БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАМЯЦЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ ХРОНІКА
РАГАЧОЎСКАГА РАЁНА

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
1994

ББК 63.3(2Б)
П 15

ГАЛОЎНАЯ РЭДАКЦЫЯ «БЕЛАРУСКАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ»:

Б. І. Сачанка (галоўны рэдактар), Я. В. Малашэвіч, С. П. Самуэль, І. П. Хаўратовіч.

РЭДАКЦЫЯ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК:

Г. К. Кісялёў (загадчык), навуковыя рэдактары Л. М. Драбовіч, І. В. Камароў, З. І. Каршакова, Ф. І. Кітаева, Н. В. Шаўрук, рэдактары С. Г. Грынкевіч, Н. А. Дзянісава, С. П. Копанева.

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

В. М. Краўчанка (старшыня камісіі), М. Н. Камароў,
В. І. Кандраценка, М. І. Лазавік, А. С. Лейкін, А. А. Палякоў.

Мастак А. М. Хількевіч.

П $\frac{0503020903-02}{M\ 318(03)-94}$ — 6—92

ISBN 5-85700-093-9

© Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 1994












Здесь 5 июня 1943 года
фашистские изверги убили
и сожгли мирных
жителей
Афанасенко Михаил Павлович 73 г
Мария Давыдовна 21
Карп Григорьевич 72
Матрена Ивановна 78
Анна Егоровна 34
Валентина Стефановна 10
Евгений Стефанович 8
Нина Стефановна 5
Степан Стефанович 2
Марченко Анна Моисеевна 23
Наталья Даниловна 22
Анна Даниловна 18
Мария Даниловна 17
Александра Даниловна 10
Петр Данилович 5
Гаврилова Анна Авдеевна 30
Галина Васильевна 11
Анатолий Васильевич 8
Василий Васильевич 1
Белоусова Феодосия Карповна 33
Эдуард Трофимович 7
Раиса Трофимовна 2
Удовенко Ульяна Корнеевна 31
Евгений Павлович 2
Софья Павловна 3
Титова Зинаида Ивановна 6
Морозова Зинаида Егоровна
Гаврилова Федосья Ефимовна 71



Да чытача

Чарговая кніга ў серыі гісторыка-дакументальных хронік «Па-
мяць» прысвечана Рагачоўскаму раёну. Як і папярэднія выданні
гэтай серыі, яна створана на аснове разнастайных дакументаў з дзяр-
жаўных і асабістых архіваў, навуковых даследаванняў, розных публі-
кацый у газетах і кнігах, успамінаў удзельнікаў і сведкаў шмат-
лікіх падзей, што адбываліся ў жыцці народа і краіны. Усе гэтыя
матэрыялы раскрываюць багатую гісторыю краю і яго людзей.

У пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі «Памяць.
Рагачоўскі раён» прымалі ўдзел мясцовыя краязнаўцы, работнікі
архіваў, бібліятэк, музеяў, супрацоўнікі савецкіх органаў, ваенкама-
таў, журналісты, навукоўцы, рэдактары энцыклапедыі.

Сіламі шырокай грамадскасці раёна складзены адзін з асноўных
раздзелаў кнігі — спісы загінуўшых у Вялікую Айчынную вайну
воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў і мірных грамадзян —
ахвяр фашысцкага тэрору, а таксама спісы воінаў Чырвонай Арміі,
што загінулі і пахаваны на тэрыторыі раёна. Даюцца таксама звесткі
пра землякоў, рэпрэсіраваных у часы сталіншчыны і пасля рэабілі-
таваных, пра хлопцаў, загінуўшых у Афганістане. Ёсць у кнізе
матэрыялы пра знакамітых землякоў — герояў працы, вядомых
пісьменнікаў, дзеячаў культуры і мастацтва, навукоўцаў і інш.

Безумоўна, стваральнікі кнігі не могуць гарантаваць поўную вы-
чарпальнасць прыведзеных матэрыялаў. На жаль, засталіся яшчэ
невядомыя салдаты, што спачылі ў зямлі Беларусі, на гэты час вядомы
імёны не ўсіх рэпрэсіраваных землякоў. Але пошукавая работа не
спыняецца з выхадам кнігі. Адкрываюцца раней закрытыя архіўныя
справы, з'яўляюцца новыя звесткі, даследаванні і, адпаведна, новыя
імёны, якія з часам знойдуць сваё месца ў чарговых кнігах «Памяць».

Раённая камісія па напісанні кнігі «Памяць» і выдавецтва «Бела-
руская Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі вельмі ўдзячны ўстано-
вам, арганізацыям і прыватным асобам, якія аказалі садзейнічанне
ў зборы, падрыхтоўцы, удакладненні матэрыялаў і выданні гісторыка-
дакументальнай хронікі «Памяць. Рагачоўскі раён».



Рагачоўскі раён размешчаны на поўначы Гомельскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. Плошча 2,1 тыс. км². Нас. пунктаў 215 (1991), у тым ліку горад Рагачоў (цэнтр раёна) і рабочыя пасёлкі Беліцк, Ільіч. 18 сельсаветаў: Азяранскі, Балатнянскі, Гадзілавіцкі, Гарадзецкі, Дворэцкі, Доўскі, Журавіцкі, Забалацкі, Запольскі, Збароўскі, Званецкі, Кісцянёўскі, Курганскі, Лучынскі, Побалаўскі, Старасельскі, Стаўпнянскі, Ціхініцкі і Беліцкі пасялковы Савет. Тэрыторыя раёна знаходзіцца ў межах Цэнтральнабярэзінскай раўніны (пераважная частка тэрыторыі), Чачорскай раўніны і Гомельскага Палесся. 67 % тэрыторыі размешчана на вышыні 140—150 м, 23 % — ніжэй за 140 м, 10 % — вышэй за 150 м. Карысныя выкапні: торф, мел, пясок, гліна і суглінкі, сапрапель. Сярэдняя тэмпература студзеня -7, ліпеня 18,3 °С. Ападкаў 590 мм за год. Вегетацыйны перыяд 192 сутак. Па тэрыторыі раёна цякуць рака Дняпро з прытокамі Друць (з Дабрыцай), Добасна, Ракатун, Ржаўка, рака Гутлянка. Найбольшыя азёры Крушынаўскае і Святое. Пад лесам 32,6 % тэрыторыі раёна, пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі 52,6 % (32,8 % ворныя землі, 18,6 % сенажаці і пашы). Асноўныя землекарыстальнікі — 20 калгасаў, 11 саўгасаў і птушкафабрыка ў в. Старое Сяло, якія спецыялізуюцца на малочна-мясной жывёлагадоўлі. Пашыраны пасевы збожжавых і бульбы. Прадпрыемствы дрэваапрацоўчай, будматэрыялаў, харчовай прамысловасці, пачатковай апрацоўкі воўны. Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгунка Магілёў — Жлобін, аўтамабільныя дарогі Бабруйск — Крычаў, Магілёў — Гомель, Рагачоў — Жлобін — Рэчыца. Суднаходства па Дняпры. Выдаецца раённая газета «Свабоднае слова». Працуе бальнеагразевы і кліматычны курорт «Рагачоў».

НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ РАГАЧОЎСКАГА РАЁНА

Горад Рагачоў

Азяранскі сельсавет: пасёлкі Вузенькі, Вялікае Ляда, Дзятлаўшчына, Заазер'е, вёскі Азяраны, Валокі, Вялікая Крушынаўка, Канапліцы, Малая Крушынаўка, Рэкта, Фалевічы.

Балатнянскі сельсавет: пасёлкі Асінаўка, Восава, Ёўня, Жавіннік, Завідаўка, Загрэб'е, Задвор'е, Зялёная Рошча (старая

назва Зорка), Крыстаполле, Ленінскі, Лясное, Махавая, Пабеда, Рубанае (старая назва Кустар), Хвойнік, Цагельня, вёскі Балотня, Гуцішча, Новая Алешня, Стараселле, Старая Алешня.

Беліцкі пасялковы Савет: рабочы пасёлак Беліцк.

Гадзілавіцкі сельсавет: пасёлкі Алейнікаў, Брод, вёска Грабаў, Доўбцы (старая назва Цыгане), Дубрава (старая назва Шышоў), Казацкі, Камень, Масткі, Пахар, Турскавы, вёскі Гадзілавічы, Княжынка, Красніца, Куставіца (старая назва Ударнік), Турск.

Гарадзецкі сельсавет: вёскі Буда, Ветачка, Вішанька, Высокае, Вялікія Стралкі, Гарадзец, Замокраўе, Каменка (старая назва Молат), Малыя Стралкі.

Дварэцкі сельсавет: пасёлкі Кручполле, Перасека, вёскі Ганнаўка, Барсукі, Бірчанская Слабада, Гусараўка, Дварэц, Дварэцкая Слабада, Зялёная Рунь, Кашара, Ліскаўская Слабада, Надзейкавічы, Новая Кашара, Пархімкаўская Слабада, Пласкіня, Смольнае, Старая Кашара, Філіпкавічы, Ямнае.

Доўскі сельсавет: пасёлкі Кавалёўка, Кляцішча, Ракуціна, Рошчына, Фёдараўка, вёскі Доўск, Малінаўка, Партызаны (старая назва Сіпораўка), Свержань, Серабранка, Слабада, Стары Доўск, Сычман, Хмелянец, Юдзічы, Ямнае.

Журавіцкі сельсавет: пасёлкі Блюеў, Заазер'е, Паддуб'е (старая назва Сталінскі), Пахар, Прылёпаўка, вёскі Валосавічы, Гута, Драгунск, Журавічы, Канава, Краснагорка, Новыя Журавічы, Хатоўня.

Забалацкі сельсавет: пасёлкі Ключы, Садовы (старая назва Маёнтак), Шырокае, Шырокі Рог, вёскі Асіннікі, Елкі (старая назва Прыстой), Забалацце, Зялёны Дуб, Міньковщина, Стары Мазалаў.

Запольскі сельсавет: пасёлак Марусіна, вёскі Броннае, Дуброўшчына, Заполле, Каласы, Касцяшоў, Наваселле (старая назва Падувінск), Новыя Каласы (старая назва Вішанькі), Раманаўка (старая назва Хапаны), Рудня Бронная, Старэнькі, Хамічы, Ясёнаўка.

Збароўскі сельсавет: пасёлак Прыдняпроўскі, дом-інтэрнат Рагачоўскі, вёскі Вікоў, Збароў, Ходасавічы.

Званецкі сельсавет: пасёлкі Гумнішча, Ільіч, вёскі Борхаў, Дружба, Званец, Шапчыцы.

Кісцянёўскі сельсавет: пасёлкі Дняпроўскі, Заеззе, Яленава, Яникаў Лог, вёскі Вішчын, Залаззе, Кісцяні, Мадора.

Курганскі сельсавет: вёскі Асмолавічы, Бярозавы Гай (старая назва Варашылаў), Каменка, Курганне, Малашкавічы, Новы Крыўск, Перакоп, Рыскоў, Стары Крыўск.

Лучынскі сельсавет: пасёлак Альсагорка, вёска Лучын, чыгуначная станцыя Сверкава.

Побалаўскі сельсавет: вёскі Амельна, Антушы, Вітлін, Востраў, Крыўка, Ліскі, Новы Востраў, Папоўцы, Перадавая (старая назва Зялёная Дубрава), Пласкіня, Побалава, Рэпкі, Сенажаткі, Ухватаўка, Цагельня, Яскіня.

Старасельскі сельсавет: пасёлкі Глінск (старая назва Мазалаў), Грабава, Зарэчча, Кокатава, Лавы, Новы Пахар, Новыя Канапліцы, вёскі Азярышча, Аляксандраўка, Асінаўка, Балаба, Блізняцы, Гайдукоўка, Малінаўка, Малыя Канапліцы, Міжыдзерава, Слабада, Станькаў, Старае Сяло, Сялец, Церахоўка, Цеснавое, Хмеліно, Шчыбрын, раз'езд Старасельскі, лясніцтва Друцкае.

Стаўпнянскі сельсавет: вёскі Вуглы, Малінаўка, Мірная (старая назва Раманаўка), Падбуддзе, Падзелы, Стоўпня, Хімы, Шырокае.

Ціхініцкі сельсавет: пасёлак Цагельня, вёскі Вірычаў, Навасёлкі, Талочкаў, Ціхінічы.

НАСЕЛЕНЫЯ ПУНКТЫ РАГАЧОЎСКАГА РАЁНА, ЯКІЯ ЗАРАЗ НЕ ІСНУЮЦЬ

Балатнянскі сельсавет: пасёлкі Карчаваха, Луткі.

Гарадзецкі сельсавет: вёска Сямінаўка.

Дварэцкі сельсавет: вёска Зяцішша.

Доўскі сельсавет: вёскі Старая Серабранка, Янаўка.

Журавіцкі сельсавет: пасёлак Міхалаўка.

Запольскі сельсавет: вёскі Манькі, Святое Возера, Сяменькавічы.

Кісцянёўскі сельсавет: пасёлак Ніжаў.

Курганскі сельсавет: вёска Дзедлава.

Лучынскі сельсавет: вёска Шлях Селяніна.

Побалаўскі сельсавет: вёска Горка, пасёлкі Хутар, Яршовы Хутары.

Старасельскі сельсавет: вёскі Парня, Руднянскі Лес, пасёлак Сіняе Мора.

Ціхініцкі сельсавет: вёскі Лейчыцы, Слапішча.

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Каля 150 тысяч гадоў назад вялікі дняпроўскі ледавік, пакідаючы тэрыторыю Беларусі, затрымаўся, і ўздоўж яго краю ўтварыліся нагрувашчанні пяску, гліны, каменння — беларуская марэнная града. Яна перасекла ўсю Рагачоўшчыну, працягнулася да Клімавіч і далей на паўночны ўсход. На поўдзень ад грады спачатку ўзніклі шматлікія прыледавіковыя азёры, потым аднавіліся рэкі, лясная расліннасць, узбагацiўся жывёльны свет. Наступіла цёплае муравінскае (мікулінскае) міжледавікоўе, якое перапынілася 90 (паводле іншых звестак 70) тысяч гадоў таму назад, калі новыя хвалі холаду пачалі пашырацца на поўдзень. Наступіла паазерская ледавіковая эпоха, якая спачатку перапынялася працяглымі пацяпленнямі. Жорсткае пахаладанне адбылося прыблізна 18 тысяч гадоў назад, калі ледавік прасунуўся да Лепеля, Оршы, Смаленска. Лясная зона знікла. На поўдзень ад ледавіка панавалі халодныя лесастэпы, якія нагадвалі тундру. Тут блукалі статкі мамантаў, паўночных аленяў, дзікіх коней, зуброў, валасатых насарогаў, белых мядзведзяў, пясцоў, зграі ваўкоў. Магчыма, у часы міжледавікоўя або ў першай палове паазерскай эпохі па даліне Дняпра праз Рагачоўшчыну вандравалі ўжо старажытныя людзі — неандэртальцы, аб чым сведчыць крамянёвае скрабло, знойдзенае ў берагавым абрыве Дняпра каля в. Абідавічы Быхаўскага раёна. Прылады працы сярэдняга палеаліту выяўлены пры раскопках стаянкі каля в. Падлужжа на р. Сож у суседнім Чачэрскім раёне. Паводле археалагічных звестак, гэта адбылося 50—35 тысяч гадоў таму назад. Неандэртальцы, або мусцьерцы (назва паводле р. Неандэр і пячоры Ла-Мусцье ў Зах. Еўропе, дзе былі выяўлены рэшткі першабытных людзей), навучыліся вырабляць каля 20 тыпаў крамянёвых прылад працы метадам грубага аббівання, паляваць на буйных статкавых жывёл, здабываць і падтрымліваць агонь. Гэтыя людзі з нізкім скошаным ілбом, характэрнымі валікападобнымі выступамі над бровамі, магутнай сківіцай былі нізкарослыя, сутулыя, з моцнымі, доўгімі рукамі. Яны будавалі жытлы з касцей маманта, камянёў, жэрдак і скур жывёл, хаваліся ад холаду пад футравымі накідкамі.

У гэты час у мусцьерцаў пачаўся пераход ад першабытнага статка да роду, існаваў ужо і нескладаны пахавальны абрад. Чалавек сучаснага фізічнага тыпу, краманьёнец (назва ад пячоры Кра-Маньён у Францыі, дзе знойдзены рэшткі чалавека гэтага тыпу), сфарміраваўся 38—35 тысяч гадоў таму назад. Яго стаянкі ў даліне верхняга Дняпра пакуль невядомы. Па-суседству, на Сажы, каля в. Падлужжа Чачэрскага раёна ў 1926 г. К. М. Палікарповічам выяўлена верхнепалеалітычная стаянка Бердыж, якая налічвае 23 тысячы гадоў. Групы падобных стаянак вывучаны ў сярэднім Падняпроўі (каля Кіева) і на Дзясне. Сож і Дняпро каля Рагачова былі звязаны паміж сабой далінамі прытокаў рэк Чачоры і Ржаўкі, таму ёсць падставы сцвярджаць, што краманьёнцы жылі і на Рагачоўшчыне. Месцы стаянак гэтых людзей — паляўнічых на мамантаў, звычайна выяўляюцца па нагрувашчаннях касцей холадалюбівых жывёл ледавіковай эпохі. Косці гэтых жывёл часта трапляюцца ў далінах мясцо-

вых рэк. Прылады працы (амаль сотні тысяч) людзі выраблялі з крамянёвых пласцін. Пры раскопках стаянкі Бердыж (С. М. Замяцін, К. М. Палікарповіч, У. Дз. Будзько, А. Г. Калечыц і інш.) былі выяўлены рэшткі 2—3 жытлаў, больш за 700 крамянёў з прыкметамі апрацоўкі, 1800 рэштак касцей маманта, пясца, паўночнага аленя, мядзведзя, ваўка, зайца, каня, зубра, валасатага насарога і інш. Мясцовыя краманьёнцы будавалі трывалыя акруглыя жытлы дыяметрам 5—6 м на адну сям'ю, у аснове з чарапоў і буйных касцей маманта, накрытых жэрдкамі, рэбрамі і скурамі жывёл. Побач з жытламі размяшчаліся вогнішчы, а таксама ямы для захоўвання харчоў. Акрамя паляванне людзі займаліся збіральніцтвам, рыбнай лоўляй, апрацоўкай дрэва, косці, рогу, шылі вопратку з футра. Яны выраблялі крамянёвыя наканечнікі коп'яў, нажы, разцы, скрабкі, праколкі, сякеры, касцяныя і рагавыя іголкі, кінжалы, капалкі, жэзлы, арнаментаваныя прадметы культу з іклаў маманта, фігуркі жанчын, бранзалеты, пацеркі, якія нашывалі на вопратку, падвескі, заколкі. Склаўся род з характэрным звычаем экзагаміі (жонкі павінны былі быць з іншага роду). Род аб'ядноўваў людзей аднаго паходжання, якое лічылася па мацярынскай лініі. Паміж людзьмі склаліся мацярынска-родавыя адносіны, няўстойлівыя парныя сем'і. Існавалі культ маці-родапачынальніцы, татэмізм, пры якім абагаўляліся паўныя рэчы, жывёла, буйныя камяні і інш.

Значнае пахаладанне ў познавалдайскі час амаль на 10 тысяч гадоў выключала Верхняе Падняпроўе, у тым ліку і Рагачоўшчыну, з Айкумены. Толькі ў канцы ледавіковай эпохі верхні палеаліт (12—9-е тысячагоддзі да н. э.) яно зноў стала прыдатным для засялення. У мезаліце (9—5-е тысячагоддзі да н. э.) на высокай 2-й надпоймавай тэрасе Дняпра з'явіліся першыя стаянкі грэнскай культуры (назва паходзіць ад урочышча Грэнск каля в. Ворнаўка Кармянскага раёна). У гэты час ледавіковая эпоха (плейстацэн) скончылася і настаў галацэн — сучасны геалагічны перыяд. У Рагачоўскім раёне стаянкі грэнскай культуры выяўлены ва ўрочышчы Каромка каля в. Кісцяні, іншыя далей, у напрамку пас. Дняпроўскі, каля вёсак Залоззе, Вішанька.

Грэнскай культуры характэрны несіметрычныя наканечнікі стрэл з крамянёвых пласцін і адшчэпаў, вастрыі, кароткія канцавыя скрабкі, разцы, грубаабабітыя сякеры. Плямёны грэнскай культуры вялі рухомы лад жыцця, будавалі лёгкія наземныя жытлы, палявалі на паўночных аленяў, пазней шукалі здабычу ў лясах, якія выраслі на месцы былых халодных лесастэпаў. Яны карысталіся дальнабойнай паляўнічай зброяй-лукам, прыручылі сабаку, навучыліся рабіць драўляныя чаўны.

У познім мезаліце Рагачоўшчына ўваходзіла і ў арэал сожскай (паводле В. Ф. Капыціна) або днепра-дзяснінскай (паводле У. П. Ксяндзова) культуры, стаянкі якой існавалі ў суседніх Быхаўскім і Жлобінскім раёнах. Сожскай культуры характэрна макралітычная вытворчасць: масіўныя грубаабабітыя сякеры, цёслы авальнай і трапецападобнай формы, пікападобныя вырабы, грубыя скрабкі, разцы, скоблі. Як выключэнне трапляліся і мікраліты. У тарфяніку каля в. Гадзілавічы выяўлены рэдкі касцяны стрыжнепадобны наканечнік дроціка з бакавымі пазамі, у якіх былі замацаваныя крамянёвыя ўстаўкі.

У 4—3-м тысячагоддзях да н. э., у эпоху неаліту, колькасць насельніцтва ў далінах рэк павялічылася. Удасканалілася апрацоўка каменных прылад працы — людзі навучыліся шліфаваць, свідраваць, паліраваць камень, авалодалі мастацтвам плоскай, пілаватай, струменнай апрацоўкі нарыхтовак з крэменю, выраблялі і абпальвалі гліняны посуд. На Рагачоўшчыне выяўлена каля 22 стаянак эпохі неаліту: каля вёсак Вішчын, Гадзілавічы, Гута, Залоззе, Лучын (урочышчы Барок, Барок Сёмінскі, Добрае, Іванскае, Завалле, Сасонка), Мадора, Ходасавічы (уро-

ПОМНІКІ БРОНЗАВАГА ВЕКУ НА ТЭРЫТОРЫІ РАЁНА



Аўтар У. Ф. Ісаенка

чышчы Дзеднае, Палік, Хоршава). Хімы. У той час на гэтай тэрыторыі жыло 200—300 чалавек. Стаянкі будаваліся сярод поплаву на астанцах 1-й надпоплаўнай тэрасы, на асобных пясчаных пагорках — у месцах, зручных для рыбнай лоўлі. У 1956—57 гг. І. І. Арцёменкам даследаваны 5 стаянак эпохі неаліту і сярэднедняпроўскай культуры бронзавага веку ў наваколлі в. Лучын.

У неалітычную эпоху ў басейне Дняпра на паўночны ўсход ад вусця Бярэзіны і Іпуці жылі плямёны верхнедняпроўскай культуры, якая склалася на аснове мясцовых вытворчых і культурных традыцый (вылучана І. М. Цюрынай у 1967). У яе ўваходзіць рагачоўская група стаянак, што займаюць прамежкавае становішча ў адносінах да днепра-данецкай культуры, арэал якой падступае да Рагачоўшчыны з поўдня (Палессе) і захаду (Бярэзіна). Гэта дае падставу некаторым даследчыкам аднесці рагачоўскую групу стаянак да асобнага варыянта днепра-данецкай культуры. Але даследаванні апошніх гадоў (У. Ф. Ісаенка, А. Г. Калечыц) пацвердзілі іх прыналежнасць да верхнедняпроўскай культуры, аб чым сведчыць і керамі́ка — высокія вастрадонныя гаршкі з прамымі сценкамі, арнаментаваныя суцэльна або гарызантальнымі зонамі, паясамі, рэдка арнаменты больш складаныя і распадаюцца на геаметрычныя зоны. Грабеньчатыя арнаменты пераважаюць над лапчастымі і ўзорамі з разнастайных ямак. Адбіткамі грэбеня рабілі кампазіцыі

Крамянёвая цясла сярэднедняпроўскай культуры, знойдзеная каля вёскі Доўск.

Гліняныя гаршкі сярэднедняпроўскай культуры з кургана ва ўрочышчы Сергіева Грыва каля вёскі Ходасавічы.

Пасудзіна з паселішча эпохі неаліту каля вёскі Ходасавічы ва ўрочышчы Мошка.

з ромбаў, звіслых трохвугольнікаў, у выглядзе зігзагаў, ялінак. Да найбольш ранніх стаянак адносіцца Хоршава, размешчанае на паўднёвы захад ад вёскі Ходасавічы, на беразе возера Добрае. Частка керамікі была аздоблена адбіткамі дробназубчатага штампа. Ва ўрочышчы Сасонка, непадалёк ад в. Лучын, выяўлены рэшткі жытла, памерамі 3,4×2,4 м, паглыбленага ў зямлю, з агнішчам у цэнтры дыяметрам каля метра. У жытло вёў ход даўжынёй да 4 м і шырынёй 1,4 м. Конусападобны дах падтрымлівалі 6 слупоў. Тут знойдзена 78 крамянёвых прылад працы і каля 1200 абломкаў ад 10—15 гаршкоў.

У эпоху неаліту склаліся вялікія групы плямён, развітое мацярынска-родавае грамадства. Сумесная праца на аснове агульнай уласнасці, параўнальнага размеркавання здабычы і прадуктаў вытворчасці ажыццяўлялася пераважна ўнутры асобных абшчын. Парныя сем'і былі няўстойлівымі, роднасць вызначалася па мацярынскай лініі. Рэлігіяй быў татэмізм — вера ў кроўную сувязь з пэўнымі жывёламі, раслінамі, рэчамі, выконваліся адпаведныя рытуалы, прыносіліся ахвяры багам-заступнікам. У канцы эпохі (3-е тысячагоддзе да н. э.) пачалі пашыраццa прымітыўнае земляробства, жывёлагадоўля, выпадковы абмен з суседзямі бурштынам, крэменем, мёдам, футрам і інш.

Медная ладдзяпадобная сякера з пахавання сярэднедняпроўскай культуры ва ўрочышчы Мошка каля вёскі Ходасавічы.

У пачатку 2-га тысячагоддзя да н. э. ўверх па Дняпры распаўсюдзіліся плямёны сярэднедняпроўскай культуры. Яны займаліся жывёлагадоўляй, выраблялі каменныя свідраваныя сякеры, валодалі металургіяй медзі і бронзы. Прышэльцы месцамі пацяснілі старажытныя неалітычныя плямёны, а часцей жылі разам з імі. Культура неалітычнага насельніцтва значна ўзбагацілася, надышоў бронзавы век. На тэрыторыі Рагачоўскага раёна вядома 16 стаянак гэтага часу, якія былі заснаваны пераважна на месцы былых неалітычных, большая частка іх размешчана ў шырокай даліне Дняпра паміж вёскамі Лучын і Ходасавічы, а таксама каля вёсак Касцяшоў, Свержань, Хімы, Шчыбрын, у Рагачове.

Раскіданыя на пясчаных выдмах, невысокіх пагорках, астанцах рачных тэрас сярод паплавоў, каля рэчак і азёр-старыц, стаянкі гэтыя былі невялікія і мелі некалькі жытлаў. Непадалёку ад стаянак былі могільнікі. Найбольш даследавана стаянка ва ўрочышчы Завалле каля в. Лучын, выяўленая ў 1928 г. А. Дз. Каваленем. На плошчы 310 м^2 захаваліся 2 вогнішчы ў ямах авальнай формы даўжынёй 1,3 м і 1,9 м, рэшткі жытла памерамі не менш як 3,7×3 м, вогнішча і вугальная пляма, вакол якой былі 8 слупоў.

Сусветную вядомасць і значэнне ў вывучэнні сярэднедняпроўскай культуры бронзавага веку набылі курганныя могільнікі, даследаваныя каля в. Ходасавічы ў 1959—63 гг. беларускім атрадам Інстытута археалогіі АН СССР пад кіраўніцтвам І. І. Арцёменкі. У 21 кургане выяўлена 47 пахаванняў, размешчаных у 5 пунктах: ва ўрочышчах Мошка (12), Палік (1), Сергіева Грыва (4), каля азёр Палік, Дзеднае (2) і Каменнае (2). Выяўлена буйная калекцыя медных і бронзавых рэчаў (11 экземпляраў) і 28 гліняных гаршкоў, якія рэстаўрыраваны.

Вакол курганоў дыяметрам 8—10 м, вышынёй да 3 м былі невялікія раўкі. Часам гэтыя курганы выкарыстоўвалі для паўторных пахаванняў. Пахаванні як у ямах, так і на гарызонце адбываліся па абраду трупапалажэння, рэдка — трупаспалення. У пахавальны інвентар увахадзілі крамянёвыя наканечнікі стрэл, нажы, падвескі з бурштыну, зубоў і касцей жывёл, металічныя вырабы, гаршкі, сякеры. Інвентар большасці пахаванняў бедны, і толькі ва ўрочышчы Мошка адно пахаванне вылучаецца сваім багаццем. У яме побач з рэшткамі шкілета выяўлены гаршчок, 4 крамянёвыя нажы, 27 стрэл, свідраваная і медная сякеры, сякера-клін, наканечнік кап'я, 2 акулярападобныя падвескі, падвеска з бурштыну, касцяная праколка, крамянёвыя адшчэпы. Медныя і бронзавыя рэчы мелі на той час вялікую каштоўнасць, метал, з якога іх адкавалі, паходзіў з Каўказа або Прыкарпацця. Сярэднедняпроўская культура існавала ў верхнім Падняпроўі ў канцы 3 — 1-й палавіне 2-га тысячагоддзя да н. э., і на яе аснове склалася сосніцкая культура (1500—1200 гадоў да н. э.). Паселішчы





Рэчы з пахавальнага кургана сярэднедняпроўскай культуры каля вёскі Ходасавічы ва ўрочышчы Мошка.

Каменныя прылады працы з пахавання эпохі бронзы каля вёскі Ходасавічы.

і могільнікі сосніцкіх плямён выяўлены побач з в. Гадзілавічы, ва ўрочышчы Мошка каля в. Ходасавічы. Асноўнымі заняткамі насельніцтва былі жывёлагадоўля і земляробства, пабочнымі — паляванне і рыбалоўства, апрацоўка медзі і бронзы. Насельніцтва жыло ў паўзямлянках, часам двухкамерных, з двухсхільным дахам, з глінабітным агнішчам унутры. Кераміка — высокія пласкадонныя гаршкі з ледзь акрэсленымі шыйкамі і патоўшчаным або скошаным краем, упрыгожаныя зігзагамі і ялінамі з прамавугольных адбіткаў, пацеркавым, шнуравым ці пракрэсленым арнаментам. Сярод знаходак на паселішчах Гадзілавічы і Ходасавічы — косці быка, каня, авечкі, свінні, каменныя зерняцёркі, таўкачы, крамянёвыя сярпы. Выяўленыя гліняныя формы для адлівак сведчаць, што тут жа, на месцы, выплаўляліся сякеры, сякеры-кельты, долаты і іншыя прылады працы.

У 7 стагоддзі да н. э. на тэрыторыі

Медная каўказскага тыпу сякера з кургана сярэднедняпроўскай культуры ва ўрочышчы Мошка каля вёскі Ходасавічы.

Гомельшчыны пачаўся жалезны век. Насельніцтва навучылася здабываць жалеза з мясцовай балотнай руды. Асновай эканомікі старажытнага насельніцтва стала ляднае (падсечнае) земляробства на шырокіх плошчах, адначасова ўзрасло гаспадарчае значэнне жывёлагадоўлі. Гэта забяспечыла рэгулярнае атрыманне дадатковага прадукту, паскорыла маёмасную дыферэнцыяцыю і працэс распаду першабытнаабшчынных адносін. У пачатку ранняга жалезнага веку (7—3 стагоддзі да н. э.) тэрыторыю Гомельшчыны засялялі плямёны мілаградскай культуры (назва ад гарадзішча каля в. Мілаград Рэчыцкага раёна). Для мілаградскай культуры характэрны своеасаблівыя жытлы: ранніе — юртападобныя паўзямлянкі, заглыбленыя ў зямлю да 1 м, плошчай да 50 м^2, больш познія — слупавой канструкцыі, квадратнай ці прамавугольнай формы, плошчай 10—15 м^2, з бакавымі выступамі і адкрытымі агнішчамі. Побач з імі ямы-скляпы. Развіваліся промыслы: здабыча і апрацоўка жалеза, апрацоўка косці, рогу, дрэва, прадзенне і ткацтва, выраб ляпнога посуду — кругладонных гаршкоў з рэзка адагнутым ці загнутым венчыкам са сціплым арнаментам у верхняй частцы ў выглядзе розных па форме і глыбіні ямак і іншых адбіткаў. На тэрыторыі Рагачоўскага раёна вядома 18 гарадзішчаў мілаградскай культуры каля вёсак Азяраны, Амельна, Вішчын, Журавічы, Задруцце, Збароў, Каменка Рыскоўская, Кісцяні, Лучын, Рыскоў, Хмялец, Рудня, Шапчыцы, Юдзічы, каля Рагачова. Большасць з іх былі мысавага тыпу, каля вёсак Амельна, Журавічы, Рудня, Рыскоў — балотнага, каля Каменкі Рыскоўскай — узгоркавае. У плане яны круглыя або прамавугольныя з закругленымі вуглами, кальцавымі валамі. Балотныя гарадзішчы звычайна размешчаны на адлегласці 3—5 км ад берагоў рэк, на невялікіх узгорках сярод поплаўных балот. Пры гарадзішчах Вішчын, Збароў, Кісцяні, Хмялец выяўлены селішчы. У розныя часы на гарадзішчах Вішчын і Лучын былі знойдзены каштоўныя скарбы. На гарадзішчах Збароў, Кісцяні, Рагачоў рэшткі посуду штрыхаванай керамікі культуры сведчаць аб уплыве балцкіх плямён, што жылі на тэрыторыі цэнтральнай Беларусі.

У сярэдзіне 3 стагоддзя да н. э. ў верхнім і сярэднім Падняпроўі, дзе раней жылі плямёны мілаградскай культуры, склалася зарубінецкая культура. Асноўным відам пасяленняў спачатку былі гарадзішчы, пабудаваныя яшчэ плямёнамі мілаградскай культуры. Яны дадаткова

ўмацоўваліся: дасыпаліся старыя валы ці ўзводзіліся новыя, утвараючы другую лінію абароны. Побач будаваліся селішчы. Людзі жылі ў невялікіх паўзямлянках або наземных жытлах з агнішчамі. Пахавальны абрад — трупаспаленне на гарызонце на бескурганных могільніках. Рэшткі крэмацыі насыпаліся ў ямкі глыбінёй 0,2—1 м. У інвентар уваходзілі прылады працы, упрыгожанні, кераміка, сустракаюцца безынвентарныя пахаванні, што сведчыць пра маёмасную няроўнасць.

На познім этапе зарубінецкай культуры, вядомым таксама як кіеўская культура (2—5 стагоддзі да н. э.), насельніцтва жыло на селішчах, якія размяшчаліся побач з пакінутымі гарадзішчамі па нізкіх берагах рэк, дзе былі ўрадлівыя глебы. На тэрыторыі Рагачоўскага раёна помнікі позняга этапа зарубінецкай культуры выяўлены ў вёсках Залоззе, Збароў, Каласы, Кісцяні, Хмелянец, пас. Ільіч, непадалёк ад Рагачова. Асноўнымі відамі гаспадаркі былі падсечнае земляробства і жывёлагадоўля, вялікі прыбытак рыбалоўства, а таксама паляванне, якое давала мяса і футра. Сеялі пераважна пшаніцу, гарох, проса, палявы боб, віку. У той час былі вядомы ўсе асноўныя віды свойскай жывёлы: карова, куры, сабака, кошка, свіння, конь, авечка. Насельніцтва пашырала здабычу і апрацоўку жалеза, вырабляла клінападобныя сякеры-кельты, сярпы, лістападобныя наканечнікі коп'яў, пласкадонны посуд, каменныя зерняцёркі, фібулы, іншыя ўпрыгожанні з бронзы. Існавалі сувязі з плямёнамі, што жылі на поўдні і паўднёвым захадзе, з насельніцтвам лесастэпу і стэпу Украіны, з гарадамі паўночнага Прычарнамор'я. Адтуль да зарубінецкіх плямён трапілі некаторыя фібулы і наканечнікі коп'яў кельцкага тыпу, падковападобныя фібулы, антычныя шкляныя пацеркі, грэчаскія амфары і іншыя рэчы.



Каменныя свідраваныя сякеры з пахаванняў сярэднедняпроўскай культуры каля вёскі Ходасавічы ва ўрочышчах Сергіева Грыва, Палік, Мошка.

Асновай грамадскага ладу быў развіты патрыярхат, грамадскай адзінкай — вялікая патрыярхальная сям'я. Некалькі сем'яў аб'ядноўваліся ў патрыярхальны род. Плямёны зарубінецкай культуры знаходзіліся на стадыі распаду першабытнаабшчыннага ладу.

Этнічныя супольнасці людзей пачынаючы з эпохі неаліту рассяліліся на вялікіх абшарах. Іх культуры мелі пэўную перайманальнасць. Таму і гідронімы (назвы вадаёмаў) без істотных змен захаваліся на працягу апошніх 4—5 тысячагоддзяў. Рагачоўскі раён размешчаны вакол Дняпра і яго прытокаў, з якіх буйнейшы — Друць. Дняпро (Данапрас, Барысфен, Непер) быў вядомы грэкам і рымлянам, хоць яго верхнім цячэннем грэкі лічылі, відаць, больш знаёмую ім Бярэзіну. Назва Днепр узнікла ад агульнаіндаеўрапейскага слова «ден», «дану» — цячэнне. Да больш позніх адносіцца Мадорка — старажытнаеўрапейскі гідронім (Модр — прыток Сены, Модар — Рэйна, Модра — Дунай). Пасля распаду індаеўрапейскай еднасці ў левабярэжжы Дняпра з'явіліся індаіранскія гідронімы (Арыя, Басея, Карма, Стомець, Хармань, Харопуць). Наступны храналагічны пласт — балцкія гідронімы. Друць — паўнаводная («друтас» — магутны), Рэкта, Рэкатун — крынічніцы (ад балцкага «ракціс» — крыніца). Вярхоўі Дняпра падыходзяць да прытокаў Заходняй Дзвіны і з'яўляюцца важнейшым адрэзкам шляху «з вараг у грэкі», за які вялася ўпартая барацьба. Найбольш кароткая валока злучала Друць з Лучосай, таму Друцк стаў адным з буйнейшых гарадоў усходніх славян (звесткі з 1001 г.). Праз стагоддзе вялікую ролю адыгрываў і «горад на рагу» — Рагачоў, які кантраляваў развілку буйных рачных шляхоў. Славянскія гідронімы маюць адпаведны назве сэнс і вылучаюцца сваёй суфіксальнай част-

кай: Вуглянка, Добрыца, Ржаўка. Такім чынам, па гідронімах прасочваецца пасля-доўная змена насельніцтва Рагачоўшчыны ад паўночных еўрапеоідаў, пазней індаеўрапейцаў, якія паступова ператварыліся ў старажытнае насельніцтва Еўропы, часткова вылучыліся ў плямёны індаіранскай галіны, да старажытных балтаў, праславян і, нарэшце, усходніх славян. Сярэднія этапы гэтага развіцця прыпадаюць на 2—1-е тысячагоддзі да н. э.

Праблема этнічнай прыналежнасці (у першую чаргу мовы) плямён жалезнага веку канчаткова не вырашана. Хутчэй за ўсё мясцовыя плямёны мілаградскай, а, магчыма, і зарубінецкай культур былі так званымі дняпроўскімі балтамі. Толькі абшчыны кіеўскай культуры, якія праніклі з поўдня ў Верхняе Падняпроўе і далей на поўнач у 250—500 гг., былі, верагодна, старажытнаславянскімі. Мясцовае балцкае асяроддзе аказвала на іх вялікі ўплыў. У выніку гэтага за наступныя тры стагоддзі ўтварылася насельніцтва, якое на захад і поўдзень ад Быхава развівала быхава-калачынскую, або банцараўскую, культуру. У складзе гэтай культуры балцкія элементы прыкметна пераважалі над славянскімі, таму яе часцей прыпісваюць славянізаваным балтам. Затое на Палессі ўжо былі старажытныя славяне (продкі дрыгавічоў, драўлян). Славянізацыя дняпроўскіх балтаў паскорылася, калі побач з дрыгавічамі ў дняпроўскім левабярэжжы з'явіліся радзімічы, выхадцы з басейна Днястра. Існуюць таксама думкі, што ўжо мілаградцы-неўры былі славянамі, а зарубінцы — іх нашчадкамі, што зарубінцы, наадварот, былі кельцкімі, германскімі, або невядомымі іншамоўнымі плямёнамі і, нарэшце, што частка носьбітаў банцараўскай культуры размаўляла на славянскай мове з прымессю балцкіх элементаў. Такім чынам, этнічная праблема яшчэ не вырашана. 600—800 гг. н. э.— гэта час распаўсюджання славян на тэрыторыі Беларусі, пераважна ў Верхнім Падняпроўі, і славянізацыі мясцовых, магчыма, не толькі балцкіх плямён. Таму ў славянскай мове ўзніклі іншамоўныя субстраты, сярод якіх пераважаў балцкі. Гэты працэс адбываўся і на Рагачоўшчыне, якая ўваходзіла ў зону сутыкнення розных плямён і культур.



Пасудзіна з пахавання сосніцкай культуры каля вёскі Ходасавічы ва ўрочышчы Мошка.

Напярэдадні новай эры пачаўся працэс распаду першабытнаабшчынных адносін. Шырокае распаўсюджанне жалезных прылад прамысловай дзейнасці прывяло да больш высокай прадукцыйнасці працы і да назапашвання матэрыяльных каштоўнасцей (збожжа, жывёла, рамесныя вырабы, прадукты палявання). Узнікла маёмасная няроўнасць. Абвастрыліся супярэчнасці паміж родамі і плямёнамі, узмацніліся варожыя дзеянні паміж імі, характэрныя перыяду «ваеннай дэмакратыі». Гэта вымусіла насельніцтва ў мэтах бяспекі будаваць штучныя ўмацаванні вакол сваіх паселішчаў.

Пераход ад першабытнаабшчыннага ладу да феадалізму ў плямён, якія засялялі тэрыторыю Беларусі, зацягнуўся да 6—9 стагоддзяў. Насельніцтва пакідала патрыярхальна-сямейныя пасёлкі-радзішчы. Утвараліся суседскія, сельскія абшчыны з асобных сем'яў, якія сяліліся ў зручных для вядзення гаспадаркі месцах на адкрытых селішчах. Будаваліся жытлы двух тыпаў: наземныя слупавой канструкцыі і паўаямлянкі з печамі-каменкамі. Асновай гаспадаркі былі земляробства і жывёлагадоўля. Пашыралася пашавае земляробства, якое паступова выцясняла пасечнае. Асноўныя прылады працы выраблялiся на паселішчах, тут жа рабілі посуд, пралі, ткалі. Паступова паглыбляўся падзел працы, развіваўся гандаль. У Рагачове, Збарове, Юдзічах знойдзены сведкі замежнага гандлю — арабскія дырхемы 750, 934, 935, 943—954 гадоў.

У 8—10 стагоддзях тэрыторыю Рагачоўшчыны ўжо засялялі славянскія плямёны дрыгавічоў і радзімічаў. Побач з іх селішчамі ўзнікалі курганныя могільнікі.

Большая частка курганоў насыпана ў сярэднявеччы над пахаваннямі дрыгавічоў і радзімічаў, часам пры старых курганах бронзавага веку, якія былі насыпаны на

2500 гадоў раней. Першыя звесткі пра курганы Рагачоўшчыны надрукаваны ў 1873—92 гг. у розных перыядычных выданнях таго часу. Вядома 56 курганных могільнікаў пры 44 населеных пунктах, у якіх налічвалася да 2700 насыпаў. Буйныя могільнікі, а таксама і паселішчы яшчэ ў пачатку 20 ст. былі каля вёсак Ветачка (200 насыпаў), Гадзілавічы (350 і 120 насыпаў), Доўск (83 і 100 насыпаў), Каменка (141 насып), Каласы (165 насыпаў), Лучын (120 насыпаў), Мадора (164 насыпы), Перакоп (100 насыпаў), Ходасавічы (100 насыпаў). На жаль, большасць з іх разбурана, таму колькасць курганоў каля вёсак значна скарацілася, у раёне іх засталося менш за тысячу. Рэспубліканскае значэнне нададзена курганным могільнікам каля вёсак Азяраны, Валосавічы, Гадзілавічы, Каменка Рыскоўская, Канава, Каласы, Курганне, Новы Доўск, Мадора, Новы Крыўск, Пахар, Рэпкі, Ходасавічы, Цагельня, Юдзічы. Упершыню раскопкі дрыгавіцкіх і радзіміцкіх курганоў 10—13 стагоддзяў каля Рагачова ў 1810 г. зрабіў Ф. Е. Нарбут, але палічыў іх магіламі невядомага народа.

Дрыгавічы рассяляліся ў асноўным на захад ад Дняпра, іх курганныя могільнікі выяўлены каля Рагачова непадалёк ад вёсак Азяраны, Задруцце, Каласы, Аляксандраўка, Панoўшчына, Добасна, Вішанька.

Курганны могільнік каля в. Азяраны вядомы з 1873 г. і ўпершыню даследаваны Е. Р. Раманавым у 1888 г. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. Выяўлены рэшткі дамавіны, кавалкі скуранoй папругі, тканіны, пахавальны інвентар (спіральныя бронзавыя кольцы, вітыя завушніцы, бінірамідальныя пацеркі з пазалотай). Гарадзішча на паўднёвай ускраіне в. Задруцце ўпершыню абследаваў у 1930—31 гг. А. М. Ляўданскі. За 100 м ад гарадзішча размешчаны курганны могільнік, у якім А. М. Ляўданскі ў 1931 г. з 40 насыпаў раскапаў 6. Тут выяўлены рэшткі дамавін, жалезныя цвікі, ганчарны посуд, шкляныя, бронзавыя, філігранныя сердалікавыя пацеркі, бронзавыя пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы. Нябожчыкаў клалі галавой на захад.

Курганны могільнік каля в. Каласы адкрыты і ўпершыню даследаваны ў 1892 г. М. В. Фурсавым і С. Ю. Чалоўскім, у 1929 г. даследаваны А. Дз. Каваленем. У 4 курганах пахавальны абрад — трупапалажэнне, у пахавальным інвентары — ганчарны посуд, сярэбраныя і медныя драцяныя бранзалеты, сердалікавая пацерка, сярэбраны пярсцёнак. У 1982 г. В. Н. Рабцэвічам і А. М. Плавінскім раскапаны 14 пахаванняў. У 9 з іх пахавальны абрад — трупапалажэнне на гарызонце, у 3 курганах былі парныя пахаванні, у 6 нябожчыкі абкладзены плашкамі. У пахавальным інвентары — паяскныя кольцы, бронзавая трохдротавая грыўня, бранзалетападобныя скроневыя кольцы, лунніцы, фібулы, вітыя і пласціністыя пярсцёнкі, шмат пацерак: сярэбраныя, зярнёныя, сердалікавыя, бурштынавыя, шкляныя пазалочаныя і пасярэбраныя бочкападобныя, зонныя, роўнавугольныя, бісер. У 7 курганах знойдзены рэшткі ганчарнага посуду.

На тэрыторыі Рагачоўшчыны на левым усходнім беразе Дняпра жылі радзімічы. Яны займаліся земляробствам і жывёлагадоўляй, бортніцтвам і паляваннем. Па ўзроўні эканамічнага, сацыяльнага і культурнага развіцця яны не адрозніваліся ад дрыгавічоў. У сярэдзіне 9 стагоддзя радзімічы плацілі даніну Хазарскаму каганату. Радзіміцкія курганы выяўлены каля Рагачова, вёсак Ветачка, Гадзілавічы, Гута, Каменка, Курганне, Мадора, Новы Крыўск, Серабранка, Ходасавічы, Юдзічы, селішча і свяцілішча каля в. Ходасавічы.

Курганныя могільнікі каля в. Ветачка датуюцца 11—12 стагоддзямі. Адзін з іх размешчаны за 500 м на паўднёвы ўсход ад вёскі і складаецца з 47 насыпаў. У 1963—65 гг. Г. Ф. Салаўёва раскапала 5 курганоў. У трох былі трупа-



Посуд з пахаванняў позняга этапа сярэднедняпроўскай культуры каля вёскі Ходасавічы ва ўрочышчах Палік і Сергіева Грыва.

Радзімічы. Рэканструкцыя твару па чэрапе (з курганнага могільніка ў вёсцы Юдзічы Рагачоўскага раёна).

палажэнні без рэчаў, у двух знойдзены скроневыя кольцы, бронзавы віты пярсцёнак, шкляныя бочкападобныя з пазалотай і бурштынавыя пацеркі, ганчарны посуд. 3 курганы ў 1983 г. даследавалі В. Н. Рабцэвіч і А. М. Плавінскі. У двух жаночых пахаваннях знойдзены кольцы, трохдротавая бронзавая грыўня, шарападобныя і біпірамідальныя сердалікавыя, шкляныя пазалочаныя і пасярэбраныя бочкападобныя пацеркі, зоркападобная фібула, бісер, сярэбраныя бранзалетападобныя скроневыя кольцы. Другі могільнік з 32 курганоў, размешчаны за 150 м на поўдзень ад вёскі, датуецца 11—12 стагоддзямі. У 1963 г. Г. Ф. Салаўёва раскапала 6 насыпаў. Толькі ў двух з іх знойзены рэшткі ганчарнага посуду, падвескі радзімічкага тыпу, скроневае кольца, бразготка, паставыя пацеркі. У 1983 г. 3 курганы даследавалі В. Н. Рабцэвіч, А. М. Плавінскі. У двух былі мужчынскія безынвентарныя трупапалажэнні, адзін пахаванне не меў.

Курганны могільнік каля в. Гадзілавічы, які складаецца са 124 насыпаў, датуецца 10—12 стагоддзямі. У 1892 г. яго ўпершыню абследавалі М. В. Фурсаў і С. Ю. Чалоўскі. У 1964 г. Г. Ф. Салаўёва раскапала 15 насыпаў. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. У курганах знойдзены абломкі ганчарных гаршкоў, пярсцёнкападобныя і сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы, шкляныя і сердалікавыя пацеркі, бронзавыя бляшкі, манетападобныя падвескі з выявай быка і без яе, лунніцы і бразготкі, іншыя рэчы. У 1981 г. В. Н. Рабцэвічам і А. М. Плавінскім раскапана яшчэ 6 курганоў. У 3 курганах рэчы адсутнічалі, у астатніх знойдзены шматлікія шкляныя пацеркі, медныя кольцы і бронзавыя падвескі.

Курганны могільнік каля в. Гута датуецца 11—13 стагоддзямі. У канцы 19 стагоддзя іх даследаваў М. М. Філонаў, у 1910 г. Е. Р. Раманаў. З 14 насыпаў раскапана 6. Пахавальныя абрады — трупапалажэнне і трупаспаленне. У пахавальным інвентары жалезныя нажы, шкляныя пацеркі, бранзалеты, сярэбраныя скроневыя кольцы.

Курганныя могільнікі каля в. Каменка датуюцца 11—12 стагоддзямі. За 1,4 км на паўночны ўсход ад вёскі выяўлены 102 насыпы, якія добра захаваліся. У 1930 г. А. М. Ляўданскі раскапаў 3 насыпы. Знойдзены ганчарны посуд, паясныя кольцы, жалезныя крэсівы і нож, бронзавыя спражкі. За 200—300 м на поўдзень і на паўднёвы ўсход ад вёскі выяўлена 97 насыпаў. У 1930 г. А. М. Ляўданскі раскапаў 3 курганы, у якіх знойдзены рэшткі ганчарнай керамікі, скроневыя кольцы, пярсцёнкі, шкляныя пацеркі.

На ўсход ад в. Курганне размешчаны курганны могільнік з 26 насыпаў 11—12 стагоддзяў. Даследаваны ў 1890 г. У. І. Зенчанкам, які раскапаў 3 насыпы. Пахавальны абрад — трупаспаленне. Знойдзены пласціністыя і вітыя бранзалеты, сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы, лунніцы, пярсцёнкі, бразготкі, абломкі шыйнай грыўні.

Курганныя могільнікі каля в. Мадора датуюцца 11—12 стагоддзямі. Ва ўрочышчы Шылаў Лес 32 насыпы. У 1978—79 гг. В. Н. Рабцэвіч і А. М. Плавінскі раскапалі 7 насыпаў. Пахавальны абрад — трупапалажэнне на гарызонце. У інвентары — сердалікавыя біпірамідальныя і прызматычныя, шкляныя, пазалочаныя бочкападобныя пацеркі, бісер, бронзавая ліpападобная спражка, праразная падвеска — амулет у выглядзе коніка, медныя вітыя пярсцёнкі і бранзалеты, рэшткі ганчарнага посуду. За 1,5—2 км на паўночны ўсход ад вёскі размешчаны яшчэ 6 насыпаў (раней было 12). У 1967 г. іх даследавала Г. Ф. Салаўёва. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. У інвентары — сярэбраны бранзалет з S-падобнымі кан-

цамі, бронзавыя паяскныя кольцы і пярсцёнкі, абломкі ганчарнай керамікі, сердалікавыя пацеркі з пазалотай і серабром, лунніцы.

Курганны могільнік на ўсход ад в. Новы Крыўск налічвае 44 насыпы 10—12 стагоддзяў. Іх абследаваў у 1910 г. Е. Р. Раманаў. У 1968 г. Г. Ф. Салаўёва раскапала 22 курганы. У 18 курганах пахавальны абрад — трупапалажэнне, у 2 — трупаспаленне. У 15 курганах знойдзены бранзалетападобныя скроневыя кольцы, бісер шкляны, шкляныя пацеркі, віты бронзавы бранзалет, гаршчок і абломкі глінянага посуду, жалезны нож, шыферныя праслiцы, лунніца і іншыя рэчы. У 11 стагоддзі адбылася змена радзіміцкіх пахаванняў крывіцкімі.

За 1 км на паўднёвы захад ад вёскі Серабранка, у лесе, размешчаны курганны могільнік з 14 насыпаў 11—12 ст. Адзін з іх раскапаны ў канцы 19 ст. А. В. Прахавым. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. У інвентары віты бранзалет, драцяныя вітыя скроневыя кольцы, дробныя пацеркі і іншыя рэчы.

Курганныя могільнікі 11—12 стагоддзяў каля в. Ходасавічы даследаваны ў 1956—63 гг. І. І. Арцёменкам.

Ва ўрочышчы Хоршава, за 4 км на паўднёвы захад ад вёскі, размешчана 55 насыпаў, ва ўрочышчы Мошка 2-я захавалася 12 насыпаў, ва ўрочышчы Мошка 1-я — 32 насыпы (частка курганоў бронзавага веку). Пахавальны абрад — трупапалажэнне. У інвентары — пазалочаныя шкляныя пацеркі, медныя і шкляныя пярсцёнкі, бісер, абломкі шыйнай грыўні і крыжыкаў, крыжападобныя і змееголовападобныя падвескі, драцяное кольца, пярсцёнкападобныя скроневыя кольцы. Падвеска-амулет у выглядзе коніка, пярсцёнкі, шкляныя пацеркі, рэшткі ганчарнай керамікі і інш.

Курганны могільнік на поўдзень ад в. Юдзічы складаецца з 62 насыпаў. Датуецца канцом 10—12 стагоддзем. Упершыню абследаваны ў 1890 г. Е. Р. Раманавым. У 1968 г. 10 насыпаў раскапала Г. Ф. Салаўёва, у 1980 г. 15 насыпаў — Э. М. Загарульскі. Пахавальны абрад — трупапалажэнне. Мужчынскія пахаванні мелі няшмат рэчаў (жалезныя дужкі і абручы ад вядра, крэсівы, ганчарны посуд і яго абломкі, косці жывёл). У жаночых пахаваннях знойдзены скроневыя кольцы, бронзавыя і сярэбраныя сяміпрамянёвыя бранзалетападобныя, з трыма напускнымі пацеркамі (кіеўскі тып), рознакаляровыя шкляныя (зялёныя, сінія, чырвоныя, фіялетавыя) пацеркі і бісер, чорна-белая, аздобленая вочкамі пацерка, а таксама пацеркі шкляныя бочкападобныя, пазалочаныя і пасярэбраныя, бурштынавыя біпірамідальныя і васьмігранныя, сердалікавыя і хрусталёвыя гранёныя, бронзавыя, сярэбраныя са складанай зерню і без яе: пярсцёнкі, манетападобныя падвескі, бронзавыя з імітацыяй зерні лунніцы, бронзавая шыйная грыўня з квадратнымі канцамі, якія заходзяць адзін за адзін, бронзавы бранзалет з расшыранымі канцамі, бронзавыя крыжыкі, ганчарны і ляпны посуд і яго абломкі.

На рубяжы 11—12 стагоддзяў паміж сучаснымі вёскамі Вішчын і Кісцяні, на месцы стаянкі каменнага веку, на правым высокім беразе Дняпра ўзнікла гарадзішча — феадальна-ўладальніцкі замак. У сярэдзіне 13 стагоддзя замак быў разбураны і спалены. Гарадзішча абследавана ў пачатку 1880-х гадоў С. Ю. Чалоўскім. У 1976—84 гг. раскопкі праводзіла экспедыцыя БДУ пад кіраўніцтвам Э. М. Загарульскага. Пляцоўка гарадзішча паўкруглая ў плане 120×65 м, плошчай 0,63 га, з боку поля ўмацаваная 3 паралельнымі лініямі валоў і равоў, якія складалі паласу абароны шырынёй каля 30 м. З боку ракі абмежавана стромкім абрывам рачной тэрасы. Вышыня вонкавых валоў 2,5—3 м, глыбіня равоў 3,5 м. На грэбені ўнутранага вала выяўлены і на працягу 30 м даследаваны рэшткі загарэлай абарончай сцяны, пабудаванай з гарызантальна накладзеных бярвён, умацаваных кароткімі папярочнымі сценамі. Месцамі захаваліся 3—4 бервяны дыяметрам 18—23 см. Тыльны бок сцяны абмазаны глінай. Каля асновы ўнутранага вала прасочана яшчэ адна сцяна з габляваных дошак, якая агароджвала ўнутраны вал ад участка забудовы.

На пляцоўцы выяўлены рэшткі 5 наземных драўляных пабудоў, размешчаных уздоўж унутранага вала, у 2 з іх захаваліся рэшткі падлогі з дошак і рэшткі печаў. У паўднёвай частцы гарадзішча знойдзены рэшткі майстэрні ювеліра, у паўночнай — свіран з абгарэлым збожжам. Сярод знаходак абломкі 2 сашнікоў, 2 матык, сярпоў, жорнаў, шлакі, зубілы, малаты. На тэрыторыі гарадзішча працаваў высокакваліфікаваны ювелір. Знойдзена серыя матрыц для вырабу крыжападобных падвесак, раснаў, колтаў з выявай барсаў, гліняная лячка з бронзай, шмат свінцовых пласцін. З рознымі галінамі гаспадарчай дзейнасці звязаны знаходкі нажоў, нажніц, шылаў, іголак, гарпуноў, рыбалоўных кручкоў, праслiц. Шмат матэрыялаў адлюстроўваюць ваен-

ную справу: наверша і крыжавіны мяча, шарападобны бронзавы кісцень, кавалкі кальчуг, пласціны ад панцырных даспехаў, наканечнікі стрэл і коп'яў, шпоры цяжкаўзброеных коннікаў (больш за 10), серыя страмён, цуглі. Знойдзены разнастайныя ўпрыгожанні і бытавыя рэчы: манетападобныя падвескі, крыжыкі, шпількі, бронзавыя бранзалеты, пярсцёнкі, бразготкі, каля тысячы абломкаў шкляных бранзалетаў, імпартны посуд.

У 1979 г. сярод камянёў каля крапасной сцяны знойдзены закапаны ў сярэдзіне 13 стагоддзя скарб: 2 колты з двухбаковай выявай птушак, у тэхніцы перагародчатай эмалі, зоркавы шасціканцовы колт з ажурнай аблямоўкай і выявай 2 птушак і крыжа, 2 расны, якія складаліся з канічных вяршынь са звіслымі ланцужкамі з бляшкамі, кручаны з трох жгутоў з шчытападобнымі канцамі ў выглядзе стылізаваных галовак масіўны бранзалет з гравіраванымі выявамі птушак і арнаментаў, 4 крыжападобныя падвескі, 3 сярэбраныя пацеркі, 2 ланцужкі з паўцыліндрыкаў, 3 грыўні наўгародскага тыпу, 9 грыўняў літоўскага і 6 кіеўскага тыпаў. Усе вырабы з высакапробнага серабра. Два колты, крыжападобныя падвескі пазалочаныя.

Для Рагачоўшчыны асабліва характэрна наяўнасць змешанага дрыгавіцка-радзімічскага насельніцтва на абодвух берагах Дняпра.

Вялікая ўсходнеславянская дзяржава са сталіцай у Кіеве — Кіеўская Русь — была ўтворана ў 882 г. Неўзабаве гэтай дзяржаве былі падпарадкаваны і дрыгавічы.

У 885 г. кіеўскі князь Алег заваяваў і радзімічаў, вызваліўшы іх ад платы даніны хазарам і адначасова абклаўшы данінай на карысць кіеўскага князя. Аб'яднаныя сілы дзяржавы, у склад якіх уваходзілі таксама палачаны, дрыгавічы і радзімічы, на чале з князем Алегам у 911—912 гг. зрабілі вялікі паход на Царград. Усе плямёны, што хадзілі разам з Алегам пад сцены візантыйскай сталіцы, летапісец назваў Руссю. Пасля 944 г. дрыгавічы былі канчаткова далучаны да Кіеўскай дзяржавы і абкладзены данінай, а радзімічы адасобіліся ад дзяржавы.

У гэты час «з-за мора» прыбыў у Полацк вараг Рагвалод («Уладальнік рога»). Рог лічыўся сімвалам боскай улады. Магчыма, назва горада Рагачоў, які ўзнік каля 1142 г. пры ўпадзенні Друці ў Дняпро побач з паўднёвай мяжой Полацкага (Крыўскага) княства, таксама звязана з падобнымі ўяўленнямі.

Барацьба, якую ў 970 г. або 980 г. распачаў наўгародскі князь Уладзімір з полацкімі князямі, закранула і радзімічаў. Пасля паходу на ятвягаў у 984 г. кіеўскія дружыны на чале з ваяводам Воўчым Хвастом пайшлі падаўляць паўстаўшых радзімічаў, якія і былі разбіты на р. Пяшчань каля Прапошаска (Слаўгарад). Аднак барацьба радзімічаў за незалежнасць працягвалася яшчэ амаль 30 гадоў (да 1015 г.).

У старажытныя часы праз тэрыторыю Рагачоўшчыны праходзілі зручныя водныя шляхі. Адначасова шырокія рэкі былі перашкодай для набегаў хазараў, печанегаў (950—1030 гг.), полаўцаў (1020—1240). Праз некалькі гадоў пасля хрышчэння кіяўлян (палян), якое адбылося ў 988 г., хрысціянства прынялі дрыгавічы, потым радзімічы. Апошнія звесткі пра іх у летапісах сустракаюцца адпаведна ў 1149 і 1169 г.

У 11 стагоддзі паўночныя землі радзімічаў, у тым ліку і амаль уся сучасная тэрыторыя Рагачоўскага раёна, апынуліся ў складзе Смаленскага княства, а ў наступныя часы, калі Орша адышла да Полацка, увесь дняпроўскі шлях да Лучына кантраляваўся смаленскімі князямі. Паўночна-ўсходняя мяжа Тураўскага княства даходзіла да Дняпра ў раёне Рагачова.

У выніку далейшага развіцця гаспадаркі, парушэння яе натуральнага характару, стварэння мясцовых рынкаў, пэўнага адасаблення ўлады на месцах наступіў перыяд феадальнай раздробленасці.

У. Ф. Ісаенка, М. Н. Камароў.

Старонкі мінулага

Пры вывучэнні старажытных летапісаў, судовых і адміністрацыйных кніг перад намі паўстае шэраг цікавых падзей і лёсаў. На жаль, пісьмовыя крыніцы не даюць паслядоўнага асвятлення гісторыі Рагачоўшчыны, але і тыя асобныя звесткі, што захаваліся, з'яўляюцца каштоўнымі вехамі на цяжкім шляху даследчыкаў. Відавочна, што Рагачоўшчына была пастаянным месцам сутычак князёў смаленскіх, кіеўскіх, полацкіх, тураўскіх, чарнігаўскіх, межы ўладанняў якіх у розныя часы праходзілі па яе зямлі. У агні міжусобіц у канцы 10 — пачатку 11 ста-

годдзяў узнік Рагачоў — невялікае славянскае паселішча на ўзвышаным мысе ў сутоках Дняпра і Друці. Абедзве ракі ўтваралі цяжкадаступную забалочаную пойму, надзейна ахоўвалі паселішча з поўдня, усходу і захаду. З поўначы да паселішча сцяной падыходзілі сасновыя лясы. Недаступнасць Рагачова з поўначы забяспечвалі пракапаны ад Дняпра запоўнены вадой роў, высокі вал і драўляныя сцены. Асноўнымі заняткамі насельніцтва былі рамяство, паляванне, рыбалоўства, бортніцтва, земляробства і жывёлагадоўля. Зручнае становішча Рагачова на галоўнай гандлёвай артэрыі славян — Дняпры — садзейнічала тут развіццю гандлю. Па Дняпры праз Рагачоў ішлі зносіны Кіева і Чарнігава з Полацкам, Смаленскам, Ноўгарадам. Паводле меркавання акадэміка Б. Л. Рыбакова, Рагачоў быў адным з цэнтраў палюддзя, зімовым шляхам прыязджаў сюды вялікі кіеўскі князь для збору даніны, тут жа князь або яго баяры вяршылі суд і разглядалі спрэчкі паміж грамадзянамі.

У 1139 г. ў Кіеве на велікакняжацкі трон сеў Усевалад II Ольгавіч. У час яго княжання не спыняліся спрэчкі з пакрыўджанымі князямі, сярод якіх былі родныя браты Усевалада Ігар і Святаслаў. Яны імкнуліся сілай здабыць сабе ўдзел. Два месяцы спусташалі дружыны Ігара і Святаслава разам з чарнігаўскімі князямі Суздальскія і Пераяслаўскія землі. Як сведчыць Іпацьеўскі летапіс, каб спыніць міжусобіцу, Усевалад у 1142 г. звярнуўся да братоў з прапановай узяць ім сабе у маёмасць Гарадзец, Рагачоў, Брэст, Драгічын, Клецк. Гэты запіс і з'яўляецца першым пісьмовым упамінаннем пра Рагачоў. Тут жа адзначана, што Усевалад падараваў Рагачоў свайму брату князю Ігару.

Другое ўпамінанне Рагачова ў летапісных зборах адносіцца да 1180 г. У гэты час ішла барацьба кіеўскага князя Святаслава (сына Усевалада) з буйнымі рускімі княствамі Смаленскім, дзе княжыў Давыд Расціславіч, і Суздальскім на чале з Усеваладам Вялікае Гняздо. Імкнучыся нейтралізаваць свайго смаленскага саперніка, Святаслаў хацеў у саюзе з наўгародскімі, полацкімі, віцебскімі і іншымі саюзнымі дружынамі разбіць палкі Давыда Расціславіча каля Друцка, але Давыду ноччу ўдалося ўцячы з-пад Друцка ў Смаленск, тады Святаслаў «приступи ко Дрьютьску и пожьже острог», а сам «пойде к Рогачеву, из Рогачева поеха по Днепру к Кыеву». Такім чынам, Рагачову давялося выконваць ролю стратэгічнага пункта кіеўскага князя ў канфлікце са Смаленскай зямлёй.

Шэраг рускіх і савецкіх гісторыкаў (Сямёнаў, Рыбакоў, Сядоў) мяркуюць, што ў межах Рагачоўшчыны знаходзіўся і летапісны Лучын (упершыню ўпамінаецца ва ўстаўнай грамаце смаленскага князя Расціслава пад 1136 г.). Б. Рыбакоў лічыць, што Лучын быў пагранічным пунктам Смаленскай зямлі і ўзнік як калонія смаленскіх крывічоў. Паводле статута Расціслава Лучын плаціў смаленскаму князю мыта, прыбытак з карчмы, а паводле граматы аб «пагароддаі» смаленскаму епіскапу «три гривны урока, 2 лисицы и осетр». У 1172 г. ў Лучыне, паводле летапісных звестак, у смаленскага князя Рурыка Расціславіча нарадзіўся сын Міхаіл і ў памяць аб гэтай падзеі князь загадаў пабудаваць тут царкву святога Міхаіла і падараваў горад нованароджанаму.

Іншыя гісторыкі — Аляксееў, Галубоўскі, Барсаў — лічаць немагчымым знаходжанне Лучына на поўдзень ад Рагачова, таму што пералічаныя ва ўстаўнай грамаце Расціслава населеныя пункты знаходзяцца на поўдзень ад Лучына і на вялікай адлегласці. Версію Рыбакова, Сямёнава, Сядова пацвярджае той факт, што ў «Спісе гарадоў рускіх, блізкіх і далёкіх» Рагачоў і Лучын упамінаюцца паслядоўна адзін за адным.

Паводле звестак беларускага гісторыка Э. М. Загарульскага, які даследаваў гарадзішча каля в. Вішчын, горад Ваішчына, што ўпамінаецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1258 г. і быў спалены аб'яднанымі войскамі літоўцаў і палачан у час паходу на Смаленск, тое самае, што і вёска Вішчын. У 12—13 стагоддзях Рагачоў і ўсе землі на ўсход ад яго ўваходзілі ў Тураўскае і Пінскае княствы. У гэты час у межах Рагачоўшчыны з'явіліся дружыны літоўскіх князёў, вядома, што ў

Рагачоў, год 1142. Такім уяўляе свой родны горад у той час мастак У. І. Паладзенка.

1240—50 гг. Рагачоў быў пагранічным пунктам у Вялікім княстве Літоўскім. Правіў тут князь Арвід Доўмант, які па даручэнні свайго дзядзькі, вялікага князя літоўскага Міндоўга павінен быў з Рагачова сачыць за чарнігаўскімі і смаленскімі князямі. У 1250 г. з-за недарэчных прычын Міндоўг выгнаў Доўманта з Рагачова. Канчаткова пры Гедыміну ў канцы 13— пачатку 14 стагоддзя Рагачоўшчына ў складзе Пінскага княства ўвайшла ў Вялікае княства Літоўскае.

У пачатку 15 стагоддзя на Рагачоўшчыну пачалося пранікненне грэка-каталіцкай рэлігіі. У 1400 г. ў Рагачове літоўскай княгіняй Марыяй Вітольдаўнай была заснавана царква ў гонар святых Казьмы і Дзям'яна ордэна базыльян. Годам раней для канонікаў гэтага ордэна князь Вітаўт выдзеліў лепшыя землі на поўдзень ад Рагачова.

У сярэдзіне 15 стагоддзя Рагачовам, Клецкам і Пінскам валодала княгіня Ганна, жонка князя Васіля Яраславіча Серпухоўскага, якая збегла са сваім пасынкам, юным князем Іванам у Літву і выйшла замуж за князя Свідрыгайлу. Пасля смерці айчыма і маці ўдзел перайшоў князю Івану Васілевічу. У гэты час Маскоўскі цар Іван III спрабаваў адваяваць падняпроўскія землі. Пасланы на перагаворы з каралём Казімірам IV Ягелончыкам пасол Іван Беклемешаў застаў Казіміра пры смерці. У 1492 г. рускія войскі на чале з ваяводам Васілём Лапіным і Андрэем Істомай захапілі Рагачоў. З гэтага часу і на працягу ўсіх войн паміж суседнімі дзяржавамі Рагачоў пераходзіў то пад уладу Масквы, то Вялікага княства Літоўскага, а пазней Рэчы Паспалітай.

У 1499 г. вялікі князь літоўскі Аляксандр Казіміравіч пацвердзіў уладальніцкія правы Івана Васілевіча на Гарадок, Клецк і Рагачоў. У 1508 г. гэтыя гарады перайшлі ў валоданне сына Івана Васілевіча — Фёдара Іванавіча, які атрымаў ў якасці пасагу за жонкай Аленай яшчэ і Пінск. Каля 1509 г. пасля смерці Алены землі перайшлі да вялікага князя і толькі дзякуючы літасці новага караля Сігізмунда I яны былі пакінуты пажыццёва князю Фёдару Іванавічу.

У 1522—23 гг. усё Пінскае княства перайшло ва ўладанне жонкі польскага караля Сігізмунда I — каралевы Боны. Пачатак яе ўладальніцкіх правоў пакладзены яшчэ граматай Сігізмунда I у 1519 г. У знак асабістай любові і з жаданнем умацаваць становішча Боны кароль падараваў ёй Пінск, Клецк, Гарадок, Рагачоў. Але фактычна імі Бона стала валодаць толькі пасля смерці князя Фёдара Іванавіча ў 1520—21 гг. Пакуль афармляўся пераход да Боны уладанняў князя Фёдара Іванавіча, ўсімі землямі кіраваў староста берасцейскі, ковенскі, лідскі, маршалак дворны Юрый Іванавіч Ільініч, якому было даручана разабраць усе маёмасныя прэтэнзіі пасля смерці князя.

Удакладняліся межы, наладжвалася інтэнсіўная эксплуатацыя прыродных рэсурсаў і залежных сялян. Абапіраючыся на велікакняжацкае права на зямлю, Бона патрабавала ад уладальнікаў прад'явіць дакументы на зямельныя ўладанні. Хто іх не меў, траціў права на карыстанне зямлёй. Сілай Бона ліквідавала цераспалосіцу, а на лепшых угоддзях арганізавала фальваркі.

Больш за 30 гадоў кіравала Бона сваімі ўладаннямі, у тым ліку і Рагачовам. Каралева вызначалася ўладалюбствам і прагай кіпучай дзейнасці, сама ўнікала ва ўсе дробныя справы сваёй вялікай гаспадаркі. Яна адводзіла пасяленцам шматлікія маёнткі і за свой кошт будавала замкі ў пагранічных уладаннях, выкупляла трыманні і перапрадавала іх, імкнулася падняць прыбытковасць, зменшыць цяжар дзяржаўных павіннасцей. У выніку гэтай дзейнасці з'явіліся вялікія зямельныя ўладанні і прыбыткі. Верным яе памочнікам ва ўсіх справах быў пан Іван Міхайлавіч Харэвіч — дзяржаўца княства Пінскага, пісар, староста пінскі, клецкі, гарадзецкі, рагачоўскі, які кіраваў княствам каля 20 гадоў.

У 1535 г. ў час руска-літоўскай вайны Рагачоў быў разбураны, пасля чаго каралева Бона вырашыла паставіць тут паводле праекта італьянскага архітэктара замак. На яго будаўніцтва прыцягвалася навакольнае насельніцтва. Асаблівая ўвага звярталася на будаванне сцен. Тоўстыя бярвёны ўкладвалі двума паралельнымі радамі, паміж імі засыпалі зямлю і каменне. Зверху на сценах былі ўстаноўлены гарматы, спецыяльныя прыстасаванні для назірання за рухам непрыяцеля, кадзі з вадой для тушэння пажару. У выніку Рагачоўскі замак складаўся з комплексу мураваных будынкаў, драўляных сцен агароджы, абараняльнага рова з вадой, пад'ёмнага моста. У цэнтры комплексу стаяў палац — аднапавярховы прамавугольны ў плане будынак памерамі 21×14 м з мезанінам, накрыты гонтавым дахам. У палацы было 5 жылых пакояў, кухня, у мезаніне — 2 залы. Да палаца далучаўся службовы флігель, дом каноника, царква, гаспадарчыя будынкі. Уезд у замак быў афармлены двух'ярус-

най брамай. Перапіска Боны са служачымі дазваляе зрабіць вывад аб вялікай цікавасці каралевы да будаўніцтва замка ў Рагачове. Захаваліся і імёны ўпраўляючых замка: Міхто Якубовіч (1545), Павел Папяльжынскі (1548), Багдан Даўмат (1552), Мацвей Вайцаховіч (1555), Рыгор Бака (1556). Вядома, што ў замку быў рагавы аркестр.

Эканамічныя пераўтварэнні маёнткаў Боны працягваў яе сын кароль Сігізмунд II Аўгуст, які прыняў у 1557 г. «Уставу на валокі». На Беларусі была ўстаноўлена фальварковая сістэма гаспадаркі, канчаткова распалася сялянская абшчына, узмацніўся працэс эксплуатацыі сялян. Рагачоў перайшоў у склад каралеўскіх эканомій і адносіўся да Рэчыцкага, павета Мінскага ваяводства (рэформа 1565 г.). Рагачоўскім старостам у гэтыя часы кіравалі прадстаўнікі магнацкіх родаў — Стравінскія, Сапегі, Быкоўскія, Юдзіцкія, Агінскія, Нарашчынскія, Пацеі. Шмат зямель належала царкоўнікам і шляхце, якая перасялілася на Рагачоўшчыну з паўночных раёнаў Беларусі, занятых рускімі войскамі ў 1565—66 гг. у час Лівонскай вайны 1558—83 гг. У 1567 г. ў рэчыцкую харугву ўваходзілі шляхціцы з Рагачоўшчыны Багдан Валынец з в. Амяльная, Шчасны з в. Мазалаў, Іван Рубы з в. Шапчыцы, Барыс Весяловіч, Полка Гаскоўскі, Грышко Сысавіч, Бенядзікт Багдановіч з в. Кісцяні, Іванка Лукашоў з в. Слабада, Васько Анцута з в. Вішчын, Акул Сітковіч, Павел Кракоўскі з в. Старое Сяло, Сямён Савіч з в. Ходасавічы.

Да сярэдзіны 16 стагоддзя рэзка пагоршылася знешнепалітычнае становішча Вялікага княства Літоўскага. На ўсходзе яму пагражала Расія, на поўдні — крымскі хан. Неаднаразова маскоўскія войскі і крымскія татары ўрываліся ў межы княства: знішчалі яго гарады і вёскі. У 1562 г. яны разрабавалі і спалілі Рагачоў.

Люблінская унія, заключаная у 1569 г., аб'яднала Вялікае княства Літоўскае і Польшчу ў адзіную дзяржаву Рэч Паспалітую. Пасля Лівонскай вайны частка падняпроўскіх земляў перайшла ва ўласнасць каталіцкай царквы. У Рагачове быў пабудаваны касцёл. Узмацненне феадальна-прыгонніцкага прыгнёту выклікала абвастрэнне класавай барацьбы. У кастрычніку — снежні 1595 г. на поўдні і ўсходзе Беларусі адбыўся антыфеадальны бунт, ядром якога стаў украінскі казацкі атрад пад кіраўніцтвам Севярына Налівайкі. У снежні Налівайка ўзяў Магілёў. Супраць яго было выстаўлена 18-тысячнае войска, якое ўзначаліў рэчыцкі староста М. Буйвід. На Буйніцкім полі пад Магілёвам адбылася бітва. Налівайка адступіў на поўдзень у напрамку Быхава — Рагачова — Рэчыцы. Паводле «Баркулабаўскага летапісу», «Литва за козаками гналася аж до Рогачева, да ничого згола не вчинили козакам; а

Фрагмент карты Вялікага княства Літоўскага 1613 г. Гравёр Т. Макоўскі.

литва и татары рушилися до Менска, до Новагорода и во Вилни набравшися тутешнего краю лупу».

У час антыфеадальнай вайны 1648—54 гг. у чэрвені 1648 г. на Рагачоўшчыне з'явіліся тайныя пасланцы Багдана Хмяльніцкага, якія заклікалі народ да паўстання, а ў верасні тут адбыліся баявыя дзеянні. У 1654 г. ў час рускапольскай вайны Рагачоўскі замак быў узяты штурмам і спалены царскім войскам, а горад разбураны.

У 1696 г. рагачоўскі староста Казімір Пацей выдаў загад аб замацаванні веруючых за цэрквамі. Да замкавай царквы Раства Багародзіцы прыпісваліся частка Рагачова, вёскі Забалацце, Навозцы (цяпер Задруцце), Старое Сяло, Станькаў, Касцянье (цяпер Кісцяні), Шапчыцы, Званец, частка в. Збароў. Да царквы св. Казьмы і Дзям'яна прыпісваліся другая частка Рагачова, вёскі Касцяшоў, Заполле, Стрэнькі, Фядосавічы (цяпер Ходасавічы) і другая частка в. Збароў. У в. Лучын была свая царква. Прыхаджане павінны былі хрысціць дзяцей, уступаць у шлюб толькі ў сваёй царкве.

Войны 17 — пачатку 18 стагоддзяў, якія пракаціліся па тэрыторыі Падняпроўя, прывялі ў заняпад жыццё мясцовага насельніцтва. Грошы ў казне адсутнічалі, і было вырашана землі ў каралеўскіх эканоміях раздаць сялянам і абмежавацца грашовым і натуральным аброкам. Вызваленыя ад паншчыны сяляне змаглі ўзняць сельскую гаспадарку, і колькасць пустак да сярэдзіны 18 стагоддзя на Рагачоўшчыне скарацілася напалавіну. Абапіраючыся на адроджаную вёску, каралеўская казна ў сярэдзіне 18 стагоддзя пачала актыўна расшыраць фальварковую гаспадарку. У гэты час пачынаецца рост Рагачова. У 1730—40 гг. на паўночнай украіне горада пачалося будаўніцтва слабады для «вновь осаженных людзей». У 1743 г. прэсвітэру Рагачоўскай замкавай царквы Антонію было дазволена пабудаваць у новай частцы горада царкву св. Міхаіла Архангела для жыхароў слабады, а таксама бальніцу і школу для дзячка. Змяніўся і нацыянальны склад гарадскога насельніцтва. Да канца 18 стагоддзя каля 15 % гараджан складалі яўрэі, якія перасяліліся з Украіны і Польшчы.



План Рагачова. 1773 г. Рэканструкцыя маста-ка У. І. Паладзенкі.

Палітычныя інтрыгі і барацьба паміж магнатамі прывялі Рэч Паспалітую пад канец 18 стагоддзя да эканамічнага і палітычнага крызісу. Аслабленне Вялікага княства Літоўскага і Польшчы выкарысталі Расія, Прусія, Аўстрыя, якія падзялілі паміж сабой тэрыторыю Рэчы Паспалітай.

Паводле 1-га падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. да Расіі адыходзілі паўднёва-ўсходнія і ўсходнія беларускія землі, у тым ліку і частка сучаснай тэрыторыі Рагачоўскага раёна. Граніца праходзіла па левым беразе Друці. Для ўсталявання ўлады на новых тэрыторыях ад Расійскага ўраду патрабаваліся меры адміністрацыйнага і эканамічнага характару. У сувязі з гэтым для кіравання беларускімі землямі было ўтворана асобнае генерал-губернатарства, у якое ўвайшлі Пскоўская і Магілёўская губерні. Рагачову быў нададзены статус правінцыяльнага горада. Тут была арганізавана новая структура ўлады: правінцыяльная канцылярыя на чале з правінцыяльным камісарам і ў складзе ваяводы, павятовага камісара, пракурора, правінцыяльнага сакратара. Улічваючы пагранічнае становішча, ў Рагачове была адкрыта мытная кантора, у якой працавалі чыноўнік і касір.

Новая адміністрацыя пачала работу з інвентарызацыі зямель. Землі і вёскі, якія належалі польскай кароне, пераходзілі пад юрысдыкцыю Расійскай дзяржавы, спадчынныя землі пакідаліся іх уладальнікам. Па выніках інвентарызацыі былі складзены карты далучаных да Расіі зямель, падушныя спісы для абкладання падаткамі.

У канцы жніўня 1772 г. рагачоўцы прымалі прысягу на вернасць імператрыцы. Дваране і духавенства, якія не пажадалі прымаць прысягу, выязджалі за мяжу, тым жа, хто прысягнуў, прадастаўляліся правы і прывілеі расійскага дваранства. Галоўнай сілай супраць правядзення расійскай палітыкі ў краі былі кляштары.

Указамі імператрыцы Кацярыны II новыя тэрыторыі на год былі вызвалены ад падаткаў, якія ўпершыню спаганяліся за другую палавіну 1773 г. ў наступных памерах: пагалоўны па 35 капеек, за вінны продаж па 10 капеек з асобы, у гарадзе ж вінны збор устанаўліваўся ў памеры 60 капеек з асобы. Падаткі пастаянна раслі. Так, у 1780 г. яны складалі: падушны з сялян 35 капеек, за вінны продаж 20 капеек, з мяшчан 60 капеек, за вінны продаж па 1 рублю з асобы ў горадзе, у мястэчках 50 капеек. Падушныя падаткі з яўрэяў спаганяліся ў памеры 50 капеек.

У гэтыя ж гады ў Рагачове быў арганізаваны продаж казённай солі, якую прывозілі сюды са Смаленска па Дняпры. Кошт яе складаў 50 капеек за пуд.

У 1781—89 гг. для продажу солі планавалася пабудаваць цагляны саляна-агульнанаправіянтны магазін. Падрадчыкам купцом Іванам Аржыцкім былі падрыхтаваны неабходныя матэрыялы, падабраны майстры, але па віне магілёўскага архітэктара В. Паўлава, які не прадставіў план будаўніцтва, магазін так і не быў пабудаваны.

Уяўленне пра горад Рагачоў таго часу дае апісанне чыноўніка Гаўрылы Дабрыніна: «У пустым замку, які парос травой, размешчана уніяцкая царква, пасярод горада на пясчаным беразе другая, на ўзвышаным беразе Дняпра — базыльянскі драўляны стары кляштар і батальённая малая царква, якая нагадвае драўляны свіран з акном. Усе гэтыя публічныя будынкі бедныя і старыя. Адны толькі краявіды, ландшафты даюць перавагу Рагачову перад іншымі».

У 1776 г. ў Рагачове адкрыта паштовая кантора, для якой быў пабудаваны новы тыпавы будынак, а першым паштмайстрам быў прызначаны Адам Алберг. Праз два гады замест канторы створана паштовая экспедыцыя, у штаце якой былі пісар і паштальён.

У выніку адміністрацыйнай рэформы 1777 г. Рагачоў страціў статус цэнтра правінцыі і стаў павятовым горадам Магілёўскай губерні. У 1780 г. ў Рагачове было 326, а ў павеце — 26 323 жыхары. Даўжыня граніц павета складала 707 вёрст, і да яго прыпісвалася 39 вёсак і мястэчкі Карма, Чачэрск, Шарсцін. У 1780 г. павет наведала імператрыца Кацярына II.

У 1778 г. быў зацверджаны план развіцця і будаўніцтва Рагачова. Аснову планіроўкі складала прамалінейная сетка вуліц. Планавалася пабудаваць 2 плошчы. Адна з іх, цэнтральная, прызначалася для службовых месцаў і гасцінага двара. Другая адводзілася для кірмашоў, гандлю харчовымі прыпасамі, фуражом, для складскіх памяшканняў, хлебных і саляных магазінаў, гаўптвахты, цэйхгаўза. У горадзе планавалася пабудаваць грэчаскую царкву, новы каталіцкі касцёл, мост цераз Дняпро, абнесці яго валам і акапаць ровам.

16 жніўня 1781 г. зацверджаны герб Рагачова — чорны бараноў рог на залатым полі. 15 лютага 1789 г. Кацярына падпісала ўказ «Аб умацаванні гарадоў Магілёўскай губерні, у якім генерал-інжынеру і кватэрмайстру Боўру прадпісвалася пабудаваць ў Рагачове крэпасць. Былі складзены планы будаўніцтва, пачаты падрыхтоўчыя работы, але будаўніцтва крэпасці так і не пачалося. Магчыма, адной з прычын быў 2-і падзел Рэчы Паспалітай у 1793 г. і страта Рагачовам свайго стратэгічнага становішча. У 1796 г. межы Рагачоўскага павета перагледжаны і колькасць яго насельніцтва склала 41 859 чалавек.

У 1791 г. на тэрыторыі Рагачоўшчыны, якая яшчэ належала Рэчы Паспалітай, каля в. Азярышча, пры мясцовым каталіцкім кляштары адкрыта школа. У ёй працавалі настаўнікі і ксёндз, а вучыліся дзеці шляхты.

У пачатку 19 стагоддзя Рагачоў — невялікі горад, насельніцтва якога ў асноўным складалі рамеснікі, тут было некалькі цэркваў, касцёлаў, крам, некалькі дзесяткаў дамоў, у 1810 г. працавалі павятовае вучылішча і пры ім інстытут Воўка-Ланеўскага «для выхавання Рагачоўскага павета беднай акольнічай шляхты дванацаці дзяцей».

Паступова ў жыццё павета і горада пранікалі новыя эканамічныя адносіны. Памешчыкі пашыралі пасяўныя плошчы за кошт узорвання пустак і асушаных балот, павялічылі пасевы бульбы, гадавалі танкарунных авечак, воўну з якіх прадавалі ў расійскія губерні. У пачатку 19 стагоддзя ў Рагачове з'явілася жалезная мануфактура. Раслі гандлёвыя сувязі з іншымі гарадамі. Чатыры разы на год праводзіліся кірмашы, на якія з'язджаліся купцы з Магілёва, Смаленска, Рослава і іншых гарадоў.

Цяжкім выпрабаваннем для жыхароў Рагачоўскага павета было напалеонаўскае нашэсце ў 1812 г. У межах павета дыслацыраваліся перадавыя часці другога рэзервовага корпуса пад камандаваннем генерала Ф. Ф. Эртэля, які прыкрываў ад пранікнення напалеонаўскіх войск на Украіну. Воіны 3-га Бутскага палка пад камандаваннем падпалкоўніка Кляноў-

скага не толькі трымалі абарону, але нападалі на ар'ергардныя атрады Напалеона, што рухаліся праз Прапойск на Маскву, знішчалі атрады французскіх марадзёраў. Сутычкі з імі былі ў вёсках Журавічы, Карма, Рыскова, Гарадзец, Гарадзілавічы і іншых. Больш за 2 месяцы дыслацыраваліся ў раёне Чачэрска атрады падпалкоўніка Кляноўскага, адбівалі атакі праціўніка, наносілі яму вялікія страты. Вайна 1812 г., неўраджаі і голад 1813, 1818, 1820—22 гг. прывялі ў заняпад гаспадарку краю.

Паводле статыстычных звестак за 1825 г. у Рагачове было 1635 жыхароў, з іх 841 мужчынскага полу, 1 мураваны будынак, 269 драўляных, 3 царквы, кляштар, навучальная ўстанова, 35 шынкоў, піцейных дамоў, рынак, лазня, 2 гарадскія сады.

У 1832 г. ў Рагачове кватаваў 1-ы конна-піянерскі эскадрон на чале з палкоўнікам князем Гагарыным, для размяшчэння якога быў пабудаваны ваенны гарадок, цэйхгаўз, манеж, стайні на 400 коней, свірны. Будаўніцтва каштавала 26 563 рублі.

У 1-й палавіне 19 стагоддзя ў межах Рагачоўскага павета пракладваліся Маскоўска-Варшаўскі і Пецярбурга-Кіеўскі шашэйныя шляхі. Іх будаўніцтва прынесла шмат праблем мясцоваму насельніцтву. Калі Пецярбургска-Кіеўскі шлях амаль не закрануў населеныя пункты, практычна не патрабаваў зносу будынкаў, скасаваў толькі частку сялянскіх зямель, то будаўніцтва Маскоўска-Варшаўскага шляху многім прынесла разбурэнне. У прашэнні жыхароў Рагачова на імя магілёўскага губернатара ад 31 мая 1850 г. адзначана: «...Для будаўніцтва ў Рагачове шашы дамы нашы з пабудовамі ацэнены на злом: Пракапенкі — у 145 рублеў, Гадодава — у 218 рублёў, Зэльманава — у 149 рублёў і Гліоса ў 132 рублі серабром і вашым правасхадзіцельствам яшчэ ў мінулым годзе зацверджаныя, але не задаволіўшыя нас ацэначная сумай... у мінулым красавіку месяцы... дамы нашы з пабудовамі зламаны. Цяпер не маем ніякіх сродкаў на будаўніцтва іх і матэрыялы падвяргаюцца крадзяжу...»

У 1833—35 гг. праводзіліся работы па рамонту плацін і мастоў, якія выканаў спецыяльны атрад шляхоў зносін пад камандаваннем капітана Сынчэўскага, потым маёра Адамава. За гэты час былі пабудаваны паромы, кожны 4 сажні ў даўжыню, 6 — у шырыню, грузападымальнасцю 1000 пудоў. Новая пераправа, на думку сучаснікаў, лічылася лепшай у губерні, не спыняла сваёй работы нават у час веснавога разводдзя (выключэннем быў 1845 г.). Паміж Друцкай і Дняпроўскай пераправай была пабудавана плацінадаўжынёй 1320 сажняў, шырынёй 4 сажні, вышынёй 7 футаў. На гэтай плаціне было 6 мастоў. Паромныя пераправы знаходзіліся ў веданні гарадской паліцыі, і ўвесь даход ішоў у гарадскую казну. Будаўніцтва Варшаўскай шашы спрыяла росту Рагачова. У 1847 г. тут было 6 казённых дамоў (1 мураваны), 306 прыватных, 45 крам, 2 царквы, пажарная каланча, паштовая станцыя, бальніца на 20 месцаў, у якой працавалі павятовы, гарадскі ўрачы, бабка-павітуха. Гораду належала 3467 дзесяцін зямлі, насельніцтва было 1432 чалавекі, з іх 255 ваенных. У 1847 г. прыход гарадскога бюджэту склаў 1560 руб. 59 1/4 кап., расход — 1159 руб. 46 1/4 кап. Вялікая частка расходаў ішла на аплату кіраўніцкага апарату. У маёнтках і фальварках узнікалі мануфактуры. У 1826 г. ў павеце было 79 вінакурных заводаў, 3 з якіх належалі духавенству, 3 — казне, астатнія — памешчыкам. Да 1850-х гадоў узніклі буйныя цукровыя заводы у фальварках Наспа і Астэрманск. У фальварку Наспа, які належаў памешчыку В. В. Іолшыну, на цукровым заводзе працавала 15 печаў. За 1859 г. тут было выраблена 342 пуды цукровага пяску на суму 1881 рубель. На заводзе працавалі 1 майстар-фін і 1 падмайстар, 120 чорнарабочых з прыгонных сялян. Прадукцыю збывалі ў Рагачове і ў павеце. Яшчэ большым быў цукровы завод князя Галіцына ў фальварку Астэрманск. Тут працавалі 172 прыгонныя селяніны. Выпрацоўваў завод 1200 пудоў цукровага пяску штогод, які гаспадар збываў у Маскве па 5 рублёў серабром за пуд.

Развіваўся гандаль на мясцовых кірмашах, прадметам якога былі вырабы і прадукты сялянскіх гаспадарак. Да сярэдзіны 19 стагоддзя ў павеце праводзілася 5 кірмашоў на год у мястэчках Жлобін, Чачэрск, Ціхінічы, Гарадзец. Галоўнымі прадметамі гандлю былі тканіны, посуд, галантарэя, цукар, соль, коні. У мястэчку Журавічы адбываліся 4 кірмашы на год. Пабольшала значэнне Рагачова як прыстані на Дняпры, да якой швартаваліся купецкія судны. З Рагачова на поўдзень, у Кіеў і Нікалаеў сплаўляліся лес, смала, гарэлка, пянька, воўна. Развіваўся і сам горад, да 1862 г. ён стаў адным з буйнейшых у Магілёўскай губерні і налічваў 2504 жыхары, з якіх 83 купцы. У горадзе было 89 крам, 2 гасцініцы, 4 заезныя дамы. Асноўным

заняткам насельніцтва былі промыслы. Хлебнікаў і булачнікаў у горадзе было 22, мяснікоў — 37, краўцоў — 93, шаўцоў — 47, шапачнікаў — 15, печнікоў — 14, сталяроў — 14, кавалёў — 10, слесараў — 3, гадзіншчыкаў — 3, канавалаў — 2. Прамысловых прадпрыемстваў у горадзе амаль не было, і работы хапала не ўсім. Многія гараджане ў пошуках заробку пакінулі родныя месцы. Так, у 1861 г. гарадской управай было выдадзена 360 пашпартоў на «адлучку».

Сярод сельскага насельніцтва павета пераважала прыгоннае сялянства, якое цярпела ад частых неўраджаяў і скарачэння пасеваў. Хваробы, цяжкая праца, адсутнасць кармоў прыводзілі да падзяжу жывёлы, што яшчэ больш разарала сялянства. Некаторыя памешчыкі імкнуліся ўводзіць больш прагрэсіўныя метады вядзення сельскай гаспадаркі — 4-польную сістэму земляробства, выкарыстанне тэхнічных сродкаў, але такіх было мала. Сельская гаспадарка прыйшла ў заняпад.

У 1861 г. ў Рагачоўскім павеце было 356 вёсак (12 220 двароў), ворнай зямлі 174 923 дзесяціны, 156 тысяч коней, 214 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, 16 тысяч простых і 22 тысячы танкарунных авечак, 200 тысяч свіней, 2 тысячы коз. Каб падняць гаспадарку, асабліва сялянскую, неабходна было хутка развіваць новыя капіталістычныя адносіны. Гэтаму перашкаджала прыгоннае права.

У час паўстання 1863—64 гг. у Польшчы, Літве і на Беларусі на тэрыторыі Рагачоўскага павета дзейнічалі і паўстанцкія атрады. Адзін з такіх атрадаў у красавіку 1863 г. арганізаваў і ўзначаліў Тамаш Міхайлавіч Грыневіч (нарадзіўся ў 1815 г., уладальнік маёнтка Верхняя Тошчыца, цяпер у Быхаўскім раёне), які быў схоплены карнікамі і расстраляны ў Рагачове 28.7.1863 г.

Рэвалюцыйная сітуацыя канца 1850 — пачатку 1860-х гадоў, абумоўленая крызісам феадальна-прыгонніцкай сістэмы і зараджэннем капіталістычных адносін, вымусіла царызм у 1861 г. адмяніць прыгоннае права. Сялянская рэформа не ліквідавала шматлікіх перажыткаў прыгону, але стала паваротным пунктам у гісторыі Расійскай імперыі. Капіталізм пачаў актыўна ўрастаць у эканоміку Беларусі, у тым ліку яе маленькага кутка Рагачоўшчыны. І хоць новыя адносіны ўкараняліся марудна, спыніць гэты працэс было немагчыма, з года ў год ён станавіўся ўсё больш прыкметным.

У вёсцы ішло расслаенне сялянства, большая частка якога працягвала весці натуральную гаспадарку і вельмі марудна ўцягвалася ў таварна-грашовыя адносіны. У земляробстве па-ранейшаму панавала трохпольная сістэма севазвароту, невялікая колькасць жывёлы і пасрэднасць яе пароды не давалі сялянам магчымасці прымяняць угнаенні, а новыя прылады працы — плуг і жалезныя бароны — з'явіліся ў сялянскай гаспадарцы толькі ў пачатку 20 стагоддзя.

У адрозненне ад сялянскіх большасць памешчыцкіх і заможных гаспадарак давалі ўладальнікам пастаянныя прыбыткі. Гэтаму садзейнічала вялікая колькасць зямлі, добрая яе апрацоўка ўдасканаленымі прыладамі працы, прагрэсіўныя сістэмы севазвароту, выкарыстанне ўгнаенняў і больш якаснага насення. Найбольш спрыяльнымі ўмовы для развіцця гаспадаркі былі ў тых памешчыкаў, якія імкнуліся арганізаваць у сваіх маёнтках дапаможныя вытворчасці, а прадукцыю пастаўляць у вялікія гарады. Асноўным такім прадуктам было сметанковае масла.

Атрымалі распаўсюджанне палавінная і арэндная гаспадаркі. У першым выпадку ўладальнікі здавалі ў арэнду маёнткі з умовай, што гаспадарку будзе весці арандатар па ўказанню самога ўладальніка, а ўраджай будзе дзяліцца на дваіх. У другім выпадку гаспадарка здавалася на некалькі гадоў у арэнду за плату. У пачатку 20 стагоддзя прыкметна скарацілася дваранскае землеўладанне. Галоўнымі земляробчымі культурамі на Рагачоўшчыне па-ранейшаму заставаліся жыта, яравая грэчка і пшаніца. Нязначная колькасць памешчыкаў сеяла азімую пшаніцу. Высокі ўраджай давалі лён і каноплі, таму ў Рагачоўскім павеце былі самыя вялікія плантацыі гэтых культур ва ўсёй губерні. Паводле статыстычных звестак за 1900 г. сярэдні ўраджай жыта ў павеце склаў 4 $^{1}/_{8}$ пуда, аўса — 9 $^{3}/_{4}$, ячменю — 4, грэчкі — 1 $^{1}/_{2}$, бульбы — 50 $^{1}/_{6}$, сена атрымалі па 112 пудоў з дзесяціны.

Паступова развівалася жывёлагадоўля як малочнага, так і мясамалочнага кірункаў. Некаторыя памешчыкі гадавалі авечак, усюды была пашырана свінагадоўля. Паводле статыстычных звестак за 1900 г. у павеце было 34 368 коней, 63 876 галоў буйной рагатай жывёлы, 53 679 авечак, 39 258 свіней, 1021 каза.

Былі пашыраны пладаводства і пчалярства. Вырашчаную садавіну адпраўлялі на продаж у Маскву, Пецярбург, Рыгу, Кіеў і іншыя гарады.

У канцы 19 — пачатку 20 стагоддзя губернскае і павятовае кіраўніцтва шмат рабіла для развіцця сельскай гаспадаркі, асабліва сялянскай. Прапагандавалася

травасеянне, арганізоўваліся выставы, распродаж жывёлы і насення. Значную ролю ў гэтым адыграла Рагачоўскае павятовае сельскагаспадарчае таварыства, створанае ў 1897 г. Яно аб'ядноўвала памешчыкаў, арандатараў, сялян. У 1898 г. таварыства арганізавала ў Доўску выставу жарабцоў, на якой было прадстаўлена каля 170 экземпляраў. З іх больш як 50 былі адзначаны медалямі і прэміямі ў памеры 20, 15, 10 і 5 рублёў. Сярод сярэбраных прызёраў 4 жарабцы належалі сялянам. Рагачоўскае сельскагаспадарчае таварыства неаднаразова прызнавалася лепшым у губерні.

Між тым частка сялян не магла выкупіць патрэбную для існавання колькасць зямлі і спрабавала знайсці лепшую долю на новых месцах. У 1900 г. 493 сям'і хадайнічалі аб дазволе на пераезд у Сібір, 265 з іх такі дазвол атрымалі. У 1907 г. з 2111 сем'яў дазвол на пераезд атрымалі 1632. Некаторыя з іх вярталіся ў родныя мясціны, не знайшоўшы шчасця за Уральскімі гарамі, у 1907 г. такіх сем'яў было 19.

Паступова капіталістычныя адносіны развіваліся ў прамысловасці. У 1881 г. ў Рагачоўскім павеце былі запалкавы, 7 дзягцярных, 2 гарбарныя, цагельны, шкляны, шкіпінарны, вапнавы заводы, у 1899 г.— 2 крухмальныя заводы, 9 гарбарных, 3 сукнавальні, 3 сенапрасавальні, 3 паравыя млыны. Паступова развівалася прамысловасць у Рагачове. У 1864 г. ў горадзе было 24 мануфактуры, 5 гарбарных, 5 маслабойных, 4 цагельныя, ганчарны заводы, 4 бровары, 5 крупадзёрак. У 1880 г. колькасць прадпрыемстваў у Рагачове скарацілася да 10, на іх працавала 7 майстроў і 26 рабочых. Штогод тут выраблялася прадукцыі на 8175 рублёў. У 1880 і ў 1897 г. ў Рагачове былі адкрыты друкарні, якія праіснавалі да 1913 г. У 1886—1913 гг. і ў 1890—98 гг. існавалі 2 прадпрыемствы па вырабу канатаў. Найбольш буйным прадпрыемствам быў лесапільны завод уладальнікаў В. Грэшнера і А. Міняева. Тут працавалі 31 майстар і 49 рабочых. Напярэдадні 1-й сусветнай вайны ў горадзе было 7 хлебапякарняў (16 рабочых), 3 заводы фруктовых водаў (6 рабочых), 4 цагельні (26 рабочых), 2 каўбасныя заводы (8 рабочых), 2 гарбарні (4 рабочыя), 4 крупадзёркі (4 рабочыя), 2 шкіпінарныя заводы (3 рабочыя), пральня (2 рабочыя). Акрамя таго ў горадзе былі 4 млыны. У 1900 г. ў Рагачове працавала 520 рамеснікаў, у павеце — 7957. Развіваўся гандаль. У 1866 г. ў Рагачове былі 2 купцы першай і 26 купцоў другой гільдыі, працавалі 84 гандлёвыя крамы. Да 1883 г. колькасць крам у горадзе павялічылася да 115, іх гандлёвы гадавы тавараабарот складаў 245 тысяч рублёў. Да гарадской прыстані ў 1883 г. прычаліла 70 караблёў і 300 плытоў. Агульны кошт вывезенага і прывезенага тавару склаў 110 тысяч рублёў. Галоўнымі прадметамі гандлю былі пянька, ільняное семя, ільняная саломка. У асноўным яны вывозіліся ў Рыгу. У паўднёвыя раёны Расіі вывозіліся будаўнічы лес і лесапрадукты. З 1880 г. ў горадзе наладжваліся 3 трохдзённыя кірмашы з тавараабаротам да 5 тысяч рублёў, 5 кірмашоў праводзілася ў павеце, на іх прадавалася тавараў на 6 тысяч рублёў.

У 1890 г. ў Рагачове было 18 мануфактурных, 1 галантарэйная, 8 бакалейных крам, 6 крам гандлявалі металічнымі вырабамі, 2 — мукой, хлебам, лёнам, 3 — харчовымі таварамі, 17 — гарэлкай і віном, акрамя таго, 71 крама гандлявала рознай дробяззю, 110 гандляроў мелі свае латкі.

Хуткае развіццё горада пачалося ў пачатку 20 стагоддзя пасля пабудовы ў 1902 г. чыгункі Магілёў — Жлобін. Палепшылася становішча з пасажырскімі перавозкамі. Два разы на дзень у Рагачоў прыбывалі пасажырскія саставы з Пецярбурга і Кіева. У летні час па Дняпры параходы з Рагачова адпраўляліся ў Оршу, Магілёў, Кіеў.

У пачатку 20 стагоддзя ў Рагачове павялічылася значэнне банкавага капіталу. Галоўную ролю ў банкаўскай справе адыгрывалі банкіры браты Тумаркіны. Акрамя таго ў горадзе дзейнічала таварыства ўзаемнага крэдыту, страхавое агенцтва, канторы розных банкаў.

Паступова расло насельніцтва Рагачова і павета. У Рагачоўскім павеце, тэрыторыя якога складала 6546,1 квадратнай вярсты, насельніцтва было 121 637 чалавек. Да 1897 г. насельніцтва павялі-

Сялянская хата на Рагачоўшчыне. Канец 19 стагоддзя.

чылася амаль удвая і складала 224 652 чалавекі. Рагачоўскі павет быў другім па велічыні ў Магілёўскай губерні, 73 % насельніцтва складалі сяляне, каля 16 % — вайскоўцы, каля 16,5 % — мяшчане, 1,3 % — дваране. Паводле веравызнання склад насельніцтва быў наступны: праваслаўных 83,2 %, іудзеяў 12 %, католікаў 3 %, раскольнікаў 1,5 %, лютэран 0,3 %.

Разам з паветам рос і Рагачоў. У 1864 г. тэрыторыя горада склала 2668 дзесяцін, насельніцтва было 4106 чалавек, у 1866 г.— 6136 чалавек, у 1900 г.— 11 тысяч чалавек, у 1916 г.— 25 тысяч чалавек. У 1866 г. ў горадзе налічвалася 354 прыватныя дамы, з якіх 2 мураваныя, у 1903 г.— 1375 дамоў, з іх 22 мураваныя. Забудова Рагачова вялася ў міжрэччы Дняпра і Друці. Пасля таго, як праз год была пракладзена чыгунка, пачалася забудова новай тэрыторыі, так званых «новых планаў». Участак знаходзіўся ў сасновым бары за чыгуначнай лініяй, таму раён сярод гараджан атрымаў назву залінейнага. Забудова цэнтра вялася пераважна аднапавярховымі драўлянымі і мураванымі дамамі. Сярод збудаванняў сваімі архітэктурнымі асаблівасцямі вылучаліся царква Аляксандра Неўскага, касцёл Святога Антонія, прыватныя дамы Беленькага, Іолшына, Спірыдонава, комплексы будынкаў рэальнага вучылішча і настаўніцкай семінарыі. Цэнтр горада быў забрукаваны, тратуары вымашчаны пліткамі з чэсанага вапняку або з дошак. Адной з галоўных гарадскіх славутасцей была набярэжная — улюбёнае месца адпачынку гараджан. Некалькі дзесяткаў фурманаў перавозілі жыхароў у розныя канцы горада, уначы вуліцы і плошчы ў цэнтры горада асвятляліся газавымі ліхтарамі. У пачатку 20 стагоддзя ў Рагачове было каля 10 гасцініц і мэбляваных пакояў з гучнымі назвамі «Брыстоль», «Новы свет», «Кантынент», «Рыга», «Савоя». Акрамя таго тут было некалькі пастаялых двароў, заезаных дамоў.

У 1879 г. ў Рагачове была адкрыта дзіцячая бальніца, у 1881 г. тут ужо існавала гарадская бальніца на 10 ложкаў, у якой працавалі 2 урачы, фельчар, павітуха. У сельскіх бальніцах павета працавалі 4 урачы, 9 акушэрак, 5 дантыстаў, у павеце былі 2 аптэкі. Медыцынскія пункты былі ў настаўніцкай семінарыі і вайсковай часці.

Шмат разбурэнняў прынеслі гораду пажары 1879 г. (страты склалі 475 рублёў). Самы разбуральны для Рагачова пажар адбыўся 13 жніўня 1881 г., страты ад яго склалі 129 870 рублёў. Згарэла тры чвэрці гасцінага двара, 88 крам з таварамі. Пасля пажараў 1879 г. была створана гарадская пажарная часць з 6 штатных работнікаў, у 1900 г. ў ёй ужо быў 21 работнік. З 1894 г. ў Рагачове існавала таварыства страхавання ад агню.

З 1875 г. на Рагачоў, як і на іншыя гарады Расійскай імперыі, пашырылася гарадавое права, у адпаведнасці з якім гарадская ўлада, пытанні народнай адукацыі, добраўпарадкавання перадаваліся гарадской думе, выбранай усімі плацельшчыкамі падаткаў. Дума выбірала гарадскую ўправу і гарадскога галаву. Іх дзейнасць была абмежавана правам «вета» з боку губернатара. Рагачоўскі павет падзяляўся на 4 станы, якія ў сваю чаргу падзяляліся на 14 валасцей. На чале павятовай улады стаяў павятовы прадвадзіцель дваранства, мясцовае кіраўніцтва ажыццяўляў павятовы спраўнік.

Ажыццяўленне мер па добраўпарадкаванню, утрыманню школ і бальніц, устаноў культуры патрабавала значных сродкаў, якіх, як правіла, не хапала. У гэтым выпадку на дапамогу прыходзілі мецэнаты. Адным з прыкладаў мецэнацтва ў Рагачове была дзейнасць прадвадзіцеля павятовага дваранства Васіля Васі-

Рагачоў, вуліца Быхаўская. Фота пачатку 20 стагоддзя.

левіча Іолшына і яго жонкі Варвары, якія завяшчалі гораду ўсе свае сродкі. На іх грошы ў Рагачове былі пабудаваны рэальнае вучылішча, тэатр, багадзельня. У іх уласным доме быў размешчаны гарадскі клуб, гасцініца. Удзячныя рагачоўцы назвалі ў гонар Іолшыных адну з вуліц горада (цяпер вуліца Цымермана). Мецэнацтвам займаліся і іншыя багатыя гараджане — Дрыбенцы і Глухаўцы.

У 1866 г. ў Рагачове былі дваранскае пяцікласнае павятовае вучылішча, аднакласнае прыходскае вучылішча, жаночы прыватны пансіён, казённае яўрэйскае вучылішча першага разраду. У 1878 г. адкрыта трохкласнае гарадское вучылішча. З 1880-х гадоў пачалося масавае адкрыццё царкоўнапрыходскіх школ ва ўсіх вацэ царкоўнапрыходскіх школ ва ўсіх валасцях павета. У гэтых школах вывучалі Закон Божы, іншыя царкоўныя прадметы, а таксама пісьмо, чытанне і арыфметыку. Найбольш буйныя школы былі ў Ціхінічах, Побалаве, Свержані, Азяранах, Гарадцы. Існавалі школы, адкрытыя на сродкі Міністэрства народнай адукацыі, а таксама земстваў. Земскія школы былі ў Забалацці, Лучыне, Мадоры і Крыўску. Некаторыя школы мелі бібліятэкі. Да канца 19 стагоддзя ў павеце (Рагачоў, Жлобін, Буда-Кашалёва) з'явіліся вышэйшыя пачатковыя вучылішчы, дзе выкладаліся алгебра, геаметрыя, фізіка, гісторыя, прыродазнаўства. У 1898 г. ў павеце было 40 школ Міністэрства народнай адукацыі, 18 царкоўнапрыходскіх школ, 199 школ пісьменнасці, у якіх вучылася 7578 хлопчыкаў і 729 дзяўчынак. У сярэднім на 930 жыхароў павета прыпадаў 1 настаўнік. Паводле перапісу 1897 г. 13,3 % насельніцтва Рагачоўскага павета было пісьменным, у Рагачове пісьменных было 45,2 %. У 1907 г. ў Рагачове адкрыта рэальнае вучылішча, у старэйшых класах якога вывучаліся механіка, сталярная справа. Вучні, якія закончылі вучылішча, маглі паступаць у тэхнічныя, гандлёвыя, прамысловыя навучальныя ўстановы. У 1915 г. ў вучылішчы было 266 вучняў. У 1906 г. ў Рагачове існавала жаночая сямікласная гімназія, пераўтвораная з прыватнага жаночага пансіёна Марыі Васілеўны Аніськовай. У гімназіі навучалася 181 гімназістка, выкладаліся арыфметыка, геаметрыя, алгебра, гісторыя, геаграфія, руская, англійская, французская мовы, касмаграфія, фізіка, рукадзелле. 1 ліпеня 1909 г. ў Рагачове была адкрыта настаўніцкая семінарыя, якая рыхтавала настаўнікаў для пачатковых вучылішчаў, у канцы 1890 г. пачала дзейнічаць першая прыватная бібліятэка Я. Б. Вальфсона, у 1900 г.— першая бясплатная бібліятэка-чытальня пры павятовым камітэце апякунства аб народнай цвярозасці, якое праводзіла вялікую культурна-асветную работу. У 1900 г. апякунства наладзіла 14 народных чытанняў, 2 тэатральныя паказы. Асветную работу вялі і навучальныя ўстановы. Іх бібліятэкі былі адкрыты для ўсіх жадаючых. Акрамя таго, у нядзелю і ў святы выкладчыкі праводзілі літаратурныя і навуковыя чытанні. Паводле звестак за 1900 г., у павеце такіх мерапрыемстваў было праведзена 309 з колькасцю слухачоў 22 329 чалавек.

Да 1914 г. ў горадзе былі 2 бібліятэкі, 2 кнігарні, працаваў музычна-драматычны гурток. У Рагачоў рэгулярна прыязджалі на гастролі перасоўчныя тэатры і цыркавыя трупы. Прыкметны зрух у культурным жыцці горада адбыўся пасля таго, як быў пабудаваны гарадскі тэатр, у якім праводзіліся і кінасеансы.

Жыхары горада выпісвалі перыядычныя выданні. Самымі папулярнымі былі «Биржевые ведомости» (208 экземпляраў), «Свет», «Сын Отечества», «Могилёвские губернские ведомости» (96 экземпляраў). Сярод перыёдыкі, якую выпісвалі рагачоўцы, было 11 замежных выданняў. Дзве рагачоўскія прыватныя друкарні выпускалі паштоўкі з відамі горада.

У горадзе былі 2 праваслаўныя царквы, 1 касцёл, 8 малітоўных дамоў. Праваслаўныя цэрквы былі ў большасці буйных і сярэдніх населеных пунктаў, у мястэчках — яўрэйскія малітоўныя дамы.

Нягледзячы на некаторы рост матэрыяльнага дабрабыту ўсіх слаёў грамадства, пастаянна адчувалася незадаволенасць палітыкай кіруючых колаў з боку найбольш сацыяльна неабароненых класаў і перш за ўсё сялян, рабочых, інтэлігенцыі. Незадаволенасць арэнднай пла-

Паром на Дняпры. Фота пачатку 20 стагоддзя.

тай, самаўпраўствам памешчыкаў, жаданне павелічэння зямельных надзелаў часта выклікалі пратэст сялян, якія самавольна секлі панскія лясы, адмаўляліся плаціць запазычанасці і арэндныя платы.

У 1882 г. ў Рагачове існаваў гурток нарадавольцаў, арганізатарам якога быў А. О. Марголін. У склад гуртка ўваходзілі прадстаўнікі мясцовай інтэлігенцыі і вучнёўскай моладзі. Яны збіралі сродкі ў падтрымку арганізацыі «Народная воля», бібліятэкай гуртка карысталіся каля 70 чалавек. У 1884 г. паліцыя разграміла гурток.

Спробы стварэння рэвалюцыйных гурткоў былі і ў наступныя гады, але цярпелі няўдачу, як гэта было з гуртком афіцэраў 159-га Гурэйскага палка ці гуртком яўрэйскай моладзі.

Пачынаючы з канца 19 — пачатку 20 стагоддзяў назіраецца ўздым рэвалюцыйнага руху ў шэрагу паветаў губерні, у т. л. і на Рагачоўшчыне. У паведамленні памочніка начальніка Магілёўскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў дэпартамент паліцыі ад 30 верасня 1905 г. адзначалася, што «рэвалюцыйны рух у раёне Гомельскага, Рагачоўскага і Быхаўскага паветаў пачаў праяўляцца з 1898 г. і асабліва ўзмацніўся ў 1904—05 гг. пры агульным уздыме рэвалюцыйнага руху ў Расіі». (Больш падрабязна пра гэта глядзі ў артыкуле «Рэвалюцыйныя падзеі 1905—07 гг. на Рагачоўшчыне».)

У пачатку стагоддзя Рагачоў неаднаразова наведвалі прадстаўнікі розных рэвалюцыйных плыняў. Яны прывозілі літаратуру, шукалі спачуваючых, спрабавалі стварыць рэвалюцыйныя гуркі. Але арганізацыйнае іх афармленне адбылося толькі ў наступнае дзесяцігоддзе, калі ў Рагачове былі створаны арганізацыі РСДРП, бальшавіцкія і меншавіцкія, Бунда, эсэраў і інш.

У час першай сусветнай вайны Рагачоў ператварыўся ў прыфрантавы горад. Тут былі размешчаны шпіталі і тылавыя ўстановы Заходняга фронту, дзейнічалі розныя дабрачынныя арганізацыі. Вайна яшчэ больш абвастрыла ўсе супярэчнасці грамадства, набліжаліся рэвалюцыйныя падзеі 1917 года.

А. С. Лейкін, У. І. Паладзенка.

ЗВЕСТКІ ПРА СТАРАЖЫТНАЕ НАСЕЛЬНІЦТВА РАГАЧОЎШЧЫНЫ З КНІГІ Г. Х. ТАТУРА «НАРЫС АРХЕАЛАГІЧНЫХ ПОМНІКАЎ НА ПРАСТОРЫ МІНСКАЙ ГУБЕРНІ І ЯЕ АРХЕАЛАГІЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ»

Что касается более подробнаго обозначения здесь народов, то из истории (Геродот, Карамзин, Нарбут, Лелевель) видно, что около 1540 г. до Р. Х. Скифы занимали Крымский полуостров и местность дальше на север по течению р. Boristhenes, т. е. Днепра. Упоминается король Targitous, первый повелитель племени Скифов (так называемых) королевских господствовавших над прочими скифскими племенами. Мифология говорит, что он родился от Борисфены дочери скифскаго короля Boreas и от Юпитера. Скифы королевские и другия племена Скифов-земледельцев жили по обеим сторонам Днепра, между реками Panticapes (Припять) и Hupacris (Десна, как полагают), до линии, проведенной между Мозырем и Батурином: на северо-запад же от собственной Скифии, за рекою Panticapes, лежала земля Герров; в ней Днепр начинал быть судоходным, до этой страны от Днепрова лимана было 40 дней плаванья, т. е. 4000 стадий, что, по исчислению Лелевеля, совпадает с окрестностями Рогачева, Герры — племя скифское,— в их земле находились гробницы скифских королей. Герры, называемые гроубокопцы или курганокопцы, могли составлять не только племя, но особую касту Скифов[1]. На запад от этой местности жили Невры, которых происхождение и более точное местопребывание неизвестны. Скифы упали в V веке до Р. Х. (Геродот, Нарбут).

Друкуецца па кн.: Татур Г. Х. Очерк археологических памятников на пространстве Минской губернии и ее археологическое значение. Мн., 1892. С. 2—3.

[1] Может быть, от этого племени происходят названия фамилий, существующих у нас поныне: Герский, Геранский, Герло (Керло), Герлик, Гира, Гируля, Гирчик, Гирин, Гурин, Гурло, Гарин, Гораин.

УПАМІНАННІ ПРА РАГАЧОЎ У ІПАЦЬЕЎСКІМ ЛЕТАПІСЕ

[В лето 6650 (1142)]. Ве лето посла Всеволод ко Вячеславу Володымеричу, да сядет в Переяславлю, а Святослава, сына своего, посади в Турове, а Изяслава Мстиславича в Володымере, и бысть распря межи князи на Всеволода и Вячеслава, и бысть нестроение великое и брани безконечныя: последи же Всеволод собра братию в любов, и помирися с ними, и розда им волости: Давидичем черниговским, си ест братаничом своим, Берестя, Дорогичин, Вощиж, Ормину, Игорю-брату, Городец, Юриев, Рогачев, а Святославу-брату Клецко, Чорториск, Изяславу Мстиславичу Переяславль, а Вячеславу Володимеричу, Туров, Святославу, сыну своему, Володымер, Ростиславу Мстиславичу Смоленск.

...[В лето 6688 (1180)]. Сдумав же Ярослав с Игорем, поидоста к Дрьютьску, поемше с собою Половце, а Всеволода Игорева брата оставиша Чернигове и Олга Святославича. И придоша полотьскии князи в стретение, помагающе Святославу: Василковича, Брячьслав из Витебска, брат его Всеслав с Полочаны, с ними же бяхуть и Либь и Литва, Всеслав Микуличь из Логажеска, Андрей Володьшичь и сыновець его Изяслав, и Василко Брацьславичь,— снемшеся вси пойдоша мимо Дрьютьск противу Святославу. И въеха Давыд князь Смоленский в Дрьютьск со всим полком своим, совокупився с Глебом с Рогъволодичем и пойде за Ярослава, и хотяшеть Давыд Ярославу и Игореви полк дати до Святослава: Ярослав же и Игорь не смеяста дати полку Давыдови без Святослава, ино идоша во твердая места и стояша межи собою неделю, обапол Дрьюти: но от Давыдова полку приеждивахуть стрелци и бьяхуться с ними крепко. Посем же Святослав приеха с Новгородьчи, и ради быша ему братья его и перегатиша Дрьють, хотяче ехати ко Давыдови: Давыд же заложися ночью и бежа Смоленьску. Святослав же приступи ко Дрьютьску и пожьже острог, и оттоле пусти Новгородьце, а сам пойде к Рогочеву, из Рогачева поеха по Днепру к Кыеву.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 58, 62.

ДАРАВАЛЬНАЯ ГРАМАТА ЛІТОЎСКАГА КНЯЗЯ ВІТАЎТА ВІЛЕНСКІМ КАНОНІКАМ НА БЯРЭЗІНСКУЮ ЗЯМЛЮ ПАМІЖ СТРЭШЫНАМ І РАГАЧОВАМ

3 красавіка 1399 г.

Мы, великий князь Витовт, даем веданье всем, кто на сей лист узозрить или слышить. Дали есмо землю кановников виленским на имя березынская к Стрешину, што были есмо дали князю Юрью толочку от Рогачева оттойма. А в ту землю первописаную не уступатися никому, а ни рогачевцем, а ни иному кому, ниж держать кановником виленским к Стрешин[у] вечно, непорюшно, никимже.

А на то на все дали есмо на крепость сей лист и печать свою велели привесити. А писано у Троцех у четверг по велице дни под леты по рожстве господни 1000 и 300 и 9 десят и 9.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 110.

ГРАМАТА КАРАЛЯ КАЗІМІРА МІНСКАМУ КУПЦУ ЦЕРАШКОВІЧУ ПРА ДАЗВОЛ БЯСПОШЛІННАГА ГАНДЛЮ Ў ГАРАДАХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

5 мая 1480 г.

Казимир божью милостью.

Князем нашим, и паном, и наместником, и тивуном, и бояром, и мытником, и всим заказником тот наш чоловек, мещанин менский Лука Терешкович, торгуеть нашим дубасом бобруйским троцкое половины и нашими пенязьми, а от того нам прибытку дает. И вы бы от нашого дубаса и от его комяги мыта не брали бы. Есте в Глуску, в Погосте, в Чорторыску, у Куликовичох, в Чет, в Ертии, в Луцку, у Вострозе, в Степани, в Дубровицы, в Городку, у Турове, у Паустьи, в Пинску, в Новегородцы Литовском, в Меиску, в Смоленску, в Орши, в Могилеве, в Рогачеве, в Лучине, в Стрешине, в Речицы, Гомъи, в Чичерску, в Пропостку, в Кричове, в Мстиславли, в Дорогобужи, у Вязме, в Новегородцы Северском, в Родогощи, в Трубецку, в Браньску, в Стародубе, в Чернигове, у Вышегороде, в Киеве, в Путивли, в Черкасех, в Житомири, в Чуднове, во в Уручьем, в Чорнобыли, в Мозыри, в Новозе, в Любечи, в Грезску,

по всим нашим мытом, и по князским, и по панским, и по боярским, сухим и водою. А которыи бы хотели через наш лист силу ему чинити, а мыто взяти от нашого дубаса и от его комят, тот нам великую вину заплатить.

Писан у Вильни мая 5 день, индикт 6.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1959. Т. 1. С. 261.

ПІСЬМО КАРАЛЕВЫ БОНЫ РАГАЧОЎСКАМУ АКАНОМУ ПРА СКАРГУ СЯЛЯН с. ЛУЧЫН НА ПАВЕЛІЧЭННЕ ПАБОРАЎ І ПАВІННАСЦЕЙ

1548 г.

Бона, божьею милостью. Державцы рогочовскому. Што при бытности твоей тут при дворе нашом на тот час у Петрикове жаловали нам подданные наши вол. Рогачёвской с. Лучинского на тебе о том, што ж дей их ты над повинности их ку работам у фольварках тамашних замковых примушаешь и приворочаешь, где еси ты с ними о том перед нами очевистую справу мел. А так еси поведил, иж они на таковые работы несуть повинни, тольки уживаеш. И мы есмо того промежку нас досмотривши, так знашли и постановили, иж тые люди наши лучинские у фольваркох тамошних, яко пашни пахати, хором и кухонь ставити, и огородов тынити и справовати, и жонки их огородов полоти и жадное работы робити немають, нижли коли бы на толоку за хлебом врядничим были ку таковым работам фольварковым возваные, тогды по своей доброй воли, кто похочеть, тот на нее пойдеть, але силою врядники наши тамошние никого з них к той работе фольфарковой приворочати немають. Што теж тыеж подданные наши лучиньские жаловали на тебе, иж они здавна за воз сена з дытму па 2 гр. платити за кождый рок суть повинни, и ты дей и тые пенези за сено з них береш и сено им над повинность их косити велиш. Яко ж еси и ты сам перед нами поведил, иж они тот плат по 2 гр. за кождый воз сена з дыму платять, а над то дей и сена 4 стоги на кождый рок косити повинни. Где мы того промежку вас досмотревши, на том есмо постановили, иж тые лучинцы и по 2 гр. за воз сена с кождого дыму платити и на кождый год 4 стоги сена там, где им в прилеглости указано будеть, косити водлуг своеи стародавноі повинности [мають]. При том теж, который лист они перед нами старосты нашого пинского небожчика пана Ивана Михайловича, на чом они здавна осели, вказывали, мы их правом при том листе заховываем, только где бы потреба вказывала, тогды они замок нам рогачовский восполок из иншою волостью нашою тамошнею робити и будовати повинни будуть. А приказуем тобе, иж бысь тых падданых наших лучинцов водлуг сего листу нашого заховал и над повинность их стародавную штобы еси им кривд никоторых неделал и повин не уводил, а селетровщину иж бысь з них потому ж, яко ж и з иншых волощан тамошних, з дыму по 2 гр. в кождый год брал конечно Писан у Петрикови под лето божь [его] нарож[енья] 1548 месяца ден..., индикт 6.

Белоруссия в эпоху феодализма. М., 1959. Т. 1. С. 208—209.

СКЛАД ВОЙСКА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

1567 г. Земскі перапіс.

...5. Повет Речицкий. Шляхта з Рогачева.— Месеца августа 12 дня.

Богдан Волынец Омеленский конь, пицр., пр., согай., саб., Щастный Качицкий з Мазолова конь, пицр., при., согай., саб., Матей Скоковский з Денискович конь, пицр., пр., согай., саб. Иван Михайлович Рубл з Шапчич конь, пицр., при., согай., саб., рогат.. Борис Васелович з Слободы конь валах, пицр., при., согай., саб., рогат.. Полко Михайлович Госковский конь, пицр., пр., согай., саб., рогат.. Гришко Сысоевич з Слободы конь, пицр., при., согай., саб., рогат. Матей Личко з Слободы выслал слугу на имя Миска, конь, пицр., согай., саб., рогат.. Иванко, Лукашов зять, з Слободы конь бахмат, скурка. при., рогат., согай., сабля. Бенадыкт Богданович з Костеневич конь, пицр., пр., согай., саб., рогат., Васко Анцута з Вишчина коник, пицр., при., согай.. саб., рогат. Окулский Ситкович з Старого Села коник, скура. пр., согай., саб., рогати.. Павел Кракович з Старого Села конь, пицр., при., согай., саб., рогат.. Семен Савич з Ходосович конь, пицр., при., согай., саб., рогат.. Мойсей Хробыстич Вирбочов конь, пицр., пр., согай., саб., рогат.. Федор Шумишич з Костешова конь — бехтер, пр., согай., сабля, рогат.. Степан Корноух з Лесок конь., пицр., при., согай., саб., рогат.. Якуб Войтехович з Зелеников конь, пицр., при., согай., саб., рогат.. Борис Данилович сам дей при замку Рогачевском для догледанья стрелбы замковое зостал, з именья своего Липинич при Ивану Рублю ставил коня, слугуна имя Кондрата, конь,

пицр., пр., саб., руч., рогат. Григорей Прозвицкий з Бахани конь 1, зброя, при., согай., рогат...

УВАГА: Скарачанні ў арыгінале азначаюць: древ.— древко; каф.— кафтанник; пицр.— пацыр; пр., при.— прилбица; скурк. при.— скурковая прилбица; согай.— согайдак, сойдак; рог., рогат.— рогатина; руч.— ручница; саб., шаб.— сабля; секер.— секера.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Мн., 1936. Т. 1. С. 287—288.

РАГАЧОЎ У БАРКУЛАБАЎСКАЙ ХРОНІЦЫ

Року 1592 июня, по старому 11 дня в неделю. Была брань великая, велми страшная: почавшы от западных краев, замков украинных Чернигов, Гомель, Любеч, Белая Церков, Переяславль, Стрешин, Речица, Рогачов, Крычов и иных многих мест и замков в тых всих [землех] по селах и местах и местечках немало збожя попсовала град и буря великая. А на бору, на лесе и по лугом со пчолами дерево бортное на воде угляды (?) згола, штось троха зостала, буря великая поламала; яко ж на тот час давали справу и жалосно поведали, иж дей, у водного мужа северского бортного дерева сто поломило, у другого двесте, у третего триста, иж страшно о том слышати было; дороги каждый от села до села волостью прочищали, навет и тепер на лесех, на бору и по болотах поломатые [дерева] видети много.

Якож тот рок 92 был урожа[й]ный: [для] жита, овса, гречихи, хотя ж не росла, але добра, пшеницу иржа побила. Цена житу была таней: чверт по грошей пяти (л. 152 об.), мера жита по грошей двадцати...

Лета Божого нароженя 1595, месяца ноября 30 дня, в понеделок, за тыдень пред святым Николою — Севериян Наливайко, при нем было козаков 2000, дел 14, гаковныц [пропуск]. Место славное Могилев, место побожное, домы, крамы, острог выжгли, домов всех яно 500, а крамов з великими скарбами 400... Тепер же Литва, от козаков отступивши, до Могилева на болший луп поехали, а козаки на всю ноч ехали до Быхова аж на низ (л. 154 об). Литва за казаками гналася аж до Рогачева, да ничого згола не вчинили козаком, а Литва и Татары рушилися до Менска, до Новагорода и до Вилни, набравшися тутешнего краю лупу.

По выеханью козаков и Литвы, тогды было зиме ни зима, ни льто, ни осен, ни весна аж до месяца мая, до святаго Афанасия, снегу не было...

Року 1600. Панове волынские, панове литовские, также козаки Запорозкие, змовившися и знявшися вси вкупе, Волохи отгамовали, войска Могилево побили, армату отняли; воевода мултянский втек из Мигалем, трохи не поймали, и много за ним гонили (л. 161 об.) аж до границы мултянское. Троха ся было успокоило. За то была дана козаком лежа у Киеве; гетманом был Самуел Кошка. Лежали [козаки] у Гоми, в Речицы, в Рогачове, у Баркулабове на пристанство аж у ждали...

Того ж року 1601, месеца октобра десятого дня, целую неделю снег силний и кгвалтовный ишол, выпал до полголени: также и буря силная была. Тогды пшеницы, ярицы, овес, гречиху, горохи и вси овощы, великое множество ярицы на полях непожатые, также и копы жатые снегом (л. 163) позаметала метелица, иж было жалостно и страшно гледети и выповедити уздыханя и плачу людей убогих, пашников немаетных.

А так лежал тот снег 2 недели аж до Дмитровы суботы. Яко ж великих морозов река Днепр был замерз, и ездили по нем яко серед зимы. А потом за ласкою Всемилостивого Господа Бога для плачу и великого уздыханя снег ростал и река Днепр росплынулся. А потом почали жати-горовати по снегу у стужу. Были теж морозы великие, огне клали, сами грелися, иж страшно и жалосно было гледети: три — два человеки на ден ледво снопов 40 нажнут овса албо ярицы, бо велми к земли прилегло.

Люди убогие, ярь на весне жали-горевали, але вже толко для статку, а того много статками на весне сами господари свое збоже травили; маки, горохи, бобы, проса, репа — то все згола погинуло. А которые молотили ярь, зерня толко знак, а коли змелет, спечет,— то у печи испечется, а з лопаты у печ не зложит; с печи аж ополоником выберет. Также и жито велми было неумолотно. А коли муку житную у хлебе спекут, то тесто печеное солодко, а за скорину хотя ложки клади, а в печи не печется.

У восень роли (л. 164 аб.) и жито сеяли, которые старым житом, то предсе ни во што, а которые житом новым сеяли, тые ни жали. Яко ж две доле тых людей было, которых оралы и не сеяны были. На лето куповали жито чверть по грошей 35, яры по гр(ошей) 40, пшеницу куповали чверть 40 гр[ошей], овес по гр[ошей] 40, конопель чверть 20 грош[ей], горох чверть 20 гр[ошей]. А тот гнев божий был и непогода, почавши от Менска до Полоцка к Витебску, до Орши, до Мстиславля, до Пропойска, до Рогачова, Могилева, Любошаны...

Того ж року 603, в месте Могилеве Иван Куцка здал з себе гетманство козацкое для того, иж у войску великое своволенство; што хто хочет, то броит... Потом по Иване Куцку был гетманом Иван Косый. Тые козаки брали приставства у Полоцку, у Витебску, на Орши, у во Мстиславлю, у Крычове, у Могилеве, у Головчине, у Чечерску, у Гомли, у Любечу, у Речицы, у Быхове, у Рогачове и по всих местах...

Варкулабовская летопись // Могилевская старина: Сб. ст. «Могилевских губернских ведомостей». Могилев, 1900. Вып. 1.

ЗВЕСТКІ ПРА ВЁСКУ АЗЯРАНЫ З «МОГИЛЁВСКИХ ГУБЕРНСКИХ ВЕДОМОСТЕЙ»

Село Озераны упоминается впервые под 1556 годом. В это время село принадлежало киевопечерскому монастырю. Озеранские крестьяне производили захваты мёду в Конопницкой[1] земле Тихинскаго[2] имения дворян Ивана и Измаила Алексеевичей Зенковичей, грабили на вольных дорогах крестьян их и т. п. Король дал повеление киевопочерскому архимандриту (не поименовать) устранить поводы к жалобам. Документ выдан 18 января 1556 г. в Варшаве[3].

Затем, Озераны упоминаются под 1584 годом. Озераны по прежнему принадлежали киевопечерской лавре и относились к Речицкому повету. Озеранские крестьяне произвели наезд на село Фалеевичи[4] Тихининскаго имения земян Василия и Юрия Зенковичей — Тихининских, ограбили тамошних крестьян, ободрали пчёл на Конопличком острове и нарушили давнюю границу на речке Ржавке. В то же время подданные Юрия З-ча сделали наезд на имение киевопечерского монастыря Яловец. Пока шло разбирательство дела, озеранцы опять произвели наезд на сельцо Зенковичей Конопличи[1]. Конца этого процесса в синодальном деле нет. Имеются документы: королевское повеление киевопечерскому архимандриту еп. Мелетию Хребтовичу от 20 февраля 1585 года из Варшавы; документы за подписью и печатью еписк. Мелетия Хребтовича от 3 марта 1587 года из Речицы и от 2 сентября 1590 года из Владимира.

10 лет спустя, в 1594 году киевопечерский архимандрит Никифор Тур удостоверял, что он зааренловал и позволил пану Давиду Кенишку в лесу с. Озеран «Робенье попелу зо всякого дерева, которое бы на попел годно было, то есть з бересту, з ясеня, з лещины и з вязу», а так же употреблять дерево, нужное «до опатренья того попелу», на бочки,— дуб и другое дерево, сколько будет необходимо. Срок аренды начинался с 6 ноября 1594 года. Продолжительность аренды и количество рабочих предоставлялись усмотрению Кенишка. За каждый лашт попелу он платил 3 злотых польских и дал 10 коп. грошей литовских в задаток. Документ писан собственноручно архимандритом Туром 6 октября 1594 года в Озеранах.

Наконец, вместе с с. Хомичи Озераны упоминаются в 1613 году, в деле о вводе ун. митрополита Рутскаго во владение имениями киевской митрополичьей кафедры и киевопечерскаго монастыря, и в 1614 г. в процессе киевопечерскаго монастыря с митрополитом Рутским.

С этого времени Озераны в документах не встречаются. От униатов они, по обыкновению, перешли к католикам. В 18 в. здесь существовал Озеранский римско-католический монастырь каноников-регулярных. Закрыт он был, если не ошибаемся, только в 1842 году, когда земли, принадлежавшия древле-киевопечерскому монастырю, перешли в министерство государственных имуществ.

Земли монастыря, судя по встречающимся в актах урочищам, занимали огромное пространство. Они тянулись с севера от Чигиринки, получившей название от южнаго Чигирина, и от речки Теребомирки (ныне Черебомирка) почти до Добосны, и с запада от нынешней границы Минской губернии почти до Днепра (по левой стороне Друти упоминаются Хомичи и Радомысль — возникший по примеру Радомысля Днепровскаго).

На документах этих мы подробно остановились потому, что до настоящаго времени по древней топографии этой местности в печати почти ничего не было[5]. *Е. Романов.*

Могилевская старина: Сб. ст. «Могилевских губернских ведомостей». Могилев, 1900. Вып. 1. (Могил. губ. ведом. 1899. № 1. С. 1).

---

[1] Ныне дер. Коноплицы.
[2] Ныне м. Тихиничи.
[3] Документ № 45.
[4] Ныне Хвалевичи.
[5] Захаваны стыль і арфаграфія арыгінала (Рэд.).

Даследаванні Вішчынскага замка

Гэты артыкул беларускага гісторыка З. М. Загарульскага, надрукаваны ў кнізе «Старажытнаруская дзяржава і славяне» (Мн., 1983. С. 86—89, на рус. мове), прыводзіцца з невялікімі скарачэннямі і ў перакладзе на беларускую мову.

У 1977 г. на працягу 5 гадоў археалагічная экспедыцыя Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна праводзіла даследаванні на раннефеадальным гарадзішчы каля в. Вішчын у Рагачоўскім раёне Гомельскай вобласці. Плошча паселішча 0,63 га. Раскапана 1650 кв. м. Таўшчыня культурнага слоя вагаецца ад 0,4 (у цэнтры пляцоўкі) да 1,5 м (па краях). Хоць у культурным слоі трапляецца дробны крэмень, у тым ліку са слядамі апрацоўкі, а таксама каменныя паліраваныя сякеркі, ранні слой стратыграфічна не выдзяляецца, і ўся тоўшча наслаенняў ад мацерыка да паверхні звязана з раннефеадальным перыядам. Ужо дзярновы слой напоўнены старажытнарускімі прадметамі. На жаль, гарадзішча доўгі час узорвалася, што прывяло да значнага перасоўвання культурнага слоя і разбурэння большай часткі рэшткаў збудаванняў, якія адносяцца да заключнага этапа існавання паселішча, калі яно было разгромлена, спалена і закінута.

Гарадзішча размешчана на правым баку Дняпра на высокай надпойменнай тэрасе. Яго земляныя ўмацаванні складаліся з трох паралельных ліній валоў і равоў, якія ўтварылі ў плане паўкруг. Вышыня вонкавых валоў 2,5—3 м. Адзін бок гарадзішча ахаваны стромым абрывам рачной тэрасы, і, відаць, не меў вала. Паселішча можна аднесці да тыпу гарадзішчаў паўкруглай формы, не звязаных з умовамі рэльефу мясцовасці. Аснову фартыфікацыі складалі штучныя валы і равы. У большасці выпадкаў падобныя гарадзішчы з'яўляюцца рэшткамі ўладальніцкіх сядзіб. На грэбені ўнутранага вала выяўлены і даследаваны на працягу 30 м рэшткі згарэлай абарончай сцяны, зробленай з гарызантальных бярвён, якія ўмацоўваліся размешчанымі на адлегласці 5—5,5 м адна ад адной кароткімі папярэчнымі сценамі. У месцах злучэння падоўжныя бярвёны злучаліся адно з адным «унакід». Сцяна была пастаўлена на вале і не мела ніжніх падземных частак. У некаторых месцах захаваліся 3—4 бервяны дыяметрам 18—23 см. У месцах злучэння ў верхнім баку бярвён высякаліся лежкі. Даўжыня папярэчных бярвён каля 1,2 м. Іх кольцы выходзілі за вонкавую плоскасць сцяны на 10—22 см. З вонкавага боку ніжнія бярвёны былі прысыпаны шчыльнай глінай, з якой насыпаўся ўнутраны вал. З тыльнага боку на вале каля сцяны сустракаліся крушні камянёў, а таксама ўчасткі глінянай абмазкі з адбіткамі плоскага дрэва. У адным месцы гліна з абмазкай ішла суцэльнай паласой 1×3 м паралельна сцяне на адлегласці каля 1 м ад яе. Як можна меркаваць па вугальнай праслойцы, да сцяны з боку гарадзішча прымыкала роўная гарызантальная пляцоўка, на якой, магчыма, насцілаўся драўляны памост. Каля асновы тыльнага боку ўнутранага вала выяўлена невысокая драўляная сцяна з чэсаных дошак, якая адгароджвала вал ад участка забудовы.

Існуе думка, што гарадзішчы, умацаваныя трыма паралельнымі лініямі валоў і равоў, пашырыліся на Русі ў сувязі з вынаходніцтвам каменямётных машын (порак) не раней як у першай палавіне 13 ст., калі адбыліся змены ў тактыцы захопу ўмацаваных паселішчаў і замест звычайнай доўгай аблогі сталі прымяняць падтрыманы стральбой з поракаў штурм. Улічваючы, што на Вішчынскім гарадзішчы добра прадстаўлена 12 ст., можна дапусціць, што першапачаткова замак меў больш простыя ўмацаванні. Аднак у 13 ст. ў мэтах процідзеяння новай зброі былі насыпаны вонкавыя валы, якія расшыралі абарончую паласу да 30 м. Пры шурфоўцы першага гарадзішча вонкавага вала не знойдзена на ім ніякіх прыкмет навальных збудаванняў.

У раскопках былі выяўлены сляды не менш як 6 згарэлых драўляных аднакамерных пабудоў. Усе яны размяшчаліся ўздоўж вала на значнай (10—15 м) адлегласці адна ад адной. Магчыма, паміж імі былі і іншыя пабудовы, рэшткі якіх цалкам разбураны пазнейшым заворваннем. Пяць пабудоў былі наземнымі зрубамі. У дзвюх зберагліся рэшткі дашчанай падлогі і развалы печаў, што дазваляе аднесці іх да жылых збудаванняў. Трэці зруб быў, верагодна, майстэрняй ювеліра. Адна пабудова больш лёгкага тыпу — свіран. Яна стаяла побач з домам, у ёй на падлозе захавалася зерне. У мацерыку знойдзена значная колькасць неглыбокіх ям. У дзвюх ямах знойдзена па аднаму цэламу гаршку.

Матэрыялы раскопак дастаткова поўна адлюстроўваюць гаспадарчае жыццё і побыт насельнікаў замка. Сельскагаспа-

дарчыя прылады прадстаўлены двума абломкамі сашнікоў, дзвюма цэлымі матыкамі, двума абломкамі сярпоў. Знойдзены таксама жорны і жалезная порхліца. Знаходкі касцей жывёл сведчаць аб дамашняй жывёлагадоўлі і паляванні. З рыбалоўствам звязаны гарпун, рыбалоўныя кручкі, гліняныя грузілы ад сетак. Знойдзены косці і луска ад буйных рыб. Дрэваапрацоўка прадстаўлена дзвюма сякерамі, пяццю долатамі, малатком з цвікадзёрам, пёрападобным свердлам. Магчыма, што ў замку мела месца апрацоўка жалеза. Знойдзены шлакі, зубілы, молат.

У паўднёва-заходняй частцы гарадзішча каля вала жыў кваліфікаваны ювелір. Там знойдзены льячка, запоўненая бронзай, матрыца для падвесак у форме лілеі (крын), невялікая матрыца (шаблончык), відаць, для адбітку бляшак расны і масіўная матрыца для колта з выявай грыфона. Частымі знаходкамі былі свінцовыя пласціны, якія, магчыма, выкарыстоўваліся для вырабу эмалей.

З іншымі відамі гаспадарчай дзейнасці звязаны знаходкі нажоў (каля 100), нажніц (4 экз.), шылаў і іголак, прасліц (больш 70). Сярод матэрыялаў раскопак выдзяляецца шэраг прадметаў, якія адлюстроўваюць ваенны побыт: перакрыжжа і наверша мяча, зробленыя з бронзы; шарападобны бронзавы кісцень, пакрыты дробнымі гарошкападобнымі выпукласцямі, аналагі якога вядомы ў гарадскіх слаях 12—13 стагоддзяў у паўднёвай і паўднёва-заходняй Русі; абрывак і асобныя кольцы ад кальчугі; пласціна з панцырнага даспеха, наканечнікі стрэл (9 экз.) і коп'яў (2 экз.). Цяжкаўзброеным коннікам належалі 8 шпор тыпу III, IV і V (паводле класіфікацыі А. Н. Кірпічнікава). Знойдзена таксама 6 страмён тыпу V, VII, VII А і X, якімі аснашчаўся верхавы конь цяжкаўзброенага рыцара. 4 экземплярамі прадстаўлены цуглі.

Разнастайныя ўпрыгожанні і іншыя бытавыя прадметы. Найбольш шматлікія абломкі шкляных бранзалетаў (510 фрагментаў), з якіх кручаных у 1,5 раза больш, чым гладкіх. Ёсць шкляныя пярсцёнкі і пацеркі. Апошніх больш як 20. Ювелірныя вырабы прадстаўлены круглымі манетападобнымі прывескамі, пакрытымі несапраўднай зерню (2 экз.), крыжамі-цельнікамі, шпількамі (адна квадрыфалійная з эмаллю і геральдычнай птушкай, другая з крыжападобнай галоўкай), бранзалетамі (кругладрацяны, трохгранны са стылізаванай галоўкай звера, віты, пласцінастыя), пярсцёнкамі, бразготкамі з крыжападобнай праразью.

У 1979 г. на замку выяўлены клад дарагіх упрыгожанняў і грашовых зліткаў, схаваны сярод камянёў у крапасной сцяне ў апошнія часы існавання паселішча. У склад клада ўваходзілі 2 колты з двухбаковай выявай птушак, выкананых тэхнікай перагародчатай эмалі, зорчаты шасціканцовы колт, колт з ажурнай аблямоўкай з выявай дзвюх птушак і крына, дзве расны, якія складаюцца з канічнага верху са звісаючымі ланцужкамі, да якіх прымацаваны бляшкі; бранзалет, кручаны з трох жгутоў са шчытковымі канцамі ў выглядзе стылізаваных галовак, двухстворкавы пласцінасты бранзалет з гравіраванымі выявамі птушак і арнаментаў, чатыры крынападобныя прывескі, тры сярэбраныя пацеркі, два ланцужкі з паўцыліндрыкаў, тры грыўні наўгародскага тыпу, дзевяць грыўняў літоўскага тыпу, шэсць грыўняў кіеўскага тыпу. Усе вырабы з высакапробнага серабра. Два колты, крынападобныя прывескі, пацеркі і пласцінасты бранзалет пазалочаны. Рэчы маюць дакладныя аналогіі ў кладах, закапаных у час мангола-татарскага разрабавання Русі, і датуюцца 2-й палавінай 12—1-й трэццю 13 ст. Клад складаўся не з новых вырабаў, многія з іх сталі непрыгоднымі: паламаныя пласцінасты бранзалет, зорчаты колт, не было дужак у колтаў з эмалямі. Паміж іх вырабам і закопваннем прайшло нямала часу.

Вялікую цікавасць мае знаходка віслай свінцовай пячаткі Мсціслава Расціславіча Храбрага, якая сведчыць аб сувязі замка з дынастыяй смаленскіх князёў. Час функцыяніравання замка вызначаны вузкімі межамі сярэдзіны 12 — сярэдзіны 13 ст. Раннюю дату дае грушападобная бразготка з крыжападобнай праразью. Знаходкі гэтага тыпу былі пашыраны на Русі з сярэдзіны 10 да сярэдзіны 12 ст. Верхняя храналагічная мяжа вызначаецца колцавай шпорай, стрэмем тыпу X, а таксама матэрыяламі кладу.

Тапанімічныя даныя, сацыяльна-эканамічны тып замка, яго сувязь са Смаленскай зямлёй, датаванне і абставіны гібелі дазваляюць паставіць пытанне пра магчымасць атаясамлівання Вішчынскага замка з летапіснай Ваішчынай, захопленай і, відаць, разбуранай у 1258 г. аб'яднаным войскам літоўцаў і палачан.

«Замак у Рагачэве»

Так называўся артыкул вядомага мастацтвазнаўцы Міколы Шчакаціхіна ў часопісе беларускіх краязнаўцаў «Наш край» (1926. № 10—11), і які прыводзіцца ніжэй з невялікімі скарачэннямі і захаваннем моўных асаблівасцей.

У самым канцы галоўнае вуліцы Рагачэву, на высокім беразе Дняпра, уздымаецца досыць вялікая старадаўняя камяніца, вядомая сярод мясцовага насельніцтва — пад назваю «замку каралевы Боны». Месца, дзе знаходзіцца гэты будынак, з'яўляецца часткаю ранейшае замкавае гары, якая стварала калісьці «рог» паміж Дняпром і утокам Друці (адкуль узяў сваю назву, пэўна, і самы горад). У цяперашні час рэчышча Друці адступіла далей, пакінуўшы сваё старарэчча каля падножжа гары з паўднёвага боку, з поўначы ж гара перарэзана штучнай шырокай выняткай, зробленай у час пабудовы маста праз Дняпро, за якім пачынаецца працяг варшаўска-маскоўскага шосэйнага шляху, напрамкам на Прапойск і Чэрыкаў.

Самы «замак» мае выгляд масіўнага, крыху прысадзістага, простакутнага ў плане, двохпаверхавага будынку, перакрытага пазьнейшым чатырохскатавым жалезным дахам. Па рагох разьмешчаны магутныя контрфорсы на квадратовых асновах, якія на галоўным фасадзе, звернутым у бок Дняпра, падымаюцца вышэй на палову другога паверху, на заднім жа дасягаюць толькі мяжы між паверхаў, абведзенай навакол усяго будынку вузкім патройным гзымсам. Другі гзымс, шырокі, ступенчаты, акаляе гару будынку пад дахам, трэці праходзіць зусім на доле, у выглядзе вузенькага ардынарнага паяска. Нічым не аздобленыя, гладкія муры, затынкаваныя паўзьверх трывалае цаглянае кладкі, маюць толькі шырокія выступы ў сярэдзінах усходняга (з боку Дняпра) і заходняга фасадаў, дзе зьмяшчаюцца ўваходныя дзьверы. Дзьверы знаходзяцца як у дольнім, гэтак і ў горнім паверхах, якія зусім ня злучаны між сабою. У першым паверсе з галоўнага фасаду (усходняга) досыць шырокі ўваход мае поўцыркульную перамычку, з задняга фасаду, насупроць яго, зьмешчаны простакутныя дзьверы, але зробленыя ў закладзеным пралёце з поўцыркульнаю аркай. Апроч таго, у паўночным фасадзе, каля самага паўночна-ўсходняга рагавога контрфорсу ёсць яшчэ адзін ваход, таксама з поўцыркульнаю перамычкаю, крыху падвышаны над зямлёй пры дапамозе невялічкага каменнага ганку з усходамі па пяць ступеняў; гэты ваход вядзе беспасрэдна ў другі паверх, куды падымаецца ўнутраная драўляная драбіна, і з першым паверхам злучэньня не мае; але магчыма, што ваход гэты пазьнейшага паходжэньня, паколькі беспасрэдна над ім у другім паверсе як с надворнага, так асабліва з нутранога боку, выразна відаць сьляды аналёгічнага па абрысах закладзенага пралёту, да якога, магчыма, калісьці падымаліся надворныя драбіны, прыбудаваныя да бакавога фасаду; гэта тым болей праўдападобна, паколькі той ваход, што існуе цяпер, у кожным выпадку ў дольні паверх весці ня мог, бо з нутранога боку якраз у гэтым месцы знаходзіцца ніша з поўкупальным скляпеньнем. Праўда, магчыма таксама, што ў гэтым месцы раней ня было наагул ніякага ўваходу, паколькі закладзены пралёт другога паверху можна вытлумачыць і ў іншы спосаб, што мы зазначым у далейшым. Другі ўваход у горні паверх



Від на Рагачоўскі замак з боку Дняпра. Фота пачатку 20 стагоддзя.

знаходзіцца ў сярэдзіне задняга фасаду; да яго падымаліся калісьці цяпер зруйнаваныя ўсходы, пакладзеныя на ўмацаваныя ў мур жалезныя трамы; але нельга быць пэўным, што гэтыя трамы належаць да першапачатковае канструкцыі: магчыма, што ўсходы раней мелі іншы выгляд і былі альбо складзены з цэглы, альбо зроблены з дрэва. Апроч уваходаў, муры ў будынку з усіх чатырох бакоў у вабодвых паверхах прарэзаны параўнальна невялічкімі вокнамі простакутнае прадоўжнае формы, з разьмяшчэннем па горызонталі; пралёты і ў некаторых выпадках маюць жалезныя краткі; на пярэднім і заднім фасадах кожны паверх у бакавых частках мае па два вакны: у сярэднім выступе усходняга фасаду, над галоўным уваходам, ёсьць і яшчэ адно вакно іншае формы, але пазнейшага пахаджэньня; на бакавых фасадах некаторыя вокны закладзены, маючы знадворку выгляд неглыбокіх глухіх простакутных ніш.

Нутраны лад будынку найлепей захаваны ў дольнім паверху. Галоўны уваход (з боку Дняпра) вядзе ў папярочны карыдор, які перасякае увесь будынак з усходу на захад, канчаючыся на супроцьлеглым баку другімі дзьвярыма. Зараз жа за ўваходам ён перакрыжаваны другім шырокім прадоўжным карыдорам, які, ідучы з поўдня на поўнач, стварае як быццам вэстыбюль будынку. Гэты другі карыдор перакрыты карабовым скляпеньнем з аркамі, абапёртымі на пілястры; у паўднёвай частцы яго пілястры зьнішчаны: з паўночнага боку ён канчаецца невысокай кантовай нішай, пакрытай поўкупальным скляпеньнем, якое прыходзіцца якраз пад вышэйпамянёнымі намі ўсходамі, што вядуць з бакавых дзьвярэй у другі паверх. Прыблізна ў самай сярэдзіне будынку першы карыдор перасечаны трэцім, раўналежным другому прадоўжным карыдорам, таксама з карабовым скляпеньнем, які падзяляе ўвесь будынак на дзьве паловы — усходнюю і заходнюю. Па бакох яго знаходзяцца вялікія прастакутныя памяшканьні, злучаныя з карыдорам шырокімі пралётамі з поўцыркульнымі аркамі, абапёртымі у сярэдзінах на моцныя простакутныя у плане слупы. Кожнае такое памяшканьне мае перакрыцьцё з двух крыжовых скляпеньняў, з абапораю на гэтыя-ж нутраныя слупы і на бакавыя муры, без спецыяльных пілястраў, альбо кансоляй на гэтых апошніх. З усходняга боку гэтыя памяшканьні асьветлены вокнамі, якія прароблены ў нутраным муры і вядуць у першы прадоўжны корыдор, прычым, аднак, крайняе з поўначы вакно, якое змешчана вышэй скляпеньня канцовае нішы гэтага корыдору, выходзіць ужо на ўсходы, што вядуць на другі паверх. Памеры і формы гэтых вокан цалкам аналёгічны надворным. У бакавых мурох вокны закладзены, апроч сярэдніх, што прыходзяцца па канцох цэнтральнага корыдору. З гэтай прычыны ў цяперашні час абодва памяшканьні ўсходняе паловы будынку, зусім ня маючы надворных вокан, зьяўляюцца досыць цёмнымі, заходняя палова крыху сьвятлей, бо кожнае памяшканне мае надворныя вокны ў заходнім фасадзе. Але і першапачаткова, калі бакавыя вокны яшчэ ня былі закладзены, агульная колькасьць іх і памеры ня зусім адпавядалі, напэўна, досыць значным памерам саміх памяшканьняў, якія, хутчэй за ўсё, ніколі ня мелі належнага святла. Часткова ў сувязі з гэтым, а таксама і з агульным распланаваннем паасобных частак, першы паверх зусім ня робіць уражання жылога памяшканьня; што пацьвяржаецца яшчэ і поўнай адсутнасьцю абы якіх сьлядоў пячэй ці комінаў, альбо наагул тых ці іншых прылад для апалу. На нашу думку, тут хутчэй было нейкае памяшканьне службовага характару,— магчыма, склад зброі ці провіянту, а мо нават і стайні, паколькі разьмяшчэньне «пакояў» і корыдораў упоўне гэта дазваляе.

Плян другога паверху ў агульных рысах адпавядае першаму. Памянёныя намі вышэй сучасныя драўляныя ўсходы ад бакавых дзьвярэй вядуць у шырокі прадоўжны корыдор, аналёгічны ніжняму «вестыбюлю». З сярэдзіны яго простастаўна ідзе другі папярочны корыдор, які канчаецца дзьвярыма на заходнім фасадзе. Другога прадоўжнага корыдору няма: замест таго, з папярочнага корыдору ў паўночны і паўднёвы бок расчыняюцца выхады ў вялікія памяшканьні без перагародак і нутраных слупоў, якія ствараюць два асобныя пакоі, па адным ў кожнай палове будынку. Ранейшыя перакрыцці ў гэтым паверсе нідзе не захаваліся, дый наогул увесь ён робіць уражаньне значна перабудаванага, паколькі ў шмат якіх месцох выразна відаць сьляды закладак і падправак пры дапамозе пазьнейшае цэглы. Найболей пераробленым зьяўляецца прадоўжны карыдор з усходняга боку. У цяперашні час ён мае па ўсходняй сьцяне шэраг вокан, сярэдняе з якіх, што знадворку, прыходзіцца на выступ усходняга фасаду, з нутранога боку змешчана ў вялікай нішы з поўцыркульнай пера-

мычкай: але гэтая ніша закладзена ў пазнейшы час, ды, апроч таго, па ўсёй сьцяне відаць сьляды такіх жа перамычак, што паказвае, хутчэй за ўсё, на шэраг закладзеных пралётаў, да якіх дапасоўваецца і замураваны пралёт з паўночнага боку, над сучасным уваходам, аб якім мы паміналі вышэй. Усё гэта робіць амаль бясспрэчнам, што першапачаткова ўвесь корыдор меў выгляд адкрытае лёджыі з лёгкай аркадай на параўнальна тонкіх слупках, якая выходзіла ў бок Дняпра, і можа быць мела надворны выхад і сходы з паўночнага боку.

Такая конструкцыя, разам з агульным характарам усяго другога паверху дазваляе лічыць упоўне магчымым, што гэты паверх, у процілегласьць ніжняму, служыў калі-небудзь жылым памяшканнем, альбо ў кожным выпадку мог граць ролю, напрыклад, памяшкання для замкавае варты, з лёджыяй у якасці назіральнае галярэі, звернутай на ўсход, г. зн. якраз у той бок, адкуль асабліва магла пагражаць небясьпека нападу. Але гэта, зразумела, нельга лічыць бясспрэчным, тым болей, што аналёгічна дольняму паверху тут няма ніякіх прылад для апалу. Магчыма, праўда, што гэтае памяшканьне ўжывалася толькі ў летні час, альбо, што тут былі зроблены калісьці часовыя прылады, якія да нашых дзён не захаваліся. Што ж датычыць нутраной апрацоўкі гэтага памяшканьня, дык сучаснае яго становішча не дае падстаў, грунтуючыся на якіх можна было-бы вырашыць пытаньне аб яго прызначэньні ў той ці іншы бок. У цяперашні час скляпеньні дольняга паверху проста засыпаны зямлёй і пяском, але ў мурох відаць паглыбленні для трамаў, што паказвае на існаваньне драўлянае падлогі. Самыя муры не затынкаваны, і паверх цаглін няма ніякіх сьлядоў ранейшага тынкаваньня; у выпадку, калі памяшканьне гэтае хаця-бы часткова служыла для жылых мэт,— магчыма, што тут была ў свой час драўляная абшыўка муроў,— але об'ектыўных падстаў для такога зацьверджаньня мы ня маем.

Пералічаныя намі конструкцыйныя асаблівасьці зьяўляюцца досыць важнымі ў пытаньні аб датоўцы гэтага помніку, а таксама аб тым, якое месца займаў ён сярод даўнейшых будоў рагачэўскага замку. Як вынікае з ранейшых нашых уваг, будынак гэты, зразумела, ня можа лічыцца галоўным замкавым будынкам, і ў гэтым сэнсе пашыранае ў Рагачэве перакананьне, што ўласна тут калісьці жыла каралева Бона, не мае пад сабой ніякага рэальнага грунту; будынак гэты бясспрэчна, быў адным з дапаможных будынкаў — ня з ліку малаважных, праўда, як сведчыць яго разьмяшчэньне на досыць выгодным і відным месцы, у той час, як галоўныя замкавыя гмахі знаходзіліся, хутчэй за ўсё, далей на поўнач, у той частцы замкавае гары, якая цяпер аруйнавана. Між іншым, у Сямёнава правільна зазначана, што гэты будынак зьяўляецца толькі часткай (адным з будынкаў) былога рагачэўскага замку. Але агульнакажучы, безадносна да мясцовага тлумачэньня, пашыранае паданьне, якое зьвязвае яго з імем каралевы Боны, мае пад сабою пэўныя падставы.

З актаў Літоўскае Мэтрыкі вядома, што ў 1524 годзе кароль польскі і вялікі князь літоўска-беларускі Жыгімонт I падараваў сваёй жонцы каралеве Боне замак у Пінску разам з прыпісанымі да яго дварамі: Клецкам, Гарадком і Рагачэвам... Атрымаўшы яго (Рагачэў) у сваю ўласную маёмасьць, Бона, магчыма, сама ніколі тут і ня была і кіравала сваім рагачэўскім «меньемъ і грунтомъ» праз спэцыяльных намесьнікаў «дзяржаўцаў» і «спраўцаў». Але ёсьць падставы лічыць, што ласьне ў гэты час тут былі распачаты тыя ці іншыя працы па пабудове сталага замку... Як стратэгічны пункт ён існаваў да 1780 году, пасьля чаго быў паступова знішчаны, што ад усіх ранейшых будоў засталася толькі адна захаваная да цяперашняга часу камяніца.

Ці можна лічыць, аднак, што гэтая апошняя належыць да першапачатковых пабудоў XVI сталецця? Канструкцыя яе не супярэчыць такому дапушчэньню, хоць у сваім сучасным выглядзе, як мы ўжо зазначылі, яна зьяўляецца, бясспрэчна, вынікам пазнейшае пераробкі. Вядома, напрыклад, што рагачэўскі замак не раз разбураўся як у XVI, так і ў XVII сталецьцях, у часе войн з татарамі, з казакамі і з Масквою. Першапачатковы будынак мог быць пры гэтым часткаю зруйнаваны і потым адноўлены ў зьменены выглядзе ў пазнейшы час,— магчыма, у XVII сталецьці, паколькі сучасны выгляд яго мае нешта супольнае з тыповымі будынкамі гэтае эпохі ў Менску і ў іншых беларускіх местах. Але ў тым відзе, які ён хутчэй за ўсё меў спачатку, і які мы спрабавалі аднавіць у зробленай намі рэконструкцыі,— ён мае выразныя стылістычныя рысы архітэктуры XVI сталецьця, у тым яе адменьніку, які ў гэты час быў вядомы і ў іншых месцох Беларусі. Уласна з прыездам Боны пасля шлюбу яе з Жыгімонтам у Беларусі з'явіліся італьянскія архітэктары і май-

стры, якія прынеслі сюды тыповыя формы італьянскага будаўніцтва эпохі Рэнэсансу, што адыгралі досыць важную ролю ў гісторыі разьвіцця архітэктурнага мастацтва ў старадаўніх беларускіх местах. Гэтыя формы былі, напрыклад, ужыты пры пабудове віленскага Дольняга замку пасьля пажару 1530 году, а таксама ў некаторых іншых дзяржаўных і прыватных будовах Вільні. Пры будаванні рагачоўскага замку, што адбылося ў той самы час, яны, натуральна, маглі зьявіцца і тут, асабліва, прымаючы пад увагу асабістыя густы Боны, якія маглі адбіцца ў надворных формах будоў яе ўласнага маёнтку. У даным выпадку, ранейшая канструкцыя ўсходняе часткі горняга паверху, што мела, як мы зазначылі, хутчэй за ўсё, від зьвернутае ў бок Дняпра адкрытае лёджыі з аркадай, з'яўляецца досыць характэрнай адзнакай, і дае ўсе падставы для дапушчэньня аб першапачатковым паходжанні будынку ўласна з XVI сталецця.

Дойлідства Рагачоўшчыны

Рагачоў — адзін з найбольш старажытных гарадоў Беларускага Прыдняпроўя, вядомы па летапісных крыніцах з 1142 г. Ён узнік на месцы гарадзішча мілаградскай і штрыхаванай керамікі культур, якое размяшчалася ў сутоках Дняпра і Друці. Дзядзінец займаў мыс у паўднёвай частцы, за ім на поўнач размяшчаўся гандлёва-рамесніцкі пасад з веерападобнай сістэмай вуліц. Такая структура была характэрна большасці старажытнарускіх гарадоў. У той час Рагачоў уваходзіў, верагодна, у Тураўскае княства. З канца 13 ст. горад знаходзіўся ў складзе Вялікага княства Літоўскага, а з 1509 г. стаў уласнасцю каралеў і вялікага князя Жыгімонта I Старога, які пазней падараваў яго сваёй жонцы каралеве Боне. У сярэдзіне 16 ст. на пакатай пляцоўцы дзядзінца, якая мае мясцовую назву Замкавая гара, была змуравана рэзідэнцыя каралевы ў стылі рэнесансавых італьянскіх палацца. Будынак разбураны ў 1-й палавіне 20 ст.

Гэты выдатны помнік дойлідства даследаваў у 1920-х гадах Мікола Шчакаціхін, які даў яго апісанне. Мураваны двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак меў вальмавы дах. Вуглы аб'ёму былі ўмацаваны магутнымі контрфорсамі, якія па вышыні даходзілі да сярэдзіны 2-га паверха. Арачны ўваход у будынак размяшчаўся ў цэнтры падоўжанага фасада. Ніжні паверх падзяляўся калідорамі на 4 аднолькавыя залы, перакрытыя крыжовымі скляпеннямі. На другі паверх вялі дзве сіметрычныя аднамаршавыя лесвіцы па баках увахода. У дэкоры галоўнага фасада былі выкарыстаны элементы класічнай ордэрнай пластыкі. Гэты помнік з'яўляўся, магчыма, першым у архітэктуры Беларусі палацам сіметрычна-восевай планіроўкі з рэнесансавым фасадам, упрыгожаным рытмічнай паўцыркульнай аркадай. Замчышча з поўначы было абнесена валам з астрогам і вадзяным ровам. Паводле інвентара 18 ст., у той час побач з палацам размяшчаліся флігель з кухняй, царква, дом аканома, гаспадарчыя пабудовы. З вакольным гарадам замак быў звязаны мостам цераз роў, 2-яруснай брамай-вежай, абкружанай галерэяй і накрытай гонтавым дахам.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай замак яшчэ нейкі час захоўваў ваенна-стратэгічнае значэнне. Меркавалася яго мадэрнізацыя з узвядзеннем бастыённай сістэмы, аб чым сведчаць планы ўмацаванняў рагачоўскага замчышча 1779 і 1783 гг., якія захоўваюцца ў архіве ваенна-марскога флоту ў Санкт-Пецярбургу. Яны не былі цалкам рэалізаваны, і паступова ўмацаванні прыйшлі ў заняпад.

Далучэнне да Расійскай імперыі спрыяла станаўленню ў беларускім горадабу-



Даяржаўныя ўстановы ў Рагачове.

даўніцтве прынцыпаў архітэктуры класіцызму, планіметрычнай яснасці і рэгулярнасці. У 1778 г. быў зацверджаны першы праектны план Рагачова. Новая ўпарадкаваная забудова размяшчалася на правым беразе Дняпра за 2 км на паўночны захад ад зліцця з ім Друці і ўтварала рэгулярную сетку прамавугольных кварталаў. Асноўныя вуліцы ішлі ў шыротным напрамку паралельна берагу Дняпра на гэтым участку. Кампазіцыя плана ўключала 2 вялікія прамавугольныя плошчы, адна з якіх была гандлёвай. У 1-й палавіне 19 ст. адпаведна з генеральным планам узводзіліся грамадскія будынкі ў стылі класіцызму. У канцы 18 ст. ў Рагачове быў узведзены мураваны будынак павятовай канцылярыі, дзяржаўных устаноў (присутственных мест), праект якога ўяўляў сабой паменшаную і спрошчаную копію дома губернскага праўлення ў Магілёве. Паводле таго самага тыпавога «ўзорнага» праекта да 1780 г. былі пабудаваны павятовыя канцылярыі ў Оршы і Мсціславе.

У Рагачове будынак канцылярыі стаяў на паўднёвым баку прамавугольнай плошчы, створанай паводле рэгулярнага плана горада 1778 г. (цяпер плошча 60-годдзя Кастрычніка). Двухпавярховы прамавугольны ў плане будынак меў цэнтральна-восевую кампазіцыю з галоўным франтальным фасадам. Цэнтральная частка, вылучаная на фасадзе плоскім рызалітам, завершаным невысокім атыкам, умяшчала вялікі парадны вестыбюль і трохмаршавую лесвіцу. Першы паверх меў калідорную планіроўку. Па баках калідораў, злучаных з вестыбюлем, размяшчаліся невялікія службовыя памяшканні. Залы і кабінеты на другім паверсе мелі анфіладную сувязь. Фасады з мерным рытмам аконных праёмаў, больш шчыльных у цэнтральнай частцы, былі аздоблены плоскімі пілястрамі і філянговымі нішамі ў прасценках.

Паводле праекта 1832 г. на плошчы побач з дзяржаўнымі ўстановамі быў пастаўлены драўляны аднапавярховы будынак павятовага дваранскага вучылішча.

У 1-й палавіне 19 ст. ў Магілёўскай губерні пачалося інтэнсіўнае будаўніцтва транспартных дарог і паштовых станцый. Тыпавы праект мураванага станцыйнага дома для Рагачова, Беліцы, Быхава і Копысі быў створаны ў 1838 г. Комплекс паштовай станцыі складаўся з галоўнага аднапавярховага будынка для падарожных, які стаяў уздоўж магістралі, і сіметрычна размешчаных абапал яго і павернутых да дарогі тарцамі дамоў для паштальёнаў. Будынкі злучаліся мураванай агароджай з праездамі ў вялікі прамавугольны двор. Па перыметры двара размяшчаліся карэтная, стайня, пуня і іншыя паштовыя службы. Вельмі сціплая архітэктурная апрацоўка канцэнтравалася толькі на галоўным «магістральным» баку станцыйнага комплексу. Цэнтр кампазіцыі падкрэсліваў невялікі рызаліт увахода з трохвугольным франтонам. Будынкі былі накрыты пакатымі вальмавымі дахамі. Фасады сціпла дэкарыраваны прафіляванымі карнізамі і ліштвамі аконных праёмаў.

Усе гэтыя грамадзянскія збудаванні не захаваліся і вядомы толькі з архіўных крыніц. На акварэльным малюнку Дз. Струкава 1864 г., які захоўваецца ў рукапісным аддзеле Навуковай бібліятэкі Вільнюскага універсітэта, адлюстраваны агульны выгляд Рагачова ў 2-й палавіне 19 ст.

У 1886 г. панараму горада ўзбагаціў велічны сілуэт праваслаўнага сабора Аляксандра Неўскага, пабудаванага ў псеўдавізантыйскім стылі. Манументальны пяцікупальны храм меў амаль цэнтрычную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю. Асноўны гранёны аб'ём, да якога з усходу прылягалі тры алтарныя апсіды, завяршаўся вялікім светлавым барабанам з купалам і галоўкай. Над бакавымі

Комплекс будынкаў паштовай станцыі ў Рагачове.

Сабор Аляксандра Неўскага ў Рагачове. Канец 19 ст.

апсідамі і прамавугольнымі аб'ёмамі на галоўным фасадзе ўзвышаліся чацверыковыя вежы, завершаныя купалкамі з галоўкамі, якія ствараліі традыцыйнае праваслаўнае пяцікупалле. У аздобе фасадаў эклектычна спалучаліся элементы старажытнарускай і ордэрнай архітэктуры: кілепадобныя какошнікі з пратафіляванымі карнізамі на мадульёнах, пілястрамі і філянговымі нішамі.

Хуткае развіццё Рагачова пачалося пасля пракладкі ў 1902 г. чыгуначнай лініі Магілёў — Жлобін. У пачатку 20 ст. былі пастаўлены значныя грамадскія будынкі і жылыя дамы ўздоўж цэнтральных вуліц, якія аднавілі аблічча горада. Як помнікі архітэктуры захаваліся з таго часу былыя будынкі рэальнага вучылішча (вул. Цымермана, 36) і земскай управы (вул. Леніна, 62).

Двухпавярховы мураваны Г-падобны ў плане будынак рэальнага вучылішча, пабудаваны ў 1903—1905 гг. (цяпер сярэдняя школа № 2), вызначаецца манументальнасцю, планіровачнай яснасцю і строгасцю архітэктуры. Галоўнае крыло мае сіметрычную кампазіцыю з цэнтральнай трохпавярховай часткай і бакавымі рызалітамі, якія першапачаткова былі накрыты высокімі вальмавымі дахамі з люкарнамі. Бакавое крыло кампазіцыйна завершана бельведэрам — гранёнай вежачкай з купалам. У дэкоры фасадаў вялікую ролю адыгрывала кантрастнае спалучэнне адкрытай чырвонай муроўкі прасценкаў з пабеленымі гарызантальнымі элементамі, што надавала «цагляной» архітэктуры будынка маляўнічасць. Пры рэканструкцыі вучылішча ў 1950-х гадах дахі зроблены больш пакатымі, зменены характар двухколеравай афарбоўкі фасадаў, якая падкрэслівае стрыманы ордэрны дэкор, у выніку чаго архітэктура будынка набыла рысы неакласіцызму.

Іншыя мастацкія прынцыпы закладзены ў вобразным вырашэнні будынка земскай управы, пастаўленага ў 1909 г., калі пашырыўся стыль мадэрн. Будынак размешчаны на месцы былой павятовай канцылярыі каля перакрыжавання сучасных вуліц Леніна і Інтэрнацыянальнай. Аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя будынка асіметрычная — у ёй дамінуе вуглавы аб'ём. Галоўны фасад, арыентаваны на плошчу, таксама асіметрычны, падзелены на 4 розныя па памерах часткі, якія завершаны разнастайнымі атыкамі. Вокны ў кожнай частцы фасада маюць розныя памеры, форму і рытм. Колеравае вырашэнне фасадаў заснавана на кантрастным спалучэнні чырвонай і шэрай тынкоўкі. Кампазіцыйныя і дэкаратыўныя асаблівасці будынка характэрны для архітэктуры мадэрна.

Цікавы таксама жылы дом эклектычнай архітэктуры па вул. Леніна, 34, фасад якога аздоблены дробным дэкорам з

Будынак былой земскай управы ў Рагачове.

Рэальнае вучылішча ў Рагачове. Пачатак 20 ст.

Збароўская царква. З малюнка 19 ст.

фасоннай цэглы і каванымі агароджамі балконаў. Падобную эклектычную архітэктуру мае каплічка канца 19 ст. на старых гарадскіх могілках. Яна мае цэнтрычны васьмігранны план (квадрат са зрэзанымі вуглами) і накрыта высокім шатром з цыбулепадобнай галоўкай. Фасады не атынкаваны і насычаны «цагляным» дэкорам (гіркі, какошнікі, рубрыкі і інш.) у псеўдарускім стылі.

З акварэлі мастака Дз. Струкава, які ў 1863—64 гг. рабіў сістэматычныя замалёўкі помнікаў старажытнасці Беларусі, вядома драўляная царква ў в. Збароў, пабудаваная ў 1749 г., якая цяпер не існуе. Гэта быў трохзрубавы трохкупальны храм са своеасаблівай аб'ёмна-прасторавай будовай. Да асноўнага амаль кубічнага зруба, пастаўленага на мураваным падмурку, далучаліся з усходу гранёная алтарная апсіда, а з захаду чацверыковы зруб бабінца. Усе зрубы былі накрыты асобнымі дахамі ў выглядзе пакатых шатроў-«каўпакоў», што былі традыцыйнымі для старажытнага беларускага дойлідства. Шатры завяршаліся «банькамі» — васьміграннымі вежачкамі з галоўкамі ў стылі барока. Над уваходам у бабінец кансольна навісаў невялікі аб'ём званіцы, гранёныя формы якога адпавядалі алтарнай частцы. Гэта дазваляла накрыць зрубы бабінца і алтара аднолькавымі дахамі. Такім чынам, у аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі збароўскай царквы спалучаліся традыцыйныя цяслярскія прыёмы народнага драўлянага дойлідства з элементамі наватарства, што зрабіла гэты помнік па-мастацку адметным.

Тыя ж традыцыі выкарыстаны пры будаўніцтве касцёла ў в. Антушы Побалаўскага сельсавета і Троіцкай царквы ў в. Дварэц.

Касцёл пабудаваны ў пачатку 19 ст. У яго архітэктуры назіраюцца таксама

Троіцкая царква ў вёсцы Дварэц.

Будынак былой царквы ў вёсцы Доўск.

некаторыя рысы класіцызму. Прамавугольныя ў плане асноўны аб'ём і апсіда аб'яднаны адзіным двухсхільным дахам з трохвугольнымі навісямі ў месцы злучэння зрубаў. Па баках апсіды нізкія прыбудовы. Галоўны фасад атынкаваны і завершаны трохвугольным франтонам, які гарызантальна ашаляваны і дэкараваны акантоўкай у выглядзе трыгліфаў. Астатнія фасады ашаляваны вертыкальна, умацаваны сцяжкамі і прарэзаны 2 радамі прамавугольных акон, аздобленых ліштвамі з сандрыкамі.

Троіцкая царква ў в. Дварэц пабудавана ў 2-й палавіне 19 ст. Будынак складаецца з 4 зрубаў, якія ўтвараюць падоўжна-восевую аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю. Аснову складае квадратны ў плане зруб, завершаны 8-гранным светлавым барабанам, накрытым пакатым шатром з галоўкай. Да яго з усходу і захаду прылягаюць прамавугольныя зрубы алтара і трапезнай, да якой далучаны бабінец з 2-яруснай вежай-званіцай (васьмярык на чацверыку), таксама завершанай галоўкай. Кампазіцыя вярхоў дынамічная і стварае выразны сілуэт помніка.

Мураваная царква ў цэнтры в. Доўск пабудавана ў пачатку 20 ст., але значна зменена перабудовамі. Крыжападобны ў плане будынак мае цэнтрычную кампазіцыю з амаль ідэнтычнымі фасадамі. Рызаліты, размешчаныя на восях плана, завершаны невысокімі шчытамі. Аздоба фасадаў, абрамленні парталаў і акон маюць псеўдакласіцыстычны характар.

Прысядзібны парк у в. Кісцяні створаны ў пачатку 19 ст. ў характэрным для класіцызму пейзажным стылі. Ландшафтная кампазіцыя парку раскінулася на дзвюх надпойменных тэрасах на высокім правым беразе Дняпра. На верхняй паўкруглай тэрасе стаяў сядзібны дом, ад якога адкрываліся далёкія перспектывы. У гэтай частцы парку захаваліся толькі асобныя групы дрэў, дом не

Парк у вёсцы Забалацце.

збярогся. У паўночнай частцы парку на ніжняй тэрасе збераглісь рэшткі рэгулярнай планіроўкі з круглым штучным узгоркам і двухрадныя алеі з хвоі звычайнай. У дэндралагічным складзе парку пераважаюць мясцовыя пароды дрэў — клён, ліпа, таполя, рабіна, але ёсць і экзатычныя расліны: лістоўніца Сукачова, конскі каштан звычайны. Каля берага захаваўся экземпляр елкі звычайнай, у кроне якой знаходзілася альтанка.

Яшчэ адзін прысядзібны парк быў закладзены ў 2-й палавіне 19 ст. на паўднёва-ўсходняй ускраіне в. Забалацце. Тэрыторыя парку падзяляецца галоўнай уязной алеяй на пейзажную паўднёвую частку і пладовы сад у паўночнай частцы. Гэта так званы «эканамічны» парк перыяду капіталізму. У пейзажнай частцы былі вадаёмы, абкружаныя сцежкамі з маляўнічымі палянкамі і групамі дрэў, кустоў бэзу, чаромхі, акацыі. Раслінны свет пераважна з мясцовых парод: вярба, дуб, арэх, бяроза, вольха і інш.

Т. В. Габрусь.

Сялянскія хваляванні ў вёсцы Званец

У Рагачоўскім павеце былой Магілёўскай губерні знаходзіўся маёнтак Іаахімава з прылеглымі вёскамі Званец, Валосавічы, Ямнае, Гута і іншымі. Спачатку маёнтак належаў памешчыкам Жукоўскім, але яны яго заклалі за даўгі, выкупіць не змаглі, і ён быў перададзены жонцы генерал-маёра Вішчынскага, якая неўзабаве прадала яго памешчыкам Барысавічам. Бязлітаснымі і жорсткімі былі Барысавічы. Зусім невыносныя ўмовы жыцця стварылі яны для прыгонных сялян. І прыгонныя, якія не мелі права нават стаяць перад сваімі ўладальнікамі з паднятай галавой, прама глядзець на іх, бо ў гэтым ужо быў выклік уладзе, надалі падаць на Барысавічаў скаргі: беларускаму ваеннаму губернатару і сенатару Баранаву, які аб'язджаў губерню. 100 чалавек сялян прасілі «абароны ад прыгнёту Барысавічаў і пазбаўлення іх ад голаду». Яшчэ больш бесчалавечна

пачалі мучыць сваіх прыгонных Барысавічы, калі даведаліся пра гэтыя скаргі, і цярплівасці сялян прыйшоў канец. Жыццё было такое цяжкае і страшнае, што не было з чаго выбіраць — або біцца якога-небудзь паляпшэння, або памерці.

Супраць Барысавічаў выступілі ўсе іх сяляне. Яны з'явіліся ў маёнтак Іаахімава са сваімі патрабаваннямі. Але памешчыкі выклікалі мясцовую земскую паліцыю. Тады сяляне яшчэ шчыльней абступілі памешчыцкі дом і пачалі пагражаць падпалам. Былі выкліканы салдаты. Пачаліся суд і расправа. Высветлілася, што выступленне прыгонных не было стыхійным. Трое сялян з в. Званец — Федасей Нікіцін, Рыгор Якаўлеў і Сцяпан Усцінаў — пачалі збіраць сялян і гаварыць ім, што «калі не будуць аддзяляцца ад згуртавання іх і паслухаюцца іх парад, то вызваляцца ад уладарання Барысавічаў...». Яны першыя напісалі скаргі, а потым да іх далучыліся і іншыя сяляне. Суд прызнаў іх завадатарамі і кіраўнікамі сялянскага бунту...

Расправу наладзілі ў в. Званец. Сюды сагналі сялян з усіх уладанняў Барысавічаў глядзець, як будуць пакараны непаслухмяныя, каб запалохаць і адбіць нават думкі аб выступленні супраць сваіх паноў. Вось і прыгавор: «Пакараць праз ката пугай і даць Якаўлеву і Усцінаву па 24, а Нікіціну 30 удараў, потым саслаць на катаржныя работы. Вёска Ямнае — Улас Іваноў, вёска Валосавічы — Ігнат Панкратаў, вёска Гута — Іван Ігнатаў і вёска Малашкавічы — Іван Панцялееў з тым, што далучыліся да названых трох сялян пры падачы скаргі і што да раскаяння і паслухмянасці аказваюцца ўпартымі, пакараць у тым жа маёнтку праз паліцэйскіх служыцеляў бізунамі і даць кожнаму па 50 удараў. З вёскі Гута 12 чалавек за тое, што не раскаяліся і былі ўпартыя ў непаслухмянасці ўладарам — пакараць праз паліцэйскіх жа служыцеляў у зборы народу бізунамі і, даўшы па 25 удараў, або пакінуць у маёнтку, калі ўладальнікі будуць згодны, або саслаць у Сібір...»

Жанчын, старых і дзяцей сілай загналі глядзець на пакаранне паўстанцаў. У адной палавіне кола, утворанага людзьмі, кат з пугай здзекваўся над людскімі душамі і целамі, у другім баку свістаў бізун ў руках паліцэйскага. Бязупынны лямант, стогны, плач... І пах крыві... прыкры, цяжкі... А затым кандалы на рукі і ногі і — у Сібір. Доўга беглі жонкі і дзеці за роднымі людзьмі, якіх забіралі на чужыну.

Разышоўся народ... Цяжкая, падманлівая цішыня... Але ўлады і памешчыкі Барысавічы не выклікалі ў сялян пачуцця страху і пакорлівасці. Яшчэ не змоўк кандальны звон, яшчэ не высахла зямля, палітая чалавечай крывёй, а сяляне Васіль Максімаў з в. Малашкавічы, Фёдар Паўлаў з в. Званец, Павел Іваноў з в. Ямнае, зноў трое, як бы працягваючы пачатую справу тых трох, пайшлі па вёсках, з хаты ў хату, збіраючы грошы на паездку ў Пецярбург. Вырашылі дайсці да самога цара. Верылі, што цар-бацюхна абароніць іх ад памешчыкаў. І зноў выявілася поўнае аднадушша сялян, ніхто не адмовіўся ад узносаў, было сабрана 100 рублёў. З цяжкасцю ўпрасілі аднаго салдата, які больш-менш ведаў грамату, напісаць скаргу на імя цара.

«...Барысавічы адмянілі былыя да ранейшых уладальнікаў карысныя для іх, сялян, установы, увялі строгае кіраванне, якое да крайнасці абцяжарвала сялян: эканамічныя пасевы, якія складалі раней дзевяноста чвэрцяў, памножылі больш чым да двухсот; забралі ворныя і сенакосныя землі, пакінуўшы толькі пры агародах, астатнія ж усе абрэзалі па самыя вокны, і Барысавічы не даюць ім карыстацца вадой, вёску Валосавічы перасялілі зусім на нязручнае месца; забраны ад сялян вёскі Малашкавічы і знішчаны пчолы; прыгнятаюць прыгонам, загадваючы на бароны накладваць колы, і ўчыняюць ім жорсткае пакаранне; пасля прыводу ў панскі дом згвалцілі дзевак; правіянцкі пісар для асабістай выгады збіраў з сялян курэй, яйкі, ялавічыну, гарэлку; у час існаваўшага ў 1821 годзе неўраджаю Барысавічы не толькі не мелі клопату аб пракармленні сялян, але зрабілі падрад на вывазку для карабельнага будаўніцтва суцэльных дубоў, праз што сяляне пазбавіліся мноства коней і вупражы, а сем'і іх у той час цярпелі голад. Барысавічы забралі асабістую сялянскую краму, у час малацьбы сялянамі на асабістых іх гумнах ставяць варту, і ўсякі ўладальнік абсявае поле толькі тым хлебам, які ўкрадзе з асабістага свайго. Ад такога прыгнёту, разарэнняў і асабліва ад голаду некаторыя сяляне памерлі, а іншыя разышліся. Ад пакарання прыказчыка Чайкоўскага памёр селянін Рыгор Андрэеў, а ад пабояў дваровага ткача Ігната — Малах Кандратаў».

Паездка ў Пецярбург, якую рыхтавалі сяляне, захоўвалася ў тайне... І вось ноччу трое смельчакоў пусціліся ў дарогу. Даводзілася пазбягаць людных месцаў (не было дакументаў, і памешчык іх ужо шукаў), там-сям падкупляць палі-

цэйскіх, каб не адвялі ва ўчастак. Да Пецярбурга яны дабраліся, але тут іх затрымалі. Пры вобыску і знайшлі гэтую скаргу на імя цара.

Сенат паслаў магілёўскаму губернатару ўказ як мага строга пакараць гэтых сялян. Указ паслалі з нарачным, які суправаджаў арыштаваных.

Судзілі іх у Рагачоўскім павятовым судзе за тое, што «...не паслухаўшы ўнушэння начальства, не звярнуўшыся да належнай уладзе паслухмянасці і атрымаўшы сабраныя з сялян 100 рублёў, самавольна адлучыліся з месца жыхарства без пісьмовых відаў у С.-Пецярбург для прынясення скаргаў на памешчыкаў Барысавічаў...».

На судзе сяляне заявілі, што «падпарадкавацца памешчыкам Барысавічам ні пад якім выглядам не згодны, і лепш жадаюць страціць жыццё, чым застацца ва ўладанні іх».

У. Л. Кігн.

Ім прысудзілі кожнаму па 25 удараў пугай ката і ссылку ў Сібір на катаржныя работы. Салдата, які пісаў ім скаргу, сяляне не выдалі.

Сенат быў задаволены... Сяляне пакараны... А гісторыя ішла сваім ходам.

Т. А. Вараб'ёва.

Маці і сын

Лізавета Іванаўна Паўлоўская вядома як збіральніца беларускіх народных песень. Яна нарадзілася ў 1830 г. ў Магілёве ў сям'і ваеннага. Скончыла Магілёўскую гімназію. Склала зборнік «Народныя беларускія песні», які быў выдадзены пад крыптанімам Е. П. у 1853 г. ў Пецярбургу. У кнігу ўвайшлі творы каляндарна-абрадавай і пазаабрадавай народнай лірыкі, запісаныя ў Быхаўскім павеце. Значная частка кнігі адведзена апісанню вясельнага абраду і тэкстам звязаных з ім песень. Гэта было першае асобнае выданне беларускіх фальклорных твораў, надрукаваных кірыліцай. Станоўчы водгук на зборнік далі часопісы «Современник» і «Отечественные записки», але адзначалі, што падрадковы пераклад беларускай песні на рускую мову прывёў да значных мастацкіх страт.

У 1853 г. Лізавета Паўлоўская выйшла замуж за юрыста Людвіга Іванавіча Кігна. Сям'я пераехала ў Тамбоў, куды мужа перавялі на службу. Там 15.1.1856 г. ў іх нарадзіўся сын Уладзімір, якому наканавана было стаць пісьменнікам. У 1860 г. Кігны вымушаны былі вярнуцца на Беларусь, таму што ў час пажару згарэў іх дом. Яны знайшлі прытулак у дзядзькі Лізаветы ў в. Фёдараўка Рагачоўскага павета. Тут Паўлоўская жыла да самай сваёй смерці ў 1915 г.

Уладзімір Кігн таксама амаль увесь час жыў на Рагачоўшчыне ў вёсках Дзедлава (адсюль яго псеўданім — Дзедлаў) і Фёдараўка. У 1880 г. ён скончыў Пецярбургскі універсітэт. Аўтар апавяданняў, рэцэнзій і нарысаў, якія друкаваў у газеце «Неделя», часопісах «Русское богатство», «Наблюдатель», «Вестник Европы», «Дело», «Нива», «Север». Найбольш значны твор — аповесць «Сашачка» (1892). У ёй адлюстраваны канфлікт народнікаў-шасцідзесятнікаў (паказаны тэндэнцыйнымі і недарэчнымі ва ўмовах 80-х) і народнікаў-васьмідзесятнікаў з іх тэорыяй «малых спраў». У 1892—1904 гг. перапісваўся і сустракаўся з А. Чэхавым, які прыхільна ставіўся да творчасці Кігна. Падарожнічаў па Расіі, Італіі, Егіпце, Сірыі, Турцыі і інш. У 1878 г. надрукаваў цыкл нарысаў «Беларускія сілуэты», у якіх, як і ў творах «Перасяленцы і новыя мясціны» (1894), «Панарама Сібіры» (1900), з замілаваннем і павагай пісаў пра Беларусь, сялян-беларусаў. Памёр Уладзімір Кігн 3.6.1908 г. ў Рагачове.

Першае стагоддзе Азяранскага вучылішча

Азяранскае прыходскае аднакласнае вучылішча для дзяцей бедных шляхціцаў было адкрыта паводле пастановы польскага сейма ў 1791 г. пры рымска-каталіцкім кляштары. Аб першых гадах дзейнасці гэтай навучальнай установы

ніякіх дакументаў не захавалася, толькі ў 1819 г. была пачата кніга, накшталт класнага журнала, у якой вёўся запіс пра вучняў, якія паступілі і выбылі, ставіліся адзнакі за паводзіны і поспехі, паказвалася прыналежнасць да саслоўя і за чый кошт (бацькоў, дзяржавы ці кляштара) яны ўтрымліваюцца. З гэтага журнала вынікала, што клас падзяляўся на некалькі груп і што сярод дысцыплін былі закон божы, які выкладалі каталіцкія святары, лацінская і польская мовы. У 1825 г. Азяраны наведаў дырэктар вучылішчаў Магілёўскай губерні, які запатрабаваў розныя звесткі аб вучылішчы і загадаў увесці навучальную праграму, што існавала ў Расіі. Але гэты загад яшчэ некалькі гадоў не выконваўся. З 1833 г. запісы ў кнізе вяліся ўжо не на польскай, а на рускай мове. У 1834 г. вучылішча стала ўстановай ланкастэрскага тыпу, г. зн. адзін з падрыхтаваных вучняў сам выкладаў сваім сябрам. У 1836 ці 1837 г. быў пабудаваны новы школьны будынак — драўляны дом памерам 22 на 8 аршынаў. На аплату наставнікаў кляштар траціў 114 руб., на падручнікі і іншыя дапаможнікі — 66 руб., усяго каля 500 руб. у год.

У 1842 г. вучылішча было перададзена міністэрству народнай асветы. Гэта тлумачылася тым (як запісана ў падрыхтаваным да сотай гадавіны дзейнасці вучылішча гістарычным нарысе), што дагэтуль вучылішча займалася «распаўсюджваннем і замацоўваннем у выключна праваслаўнай краіне каталіцтва», і як доказ быў прыкладзены спіс вучняў. У 1837/38 навучальным годзе ў вучылішчы займаліся 29 чалавек з усіх паветаў Магілёўскай губерні. З іх дваран-каталікаў было 26, духоўнага саслоўя грэка-расійскай веры — 2 і адзін селянін-каталік.

Вельмі цікава суаднесці даты, калі пачыналіся «перабудовы» ў вучылішчы, з тым, што адбывалася ў краіне, напрыклад з паўстаннем дзекабрыстаў, нацыянальна-вызваленчай барацьбой 1830—31 гг., ці тое, што адзін з лепшых настаўнікаў Крутовіч быў звольнены як каталік у 1865 г.

З цягам часу вучылішча ператварылася ў звычайную царкоўнапрыходскую школу, дзе рыхтавалі ў асноўным на вельмі паважаную ў той час пасаду сельскага пісара.

З 1819 па 1891 гг. вучылішча скончылі 932 чалавекі.

У 1891 г. быў урачыста адзначаны стогадовы юбілей дзейнасці вучылішча, аб чым сведчаць і дакументы («Аб святкаванні стогадовага юбілею Чэрыкаўскага, Азяранскага і Мсціслаўскага народных вучылішчаў»), якія захоўваюцца ў Дзяржаўным гістарычным архіве Рэспублікі Беларусь у г. Мінску.

С. Г. Грынкевіч.

Рэвалюцыянерка з Рагачова

Удзельніца рэвалюцыйнага руху ў Расіі ў канцы 19 стагоддзя Г. М. Дабрускіна — ураджэнка г. Рагачова. У энцыклапедычным слоўніку «Гранат» была надрукавана напісаная ў красавіку 1925 г. ў Растове-на-Доне яе аўтабіяграфія, якая са скарачэннямі прыводзіцца ніжэй.

ДОБРУСКИНА Генриета Николаевна

Родилась я в 1862 г. 5 января в г. Рогачеве Могилевской губ. Семья наша жила в нужде: отец пробивался уроками. Он был романтик и мечтатель, далекий от жизни, свободолюбивый и патриот, мечтавший о старом Иерусалиме и грезивший им. Писал стихи на древнееврейском языке, жил одно время в Париже, где бывал у Виктора Гюго, которого боготворил, и умер в Палестине. Мать, более практичная, чем отец, несла всю тяжесть повседневной жизни. Она любила читать, и дом наш был наиболее интеллигентный в городишке. Вечерами устраивались чтения. Читали Гёте, Гейне, Берне. Нас было 5 человек детей. Учились мы сначала дома. Одно время жил у нас и занимался с нами Млодецкий, впоследствии покушавш. на Лор.-Меликова и казненный. Была еще мала и определенных воспоминаний о нем не сохранила, кроме того, что он был выдающимся педагогом. Учились мы в пансионе «для благородных девиц». Как-то раз вечером пришла к нам знакомая акушерка, Кайранская, и привела своего брата, приехавшего к ней погостить. Весь вечер (это было в 1875 г.) он рассказывал о великом порыве хождения в народ, охватившем лучшую часть нашей интеллигенции. Притаившись в углу, мы, дети, слушали эти рассказы. Со мною вместе училась моя подруга, Дебора Познер, привлеченная впоследствии по Лопатинскому делу, высланная административно в Архангельскую губ., где она умерла.

Г. М. Дабрускіна.

И вместе с нею мы стали мечтать о том, чтобы учиться, идти в народ и своими знаниями служить ему.

В 1876 г. поступила в Могилевскую Мариинскую гимназию. Гимназическая наука глубоко поразила меня. Наш маленький пансион был идеалом по сравнению с мертвенной гимназией. Мы зубрили теорию словесности, без смысла, в 5-м кл. решали задачи по арифметике. Эта школа могла отбить охоту к учению даже у святого. В 6-м классе появился у нас новый учитель словесности, который упразднил «ъ» и начал разбирать литературные произведения как отражения духовных стремлений русского об-ва. Все учение приобрело новый смысл. Учитель истории останавливался долго на истории французской революции и ее влиянии на жизнь других европейских народов. Оба эти учителя толкали нас на размышления, и к бессознательному стремлению, к порыву присоединялось сознательное отношение...

По окончании гимназии уехала домой. Наши материальные дела были в самом хаотическом и безнадежном состоянии, и ни о какой поездке учиться дальше думать не могла. Уже с 6-го класса давала уроки и училась сама. По окончании гимназии мне предложили место гувернантки в Пропойске, местечке Могилевской губ. Приняла это предложение.

Все местечко было населено предпринимателями и рабочими, занимавшимися сплавом леса в Екатеринослав. Время прохождения плотов через пороги было страшное для предпринимателей: оно сулило богатство или разорение. В спокойное время шла беспрерывная карточная игра, выпивка и пошлые, двусмысленные разговоры. Нужно было большое усилие воли, чтобы не опуститься. Пришла болезнь — воспаление легких. Она была моей избавительницей. С возвращением здоровья отправилась в Могилев. Учитель словесности дал мне 30 руб., и на эти деньги я уехала в Петербург. Приехала с 12 руб., с громадным запасом энергии, жажды знания и деятельности.

Попала сразу в студенческую среду, поступила на Бестужевские курсы на естественное отделение. Начала искать работу, чтобы жить, и подходящей компании, чтобы учиться. Чем только ни занималась я. Брала вышивание, переписку всяких бумаг, давала уроки французского языка и все-таки очень часто голодала.

Гораздо более повезло мне в поисках кружка саморазвития. Попала в кружок, изучавший сектантство. Занятиями руководил Яков Абрамов, писавший много по этим вопросам... После сектантства занимались политической экономией. Начали с Чупрова, Янсона, постоянно спотыкаясь, ища объяснения, но постепенно, уча и учась, перешли на Адама Смита, Рикардо, Милля. Студенческая среда, в которую я попала, в общем была проникнута хорошими стремлениями, но сознательных революционеров, активных работников, принимавших участие в революционном движении, было мало; так же мало было в ней и реакционных элементов. С настоящими революционерами еще не встречалась.

В 1881 г. пошла 8 февраля в университет на акт. Профессор Бекетов в мундире, ленте и орденах читал отчет нудно, томительно. Наконец, он кончил. Начались доклады, и вдруг смятение, шум: студент Подбельский подошел к министру народного просвещения Сабурову и пытался дать ему пощечину. В это время с хор другой студент, приятель Подбельского, Коган-Бернштейн произносил речь, требуя возвращения Устава 1864 г. и в то же время разбрасывая прокламации. Произошло замешательство, шум, ловля и подхватывание прокламаций. Когда все успокоилось, мы разошлись, взволнованные, получив революционный заряд. В феврале же умер Достоевский. Студенчество приняло горячее участие в похоронах, но чтило в нем петрашевца и бывшего каторжанина больше, чем знаменитого писателя. События следовали с неимоверной быстротой. Разразилось 1 марта 1881 г., глубоко потрясшее русское общество. Сидеть долго над саморазвитием уже не хотелось. Хотелось работы активной.

В это время у меня завязались знакомства в революционной среде.

Познакомилась с Ал. Блеком и стала работать; распространяла прокламации, хранила литературу, познакомилась ближе с программами существовавших пар-

тий. Все мои симпатии были на стороне Народной Воли и в Н. В. я начала работать. Я много работала среди молодежи, устраивала кружки, да нередко вызывали меня для изложения программ революционной партии. 1 марта революционизировало не только меня, но и многих, как я.

Наиболее отзывчивыми оказались курсистки естественницы и студенты естественники. На курсах чаще стали сборы в пользу заключенных, ходили в качестве невест и родственниц на свидание к заключенным. Еще в 1880 г. познакомилась и подружилась с кружком поляков: Станкевичем, Плосским, Дембским, Рехневским, графом Зубовым — русским из Шавлей, но работавшим вместе с поляками. Он сделался пролетариатцем впоследствии и участвовал в переговорах о соглашении с Н. В. Мои отношения с ними позднее из простой дружбы обратились в революционную связь.

На курсах близко сошлись с однокурсницей Софьей Сладковой, поселились вместе на Петербургской стороне, на Б. Дворянской, и устроили у себя конспиративную квартиру.

Здесь встречались народовольцы; у нас же позже происходили переговоры между народовольцами и пролетариатцами. К нам же после своего мнимого побега явился и Дегаев. Он произвел на меня отталкивающее впечатление своими бегающими глазами. Инстинктом почувствовала в нем предателя. Я высказала Куницкому свои сомнения. О провокации его еще тогда не знали.

Ушла с головой в революционную работу. Сладкова ушла от меня хозяйкой типографии, и я поселилась одна. Начала подумывать об исполнении моего самого заветного желания — работать среди рабочих. П. Ф. Якубович познакомил меня с учителем городской школы Ив. Иван. Поповым, который познакомил меня со студентом Мойсеевым, и мы все 3 работали среди рабочих Петербурга. Выдающихся рабочих не встречала тогда, и мои знакомцы делали первые революционные шаги. Весной 83 г. нужно было везти литературу в Белосток; с этой литературой поехала я. Литература предназначалась для рабочих. Там встретила рабочих, уже более распропагандированных, а один из них, ткач, еврей, сам руководил революционными кружками и организовал их. Там же нашла я и интеллигентский кружок. Из Белостока поехала в Варшаву. Там ставилась типография. Хозяйкой квартиры, где находились шрифт и все принадлежности, была Софья Онуфрович, моя старая приятельница, потом жена Эдмунда Плосского. В Варшаве в это время были Людвиг Варынский, Дулемба, Плосский, Янина Ентыс, классная дама института, которую называли польской Перовской. Поразила меня их неконспиративность. Ходили мы все вместе обедать. Давали нам всегда отдельный кабинет. Подавал лакей, который, мне казалось тогда, отлично понимал, что мы за люди. На свадьбе Плосских были мы все, и все сходило. Думаю, что такое отношение объяснялось ненавистью поляков к официальной России. Рабочие поразили меня своим внешним видом — их трудно было отличить от интеллигентов. Они были тогда и развитее, и революционнее наших рабочих. Пролетариатцы поручили мне связать рабочую организацию Белостока с Варшавой; в «Пролетариат»,— орган поляков — должны они были посылать отчеты. Осенью 83 г. вернулась в Петербург. Мне дали паспортный стол, который вскоре пришлось передать в другие руки, а сама я переселилась на Пушкинскую улицу, где жили мы вместе с курсисткой Константиновой. В это время возникает новое течение в Н. В., известное под названием «Молодой Н. В.». Представителем его являлся П. Ф. Якубович. Многие из нас сознавали тщетность усилий интеллигенции, не опирающейся на массы, и в поисках выхода набрели на аграрный и фабричный террор. К Якубовичу присоединилось много петербургской и киевской молодежи. В то время мое отношение к «Мо. Н. В.» еще не вполне определилось, хотя многие из их положений были близки мне...

В январе 84 г. была арестована Киевская типография, где был взят адрес прис. повер. Тура. Арестованный Тур сказал, что письма передавал мне. За мной началась слежка.

Петр Филиппович Якубович дал мне связи с Ростовом н/Д, рассчитывая на то, что там найду кружок «Молодой Народной Воли». Перешла на нелегальное положение и уехала в Ростов. Через местного деятеля Мелькона Каялова нашла старого народовольца А. Баха и местную группу. Тут жил и предатель на нашем процессе, Елько. Местная группа прекрасно работала. Во главе ее стоял Петр Пешекеров. Здесь взялась за работу среди рабочих. Среди них еще веял дух Панкратова и Борисовича. Из фамилий у меня осталась только одна — это Августа Райха. Его показания читались на суде. Кружков было несколько. Ходили мы заниматься на каменоломни, причем

приходила туда я одна, а рабочие собирались позже. Обратно мы возвращались вместе, так как был поздний час. Читала им в популярном изложении главы из «Капитала» Маркса о прибавочной стоимости, о трудовой ценности, «Коммунистический Манифест», знакомый мне давно в русском переводе... В Ростов тем временем съезжалось много нелегальных. Ставилась типография... Достаточного количества шрифта не было и нужно было его раздобыть. Для этого поехала в Новочеркасск, свела знакомство с печатниками, раздобыла целый чемоданчик шрифта, и наша типография заработала. Пришлось мне свести знакомство и с предателем Геером, кот. чинил у меня на квартире 4 бомбы, привезенные из Луганска. Они хранились у меня. В августе ездила в Ейск к Луке Колегаеву за деньгами для Н. В.

За ними, так же как и за снарядами, приезжал в Ростов Герман Александрович Лопатин. Как известно, приезд Лопатина объединил в России враждующие направления. Он занялся собиранием Н. В. В сентябре уже начал выходить № 10. Все вышедшие №№ «Н. В.» лежали у меня в ларе, который стоял на веранде. 6-го октября в Петербурге были арестованы Лопатин и Салова. 16 октября я была арестована на улице. Кроме меня, арестована была вся местная группа. Меня привели домой, когда обыск был уже окончен. Когда меня вели через веранду, жандармский полковник спросил хозяйку — нет ли где еще моих вещей. С трепетом смотрела на нее, но она ответила,— «нет». И меня увезли, 10 № был спасен и передан по принадлежности. После 2-недельного сидения в Ростове, где я не назвала своей фамилии, после очных ставок была увезена в Петербург, где до суда просидела в Петропавловской крепости и в Доме предварительного заключения около 3-х лет. Судилась по процессу Г. А. Лопатина. Суд — это экзамен для каждого революционера. Одеваешь праздничное платье и сам какой-то праздничный. Здесь проявляется стойкость, убежденность человека и революционера. С глубоким волнением ждала обвинительного акта и суда. Еще раньше управляющий Домом предварит. заключения, полковник Ерофеев, говорил мне, что Елько выдает злостно, но я ему верить не хотела. И вот нам вручили обвинит. акт. Сколько горьких разочарований: Елько, человек, преданный революции, оказался злостным предателем; другим предателем обнаружился Геер,— но от этого ничего я и не ждала. Сколько слабости! Зато с каким восторгом смотришь на смелых и стойких. Процесс наш начался 4-го июня 1887 г. 15 человек были приговорены к смертной казни, в т. ч. и мы с Саловой. Казнь заменена каторгой и поселением. На мою долю выпало 8 лет каторги. 18 июля мы с Саловой были наряжены в арестантские костюмы и выведены в контору, где собирались уже П. Ф. Якубович, В. И. Сухомлин и др. Мы были направлены на Нерчинскую каторгу; на Карийские золотые промыслы. В пути мы были около года и на Кару приехали в октябре 88 г. Еще в пути мы узнали об увозе Ковальской и о Карийских волнениях. С тяжелым чувством вошли мы в тюрьму. Все время сиденья было сплошной трагедией. Участвовали в двух голодовках: в 8 и в 16 суток. Год просидели в одной камере с душевно-больной Тринидатской. О смерти наших товарок узнали только в январе 1890 г. Осенью в 1890 г. вышла в вольную команду; вскоре вышла замуж за Адриана Федоровича Михайлова, в 1895 г. мы вышли на поселение. Жили мы на приисках на Витиме, а затем Рос. Золотопром. о-ва недалеко от Читы. Там устраивали бесплатную школу для детей рабочих, в кот. одна занималась. Имела 18 учащихся. В 1900 г. уехала в Читу, куда мужа не пустили как особо опасный элемент. Через год и он переехал в Читу. Когда вн с-р.-ское движение, оно вызвало мое сочувствие, как почти всех стариков. В Чите занималась уроками, имела массу учеников и занималась краснокрестовской работой, а в 1905 г. образовался местный комитет, в кот. вошла вместе со многими из наших стариков и из молодежи, выросшей на наших глазах... После освобождения из тюрьмы А. Ф. (он сидел за 1905 г.) мы 11 июня 1907 г. вернулись в Россию, в Одессу, где в течение 10 лет работала среди женщин-работниц и вела красно-крестовскую работу, часто в одиночестве. После переворота была избрана представителями партий и Сов. Раб. Деп. председательницей комитета помощи политическим амнистированным. В настоящее время живу в Ростове-на-Дону[1].

Деятели СССР и революционного движения России: Энцикл. словарь Гранат. М., 1989. С. 74—77.

---

[1] З 1931 г. Г. М. Дабрускіна жыла ў Маскве. Памерла ў 1945 г.

Рэвалюцыйныя падзеі 1905—07 гг. на Рагачоўшчыне

1905 год

24 студзеня (6 лютага). Аднадзённая палітычная забастоўка ў Рагачове. Баставала 250 чалавек. Люты (другая палавіна), сакавік, масавыя парубкі памешчыцкага лесу сялянамі Рагачоўскага павета.

ПРАШЭННЕ ПАМЕШЧЫКА РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА Э. І. БУЛГАКА МІНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ П. Р. КУРЛАВУ АБ ПРЫНЯЦЦІ МЕР СУПРАЦЬ ПАРУБКІ ЛЕСУ СЯЛЯНАМІ Ў ЯГО МАЁНТКУ

1 сакавіка 1905 г.

В имении моем Добосне, расположенном в Бобруйском уезде Минской (губ) и Рогачевском уезде Могилевской губ., жители дер. Скрипица Качеричской вол., староверы, с половины февраля м[еся]ца стали производить массовые порубки принадлежащего мне леса — уже в пределах Могилевской губ.

Толпой в 30—40 чел. они наезжают в лес, рубят что им угодно и где угодно, и отъезжают в дер. Скрипица, расположенную в Минской губ., увозя с собой все похищенное. Лесная стража имения справиться с рассвирепевшей, вооруженной топорами и дубинами толпой, угрожающей избиениями и убийствами, конечно, не в силах. Я обращался к содействию местной полиции, но увещевания станового пристава делу не помогли и немедленно после его отъезда массовые порубки повторились и продолжаются ежедневно, и мой лес остается без защиты, в распоряжении грабителей.

Ввиду изложенного честь имею покорнейше просить вас принять самые энергичные меры для прекращения сего наглого произвола и ограждения моей собственности.

Эдгар Игнатьевич БУЛГАК.

Начало первой русской революции, янв. — март 1905 г. М., 1955. С. 654.

18 красавіка (1 мая). Святкаванне 1 Мая сялянамі сяла Карма. Сяляне спявалі рэвалюцыйныя песні і крычалі «Далоў самадзяржаўе». 13 чалавек удзельнікаў святкавання адпраўлены ўраднікам у Чачэрск. Забастоўка рабочых і рамеснікаў у Рагачове.

6(19) мая. Хваляванні сялян у в. Лучын.

З ПРАШЭННЯ СЯЛЯН ВЁСКІ ЛУЧЫН МАГІЛЁЎСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ Ў СУВЯЗІ З АДМОВАЙ ПАМЕШЧЫКА Ў ПРАДАСТАЎЛЕННІ ПАШЫ ДЛЯ ЖЫВЁЛЫ

6 мая 1905 г.

Крайне тяжелые земельные условия слишком неблагоприятно отзываются на нашем сельском хозяйстве, а поставленные к тому же в зависимость от соседнего помещика им. Заболотье Хрущева становятся положительно невыносимыми, так как наша надельная земля со всех трех сторон окружена и граничит с землею его, Хрущева, а с четвертой — р. Днепром. При таком расположении границ мы совершенно лишены паши, т. е. возможности пасти где-либо свой скот.

До настоящего года помещик Хрущев отдавал нам пашу или на отработ или на наличные деньги. На все условия, какие он нам предлагал, мы соглашались, в точности выполняя их. В текущем же году помещик Хрущев, по неизвестной нам причине, не дает нам паши и не соглашается ни на какие условия, благодаря чему скот наш обречен почти на голодовку, а это уже грозит неблагоприятно отозваться на нашем хозяйстве.

Вышеприписанные отношения помещика Хрущева, не соглашающегося ни на какие наши условия, вынудят нас в силу крайней необходимости на самовольную пастьбу нашего скота на его земле...

Уполномоченные от общества крестьяне с. Лучина Василий Емельянов, Иван Андреев и Алексей Агеев, а за них неграмотных по их просьбе расписался и сам за себя Моисей Назаров.

Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.). Мн., 1953. Т. 3. С. 226.—227.

9(22) чэрвеня. Аграрныя хваляванні ў вёсках Міхалёўка, Лугавая, Вірня, Стоўпня.

З ДАНЯСЕННЯ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА ТАВАРЫШУ МІНІСТРА ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ, ЗАГАДЧЫКУ ПАЛІЦЫІ ПРА АГРАРНАЕ ВЫСТУПЛЕННЕ СЯЛЯН І ЗАБАСТОЎКУ БАТРАКОЎ У ПАВЕТАХ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

16 чэрвеня 1905 г.

...О новых, полученных мною сообщениях о самоуправных действиях крестьян докладываю следующее:

1. По донесению исправника Рогачевского у., крестьяне дер. Михалевки явились 9 июня с кольями в им. Гуту Селивестровой и заставили рабочих прекратить работу, пригрозив, в случае неисполнения требований, перебить рабочих; последние прекратили работу. Затем толпа направилась к помещичьему дому и предъявила владелице следующие условия: а) плату в день: мужчине 60 коп., женщине 40 коп., б) начало работ — 6 час утра, конец — 6 час вечера; в) во время жатвы и покоса цену увеличить: мужчине от 75 коп. до 1 руб., женщине до 60 коп. Цен этих никогда не существовало.

11 июня те же крестьяне, прогнав рабочих в фольв. Колотин, опять явились в им. Гуту, но, встретив полицию, повернули обратно по засеянным лугам помещицы, заявляя, что, если их будут преследовать, они сумеют защищаться, и показали ножи, кистени и пр.

При увещании крестьян земским начальником и исправником они держали себя крайне дерзко и вызывающе.

11 июня крестьяне дер. Луговой, Вирни, того же уезда, силой не допустили станового пристава к описи имущества крестьян на удовлетворение взысканий по суду в пользу помещицы Башмаченковой, владения которой были нарушены крестьянами, и заявили земскому начальнику и приставу, что землей они будут владеть, что бы с ними не делали.

Крестьяне дер. Столпня, того же уезда, вынуждают помещика Пенкина отдать им в аренду луг на предлагаемых ими условиях и не допускают других арендаторов, избивая и прогоняя их. Ввиду возбужденного настроения крестьян, диктующих помещикам свои условия, исправник ходатайствует о присылке в уезд полусотни казаков...

И . д. губернатора вице-губернатор (подпись)
Правитель канцелярии (подпись)

Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.). Мн., 1953. Т. 3. С. 504—505.

Верасень — кастрычнік. Рост рэвалюцыйнага руху ў павеце.
Снежань. Аграрныя хваляванні ў маёнтку Сазонава.

1906 год

1 мая. Палітычная забастоўка ў Рагачове.
1907 год

1 мая. Палітычная забастоўка ў Рагачове.

Змагаўся за волю

Вёска Дварэц вядомая не толькі сваёй назвай. Тут нарадзілася шмат людзей, якія ўпрыгожваюць яе гісторыю і дзень сёняшні. На жаль, далёка не пра ўсіх мы ведаем. У розныя часы вёску пакідалі яе маладыя жыхары, а ці ўсе вярнуліся назад?..

У пачатку века родныя і аднавяскоўцы праводзілі ў армію Паўла Ільіча Панькова — сціплага хлопца, добрага працаўніка. Служыў ён у Туле салдатам, потым яфрэйтарам. І нарэшце стаў унтэр-афіцэрам.

Як і большасці сумленных людзей Расіі, Паўлу Панькову не падабаўся самадзяржаўны лад, які зневажаў годнасць чалавечай асобы як у вёсцы, так і ў арміі. І ён усёй душой пацягнуўся

да тых, хто выступаў за свабоду, за разняволенне прыгнечаных. У 1905 г. Панькоў уступіў у РСДРП, распаўсюджваў літаратуру, вёў палітычную агітацыю сярод салдат. Яго добра ведалі як палымянага агітатара за новае, змагара за сацыяльную справядлівасць. Паводле ўспамінаў аднапалчаніна Аляксандра Фралова, Павел Панькоў і яго верныя паплечнікі Н. Бендзікаў, З. Жукоўскі, М. Крычаўскі, В. Юдоўскі зарэкамендавалі сябе сапраўднымі рэвалюцыянерамі-канспіратарамі. Пракламацыямі яны не захаплялiся, а давалі салдатам і рабочым газеты і нелегальную літаратуру. Стваралі маленькія гурткі, не больш за пяць чалавек, выступалі там з гутаркамі, спрачаліся аб набалелым. Вялікія сходы наладжвалі на кватэрах рабочых, на кароткі час.

У 1906—07 гг. Панькоў быў членам і адным з кіраўнікоў Тульскай падпольнай арганізацыі РСДРП.

Але як ні асцерагаўся падпольшчык, усё ж паліцыя натрапіла на яго след. 18 студзеня 1907 г. Панькова і амаль усіх яго паплечнікаў арыштавалі і пасадзілі ў турму. Пачаліся цяжкія дні пярэдніх следстваў, допытаў. Панькоў адкрыта прызнаўся, што вёў антыўрадавую прапаганду сярод маладых салдат і запрашаў іх хадзіць у дом Смірнова, дзе невядомы аратар з цывільных угаворваў ісці супраць цара і дзяржаўнага ладу.

Павел хацеў звязацца з сябрамі, што засталіся на волі. Ён напісаў запіску свайму знаёмаму, у якой дасылаў шчырае прывітанне сваім таварышам, выказваў надзею, што тыя, хто цяпер царствуе ў раскошных палатах, хутка памяняюцца з ім месцам, і заканчваў запіску словамі: «Да здравствует социал-демократическая рабочая партия!» Але гэту запіску перахапіла варта і далучыла да судовай справы.

15 мая 1908 г. П. І. Панькова, іншых абвінавачваемых прывезлі ў Маскву на суд, да якога ўсё было падрыхтавана. Зачыталі акт аб антыўрадавай агітацыі сярод мясцовага насельніцтва, прыгавырылі да двух гадоў зняволення ў крэпасці. Тады яму было ўсяго 24 гады. Нагэтым звесткі аб Панькове абрываюцца.

Спроба высветліць, як склалася яго далейшае жыццё, станоўчых вынікаў не дала. Няўжо заўчасна загінуў у турме, як гэта нярэдка здаралася? Тульскі партархіў не змог штосьці дапоўніць — звестак няма. А можа што ведаюць родныя, землякі, якія жывуць на Рагачоўшчыне? Будзем спадзявацца, што хтосьці ўсё ж дапіша біяграфію рэвалюцыянера-земляка.

Э. А. Карнілovіч

Настаўніцкая семінарыя

Настаўніцкая семінарыя ў Рагачове была адкрыта 1 чэрвеня 1909 г. Яе дырэктарам быў прызначаны былы інспектар народных вучылішчаў Дз. А. Сцяпура. Першыя 40 семінарыстаў, якія прыбылі не толькі з Рагачоўскага павета, але і з паветаў Магілёўскай, Кіеўскай, Мінскай, Смаленскай губерняў, пачалі вывучэнне рускай мовы і літаратуры, арыфметыкі, прыродазнаўства, фізікі, гісторыі, геаграфіі, малявання, спеваў, педагогікі, псіхалогіі і методыкі пачатковага навучання. Вялікае месца ў раскладзе займалі таксама царкоўныя прадметы — закон божы і царкоўнаславянская мова.

Сялянская хата на Рагачоўшчыне. Фота пачатку 20 стагоддзя.

Пры семінарыі пачало працаваць пачатковае вучылішча, дзе падлеткі атрымлівалі веды, неабходныя для паступлення ў яе, да таго ж вучылішча было месцам, дзе семінарысты праходзілі педагагічную практыку.

Спачатку семінарыя і вучылішча размяшчаліся ў 2 дамах, арандаваных у памешчыка Е. І. Лашкевіча, на рагу вуліц Аляксандраўскай і Пясчанай. У 1914 г. паводле праекта акруговага архітэктара Валанцэвіча клімавіцкім прадпрымальнікам Гурэвічам быў узведзены комплекс будынкаў для семінарыі па вуліцы Быхаўскай.

У галоўным двухпавярховым корпусе першы паверх займалі класы, музей, гімнастычная зала, малявальны клас, фізічны кабінет, настаўніцкая. На другім паверсе былі бібліятэка, царква, кватэры

настаўнікаў. Акрамя галоўнага корпуса, у комплекс уваходзілі 3-павярховы будынак інтэрната, мураваны дом пачатковай школы, лазарэт, лазня і іншыя гаспадарчыя пабудовы. На 2,5 дзесяціны зямлі размяшчаўся фруктовы сад.

У 1909 г. дзейнічалі два першыя класы семінарыі і два класы пачатковага вучылішча. З кожным годам колькасць семінарыстаў расла. Так, у 1912 г. навучэнцаў было 110, а ў 1916—129.

Вучылі семінарыстаў 12 выкладчыкаў, большасць якіх мелі універсітэцкую адукацыю і прытрымліваліся радыкальных поглядаў, прапагандавалі ідэі М. Н. Піратова і К. Дз. Ушынскага.

Дырэктар семінарыі Дзмітрый Антонавіч Сцяпура быў вядомым у беларускіх губернях педагогам. Ён з'яўляўся аўтарам артыкулаў па педагогіцы, гісторыі народнай адукацыі, методыцы выкладання літаратуры. Дз. А. Сцяпура актыўна прапаведаваў неабходнасць усеагульнай бясплатнай пачатковай адукацыі, аддаваў шмат увагі нагляднасці і даступнасці навучання.

Шмат намаганняў прыклаў ён для арганізацыі ў семінарыі фізічнага кабінета, які ўжо ў першыя гады налічваў каля 300 прыбораў для дэманстрацыі доследаў. У створаным 1 студзеня 1910 г. педагагічным музеі семінарыі былі сабраны шматлікія падручнікі, методыкі, дапаможнікі для настаўнікаў, табліцы і наглядныя дапаможнікі. У бібліятэцы налічвалася каля тысячы назваў кніг царкоўнай і свецкай літаратуры, шэраг перыядычных выданняў.

Вялікую ролю ў станаўленні семінарыі адыгралі педагогі Н. П. Пуцімцаў, О. Л. Парыйскі, М. С. Беражны і іншыя.

Вельмі папулярнымі ў семінарыі былі экскурсіі. Некалькі разоў за год навучэнцы адпраўляліся ў блізкія і далёкія падарожжы. Яны аглядалі славутасці Масквы, Кіева, Крыма, падарожнічалі па Волзе, наведалі папяровую фабрыку ў Добрушы, сельскагаспадарчую выстаўку ў Быхаве. Займаліся семінарысты і вывучэннем мясцовага краю.

У цікавыя агульнагарадскія мерапрыемствы ператвараліся падрыхтаваныя навучэнцамі семінарыі святы і вечары: прысвечаныя 50-годдзю адмены прыгоннага права, 100-годдзю Айчыннай вайны 1812, 50-годдзю з дня смерці паэта С. Нікіціна, 200-годдзю з дня нараджэння Ламаносава і іншыя. Нярэдка да падрыхтоўкі свята запрашалі гімназістак з прыватнай гімназіі Анісімавай. На такіх вечарах гучалі даклады, вершы, выступалі хор семінарыі і самадзейны балалаечны аркестр, вакальныя групы і да т. п.

Нягледзячы на высокі кошт навучання аднаго вучня (каля 390 руб.), плата з выхаванцаў семінарыі не бралася, многім да таго ж выплачвалася стыпендыя. Так, з 110 выхаванцаў у 1912 г. 82 атрымлівалі стыпендыю па 100 рублёў, з іх 60 — са сродкаў дзяржаўнага казначэйства, 22 — Магілёўскага губернскага земства. Дырэктар семінарыі Сцяпура актыўна прыцягваў і мецэнатаў — багатых жыхароў горада і павета. Грашовую дапамогу атрымлівалі семінарысты і ад правядзення дабрачынных вечароў і канцэртаў.

Семінарыя стала буйным метадычна-асветніцкім цэнтрам. Пры ёй дзейнічалі курсы для настаўнікаў пачатковых школ, дзе абменьваліся вопытам, знаёміліся з новымі метадычнымі і наглядным дапаможнікамі, і нядзельная школа для дарослых. Жыхары ўсяго горада маглі карыстацца вучнёўскай бібліятэкай; педагогі, асабліва пачатковага вучылішча, прымалі актыўны ўдзел у народных чытаннях, якія праводзіліся ў горадзе.

Цяжкае становішча склалася ў семінарыі ў гады першай сусветнай вайны. Блізкасць фронту, дарагавізна — усё адбівалася на навучэнцах. У інтэрнаце размясціўся лазарэт для раненых. Семінарысты праводзілі дабрачынныя мерапрыемствы, даходы з якіх ішлі на дапамогу раненым і сем'ям загінуўшых.

У гады грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі семінарыя не дзейнічала. Пастановай Наркамасветы РСФСР ад 9 чэрвеня 1919 г. Рагачоўская семінарыя была пераўтворана ў трохгадовыя педагагічныя курсы для падрыхтоўкі настаўнікаў адзінай працоўнай школы 1-й ступені. За гады свайго існавання семінарыя выхавала больш як 100 педагогаў пачатковай школы, якія неслі людзям такое неабходнае — святло ведаў. *А. С. Лейкін.*

Від на Рагачоў з боку Дняпра. Фота пачатку 20 стагоддзя.

ЧАС БАРАЦЬБЫ І ВЫПРАБАВАННЯЎ

У 1917 г. паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Рагачоўскі павет адносіўся да Магілёўскай губерні. Тут было 31 517 сялянскіх гаспадарак, 292 буйныя прыватнаўласніцкія гаспадаркі, 54 гаспадаркі несялянскага тыпу, 218 223 жыхары, у т. л. 105 792 мужчыны і 105 732 жанчыны. Большую частку насельніцтва складалі беларусы. Часова адсутнічала 27 340 чалавек, з іх 25 190 былі ў дзеючай арміі. У прыватнаўласніцкіх гаспадарках працавалі 2133 наёмныя работнікі, 13 400 сялянскіх гаспадарак мелі купленую зямлю, 5031 — не мелі зямлі пад пасевы, з іх 2639 былі ў асноўным бежанцамі, 4270 гаспадарак зусім не мелі зямлі. Не мелі жывёлы 2542 гаспадаркі, цяглавай жывёлы 5489, кароў 3799 гаспадарак.

Рэвалюцыйныя падзеі 1917 г. не пакінулі ў баку і Рагачоўскі павет. Вестка пра лютаўскую рэвалюцыю 1917 г. ў Петраградзе і адрачэнне цара, стварэнне Часовага ўрада прыйшла ў Рагачоў 3 сакавіка 1917 г. і была прыхільна сустрэта ва ўсіх слаях насельніцтва, асабліва сярод моладзі і інтэлігенцыі.

5 сакавіка 1917 г. быў створаны орган кіравання горадам і паветам — часовы выканаўчы камітэт. Захаваліся гарадская дума і земская ўправа. У гэты ж дзень у Рагачове адбылася дэманстрацыя рабочых і навучэнцаў. Дэманстранты патрабавалі выдалення з выканаўчага камітэта павятовага прадвадзіцеля дваранства. На наступны дзень натоўп з рабочых і навучэнцаў настаўніцкай семінарыі і рэальнага вучылішча на чале з настаўнікам Зяленскім накіраваліся ў казармы. Салдаты далучыліся да іх заклiку і ўліліся ў дэманстрацыю. Каля будынка гарадскога тэатра адбыўся мітынг, які працягваўся 6 гадзін. Удзельнікі яго патрабавалі перавыбрання выканаўчага камітэта і арышту вядомых манархістаў. Пасля мітынгу натоўп накіраваўся ў земскую ўправу і зрабіў перавыбары выканкома.

4—7 сакавіка ў Рагачове рабочыя і салдаты раззброілі і арыштавалі паліцэйскіх і царскіх чыноўнікаў.

27 сакавіка 1917 г. адбыўся сход рабочых і работніц горада, на якім прысутнічалі 322 чалавекі. Сход выбраў Савет рабочых дэпутатаў, у склад якога ўвайшло 14 чалавек і 3 кандыдаты. У канцы сакавіка ў Рагачове ўтварыўся Савет салдацкіх і афіцэрскіх дэпутатаў. 14 мая 1917 г. на павятовым сялянскім з'ездзе быў арганізаваны Савет сялянскіх дэпутатаў. 20 мая адбылося сумеснае пасяджэнне Савета салдацкіх і Савета рабочых дэпутатаў, на якім яны аб'ядналіся. Быў выбраны прэзідыум і выканаўчы камітэт. Старшынёй Савета стаў ветэрынарны ўрач, эсэр І. С. Даленка. Выдавалася газета «Наше свободное слово» — друкаваны орган Савета. У маі 1917 г. пачала выдавацца гарадская газета «Рогачевское эхо».

Саветы былі органамі рэвалюцыйна-дэмакратычнай улады і ў большасці сваёй былі прадстаўлены бундаўцамі, меншавікамі і эсэрамі. Лютаўскія падзеі актывізавалі стыхійныя выступленні сялян супраць памешчыцкага землеўладання. Так, сяляне вёсак Турск і Гадзілавічы 8 і 9 сакавіка 1917 г. разграмілі маёнтак Турск і захапілі маёмасць памешчыка. Разам з сялянамі ў разгроме маёнтка ўдзельнічалі

салдаты размешчаных у Турску часцей. 13 і 14 сакавіка сяляне навакольных вёсак разграмілі маёнтак памешчыцы Хрушчовай у Забалацці. Сяляне Дудзіцкай воласці самавольна секлі казённыя і памешчыцкія лясы, захоплівалі пашы і пасевы.

Рух пратэсту супраць цяжкага сацыяльна-эканамічнага становішча ахапіў і рабочых буйнейшых прадпрыемстваў павета. Так, агульны сход рабочых Наспенскага шклозавода за невыкананне сваіх патрабаванняў яго арандатарам часова ўстанавіў рабочы кантроль, перадаў завод у кіраванне савета рабочых. Такім жа чынам паступілі і рабочыя шклозавода Курындзіна ў сяле Нядойкі.

У канцы красавіка 1917 г. ў Рагачове былі створаны прафесійныя саюзы швейнікаў, харчавікоў, транспартнікаў, рамеснікаў. Яны хутка пашыралі сваю дзейнасць і ў сярэдзіне мая ахапілі большасць рабочых і служачых горада. Усталяваўшыся арганізацыйна, прафсаюзы павялі барацьбу за правы рабочых і павышэнне заработнай платы. Паводле ўспамінаў Я. І. Збароўскага, удзельніка рэвалюцыйных падзей у Рагачове, у сярэдзіне чэрвеня 1917 г. ў прафсаюзных арганізацыях пачалася агітацыя за правядзенне ўсеагульнай забастоўкі рабочых і служачых горада з мэтай устанаўлення на ўсіх прадпрыемствах горада васьмігадзіннага рабочага дня. Агітацыя мела поспех. Была аб'яўлена ўсеагульная забастоўка.

У канцы лета 1917 г. ў Рагачове быў створаны аддзел партыі народнай свабоды (кадэты), аднак ён быў не шматлікім, не праяўляў вялікай палітычнай актыўнасці і спыніў сваё існаванне пасля кастрычніцкага пераваротy. Асноўная маса інтэлігенцыі групавалася вакол меншавікоў, эсэраў, Бунда. Буйныя земляўладальнікі групаваліся вакол мясцовага аддзела Саюза зямельных уласнікаў.

6 жніўня 1917 г. ў Рагачове адбыліся выбары ў гарадскую думу. Палякі, беларусы і літоўцы ўтварылі выбарны рады-кальна-дэмакратычны блок і выставілі агульны спіс кандыдатаў, за які з 4721 выбаршчыка прагаласавала 917. Большасць галасоў атрымаў «сацыялістычны блок» (меншавікі, бундаўцы, эсэры).

Да кастрычніка 1917 г. ў Рагачове дзейнічаў аб'яднаны камітэт РСДРП, у якім большасць складалі меншавікі-абаронцы. У кастрычніку члены камітэта, прадстаўнікі фракцыі бальшавікоў заявілі, што ў сувязі з маючымі адбыцца выбарамі ва Устаноўчы сход, калі спіс бальшавікоў будзе канкурыраваць з аб'яднаным спісам меншавікоў і Бунда, яны не лічаць магчымым весці далейшую сумесную работу і пакідаюць арганізацыю.

Вестку аб Кастрычніцкім узброеным паўстанні ў Петраградзе атрымалі адначасова Рагачоўскі Савет, камандаванне гарнізона і мясцовыя органы кіравання па розных каналах сувязі. 26 кастрычніка 1917 г. адбылося экстраннае пасяджэнне Рагачоўскага Савета, на якое былі запрошаны прадстаўнікі гарадской управы, павятовай харчовай управы, пошты і чыгункі.

Пасля таго, як старшыня Савета Даленка прачытаў тэлеграму аб рэвалюцыйных падзеях у Петраградзе, выступілі дэпутаты, якія асудзілі пераварот. Была прынята рэзалюцыя і зацверджаны тэкст тэлеграмы, накіраванай у Петраград, у якой выказана падтрымка Часоваму ўраду, ЦВК і Савету рэспублікі, адзначана, што захоп улады бальшавікамі пагражае зрывам выбараў ва Устаноўчы сход, «што раўназначна здрадзе і адкрыццю фронту для немцаў».

У лістападзе 1917 г. ў Рагачове і павеце адбыліся выбары ва Устаноўчы сход, у якім асобныя спісы мелі губернскі Савет сялянскіх дэпутатаў і губернская арганізацыя партыі эсэраў, РСДРП (меншавікі) і Бунд, аб'яднаная яўрэйская сацыялістычная рабочая партыя, яўрэйская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (Паалей Цыён), Усерасійскі саюз зямельных уласнікаў, партыя народнай свабоды (кадэты), ідышэ фолкспартай і знешнепартыйны дэмакратычны камітэт, беларускія арганізацыі, яўрэйскі нацыянальны выбарчы камітэт, Магілёўская губернская польская рада, Палеская арганізацыя РСДРП(б). У выніку выбараў з 87 144 галасоў, прызнаных сапраўднымі, 63 525 былі аддадзены губернскаму

Гарадскі сад у Рагачове. Фота пачатку 20 стагоддзя.

Савету сялянскіх дэпутатаў і губернскай арганізацыі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, або 72,89 %, Палеская арганізацыя РСДРП(б) набрала 11 251 голас, або 12,91 % усіх выбаршчыкаў.

Працэс устанаўлення Савецкай улады ў Рагачове і павеце праходзіў складана і супярэчліва. Да лютага 1918 г. тут дзейнічалі гарадская дума, харчовыя і зямельныя камітэты. 1(14) снежня 1917 г. пры Рагачоўскім павятовым Савеце быў створаны ваенна-рэвалюцыйны камітэт (ВРК) — надзвычайны орган барацьбы за ўладу, у якім кіруючую ролю мелі бальшавікі і левыя эсэры. Адначасова ствараліся валасныя і сельскія Саветы.

Была арганізавана і міліцыя. Паводле ўспамінаў былога супрацоўніка рагачоўскай міліцыі І. Р. Карыцкага, крымінальнага кодэкса тады не было, панавала прававое беззаконне. Супрацоўнік міліцыі, калі заканчваў расследаванне па крымінальнай справе, пісаў: «На падставе выкладзенага, кіруючыся рэвалюцыйным сумленнем, меркаваў бы...», далей называлася мера пакарання.

Вялікае супраціўленне ўсталяванню новай улады аказалі войскі 1-га польскага корпуса на чале з І. Р. Доўбар-Мусніцкім, які быў сфарміраваны ў ліпені 1917 г. Часовым урадам. Часці яго размяшчаліся і ў Рагачове. Яны перашкаджалі падзелу зямлі і маёмасці памешчыкаў, паралізавалі работу органаў улады на месцах.

12(25) студзеня 1918 г. Доўбар-Мусніцкі аб'явіў вайну Савецкай уладзе, а на наступны дзень заняў увесь Рагачоўскі павет. Мясцовы Савет быў разагнаны, члены яго арыштаваны. Баі працягваліся да канца студзеня. 31 студзеня рэвалюцыйныя войскі пад камандаваннем І. І. Вацэціса занялі Рагачоў.

8(21) лютага 1918 г. газета «Известия Могилевского губернского исполнительного комитета Советов крестьянских, солдатских и рабочих депутатов» паведамляла аб уступленні ва ўладу новага Рагачоўскага Савета: «Савет салдацкіх і рабочых дэпутатаў арганізаваўся. Прыняты меры па арганізацыі сялян на месцах. Рыхтуецца сялянскі з'езд для перавыбараў сялянскага Савета дэпутатаў. На першым сходзе саўдэпа прынята рэзалюцыя, якая вітае цэнтральную Савецкую ўладу. Прэзідыум бальшавіцкі. Выканком прыступіў да работы». У другой палавіне лютага 1918 г. большую частку Рагачоўскага павета і горад захапілі германскія войскі. Лінія фронту пралягла па р. Дняпро, а потым праз в. Гадзілавічы паміж вёскамі Гарадзец і Вялікія Стралкі. Германскія акупанты праводзілі драпежніцкую палітыку, якая выклікала пратэст насельніцтва, шырокую хвалю партызанскага руху, значную ролю ў арганізацыі якога адыгралі С. Вілюга, Г. Старавойтаў, А. Антоненка, К. Новікаў. У вёсках узнікалі атрады самаабароны, у валасцях — партызанскія атрады, найбольш буйнымі з якіх былі рагачоўскі (300 чалавек), кармянскі (каля 100 чалавек), чачэрскі, раўкавіцкі. Задняпроўскія воласці Рагачоўскага павета не былі акупіраваны, і органы Савецкай улады эвакуіраваліся ў Доўск. 10 сакавіка 1918 г. ў Доўску прайшлі перавыбары Рагачоўскага павятовага Савета. У выканком Савета ўвайшло 7 бальшавікоў і 7 левых эсэраў, старшынёй яго быў выбраны левы эсэр Мікалай Ігнацьевіч Піткевіч, таварышам старшыні — бальшавік Сяргей Храмцоў, сакратаром — левы эсэр Сямён Якаўлевіч Старасценка. Сувязь павятовага выканкома з губвыканкомам была няўстойлівая, Рагачоўскі Савет пастаянна меў фінансавыя цяжкасці. Паводле ўспамінаў удзельніка тых падзей А. Б. Рыськіна, вясной 1918 г. ў Рагачове была створана нелегальная бальшавіцкая арганізацыя на чале з А. Сасонкам, І. Сосіным, М. Мадорскім, Я. Эпштэйнам і Рыськіным, якая ўвахо-дзіла ў Палескую бальшавіцкую арганізацыю. Неўзабаве былі створаны партячэйкі ў Ціхінічах, на Наспенскім шклозаводзе, спартакаўская падпольная група нямецкіх салдат, што служылі ў рагачоўскім гарнізоне.

У чэрвені 1918 г. ў Доўску адбыўся агульны сход мужчын, на якім было вырашана арганізаваць з прыгоднага да ваеннай службы мужчынскага насельніцтва рэвалюцыйны полк для абароны ад нямецкай інтэрвенцыі.

Пасля лістападаўскай рэвалюцыі 1918 г. ў Германіі склаліся новыя ўмовы на фронце, нямецкія войскі пакінулі тэрыторыю Беларусі. Германская акупацыя нанесла велізарны ўрон асноўнай галіне эканомікі павета — сельскай гаспадарцы. У час яе было разрабавана і вывезена ў Германію 650 тысяч пудоў збожжа і 800 тысяч пудоў сабранага ўраджаю. У мэтах правядзення сацыяльна-палітычных пераўтварэнняў у прамысловасці, урэгулявання эканамічных адносін у Рагачове зімой 1918 г. быў створаны савет народнай гаспадаркі (СНГ) на чале з П. Н. Вальгачовым. Першыя мерапрыемствы СНГ былі накіраваны на аднаўленне прадпрыемстваў, разбураных вай-

ной, падрыхтоўку да веснавой сяўбы 1919 г. На базе буйных памешчыцкіх маёнткаў былі арганізаваны саўгасы. Узніклі камуны. Найбольш буйной была камуна «Звязда», якая мела каля 600 дзесяцін ворнай зямлі, у астатніх камунах пасяўная плошча складала 80—100 дзесяцін і аб'ядноўвалася па 15—20 двароў.

Летам 1918 г. на неакупіраванай тэрыторыі Рагачоўшчыны, а пасля ўходу нямецкіх войск і на астатняй ствараліся камбеды — арганізацыі вясковай беднаты, апорныя пункты дыктатуры бальшавікоў на вёсцы, якія займаліся пытаннямі харчразвёрсткі, праводзілі мабілізацыю і набор добраахвотнікаў у Чырвоную Армію і інш. У ліпені 1918 г. ўзніклі Доўскі і Расонскі валасныя камбеды, у лістападзе — Гарадзецкі, у снежні — Дудзіцкі, Нядойцкі, Стрэшынскі. З дапамогай камбедаў бальшавікі зацвердзілі манапольнае кіраўніцтва органамі ўлады. З эканамічнымі задачамі, з улікам і кантролем за збожжанарыхтоўкамі камбеды справіліся часткова. Сілавыя метады вырашэння харчовай праблемы прывялі да надзвычайнага абвастрэння становішча ў вёсцы, да масавых паўстанняў сярэдніх, заможных сялян і часткі беднаты, якія мелі месца на Рагачоўшчыне летам 1918 г. Асабіста Леніну дакладвалі аб напружаным становішчы ў Рагачоўскім павеце. «Паведаміце падрабязнасці аб падаўленні паўстання кулакоў у Рагачове, імёны арыштаваных. Неабходна канфіскаваць маёмасць паўстаўшых кулакоў, арганізаваць камітэт беднаты, дзейнічаць энергічней»,— патрабаваў Ленін у тэлеграме ад 23 жніўня 1918 г. Рагачоўскай павятовай арганізацыі РКП(б). Паўстанні, якія прайшлі ў 1918 г. па беларускіх паветах, былі першым грозным пратэстам сялянства супраць сістэмы ваенна-камуністычнага кіраўніцтва вёскай. Ваенная разруха, усё большыя патрэбы фронту, харчразвёрстка непазбежна ставілі сялянства, а таксама і салдат, выхадцаў з вёскі, у апазіцыю да ўлады.

У лістападзе 1918 г. Савет Працы і Абароны Расійскай Рэспублікі прыняў рашэнне аб арганізацыі спецыяльных вайсковых часцей асобага прызначэння РККА «для барацьбы з контррэвалюцыяй і ў мэтах падтрымання рэвалюцыйнага парадку». Узвод ЧОН быў створаны і ў Рагачове. У ім было 75 чалавек. Ён камплектаваўся з добраахвотнікаў і толькі па рэкамендацыях бальшавіцкіх арганізацый. З паступовым увядзеннем палітыкі ваеннага камунізма ўзмацнялася роля рэпрэсіўных органаў. 25 лістапада 1918 г. ў Рагачове створана надзвычайная камісія, у снежні 1919—студзені 1919 — судовыя органы. У канцы 1918 г. ў павеце было 30 міліцыянераў, у асноўным выхадцаў з бяднейшых сялян.

25 лютага 1919 г. ў Карме каля 300 чалавек, узброеных вінтоўкамі, віламі, сякерамі, разграмілі памяшканне валвыканкома і валкома партыі, забілі 5 камуністаў і захапілі ўладу ў воласці пад лозунгам: «Саветы без камуністаў». Выступленне

Рагачоўскі атрад ЧОН.

было задушана ўзброеным атрадам ЧОН і падраздзяленнямі пагранпалка на чале з камісарам В.-А. Ф. Цымерманам, якія прыбылі з Рагачова.

11 сакавіка паўсталі салдаты 10-га пагранпалка, размешчанага ў Рагачове. П. П. Міхалькоў, ураджэнец в. Гадзілавічы, баец рагачоўскага атрада ЧОН, успамінаў:

«Батальён дзесятага пагранпалка ўзняў паўстанне і адмовіўся ісці на фронт. Паўстанцы забілі камісара палка Цымермана. Былі мабілізаваны ўсе камуністы Рагачова, міліцыя, надзвычайная камісія. Нашаму ўзводу загадалі абяззброіць батальён з 700 чалавек.

У ноч на 17 сакавіка мяцежны батальён быў акружаны, і частка нашых байцоў — Брацянкоў, я, Шышоў і іншыя — уварваліся ў казармы, захапілі кулямёт і далі чаргу па паўстанцах. Пад нашым кантролем знаходзіліся і піраміды з вінтоўкамі.

У гэты час у казарму ўскочыла другая група нашых салдат. З вуліцы будынак быў акружаны. Падалі каманду байцам батальёна выходзіць на двор. Камандзір батальёна, былы паручнік царскай арміі Іваноў, уцёк, але быў схоплены ля вёскі Тошчыца.

На наступны дзень быў знойдаены труп камісара палка Цымермана. Зачыншчыкі з ліку эсэраў і былога афіцэрства царскай арміі былі пакараны, а радавых салдат накіравалі на фронт...».

Паводле артыкула Н. Стужынскай «Сялянская вайна на Беларусі» (Звязда. 1992. 28 мая), у сакавіку 1919 г. частка сялянства Рагачоўскага павета падтрымала Стракапытаўскі мяцеж, адобрыўшы мэты і лозунгі «Палескага паўстанцкага камітэта», які падрыхтаваў гэта выступленне. Яны патрабавалі спалучэння прыватнай і дзяржаўнай ініцыятывы ў гандлі і прамысловасці, грамадзянскіх свабод, зямлі, перадачы ўлады Устаноўчаму сходу. Узброены атрад ЧОН з Рагачова ўдзельнічаў у задушэнні Стракапытаўскага мяцяжу.

Непрыманне харчовай, аграрнай і нацыянальнай палітыкі, якую праводзіла Савецкая ўлада, выклікала вясной — летам 1919 г. актыўны працэс фарміравання паўстанцкіх атрадаў так званых «зялёных» у Рагачоўскім павеце, для падаўлення якіх сцягваліся вялікія ўзброеныя сілы.

26 красавіка 1919 г. ў складзе РСФСР была ўтворана Гомельская губерня, у яе ўвайшоў і Рагачоўскі павет.

У канцы лета 1919 г. польскія войскі падышлі да Рагачова так бліска, што горад апынуўся пад пагрозай акупацыі. Чырвоная Армія, якая ў асноўным складалася з маршавых рот, дрэнна ўзброеная, не вытрымала націску і вымушана была часова адступіць. Усе павятовыя арганізацыі і ўстановы, а таксама матэрыяльныя каштоўнасці былі эвакуіраваны за Дняпро — у Доўск. Павятовы камітэт партыі перавёў усю партарганізацыю на казарменнае становішча. Многія яе члены былі перададзены ў распараджэнне 8-й стралковай дывізіі, якая змагалася пад Рагачовам.

У снежні 1919 г. Рагачоўскі павятовы рэўком на падставе загаду рэўваенсавета 16-й арміі прыняў пастанову аб замене валасных выканкомаў рэўкомамі. Паводле яе ўсе валвыканкомы аб'яўляліся распушчанымі. Ваенкамдыву 8-й дывізіі прапаноўвалася абавязкова ўключыць прадстаўнікоў дывізіі ў валрэўкомы ў месцах яе размяшчэння. Пастановай прадпісвалася ліквідаваць местачковыя Саветы, забраць у іх пячаткі, штампы, бланкі і перадаць у павятовы рэўком. Рагачоўшчына жыла ва ўмовах ваеннага становішча.

У сакавіку 1920 г. польскія войскі прарвалі лінію абароны і захапілі Мазыр, Калінкавічы, Васілевічы, Рэчыцу. Рагачоў апынуўся ў прыфрантавой паласе і ўся ўлада ва ўмацаваным раёне належала Рагачоўскаму рэўкому, які падпарадкоўваўся рэўваенсавету 16-й арміі і арганізоўваў насельніцтва на ваенна-абарончыя работы, праводзіў мабілізацыю, размяшчэнне вайсковых часцей, забеспячэнне іх харчамі, «Дні хворага і раненага чырвонаармейца», «Тыдні фронту і транспарту», ім была ўведзена ўсеагульная працоўная павіннасць, арганізоўваліся шматлікія камуністычныя суботнікі. У 1920 г. Рагачоўскі камітэт РКП(б) і рэўком выдавалі газету «Заря коммуны».

З мая 1920 г. ў Рагачове базіраваліся караблі Дняпроўскай ваеннай флатыліі, на якіх служылі і мясцовыя жыхары (больш падрабязна пра гэта глядзі ў артыкуле «У баях на Дняпры»).

У чэрвені 1920 г. тэрыторыя Гомельшчыны была вызвалена ад польскай акупацыі. 12 верасня 1920 г. адбыўся 1-ы павятовы з'езд Саветаў, якому Рагачоўскі павятовы рэўком перадаў усю ўладу. Паступова аднаўлялася работа прамысловых прадпрыемстваў, была пушчана электрастанцыя ў Рагачове і Гарадцы.

У час рэвалюцыі і грамадзянскай вайны ў Рагачоўскім павеце адбыліся значныя сацыяльныя змены. Летам 1920 г. тут зарэгістравана 30 900 гаспадарак. Да гэтага часу было ліквідавана буйное памешчыцкае землеўладанне. Памешчыцкая зямля была размеркавана сярод беззямельных і малазямельных сялян. На базе

некаторых маёнткаў створаны калектыўныя гаспадаркі, у тым ліку 29 камун, 134 арцелі, 9 саўгасаў, якія былі маламадарак мелі наёмную рабочую сілу. Колькасць насельніцтва склала 181 991 чалавек, у тым ліку 89 689 мужчын і 92 302 жанчыны. У дзеючую армію было мабілізавана 12 130 чалавек. У сувязі з масавым дэзерцірствам у гады грамадзянскай вайны сотні дэзерціраў хаваліся. Часта яны папаўнялі антысавецкія ўзброеныя фарміраванні і крымінальныя банды.

З агульнай колькасці гаспадарак 2017 займаліся промысламі. У павеце 519 гаспадарак не мелі жывёлы, 4091 гаспадарка не мела цяглавай жывёлы, 1301 гаспадарка не мела каровы. Нягледзячы на ўмовы грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі, аднаўляліся старыя і адкрываліся новыя навучальныя ўстановы. У канцы 1920 г. ў павеце працавалі 293 школы першай ступені і 10 другой ступені, у якіх адпаведна навучалася 25 309 і 1612 дзяцей. Усяго ў школах працавалі 623 настаўнікі. У павеце былі 2 дзіцячыя садкі, якія наведвала 102 дзіцяці, 3 дзіцячыя дамы (110 дзяцей). Пашырылася сетка культурна-асветных устаноў, працавала 55 бібліятэк, 82 хаты-чытальні, 3 народныя дамы, 3 клубы, 2 музеі, 1 тэатр, 4 мастацкія студыі.

П. К. Башко, М. Н. Камароў.

у сакавіку 1917

З успамінаў жыхара г. Рагачова Васіля Андрэевіча Салаўёва

У той час мне яшчэ не было 15 гадоў, і я вучыўся ў Рагачоўскім рэальным вучылішчы ў 4-м класе...

Чуткі аб лютаўскай рэвалюцыі ў Расіі ў Рагачоў дайшлі ў сакавіку 1917 г. У той час царская Стаўка знаходзілася ў Магілёве, за 100 км ад Рагачова, і натуральна, што гэта адбілася на ўсім становішчы ў горадзе і навакольных вёсках, дзе стаялі вайсковыя часці.

Памятаю, як гэтыя чуткі дайшлі да нас. Аднойчы пасля званка аб пачатку заняткаў настаўнікі ў класы не прыйшлі, а сабраліся ў настаўніцкай і аб чымсьці раіліся. Мы паслалі разведку да старшакласнікаў (5—7 класы), але і яны нічога дакладнага не ведалі.

Праз мінут 15 прыйшоў у клас настаўнік геаграфіі Зяленскі і расказаў нам, што ў Петраградзе рэвалюцыя і Мікалай II звергнуты з прастола, а ўлада перайшла да Дзяржаўнай думы.

Тут ужо было не да заняткаў, тым больш, што ў калідоры ўзняўся шум: гэта старшакласнікі выйшлі з класаў і вырашылі арганізаваць дэманстрацыю па горадзе.

Нас, як «малышоў», браць не хацелі, але мы настаялі на сваім і падключыліся да іх.

Сабраліся ўсе ў фізічным кабінеце (самай вялікай аўдыторыі), дзе ўзнік стыхійны мітынг. Дырэктар вучылішча Ф. І. Шыманоўскі і інспектар В. Юдзеніч спрабавалі адгаварыць нас, маўляў, могуць быць усялякія эксцэсы, пагромы і г. д. Але найбольш ліберальныя настаўнікі — Зяленскі, Караткевіч — падтрымалі нас, і мы гуртам выйшлі на двор і пачалі строіцца ў калону па 4 чалавекі.

Да нас далучыліся выхаванцы жаночай гімназіі, гарадскога вучылішча і настаўніцкай семінарыі. Узнікла пытанне, дзе ўзяць чырвоны сцяг. Вырашылі зняць яго з пажарнай каланчы, што і было зроблена вучнем гарадскога вучылішча В. А. Мельнікавым.

Калонай, спяваючы «Марсельезу» і іншыя рэвалюцыйныя песні, рухаліся мы па Быхаўскай вуліцы горада.

Зрэдку траплялі гарадавыя, але ўжо без «сялёдак» і пісталетаў: убачыўшы дэманстрацыю, яны хаваліся па дварах. Потым вырашылі пайсці на палкавы двор, дзе знаходзіўся шпіталь, да параненых салдат. Тыя з іх, што маглі рухацца, далучыліся да нас. Нехта прапанаваў накіравацца ў кінатэатр «Мадэрн» і правесці мітынг. Тут сабралася шмат салдат, жыхароў горада, моладзі, нас адціснулі на галёрку.

Хто выступаў на мітынгу, не памятаю, але, відаць, гэта былі эсэры і меншавікі, бо арганізацыі бальшавікоў у горадзе, здаецца, не было...

Дэманстрацыя ўскалыхнула «ціхі» гарадок, падштурхнула ў наступныя месяцы многіх яго жыхароў да сацыяльнай актыўнасці.

Матэрыялы гэтай рубрыкі першапачаткова мелі адну крыніцу — зборнікі дакументаў і, зразумела, не маглі ўсебакова і аб'ектыўна адлюстраваць той складаны і багаты на падзеі час — 1917—20 гг. Па просьбе рэдакцыі кандыдат гістарычных навук П. К. Башко дапоўніў гэты раздзел матэрыяламі і дакументамі, якія ён сабраў у працэсе сваіх даследаванняў і якія раней не друкаваліся.

ТЭЛЕГРАМА НАЧАЛЬНІКА РАГАЧОЎСКАГА ГАРНІЗОНА ГЕНЕРАЛ-МАЁРА БУРАВА ГАЛОЎНАМУ НАЧАЛЬНІКУ МІНСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

3 сакавіка 1917, 15 гадзін 5 мінут

Рогачевской управой получено якобы разрешенное цензурой [в] Петрограде извещение о смене Правительства, [об] образовании Временного комитета [под] председательством Родзянко. Прошу указаний. [В] гарнизоне спокойно.

Генерал-майор Буров.

ЦДВГА, ф. 1915, воп. 2, спр. 9, л. 22.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «ИЗВЕСТИЯ ПЕТРОГРАДСКОГО СОВЕТА» АБ ВЫСТУПЛЕННІ МОЛАДЗІ ГОРАДА РАГАЧОВА СУПРАЦЬ СТВОРАНАГА ЦАР. СКІМІ ЧЫНОЎНІКАМІ ЧАСОВАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА ГОРАДА І ПАВЕТА

9 сакавіка 1917 г.

5 марта предводитель дворянства Глуховцев собрал в земской управе чиновников старого режима в присутствии исправника, назначил себя председателем временного исполнительного комитета в городе и уезде, членами комитета — уездного члена Макарьева, директора реального училища Шимановского, земского начальника Кутневича и др. На другой день в виде протеста молодежь шествием и митингом требовала смены комитета.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 1. С. 105.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «НАШЕ СВОБОДНОЕ СЛОВО» АБ АРГАНІЗАЦЫІ САВЕТА РАБОЧЫХ ДЭПУТАТАЎ У ГОРАДЗЕ РАГАЧОВЕ

6 красавіка 1917 г.

27 марта 1917 г. в городском театре произошло собрание всех рабочих и работниц гор. Рогачева в количестве 322 чел. Собрание рабочих избрало Совет рабочих депутатов из 14 чел. и 3 кандидатов к ним. На том же собрании было постановлено единогласно отчислить половину одиодневного заработка в пользу Совета рабочих депутатов.

На первом же собрании был избран временный президиум, т. к. Совет нашел себя не в полном составе, ввиду отсутствия представителей от заводских рабочих и железнодорожников.

Первым шагом новоизбранного Совета было завязать сношения с гарнизонным комитетом: были посланы 2 представителя от Совета в гарн[изонный] комитет и столько же от гарнизон[ного] комитета в Совет.

Канцелярия Совета помещается в здании евр[ейского] нар[одного] дома (Базарная ул., д[ом] Лашкевича) и открыта ежедневно от 7 до 9 час. вечера, по субботам от 2 до 6 час. вечера.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 1. С. 150—151.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ ПЕТРАГРАДСКАГА САВЕТА АБ НАСТРОІ СЯЛЯН РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА

В Рогачеве Могилевской губернии чувствуется чрезвычайно нервное настроение вследствие происходящих в окрестностях разгромов помещичьих экономий и винокуренных заводов. Скот частью уводится, частью истребляется. Были случаи частич-

ного погрома еврейских лавочек в Гадиловичах, настроение крестьян и солдат в этом направлении разрастается. Невежественная масса белорусских крестьян плохо поняла совершившийся переворот, говорят, что все это сделали паны, чтобы вернуть крепостное право.

В виду того, что в Белорусском крае много помещичьих экономий и винокуренных заводов, что здесь много евреев, из-за которых может разгореться пожар, что край этот близок к району военных действий, необходимо обратить на Белоруссию особое внимание, в смысле распространения правильных взглядов на совершившиеся события.

Известия Петроградского Совета рабочих и солдатских депутатов. 1917. № 34. 7 апр.

ТЭЛЕГРАМА З'ЕЗДА НАСТАЎНІКАЎ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА Ў ПЕТРАГРАДСКІ САВЕТ САЛДАЦКІХ І РАБОЧЫХ ДЭПУТАТАЎ АБ ПАДТРЫМЦЫ ЧАСОВАГА ЎРАДА

7 красавіка 1917 г.

Народные учителя Рогачевского уезда Могилевской губернии впервые собравшись на общий съезд при обновленных условиях государственного строя нашей Родины, приветствуя Совет солдатских и рабочих депутатов заявляют, что они отдадут все свои силы на служение народу и на осуществление задач Временного правительства, направленных к счастью и славе России.

ЦДА Санкт-Пецярбурга, ф. 7384, воп. 9, спр. 142, л. 109.

З ПЕРАПІСКІ РАГАЧОЎСКАГА САВЕТА САЛДАЦКІХ І АФІЦЭРСКІХ ДЭПУТАТАЎ З ПЕТРАСАВЕТАМ

26 апреля 1917 г. Рогачевский Совет солдатских и офицерских депутатов направил телеграмму Петросовету, в которой одобрил деятельность последнего, выразил обеспокоенность деятельностью последователей Ленина. «Петроград имеет интеллигентные силы для борьбы с ними, его последователями, а деревня бессильна, грозит полная разруха. Необходимо принять самые решительные меры в Петрограде по отношению к Ленину и тогда его последователи исчезнут в провинции»,— говорилось в телеграмме.

ЦДАКР СССР, ф. 1235, воп. 35, спр. 5, л. 91.

ТЭЛЕГРАМА ВЫКОНВАЮЧАГА АБАВЯЗКІ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА КАМІСАРА ГАЛОЎНАМУ НАЧАЛЬНІКУ МІНСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

Атрымана ў Смаленску 30 красавіка 1917 г.

Рогачевский уездный комиссар, член Государственной Думы Дрибинцев, председатель [совета] офицерских и солдатских депутатов Даленко просят, ввиду чрезвычайно продуктивной важной работы солдат и офицеров сводного полка, ходатайствовать об оставлении полка хоть на один месяц в Рогачеве, указывая только на наличие полка возможно наладить жизнь уезда, предупредить анархию. Поддерживаю его ходатайство. Прошу удовлетворить таковое. Мне телеграфировать.

И. Д. Губернского комиссара Чистяков.

ЦДВГА, ф. 1915, воп. 2, спр. 9, л. 581.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «ГОМЕЛЬСКАЯ КОПЕЙКА» АБ ВЫСТУПЛЕННЯХ СЯЛЯН У РАГАЧОЎСКІМ ПАВЕЦЕ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

2 мая 1917 г.

Происходит в крупных размерах самовольная рубка казенных и помещичьих лесов, пастьба скота в лесных культурах и посевах. Волостные комитеты под влиянием смутьянов меняют свой состав. С распоряжениями и воззваниями комиссара уездного исполнительного комитета не считаются. Командирован начальник милиции во главе 118 солдат в Дудичскую вол. Завтра столько же солдат посылается в Чечерскую вол.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 1. С. 270.

ПАСТАНОВА АГУЛЬНАГА СХОДУ РАБОЧЫХ НАСПЕНСКАГА ШКЛЯНОГА ЗАВОДА РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА МАГІЛЕЎСКАЙ ГУБЕРНІ З ПАТРАБАВАННЯМІ ДА ЎЛАДАЛЬНІКАЎ ЗАВОДА АБ ПАЛЯПШЭННІ ЭКАНАМІЧНАГА СТАНОВІШЧА

8 мая 1917 г.

1917 г. мая 8 дня, общее собрание мастеровых и рабочих Наспенского стекольного завода н[аследни]ков Г. С. Курындина, обсудив настоящий критический момент своего положения, единогласно постановило:

1. Потребовать от владельца завода полного содержания за весь предыдущий год, считая с 1 апреля 1916 г. по 1 апреля 1917 г. включит[ельно], считая месячным заработком 120 руб.

2. Возвратить рабочим те проценты, которые с них удерживались во время остановок завода, т. е. работали вместо нормального заработка за 5 коп. в день, а также бравших продукты из фабричной лавки по высоким ценам. Мастеровым, нанятым в октябре месяце 1916 г. и понесшим огромные убытки вследствие переездки и потери всего имущества, уплатить каждому из них по 500 руб.

3. Все солдатки, мужья которых работали на означенном заводе и призванные по мобилизации, должны воспользоваться одинаковым вознаграждением, кроме того, должны воспользоваться половинным заработком своего мужа: уплатить [солдаткам] за непользование огородом и сеном за все время отсутствия мужа.

4. Что касается пользования квартирами, отоплением и огородами (разработанными своими трудами и которые не у всех имеются), сенокосом и пастбищем для скота, рабочие отказаться не могут до тех пор, пока это явится возможным.

Председатель вр[еменного] заводского комитета В. Миловский.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 1. С. 283—284.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «НАШЕ СВОБОДНОЕ СЛОВО» АБ ЗЛІЦЦІ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ І САЛДАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ У ГОРАДЗЕ РАГАЧОВЕ

22 мая 1917 г.

В субботу, 20 мая, состоялось объединенное заседание Советов солдатских депутатов. Было решено соединить эти 2 организации и образовать Совет солдатских и рабочих депутатов.

Избран президиум и исполнительный комитет. Председателем Совета единогласно выбран И. С. Даленко.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 1. С. 319.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «ПРАВДА» АБ КАНФІСКАЦЫІ РАБОЧЫМІ ШКЛЯНОГА ЗАВОДА НАШЧАДКАЎ КУРЫНДЗІНА НЯДОЙКСКАЙ ВОЛАСЦІ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА МАГІЛЕЎСКАЙ ГУБЕРНІ

26 мая 1917 г.

Рабочие стекольного завода Курындина Недойкской вол., число которых доходит до 400, арестовали администрацию и вступили во владение заводом и миллионным имуществом, завещанным на благотворительные цели.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 1. С. 329.

З ДАНЯСЕННЯ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА КАМІСАРА МІНІСТЭРСТВУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ ЧАСОВАГА ЎРАДА

Не пазней чэрвеня 1917 г.

15 марта избран Рогачевский уездный временный исполнительный комитет в составе 24 лиц с правом кооптации...

В исполнительный комитет входят также земские и городские управы и делегаты местного солдатско-офицерского комитета...

Исполнительный комитет в большинстве случаев играет в местной жизни руководящую роль и существующие организации стоят в подчиненном положении...

Волостные комитеты организуются, но не везде на одинаковых началах, земская управа, уездный комиссар, уездный исполнительный комитет всячески стараются произвести выборы в волостные комитеты возможно полнее с привлечением всех элементов населения волости. Практически это оказалось пока неосуществимым за недостатком организованности, согласованности волостного населения, классовых течений и в большинстве случаев взяли верх случайные люди, местами с недавним уголовным прошлым. Наблюдается недостаток культурных сил на выборах. Там, где выборы в комитеты состоялись, состав их получился пестрый, малограмотный, со слабой работоспособностью. Права меньшинства не обеспечены.

ЦДАКР СССР, ф. 398, воп. 2, спр. 113, л. 312—313.

ТЭЛЕГРАМА СТАРШЫНІ ГАЛОЎНАГА САВЕТА САЮЗА ЗЯМЕЛЬНЫХ УЛАСНІКАЎ РАСІІ ЛЬВОВА МІНІСТРУ ЎНУТРАНЫХ СПРАЎ

25 ліпеня 1917 г.

В г. Рогачеве организатор съезда земельных собственников Михаил Спиридонов по ордеру, выданному комиссаром, арестован толпой в день съезда. Административные и судебные власти бездействуют.

ЦДАКР СССР, ф. 406, воп. 6, спр. 116, л. 189. Копія.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ» АБ ВЫБАРАХ У РАГАЧОЎСКУЮ ГАРАДСКУЮ ДУМУ[1]

6-га жніўня г. г. ў Рагачові адбыліся выбары да гарадзкой думы. Палякі, беларусы і літоўцы ўтварылі выбарны радыкальна-дэмакратычны блок і выставілі агульны сьпісак кандыдатаў за № 4. Усіх сьпісаў было выстаўлено 11; усіх галасоў было подано да ўрнаў 4721; з гэтага ліку на сьпісак № 4 прышлося 917. Па сьпіску № 4 прайшло 7 кандыдатаў: 6 палякаў і 1 беларус.[2] Усяго ў Думі будзе 36 думцаў.

Вольная Беларусь. 1917. 30 жн.

ТЭЛЕГРАМА ГАЛОЎНАГА НАЧАЛЬНІКА МІНСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ ГЕНЕРАЛ-ЛЕЙТЭНАНТА КІСЯЛЕЎСКАГА ГЕНЕРАЛ-КВАТЭРМАЙСТРУ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ

28 жніўня 1917 г.

Начгарнизона Рогачева резолюцией Совдепа устранен от должности. Я телеграфировал Совдепу о незаконности его постановления и просил отмены. Начгар(у) приказал должности не сдавать. Прошу содействия фронтового комиссара.

Главновокр ген.-лейт. Киселевский

ЦДВГА, ф. 1915, воп. 9, спр. 1, л. 45. Копія.

ТЭЛЕГРАМА КАМІСАРА ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ ЖДАНАВА СТАРШЫНІ РАГАЧОЎСКАГА САЎДЭПА І ГАЛОЎНАМУ НАЧАЛЬНІКУ МІНСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

5 верасня 1917 г.

Устранение от должности начгара Алтабаева является незаконным. Прошу допустить его к исполнению обязанностей. Если Алтабаев изобличен как участник корни ловского мятежа, его надлежит направить в чрезвычайную следственную комиссию в г. Могилев. Причины устранения Алтабаева прошу мне сообщить.

Комиссар Жданов.

ЦДВГА, ф. 1915, воп. 9, спр. 1. л. 62. Копія.

---

[1] Друкуецца з захаваннем тагачаснага правапісу.
[2] На самай справе па спісе № 4 прайшло 6 кандыдатаў (заўвага П. К. Башко).

З ПАВЕДАМЛЕННЯ ГАЗЕТЫ «ГОЛОС НАРОДА» АБ РАСКОЛЕ Ў РАГАЧОЎСКАЙ АБ'ЯДНАНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ РСДРП

...члены комитета, представители фракции большевиков, заявили, что в связи с приближающимися выборами в Учредительное собрание, когда список большевиков будет конкурировать с объединенным списком меньшевиков и «Бунда», они не считают возможным вести дальнейшей совместной работы и уходят из организации. Вместе с членами комитета собрание покинуло до 35 членов организации, которые тогда же приступили к организации партии с.-д. интернационалистов (большевиков).

Голос народа. 1917. 11 окт.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «РУССКОЕ СЛОВО» АБ З'ЕЗДЗЕ СЯЛЯН РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА

Рогачев, 14.V. Состоялся уездный крестьянский съезд. Организован Совет крестьянских депутатов. На съезде постановлено лишить дезертиров права на наделение землей.

Русское слово. 1917. 16(20) мая.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «НАШЕ СВОБОДНОЕ СЛОВО» АБ ЭКСТРАННЫМ ПАСЯДЖЭННІ РАГАЧОЎСКАГА САВЕТА

26 октября в 10 часов утра были получены две телеграммы уездным правительственным комиссаром от Временного Правительства, в которых говорилось, что Петроградский Совет с. и р. д., имея в своем распоряжении крейсер «Аврора» и захватив Петропавловскую крепость, бомбардирует Зимний дворец (место заседания Временного Правительства), что две атаки отбиты и армия, возбужденная предательским выступлением большевиков, шлет правительству и Совету республики войска на помощь. Временное правительство просит всех граждан республики оказать помощь ему и в корне пресечь замыслы большевиков, играющих в руку германцев.

На экстренное заседание были приглашены: городская управа, уездная и продовольственные управы, представители почты и железной дороги.

По прочтении телеграммы председателем Совета Даленко открылись прения о тактике Совета. Все ораторы, осуждая самовольное выступление Петроградского Совета (который состоит из большевиков) и его посягательство на народную власть без согласия ЦИК, крестьянского Совета и Временного Совета республики, высказываются против самочинного поступка петроградских большевиков.

Захват власти грозит расстройству созыва Учредительного собрания, что равносильно измене и открытию фронта для немцев.

После долгих и бурных прений была принята резолюция (при 4 воздержавшихся большевиков), предложенная т. Малькевичем: «Послать срочные телеграммы Временному Правительству, Центральному исполнительному комитету, Всероссийскому крестьянскому Совету и фронтовому комитету с осуждением действий Петроградского Совета и сохранить верность Временному правительству и вышеназванным демократическим организациям».

Текст телеграммы следующий: «Рогачевский Совет солдатских, рабочих и крестьянских депутатов, представители города, уезда, и всех правительственных учреждений, в экстренном заседании, обсудил самочинное выступление Петроградского Совета против Временного Правительства, что ведет к расстройству созыва Учредительного собрания и тыла. Заседание категорически осудило это выступление и всемерно поддержит только Временное Правительство ЦИК и Совет республики».

Наше свободное слово. 1917. 28 окт.

З ДАДАТКОВАГА ПРАТАКОЛА РАГАЧОЎСКАЙ УЧАСТКОВАЙ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ ПА ВЫБАРАХ ВА УСТАНОЎЧЫ СХОД

Лістапад 1917 г.

Поименованная в основном списке участковая избирательная комиссия города Рогачева постановила: составить настоящий дополнительный протокол на нижеследующих основаниях.

В назначенный правительством день и час избирательная комиссия в своем полном составе приступила к соответствующей работе, предварительно выполнив в точности надлежащие инструкции по этому вопросу.

Во время выборов было много протестов со стороны граждан, не внесенных в избирательный список, за недопущение комиссией к голосованию. К вечеру недовольство граждан вылилось в широком размере. Все упреки были направлены непосредственно по адресу избирательной комиссии. На следующий день на этой почве враждебное недовольство возросло бы еще шире. Дабы избежать каких-то нежелательных эксцессов со стороны протестующих, комиссия 12 ноября в 10 час. вечера на совместном заседании с представителями городского самоуправления и местных общественных организаций постановила: допустить к голосованию граждан не внесенных своевременно в избирательный список, составив для этого самостоятельный список и поставив отдельный ящик-урну, а также и отчетность о результатах дополнительных выборов дать отдельно...

ЦДАКР БССР, ф. 863, воп. 1, спр. 1. л. 15.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «ГОЛОС НАРОДА» АБ ВЫНІКАХ ВЫБАРАЎ ВА УСТАНОЎЧЫ СХОД ПА г. РАГАЧОВЕ

Просматривая итоги голосования первым на перво бросается в глаза то небрежное, я бы сказал халатное отношение граждан к самим выборам.

Вместо 5318 граждан и 2046 солдат избирателей к урнам явилось только 3307 граждан и 1348 солдат. Невольно восклицаешь: «Боже мой, какой преступный абсентеизм». Почти половина процентов граждан осталась стоять в стороне совершенно пассивной. И это в такое время, когда взоры всей страны направлены на Учредительное собрание как на единственного спасителя, способного вывести погибающую страну на твердый путь, в это время почти половина граждан нашего города не проявляет никакого интереса к выборам.

По результату выборов можно составить и некоторое понятие о политических убеждениях наших граждан. Большинство голосов получил список № 9 объединенных еврейских организаций. Те евреи, которые стоят не на социалистической, а национально-буржуазной платформе, голосовали за этот список.

Остальная часть евреев, работники и работницы, по своим взглядам социал-демократы. Эта часть евреев голосовала за № 2. Список № 6 партии народной свободы получил всего около 600 голосов. Какая громадная разница между настроением обывателя в первые месяцы рѐволюции и теперь!.

Будь выборы в Учредительное собрание каких-нибудь месяца три тому назад, то список народной свободы навряд ли бы получил столько голосов.

Наконец список № 11 большевиков. Этот список больше 700 голосов среди одних только солдат. Это тоже показывает, что настроение солдат резко изменилось за последнее время, но не в ту сторону, что настроение перепуганного обывателя, не в сторону к. д.[1], а в сторону совершенно противоположную, в сторону большевиков.

Вот то заключение, какое можно вывести о настроениях граждан по их бюллетеням.

Голос народа. 1917. 23 нояб.

ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ ВА УСТАНОЎЧЫ СХОД ПА РАГАЧОЎСКІМ ПАВЕЦЕ[2]

	Число голосов	%
Список № 1. Губернский Совет крестьянских депутатов и губернская организация партии социалистов-революционеров	63 525	72,89 %
Список № 2 РСДРП[3] и «Бунд»	1736	1,99 %
Список № 3 объединенная Еврейская социалистическая рабочая партия	668	0,76 %

---

[1] кадэтаў.

[2] Выбары па Магілёўскай выбарчай акрузе праводзіліся 12—14 лістапада 1917 г.

[3] Меншавіцкія арганізацыі.

Список № 4 Еврейская социал-демократическая рабочая партия (Поалей Цион)	186	0,21 %
Список № 5 Всероссийский союз земельных собственников	1114	1,27 %
Список № 6 Партия народной свободы (кадеты)	1275	1,46 %
Список № 7 Идише фолкспартай и внепартийный демократический комитет	104	0,11 %
Список № 8 Белорусские организации	75	0,08 %
Список № 9 Еврейский национальный избирательный комитет	4716	5,41 %
Список № 10 Могилевская губернская польская рада	2494	2,86 %
Список № 11 Полесская организация РСДРП (б)	11 251	12,91 %
Всего действительных голосов	87 144	

ЦДАКР Беларусі, ф. 863, воп. 1, спр. 1. л. 52—53.

ПАВЕДАМЛЕННЕ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА САВЕТА АБ АРГАНІЗАЦЫІ ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА

1 снежня 1917 г.

Доводится до сведения граждан гор. Рогачева и уезда и всех учреждений, что организован Военно-революционный комитет, в состав коего входят представители исполкома Совета рабочих и солдатских депутатов и войдут представители крестьянского Совета, воинских частей, социалистических партий и профессиональных союзов, имеющих представителей в Совете.

Военно-революционный комитет находится под контролем Совета и его исполкома, перед которым он ответственен.

Военно-революционный комитет будет бороться со всеми эксцессами и контрреволюционными выступлениями.

Исполнительный комитет Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии : Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 2. С. 347—348.

РЭЗАЛЮЦЫЯ IV МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА СЯЛЯНСКАГА З'ЕЗДА АБ БАРАЦЬБЕ З КОНТРРЭВАЛЮЦЫЙНЫМІ ПОЛЬСКІМІ ЛЕГІЁНАМІ

8 студзеня 1918 г.

Принимая во внимание, что пребывание в губернии польских легионеров, разоряющих нашу деревню и трудовое крестьянство, имеет открытые политические, контрреволюционные, захватнические цели польской знатной буржуазии, вступившей в союз с помещиками нашего края и их организациями, губернский крестьянский съезд постановил:

1. Требовать от революционной Ставки и центральной власти самых решительных и окончательных мер к выводу войск из пределов Белорусского края, не останавливаясь перед разоружением и интернированием польских легионов.

2. Перед лицом всего крестьянства съезд, как высший орган народной власти в губернии и хозяин ее, заявляет, что со своей стороны он не ограничится одним вынесением резолюций по борьбе с контрреволюционными войсками и потребует конные белорусские части для гарантии выполнения легионами нашего постановления об их уходе.

3. Союз земельных собственников объявляется контрреволюционной организацией, и как таковой должен прекратить свое существование, а члены его привлекаются к суду революционного трибунала.

4. Находящийся в плену у польских легионов гор. Рогачев должен быть немедленно очищен этими войсками в 5-дневный срок, в противном случае съезд и исполнительный комитет губернскога Совета крестьянских, рабочих и солдатских депутатов оставляют за собой полную свободу действий по отношению к польским легионам и их начальству.

5. Во имя солидарности трудящихся обратиться к товарищам польским социалистам с предложением оказать и свое содействие на польских солдат, обманываемых в своей преступной заговорщической затее своей буржуазией.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 2. С. 724—725.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «СОВЕТСКАЯ ПРАВДА» АБ БАРАЦЬБЕ СУПРАЦЬ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЙНАГА ВЫСТУПЛЕННЯ ПОЛЬСКІХ ЛЕГІЁНАЎ НА ЧАЛЕ З ГЕНЕРАЛАМ ДОЎБАР-МУСНІЦКІМ

23 студзеня 1918 г.

13 января польскими легионами в колич[естве] 26 тыс. 3-х родов оружия, во главе с польским генералом и штабом, захвачен гор. Рогачев. Ими разогнан Совет рабочих и солдатских депутатов, арестован крестьянский Совет и комиссар, избранный крестьянским съездом.

Захвачены все учреждения, казначейство с 1600 тыс. руб. наличностью: арестованы русские и польские социалисты: одновременно начались выступления в Сенненском у., также и в Смоленской губ. Совершаются насилия над крестьянами. Все то является следствием официального объявления польской буржуазией «священной войны» Польским штабом объявлена в Рогачеве аннексия Могилевской губ. в состав монархической Польши. Поезда задерживаются, в Рогачеве обыскиваются наши солдаты. Губ[ернский] исп[олнительный] комитет Совета солдатских, крестьянских и рабочих депутатов, действуя согласно постановлениям съезда как высшая власть губернии и усматривая в контрреволюционном выступлении польской буржуазии и ее легионеров прямую угрозу Советской власти и завоеваниям революции, издал декрет об аресте представителей польской буржуазии, помещиков и тех лидеров кадетской партии и союза земельных собственников, которые вместе с открытыми врагами революции в союзе с польской буржуазией, выступающей против нас... «Союз земельных собственников», ввиду установления прямой связи с его выступлением, объявлен вне закона. Арестованы кн. Святополк-Мирский, ксендз Цека, целый ряд буржуазных польских организаций по соглашению с польской партией социалистов. Революционной Ставкой принимаются стратегические меры. Мы взяли на себя организацию агитации среди польских войск, чтобы побудить солдат арестовать своих офицеров и штаб. Выпущены воззвания на польском языке. Есть сведения из Рогачева о начавшемся брожении среди польских войск. Однако штаб арестовывает сознательных польских солдат, не желающих играть в руку польской буржуазии. Нами предъявлен ультиматум польскому штабу об очищении Рогачева, подчинении Ставке и прекращении насилий и арестов. В зависимости от результатов мятежа стоит судьба арестованных нами польских помещиков, кадетов и вообще контрреволюционеров как заложников. Мы считаем необходимым содержать их в тюрьме и после подавления мятежа.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 2. С. 831—832.

ПІСЬМО СЯЛЯН ВЁСКІ ЗАБАЛАЦЦЕ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ Ў МАГІЛЁЎСКІ САВЕТ АБ АКАЗАННІ ДАПАМОГІ Ў БАРАЦЬБЕ СУПРАЦЬ ПОЛЬСКІХ ЛЕГІЯНЕРАЎ

25 студзеня 1918 г.

При сем представляем сведения о поступлении войск польских легионов, находящихся в с. Заболотье Рогачевского у. Могилевской губ., которые делают те поступки, которые они делают, несмотря на то, что в имении Заболотье забирают фураж и скот, но еще с 17 на 18 января с. г. ночью около 11 час. ночи делали в с. Заболотье обыск оружия и занялись грабежом. У многих жителей забрали деньги и сало, то поэтому Заболотское сельское общество просит от вас обязательно помощи, потому что дальше жить невозможно, и мы все погибаем в руках полицейских войск.

Следуют подписи.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн. 1957. Т. 2. С. 842—843.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ «ПРАВДА» АБ ВЫЗВАЛЕННІ ГОРАДА РАГАЧОВА І РАЗГРОМЕ 1-й ПОЛЬСКАЙ ДЫВІЗІІ

15 лютага 1918 г.

К утру 31 января мы овладели всеми укрепленными позициями 1-ой польской дивизии. Рогачев был захвачен нами уже в 23 ч. в ночь на 31 января обходом одним полком с востока в направлении к дер. Мадоры-Озорище за р. Друть.

Невзирая на то, что дороги из Рогачева на Бобруйск были в наших руках уже к вечеру 30 января, польская дивизия продолжала сражаться с крайним упорством за укрепленные позиции в 4-х местах севернее Рогачева и деревни западнее Рогачева.

В настоящее время 1-ой польской дивизии больше не существовать, т. к. в Бобруйск успели прорваться лишь незначительные части командного состава.

Польские солдаты массами сдаются в плен. Часть их разбрелась, побросав оружие.

Большой железнодорожный мост у Рогачева через р. Друть спасен нашим разъездом, успевшим вовремя прорваться к мосту и захватить польских подрывников, подготовлявших этот мост к взрыву. В рядах 1-ой польской дивизии сражалось много германских и австрийских офицеров и военнопленных солдат.

При опросе офицеры 1-ой польской дивизии заявили, что целью 1-го Польского корпуса было обеспечить присоединение к коренной Польше Минской и Могилевской губ. по принципу самоопределения.

Командующие войсками, действующими против 1-го Польского корпуса, Ваптетно и Павлуновский.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии: Документы и материалы. Мн., 1957. Т. 2. С. 879.

ПРАТАКОЛ АГУЛЬНАГА СХОДУ ГРАМАДЗЯН АД 18 ГАДОЎ ДА 45-ГАДОВАГА ЎЗРОСТУ ДОЎСКАЙ ВОЛАСЦІ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА

7 чэрвеня 1918 г.

Агульны сход мужчынскага насельніцтва ад 18 да 45-гадовага ўзросту заслухаў дэкрэт СНК ад 8 красавіка 1918 года, пастанавілі:

У сувязі з блізкасцю немцаў і магчымасцю прасоўвання іх углыб Расійскай Рэспублікі і заняцця імі нашага ўраджаю, арганізаваць з прыгоднага да ваеннай службы насельніцтва Доўскі рэвалюцыйны полк, згуртаваны жалезнай дысцыплінай, каб абараніць Радзіму і рэвалюцыю ад небяспекі, адкуль бы такая ні зыходзіла. Разбіўку зрабіць на месцах, а вядзенне ўліку згодна адзначанага дэкрэта ўскласці на валасны ваенны камісарыят. Для падтрымання дысцыпліны выпрацаваць правілы клятвеннага абяцання адзін перад адным, гонарам выконваць доўг грамадзяніна, салдата і пакарання за парушэнні клятвы. Для выканання 1-га пункта адзначанага дэкрэта аб валасных камісарыятах па ваенных справах сход адзінагалосна выбраў: у ваенныя кіраўнікі грамадзяніна вёскі Асмолавічы, былога паручніка 9-га Сібірскага стралковага палка Фрола Спірыдонавіча Краўцова.

У камісары: 1. Грамадзяніна Ст. Доўска, былога паручніка 742-га Панявежскага пях. палка Венідзікта Міхайлавіча Кіслякова. 2. Большасцю галасоў пры 2-х супраць і 4-х устрымаўшыхся грамадзяніна вёскі Балотня, былога падпаручніка 2-й батарэі 135-га артылерыйскага дывізіёна Наума Канстанцінавіча Мішчакова.

Усе грамадзяне Доўскай воласці патрабуюць хутчэйшай прысылкі зброі для барацьбы з ворагамі Радзімы і рэвалюцыі, а пагэтаму даручаюць выбраным камісарам Кіслякову, Мішчакову і Краўцову неадкладна скласці патрабаванне на зброю і іншую амуніцыю і патрабаваць хутчэйшай прысылкі, таму што ўсялякае прамаруджанне пагражае гібеллю маладой Расіі. Мы, сялянства, гучна заяўляем, што не дадзім загінуць маладой Расіі, гатовы стаць на абарону ўсе — ад мала да вяліка.

Старшыня Савета Піткевіч
Члены выканкома Храмцоў, Ш. Руслінцэр, Бычкуноў, Дудкоў
Сакратар Старастаў.

Камунар. 1967. 27 ліп.

ПАСТАНОВА АБ'ЯДНАНАГА ПАСЯДЖЭННЯ САВЕТА І КАМБЕДА ДАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ АБ ПЕРАВЫБАРАХ САВЕТА І АРГАНІЗАЦЫІ ВАЛАСНОГА І СЕЛЬСКІХ КАМБЕДАЎ

28 ліпеня 1918 г.

Постановили: переизбрать волостной Совет и переименовать его в Совет депутатов бедноты: в таковой избрать бедняков от граждан дер. Звонца — 1) Осипа Гудеева, 2) Фрола Хворостова; дер. Ст[арого] Кривска — 3) Луку Чаковского, 4) Ивана Деркунова; с. Шапчиц — 5) Архипа Лявшукова, 6) Агея Рождаева; с. Хизова — 7) Григория Великовского; дер. Осмолович — 8) Гавриила Сотникова, 9) Никифора Возанкова; дер. Староселья — 10) Василия Дивненкова, 11) Михаила Бондарева; дер. Ямного — 12) Константина Котова, 13) Демьяна Самусева; им[ения] Дедлово — 14) Мартина Барабоша, 15) Иосифа Новенького; мест. Сверженя — 16) Николая Савицкого, 17) Александра Рогожкина, 18) Лазаря Лесковича; дер. Гутища — 19) Семёна Бычкунова; дер. Ст[арой] Олешни — 20) Григория Гореликова; дер. Курганья — 21) Василия Козакова, 22) Матвея Пешехонова; дер. Хизовской Буды — 23) Сидора Матвеенкова, 24) Сидора Филиппенкова; дер. Сычмана — 25) Тимофея Лопушкова, 26) Петра Михеенкова; дер. Малошкович — 27) Семена Кушнарова, 28) Павла Посредникова; дер. Борхова — 29) Сергея Макеенкова; дер. Сипоровки — 30) Ефима Макаренкова, 31) Антона Сурначева; хут. Довска — 32) Михаила Кормаша; от отряда Красной Армии — 33) Романа Афанасенкова; дер. Петрович — 34) Трофима Старостенкова, 35) Кузьму Афанасенкова; с. Болотни — 36) Степана Тытырева и 37) Алексея Богданова.

Председателями сельских комитетов Совета депутатов бедноты избрать от бедняков дер. Звонца — 1) Степана Щербакова; дер. Старого Кривска — 2) Назара Сомова; с. Шапчиц — 3) Пимена Дроздова; с. Хизова — 4) Ивана Киреева; дер. Осмолович — 5) Семена Столярова; дер. Староселья — 6) Семена Тисименкова; дер. Ямное — 7) Ивана Маркотина; имения Дедлово — 8) Максима Богдановича; мест. Сверженя — 9) Филиппа Бондарева; дер. Гутища — 10) Даниила Микуленкова, дер. Довска — 11) Максима Певнева, [дер.] Ст.[арого] Довска — 12) Элю Эпштейна; дер. Берестовца — 13) Семена Ковшеенкова; дер. Ст[арой] Олешни — 14) Алексея Зенькова; дер. Курганья — 15) Макара Николаева; дер. Юдич — 16) Семена Дивоченкова; дер. Хизовской Буды — 17) Даниила Миронова; дер. Сычмана — 18) Иосифа Солошенкова; дер. Малошкович — 19) Никифора Винтесенкова; дер. Борхов — 20) Виктора Тимошенкова; дер. Сипоровки — 21) Тихона Швайковского; хутора Довска — 22) Платона Саприко; дер. Петрович — 23) Семена Старостенкова, с. Болотня — 24) Ивана Глушакова.

В президиум волостного Совета депутатов бедноты избрать бедняков: председателем Николая Матвеевича Ангелейко, членами Ермолая Евдокимовича Сотникова, Василия Ивановича Дивненкова, Трофима Лаврентьевича Старостенко и Архипа Николаевича Лявшунова.

Вновь избранному президиуму Совета депутатов бедноты приступить к работе с 31 июля нового стиля по приёмке дел волостного Совета от старого президиума.

Комитеты бедноты Белоруссии: Сб. документов и материалов. Мн., 1958. С. 232—233.

ЗАГАД РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ ВАЛВЫКАНКОМАЎ У ВАЛРЭЎКОМЫ

11 кастрычніка 1919 г.

Ввиду близости фронта, требующего от Советской власти напряженной революционной работы, уревком постановил: волисполкомы в Тихиничах, Кистенях, Луках, Стрешине и м. Жлобине реорганизовать в Ревкомы в составе: одного представителя от 8-й дивизии и двух от волисполкомов, причем председатель волревкома назначается уревкомом. Отделы волисполкомов продолжают свою работу, во всех случаях подчиняясь волревкому. Волревком объявляется высшей гражданской властью в пределах своей волости и подчиняется уревкому, уездному военкому и начальникам боевых участков фронта.

Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г.— июль 1920 г.): Сб. документов и материалов. Мн., 1961. С. 207.

ЗАГАД РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА АБ УВЯДЗЕННІ ЎСЕАГУЛЬНАЙ ПРАЦОЎНАЙ ПАВІННАСЦІ ПА НАРЫХТОЎЦЫ БУДАЎНІЧЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ І ПАЛІВА

Не пазней 23 сакавіка 1920 г.

Всем гражданам гор. Рогачева и уезда, всем волревкомам, сельсоветам и профсоюзам.

Республика страшно нуждается в топливе и строительных материалах. Все это разрушила война, затеянная буржуазией, все это разрушила гражданская война — война на мозолистых рук с помещиками и фабрикантами, все это необходимо срочно восстановить, построить, ибо без этого невозможны дальнейшие важные завоевания рабочих и крестьян Советской республики, без восстановления разрушенного невозможна дальнейшая свободная и спокойная жизнь трудящихся в Советской республике.

Рогачевский революционный комитет, исполняя волю рабочих и крестьян всей республики, постановляет:

Срочно провести в жизнь всеобщую трудовую повинность по заготовке топлива и строительных материалов; для чего обязывает всех граждан обоего пола от 17 до 50 лет явиться в ближайшие районы лесозаготовок для работ в лесу. Причем граждане, имеющие пилы и топоры, обязаны вырубить не менее 1 куб. саж. дров 3 арш. длины или не менее 1/2 саж. швырка. Граждане, не имеющие пил и топоров, обязаны явиться на подборку раскиданных и подъемку развaленных штабелей дров в лесу. Женщины должны производить подборку сучьев в лесу по указанию лесничих. Отбывание повинности продолжается 3 дня. Все указания о местах работ и характере их будут даны ближайшими лесозаготовительными организациями или их отделениями (конторами). По окончании работ каждый гражданин обязан получить соответствующее удостоверение от лесозаготовительных организаций, по которым будет производиться расплата по установленным ценам в местных конторах по окончании работы.

Всем лесозаготовительным организациям срочно произвести техническую разработку данного приказа не позднее 28 марта.

Трудовая повинность должна быть закончена к 8 апреля с. г. Все граждане, уклонившиеся от выполнения данной трудовой повинности, будут взяты на особый учет и привлечены к работе принудительно, а также понесут ответственность как за неподчинение.

Лесным конторам, волревкомам, сельским Советам под личную ответственность следить за проведением настоящего приказа.

Председатель Ревкома *Мышковский*
Ответственный руководитель по топливу уполномоченный XVI армии *Солдатов*
Секретарь *Гарбуз*

Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г.— июль 1920 г.): Сб. документов и материалов. Мн., 1961. С. 333—334.

Побалаўскі бой

З успамінаў ураджэнца в. Побалава І. Цімашэнкі

У 12 гадзін ночы 30 лістапада 1917 г. над в. Побалава Рагачоўскага павета ў паветра ўзнялася чырвоная ракета. Гэта быў сігнал небяспекі: да вёскі набліжаліся польскія легіянеры. Начны дазор з атрада мясцовай самаабароны паведаміў аб гэтым атраду Чырвонай гвардыі. За ракой у в. Востраў, дзе былі асноўныя сілы атрада, занялі абарону чырвонагвардзейцы. На дапамогу прыйшло мясцовае насельніцтва, усе, хто мог валодаць зброяй.

Легіянеры з'явіліся нечакана, зайшлі з тылу. Прыйшлося змяніць баявыя парадкі. Адзіная 3-цалёвая гармата была нацэлена чырвонагвардзейцамі на захад, а цяпер яе трэба было паварочваць на ўсход і страляць прамой наводкай на блізкую адлегласць. Белапалякі разгортвалі свае сілы і вялі інтэнсіўны кулямётны агонь. У гэты час на дапамогу чырвонагвардзейскаму атраду спяшаліся былыя салдаты з суседніх вёсак Крыўка, Рэпкі, Ліскі. Ноччу цяжка было вызначыць сілы праціўніка. Вёска Побалава, дзе знаходзіўся камандзір атрада Тарасаў са сваім штабам, першая падверглася нападу белапалякаў, якія імкнуліся захапіць камандзіра, але не змаглі.

Легіянеры хацелі ўзяць штурмам в. Востраў. Чырвонагвардзейцы вырашылі змагацца да апошняга патрона, але сілы былі няроўныя. Супраць атрада з 75 чалавек выступіў уланскі полк на чале з афіца-

рамі, што служылі ў старой царскай арміі. Па сіле агню белапалякі у 3—4 разы пераўзыходзілі чырвонагвардзейскі атрад. Яны здолелі цаной цяжкіх страт акружыць вёску і захапіць у палон 19 чырвонагвардзейцаў і некалькі мясцовых сялян, усіх іх расстралялі. Загінулі жыхары в. Востраў Шынкевіч Мітрафан, Пётр Якімовіч. Іосіф Худалей уцёк з-пад расстрэлу.

Дэлегат першага з'езда

З успамінаў С. Дзівачэнкі

У час рэвалюцыйных падзей 1917 г. я служыў унтэр-афіцэрам драгунскага кавалерыйскага палка, які дыслацыраваўся на станцыі Давыдаўка Варонежскай губерні. У маі кавалерысты эскадрона выбралі мяне сваім пасланцом у Варонежскі губернскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Пасля кастрычніцкага паўстання ў Петраградзе ў палку быў створаны чырвонагвардзейскі атрад. Я быў абраны камандзірам узвода. Удзельнічаў у баях супраць войск генерала Каледзіна.

Па стану здароўя ў пачатку 1918 г. мне прыйшлося вярнуцца на радзіму — у в. Хмелянец на Рагачоўшчыне. Гэта былі трывожныя дні. Нямецкія акупанты захапілі Рагачоў. Разам з мясцовымі бальшавікамі я ўдзельнічаў у стварэнні Доўскага валаснога рэвалюцыйнага камітэта. З сакавіка 1918 г. на сходзе ўпаўнаважаных быў выбраны кіруючы орган камітэта на чале з жыхаром в. Задуб'е Кармянскага р-на Старасценкам. Затым у воласці арганізавалі рэвалюцыйны полк, які ваяваў з тымі, хто выступаў супраць Савецкай улады.

У снежні 1919 г. мяне выбралі прадстаўніком партыйнай арганізацыі на 6-ю паўночна-заходнюю абласную канферэнцыю РКП(б). Раніцай 27 снежня 1919 г. на станцыі Рагачоў нам, дэлегатам, падалі «эшалон», які складаўся са старэнькага паравоза і аднаго вагона.

Праходзіла канферэнцыя ў Смаленску ў будынку былога дваранскага сходу. Абмяркоўвалі даклад аб бягучым моманце, справаздачны даклад абласнога камітэта РКП(б), даклады аб становішчы на месцах. З выключна вялікай увагай мы слухалі даклад А. Ф. Мяснікова і яго прапанову аб стварэнні БССР і перайменаванні канферэнцыі ў першы з'езд Кампартыі Беларусі.

Калі работа канферэнцыі завяршалася, я падаў у прэзідыум запіску і прасіў дапамагчы абмундзіраваннем для Доўскага вартавога батальёна. Просьбу задаволілі. Дамоў я вёз 50 камплектаў абмундзіравання і 320 пар смаленскіх лапцяў.

Пасля з'езда працаваў камісарам Доўскага валаснога рэўкома. Восенню 1923 г. дробныя сялянскія гаспадаркі былі аб'яднаны ў сельгасарцель «Чырвоны хлебароб», старшынёй якой абралі мяне.

У даваенныя гады ўзначальваў сельскія Саветы, быў дырэктарам МТС. У час гітлераўскай акупацыі партызаніў, затым аднаўляў разбураную гаспадарку.

Як святкавалі Першамай

З газеты «Известия Рогачевского уездного исполнительного комитета» № 49 за 1919 год

Маршрутная комиссия остановилась на следующем порядке манифестации: а) Утром, 1-го мая, все организации, красноармейские части и школьные коллективы собираются у своих центров и затем, выстроившись в колонны, направляются на казарменную площадь с таким расчетом, чтобы не позже 10 с половины часов утра быть на месте. Каждая организация и каждая часть занимают на площади определенное место по указанию особых распорядителей по указанию маршрутной комиссии, б) О начале торжества возвещается сигнальным залпом из орудий, после чего открывается общий митинг речью представителя от Рогачевской Коммунистической партии коммунистов-большевиков, после которой в) парад красным войскам гарнизона гор. Рогачева. Детали парада поручается разработать Начальнику гарнизона т. Чичко. г) Все организации, части красной армии и школьные коллективы выстраиваются в следующем порядке: впереди оркестр духовой музыки трудовой школы, затем партия коммунистов-большевиков, далее следуют части красной армии со взводом особого назначения впереди. Далее профессиональные организации, за ними школьные коллективы. Шествие заключается всеми остальн-

ными гражданами, желающими манифестировать. Между красноармейскими частями и профессиональными Союзами помещается хор рабочих. д) Маршрут: по Циммерманской ул. до Комитета Партии ком.-большевиков, затем манифестация заворачивает по переулку на Поповскую улицу, причем школьные коллективы не входят в переулок, поворачивают обратно и выстраиваются по улице, до соборной площади, ожидая подхода главных колонн. При выходе главных колонн по Бобруйскому шоссе опять на Циммерманскую улицу, оркестр становится во главе школьных коллективов и ведет за собою колонны учащихся за город на прогулку. Главные колонны продолжают шествие и одна часть колонны в составе партии и красноармейцев останавливается на площади 1-го мая (у советского театра), а вторая часть в составе профессиональных организаций на площади Собора, где и устраиваются митинги, на которых выступит ряд ответственных ораторов. Распорядителями на митингах назначаются Никитин и Самусевич.

3) Лекционная Комиссия предполагает организовать накануне праздника 30 апреля в 7 часов вечера одновременно в разных районах города лекции на тему о международном празднике 1-го мая. Лекции будут прочитаны в следующих местах.

В помещении Сельхоза, театре, клубе артиллеристов, в Военкоме и клубе 4-го запасного батальона и в помещении Советского кинематографа.

Бой за вёску Вялікія Бортнікі

З успамінаў Івана Яўсеевіча Ярачкіна

У скверы, што насупраць гарадскога парку імя Цымермана ў Рагачове, стаіць помнік. На ім надпіс: «Вечная слава героям, якія загінулі ў баях за Савецкую ўладу». Тут пахаваны чырвонаармейцы, што 7 лістапада 1919 г. адбілі вераломны напад белапалякаў. З удзельнікаў гэтай схваткі ў жывых засталіся двое: камандзір узвода Коршак і чырвонаармеец Ярачкін.

У пачатку лістапада 1919 г. лінія фронту з белапалякамі праходзіла ў раёне в. Вялікія Бортнікі па шашы Рагачоў — Бабруйск. 6 лістапада наш узвод у складзе 20 чалавек на чале з камандзірам тав. Коршакам, як звычайна, пасля абеду накіраваўся ў сутачны нарад на заставу.

У тым годзе зіма была ранняя, у пачатку лістапада ездзілі ўжо на санях. Вечарам 6 лістапада пайшоў снег. У другой палове ночы наступіла адліга, а к раніцы — густы туман. Белапалякі, карыстаючыся заслонай туману, перайшлі ў наступленне. Вартавыя, якія стаялі на пастах, своечасова ўзнялі трывогу. Застава ўступіла ў няроўны бой. У ход былі пушчаны ўсе сродкі абароны: гранаты, штыкі і прыклады. Але праціўніку, які нёс вялікія страты, усё ж удавалася прасоўвацца. Жменька чырвонаармейцаў не здавала сваіх рубяжоў. Геройскі загінула застава 2-га ўзвода ў колькасці 18 чалавек. Засталіся ў жывых двое: камандзір узвода і я — радавы.

З падыходам свежай роты чырвонаармейцаў, якая адразу ўступіла ў бой, атака белапалякаў захлынулася, праціўнік залёг і ўзмацніў кулямётны і аружэйны агонь.

Стварыўшы перавагу ў сілах на ўчастку нашай роты, белапалякі зноў пайшлі ў наступленне. Атакі паўтараліся адна за адной, але толькі пасля пятай наша рота пакінула Бортнікі і адступіла да ўзлеску, да домікa лесніка, і заняла новыя пазіцыі. Тут вораг сустрэў ўпартае супраціўленне і вымушаны быў залегчы. Перастрэлка ішла працяглы час, але ланцугі не паднімаліся, праціўнік накапліваў свежыя сілы. У гэты час і да нас падышла з батальённага рэзерву 7-я рота.

З Рагачова ўдарылі нашы дальнабойныя гарматы, пачалася артылерыйская канада. Затым камандзір 3-га батальёна А. В. Шусцікаў павёў байцоў у контратаку. Чырвонаармейцы з боем занялі Бортнікі. Абяскроўлены вораг не прыняў лабавой атакі і спешна пачаў адступаць, адстрэльваючыся на хаду і пакідаючы забітых і параненых.

Тым часам агонь нашай артылерыі быў перакінуты на в. Лейчыцы, дзе размясціўся штаб 3-га Пазнанскага палка. Наша 9-я рота заняла ваколіцу вёскі. З другога боку паявілася 7-я рота. Лейчыцы былі таксама ўзяты. Пасля бою мы падабралі ў Бортніках целы 18 гераічна загінуўшых чырвонаармейцаў нашага ўзвода і на сялянскіх падводах даставілі іх у в. Барсукі. Па дарозе былі знойдзены целы яшчэ двух чырвонаармейцаў нашага батальёна, якія загінулі пры ўзяцці в. Бортнікі.

У в. Барсукі стаяў абоз нашага 3-га батальёна. Днём 7 лістапада целы загінуў-

шых былі падрыхтаваны да пахавання. Жанчыны сабралі для іх 20 прасцін. Воіны былі пахаваны ў Рагачове пад жалобныя гукі аркестра і залпы аружэйнага салюта.

* * *

Супрацоўнік Цэнтральнага ваенна-марскога музея ў г. С.-Пецярбург І. Я. Краўцоў устанавіў імёны загінуўшых у гэтым баі і пахаваных у Рагачове байцоў 72-га стралковага палка Чырвонай Арміі. Вось яны:

БАРАНКОЎ Трафім Рыгоравіч, ураджэнец в. Гара Даямідаўскага павета Смаленскай губерні.

БЯЛГРАДСКІ Іван Парфенавіч, в. Цвердава Быхаўскага павета.

БРАШКО Яфім Федасеевіч, в. Новыя Дарогі Бабруйскага павета.

БУЛАХ Фёдар, в. Казулічы Бабруйскага павета.

ВІЦЕЕЎ Сяргей Яфімавіч, Багалюбская воласць Уладзіміраўскага павета аднайменнай губерні.

ГАЛЬПЕРЫН Лейба Шаравіч, м. Дворцы Слонімскага павета.

ГАСЮК Сцяпан Міхайлавіч, в. Ручайцы Ашмянскага павета.

ДРАЗДОЎ Дамітрый Паўлавіч, в. Лукі Навагрудскага павета.

КАЛЕНІКАЎ Антон Аляксеевіч, г. Коўна (Каўнас).

КАРОЛЬ Майсей Апанасавіч, в. Раць Бабруйскага павета.

ЛЯЎКОВІЧ Іван Вікенцьевіч, в. Равін Навагрудскага павета.

ПЛЯСКАЧ Сямён Іванавіч, в. Пагарэлкі Навагрудскага павета.

РАБІНКІН Васіль Іванавіч, в. Чарнагорава Вязнікаўскага павета Уладзімірскай губерні.

РАСКІН Файбіш Нохімавіч, г. Мінск.

ТЫЦКО Марк, в. Баранавічы Бабруйскага павета.

ХАЛАДОК Каліграт Максімавіч, в. Тлушычы Бабруйскага павета.

ХРОМАЎ Васіль Іванавіч, в. Капуст Наўгародскага павета аднайменнай губерні.

у баях на Дняпры

Кананерскія лодкі Дняпроўскай ваеннай флатыліі «Грамавы», «Гарачы» і «Гучны» і бранякатэр № 4 прыбылі ў Рагачоў к канцу дня 17 мая 1920 г. і сталі на швартовы вышэй моста праз Дняпро. З 28 красавіка гэтыя караблі пад камандаваннем начальніка 2-га дывізіёна ваеннага марака Барыса Львовіча Дандрэ і камісара дывізіёна Васіля Іванавіча Дзядлоўскага ўдельнічалі ў баях супраць белапалякаў у вусці Бярэзіны, у раёне Горваль — Якімаўская Слабада — Шацілкі (цяпер г. Светлагорск). Атрылерыйскім агнём канлодкі падтрымлівалі часці 10-й і 57-й стралковых дывізій, якія дзейнічалі на фронце ад Рэчыцы да Шацілак на лініі рэк Дняпро і Бярэзіна з мэтай разгарнуць наступленне на Калінкавічы — Мазыр і вызваліць гэтыя стратэгічныя пункты.

Так, 9 мая 1920 г. караблі 2-га дывізіёна флатыліі наладзілі пераправу войск 57-й і 10-й дывізій Чырвонай Арміі з правага берага Дняпра на левы, калі тыя апынуліся ў крытычным становішчы ў раёне Горваля.

У наступныя дні караблі курсіравалі ў раёне вёсак Ніжняя і Верхняя Алба, наносілі артылерыйскія ўдары па пераправах і наступаючых сілах праціўніка, які імкнуўся захапіць Жлобін і Рагачоў. Знаходжанне караблёў на фронце ў адрыве ад баз забеспячэння стала небяспечным, і было вырашана зрабіць базай г. Рагачоў. Да таго ж на выпадак магчымай абароны горада караблі павінны былі стаць трывалай заслонай ад войск белапалякаў. Тым больш, што вышэй Рагачова судны з-за меляў і перакатаў падняцца не маглі.

Стаянка ў Рагачове не была пастаян-



Кананерскія лодкі «Грамавы» і «Гарачы» на Рагачоўскім рэйдзе. Чэрвень 1920 г.

най, адсюль канлодкі з адпаведнай асадкай адпраўляліся ў раён баявых дзеянняў. Так, канлодка «Гарачы» 19 мая накіравалася з Рагачова на фронт з запасам снарадаў, паліва і харчавання для вартавых суднаў «Арол», «Беркут» і судна сувязі «Літвінка». 20 мая па загаду камандзіра 29-й стралковай брыгады «Гарачы» вёў артылерыйскі абстрэл пазіцый белапалякаў у раёне перасячэння дарог з в. Шыхаў на Верхнюю і Ніжнюю Албу. У выніку інтэнсіўнай стральбы на кармавой гармаце трэснуў ствол: страляць стала немагчыма, і на другі дзень канлодка вярнулася ў Рагачоў. Камандзірам «Гарачага» быў марак-чарнаморац Іван Мацвеевіч Іваноў, камісарам — марак-балтыец Іван Якаўлевіч Сарапульцаў.

Судны флатыліі былі жахам для праціўніка, які панёс ад іх трапнага агню немалыя страты і ўсяляк імкнуўся іх знішчыць. З 18 па 23 мая стаянка караблёў у Рагачове і сам горад некалькі разоў былі бамбардзіраваны белапольскай авіяцыяй. Аднак зенітная артылерыя «Грамавога», «Гучнага» і бранякатэра № 4 адбівала атаку варожых аэрапланаў. 24 мая на фронт з Рагачова была накіравана канлодка «Гучны», а на другі дзень са штабам 2-га дывізіёна караблёў — канлодка «Гарачы». 25 мая канлодкі вялі артагонь па праціўніку ў Горвалі, сарвалі спробу белапалякаў захапіць в. Ніжняя Алба.

30 мая каля Стрэшына белапалякі наладзілі засаду з мэтай знішчэння караблёў.

Пасля трохгадзіннага моцнага бою судны прарваліся, дайшлі да Затона і сталі на швартовы.

Гарачае і сухое лета выклікала моцнае абмяленне Дняпра, што не давала магчымасці канлодкам пакінуць Рагачоўскі рэйд і накіравацца на фронт. Перыядычна з фронту ў Рагачоў прыбывалі і адплывалі вартавыя судны «Арол» і «Беркут», а таксама дапаможныя судны «Проня», «Слава», «Леў», «Бесядзь», «Эльза», «Магілёў», «Усход», судна сувязі флатыліі «Літвінка». Бранякатэр № 4 з-за сур'ёзнай няспраўнасці матора ўвесь перыяд знаходзіўся ў Рагачове.

Аб далейшых дзеяннях караблёў паведамляецца ў рапарце Б. Л. Дандрэ ад 26 чэрвеня: «На суднах у Рагачове праводзяцца практычныя заняткі па артылерыі: разборка і зборка замкоў, гарматных кулямётаў, штодзённа заняткі з сігнальшчыкамі, практычная стральба з вінтовак і кулямётаў. Чытаюцца лекцыі па тактыцы. Фарватэр ад Рагачова да Жлобіна праходны, хоць і з цяжкасцю. У цяперашні час мной арганізавана дастаўка дроў у Рагачоў, Жлобін і Стрэшын. Дровы дастаўляюцца падводамі праз райлесканцтору Рагачова. У Рагачове стаіць баржа з дровамі каля 25 кубаметраў, якую ў любы момант можна адбуксіраваць у Жлобін або Стрэшын. Забеспячэнне харчаваннем здавальняючае: мяса, хлеб, бульбу атрымліваю з 10-й дывізіі, паўднёвую групу забяспечваю харчаваннем і артылерыйскімі запасамі дапаможным суднам «Эльза», а таксама дровы дастаўляем са Свержаня ў Рагачоў. Гаспадарчы артылерый-

Каманда кананерскай лодкі «Грамавы».

Каманда кананерскай лодкі «Гарачы». Чэрвень 1920 г. У першым радзе злева направа: другі — В. І. Дзядлоўскі, трэці — С. С. Машэйка, пяты — Ф. Г. Якушэнка. У трэцім радзе другі злева І. Я. Саракульцаў, побач з ім І. М. Іваноў. У апошнім радзе чацвёрты справа С. К. Маргуноў.

скі і машынны склады перамешчаны на прысланы ў маё распараджэнне параход «Магілёў». З 6 па 10 чэрвеня канлодкі баёў не вялі з-за моцнага абмярзання ракі...». З 10 па 19 чэрвеня судны дывізіёна ўдзельнічалі ў баях каля Жлобіна, Ніжняй і Верхняй Албы, Горваля і Стрэшына.

Маракі канлодкі «Грамавы» (камандзір марак-балтыец Валянцін Іванавіч Партнягін, камісар — ураджэнец г. Рэчыцы, былы машыніст лінкора «Гангут» Балтыйскага флоту Рыгор Мітрафанавіч Хамянок) і бранякатэра № 4 удзельнічалі 26 мая ў тушэнні вялікага пажару, які ахапіў г. Рагачоў. Самаадданая і гераічная работа па ліквідацыі пажару згуртавала каманды караблёў, а былыя маракі і франтавікі з ліку мясцовай моладзі добраахвотнікамі ўвайшлі ў склад 2-га дывізіёна флатыліі.

Так, 26.5.1920 г. пастуціў на канлодку «Грамавы» Ціхан (Цімафей) Рыгоравіч Уласаў з Доўскай воласці, 2 чэрвеня залічаны пісарам ураджэнец в. Ходасавічы Гарадзецкай воласці Апанас Сцяпанавіч Яфрэмаў (Ахромаў). У чэрвені сталі машыністам судна Раман Ігнатавіч Корзунаў з в. Рэкта Азяранскага сельсавета, які служыў раней на лінкоры «Палтава» на Балтыцы, кулямётчыкам Кузьма Андрэевіч Мельнікаў з Доўскай воласці. Кокам на «Грамавы» паступіў Яфім Яфрэмавіч Ечашоў з в. Кісцяні (яго брат Лявон Яфрэмавіч таксама быў ваенным маракам).

Ураджэнцы Рагачоўскага павета папоўнілі каманду карабля, і пазней рулявым стаў былы марак-чарнаморац Лаўрэнцій Яфімавіч Ксяндзоў, старшым сігнальшчыкам — Леў Віктаравіч Дзмітрыеўскі, машыністам — Дзяменцій Міхайлавіч Уздоўскі, марак-балтыец з эсмінца «Гром», які вызначыўся ў кастрычніку 1917 г. ў Маанзундскім баі.

На канлодцы «Гарачы» добраахвотнікамі пачалі служыць былы качагар лінкора «Палтава» Фёдар Герасімавіч Якушэнка з в. Ходасавічы, былы камендор лінкора «Палтава», былыя матросы Самуіл Канстанцінавіч Маргуноў з в. Валокі Ціхініцкай воласці, Іосіф Маркавіч Барсукоў з в. Малыя Канапліцы, Аляксандр Антонавіч Ясяніцкі з в. Слабада Ціхініцкай воласці; з іншых месцаў Рагачоўскага павета — Лявонцій Іосіфавіч Грынькевіч, Арцём Максімавіч Хадановіч, Сцяпан Сямёнавіч Мажэйка, Дзяніс Рыгоравіч Войтаў з в. Кісцяні і іншыя.

На канлодцы «Гучны» таксама было

А. С. Яфрэмаў.

Р. І. Корзунаў.

Ф. Г. Якушэнка.

І. М. Барсукоў.

нямала добраахвотнікаў з Рагачоўскага павета, большасць з якіх прыбыла на суднах ў яшчэ ў красавіку 1920 г., калі карабель актыўна дзейнічаў супраць белапалякаў на Бярэзіне. Гэта былі электрык Яфрэм Кузьміч Нямцоў, старшы матрос Яфім Паўлавіч Сідарэнка, качагар-балтыец Фёдар Усцінавіч Неміленцаў. Некаторыя з рагачоўцаў увайшлі ў склад каманды «Гучнага» ў перыяд яго дзеянняў у Рагачоўскім павеце. Так, 23 чэрвеня на карабель залічаны Яфім Пятровіч Буракоў, які стаў начальнікам артылерыі і кулямётаў карабля.

«Гучны», які меў меншую асадку, пастаянна знаходзіўся на фронце, днём і ноччу наносіў артылерыйскія ўдары па белапаляках у раёне Горваля, Ніжняй Албы, Стрэшына з удзелам і пад кіраўніцтвам былога кранштацкага марака, артылерыйскага унтэр-афіцэра Буракова. Прыходзілі добраахвотнікамі на «Гучны» рагачоўцы і пазней, калі канлодка ваявала на Дняпры на поўдзень ад Кіева. Так, 24 верасня залічаны электрыкам па абслугоўванню карабельнай радыёстанцыі (праз яе падтрымлівалася сувязь з Рагачова са штабам флатыліі ў Гомелі) ураджэнец мястэчка Журавічы, марак-балтыец, удзельнік Кастрычніцкага ўзброенага паўстання ў Петраградзе ў 1917 г. Дзмітрый Ігнатавіч Бадзеннікаў. 1 кастрычніка пачаў служыць артылерыйскім назіральнікам карабля ўраджэнец Рагачоўскага павета Дзіянісій Сафонавіч Сафонаў, які раней ваяваў на бронепаяздах, быў паранены і кантужаны ў баях грамадзянскай вайны.

Я. Р. Бендзеў.

3 чэрвеня прыняты ў Рагачове сігнальшчыкам вартавога судна «Беркут» ураджэнец в. Ходасавічы Гарадзецкай воласці Ціт Кірылавіч Казакоў. У гады рэвалюцыі ён служыў на эскадраным мінаносцы «Азард» Балтыйскага флоту, яго фатаграфія ў групе каманды судна экспануецца ў Цэнтральным ваенна-марскім музеі ў Санкт-Пецярбургу і ў музеі «Кранштацкая крэпасць». У той жа дзень на вартавое судна «Арол» быў залічаны яго зямляк марак-балтыец, які служыў раней на лінкоры «Палтава», Іван Карнеевіч Гаўрылаў. На вартавым судне «Арол» ваявалі кулямётчыкамі ўраджэнец в. Вішнёўка Кісцянёўскай воласці Леанід Рыгоравіч Кужаў і Несцер Дарафеевіч Мядзведзеў з Рагачоўскага павета.

7 ліпеня 1920 г. камандуючы 16-й арміяй загадаў караблям 2-га дывізіёна флатыліі адправіцца з Дняпра на Прыпяць, дзе яны ўдзельнічалі ў баях супраць адступаючых на захад белапалякаў.

У складзе Дняпроўскай ваеннай флатыліі ваявалі Іосіф Яўсеевіч Лісоўскі з в. Броннае Ціхініцкай воласці (у 1920 г. машыніст канлодкі «Маладзецкі»), Фоцій Ільіч Дуброўскі з в. Вішчын Кісцянёўскай воласці (з 1.10.1919 г. старшы сігнальшчык канлодкі «Маланкавы»), яго зямляк Сямён Клімавіч Маркаў (у 1919 г. кулямётчык бранякатэра № 1 «Украінец»), Марк Піліпавіч Лабанаў з Гарадзецкай воласці, Анікій Міхайлавіч Барсукоў з хутара Дзянісаўка Рагачоўскага павета (з 1919 г. старшы качагар пераходзячай роты), Сцяпан Кузьміч Буянок з

А. А. Ясяніцкі.

Ц. К. Казакоў.

Л. Р. Кужаў.

М. К. Раманюк.

Доўскай воласці, Майсей Іванавіч Капякоў з в. Званец гэтай жа воласці (з 12.3.1921 г. стаў матросам вартавога судна «Удалы» атрада воднай аховы Дняпра), Дзяніс Рыгоравіч Валетаў з в. Кісцяні, Макар Сямёнавіч Кушыкаў (з 26.9.1919 г. ваяваў на бронепараходзе «Трахтаміраў». У 1920 г. камендант аховы рэйдаў флатыліі), Мацвей Кірылавіч Раманюк (з 29.3.1919 г. баталёр бронепарахода «Кур'ер», а з 1.6.1919 г. загадчык гаспадаркі 2-й брыгады караблёў, потым агент па нарыхтоўках харчавання для маракоў флатыліі), Агафія Цімафееўна Суднік (з 16.4.1919 г. санітарка 2-й брыгады караблёў флатыліі) з Рагачова, Лаўрэнцій Фёдаравіч Навуменка з Рагачоўскага павета (з 1.1.1920 г. рулявы катэра № 1 міннага дывізіёна).

І. Я. Краўцоў.

* * *

Аўтар вышэйпрыведзенага артыкула — супрацоўнік Цэнтральнага ваенна-марскога музея ў г. Санкт-Пецярбург Іван Якаўлевіч Краўцоў, працуючы ў розных архівах, знайшоў нямала звестак пра ўраджэнцаў Рагачоўшчыны, якія ваявалі ў складзе Чырвонай Арміі ў асноўным супраць белапольскіх інтэрвентаў на тэрыторыі Беларусі.

Вось іх імёны: Міхаіл Пятровіч Басыгін, Мікіта Асонавіч Кавалёў, Якаў Пятровіч Кавалёў, Мікалай Міхайлавіч Кутаў, Міхаіл (Міна) Васілевіч Петракоў, Андрэй Міхайлавіч Семчанка, Ілья Міхайлавіч Сцяпанаў, Данііл Гаўрылавіч Шылянкоў, Пратас Сямёнавіч Шылянкоў, Максім Трафімавіч Чахаў з Гарадзецкага сельсавета; Арцём Аляксандраў, Цярэнцій Макаенкаў, Іосіф Дзмітрыевіч Сяргеенка з Доўскай воласці; Яфім Рыгоравіч Бендзеў, Дзмітрый Платонавіч Уладзееў, Улас Іванавіч Уладзееў, Ягор Іванавіч Уладзееў, Архіп Міронавіч Іваноў, Навум Ягоравіч Іваноў (загінуў у баі з белапалякамі ў час наступлення на Мінск у пачатку ліпеня 1920 г.), Іосіф Пятровіч Калбасаў, Цімафей Сідаравіч і Яўстафій Сідаравіч Калбасавы, Кірыла Дзмітрыевіч Карнавухаў (прапаў без вестак у ліпені 1920 г. на подступах да Мінска), Гаўрыла Лявонцьевіч Ключнікаў (прапаў без вестак у баі з белапалякамі 16.10.1920 г. ў Любанскім р-не Мінскай вобл.), Савелій Піліпавіч Сафонаў (прапаў без вестак у пачатку ліпеня 1920 г. на подступах да Мінска), Пётр Трафімавіч Хаканцаў (загінуў у пачатку ліпеня 1920 г. пры наступленні на Мінск) з былой Кісцянёўскай воласці; Амос Ігнатавіч Корзунаў з в. Рэкта Азяранскага сельсавета; Ануфрый Майсеевіч Хуркоў з в. Станькаў Старасельскага сельсавета (памочнік камандзіра батарэі Магілёўскай дывізіі); Аляксандр Нікадзімаў з в. Азяраны Ціхініцкага сельсавета, Пётр Сцяпанавіч Шумілаў з в. Вірычаў гэтага ж сельсавета (зімой 1918 г. ўдзельнічаў у баях супраць нямецкіх войск пад Нарвай, потым ваяваў на тэрыторыі Беларусі супраць белапалякаў, з 8.5.1919 г. служыў на флоце), Пётр Іванчанка, Ілья Казакоў, Якаў Цімафеевіч Костусеў (камандзір узвода Аршанскага артдывізіёна Магілёўскай дывізіі), Рыгор Майсеевіч Саўчанка (з 1.5.1918 г. памочнік камандзіра 2-га Аршанскага палка), Уладзімір Шырапаў з былой Ціхініцкай воласці; Рахмель Вішнеўскі, Рыгор Карцаў, Сцяпан Макараў (уступілі ў перавязачны атрад 6-га Гродзенскага палка), Лейба Іцкавіч Хаўкін з Рагачова.

АНКЕТА ІНФАРМАЦЫЙНА-ІНСТРУКТАРСКАГА ПАДАДДЗЕЛА РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА[1]

Не раней 23 кастрычніка 1919 г.

1. Рогачевский уездный Совет — временно Рогачевский уездный Ревком.
2. Гор. Рогачев, Циммермановская улица, дом бывшей городской управы.
3. Без изменения.
4. Состав Ревкома прежний: председатель Фома Карпович Михаленко (состоит в партии коммунистов с 1 февраля 1919 г.); члены: Григорий Григорьевич Самусевич (состоит в партии коммунистов с 17 марта 1917 г.), Файтель Израилевич Кузнецов (состоит в партии коммунистов с...[2]), Иосиф Игнатьевич Володько (состоит в партии с октября 1917 г.), Солдатов (состоит в партии с...[2]).

Изменений в форме организации и личном составе заведующих отделами за отчетный период не последовало. Работа отделов идет продуктивно.

П. п. 5, 6 и 7. В политическом отношении волости уезда должны считаться вполне благонадежными и преданными Советской власти. Явных контрреволюционных выступлений не было, за конспиративной деятельностью отдельных лиц имеют наблюдение местные чека. Выступлений левых эсеров не наблюдалось.

8. Сельских Советов числится 222, а именно:

В Старо-Руднянской вол. 28, Рассохской 15, Чечерской 23, Недойской 10, Довской 25, Кистиневской 21, Стрешенской 30, Городецкой 42, Луковской 28.

Во всех этих волостях сельские Советы организованы удовлетворительно.

Ввиду обстоятельств, изложенных в предыдущих донесениях, инструктора не посылались.

9. Случаев сопротивления реквизиционным продовольственным отрядам не было.

10. Хлебная монополия была проведена со всею строгостью. Случаев нарушения ее не было. Крестьяне в большинстве относятся к ней сдержанно; в отдельных случаях были жалобы на обременительность монополии для крестьянского хозяйства и недостаток соли, но активных выступлений на почве продовольствия не было.

11. Уездный Ревком существует на средства, ассигнованные казною по смете Народного комиссариата внутренних дел. Средств от губернского Совдепа и из других источников не получает.

12. Входящих бумаг по канцелярии президиума было 492 и исходящих 534 с 23 сентября по 23 октября 1919 г.

13. В связи с Октябрьскими празднествами был устроен беспартийный съезд волостных Совдепов.

Заведующий информационно-инструкторским подотделом

Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г.— июль 1920 г.): Сб. документов и материалов. Мн., 1961. С. 214—215.

ЗАГАД РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА З АБ'ЯВАЙ НАРОДУ АБ СТВАРЭННІ РЭЎКОМА І АХОВЕ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ПАРАДКУ

Не раней 14 верасня 1919 г.

§ 1. Постановлением Рогачевского уездного исполнительного комитета совместно с представителями ВЦИК и губисполкома от 14 сентября 1919 г. образован вместо исполкома Революционный комитет в составе председателя тов. Михаленко, членов Кузнецова, Володько, Солдатова и секретаря тов. Самусевича, который является высшим органом гражданской власти в городе и уезде. Все отделы исполкома являются отделами Ревкома и, безусловно, подчиняются ему. Все распоряжения Ревкома носят характер приказа и должны беспрекословно и быстро выполняться.

§ 2. Ревком подтверждает постановление исполкома об объявлении всех советских гражданских учреждений на военном положении.

---

[1] Пытанні ў анкеце адсутнічаюць.

[2] Пропуск у тэксце.

Никто из сотрудников не имеет права отказываться от работы во внеурочное время, причем эта работа не оплачивается.

Заведующие отделами не имеют права уезжать в командировки без разрешения Ревкома, а сотрудники отделов без разрешения заведующего отделом.

Штемпеля бланков и печати исполкома и его отделов остаются в силе. Бумаги, удостоверения и прочие исходящие от Ревкома [документы] удостоверяются печатью исполкома.

Не подчиняющиеся распоряжениям Ревкома или не выполняющие его приказов будут предаваться суду Военно-революционного трибунала.

Председатель Ревкома
Члены
Секретарь

Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г.— июль 1920 г.): Сб. документов и материалов. Мн., 1961. С. 195—196.

ЗАГАД РАГАЧОЎСКАГА РЭЎКОМА АБ ПРАВЯДЗЕННІ «ТЫДНЯ ПАЛІВА»

29 снежня 1920 г.

По распоряжению Реввоенсовета XVI армии с 31 сего декабря по 7 января 1920 г. назначается «Топливная неделя» по уезду для подвозки дров к станциям железных дорог. В течение этой недели ни одна лошадь ни в городе, ни в сельских местностях не должна быть не использована для возки дров. А посему предписывается уездлескому и агентам его по уезду на это время назначить достаточный штат служащих по отпуску дров в лесу и приемке их на станции. Принять меры, чтобы крестьяне, направляемые в лес, не блуждали по кварталам, разыскивая местонахождение дров и агентов уездлескома, для этого лесные сторожа и служащие лесничих обязываются встречать и направлять их в лесные делянки для нагрузки. Предлагается всем лесничим мобилизовать для содействия и успешного проведения топливной кампании весь штат своих служащих. Всем сельским Советам и товарищам коммунистам на местах принять со своей стороны все зависящие меры, чтобы неделя эта прошла в самой интенсивной работе. Объявить гражданам, что при уклонении их от этой повинности лошади их будут конфискованы, а сами будут предаваться суду Ревтрибунала.

Председатель Ревкома (подпись неразборчива)
Председатель уездлескома
Секретарь Ревкома (подпись неразборчива)

Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г.— июль 1920 г.): Сб. документов и материалов. Мн., 1961. С. 248—249.

СА СПРАВАЗДАЧЫ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА АБ РАБОЦЕ ЗА ЛЮТЫ 1920 г.

Отдел народного образования

Для установления связи с работой на местах и для решения некоторых важных вопросов отделом в феврале месяце был созван съезд заведующих волостными отделами народного образования Рогачевского и Бобруйского уездов, на котором были разрешены указанные в прилагаемой копии протокола съезда вопросы.

Во всех волостях уезда организованы комиссии по ликвидации безграмотности и приступлено к переписи неграмотного населения. В гор. Рогачеве произведена перепись всего неграмотного населения, заготовлено необходимое количество азбук и открыто уже 17 школ для безграмотных, в которых обучается уже свыше 300 человек взрослых безграмотных граждан.

Идя навстречу требованиям местного населения, отделом приняты меры к открытию с 1 марта в гор. Рогачеве следующих курсов: счетоводных, бухгалтерских, строительных, электромонтерных и швейных, для чего открыта запись желающих обучаться на этих курсах, подысканы соответствующие помещения и приглашено достаточное количество лекторов. Кроме того, в феврале месяце открыты отделом курсы английского языка, на которых обучается до 60 человек, учащихся в три смены, занятия на курсах проводятся вечером.

В феврале месяце открыто в разных пунктах уезда 8 изб-читален, которые вместе с существующими уже снабжались литературой.

Отдел здравоохранения

В истекшем феврале месяце работа отдела главным образом сосредоточена была на борьбе с эпидемией. В городе, в уезде производились прививки предохранительной оспы. По мере возможности больные тифом изолировались в заразные отделения и производились дезинфекции помещений и одежды. В первой половине февраля месяца была оказана медицинская помощь 3091 заразному больному. Для второй половины цифра эта несомненно должна быть увеличена, так как заболеваний было больше. Кроме того, в целях борьбы с эпидемией предпринято было устройство бани в Жлобине. Для этого отпущены деньги и материалы. Успешному ведению борьбы сильно мешал крайний недостаток медработников вообще и отсутствие врачей на участках. В феврале были получены медикаменты, которые распределяются между аптеками и всеми лечебными учреждениями уезда. Количество медикаментов настолько незначительно, что через несколько дней не будет запасов на складе, а в аптеках и больницах хватит этих медикаментов на 2—3 недели. Если не будет прислан новый запас медикаментов, то все лечебные учреждения опять окажутся в критическом положении. Также оказывалась зубоврачебная помощь в советских амбулаториях. Успешному зубоврачеванию сильно мешает отсутствие медикаментов и пломбировочных средств. По лечебным учреждениям производится мелкий ремонт помещений и пополнение инвентаря.

...По отделу социального обеспечения

Подотдел пайка. Волости Бобруйского уезда, присоединенные к Рогачевскому, не удовлетворены денежным пайком с августа месяца 1919 г., о чем неоднократно сообщалось в губсобес и Наркомсобеструд как письменно, так и телеграфно, но ответа до сего времени никакого не последовало. Семьи красноармейцев по Бобруйскому уезду осаждают собес, требуя паек, но за неассигнованием кредита не приходится их удовлетворять. С их стороны по сему предмету справедливые нарекания. Кредит требуется приблизительно до 5 000 000 руб. удовлетворить только за 1919 г.

Семьи солдат старой армии, несмотря на представленный кредиторский список, за неассигнованием губсобесом кредитов также не удовлетворены денежным пособием с апреля месяца 1919 г.

Подотдел пособий. В феврале месяце выдано беднейшему населению города 19 500 бесплатных обедов, сухих пайков выдано 407, оказана медицинская помощь 159, бесплатных рецептов выдано 126, единовременных пособий выдано 1500 руб. Ощущается крайний недостаток в предметах продовольствия.

По «Неделе фронта» идет бесплатная раздача досок семьям красноармейцев,

Члены Рагачоўскага павятовага выканкома.

которые по распоряжению райлесконторы отпущены в количестве 1 600 штук; остальные продукты и предметы из комиссии по проведению «Недели фронта и транспорта» еще не поступали.

В инвалидном доме к 1 марта помещается 17 человек; в течение февраля месяца было 2 смертных случая от старости.

В доме отдыха для больных и раненых красноармейцев помещается 30 человек, в течение отчетного месяца им выдано по одной паре теплого нательного белья; ощущается недостаток в обуви.

В доме ребенка на 1 марта состоит 30 детей. В течение февраля месяца был один смертный случай от воспаления мозга. Заболеваемости среди детей не было.

...Пенсионный подотдел. К 1 февраля состояло нерассмотренных дел 389, в течение февраля месяца поступило вновь ходатайство о назначении пенсии 213, за февраль месяц рассмотрено 136 пенсионных дел, по которым назначена пенсия на сумму 1 832 870 руб. К освидетельствованию не все являются вызванные, а потому приходится вызывать их в комиссию вторично, что затягивает разбор дел.

По совнархозу

Счетно-финансовым отделом велась денежная отчетность, которая выразилась со дня деятельности в сумме 69 702 345 руб. 22 коп.

В распоряжении отдела находится 7 промышленных предприятий, обслуживающих боевой фронт, а именно: электрическая станция, типография, швейная мастерская, слесарно-жестяная мастерская, кирпичный завод, сапожная мастерская, кузнечно-слесарная мастерская в м. Корме.

Электрическая станция и типография обслуживают гражданские военно-советские учреждения. Электрическая станция работает в настоящее время в неблагоприятных условиях. Поставка дров идет ненормально, а если таковые доставляются, то сырые, почему свет при настоящей перегрузке машин и отсутствии сухих дров неудовлетворителен. Притом, несмотря на то, что были приняты меры о самовольных включениях, таковые продолжают существовать и с каждым днем прибавляются исключительно воинскими частями. Рабочих электрической станции и его отдела 14 человек, и содержание их ежемесячно 28 000 руб. В настоящее время отсутствуют электромонтеры, которых ныне невозможно подыскать.

Типография выполняет все заказы. Ощущается острый недостаток в рабочих, ныне которых имеется 23 человека и содержание их 40 000 руб в месяц.

Швейная мастерская в настоящее время выполняет все заказы советских гражданских учреждений и воинских частей.

Слесарно-жестяная мастерская снабжает обозные и саперные войсковые части, а также учреждения шанцовыми инструментами и прочими железными и жестяными изделиями, а также производит всевозможные починки. Кирпичный завод в Рогачеве бывшего Симкина с 25 февраля с. г. возобновил работы по обжигу кирпича вследствие получения 50 саж. дров. Рабочих в настоящее время 15 человек.

Сапожная мастерская изготовила по настоящее время 6 000 пар обуви при имеющемся числе рабочих: в Рогачеве 28 человек, Чечерске 28 человек, м. Городце 10 человек. В м. Городце и Чечерске мастерские уотнархоза начали функционировать: первая — с 1 февраля и вторая с 15 февраля с. г.

Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 г.— июль 1920 г.): Сб. документов и материалов. Мн., 1961. С. 308—311.

Месца нараджэння — Рагачоўшчына

Сярод вядомых рэвалюцыянераў, першых савецкіх дзяржаўных і ваенных дзеячаў былі і тыя, чый жыццёвы шлях пачаўся на Рагачоўшчыне. Па-рознаму склаўся іх лёс, па-рознаму можна адносіцца да іх у нашы дні. Але гэта жывая старонка гісторыі раёна, якую нельга забыць перагарнуўшы...

АКУЛІЧ Аляксандр Канстанцінавіч, генерал-лейтэнант (1940). Нарадзіўся 15.1.1888 г. ў в. Стары Мазалаў Рагачоўскага раёна. У арміі з 1915 г., скончыў Віленскае ваеннае вучылішча (1916). Член КПСС з 1917 г. Удзельнік рэвалюцыйных падзей 1917 г. ў Маскве. У грамадзянскую вайну на Усходнім і Паўднёвым франтах: камандзір палка, начальнік штаба, камандзір 90-й брыгады 30-й стралковай дывізіі Чырвонай Арміі. У Айчынную вайну камандаваў дывізіяй на Волхаўскім фронце, удзельнік абароны Ленін-

А. К. Акуліч.

Р. С. Окуневіч.

града. З 1946 г. ў адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 іншымі ордэнамі, медалямі. Памёр 13.5.1961.

БЕЛЕНЬКІ Абрам Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1883 г. ў в. Свержань у беднай сялянскай сям'і. Працаваў наборшчыкам у друкарні ў Харкаве, быў членам рабочага гуртка. У 1902 г. ўступіў у рады РСДРП. У 1903 г. на нелегальным партыйным сходзе арыштаваны і зняволены ў харкаўскую турму, пасля сасланы ў Оршу пад асобы нагляд паліцыі. У 1904 г. эмігрыраваў у Францыю, уваходзіў у парыжскую групу бальшавікоў, дзе зблізіўся з У. І. Леніным. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. загадваў друкарняй ЦК РСДРП(б) у Петраградзе, удзельнік Кастрычніцкага ўзброенага паўстання. Са снежня 1917 г. камісар ВЧК і супрацоўнік аддзела па барацьбе са службовымі злачынствамі, памочнік Ф. Э. Дзяржынскага. У 1919—24 гг. начальнік аховы Леніна, член калегіі ВЧК-АДПУ, затым на аператыўнай і гаспадарчай рабоце ў НКУС СССР. У 1937 г. незаконна рэпрэсіраваны і ў 1941 г. памёр у турме. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1954 г.

БЕЛЕНЬКІ Рыгор Якаўлевіч (партыйныя псеўданімы Грыша, Бялінскі), нарадзіўся ў 1885 г. ў в. Свержань. З 1899 г. ў Мінску. У 1903 г. ўступіў у РСДРП, удзельнік рэвалюцыі 1905—07 гг. З 1905 г. на партыйнай рабоце ў Вільні, з 1906 г. ў Пецярбургу. Дэлегат Пятай (Агульнарасійскай канферэнцыі РСДРП у Парыжы (снеж. 1908), дзе пазнаёміўся з У. І. Леніным. Тройчы быў арыштаваны і высланы (1901, 1907, 1910). У 1912 г. ўцёк з ссылкі і эмігрыраваў у Францыю. У 1914—17 гг. сакратар парыжскай секцыі бальшавікоў. Дэлегат Бернскай канферэнцыі РСДРП 1915 г. У маі 1917 г. вярнуўся ў Расію. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Маскве. Член ВЦВК і ЦВК СССР (1919—27). З 1926 г. ў Камінтэрне. У 1925—27 гг. далучаўся да трацкісцкай апазіцыі, за што двойчы (1926, 1936) быў выключаны з партыі, але хутка адноўлены. У 1936—37 гг. дырэктар Інстытута павышэння кваліфікацыі гаспадарнікаў і ІТР мясцовай прамысловасці. У 1937 г. незаконна рэпрэсіраваны і расстраляны. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1956 г.

Э. А. Карніловіч.

БЕЛЕНЬКІ Яўхім Якаўлевіч (партыйны псеўданім Сяргей), нарадзіўся ў 1875 г. ў в. Свержань. У 1898 г. ўступіў у РСДРП. Далучаўся да Бунда. Адзін з заснавальнікаў і кіраўнікоў Мінскай арганізацыі РСДРП(б) (1903). Удзельнічаў у стварэнні падпольнай друкарні, Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП (1904), кіраўніцтве забастоўкай мінскіх чыгуначнікаў (1905). З 1906 г. на партыйнай рабоце ў Магілёве (сакратар акруговага камітэта РСДРП), Кіеве, Екацярынаславе. Двойчы, у 1902 і 1904 гадах, быў арыштаваны. У 1907 г. сасланы ў Валагодскую губерню, адкуль у 1909 г. ўцёк. Жыў нелегальна ў Пецярбургу. Удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. З 1918 г. працаваў у ВСНГ, Наркамаце РСІ, Наркамфіне СССР. Памёр у 1957 г.

ГАРБАЧОЎ Барыс Сяргеевіч, нарадзіўся 19.8.1892 г. ў в. Забалацце ў шматдзетнай сялянскай сям'і. З 14 гадоў працаваў грузчыкам у в. Аннаўка, потым у будаўнічай чыгуначнай арцелі ў Оршы, у Данбасе. У 1913 г. прызваны ў армію, у час першай сусветнай вайны ваяваў ва Усходняй Прусіі. У 1917 г. ўступіў у РСДРП(б), быў выбраны ў Мінскі Савет. На чале створанага ім ваенізаванага атрада паспяхова правёў аперацыю супраць уланскага палка польскага корпуса генерала Доўбар-Мусніцкага, ваяваў з ня-

А. Я. Беленькі (злева).

мецкімі і польскімі акупантамі. У гады грамадзянскай вайны камандаваў асобым кавалерыйскім палком, кавалерыйскай брыгадай у 1-й Коннай арміі. Узнагароджаны 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга. У 1926 г. скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе. Камандзір брыгады, дывізіі, начальнік і ваенком корпуса ваенных навуковых устаноў Маскоўскай ваеннай акругі. З 1937 г. камандуючы войскамі Забайкальскай, Уральскай ваенных акруг. Член ваеннага савета пры Наркамаце абароны СССР. Выбіраўся членам ВЦВК і ЦВК СССР. Б. С. Гарбачоў стаў ахвярай сталінскіх рэпрэсій. Расстраляны 3.7.1937 г. Рэабілітаваны ў 1956 г.

З успамінаў саратнікаў Б. С. Гарбачова

Мозаў Барыс Карнеевіч: Я пайшоў служыць у Чырвоную Армію як добраахвотнік, быў у 6-й дывізіі. Першай коннай. А Б. С. Гарбачоў быў камандзірам 3-й брыгады 4-й дывізіі. Любілі байцы Б. С. Гарбачова, просты быў, не цураўся сваіх... Адных забалацкіх было тады ў 3-й брыгадае чалавек 15. Многа з іх загінула. Бывала, пасля бою прыйдзеш у штаб да Барыса Сяргеевіча. Ён распытвае аб тым, што пішуць з дому, шчыра так пагутарыць, пажартуе... А ў баі першым быў... Смелы быў, любілі яго ўсе за гэта...

Казачэнка Іван Кірылавіч: ...Я спачатку быў у 7-й кавалерыйскай дывізіі, потым нас, 200 чалавек, адправілі ў Смаленск. Было гэта ў красавіку 1918 г. Б. С. Гарбачоў тады асабіста камплектаваў асобны Жалезны кавалерыйскі полк добраахвотнікаў. Быў камандзірам, а яго родны брат Дзмітрый камандаваў эскадронам. Браты Гарбачовы былі заўсёды разам...

Потым наш полк быў адпраўлены на Паўднёвы фронт супраць Дзянікіна. Ехалі мы ў цяплушках. Спявалі пад гармонікі, скакалі. Смерці не баяліся, маладыя былі ўсе.

Ды толькі не ўсім давялося вярнуцца ў родны край. Загінулі жыхары Забалацця Святцаў Іван Піменавіч, Курачкін Яфім Фёдаравіч, Зуеў Павел Якаўлевіч.

У сакавіку 1919 г. загінуў і Дзмітрый Сяргеевіч. А было гэта так... Вёў ён 2 маршавыя эскадроны са Смаленска на папаўненне Жалезнага кавалерыйскага. Выгрузіліся ў Варонежы і рушылі на фронт. У адной са станіц байцы размясціліся на днёўку. А ноччу пачалося паўстанне казакоў-станічнікаў. Яны занялі вартавых, акружылі курані, дзе спакойна спалі чырвоныя коннікі. І пачалося... Дзмітрый Сяргеевіч адбіваўся да апошняга патрона. Пры ім знаходзіліся штабныя дакументы і сейф з грашыма. Калі казакі ўварваліся ў памяшканне і накінуліся на камандзіра, раздаўся выбух. Гэта Гарбачоў ірвануў за чаку гранаты-лімонкі...

Успаміны запісаў У. Бандарэнка.

ОКУНЕЎ Рыгор Сяргеевіч, нарадзіўся 18.7.1900 г. ў в. Ціхінічы Рагачоўскага раёна. З рабочых. У 1914 г. пераехаў у Рагачоў, дзе працаваў падручным слесара газавага завода. У 1917 г. ўдзельнічаў у кастрычніцкім узброеным паўстанні ў г. Саратаве. Член КПСС з лістапада 1917 г. З 1919 г. ўдзельнік грамадзянскай вайны, ваяваў на Доне. У пачатку 1920 г. сакратар Новаўзенскага павятовага камітэта партыі Саратаўскай вобл., старшыня рэўкома, член штаба абароны, у 1921 член Саратаўскага губкома. З лютага 1922 г. на Чарнаморскім флоце: інспектар, начальнік агітаддзялення, начальнік аргінструктарскага аддзела, намеснік начальніка Палітупраўлення флоту. У 1924—25 гг. слухач Ваенна-палітычных курсаў вышэйшага палітсаставу арміі і флоту. У 1926—27 гг. намеснік начальніка Палітупраўлення Балтыйскага флоту, член рэдкалегіі часопіса «Морской сборник» (1927). У 1927—30 гг. начальнік Палітупраўлення і член Рэўваенсавета Чарнаморскага флоту. У 1931—32 гг. рэдактар часопіса «Морской сборник». З 1933 г. начальнік Ваенна-Марской акадэміі, член Рэўваенсавета СССР, памочнік па палітчастцы начальніка Ваенна-Марскіх Сіл СССР, з 1934 г. намеснік камандуючага па палітчастцы Ціхаакіянскага флоту, член Ваеннага Савета пры Наркамаце абароны СССР. З 1935 г. армейскі камісар 2-га рангу. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Чырвонага Сцяга. Аўтар шэрага артыкулаў. У снежні 1937 г. беспадстаўна арыштаваны органамі НКУС і 28.7.1938 г. расстраляны. Рэабілітаваны пасмяротна.

Э. А. Карніловіч.

СЛАВІН Барыс Аронавіч, нарадзіўся ў 1888 г. ў в. Канапліца Рагачоўскага раёна. З мяшчан. З 1904 г. ў Рагачове: вучыўся ў гарадскім вучылішчы, даваў платныя ўрокі, уступіў у мясцовую арганізацыю Бунда, быў выбраны членам яе камітэта. У 1907 г., каб пазбегнуць арышту, эмігрыраваў у Амерыку, дзе працаваў на заводзе ў г. Сан-Францыска. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. вярнуўся ў Расію. У канцы 1917 г. выбраны старшынёй Харбінскага Савета, членам камітэта Харбінскай бальшавіцкай арганізацыі РСДРП, камісар кіравання КВЖД. З студзеня 1918 г. ў Іркуцку: член абласнога выканкома Усходняй Сібіры, камісар фінансаў. Пасля наступлення белачэхаў кіраваў забеспячэннем войск, удзельнічаў у баях. З невялікім атрадам прабіўся праз горы і тайгу ў Чыту. З лістапада 1918 г. ў Хабараўску, удзельнічаў у стварэнні бальшавіцкай арганізацыі. З 1919 г. старшыня Хабараўскага падпольнага камітэта РКП(б). У маі 1919 г. арыштаваны калчакаўцамі, закатаваны ў турме.

Э. А. Карніловіч.

П. Г. Смідовіч.

СМІДОВІЧ Пётр Гермагенавіч (партыйныя псеўданімы Дзюваль, Жэлье, Матрона, В. І. Зыбін, Чарвінскі, Марселец), нарадзіўся 19.5.1874 г. ў Рагачове. З дваран. Член РСДРП з 1898. За рэвалюцыйную дзейнасць у 1894 г. выключаны з Маскоўскага універсітэта і высланы ў Тулу. Скончыў электратэхнічную школу ў Парыжы, працаваў у Бельгіі. Член Бельгійскай рабочай партыі. З 1902 г. агент «Искры»; адзін з арганізатараў падпольнай друкарні «Искры» ва Умані (1903). Член Сярэднеўральскага (1903), Паўночнага (1904), Бакінскага і Тульскага (1905) камітэтаў РСДРП. Удзельнік Снежаньскага ўзброенага паўстання ў Маскве ў 1905 г. У 1906—08 гг. член Маскоўскага акруговага і гарадскога камітэтаў РСДРП. За рэвалюцыйную дзейнасць няраз быў арыштаваны і сасланы. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. член Маскоўскага камітэта РСДРП(б), член Прэзідыума выканкома Массавета. У кастрычніцкія дні 1917 г. член Маскоўскага ВРК. У пачатку 1918 г. Смідовіч узначаліў аддзел электратэхнічнай прамысловасці ВСНГ, прымаў удзел у распрацоўцы плана ГОЭЛРО. З красавіка 1918 г. старшыня Массавета. Член ВЦВК, член Прэзідыума ВЦВК, ЦВК СССР, старшыня Камітэта садзеяння народнасцям паўночных ускраін пры ЦВК СССР. Удзельнік грамадзянскай вайны, ліквідацыі сялянскага паўстання на Тамбоўшчыне і кранштацкага мяцяжу. Член ЦКК РКП(б) у 1921—22 гг. П. Г. Смідовіч адкрываў у 1922 г. першы з'езд Саветаў СССР, які абвясціў аб стварэнні Савецкага Саюза. Памёр 16.4.1935 г. Пахаваны на Краснай плошчы ў Маскве. Яго імем названы гарадскі пасёлак у Хабараўскім краі, вуліцы ў Рагачове, Маскве, Нар'ян-Мары, першая маскоўская электрастанцыя.

У гады нэпа і калектывізацыі

Пасля грамадзянскай вайны ў жыцці савецкай краіны пачаўся новы перыяд, вядомы як новая эканамічная палітыка (нэп). Абвешчаная ў сакавіку 1921 г. на X з'ездзе РКП(б), яна дала магчымасць за даволі кароткі час аднавіць эканоміку, вырашыць іншыя праблемы. Аб тым, як адраджалася ў тыя гады Рагачоўшчына, лепш за ўсё сведчаць архіўныя матэрыялы.

Пачатак 20-х гадоў. На дзеючых прадпрыемствах Рагачоўскага павета не хапала сыравіны, паліва, знізілася прадукцыйнасць працы, скарачалася колькасць рабочых. Пасяўная плошча па павеце ў 1920 г. ў параўнанні з 1916 г. скарацілася на 4080 дзесяцін, коней паменшала на 20 896, буйной рагатай жывёлы — на 24 890, авечак — на 18 807, свіней — на 47 140 галоў. Інфляцыя рабіла амаль немагчымым гандаль. Не хапала самых неабходных прадуктаў і тавараў.

У 1921 г. партыйным кіраўніцтвам павета былі зроблены некаторыя захады, каб паспяхова правесці веснавую сяўбу. Быў арганізаваны «Двухтыднёвік чырвонага аратага». Працоўныя горада дапамагалі сялянам жалезам, вугалем, рамантавалі сельгасінвентар. Дапамога ў першую чаргу аказвалася беднякам і сем'ям чырвонаармейцаў.

Гэтыя меры далі пэўныя вынікі, але толькі ажыццяўленне нэпа адыграла галоўную ролю ў аднаўленні гаспадаркі. Замена харчразвёрсткі харчпадаткам падахвоціла сялян вырабляць больш прадукцыі. Пачала пашырацца пасяўная плошча, у 1921 г. яна пад яравым клінам павялічылася на 71,94 % у параўнанні з 1920 г. Прыпыніўся ў вёсках бандытызм, выкліканы голадам 1920 г. 5.12.1922 г. Рагачоўскі з'езд Саветаў паслаў на імя У. І. Леніна тэлеграму, у якой цалкам адабраўся нэп і адзначалася, што харчпадатак 1922 г. быў здадзены на 100 працэнтаў. Аднак і ў 1921 г., і ў 1922 г. пасяўная плошча ў Рагачоўскім павеце была меншая за даваенную. Таму Рагачоўская павятовая зямельная канферэнцыя, якая адбылася 10.2.1923 г., прыняла рашэнне арганізаваць для сялян, хто не мае насення, грамадскія клеці ўзаемадапамогі, адкрыць доўгатэрміновыя пазыкі на набыццё сельгасмашын і інвентару.

Толькі вясной 1924 г. сялянам Рагачоўшчыны прададзена дзяржаўнай насеннай

пазыкі: ячменю 500 пудоў, аўса 500 пудоў, вікі 2518 пудоў, лёну — 900 пудоў, азімага жыта 3500 пудоў. Каб заахвоціць пашырэнне пасяўных плошчаў, паступова зніжаўся адзіны сельскагаспадарчы падатак. На 1923—24 гг. на Рагачоўшчыне ён быў зніжаны на 25 %.

Прыведзеныя ніжэй статыстычныя звесткі аб пасяўных плошчах з 1916 па 1924 год сведчаць на карысць нэпа ў адраджэнні сельскай гаспадаркі на Рагачоўшчыне:

Гады	Плошчы пасеву, дзесяцін
1916	134 880
1920	130 800
1921	131 080
1923	142 510

У 1924 г. пасяўная плошча дасягнула даваеннага ўзроўню і склала 193 233 дзесяціны. Пашырылася плошча пад тэхнічнымі культурамі. Так, плошча пад лёнам у параўнанні з даваенным часам павялічылася на 519 дзесяцін, пад каноплямі — на 160 дзесяцін.

Магчымасць прадаць рэшткі ўраджаю пасля выплаты харчпадатку заахвочвала сялян паляпшаць сістэму апрацоўкі зямлі і дабівацца больш высокіх ураджаяў. Вось сярэднія лічбы ўраджайнасці ў тыя гады: жыта азімага 36,6 пуд/дзес., жыта яравога 42,3 пуд/дзес., пшаніцы азімай 46,9 пуд/дзес., ячменю 35,5 пуд/дзес.

Павелічэнне пасяўных плошчаў садзейнічала росту пагалоўя жывёлы. Так, вясной 1923 г. ў сялянскіх гаспадарках Рагачоўскага павета было 60 662 кані, 88 001 галава буйной рагатай жывёлы, 86 818 авечак, 103 178 свіней, гэта без уліку жывёлы ў калектыўных гаспадарках і саўгасах.

У дваццатыя гады калгасы не былі папулярныя ў сялян. Хоць дзяржава і заахвочвала калектыўную працу, на 16 снежня 1921 г. ў Рагачоўскім павеце было 9 саўгасаў, дзе працавала 879 чалавек, якія мелі ў сваім распараджэнні 64 кані і 281 галаву буйной рагатай жывёлы; 134 арцелі, якія аб'ядноўвалі 587 чалавек, мелі 134 кані і 313 галоў буйной рагатай жывёлы.

Калектыўным гаспадаркам у 1924 г. належала каля 3 % агульнай плошчы, або 10 500 дзесяцін, астатняя зямля знаходзілася ў карыстанні сялян.

Адначасова з аднаўленнем сельскай гаспадаркі ішло аднаўленне і прамысловасці. З-за крайняй абмежаванасці матэрыяльных рэсурсаў і фінансавых сродкаў у непасрэдным распараджэнні дзяржавы пакідаліся найбольш буйныя, жыццяздольныя і важныя для народнай гаспадаркі і абароны краіны прадпрыемствы. Астатнія здымаліся з дзяржаўнага забеспячэння. Частка з іх здавалася ў арэнду кааператывам ці прыватным асобам. На 9.9.1921 г. на Рагачоўшчыне не засталося ніводнага дзяржаўнага прадпрыемства.

ЗАРЯ КОММУНЫ

С красного фронта.

Старонка газеты «Заря коммуны», органа Рагачоўскага павятовага камітэта РКП і павятовага рэўкома. 20 лютага 1920 г.


Сяляне Рагачоўскага павета здаюць харчпадатак. 1922 год.

Піянерскі атрад вёскі Побалава. 1929 г.

Здача прадпрыемстваў у арэнду пачалася з канца 1921 г. і працягвалася да 1.1.1923 г. Прычым прадпрыемствы здаваліся на тэрмін ад 1 да 6 гадоў і толькі каля 6 % — бестэрмінова. Прыватным асобам здадзена ў арэнду каля 70 % прадпрыемстваў на ўмовах аднаўлення і рамонту зношанага абсталявання.

Па даных губернскага статыстычнага бюро на 20.11.1923 г. на Рагачоўшчыне было 11 цэнзавых прамысловых прадпрыемстваў (цэнзавыя — прадпрыемствы, на якіх не менш чым 16 рабочых і ёсць механічны рухавік або не менш як 30 рабочых, калі няма рухавіка) з колькасцю рабочых 725 чалавек.

У 1923 г. намаганнямі працоўных і гарадскога Савета ў Рагачове быў адкрыты завод «Друць», які раней не працаваў. Гэты завод выпускаў драўняную масу і кардон. Дзякуючы арэндзе завод даў за 2-гі квартал 2619 пудоў вырабаў, або 105 % ад плана. Расла гарадская кааперацыя. Да верасня 1926 г. ў арцелі аб'ядналіся 169 саматужнікаў. Новым кааператывам дзяржава аказвала дапамогу. Да 1925—1926 гг. прамысловасць Рагачоўшчыны ў цэлым перасягнула даваенны ўзровень па асноўных паказчыках.

Калектывізацыя. Пераўтварэнне сельскай гаспадаркі на аснове карэннай тэхнічнай рэканструкцыі, уздыму агульнай культуры вёскі было гістарычнай неабходнасцю. Але ніякай аб'ектыўнай неабходнасцю нельга апраўдаць таго гвалту, што быў учынены над сялянінам і вёскай у час правядзення калектывізацыі і раскулачвання. Дакументы, што захаваліся ў архівах, дазваляюць прасачыць у асноўных рысах, як адбываўся гэты трагічны і балючы працэс на Рагачоўшчыне.

Да 1927 г. асноўная маса сялянства раёна была бядняцка-серадняцкай, а заможныя гаспадаркі складалі каля 4 %. На тэрыторыі раёна былі 4 саўгасы і Турская доследная станцыя, якая распаўсюджвала агранамічныя веды, абменьвалася з сялянамі насеннем. Трактарам станцыі было ўзарана 75 дзесяцін зямлі ў бяднейшых гаспадарках.

25 сакавіка 1928 г. на першай раённай нарадзе беднаты абмяркоўвалі практычныя шляхі калектывізацыі вёскі. Планавалася ахазваць эканамічнае садзейнічанне для ўздыму бядняцкіх гаспадарак, наступленне на капіталістычныя элементы вёскі шляхам прагрэсіўнага падатку, абмежавання арэнды зямлі «пры апоры партыі на беднякоў-парабкаў у блоку з серадняком». Актыву беднаты прадпісвалася праяўляць больш ініцыятывы і праводзіць тлумачальную падрыхтоўчую работу сярод бядняцка-серадняцкіх слаёў, асабліва ў пашырэнні і ўкараненні ў пасёлках калектыўных элементаў працы ў агульным вядзенні гаспадаркі: пасадка калектыўнага саду, сумесная апрацоўка зямлі, валоданне калектыўнай машынай, а таксама ў пераходзе падрыхтаваных пасёлкаў і вёсак да сельскагаспадарчай арцелі (намячалася ўжо ў тую вясну стварыць 5 такіх гаспадарак). Нарада заклікала больш праводзіць кааперараванне беднаты ў прасцейшыя і спецыяльныя віды кааперацыі, каб кожная бядняцкая гаспадарка была ўключана ў гэты працэс. Былі ўхвалены планы арганізацыі ў тым жа годзе 4 машынных таварыстваў, аднаго насенняводчага, 2 тарфяных, 4 масларобчых і сыраварных, 2 птушкагадоўчых і інш.

На тым этапе кааперавання сялянства яшчэ шырока выкарыстоўвалі метады пераканання, агітацыі, уплыву станоўчага прыкладу (для гэтага ў в. Кісцяні была створана сельгаскамуна).

3 лютага 1929 г. пленум Рагачоўскага райкома партыі падвёў першыя вынікі калектывізацыі за 1928 г.: было арганізавана 16 калгасаў, 10 машынных таварыстваў, 3 меліяратыўныя, 7 тарфяных, 4 малочныя і 1 насеннае. Сацыяльнае становішча калгаснікаў было такое: беднякі складалі 90,4 %, сераднякі — 9 %, паводле нацыянальнага складу — беларусаў 60 %, яўрэяў 40 %. Партыйнае кіраўніцтва галоўнай задачай ставіла своечасовае льготнае забеспячэнне калгасаў насеннем, угнаеннямі, сельскагаспадарчай тэхнікай, лесаматэрыяламі, крэдытамі. Пры такіх перавагах перад аднаасобнымі гаспадаркамі калгасы, безумоўна, умацоўваліся і станавіліся дзе-нідзе прыкладам вядзення гаспадаркі, асабліва для беднаты.

У маі 1929 г. на сходзе партактыву Рагачоўскага раёна гаварылася, што няма такога сельсавета ў раёне, дзе б не было жадання сялян ісці ў калгас. Разам з тым, адзначалася на сходзе, ёсць факты, калі камуністы з заможных сялян выступалі супраць калгасаў, кулацтва таксама старалася «перашкодзіць гэтай рабоце».

З прыняццем генеральнага курсу на суцэльную калектывізацыю фарсіраванне тэмпаў арганізацыі калгасаў станавілася больш яўным і сілавым. Пры гэтым ігнараваліся настрой сялянства, яго неватоўнасць і нежаданне адмовіцца ад уласнай, хоць і дробнай, гаспадаркі. Мяняецца і тон дакументаў таго часу.

У верасні 1929 г. ставіцца задача правесці суцэльную калектывізацыю Гарадзецкага і Свержанскага падраёнаў (10 сельсаветаў). 8 лістапада 1929 г. на канферэнцыі калгаснікаў Рагачоўска-Жлобінскага масіву, на якой 200 дэлегатаў (з іх 60 сялян) прадстаўлялі 10 тыс. калгаснікаў з 12 сельсаветаў, былі прыняты і першыя лічбавыя арыенціры: да 1 студзеня 1930 г. калектывізаваць раён на 80—90 %. У адрас ЦВК СССР, СНК, ЦК ВКП(б) удзельнікі канферэнцыі адбілі тэлеграмы з абавязацельствамі арганізаваць калгас-гігант на тэрыторыі 2 раёнаў і весці рашучую «барацьбу з кулаком і нэпманам, якія перашкаджаюць нашаму сацыялістычнаму будучаму...» У матэрыялах жа бюро РК КП(б)Б за снежань 1929 г. ўжо намечаны новыя арыенціры: апошні пленум РК пастанавіў калектывізаваць раён на 100 %.

Уяўленне аб тым, як ішла калектывізацыя ў раёне, дае наступная табліца:

Дата	Колькасць гаспадарак	Колькасць калгасаў	Колькасць гаспадарак у калгасах	%
1.10.1928		23	186	1.4
1.6.1929		40	448	4
20.4.1930		60	1713	13
30.11.1931	13 933	127	4689	33,6
1.6.1932	14 538	114	3600	24,7
5.11.1932	14 538	114	3652	25
1.11.1934		182	9705	63,8

На 1 калгас прыпадала ў сярэднім 11,2 сям'і ў 1928 і 28,5 сям'і ў маі 1930. Мяняўся і сацыяльны стан калгаснікаў: калі на 1.10.1928 сярод іх было 9 % заможных сялян, то ўжо на 1.6.1929 толькі 0,2 %. Большасць была беднякоў, павялічылася колькасць сераднякоў. З табліцы відаць, што да лета 1932 г. ў раёне зменшыліся і колькасць калгасаў, і працэнт сялянскіх гаспадарак у іх адносна агульнай колькасці сялянскіх двароў. Гэта вынік «адліву» сялян з калгасаў, які стаў магчымым пасля таго, як былі крыху адпушчаны адміністрацыйныя ціскі (крытыка «галавакружэнняў ад поспехаў» і інш.). Паўплывала і тое, што на Рагачоўшчыну, як і на астатнія паўднёвыя раёны Беларусі, хлынулі патокі ўкраінскіх сялян, што ратаваліся ад голаду, які пачынаўся на Украіне.



Будынак паліклінікі ў Рагачове. 1930-я гады.

На 15 лістапада 1932 г. ў раёне налічвалася сялянскіх гаспадарак: 3562 калгаснікаў, 760 беднаты, вызваленай ад падатку, 9529 серадняцкіх, якія плацілі падатак, 473 заможныя, 45 кулацкіх, прызначаных на адсяленне.

У раёне да 1932 г. было і 5 саўгасаў: Ціхініцкі і Дзедлаўскі — прамыслова-жывёлагадоўчага профілю, Красніца — свінагадоўчага, Побалава — Забалацце — насенняводчага і Турскі.

Валавы збор сельскагаспадарчых культур у 1932 г. быў наступны (у цэнтнерах):

	Жыта і пшаніца	Авёс і ячмень	Крупяныя бабовыя	Бульба	Агародніна	Лён валакно	Пянька валакно
				39 168	5868	30	
	1176	2590	1043	293 930	34 728	1538	2
Саўгасы	31 327	22 739	6445	772 310	85 800	5600	258
Калгасы	92 088	60 315	28 007				1003
Адпаасобнікі							

План жа нарыхтовак збожжавых быў выкананы на 59,7 %, бульбы — на 76,9 %, мяса — на 22 %. Свойскай жывёлы аднаасобнікі ў 1932 г. трымалі ў 5—7 разоў больш, чым у калгасах, коней у 2,5 раза. Прыведзеныя вышэй даныя сведчаць аб тым, што аднаасобныя сялянскія гаспадаркі далёка не вычарпалі сваіх магчымасцей. І гэта ва ўмовах палітыкі жорсткага падаткаабкладання, абмежаваных магчымасцей у набыцці крэдытаў, насення, тэхнічнага інвентару, калі прыярытэты ў забеспячэнні матэрыяльна-тэхнічнымі сродкамі аддаваліся ў першую чаргу калгасам. А матэрыяльна-тэхнічная база сельскай гаспадаркі заставалася слабай. У пачатку 1930-х гадоў на ўвесь раён было толькі 38 калёсных трактароў: 11 у саўгасах, 2 у калгасах і 25 у МТС, якая абслугоўвала 52 калгасы ў 13 сельсаветах. На ўвесь раён быў толькі адзін грузавік (МТС), асноўным жа транспартным сродкам былі калёсы, а цяглавай сілай — коні.

Дзяржаўная, па сутнасці безальтэрнатыўная, палітыка ў развіцці сельскай гаспадаркі вымушала селяніна ў пераважнай большасці рабіць выбар на карысць калгаса. Ва ўмовах драпежніцкага падаткаабкладання, ідэалагічнага і эканамічнага ўціску, калі спробы адстаяць сваё права на ўласную зямлю і гаспадарку, права жыць і працаваць па ўласнаму разуменню, без паганятых і найвышэйшых дырэктыў расцэньвалася як падрыў асноў савецкага ладу з вынікаючай адсюль небяспекай, безумоўна пачала «назіраццa тэндэнцыя да росту колькасці калгасаў». На 1 лістапада 1934 г. з 15 232 сялянскіх двароў у раёне ў 182 калгасах было 9705 гаспадарак, або 63,7 % ад усіх сялянскіх гаспадарак. Калгасы былі ў асноўным дробныя, аб'ядноўвалі ў сярэднім 53 гаспадаркі.

Да 1937 г. калектывізацыя ў раёне была завершана, у калгасы было аб'яднана 79,1 % сялянскіх гаспадарак.

Гвалт над здаровым сэнсам і чалавечай годнасцю не мог не выклікаць адваротнай рэакцыі, што выяўлялася ў масавым незадавальненні і адкрытых пратэстах сялян, якія часам набывалі крайнія формы, у т. л. ў выглядзе антысавецкіх выступленняў. У справаздачы Рагачоўскага райкома за перыяд з жніўня 1929 г. па май 1930 г. адзначалася: «Ва ўмовах суцэльнай калектывізацыі ўзмацняецца класавая барацьба. Гэта асабліва праявілася ў час веснавой пасяўной кампаніі, хлебанарыхтовак. Кулакі, лішэнцы, паліцэйскія, гандляры пачалі адкрыта выступаць не толькі з агітацыяй, але і з тэрорам (падпал школы ў Серабранцы, маёмасці калгаса ў Мяркулавічах, збілі калгасніка ў Гарадцы і ў Старасельскім с/с, выстралу калгасніка ў Дварэцкім с/с і асабліва ў час высялення кулацтва (Мяркулавічы, Прыбар, Святое, Заполле, М. Стрэлкі, Лучын, Мадора, Красніца)». У 1934 г. летам у калгасе «Новае жыццё» ў в. Каласы былі падпалены дамы актывістаў калгаса і мясцовага Савета, аналагічны выпадак адбыўся і ў в. Доўск. Восенню таго ж года ў в. Мадора ў час перавыбараў былі падпалены калгасныя будынкі з сенам і збожжам. Паводле архіўных дакументаў «кулакі сабатавалі здачу лёну дзяржаве ў в. Турск, Старое Сяло, Задруцце».

Ва ўмовах таталітарнага рэжыму, калі магутная рэпрэсіўная машына працавала бесперапынна, калі не толькі яўныя ці скрытыя праціўнікі існуючага ладу, але і яго прыхільнікі і нават стваральнікі ў масавай колькасці станавіліся «ворагамі народа», канчалі сваё жыццё ў катавальнях сталінскай ахранкі ці ў лагерах сумна вядомага ГУЛАГа, усякае яўнае ці ўскоснае супраціўленне, якія б формы яно ні набывала, было з самага пачатку асуджана на паражэнне.

Малох рэпрэсій, пастаўленых, як і ўсё ў той час, на строгую, планавую сістэму, не абышоў і Рагачоўшчыну. Нават вядомыя рэвалюцыянеры, ваенныя і савецкія дзеячы — ураджэнцы раёна сталі ахвярамі рэпрэсій — гэта саратнікі У. І. Леніна А. Я. і Р. Я. Беленькія, ваенныя дзеячы Б. С. Гарбачоў і Р. С. Окунеў, нарком БССР У. І. Піваварaў. А колькі было простых людзей — сялян, рабочых, службоўцаў, настаўнікаў і г. д. з той жа

Рагачоўшчыны, што таксама падвергліся рэпрэсіям! Наўрад ці былі такія вёскі, адкуль хоць бы аднаго-двух чалавек ды не «забралі».

А «забраць» маглі ў той час за неасцярожнае слова ці пытанне, за нейкі свавольны ўчынак, якому пэўныя сілы маглі надаць палітычную афарбоўку, і г. д. Былы жыхар в. Званец І. С. Барысаў успамінаў, што з іх вёскі «забралі» Пятра Капякова за пытанне, якое ён кінуў, седзячы на прызбе з аднавяскоўцамі: «Хто будзе і што будзе, калі раптам не стане Сталіна?». А мясцовага дзівака, пастуха Максіма Уласава, які меў звычку ў час вячорак у вясковай хаце танцаваць з услончыкам і заўсёды спыняцца каля партрэта правадыра, выставіўшы перад сабой услон, арыштавалі неяк увечары, прыехаўшы за ім на машыне і прапанаваўшы яму пакатацца. Так і згінуў назаўсёды вясковы дзівак, незласлівы хлопец Максім Уласаў. Гэты спіс можна прадоўжыць, хоць яшчэ шмат прозвішчаў патрэбна знайсці і аднавіць у людской памяці, вярнуўшы ім добрае імя.

Змены, якія задумана было ажыццявіць у эканамічным жыцці грамадства, вымагалі адпаведных захадаў і ў галіне культуры і адукацыі.

Да пачатку 1920/21 навучальнага года ў Рагачоўскім раёне 48,8 % дзяцей ад агульнай колькасці дзяцей школьнага ўзросту не вучылася ў школе. У 1921 г. ў Рагачоўскім павеце налічвалася 379 розных школ, да 1922 іх колькасць скарацілася да 311, прычым 75 з іх не функцыянавалі па розных прычынах. Неабходна было тэрмінова рыхтаваць настаўніцкі корпус, ствараліся кароткачасовыя курсы настаўнікаў з тэрмінам навучання ад 2 да 3 месяцаў, такія курсы працавалі да пачатку 1920 г. ў Рагачове. На вёсцы пачалі стварацца хаты-чытальні, бібліятэкі, клубы, якія станавіліся асяродкам культуры. Ры ўдзеле гэтых устаноў вёўся ўлік непісьменных, ствараліся пункты і школы па ліквідацыі непісьменнасці для дарослых. Толькі адна Кісцянёўская хата-чытальня адкрыла ў 1928 г. 6 такіх пунктаў.

Вось некаторыя вытрымкі са справаздачы Рагачоўскага Дома селяніна за 1928 г.: выселяніна 3724 чалавекі, з іх 3176 мужчын, 548 жанчын, праведзена 48 чытанняў, на якіх прысутнічала 900 чалавек; прачытаны 33 лекцыі на палітычныя тэмы, прысутнічала 588 чалавек. Усяго ж прачытана лекцый і дакладаў 127, наведала іх 3724 чалавекі. У бібліятэцы 822 кнігі, маюцца 4 перасоўкі, кніг палітычных 280, па сельскай гаспадарцы 202, антырэлігійных 80, белетрыстыкі 200, ваеннай тэматыкі 90.

У 1931 г. ў раёне было 18 дамоў сацыялістычнай культуры, у 1934 г. ўжо 26. Хоць якасць работы наўрад ці была здавальняючай, што, дарэчы, адзначалася і ў некаторых дакументах тае пары. У 1931 г. Рагачоўская бібліятэка мела звыш 10 тысяч кніг, але адсутнасць чытальні перашкаджала разгарнуць масавую работу з чытачамі. У ліквідацыі непісьменнасці актыўны ўдзел бралі камсамольцы. Газета «Чырвоная змена» ад 12 мая 1932 г. паведамляла, што 110 камсамольцаў раёна добраахвотна працавалі ў лікпунктах з 850 непісьменнымі. Да канца 1933 г. амаль ва ўсіх калгасах былі абсталяваны клубы. У многіх гаспадарках пачалася радыёфікацыя. Так, у калгасе імя Калініна было радыёфікавана 20 сялянскіх хат, у калгасе «Ленінскі шлях» — 12. У Дварышчанскім сельсавеце быў абсталяваны ўзмоцнены радыёвузел і радыёфікавана 150 хат калгаснікаў. У кожным калгасе 3 разы на месяц паказвалі кіно. Паўсюдна развівалася мастацкая самадзейнасць, праводзіліся яе раённыя агляды. Газета «Звязда» 1 красавіка 1935 г. паведамляла, што ў Рагачове ў канцы

На ўроку ў рагачоўскай сямігодцы.

сакавіка ў будынку Гарадскога тэатра на працягу 3 дзён адбывалася раённая алімпіяда самадзейнага мастацтва, арганізаваная райкомам камсамола і райана. У ёй прымалі ўдзел калектывы мастацкай самадзейнасці Мадорскага, Ціхініцкага і Дварэцкага сельсаветаў, лесазавода імя Халтурына і іншыя, усяго 200 чалавек навучэнцаў, рабочай і калгаснай моладзі. Газета адзначала выступленні на скрыпцы 7-гадовай Мараюўскай і 8-гадовага Вількава. Аналагічная алімпіяда адбылася і праз год. У ёй прынялі ўдзел 116 чалавек ад 14 калектываў, было прадэманстравана каля 100 мастацкіх нумароў. Значнай падзеяй у культурным жыцці раёна было адкрыццё ў верасні 1935 г. ў Рагачове на базе мясцовага драмгуртка тэатра. З 1937 г. ён стаў называцца Рагачоўскім калгасна-саўгасным тэатрам. Трупа папоўнілася прафесійнымі акцёрамі, спектаклі ставілі вядомыя рэжысёры. Тэатр часта выязджаў на гастролі ў розныя гарады Беларусі.

Безумоўна, у тых складаных умовах эканамічнага і палітычнага жыцця, якія стварыў для народа сталінскі рэжым, пытанням духоўнага развіцця, культуры аддавалася столькі ўвагі, колькі і ў якой ступені гэта было патрэбна самому рэжыму. Антырэлігійная прапаганда набывала сапраўды «ваяўнічыя» формы, што ў выніку вылілася ў разбурэнні, закрыццё храмаў, рэпрэсіі супраць святароў. Пасля палітыкі беларусізацыі ў 20-х гадах, калі былі спробы сапраўднага адраджэння беларускай культуры, мовы, дзяржаўнасці, прыйшоў час барацьбы з «нацдэмаўшчынай», занядбання мовы, гістарычнага мінулага, разгрому краязнаўчага руху і г. д. У палітычную барацьбу, якая па вызначэнню Сталіна павінна была з кожным годам абвастрацца, уцягвалі нават дзяцей. Паведамленні газет таго часу аб тым, што ў 1933 г. ў Рагачоўскім раёне шырока разгарнуўся рух піянераў і калгасных дзяцей за ахову «сацыялістычнага ўраджаю», што былі створаны «піянерскія дазоры аховы ўраджаю і барацьбы са стратамі», зараз успрымаюцца зусім па-іншаму, калі ведаеш пра голад 1930-х гадоў, пра сумна вядомы закон «аб каласках» ад 7.8.1935 г. і пра многае іншае. Атмасферу падазронасці, татальнага недаверу і пошуку шкоднікаў даносяць да нашых сучаснікаў дакументы і газеты тае пары. Асабліва яскравым прыкладам могуць служыць у гэтым сэнсе вытрымкі з пратаколаў бюро Рагачоўскага РК КП(б)Б за 1937 г. (гл. ў артыкуле «Дакументы сведчаць»).

У канцы 30-х гадоў да тых цяжкасцей і трывог, што неслі на сваіх плячах і ў сэрцах людзі, дадаліся новыя: за лакальнымі ваеннымі канфліктамі ўсё выразней адчувалася пагроза вялікай вайны. Пахавальныя лісты з фінскай кампаніі прыйшлі і ў сем'і рагачоўцаў. Пажар сусветнай вайны палыхаў ужо каля заходніх межаў рэспублікі.

В. С. Каральчук, В. В. Сафонава
(адукацыя, культура).

Рагачоўскія камсамольцы

З успамінаў Р. І. Туркінай

Рахіль Ізраілеўна Туркіна — ураджэнка Рагачова, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Рагачоўскай гарадской і павятовай камсамольскіх арганізацый, удзельніца грамадзянскай вайны. Аўтар успамінаў у кнізе «У агні грамадзянскай вайны» (Мн., 1987, на рускай мове), якія прыводзяцца ніжэй са скарачэннямі і ў перакладзе на беларускую мову.

У снежні 1918 г. ў Рагачоў з Масквы прыехаў інструктар ЦК камсамола. Зусім малады хлопец у салдацкім шынялі. На жаль, забыла яго прозвішча...

Я правяла яго да сакратара камітэта партыі т. Кузняцова. Адразу намецілі склад аргбюро з 5 чалавек, у лік якіх уключылі і мяне. У той жа дзень мы сабраліся на першае пасяджэнне...

Маскоўскі прадстаўнік прабыў у Рагачове 2 дні. Ён пакінуў надрукаваныя на машынцы рашэнні I з'езда камсамола і Статут РКСМ.

З вялікім энтузіязмам узяліся мы за нязвычную для нас работу. Члены аргбюро сталі часта бываць сярод моладзі цагельнага і лесапільнага заводаў, на кардоннай фабрыцы, у швейных, шавецкіх і сталярных майстэрнях. Мы тлумачылі юнакам і дзяўчатам мэты і задачы камсамола, заклікалі іх пад чырвоны сцяг РКСМ, каб дружна і арганізавана будаваць новае жыццё...

У пачатку лютага 1919 г. ў гарадскім тэатры адбыўся мітынг працоўных. З дакладам аб бягучым моманце выступіў сакратар павятовага камітэта партыі Ф. Кузняцоў... Пасля мітынгу многія пыталіся, калі будзе створана камсамольская арганізацыя ў Рагачове, як уступіць у яе рады. Сакратар павятовага камітэта паведаміў, што падрыхтоўчая работа разгорнута на

ўсю моц. І сапраўды, на сваім чарговым пасяджэнні аргбюро абмеркавала пытанне аб правядзенні першага сходу моладзі. Намецілі яго на 15 лютага 1919 года. Гэты дзень і стаў днём нараджэння Рагачоўскай камсамольскай арганізацыі...

Увечары 15 лютага ў падрыхтаваным памяшканні сабралася каля 70 юнакоў і дзяўчат з прадпрыемстваў і некалькі вучняў, якіх аргбюро запрасіла. Па даручэнню павятовага камітэта партыі сход адкрыў малады, але ўжо вопытны работнік Сямён Кузняцоў...

Першым атрымаў слова камісар расквартараванага ў Рагачове пагранічнага палка А. Цымерман... Затым з вялікай цікавасцю праслухалі даклад Сямёна Кузняцова «Аб мэтах і задачах Камуністычнага саюза моладзі». Ён пазнаёміў прысутных з рашэннямі І з'езда і Статутам РКСМ.

Пасля адказаў на пытанні пачаўся прыём у члены РКСМ. Тут жа ўручалі камсамольскія білеты. Яны былі часовыя, іх надрукавалі ў мясцовай друкарні на шэрай паперы. Першы білет пад апладысменты ўсёй залы атрымаў Сямён Кузняцоў... Тады ж выбралі склад гаркома камсамола. У яго ўвайшлі акрамя ўсіх членаў аргбюро Ф. Аўсяннікава і П. Сярэбранікаў. Сакратаром стаў С. Кузняцоў...

Ніхто з членаў гаркома не быў, як цяпер прынята казаць, вызваленым работнікам. У прыватнасці, Сямён Кузняцоў з'яўляўся загадчыкам аддзела агітацыі і прапаганды павятовага камітэта партыі, а я там узначальвала аддзел па рабоце сярод жанчын. Свае абавязкі ў гаркоме камсамола мы выконвалі, так сказаць, на грамадскіх пачатках...

Галоўная задача вытворчасці горада заключалася ў забеспячэнні арміі. Нашы майстэрні шылі абутак, абмундзіраванне. Гэтым не абмяжоўваліся. Паводле рашэння рэўкома з камуністаў і членаў РКСМ стварылі тройкі па канфіскацыі ваеннай маёмасці ў прыватных асоб. Яе нямала сабралася ў крамнікаў і спекулянтаў, якія куплялі ці выменьвалі на прадукты харчавання бялізну і абутак у салдат старой арміі. Пасля санапрацоўкі і рэстаўрацыі адабраная маёмасць адпраўлялася на фронт...

Да лета 1919 г. ў гарадской арганізацыі РКСМ налічвалася ўжо 110 чалавек. Значна павялічылася і колькасць вясковых ячэек. Памацнелі камсамольскія арганізацыі ў Чачэрску, Карме, Журавічах, Доўску, Жлобіне, Гадзілавічах, Гарадцы, Ціхінічах і іншых месцах. Летам 1919 г. адбыўся наш першы павятовы з'езд, які абмеркаваў становішча

А. К. Мармозаў.

на франтах і задачы камсамола і выбраў павятовы камітэт РКСМ. Сакратарамі павятовага камітэта ў тыя гады паслядоўна з'яўляліся я, Р. Кузняцова, Ф. Аўсяннікава, П. Сярэбранікаў...

Усе лепшыя сілы камсамольская арганізацыя накіравала на фронт. Першая мабілізацыя моладзі на барацьбу з Калчаком прайшла ў маі 1919 года. Я добра памятаю тыя праводзіны... Разам з Сямёнам Кузняцовым на фронт накіраваліся М. Мадорскі, І. Сосін, С. Агранаў, В. Ліпоўскі, А. Кавальчук і іншыя.

У верасні 1919 г. на Паўднёвы фронт для барацьбы з Дзянікіным адправілася другая група рагачоўскіх камсамольцаў, а ў маі 1920 г. на Заходні фронт — трэцяя. З гэтай групай ішла ў армію і я.

Наш эшалон адправіўся ў Магілёў. Там знаходзіўся штаб 8-й дывізіі. Мяне прызначылі спачатку палітруком маршавай роты, а затым інструктарам палітаддзела дывізіі. Удзельнічала ў баях пры наступленні на Варшаву. Сем дзён была старшынёй рэўкома ў польскім горадзе Межырэчча. У нашу задачу ўваходзіла забеспячэнне праходзячых савецкіх войск харчаваннем і фуражом, падтрыманне парадку сярод насельніцтва. Потым працавала ваенкомам перавязачнага атрада і санітарнай часці 22-й брыгады. Не адзін раз даводзілася выцягваць параненых з поля бою. Была кантужана. Зведала і радасць перамог і горыч адступлення...

Рагачоўскія камсамольцы апраўдалі аказаны ім давер... Многія загінулі ў баях: Я. Вішнеўскі, П. Сасонка, А. Кавальчук, Г. Трымлесінскі, І. Сосін і іншыя...

З успамінаў першага піянерважатага Лучынскай школы Адама Кузьміча Мармозава

Пасля таго, як было прынята рашэнне арганізаваць піянерскі атрад у Лучыне, мяне накіравалі ў Бабруйск на курсы

піянерважатых. Пасля іх сканчэння я вярнуўся ў Лучыя і ўзначаліў атрад.

У той час у раёне было ўсяго 4 піянерскія атрады: у Турску, Забалацці, Гадзілавічах і ў нас, у Лучыне.

Напачатку наш атрад складаўся з 4 чалавек: Жукаў М. Н., Казакоў А. Г., Дзядкоў І. М., Гручанкоў Г. А. Насіў ён імя М. І. Калініна. Урачыстае абяцанне піянеры давалі тады ў Рагачове ў райкоме камсамола. Гучала яно тады прыкладна так: «Чэсным словам абяцаю, што буду верны рабочаму класу. Буду штодня дапамагаць сваім працоўным сабратам, ведаю законы піянераў і буду ім падпарадкоўвацца». Пры сустрэчы з важатым, а таксама піянера з піянерам заўсёды віталіся салютам.

Збіраўся атрад 3 разы на тыдзень: чыталі кнігі, развучвалі гульні, вывучалі біяграфію М. І. Калініна, спявалі песні, дапамагалі настаўнікам у ліквідацыі непісьменнасці. Пасля збораў хадзілі строем па вёсцы з песнямі. У 1924 г. ў атрад уступілі 4 дзяўчынкі.

Піянеры мелі і сваю форму. Дзяўчынкі насілі белыя кофтачкі і чорныя спадніцы, хлапчукі — кароткія штаны і белыя кашулі. Важаты піянерскага атрада насіў спецыяльны касцюм — гімнасцёрку і штаны ахоўнага колеру. Да формы прымацоўваўся піянерскі значок і піянерскі галштук, партупея і фінскі нож у ножнах на рэмені. Я прапрацаваў піянерскім важатым 2 гады. Потым пасля мяне стаў важатым Міхалькоў Лаўрэн Васілевіч, ён загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны.

Першая сельгасарцель

Вясной 1920 г. ў в. Забалацце была створана першая ў Рагачоўскім павеце сельскагаспадарчая арцель беднякоў «Роўнасць». Старшынёй яе аднадушна выбралі свайго земляка Рыгора Сяргеевіча Завадскага, былога старшыню камбеда. Калектыўная гаспадарка хутка пайшла ўгару, аб'яднаўшы вакол сябе ўсю беднату вёскі. Пра дзейнасць арцелі стала вядома ў Маскве. Яе работай зацікавіўся М. І. Калінін. Завадскага запрасілі ў Маскву. А ў 1927 і 1929 гадах працоўныя выбралі Рыгора Сяргеевіча членам ВЦВ. Такім чынам, прадстаўнік першай у раёне сельгасарцелі становіцца членам урада Савецкай краіны.

Пасля кожнай паездкі ў Маскву Рыгор Сяргеевіч расказваў сваім землякам пра мерапрыемствы ВЦВК, пра тое, якую дапамогу аказвае сельгасарцелі М. І. Калінін. І вось на адным са сходаў у 1929 г. члены арцелі аднадушна вырашылі перайменаваць сваю гаспадарку і прасілі ўсесаюзнага старасту даць згоду назваць сельгасарцель яго імем. Паслалі калектыўнае пісьмо, а потым камандзіравалі ў Маскву і Завадскага. І вось з 1930 г. старэйшы калгас нашага раёна носіць імя Калініна.

Я. Гарбатаў.

Рагачоўшчына — галадаючым Паволжа

Дапамажы! Схуднелы чалавек узнімае рукі і толькі адно слова: «Дапамажы!». Гэты плакат — крык мільёнаў людзей, якія паміралі ад голаду ў пачатку 20-х гадоў. Звыш 23 мільёнаў чалавек галадала на Паўднёвым Урале, Паволжы, частцы Украіны, Паўночным Каўказе. «Дзесяць сытых павінны накарміць аднаго галадаючага»,— такі быў лозунг тых дзён. Дастойны ўклад у справу дапамогі галадаючаму Паволжу зрабілі і працоўныя Рагачоўшчыны. Гомельская губерня дапамагала вобласці немцаў Паволжа, у якой ужо ў канцы мая 1921 г. налічвалася каля 300 000 галадаючых. Гарачае лета з пастаяннымі сухімі вятрамі знішчыла ўсе пасевы вобласці. Загінула 80 % азімых збожжавых, яравых нават не было чаго ўбіраць. Гаралі сады, не было ўраджаю і на агародах, і на бульбяным палетку. Не было чым карміць жывёлу, і яна масава гінула. Людзі елі траву, макуху, суслікаў, сабак, катоў, гатавалі ежу з падлы, са старой скуры і падэшваў. Гомельскай губерні было даручана выратаваць 400 000 чалавечых жыццяў. Да Рагачоўскага павета былі прымацаваны 22 тысячы галадаючых (Палеская праўда. 1922. 10 студз.). Жыхары Рагачоўскай зямлі справамі дапамагалі галадаючым.

На адрас Сімбірскага губернскага земельнага аддзела ў жніўні 1921 г. з Рагачова адпраўлена пяць вагонаў насеннага жыта для сяўбы азімых (Палеская праўда. 1921. 13 жн.). У жніўні 1921 г. ў Рагачове быў наладжаны фестываль у карысць галадаючых і сабрана каля 2 мільёнаў рублёў, што было раўназначна 35—40 пудам хлеба, і гэта была не адзіная форма арганізацыі дапамогі галадаючым.

Рабочыя і служачыя пастанаўлялі рабіць абавязковыя адлічэнні з заработнай платы ў фонд дапамогі. Так саюз работнікаў асветы Кармянскай воласці ў жніўні 1921 г. пералічыў галадаючым Паволжа месячную зарплату (Палеская праўда. 1921. 16 жн.).

5—6 снежня 1921 г. ў Рагачове адбылася павятовая нарада сакратароў 13 валасных бюро партыйных арганізацый, а таксама сакратароў Жлобінскай партыйнай арганізацыі, ячэйкі Наспенскага завода і Рагачоўскіх гарадскіх партыйных ячэек. Нарада прыняла рашэнне, каб валасныя бюро партарганізацый актыўна ўключаліся ў работу валасных камітэтаў па аказанню дапамогі галадаючым і кіравалі работай камітэтаў узаемадапамогі.

На пачатак лютага 1922 г. ў Паволжа было адпраўлена 7 вагонаў прадуктаў, сабраных працоўнымі Рагачоўшчыны. Дарослыя галадаючыя, якія прыбылі ў павет, былі ўладкаваны на розныя прадпрыемствы. Добра ўладкавалі і дзяцей. Устаноўлена была норма выдачы прадуктаў для галадаючага: 30 фунтаў (12 кілаграмаў) хлеба ў месяц на чалавека. Яшчэ ў жніўні 1921 г. павет прыняў 1000 дзяцей з галадаючых губерняў, якіх размясцілі ў Жыліцкім саўгасе, многія былі размеркаваны па валасцях (Палеская праўда. 1921. 13 жн.).

У цэрквах, касцёлах, сінагогах дзяржава забрала частку каштоўнасцей на пакупку хлеба галадаючым. Па Гомельскай губерні на 30 красавіка 1922 г. было сабрана 62 пуды 6 фунтаў 21 лот 2 залатнікі 67 долей серабра, 33 залатнікі 6 долей золата і 303 каштоўныя камяні, не лічачы жэмчугу і 28 сярэбраных рублёў. У г. Рагачове канфіскацыя каштоўнасцей з касцёлаў і сінагог скончылася 28.4.1922 г. З касцёла канфіскаваны 3 фунты 9 залатнікоў серабра і з сінагогі 6 лотаў серабра. 3 мая 1922 г. закончылася канфіскацыя каштоўнасцей у цэрквах горада: канфіскавана 16 фунтаў 22 долі серабра. У валасцях, павеце канфіскацыя каштоўнасцей закончана 20.5.1922 г. Усяго было канфіскавана каля 2,5 пуда серабра, сярэбранымі манетамі 154 рублі 20 капеек, золатам 10 рублёў і меддзю 1 рубель 35 капеек.

Ураджай 1922 г. дапамог пераадолець вынікі сухавею.

М. Н. Камароў.

Дакументы сведчаць

РЭЗАЛЮЦЫЯ РАГАЧОЎСКАЙ АГУЛЬНАГАРАДСКОЙ РАБОЧАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ АБ АСУДЖЭННІ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ЭСЭРАЎ

28 ліпеня 1922 г.

Заслушав доклад тов. Похвистнева о значении [судебного] процесса над эсерами, общегородская конференция членов профсоюзов гор. Рогачева совместно с общегородской конференцией женщин-работниц клеймит позором предателей рабочего класса и убийц его вождей, требуя высшей меры наказания предательской партии эсеров в лице ее вождей.

ДА Гомельскай вобл., ф. 433, воп. 1, спр. 1209. л. 122.
Завераная копія.

ЛІСТ РАГАЧОЎЦАЎ ДА ЛЕНІНА

5 снежня 1922 г.

Москва, Кремль.

Дорогой Владимир Ильич!

VII Рогачевский съезд Советов рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов Гомельской губернии, собравшись для обсуждения вопроса строительства уезда и намечения плана на будущий период, очень рад Вас видеть уже несколько месяцев после выздоровления снова в своих рядах на посту вождя — руководителя Российской республики.

Главная задача нашего уезда, как крестьянского, состоит в поднятии, укреплении сельского хозяйства. В этой области, хотя не слишком большие, но достигнуты некоторые успехи. Засев земли в 1922 и 1923 гг. равен 100 процентам довоенного времени. Продналог этого года сдан на 100 процентов.

Съезд горячо приветствует Вас, дорогой Владимир Ильич, твердо уверен, что мы, под Вашим руководством, напряжением своих усилий, поскольку нет помощи извне, сможем выйти сами из разрухи и тяжелого еще пока положения.

Приветствуя Вас, съезд избирает Вас почетным председателем съезда.
Да здравствует борьба за экономическое укрепление на трудовом фронте!
Да здравствует вождь товарищ ЛЕНИН!

Президиум съезда.

ДА Гомельскай вобл., ф. 428, воп. 1, спр. 300, л. 106.

ПАСТАНОВА РАГАЧОЎСКАЙ ПАВЯТОВАЙ ЗЯМЕЛЬНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ АБ АРГАНІЗАЦЫІ ДАПАМОГІ СЯЛЯНСКІМ ГАСПАДАРКАМ

10 лютага 1923 г.

Заслушав доклад тов. Евдокимова, уездная земельная конференция, учитывая чрезвычайную нужду сельского хозяйства в инвентаре, разных семенах и удобрениях, считает необходимым:

1. Организацию в волостях общественных амбаров для взаимопомощи нуждающегося населения в семенах.

2. Считаясь с разрухой сельского хозяйства и необходимостью [наличия] крупных средств для его восстановления, конференция считает необходимым открытие долгосрочного кредита крестьянству в смысле снабжения его сельскохозяйственными машинами и орудиями, причем кредит должен выражаться в хлебных единицах, а не в золотых рублях.

3. Ввиду огромных залежей сельскохозяйственного инвентаря на складах уездных хозорганов, конференция считает необходимым изъять таковой и распределить его между сельским населением на основах долгосрочного кредита.

4. Ввиду неуяснения крестьянством выгоды применения культурных семян, трав, удобрения и лучшего инвентаря, агроперсоналу вести широкую агитацию среди населения за применение таковых в сельском хозяйстве.

5. Съезд считает самым подходящим органом для распределения и снабжения населения сельскохозяйственным инвентарем и семенами сельскохозяйственную кооперацию, причем семена должны отпускаться как сельскохозяйственной кооперации, так и для населения в виде семссуды.

ДА Гомельскай вобл., ф. 277, воп. 1, спр. 277, л. 22.

РЭЗАЛЮЦЫЯ VIII РАГАЧОЎСКАГА ПАВЯТОВАГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ АБ УЗНАГАРОДЖАННІ СЯЛЯН КАРМЯНСКАЙ ВОЛАСЦІ ТРАКТАРАМ ЗА ПОСПЕХІ Ў ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАННІ

3 снежня 1923 г.

Заслушав сообщение тов. Евдокимова о достижениях в землеустройстве по Кормянской вол., далеко опередившей остальные волости уезда, съезд для поощрения передового крестьянства, выразившего готовность перейти к новым улучшенным формам землепользования, постановляет наградить крестьянство Кормянской вол. трактором, переданным губисполкомом Рогачевскому у.

Съезд выражает уверенность, что данный трактор в Рогачевском у. явится первой ласточкой, извещающей о близком будущем, когда крестьяне СССР станут на путь широкого использования достижений техники для облегчения тяжелого труда крестьянина на родных освобожденных нивах.

ДА Гомельскай вобл., ф. 428, воп. 1, спр. 463, л. 198.

СПРАВАЗДАЧА ТУРСКАЙ РАЁННАЙ ДОСЛЕДНАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ СТАНЦЫІ АБ РАБОЦЕ ЗА 1922/23 ГАСПАДАРЧЫ ГОД

10 снежня 1923 г.

За отчетный период хозяйственная часть опытной станции более или менее наладилась. Так, было подготовлено опытное поле. Затруднения встречались в постановке правильной бухгалтерии, что объясняется отсутствием устойчивой валюты.

Земли, отведенные под Турскую опытную станцию, состояли из следующих угодий: пашни — 530 дес., заливного луга — 427 дес., сада — 22 дес. и выгона — 115 дес. Остальная земля не имеет решающего значения. Земли Турской опытной станции, имеющие в своем составе самые разнообразные типы песков, интересны для ведения

хозяйства песчаного района Гомельской губ. В пониженных местах почва станции имеет склонность к заболачиванию вследствие высокого уровня грунтовых вод.

Профессор Афанасьев, работавший у Турске, пришел к выводу, что почвенные условия опытной станции с преобладанием песков диктуют необходимость развития животноводства.

Из хлебов хозяйством опытной станции в 1923 г. было занято: озимой рожью — 71 дес., озимой пшеницей — 5 дес., клевером — 72 дес., овсом — 70 дес., ячменем — 14 дес., яровой пшеницей — 5 дес., яровой рожью — 3 дес., гречихой — 17 дес., лупином на семена — 5 дес., сераделлой — 1 дес. и викой на зеленый корм — 2 дес. Кроме того, 140 дес. было отведено под разные оброчные статьи и для хозяйства рабочих станции. Метеорологические условия этого года и обилие дождей, содействуя быстрому росту растений, оказались неблагоприятными для урожаев зерна, дав в среднем урожай озимой ржи 64 пуд. на десятину и озимой пшеницы 50 пуд. на десятину. В прошлом же году получилось в среднем 78 пуд. с десятины.

Семенной работе станция уделяет громадное внимание. Корма лугового свойства преобладают над семенами полевого свойства. Ведутся переговоры с отделом сельскохозяйственной мелиорации о проведении целого ряда мелиоративных работ. Расширяется семенная уборка клевера. В прошлом году в этом отношении было сделано много ошибок, которые в этом году были избегнуты. Сераделла в этом году при неблагоприятных условиях дала все-таки хорошие результаты. Луг дает ежегодно очень большую прибыль. Десятина луга дает до 200 пуд. сена превосходного качества. Это доходная статья станции. Животноводство опытной станции представляется в следующем виде: на 1 октября 1923 г. составляло 111 голов крупного рогатого скота, из коих: 1) коров — 41, 2) телок 3,5 л.— 12, 3) телок 2,5 — 17, 4) телок 1,5 — 11, 5) быков-производителей швицкой породы — 2, 6) волов рабочих — 7, 7) волов 3—4 лет — 19, 8) быков 1,5 года — 1.

Удоя приходится в среднем на одну корову около 60 пуд. молока в год. В сравнении с прошлым годом удой повысился почти в 1,5 раза. За октябрь и ноябрь с. г. удой увеличился, что объясняется кормлением коров не грубыми кормами, а жмыхами, картофелем и корнеплодами.

Прибыль, полученная в этом году от молочного стада, была целиком поглощена содержанием подрастающего молодняка.

Количество лошадей на 1 октября с. г. составляет 27 голов, из коих 18 меринов, 2 жеребца, 4 кобылицы и 3 жеребят-сосунков. Это количество лошадей далеко недостаточно для полного обслуживания хозяйства, и поэтому некоторые работы совершаются наемным порядком, пользуясь сдельной работой крестьян, пришлых и местных.

Отсутствие средств является единственной причиной медленного прироста лошадей в хозяйстве.

Стоимость одного рабочего дня лошади, включая сюда амортизацию, сбрую, ковку, лечение, корм и т. п., составляет 1 пуд. 18 фунтов в ржаных единицах.

Приобретение лошадей, несмотря на выгодность этого дела, непосильно для опытной станции: не хватает средств.

Овцеводство в этом году дало прибыль. Всего овец и баранов на 1 октября с. г. числилось 102 головы на сумму 918 пуд.

Свиноводство в хозяйстве опытной станции только что зарождается. Всё внимание направлено на увеличение числа голов свиней, количество коих на 1 октября с. г. было 41 шт., в том числе: 7 маток, 2 борова, подсвинков 8 шт. и поросят 24 шт. Все свиньи йоркширской породы, вес их составляет 1295 пуд. Приплод, получающийся от свиней, разбирается, главным образом, окружающим населением, и лишь небольшое количество оставляется для себя.

Сад опытной станции был очень запущен. Несмотря на произведенные расходы по постройке изгороди, сад все-таки дал прибыль в 1192 пуд. Огород в 10 дес. дал прибыль почти в 1,5 раза большую, нежели сад.

Постройки все приведены в порядок. Сельскохозяйственный инвентарь тоже вполне отремонтирован, но перевозочных средств и повозок не достаточно.

Штат раньше состоял из 66 чел. Теперь же после сокращения осталось 46 чел. Несвоевременное сокращение штатов оказалось несколько убыточным, ибо приходится нанимать 3 девушек для поденной работы.

За октябрь — ноябрь с. г. имеется задолженность, объясняющаяся тем, что расходы на полеводство съедают всю прибыль от луговодства, сада и скотного двора.

Для увеличения доходности хозяйства опытной станции необходимо заняться сыро-

варением. Для организации этого дела Рогачевское УЗО дает котел. Это предприятие даст значительную доходность и еще больше упрочит положение молочного хозяйства.

Винокуренный завод сейчас не может быть пущен в ход из-за отсутствия спроса на спирт. Надо открыть крахмально-терочный завод. Это также даст большие доходы. Вообще отсутствие оборотных средств не дает возможности открывать многие предприятия, очень полезные и доходные.

Опытная работа станции свелась к тому, чтобы изучить сущность сельскохозяйственной работы целого ряда уездов района, примыкающих по естественно-исторической обстановке к Турской опытной станции. Варианты работы не особенно изучены вследствие отсутствия разработанных материалов. Опытное поле заболочено. Турская опытная станция не должна выращивать люпина, ибо Новозыбковская станция в этом отношении работает более успешно. Люпин должен сеяться не для промышленных целей, а только для нужд местного крестьянского хозяйства. Точно так же велись работы на опытном поле по разведению культур сераделлы и клевера.

Биологический питомник тоже проделал большую работу.

Зяблевая вспашка изучается в отношении ее выгодности для нашей песчаной почвы. Все эти темы представляют теперь животрепещущий интерес. Опыты применения минерального удобрения в этом году проводились по методу профессора Винера.

Для поднятия хозяйства Турской опытной станции на должную высоту необходимо: 1) построить крахмально-терочный завод, для чего нужна соответствующая денежная ссуда; 2) создание семенного севооборота луговых трав; 3) правильная организация рабочей силы. Это вопрос сложный и большой.

В Турске уже второй раз в этом году происходят пожары. Первый пожар был малоубыточным: сгорели куры и 30 пуд. хлеба. Второй же пожар причинил большие бедствия: сгорели гумно (120×200), молотилка, 1500 пуд. мякины, гречиха и т. д.

Это явление не случайное, а организованное, оно требует немедленного расследования.

ДА Гомельскай вобл., ф. 24. воп. 1, спр. 275. л. л. 271, 272.

СА СПРАВАЗДАЧНАГА ДАКЛАДА ГАРАДЗЕЦКАГА РК КП(б)Б ЗА ПЕРЫЯД З 1 КАСТРЫЧНІКА 1925 г. ПА 1 КРАСАВІКА 1926 г.

Политнастроение

...Рабочих в районе имеется незначительное количество, одобряют мероприятия Советской власти и партии.

...Отношение крестьянства в общем удовлетворительное, за исключением отдельных элементов, как-то: бывших служивых элементов, а также и часть принадлежащей к шерстинскому течению (церковь).

...В районе интеллигенция составляет почти исключительно учительство, которое почти все относится хорошо к Советской власти и партии и помогает проводить на местах мероприятия Советской власти.

Экономическо-хозяйственное состояние района

...В области промышленности

винзавод — 1, нефтяных мельниц — 1, ветряных мельниц — 40, из них работающих — 20, кирпичных заводов — 1, маслобоек — 8, крупорушек — 8, волночесок — 12 и 1 — на сукновалке, кузнецов — 24, кожевников — 5, портняжных — 28, сапожников — 28, столярных мастерских — 10, пряночников — 4.

...Инвентарь и сельскохозяйственные машины

Всех хозяйств по району — 4771

Населения — 25 849 душ

Молотилок паровых — нет

Косилок, жаток и сеялок имеются только в совхозе и артели;

плугов имеется в значительной части одноконные и железные даже в каждом хозяйстве

...бороны большей частью деревянные с железными зубьями

Земельные угодья:

площадь земли района — 46 440 десятин, пашни — 22 943 дес., сенокоса суходольного — 9000 дес., сенокоса заливного — 475 дес., под болотами, зарослями, водой и оврагами — 7753 дес., из коих болот — 1406 дес. находится под мелиорацией.

Скот-животноводство:
рабочих лошадей — 5996 голов, молодняка — жеребят — 942, коров — 8020 голов, волов — 19, овец — 5885 шт.
Район можно разделить на социальные группы в следующем порядке:
бедноты — 25 процентов, середняков — 67—68 процентов, кулацких хозяйств — 7—8 процентов.
Состав РК и организации КПБ:
С 18 октября 1925 г. выбран РК из следующих тт. Патанейко, Валовиков, Лагутков, Купреев, Силков и Порфененко и кандидатами к ним Подольцев и Шаповалов.
На 1-е октября было 16 членов и 10 кандидатов, на 1-е апреля имеется 17 членов и 26 кандидатов, а всего 43 человека, по социальному происхождению: рабочих — 7, батраков — 3, крестьян — 27 и служащих — 6, из них работают на своем хозяйстве 9 человек, а остальные на разных службах на районе.
Взаимоотношения ячейки с населением хорошие.
Рост партийцев в Городецкой ячейке был малый и проходил только за счет передачи комсомольцев в партию.

ДА Гомельскай вобласці, ф. 94, воп. 1, спр. 29.

Як гэта было

З гісторыі аднаго калгаса і аб лёсе яго стваральнікаў

У красавіку 1928 г. ў в. Балотні стварылі калгас. Сярод першых яго членаў былі Міхаіл Андрэевіч Жураўскі, яго брат Фёдар Андрэевіч, Аляксей Міхайлавіч Бозік, Лявон Мацвеевіч Дзядкоў. На першым жа сходзе старшынёй калгаса выбралі Фёдара Жураўскага, чалавека, які многа пабачыў у жыцці, верыў у справу Леніна і пад уплывам свайго брата Міхаіла стаў перакананым камуністам.

Дваццаць пяць сялянскіх двароў увайшлі ў калектыўную гаспадарку, якой аднагалосна далі імя Леніна. У той час у калгасе было 20 плугоў, 25 драўляных барон, 25 коней, 15 кароў. Але спачатку ўсе работы даводзілася выконваць уручную. Восенню таго ж 1928 г. калгаснікі кінулі ў зямлю першыя зярняты. Першы калектыўны ўраджай — сапраўднае свята. Больш як сотню пудоў здалі дзяржаве (у першы год існавання калгаса хлебапастаўка яму была даведзена на льготных умовах), засыпалі насенны фонд.

Асноўная маса сялян уступіла ў калгас у 1932—1933 гг. Больш арганізавана праводзіліся ўсе калгасныя мерапрыемствы. Калгас набіраў сілу. У 1934 г. на палях гаспадаркі з'явіўся першы трактар «Фардзон». У 1936 г. калгас набыў аўтамашыну ГАЗ—АА. Але вадзіць яе не было каму, таму запрасілі на аўтамашыну Марчанку з Новых Журавіч, якога ўсе паважалі як майстра сваёй справы.

Многія з сельскіх актывістаў былі накіраваны на вучобу. Так, Курылаў Пракоп вучыўся у Ленінградзе на палітычных курсах, Лявон Дзядкоў скончыў Мінскі медінстытут і потым стаў вядомым на ўсю акругу ўрачом.

* * *

1935 г. стаў драматычным для старшыні балатнянскага калгаса Ф. А. Жураўскага. Аднойчы ноччу за ім прыйшлі... Міліцыянер загадаў збірацца. Аператыўная група распачала вобыск: спачатку ў куфры перавярнулі ўсё адзенне, памацалі ў куце за абразом, потым пайшлі ў кладоўку. Нічога не знайшоўшы, загадалі ісці з імі ў машыну. У Старых Журавічах супрацоўнікі ДПУ спачатку прапанавалі Фёдару Андрэевічу «ўсё расказаць». але расказваць не было чаго. Жураўскага этапавалі ў Магілёў. Тут Фёдар Андрэевіч зразумеў, што работнікі ДПУ імкнуцца знайсці ў яго асобе ворага народа, трыманне ў сырых казематах турмы сведчыла аб тым, што ён не скора выйдзе адтуль на волю. Праўда, фактаў, якія ганьбілі б Жураўскага, не было, допыт таксама не даў падстаў для абвінавачвання. Тады следчыя органы ўзяліся за яго брата — Міхаіла Андрэевіча. Але і тут у іх нічога не атрымалася. Работнікам следчых органаў «працаваць» з «вельмі адукаваным настаўнікам», як яны называлі Міхаіла Жураўскага, было яшчэ горш. Міхаіл Андрэевіч выклаў абгрунтаваныя факты невінаватасці брата і самога сябе. Яго лагічныя довады ставілі следчых у тупік. Тады братоў пасадзілі ў такі сыры і цёмны склеп, што, здавалася, гэта — магіла. Міхаіл захварэў на дызентэрыю. Следчыя органы вымушаны былі адправіць яго на лячэнне, бо ведалі, што ад гэтай хваробы

рэдка хто вылечваўся. Падследны дабіўся дазволу, каб яго лячылі ў Доўскай бальніцы — усё ж бліжэй дадому. Калі і пакіне гэты свет, дык пахаваюць у роднай вёсцы. Але Міхаіл перамог хваробу і вярнуўся дадому жывым.

Амаль год не было ніякіх вестак ад Фёдара Андрэевіча, і толькі ў жніўні 1936 г. родныя даведаліся, што ён памёр ад запалення лёгкіх.

Няшмат часу было адведзена пражыць і Міхаілу. Ён загінуў у час вайны. Разам з іншымі патрыётамі яго расстралялі фашысты ў Старых Журавічах ва ўрочышчы «Барок» у 1942 г.

А. Зайцаў.

«Свабода»

З успамінаў Андрэя Харытонавіча Кордзікава

Настаў 1929 год. У вёсцы Гарадзец пачала арганізоўвацца калектыўная гаспадарка, якой спачатку далі назву «Свабода». Гэта быў надзвычай цяжкі і трывожны год. Жыхары вёскі, як беднякі, так і заможныя, не разумелі гэтай новай сістэмы гаспадарання. Яны вагаліся — ісці ў калгас ці не. Не зусім разумелі сваіх абавязкаў і многія актывісты калгаснага руху. У некаторых выпадках яны гналі жыхароў у калгас сілай, а тыя, хто супрацьлягалі высылцы разам з кулакамі. Нямала было выпадкаў, калі высылалі людзей далёка не з кулацкага асяроддзя. Гэта былі тыя, хто сваім потам і мазалём паднялі на больш высокі ўзровень сваю ўласную гаспадарку. Такіх выпадкаў было нямала. Аднак калгас быў арганізаваны. Гаспадарка не давала станоўчага эфекту. Адсутнічала належная тэхніка для апрацоўкі зямлі. Асноўнымі прыладамі працы былі плуг і барана. Зямля пусцела, ураджаі зніжаліся. За сваю працу мы, калгаснікі, у той час атрымлівалі не кілаграмы, а грамы зерня. Асабліва цяжкім быў 1933 год, калі мы за сваю працу нічога не атрымлівалі. У вёсцы панаваў голад. Памятаю, як за буханкай хлеба я ездзіў у Гомель, дзе прастаяў у чарзе цэлыя суткі. У цэнтры вёскі быў хлебны ларок, але хлеб тут маглі атрымаць толькі жыхары, якія жылі ў цэнтры вёскі. Нам, хутаранам, хлеб купіць амаль не даводзілася...

«Маладая гвардыя»

З успамінаў Еўдакіі Парфенаўны Кірэйшынай

Камуна «Маладая гвардыя» была створана ў Меркулавічах на былой памешчыцкай зямлі ў 1929 г. Вясной 1929 г. са Збарова туды накіравалі камсамольцаў. Гэта былі адны маладыя хлопцы. Раённае начальства ведала, што ў гэтых хлопцаў-камсамольцаў не ўсё ладзілася, што ім было вельмі цяжка пачынаць агульную гаспадарку.

Для ўмацавання камуны Мацко (пасаду дакладна не памятую) вырашыў накіраваць у Меркулавічы майго мужа — Дзмітрыя Ягоравіча Кірэйшына, 1893 года нараджэння. Выбралі яго таму, што ён восем гадоў праслужыў на флоце — 4 гады да рэвалюцыі і 4 пасля яе, і ў раёне палічылі, што ён можа арганізаваць работу ў камуне.

Да таго часу ў нас ужо быў свой зруб — рыхтаваліся закончыць яго і да зімы перайсці ў сваю хату. Але муж не адмовіўся ад прапановы ехаць у Меркулавічы. Яго і ў арміі, і пасля дэмабілізацыі палічылі актыўным і свядомым.

Для ўступлення ў камуну трэба было ўнесці пай. Мы тады ад сям'і аддзяліліся і атрымалі сваю долю: карову, частку мяса, сала, 3 мяшкі жыта, прадалі свой зруб у Збарове і ўнеслі пай 120 рублёў. Тое, што засталося, забралі з сабой.

Кіраваў камунай Мікалай Фёдаравіч Аляксееў. Ён лічыўся старшынёй куста, хаця жыў у Асінаўцы і працаваў там настаўнікам, а ў камуну толькі наведваўся. Пастаянна за старшага ў камуне быў мой муж.

У Меркулавічах нам далі хату (у нас ужо было трое дзяцей). Прыехалі мы туды глыбокай восенню. Камунары ўжо ўбралі бульбу. Але, акрамя бульбы, у іх не было чаго есці, яны галадалі. З нашым прыездам становішча палепшылася. Са сваёй мукі я пякла на ўсіх хлеб, гатавала абед, запраўляла яго тым, што прывезлі мы са Збарова. Карова давала крыху малака. Сяк-так дажылі да вясны.

Пачалася новая пасяўная. Для камуны выдзелілі 12 кароў, якіх прыгналі з яўрэйскай арцелі з Вікова. Пачалі гадаваць цялят. З бульбы рабілі крухмал і здавалі дзяржаве. Адходы ішлі на корм каровам. Жыць стала больш сытна, але і работы прыбавілася. Я не магла ўправіцца і з кух-

няй, і са скацінай. Хлопцы павінны былі вучыцца даіць кароў, хаця гэты занятак ім не падабаўся. Але выйсця іншага не было. Даілі па чарзе.

Мясцовае насельніцтва пазбягала нас, як чумных. Калі хто-небудзь з камунараў заходзіў у краму, мясцовыя хутка адтуль выходзілі. Ідучы ў царкву праз камуну, яны абыходзілі нас стараной. Я ж старалася задобрыць іх, быць з імі ласкавай. Калі яны ішлі ў царкву ў вялікае свята, я давала ім хустку, каб паклалі ад мяне. На вечарынкі да нас мясцовыя дзяўчаты не хадзілі, і нашым хлопцам не было з кім танцаваць. А вечарынкі мы наладжвалі, калі прыязджаў Мікалай Аляксееў. Ён вельмі добра граў на гармоніку, умеў развесяліць, падняць настрой.

Пазней некаторыя хлопцы ўсё ж ажаніліся, у асноўным прывозілі дзяўчат са свайго краю.

У ліку першых камунараў былі: Раман Паўлавіч Сімакоў, Яфім Сталяроў, Дзмітрый Аляксееў, Пётр Аляксееў, Цімафей Бобыраў, Фёдар Анісаў, Фёдар Шмацікаў, Павел Осіпаў, Сяргей Карпаў, Антон Краўцоў, Ігнат Сімакоў і мы з мужам. Пазней уступіў у камуну Іван Аляксееў.

Потым пайшлі ў камуну і мясцовыя жыхары з хутароў, з навакольных вёсак. Мой муж умеў іх агітаваць. Ён быў адукаваны, шмат кніг чытаў. Ён фактычна кіраваў камунай і тады, калі старшынёй яе прыслалі 30-тысячніка з Быхава тав. Хальчыцкага. Той быў гараджанін, не ведаў сельскай гаспадаркі, ва ўсім раіўся з мужам.

У 30-я гады пачалося стварэнне калгасаў. «Маладая гвардыя» была пераўтворана ў калгас. Відаць, камуна мала прыбытку давала дзяржаве. Хутаране, што ўступілі ў яе, не хацелі працаваць, чакалі толькі званка на абед.

З камуны перайшлі ў калгас Фёдар Анісаў, Фёдар Шмацікаў, Дзмітрый Кірэйшын і іншыя. Некаторыя ж вярнуліся тады дамоў у Збароў.

Мы яшчэ заставаліся ў Меркулавічах некалькі гадоў (прыкладна да 1937 г.). Магчыма, мы не паехалі б адтуль. Але калі камуну пераўтварылі ў калгас, дамы, у якіх жылі камунары, нам прапанавалі выкупіць. За нашу старую хату трэба было заплаціць 200 рублёў. Нам было крыўдна, ды і не пад сілу заплаціць такую вялікую суму.

У гэты час мужа пачалі ўгаворваць вярнуцца ў Збароў, абяцалі даць для хаты ёўню (пры свірне, дзе сушылі снапы для малацьбы) раскулачанага аднавяскоўца. Ён згадзіўся вярнуцца ў Збароў.

Час тады быў складаны і цяжкі. Крыўды было шмат. Не раз палілі ўладанні тых, каму штосьці дасталося з пабудоў раскулачаных, хаця ўладанні гэтыя былі ў асноўным накшталт выдзеленай нам ёўні (свірны, хлявы, дамы забіралі пад калгаснае карыстанне). Усё гэта распальвала варожасць паміж аднавяскоўцамі. На мужа ўзвялі паклёп. У даносе так прадставілі справу, быццам мы ў камуне нажыліся, прысвоілі сабе там нейкія прыбыткі дзяржаўныя. Ніхто не ўспамінаў, што мы зрабілі для камуны за ўсе гады і для калгаса таксама. Тыя, хто ведаў праўду, абараніць нас не змаглі.

Арыштавалі мужа ў верасні 1937. З Амурскай вобласці я атрымала ад яго пісьмо, адправіла яму пасылку, але яе вярнулі разам з паведамленнем, што ён памёр. Мацко і яго сакратара тады таксама арыштавалі. Пазней мужа рэабілітавалі, але гэта паведамленне дзесьці згубілася.

Засталася я без мужа. На руках пяцёра дзяцей. Меншаму споўніўся тады годзік. Малога з сабой насіла на ферму. Пасля камуны 10 гадоў у Збарове працавала даяркай. Усе работы выконвалі ўручную. Заработкі былі нізкія.

А потым пачалася вайна, бяда была з усіх бакоў. Старэйшы сын Рыгор, 1925 года нараджэння, добраахвотнікам пайшоў на фронт у 1941 г. Прызываўся ваенкаматам у Турску. Пасля шпіталя прыслаў пісьмо з Венгрыі. Быў танкістам. Загінуў у самым канцы вайны.

Гаравала да старасці. У калгасе працавала да 65 гадоў. *Запісала А. Сіліна.*

На жыццёвых скрыжаваннях

З успамінаў жыхара в. Доўск К. Зайцава

Мой дзядуля Якаў Зайцаў, жыхар в. Званец, быў селянінам-серадняком. Ён меў некалькі дзесяцін зямлі, коней і іншую жывёлу, прылады працы і ветраны млын. Былі ў яго сыны Фёдар, Дзмітрый і Астап. Дзмітрый, мой бацька, 1894 года нараджэння — удзельнік першай сусветнай вайны. У адным з баёў ён трапіў у палон да аўстра-венгерскіх салдат. З палону вярнуўся на радзіму. Заняўся земляробствам.

У перыяд калектывізацыі ў в. Званец падлягалі раскулачванню Якаў Зайцаў, Давыд Белагрыўцаў, Фёдар Белагрыўцаў і Майсей Сямёнаў. За якія грахі? Ды ніякія. Мой дзядуля Якаў, напрыклад, за

ветраны млын, які сам жа пабудаваў. Яго абвінавацілі ў тым, што за памол браў з сялян плату. Але ён не быў эксплуататарам. Малоў зерне сялянам асабіста сам, без найму работнікаў, і браў за памол плату зернем у невялікіх памерах.

У сялян дзядуля карыстаўся павагай і як чалавек, і як старанны селянін. Праца ваў ён з сынам і нявесткай на сваёй зямлі з раніцы і да вечара. Мне тады было тры гады, але і цяпер памятаю дзядулю, які працаваў на млыне, як аднойчы трымаў мяне на руках.

Дык вось Якава, Давыда, Фёдара і Майсея раскулачылі і выслалі. Аднавяскоўцы ўабунтаваліся, расказваў відавочца Цімафей Драчоў, і працівіліся адпраўцы землякоў у ссылку. Але іх уціхамірыла міліцыя, выкліканая з раёна мясцовай уладай. Нас таксама выслалі. Маці ўзяла з сабой толькі мяне, як малога, а Валодзю і Ваню пакінула ў сяцёр. Памятаю, плылі на параходзе па рацэ. Маці, трымаючы мяне на руках, плакала ад гора, ад таго, што іх разлучылі са сваякамі і радзімай. Спрабавала кінуцца ў ваду і ўтапіцца. Бацька вырваў мяне з яе рук і сказаў: «Дзіця не вінавата, а ты тапіся, калі жыць надакучыла».

Плылі мы доўга, потым ехалі эшалонам з іншымі перасяленцамі. Прывезлі нас ў нейкі катлаван і высадзілі. Гэта было ў красавіку 1930 г. Холадна. Навакол горы, снег. Мясцовасць — Хібінагорская тундра.

Тут у гарах быў знойдзены апатыт. Распрацоўвалі руду сяляне, сасланыя сюды пад выглядам класавых ворагаў. Але ў большасці гэта былі сераднякі і нават беднякі. Так, у бараку пражывала мнагадзетная сям'я Івановых. Мой сябра Лёнька гаварыў нам, што яны з беднаты і што іх саслалі за тое, што бацька заступіўся за сваяка, якога залічылі ў спісы ссыльных. Адным словам, пакаралі за сабатаж мерапрыемстваў Савецкай улады. Пасяліліся мы ў чорных шалманах, накрытых толлю, непадалёку ад возера Вудзявор. У памяшканнях цесна, холадна. Абаграваліся «буржуйкамі». Восенню нас перавялі ў барак, які стаяў паблізу лесу і гор. Доўгі, драўляны, з двума ганкамі, з шырокім калідорам, кухняй і пакоямі з пячным ацяпленнем ён стаяў на рагу вуліц Будаўнічая і Нагорная. Лучына, свечка, газавая лямпа — вось чым асвятлялася памяшканне. А калі ў 1933—34 гадах на возеры Вудзявор пабудавалі гідраэлектрастанцыю, і ў нас засвяцілася электрычная лямпачка. Ежу пасяляне гатавалі на пліце, прымусах, газніцах. Жыльцоў пастаянна трывожылі клапы і іншыя насякомыя. Часам санітары пры выяўленні інфекцыйных захворванняў накладвалі на барак каранцін на 2—3 тыдні. Пакуты пасялян збліжалі і раз'ядноўвалі іх. Маё бацькі і сям'я Грэчкіных туліліся ў адным пакойчыку і часта сварыліся. Не ладзілася і ў іншых сем'ях. Толькі дарослым усвядоміў я прычыну гэтых сварак. Злосць «лішэнцаў» брала пачатак з іх крыўды, адарванасці ад сваіх родных месцаў і сялянскага жыцця.

Маці мая не змагла перажыць такога адлучэння. І калі ішла з грудным дзіцём у лячэбніцу на чыгункі, трапіла пад цягнік. Здарылася гэта ў снежні 1933 г. Мне было шэсць гадоў. Я гуляў з хлопцамі ў калідоры. Раптам з вуліцы прыбегла Пецька Волкаў і ўсхвалявана сказаў: «Тваю маці поездам зарэзала, Косця!». Я заплакаў і пайшоў сказаць аб гэтым бацьку. Бацька замітусіўся, хутка апрануўся і пайшоў да месца здарэння. Я плакаў, рваўся на вуліцу. Але жанчыны трымалі мяне, суцяшалі. Хутка вярнуўся са слязьмі на вачах бацька: «Якое няшчасце, Косцік!..». Машыніст, які вёз руду на фабрыку, расказваў: «Бачу, ідзе жанчына з дзіцём на руках. Сігналю, не зварочвае. А цягнік на хаду не спыніш...».

Загінула маці. А Алёша ўцалеў. Праўда, і ён хутка памёр без маці.

Пахаваў бацька маці на 16-м кіламетры. Колькі тут на могілках крыжоў! Гэта ўсё ахвяры сталінскай палітыкі.

Пасля забойства С. М. Кірава Хібінагорск перайменавалі ў Кіраўск. Будаваўся ён на касцях «лішэнцаў». Хлапчуком я хадзіў у фабрычную сталовую і бачыў, у якіх цяжкіх умовах рабочыя апатытавонефелінавай абагачальнай фабрыкі малолі руду на канцэнтрат. Грукат барабанаў, пыл. Немагчыма перагаворвацца без рупара, а ўсе фігуры рабочых белыя ад пылу. Рабочыя глухлі ад шуму, нажывалі сілікатную хваробу. І мой бацька да канца жыцця дрэнна чуў.

У 1937—38 гг. пайшоў па хатах «хапун». З нашага барака рэпрэсіравалі як ворага народа Іголкіна, Волкава. А мы, дзеці, не разумелі тады сутнасці рэпрэсій і ўспрымалі хлусню за праўду. Памятаю, на сценах калідора віселі партрэты палкаводцаў грамадзянскай вайны Блюхера, Тухачэўскага, Ягорава. Калі мы даведаліся, што яны ворагі народа, то расстрэльвалі іх каменьчыкамі з рагатак.

Усё ж горад рос, будаваўся. Узвялі лазне-пральны камбінат, пошту, сталовую, магазіны, гастраном, гасцініцу, кінатэатр «Бальшавік», бальніцу, амбулаторыю, аптэкі, дзве сярэднія школы, дзіцячыя сады, Дом піянераў, адміністрацый-

на-вытворчыя аб'екты. Будавалася, абнаўлялася жыллё. Наш барак пасля капітальнага рамонту пабялілі і пафарбавалі. Пасля адмены картачнай сістэмы палепшылася жыццё і кіраўчан. У 1938 г. на паліцах магазінаў было багацце разнастайных прадуктаў. Але купіць іх было цяжка. Грошы зарабляліся нялёгка. Затое не хапала прамтавараў. Матэрыю давалі па талонах гарсавета. Не хапала і школьных падручнікаў, сшыткаў, паперы.

У 1937 г. мой бацька ўзяў у жонкі Кацярыну. Мачаха дабрынёй не вызначалася. Але я называў яе мамай. Вучыўся ў пачатковай школе. У тым жа годзе бацька ў час водпуску паехаў на Беларусь і прывёз у Кіраўск сына Івана, а Уладзімір у 1939 г. прыехаў сам. Браты ўладкаваліся: адзін пачаў працаваць паркетчыкам на дрэваапрацоўчым заводзе, другі — слесарам-водаправодчыкам на фабрыцы. Яны былі рады, што прыехалі ў Кіраўск, бо на радзіме галадалі. У калгасах жылося цяжка. Іван вадзіў сляпых старцаў жабраваць, не вучыўся, жыў у цёткі Пёклы ў в. Званец. Не лепш жылося і Уладзіміру ў Каўтуновых у в. Шапчыцы. Сіроты шчаслівымі не бываюць. Ды і я, жывучы з бацькам, заўсёды хацеў есці, у іншыя дні сядзеў галодны. Не, бацька мой не быў п'яніцам. Атрымае зарплату, накупіць ласункаў, растранжырыць грошы за 15 дзён, а паўмесяца — галадаем. Нават мачаха праз паўгода пакінула нас.

У Вялікую Айчынную вайну братоў прызвалі ў Чырвоную Армію, а нас з бацькам у жніўні 1941 г. эвакуіравалі ў пасёлак Уксора Шэнгурскага раёна Архангельскай вобласці. У 1943—44 гадах там я закончыў ФЗВ і па накіраванню працаваў у Мезені кавалём, а 2.11.1944 г. быў таксама мабілізаваны ў армію. Так стаў я ўдзельнікам вайны. Іван загінуў на фронце, а Уладзімір дэмабілізаваўся і прыехаў у Кіраўск за бацькам. Потым разам мы выехалі на Беларусь.

Пасля армейскай службы я жыў то ў бацькі, то ў брата, працаваў на льнозаводзе, вучыўся ў вячэрняй школе рабочай моладзі. Потым скончыў Мінскі педінстытут імя А. М. Горкага. Атрымаў дыплом настаўніка гісторыі і грамадазнаўства, але ў школе не працаваў па інваліднасці.

Калі аналізую пройдзены жыццёвы шлях, то адчуваю, што ярлык сына кулака вісеў над маёй галавой як дамоклаў меч і пасля вайны.

Рагачоўскі раён у 1930-я гады

Тэрыторыя раёну разьмяшчаецца паміж 52°51′ і 53°19′ паўночнай шырыні і 29°38′ і 30°44′ усходняй даўжыні ад Грынвіча. Раённым цэнтрам зьяўляецца горад Рагачоў.

Праз раён праходзіць Ленінград-Адэская чыгунка. Чыгуначная станцыя Рагачоў знаходзіцца пры самым горадзе. Горад стаіць на правым беразе Дняпра пры ўпадзенні ў яго ракі Друць.

У склад раёну ўваходзіць 26 сельсаветаў. Раён мяжуецца на поўначы з Быхаўскім раёнам, на ўсходзе — з Кармянскім, Чачэрскім і Буда-Кашалёўскім, на поўдні — з Жлобінскім і на захадзе з Бабруйскім.

Тэрыторыя раёну займае 212.469 га зямель с.-г. прызначэння — 72,3 %, лясоў — 27,2 %. З зямель с.-г. прызначэння ўжыткоўнай 141.224 га — 91,9 % і няўжыткоўнай ...—8,1 %. Усяго насельніцтва ў раёне налічваецца 103.845 чалавек, з іх беларусаў — 85,69%, яўрэяў — 9,32%, палякаў — 0,60 %, рускіх 3,97 %, украінцаў — 0,20 %, латышоў — 0,03 % і іншых нацыянальнасьцяў — 0,21 %.

Па тытульнаму сьпісу 1931 г. у раёне налічвалася 74 прадпрыемствы, з агульнай колькасьцю рабочых — 504. Сярод прадпрыемстваў былі: электрастанцыя — 1, тарфяных арцеляў — 8, арцель па вырабу гадзіннікаў — 1, кавальскіх арцеляў — 3, смалакурных — 1, цагельняў — 7, лесазавод — 1, арцель па апрацоўцы лазы — 1, сукнавальных — 3, рымарных — 1, шавецкіх — 2, кравецкіх — 1, кардонная фабрыка — 1, млыноў вадзяных — 2, паравых — 2, нафтавых — 9, ветраных — 24, хлебапякарняў — 2, бровараў — 2, іншых арцеляў — 2. Значная частка дробных прадпрыемстваў да пачатку 1932 г. спыніла сваю дзейнасць.

У 1932 г. па раёне існавала 16 дзяржаўных, 18 коопэрацыйных і 1 грамадзкае, а ўсяго — 35 прамысловых прадпрыемстваў. З іх знаходзілася ў падпарадкаванні Наркомцяжпрому — 1, НКЛесу — 1, НКСнабу — 5, НКЗему — 6, РВК і Гарсавету — 3, прамкоопэрацыі — 18, грамадзкіх арганізацый — 1. Пэрсонал усіх гэтых прадпрыемстваў на 1/XII—32 г.—1511 адзінак, у тым ліку рабочых (бяз вучняў і МАП) — 1284, служачых — 136; акрамя таго працуючых па хатах было — 2 чал. Сярэдняя колькасьць рабочых за першае паўгодзьдзе 1932 г. складала 1283. Сума асноўных фондаў на 1/1.33 г. была — 1.420.131 р. Калі валавая продукцыя ў

аптова-адпускных цэнах адпаведнага году за 1931 г. складала 3.827.231 р., то толькі за першае паўгоддзе 1932 г. яна ўжо складала 2.100.486 р.

Чатыры прадпрыемствы мелі рухавікі. Найбольш буйнымі прадпрыемствамі раёну ў 1932 г. зьяўляліся: электрастанцыя ў г. Рагачове; рабочых у сярэднім за паўгоддзьдзе 1932 г.—15; валавая прадукцыя за гэты ж час у цэнах 1926—27 гг.—58.842 р. Арцель «Чырвоны Кастрычнік» у м. Гарадзец; рабочых — 63, валавая прадукцыя — 30.320 р. Лесазавод імя Халтурына ў г. Рагачове; рабочых — 310 і валавая продукцыя (піламатэрыялы) — 1.797.849 р. Швэйная арцель у г. Рагачове; рабочых — 61, валавая продукцыя — 284.846 р. Арцель імя XVII МЮД'у ў г. Рагачове; рабочых — 65, валавая прадукцыя (адзеньне) — 58.200 р. Кардонная фабрыка ў г. Рагачове; рабочых — 142 і валавая продукцыя — 673.000 р. Бровар у саўгасе Дзелава: рабочых — 24 і валавая продукцыя — 337.647 р. Арцель «Аб'яднаньне» у г. Рагачове; рабочых — 54, валавая продукцыя (абутак) — 119414 р. Спажывецкая коопэрацыя раёну мае 23 сельпо з гандлёвай сеткай у 85 адзінак, пайнікаў спажыўкоопэрацыі налічваецца — 26.441.

У раёне выяўлены наступныя карысныя выкапні і розныя гліны ў вв. Лучын, Фалевічы, Верачыва, Доўскі, уроч. Чарамінскае; суглінкі — у вв. Канапліцы, Дзераны, Дадамыслі, Рэкты, Кашэры і г. Рагачоў; пяскі розныя — у в. Бабенкі, валуны крышталёвыя — у в. Блізняцы; крэйды — Кісьцяні, у г. Рагачове і значныя запасы торфу на плошчы 4.407 га балот. Сельская гаспадарка раёну спэцыялізуецца ў жывёлагадоўча-бульбяным напрамку.

У раёне ёсць 5 саўгасаў: Красьніца — са сьвінагадоўчым напрамкам гаспадаркі, з агульнай колькасьцю сенапахаці — 696,38 га, і пагалоўем буйной рагатай жывёлы — 54, сьвіней — 686 і коняй — 49. Дзедлава — з малочным напрамкам, сенапахаці — 831,35 га і пагалоўя буйной рагатай жывёлы — 172. Ціханічы — з малочным напрамкам, сенапахаці — 1187,89 га і пагалоўя буйной рагатай жывёлы — 349. Пабелава Забалоцьце з насеннаводным ухілам, сенапахаці — 815,15 га, пагалоўя буйной рагатай жывёлы — 229, сьвіней — 14 і коняй — 104. Турок — насеннаводны — 729,55 га сенапахаці.

У раёне ёсьць 15.190 гаспадарак, з іх на 1.1.33 г. колектывізавана — 24,7 %; усяго ў раёне 116 колгасаў, якія аб'ядноўваюць 26,3 % сенапахаці раёну. У колгасах ёсьць наступныя фэрмы: сьвінаводнатаварных — 75, з агульнай колькасьцю пагалоўя на 20/XII—32 г.—2166, малочна-таварных — 42, з пагалоўем на 20/XII—32 г. 4313, па вырашчванні маладняка (цялят) — 13,3 пагалоўем на 20/XII—32 гг.—456 і коняводных — 3, з пагалоўем — 165.

Трактарны парк МТС складаецца з 28 адзінак, агульная магутнасць якіх 420 НР. МТС абслугоўвае 61 колгас.

У раёне па колгаснаму сэктару ёсьць наступная колькасць складаных с.-г. машын, сенакасілак — 19, конных грабляў — 4, жняярак-самаскідак — 112, снапавязалак — 6, бульбакапалак — 4, сеялак радковых — 12, складаных малатарняў — 113 і па МТС складаных малатарняў — 11, сеялак 24-х радковых — 2. Пасяўная плошча раёну ў 1932 г. складала 6.865 га ў тым ліку пад зернавымі — 73 %, бульбай — 18,2 %, тэхнічнымі культурамі — 4,9 % і сеянымі травамі — 2,45 %.

Нарыхтоўкі ў 1932 г. с.-г. прадукцыі ў раёне на 1/II—33 г. далі наступныя лічбы ў тонах: ільнавалакна — 140, пянькі — 14,51, ільнанасеньня — 225,94, канапель — 22,36, саломы — 744.

План веснавой сяўбы на 1933 г. на раёне быў наступны:

Назва сэктараў	Усяго яравога кліну	Збожжа-зернавых культур	Тэхнічных разам, у т. л. ільну		Бульбы
Саўгасны	2293	839	20	20	368
Калгасны	12 500	6030	900	750	3400
Аднаасобны	30 929	17 207	2510	1850	8940
Іншых гасп. саўг. і калг.	—	524	—		12 850[1]
Разам	46 656	24 600	3430	2800[1]	

[1] Так у дакуменце (Рэд.)

У раёне на 1/I—33 г. існавала наступная сетка навучальных устаноў: 4-годак — 92, у іх настаўнікаў — 174 і вучняў — 8624; ФЗС — 9, у іх настаўнікаў — 52 і вучняў — 991, ШКМ — 22, у іх настаўнікаў — 130 і вучняў — 3956. Процант пісьменнасці па раёне сярод падлягаючых навучаньню складае 83,5.

Партарганізацыя раёну складаецца з 47 ячэек, з агульнай колькасцю камуністаў — 540, з іх членаў КП(б)Б — 378, кандыдатаў — 168. Комсамольская арга-

нізацыя налічвае 61 ячэйку, з лікам членаў — 825.

У раёне працуе палітаддзел, арганізаваны пры Рагачоўскай МТС.

У раёне выходзіць газета «Камунар», тыраж якой 8000 экз.

Друкуецца па кн.: Усе раёны БССР. Мн., 1933. С. 320—323.

Такім быў Гарадзец

З успамінаў былога дырэктара Гарадзецкай школы Фёдара Юр'евіча Касіноўскага

Калісьці ля мястэчка Гарадзец, дзе зараз пралягла канава для сцёкаў веснавой паводкі, цякла рака Ржаўка. Праз раку быў перакінуты мост. Па абодва бакі ад моста берагі ракі былі пакрыты зараснікамі вольхі і вербалозу. Гэта былі вельмі прыгожыя мясціны. Першы квартал вуліцы пры ўездзе ў Гарадзец быў забудаваны старымі хацінамі з самымі разнастайнымі прыбудовамі. Ніводнага зялёнага дрэўца, а ні якага агародчыка ці кветачкі перад дамамі на вуліцы не было.

Усе дамы-хаціны як бы счэплены адзін з адным, якое кацяня магло б прабегчы ўвесь квартал, не кранаючыся зямлі. У гэтым квартале жыла беднота былых гандляроў яўрэйскай нацыянальнасці.

Пры ўездзе на базарную плошчу злева знаходзіліся будынкі пошты, аптэкі, халупа-развалюха Гаўліна (карабейніка сельпо), яўрэйская школа, крама сельпо і царква. З правага боку былі старыя дарэвалюцыйныя, амаль прыйшоўшыя ў непрыгоднасць крамы дробных гандляроў і ў тарэц да іх прыстаўлены будынак шавецкай арцелі (на гэтым месцы цяпер Палац культуры).

Асноўная частка насельніцтва Гарадзецкага сельсавета жыла на хутарах, размешчаных па прасёлках на Стоўпню, Святое і Царкоўе.

Таму не цяжка меркаваць, якое значэнне мелі ў жыцці ўсіх жыхароў кірмашы. У час кірмашоў уся плошча мястэчка была запоўнена народам. Прыязджалі і прывозілі тавар з навакольных вёсак і хутароў, прадаваліся і вырабы местачковых майстроў. І чаго толькі не было ў продажы! Бочкі, цабэркі, начоўкі, посуд гліняны і драўляны, палатно і сукно хатняга вырабу, абутак ад лапцей да ботаў, а таксама гародніна, садавіна і зерне.

Рагачоўскі калгасна-саўгасны тэатр

Па ініцыятыве Рагачоўскага райкома камсамола было вырашана стварыць на базе мясцовага драмгуртка тэатр. Уся трупа — восем чалавек. Адкрыццё адбылося ў верасні 1936 г. Мастацкім кіраўніком тэатра быў прызначаны А. Лізункоў. З 1 студзеня 1937 г. калектыў атрымаў афіцыйную назву — Рагачоўскі калгасна-саўгасны тэатр. У тым жа годзе трупа папоўнілася акцёрамі з БДТ-3[1] (Б. Савіч, Я. Гаробчанка, Н. Шклярэнка, А. Блажэвіч, Я. Мазурэнка, Г. Свірчэўскі і інш.). Прыход акцёраў, якія мелі пэўны вопыт работы, плённа паўплываў на дзейнасць калектыву. Трупа папоўнілася таксама акцёрамі з іншых тэатраў (Б. Талпега, М. Касая, А. Лявонава і інш.).

Шэфамі маладога калектыву сталі акцёры Рускага драматычнага тэатра БССР і яго кіраўнік У. Кумельскі. Практычная дапамога прафесійнымі кансультацыямі, дэкарацыямі, касцюмамі, рэквізітам спрыяла паляпшэнню працы тэатра. Наладзілася сувязь з вядомымі рэжысёрамі. Так, у прыватнасці, на пастаноўку «Шторму» У. Біль-Белацаркоўскага быў запрошаны К. Саннікаў.

Творча моцная трупа давала магчымасць ставіць складаныя спектаклі. Іх мастацкі ўзровень з пункту погляду рэжысуры і акцёрскага выканання вывеў калектыў на адно з першых месцаў сярод беларускіх калгасна-саўгасных тэатраў. У рэпертуары: «Агні маяка» Л. Карасёва, «Не ўсё кату масленіца» А. Астроўскага, «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага, «Дурная для іншых, разумная для сябе» Лопэ дэ Вэгі, «Бацькаўшчына» К. Чорнага, «У пушчах Палесся» Я. Коласа, «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка і інш.

На фестывалі ў Мінску былі паказаны «Ягор Булычоў і іншыя», «Дурная для іншых, разумная для сябе», «У пушчах Палесся». Найбольш высокую ацэнку атрымаў апошні спектакль.

У сваёй трактоўцы п'есы «У пушчах Палесся» (рэжысёр А. Лізункоў) тэатр арыентаваўся на спектакль БДТ-2. З дазволу драматурга, які разумеў усе цяжкасці

[1] Беларускі трэці дзяржаўны драматычны тэатр.

пастановачнага парадку, рагачоўцы крыху скарацілі п'есу і зрабілі так званы выязны варыянт для паказу ва ўмовах калгасаў, што, як адзначала крытыка, на жаль, адмоўна адбілася на стварэнні агульнай атмасферы, распрацоўцы некаторых сюжэтных ліній, асобных характараў (напрыклад, бабка Наста ў выкананні Д. Маскалёвай, Панас — В. Магідзіна). Акцёры тут пайшлі па лініі вонкавых эфектаў, не высвятляючы сутнасць персанажаў. Але гэта не перашкодзіла агульнаму станоўчаму ўражанню. Драматургія Я. Коласа дапамагла многім акцёрам раскрыць свае здольнасці, выявіць новыя рысы іх індывідуальнасцей. Поспех спектакля быў забяспечаны выкананнем галоўных роляў. Г. Свірчэўскі імкнуўся падкрэсліць непарыўную сувязь дзеда Талаша з роднай зямлёй, народам. Ён быў натуральны ў сваіх думках, паводзінах, адносінах да людзей. Акцёр шмат працаваў над вобразам, удасканальваў яго, прыслухоўваўся да заўваг Я. Коласа, які раіў акцёру, каб у яго Талашу «адчувалася тая агромністая сіла, якая адкрыта ў гэтым зборным вобразе разумнага беларускага селяніна».

Яркі вобраз Саўкі Мільгуна стварыў Я. Гаробчанка. Яго Саўка не проста вясковы п'яніца, гатовы за шклянку гаралкі прадаць уласную дачку, а і хітры мужык. Глядач запамінаў яго расхлістаную постаць, азылы твар, зласлівыя вочкі, што ўважліва сачылі за ўсім і ўсімі. І хоць Саўка часта трапляў у недарэчныя сітуацыі, акцёр ніколі не імкнуўся пасмяшыць публіку. Галоўнае для яго — паказаць хцівае нутро гэтага адшчапенца.

З поспехам выступілі ў ролях Дарвідошкі Б. Талпега, Букрэя М. Васілеўскі, Мартына Рыля Братаноўскі, Аўгінні Н. Шклярэнка.

Я. Колас увогуле станоўча паставіўся да спектакля. На сустрэчы ўдзельнікаў фестывалю з пісьменнікамі ў сваім выступленні ён заклікаў іх актыўна ўключыцца ў стварэнне новага рэпертуару для калгасна-саўгасных тэатраў. Ён зазначыў, што калектыву неабходна авалодаць новымі мастацкімі вяршынямі, падкрэсліў, што галоўны шлях — гэта вучоба.

Пры пастаноўцы спектакля «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка (рэжысёр Ю. Рашымаў) галоўная ўвага была скіравана на паказ непазбежнасці пагібелі тых, хто спрабуе шкодзіць Савецкай уладзе. Каб найбольш акцэнтаваць гэты момант, рэжысёр зрабіў шэраг купюр у п'есе. Былі скарочаны некаторыя сцэны, а таксама і дзеючыя асобы, у прыватнасці дзед Анісім. Скарачэнні ў тэксце адбіліся і на паўнаце характарыстыкі вобразаў Язэпа, Мірона Бокуця, Насці. Рэжысёр усю ўвагу сканцэнтраваў на вобразе Харкевіча. Акцёр Б. Савіч стварыў вобраз жорсткага і хітрага ворага. Акцёру важна было паказаць, што рухае яго нянавісцю, раскрыць прыроду такіх людзей. Ён знайшоў шэраг трапных дэталей, якія дапамаглі найбольш ярка раскрыць гэты характар. Запаміналіся Сцепаніда (М. Андрыевіч), Даніла (Падбярэзкін), Абабурка (А. Любімаў), Вырвіч (Я. Мазурэнка) і інш. «Спектакль,— адзначалася ў друку,— у цэлым робіць добрае ўражанне і з'яўляецца значным творчым дасягненнем Рагачоўскага калгасна-саўгаснага тэатра».

Плённым быў зварот да п'есы М. Горкага «Ягор Булычоў і іншыя» (рэжысёр А. Лізункоў), хоць калектыву і не ўдалося ў поўнай меры па-мастацку раскрыць філасофскую і псіхалагічную складанасць твора. Паказальна, што кожны новы спектакль маладога тэатра станавіўся сапраўднай школай сцэнічнага спасціжэння драматургіі, удасканалення ўласнага майстэрства. Народны артыст рэспублікі Дз. Арлоў даў высокую ацэнку многім акцёрам гэтага калектыву, адзначыў адметнасць іх індывідуальнасцей. Вось некаторыя яго ацэнкі: «Добрая і заўсёды тактоўная манера падачы вобраза ставіць Б. Савіча ў рад сапраўды каштоўных з добрай перспектывай акцёраў...»; «Абаяльны акцёр Я. П. Гаробчанка. Вельмі добра, што Я. Гаробчанка не звязвае сябе рамкамі пэўнага амплуа, а іграе ролі разнастайныя...». Дз. Арлоў лічыў перспектыўнымі «мяккага, простага, шчырага» Г. Свірчэўскага, цікавага характарнага акцёра А. Блажэвіча, яркага, «выразнага» Б. Талпегу, «пераканальнага і праўдзівага» М. Васілеўскага.

У асноўным тэатр жыў «на калёсах». На стацыянар вярталіся для рэпетыцый новага спектакля. Яго добра ведалі жыхары Оршы, Клімавіч, Чачэрска, Веткі, Крычава, Журавіч, Жлобіна, Асіповіч і іншых раённых цэнтраў, шматлікіх калгасаў і саўгасаў гэтых раёнаў.

Творчы ўзровень Рагачоўскага калгасна-саўгаснага тэатра дазволіў на яго базе стварыць Баранавіцкі абласны драматычны тэатр.

Друкуецца па кн.: Гісторыя беларускага тэатра. Мн., 1985. Т. 2. С. 413, 415.

З ПРАТАКОЛАЎ БЮРО РАГАЧОЎСКАГА РК КП(б)Б

15 студзеня 1937 г.

Тихонович Михаил Мих., в КП(б)Б с 1930 г., 1901 г. рожд., белорус, рабочий, зам. директора МТС.

Обвиняется в том, что 13.1.1937 г. в разговоре с коммунистами были выкинуты по поводу Сталинской Конституции контррев. фразы.

За проявление контррев. настроения; за нереагирование на контррев. разговоры в колхозе «Полымя», как классового врага, прикрывающегося партбилетом, исключить. Боровик Онисим Иванович, с 1934, 1898 г. рожд., белорус, служащий.

Зная о контррев. высказываниях особых колхозников к-за «Коминтерн» в связи с расстрелом троцкистско-зиновьевских бандитов, их не разоблачил, что свидетельствует о его примиренчестве к троцкистским элементам.

За притупление классовой бдительности и защиту классово-враждебных эл-тов исключить из рядов КП(б)Б.

Секретарь РК КП(б)Б (Вайнман)

ДА Гомельскай вобласці, ф. 87, спр. 54, л. 18, 53.

9 сакавіка 1937 г.

О АНТИПАРТ. ПОСТУПКАХ ЧЛЕНА ПАРТИИ СЕЧЕНОВА, О ФАКТАХ КОНТРРЕВ. ВЫСТУПЛЕНИЙ НА КОНСЕРВСТРОЕ

Прораб Келер организует рабочих немецкой нац-сти против рабочих белорусов, неоднократно высмеивал Белоруссию, она якобы находится на поводу Москвы; белорусы «неумытыя лапцюжники».

Нач. стр-ва Сеченов вел разговоры, что представителей райкома он не допустит на стр-во.

Парторг Любимов не принял своевременных мер. Отсутствует большевистская критика и самокритика.

Учитывая то, что т. Сеченов признал допущенные ошибки и дал слово исправить, ограничиться вынесением ему выговора.

ДА Гомельскай вобласці, ф. 87, спр. 54, л. 68—70.

19 ліпеня 1937 г.

Зеленко Гавриил Игнатьевич, в партии с 1927 г., 1896 г. рожд., белорус, уроженец д. Денисковичи Слуцкого уезда, учитель.

В н/в обвиняется в том, что на протяжении многих лет состоял в личных дружеских отношениях с врагом народа Голодедом, врагом народа Бенском (пьянки на квартире с Бенском и Вайнманом);

— поддерживал близкие связи с исключенным из партии ставленником Голодеда Пономаревым,

— как председатель райисполкома осуществлял в р-не вредительские действия (допущение анемии в колхозах, не принял мер к исправлению перегибов).

Скрыл от партии свое пребывание в период 1917—1919 г. членом Слуцкой уездной управы — исключить.

Кардаш Дементий Петрович, белорус, из кулаков. Директор Рогачевского пединститута.

Обвиняется: в обмане партии и скрытии от партии кулацкого происхождения, покрывание своего отца, бывшего эсером, активно боровшегося против сов. власти, засорил институт врагами народа и т. д.— исключить.

ДА Гомельскай вобласці, ф. 87, сп. 54, л. 186—187, 247.

Гартаючы падшыўкі

Па старонках раённай газеты «Камунар»

Пачала выдавацца са снежня 1918 г. Спачатку называлася «Известия Рогачевского уездного исполнительного комитета», з верасня 1919 г. «Известия Рогачевского ревкома», у 1920—1930 гг. «Заря коммуны», з жніўня 1930 г. «Камунар». У Айчынную вайну ў 1943—44 гг. выдавалася падпольна на акупіраванай тэрыторыі Беларусі. З 1992 г. называецца «Свабоднае слова».

28 верасня 1935 г.

АБ УВЯДЗЕННІ АДЗІНЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ РОЗНІЧНЫХ ЦЭН

На мяса і мясапрадукты трэці пояс — Менск гавядзіна сярэдняй упітанасці 1—3 сорта 7 р. 40 кап., 5 р. 80 кап., 4 р. 70 кап.
каўбаса чайная 1 с. 9 р. 80 кап.
—«—любіцельская 11 р. 80 кап.
—«—палтаўская 16 р. 50 кап.
Рыба за 1 кг чацьвёрты пояс — БССР
лешч марожаны 3 р. 30 кап.
вобла 2 р. 30 кап.
таран 1 р. 60 кап.
часцік 1 р. 20 кап.
селядзец 5 р.
івасі 4 р. 50 кап.
Другі пояс — БССР
цукар пясок за 1 кг 4 р. 50 кап.
—«—рафінад 4 р. 90 кап.

ЦЭНЫ ЗНІЖАНЫ

Па печанаму хлебу:

жытні хлеб за 1 кг па трэцяму поясу з 1 р. да 85 кап.
пшанічны хлеб з мукі 96 % памолу за 1 кг з 1 р. 10 кап. да 1 р., пшанічны хлеб з мукі 85 % памолу з 2 р. да 1 р. 70 к.

Па муцэ:

мука жытняя 95 % памолу за 1 кг з 2 р. 10 кап. да 1 р. 60 кап., пшанічная з 2 р. 25 кап. да 1 р. 80 кап., пшанічная 85 % памолу з 2 р. 80 кап. да 2 р. 40 кап.

Па крупах:

Па пшану 1 с. за 1 кг. трэці пояс з 2 р. 20 кап. да 2 р. 10 кап.
Па крупах грэцкіх з 4 р. 50 кап. да 4 р. 30 кап.
Па крупах перловых з 1-га па 4-ы з 3 р. 20 кап. да 2 р. 80 кап.
Па крупах ячневых з 1 р. 50 кап. да 1 р. 30 кап.
Па рысу 1 сорт з 8 р. да 6 р. 50 кап. 2 сорт з 7 р. да 5 р. 50 кап.
Масла жывёльнае другі пояс
салёнае за 1 кг 14 р.
несалёнае сладка-слівачнае 15 р. 50 кап.
маргарын сталовы 10 р.
бульба за 1 кг 25 кап. у г. Менск.

ПРАЦОЎНЫЯ РАГАЧОЎШЧЫНЫ АДНАДУШНА АДАБРАЮЦЬ ПРЫГАВОР ВЯРХОЎНАГА СУДА НАД ПОДЛАЙ БАНДАЙ ШПІЁНАЎ, ЗДРАДНІКАЎ РАДЗІМЕ, АГЕНТАЎ КРЫВАВАГА ФАШЫЗМА

XVI З'ЕЗД КП(б)Б

Рашэнні [illegible] чэрвеня адкрываюць... **Валкавіч** Тав. Валкавіч гаварыць аб актуальных... Менск... Пракуратуры Саюза ССР аб справе арыштаваных... шпіёнаў, здраднікаў радзімы і Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Грамадзянін... ўзнагароджаны... Валкавіч, што пралетарская дыктатура... тэрору... Ягоднай... Валкавіч... [illegible] з'ездзе КП(б)Б... Сталіна... буржуазна-нацыяналістычнай...

Са справаздачнымі... выступіў... ЦК КП(б)Б... Сталіна... Ён... [illegible] ...

Сёння... [illegible] ...

Прыгавор суда — прыгавор народа

Вынесены абгрунтаваны прыгавор Ласкім Прысутствам Ваеннай Калегіі Вярхоўнага Суда СССР здраднікам радзімы, з вялікай зацікаўленасцю і цвёрдай упэўненасцю ў правільнасці... калгасніцкай грамадскасці... „10-ты партызан". Рабочыя... калгаснікі... сабраліся ў клубах... каб абмеркаваць гэты прыгавор.

Іх выступленні поўны глыбокай нянавісці да... фашыстам — шпіёнам.

Здраднікі жадалі адзінаму... [illegible] ...

—Агідныя ворагі вужа... [illegible] ...—гаворыць калгаснік **Осіпаў**, — яны намагаліся... [illegible] ...

Гатага не могуць... [illegible] ...

Гатага не могуць рана душна... [illegible] ...

Іх выступленні поўны глыбокай нянавісці да... фашыстам — шпіёнам.

Здраднікі жадалі адзінаму... [illegible] ...

—Агідныя ворагі вужа... [illegible] ...—гаворыць калгаснік **Осіпаў**, — яны намагаліся... [illegible] ...

Гатага не могуць рана душна... [illegible] ...

Гатага не могуць раўна душна перамосціць ворагі. Нашым перамогі прыводзяць іх у вярэдзь. Ім... [illegible] ...

—Агідныя ворагі вужа... [illegible] ...—гаворыць калгаснік **Осіпаў**, — яны намагаліся... [illegible] ...

Гатага не могуць раўна душна перамосціць ворагі. Нашым перамогі прыводзяць іх у вярэдзь. Ім... [illegible] ...

Гатага не могуць раўна душна перамосціць ворагі. Нашым перамогі прыводзяць іх у вярэдзь. Ім іммунітэт чым небудзь нашкодзіць нам. Ад... [illegible] ...

—Агідныя ворагі вужа... [illegible] ...—гаворыць калгаснік **Осіпаў**, — яны намагаліся... [illegible] ...

Гатага не могуць раўна душна перамосціць ворагі. Нашым перамогі прыводзяць іх у вярэдзь. Ім іммунітэт чым небудзь нашкодзіць нам. Ад... [illegible] ...

Гатага не могуць раўна душна перамосціць ворагі. Нашым перамогі прыводзяць іх у вярэдзь. Ім іммунітэт чым небудзь нашкодзіць нам. Адзін... [illegible] ...

—Агідныя ворагі вужа... [illegible] ...—гаворыць калгаснік **Осіпаў**, — яны намагаліся... [illegible] ...

Гатага не могуць раўна душна перамосціць ворагі. Нашым перамогі прыводзяць іх у вярэдзь. Ім іммунітэт чым небудзь нашкодзіць нам. Адзін

3 кастрычніка 1935 г.

НОВАЯ ШКАЛА АТАВАРВАННЯ ХЛЕБАЗАКУПАК

Гутарка з загадчыкам гандлёвага аддзела райсаюза тав. Кучынскім.

На аснове рашэння дырэктыўных органаў установлена новая шкала прадажы тавараў для стымуліравання хлебазакупак у 1935 годзе... Так, напрыклад, калі раней набываючы аўтамашыну трэба было прадаць 100 тон хлеба, то зараз трэба прадаць усяго 33—35 тон хлеба ў залежнасці ад віда культуры. Для набыцця веласіпеда трэба здаць 3,5 цэнтнера хлеба ў той час, калі раней трэба было здаць восем цэнтнераў. За рубель прададзенага хлеба раней можна было купіць на рубель кровельнага жалеза, а зараз гэтага жалеза можна купіць на 2 рублі.

Для нашага раёна для стымулявання хлебазакупак у 4 квартале 1935 года будзе завезена 5 аўтамашын, 60 веласіпедаў, 18 аўтапакрышак з намерамі, 6 ружжаў, 10 боран «Зігзаг», 10 жатак-самаскідак, конныя граблі, малацілкі, сенакасілкі, жалеза кровельнага 3,5 тон, цвікоў будаўнічых 4,5 тон, 75 пар ботаў на скуранай падашве і іншыя тавары.

1 студзеня 1936 г.

УСТУПАЕМ У НОВЫ ГОД

Кардонная фабрыка імя Сталіна сустракае новы год вытворчымі перамогамі... Разам з ростам прадукцыйнасці працы выраслa і зарплата рабочых, па плану сярэдні заработак рабочага ў гадзіну павінен быў складаць 56,4 кап., а фактычна складаў 63,2 кап.—112 %.

Парторг Шульгін.

28 студзеня 1936 г.

РЭКОРДЫ ЛЕСАРУБАЎ МАСКАНАВА І СЕВАСЦЬЯНАВА

Лесарубы Азяранскага лесазагатоўчага ўчастку т. т. Масканаў Лявон і Севасцьянаў Пахом за 8 гадзін загатовілі ручной пілой 80,75 кубаметраў сасновага лесаматэрыялу — 621 проц. нормы. Яны зарабілі 44 руб. 64 кап.

15 сакавіка 1936 г.

ПАХОД У СУПРОЦЬГАЗАХ

12 сакавіка ячэйкай Асоавіяхіма лесазавода імя Халтурына быў арганізаван паход у супроцьгазах. У паходзе ўдзельнічала 35 чалавек, з іх трое даяўчат. Паход суправаджаўся духавым аркестрам. Пройдзены шлях раўняецца тром кіламетрам.

Канц.

21 сакавіка 1936 г.

СТАХАНАЎСКІ ДЭКАДНІК НА ЦІХІНІЦКІМ ВІНЗАВОДЗЕ

Праведзены стаханаўскі дэкаднік на ціхініцкім вінзаводзе даў добрыя вынікі. Дзесяцідзённы план перавыканан на 323 дэкалітры. Зараз на заводзе аб'яўлен стаханаўскі двухдэкаднік.

ПАПЯРЭДЗІЛІ АВАРЫЮ

17 сакавіка на электрастанцыі лопнулі трубы ў паравым катле, што пагражала астаноўкай станцыі. Каб папярэдзіць аварыю, рабочыя станцыі т.т. Нікалаенка, Грахоўскі і Снопка ўлезлі ў гарачы кацёл і за 6 гадзін адрамантавалі трубы. Звычайна такая работа павінна была працягвацца двое сутак.

Гарэлік.

18 верасня 1936 г.

САБАТАЖНІКІ ПАКАРАНЫ

За сабатаж на працягу некалькіх год у выкананні ўсіх відаў паставак і абавязковых грашовых плацяжоў, за схову хлеба ў гэтым годзе з мэтай ухілення ад здачы дзяржаве, грамадзянін пасёлка «Гарэлы мох» Слугароў Кірыла асуджаны на тры гады пазбаўлення волі ў канцлагерах без паражэння ў правах.

22 верасня 1936 г.

ПА ГОРАДУ І РАЁНУ

Парашутная вышка працуе нармальна. За час, прайшоўшы з яе адкрыцця, зроблена больш 300 прыжкоў...

А. Р.

24 верасня адбудзецца выпуск групы планерыстаў. Усе слухачы планернага гуртка добра засвоілі праграму лётнай справы...

Р.

З 17-га верасня пры гортэатры пачаў работу джаз-аркестр пад кіраўніцтвам тав. Краўцова. Аркестр выконвае рознастайнейшыя музычныя нумяры.

А.

23 лістапада 1936 г.

Калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі «13-годдзе Акцябра» Гадзілавіцкага сельсавета пастанавілі прадаць дзяржаве 40 тон хлеба. За атрыманыя грошы калгас мяркуе набыць грузавую аўтамашыну.

19 сакавіка 1937 г.

ВЫЛАЗКА КЛАСАВАГА ВОРАГА

Чатыры дні з 12 па 15 сакавіка дэманстраваўся ў нашым гарадскім кінатэатры дакумент велізарнейшай гістарычнай важнасці фільм «Даклад таварыша Сталіна». Тысячы працоўных раёна ішлі ў кінатэатр, каб убачыць любімага Сталіна, пачуць голас правадыра з трыбуны з'езда Советаў. Але чыясьці варожая рука ў апаратнай кінатэатра ў час дэманстрацыі фільма нагла скажала гук, што цяжка было што-небудзь пачуць. Глядачы абурыны безадказнасцю дырэкцыі тэатра да дэманстрацыі такога фільма.

Трэба навесці бальшавіцкі парадак у кінатэатры, дзе яўна скрываюцца ворагі народа і карыстаюцца ратазействам і палітычнай слепатой дырэкцыі тэатра, робяць сваю агідную справу.

ЯШЧЭ ШЧЫЛЬНЕЙ ЗГУРТУЕМСЯ ВАКОЛ ПАРТЫІ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

Нашы слаўныя чэкісты вырвуць з корнем ядавітае жала ў фашысцкіх шпіёнаў і здраднікаў. Ні адна брудная варожая нага не будзе ступаць па свяшчэннай зямлі краіны соцыялізма. Ніякія спробы ворага не зломяць магутнасці нашай слаўнай радзімы.

Няхай шалеюць паны Гітлеры і Гебельсы, пачуўшы, што іх спадручныя, іх стаўленнікі, вылаўлены і пакараны.

У адказ на прошукі ворага, на прошукі фашызма, які імкнецца працягнуць свае агідныя шчупальцы да нашай краіны мы адкажам яшчэ большым уздымам рэволюцыйнай пільнасці, яшчэ большым уздымам вытворчасці працы.

Шчыльней згуртуемся вакол партыі Леніна—Сталіна, вакол нашага вялікага правадыра таварыша Сталіна.

Сімкін.

13 кастрычніка 1939 г.

БАГАТЫ ПРАЦАДЗЕНЬ

Добрага ўраджаю зернавых дабіліся ў гэтым годзе калгаснікі калгаса імені Чапаева Лучынскага сельсавета. Дзякуючы сваёй стараннай рабоце, яны забяспечылі сабе высокі кошт працадня.

Па папярэднім падлікам праўлення, калгаснікі мяркуюць атрымаць на працадзень каля 2,5 кілаграма зернавых і 5—6 кілаграм бульбы...

Гэтымі днямі калгаснікі атрымоўваюць авансам па 700 грам зярна на працадзень...

Лук'яненка.

ВЫПРАЎЛЯЦЬ ПАРУШЭННЕ СТАТУТА

Днямі ў калгасе «Вална» Крушынаўскага сельсавета адбылося пасяджэнне праўлення калгаса, на якім было абгаворана пытанне аб ліквідацыі парушэнняў Прыкладнага статута сельскагаспадарчай арцелі. На праўленні было высветлена, што 13 калгаснікаў маюць па 2 свінаматкі з прыплодам, а 17 гаспадарак маюць прысядзібныя ўчасткі, якія даходзяць да 0,65 га, на праўленні, дзе прысутнічала многа калгаснікаў аднадушна было пастаноўлена, каб у трохдзённы тэрмін здаць свінаматак звыш нормы статута ў загатпункт. Выступаючыя гаварылі, каб у бліжэйшыя два-тры дні выправіць усе парушэнні статута сельгасарцелі і далей у сваёй рабоце кіравацца статутам і точна яго выконваць.

Сушчэўскі.

Лёс наркома

ПІВАВАРАЎ Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся ў 1904 г. ў в. Сямінаўка Рагачоўскага раёна. Беларус. З сялян. Член КПСС з 1931 г. Савецкі дзяржаўны дзеяч. У 1924 г. скончыў Рагачоўскі педагагічны тэхнікум, працаваў настаўнікам, дырэктарам сямігодкі ў Мазырскім раёне. У 1930 г. скончыў фізіка-матэматычны факультэт БДУ. У 1930—32 гг. аспірант АН БССР, у 1932—35 гг. аспірант АН СССР. У 1936 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю па раздзелу геафізікі. Працаваў старшым навуковым супрацоўнікам Фізіка-тэхнічнага інстытута АН БССР. З 21.10.1937 г. нарком асветы БССР. 2.7.1938 г. арыштаваны, 28.1.1940 г. выключаны з партыі. Рашэннем Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 29.5.1940 г. засуджаны на 15 гадоў папраўчапрацоўных работ. Пакаранне адбываў у Комі АССР. Памёр 28.8.1941 г. ў пасёлку Усць-Уса Комі АССР. Месца пахавання невядома. Рэабілітаваны 25.12.1954 г.

З пісьма жонкі У. І. Піваварава, заслужанай настаўніцы БССР Яўгеніі Іванаўны Вігура, апублікаванага газетай «Літаратура і мастацтва» 7 верасня 1990 г.

Мужа майго Уладзіміра Іванавіча Піваварава даўно ўжо няма ў жывых. Ніколі не забуду ноч (было гэта з 1-га на 2-е ліпеня 1938 г.), калі ў нашу кватэру пастукаліся энкэвэдзісты і, падняўшы мужа з ложка, павялі з сабой.

На ўсе мае запытанні і пісьмы ў розныя

У. І. Піваварaў.

вышэйшыя інстанцыі, пра яго лёс ніякіх адказаў я так і не атрымала. І толькі праз 17 гадоў, у сакавіку 1955 года, у Ваеннай калегіі Вярхоўнага суда СССР мне выдалі даведку аб яго поўнай рэабілітацыі: «...Прысуд па справе Піваварава У. І. адменены... справа спынена... за адсутнасцю ў ёй саставу злачынства (пасмяротна)».

Прачытаўшы слова — «пасмяротна», я ўпершыню паверыла, што яго ўжо няма на свеце.

Вось так было здзейснена гэтае злачынства. Так распраўляліся з маладымі кадрамі беларускай савецкай інтэлігенцыі, людзьмі сумленнымі і адданымі сваёй радзіме. Я помню, як старанна муж ставіўся да сваіх аспіранцкіх абавязкаў, да будучай абароны дысертацыі па фізіка-тэхнічным цыкле (ён закончыў фізмат БДУ).

Яму прапанавалі пасаду наркома народнай асветы. І калі ён пачаў адмаўляцца — гэта было ў асабістай гутарцы, на якую ён быў выкліканы да першага сакратара ЦК КП(б)Б Волкава А. А.,— той яму сказаў з папрокам: «Як жа гэта ты, тав. Піваваравў, не хочаш памагчы партыі ў ліквідацыі вынікаў шкодніцтва?». Муж прыйшоў і расказаў мне пра гэта, каб параіцца, што рабіць. Рыхтаваў ён сябе для навуковай работы, а тут прапаноўваюць такую адказную пасаду! Як жа яму было не задумацца? Тым больш, што да гэтага ніколі не быў на адміністрацыйнай рабоце (хіба толькі дырэктарам 7-гадовай школы на Палессі).

...Але лёсам мне было наканавана ўсё-такі сустрэцца тады з мужам у турме. Было гэта пасля закрытага суда над ім 28—29 мая 1940 года. Нам, жонкам асуджаных, была прадастаўлена — нарэшце! — магчымасць убачыць сваіх пакутнікаў і хоць што-небудзь даведацца аб іх здароўі, аб ходзе следства на працягу гэтых страшных двух гадоў «нічоганяведання».

Муж вельмі ўзрадаваўся, убачыўшы мяне, рабіў спробу нешта сказаць, але адзелены ад мяне дзвюма рашоткамі, паміж якімі ўзад-уперад бегаў турэмшчык, не мог перакрычаць шум і гвалт, які стаяў у пакоі — усе крычалі, каб быць пачутымі. Усё спатканне доўжылася хвілін 20, не болей. Мужу хацелася столькі даведацца, пачуць ад мяне пра кожнага з нашых трох дзяцей, але гэта было немагчыма. Паспела толькі пачуць аб судовым прысудзе: 15 гадоў строгага рэжыму лагераў без права абскарджання, без права перапіскі з сям'ёй... І яшчэ ён паспеў у гэтым шуме сказаць: «Не вер, Жэня, дрэнnаму, што на мяне могуць нагаварыць. Шмат разоў мяне збівалі да страты прытомнасці (і іншых таксама), калі прыходзіў да памяці, катаванні працягваліся зноў. Допыты цягнуліся па многа гадзін, прымушалі стаяць, а сілы не было. У мяне толькі з сакавіка 1939 пачалі расці новыя пазногці на пальцах...».

Званок перапыніў нашу сустрэчу. Так і праводзіла я яго ў магілу, якой не адшукаць...

Мінулым летам дзве мае дачкі паехалі ў катаржныя мясціны, дзе, па некаторых звестках, знаходзіўся іх бацька. Паехалі з надзеяй: можа, хто яшчэ жывы і мог бы яго ўспомніць. Ды не, дарэмныя спадзяванні!..

Вернутыя імёны

Рэпрэсіі, якія разгарнуў таталітарны рэжым супраць уласнага народа, у найбольшай ступені закранулі сялянства. У працэсе прымусовай калектывізацыі і «раскулачвання» тысячы людзей, працаздольных і нямоглых, старых і малых былі адарваны ад роднай зямлі, сваіх хат, гаспадарак і асланы на пасяленні, у лагеры.

У працэсе работы над кнігай «Памяць. Рагачоўскі раён» раённая камісія з Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобл. атрымала спіс жыхароў Рагачоўскага раёна, рэпрэсіраваных у 1930 г. Гэта унікальны дакумент. У ім 239 прозвішчаў жыхароў былых Крушынаўскага, Мадорскага і Цідхініцкага сельсаветаў. Усе сяляне, цэлыя сем'і. У пункце дакумента, дзе пазначаны характар абвінавачвання, такія запісы: «кулацкая гаспадарка», «член кулацкай гаспадаркі», «бацька (маці) кулака», «жонка (дачка, сын, унук) кулака» і нават такое абвінавачванне, як «серадняц-

кая гаспадарка», «член сям'і серадняка», «нявестка серадняка» і г. д. Меры пакарання былі наступныя: «пазбаўленне выбарчых правоў», «высылка», «арыштаваны АДПУ», насупраць прозвішчаў непаўналетніх значыцца «няма даных». Амаль ва ўсіх сем'ях канфіскавана маёмасць.

Вось прозвішчы гэтых людзей.

АРЦЁМАВЫ з в. Крушынаўка Крушынаўскага (цяпер Азяранскі) сельсавета: Касьян Пятровіч (1827), Алесь Касьянавіч (1851), Сінклета Ануфрыеўна (1851), Іван Алесевіч (1891), Ірына Міхайлаўна (1895), Серафіма (1920), Ніна (1922), Надзея (1924), Міхась (1926).

АЎРАМАВЫ з в. Мадора Мадорскага (цяпер Кісцянёўскі) сельсавета: Аляксей Яфімавіч (1876), Агафія Захараўна (1878), Павел Іванавіч (1906), Яфімія Іванаўна (1906), Сямён (1916), Трафім (1923), Іван (1928).

АЎРАМАВЫ з в. Мадора: Прохар Пятровіч (1858), Марфа Аўдзееўна (1858), Іван Прохаравіч (1895), Пётр Прохаравіч (1898), Наталля Васілеўна (1891), Домна Яфімаўна (1900), Марфа (1920), Ульяна і Ніна (абедзве з 1922), Янка (1924), Ганна (1929).

АЎСЯННІКАВЫ з хутара Дзягцярскае Ціхініцкага сельсавета: Ісай Дзмітрыевіч (1878), Марыя Ан. (1880), Мікалай Ісаевіч (1907), Ефрасіння (1908), Агафія Ісаеўна (1913), Марыя Ісаеўна (1920).

БУКАТАВЫ з в. Ясенаўка Ціхініцкага сельсавета (цяпер у Запольскім сельсавеце): Кацярына Ян. (1894), Павел (1901), Софія (1920), Лідзія Паўлаўна (1922).

ГАЎФЫ з хутара Чаромха Ціхініцкага сельсавета: Адольф (1894), Эдуард Адольфавіч (1923), Франц Адольфавіч (1925), Уладзіслаў Адольфавіч (1930), 2 чалавекі з гэтай сям'і ў спісе не названы, хоць ў графе «склад сям'і» пазначана 6 чалавек, у т. л. 3 непаўналетніх.

ДОЙЛІДАВЫ з хутара Валокі Крушынаўскага (цяпер Азяранскі) сельсавета: Якуб Арцёмавіч (1895), Ганна Фёдараўна (1899), Якуб Якубавіч (1922), Іван Якубавіч (1924), Марыя Якубаўна 1927), Вольга Якубаўна (1929).

ДОЙЛІДАВЫ з в. Лейчыцы Ціхініцкага сельсавета: Аўдоцця (1855), Ілья Пятровіч (1885), Марыя (1895), Уладзімір (1920), Іван (1925).

ДОЙНІКАВЫ з в. Фалевічы Крушынаўскага (цяпер Азяранскі) сельсавета: Іван Сцяпанавіч (1878), Праскоўя Іванаўна (1878), Ксенія Іванаўна (1902), Феня Іванаўна (1926).

ЖУКОЎСКІЯ з в. Талочкаў Ціхініцкага сельсавета: Марыя (1863), Сяргей (1890), Ганна (1901).

ЗАЙЦАВЫ з в. Мадора: Захар Мануілавіч (1879), Іван Захаравіч (1905), Ганна Рыгораўна (1901), Аўдоцця Алесеўна (1908), Васіліна Захараўна (1910), Таццяна (1915), Матрона (1917), Лізавета (1919), Васіль (1922), Фядос (1923), Уладзімір і Яфімія (абое 1925).

ЗАЙЦАВЫ з в. Мадора: Дзям'ян Пятровіч (1873), Ульяна (1879), Кірыла Пятровіч (1879), Ерафей Пятровіч (1881), Ірына Фёдараўна (1886), Пётр Ерафеевіч (1909), Настасся Ерафееўна (1912), Раіса Дзям'янаўна (1912), Мікалай і Барыс (абодва 1916).

КАЛАСКОВЫ з хутара Ціхінцы Ціхініцкага сельсавета: Уладзімір (1896), Таццяна П. (1896), Вера Уладзіміраўна (1923), Вольга Уладзіміраўна (1926).

КАЛАСКОВЫ з хутара Ціхінцы: Павел Ф. (1888), Зося К. (1892), Матрона Паўлаўна (1910), Надзея Паўлаўна (1915), Вольга Паўлаўна (1919), Вера Паўлаўна (1926).

КАМАРОЎСКІЯ з хутара Талочкава Ціхініцкага сельсавета: Піліп (1865), Аўдоцця (1865), Ганна (1901), Ганна (1907), Данііла Піліпавіч (1908), Сава (1915), Аркадзь і Юра (абодва 1925), Мікалай (1927).

КАРАТКЕВІЧЫ з в. Навасёлкі Ціхініцкага сельсавета: Агафія (1878), Алесь (1880), Марыя А. (1899), Мікалай А. (1902), Пётр А. (1905), Уладзімір А. (1914).

КАЦЯНКОВЫ з в. Ясенаўка: Ананій Іванавіч (1870), Фядосся (1875), Сяргей Анавьевіч (1896), Лізавета П. (1899), Гелена Ан. (1907), Алеся (1910), Вольга (1912), Іван (1915), Анф.(іса?) (1923), Вера (1925), Надзея (1927).

КРЭЗЫ з в. Рудня Бронская Ціхініцкага сельсавета: Міхаіл Паўлавіч (1893), Ганна (1900), Мікалай (1913), Вольга (1925), Гелена (1926), Рыгор (1927), Міхась (?).

КРЭЗЫ з в. Слапішча Ціхініцкага сельсавета: Фёдар Ан. (1880), Яўгенія (1884), Сцяпан Фёдаравіч (1905), Надзея Фёдараўна (1908), Пётр Фёдаравіч (1910).

КУРШАНАВЫ з в. Талочкаў Ціхініцкага сельсавета: Усцін (1860), Фёдар (1894), Андрэй і Марыя (абодва 1905), Пётр (1907), Ганна (1909), Аляксандр (1927), Таццяна (1928), Мікалай (1929), Уладзімір (1930).

ЛІСОЎСКІЯ з хутара Кручполле Ціхініцкага сельсавета: Васіль Ав. (1872), Гелена Н. (1884), Аркадзь Васілевіч (1910), Іван Васілевіч (1912).

МАСЛАВЫ з хутара Праходцы Ціхініцкага сельсавета: Рыгор Ніфанцевіч (1882), Кліна (1897), Якуб Рыгоравіч (1923), Хаціна (Фаціна) Рыгораўна (1925), Фёдар Рыгоравіч (1927), Амос Ніфанцевіч (1886).

Пётр Ніфанцевіч (1870), Ксенія (1893), Васіліса Пятроўна (1921), Андрэй Пятровіч (1924), Ірына Пятроўна (1925), Фёдар Пятровіч (1927).

Якуб (1872), Алеся (1890), Алена Якубаўна (1913), Павел Якубавіч (1916), Васіль Якубавіч (1920), Мікалай Якубавіч (1923), Ганна Якубаўна (1924), Іван Якубавіч (1929).

Ніфанцій (1860), Наталля (1863), Вінам Ніфанцевіч (1909), Аксіння (1907), Таццяна В. (1929), Ганна В. (1930).

МАЦВЯЙКОВЫ з в. Мадора: Нікандр Фёдаравіч (1869), Фёкла Раманаўна (1891), Васіль Нікандравіч (1895), Ілья Нікандравіч (1897), Аксіння Іванаўна (1899), Настасся Ільінічна (1903), Мікалай (1925), Ірына і Ульяна (абедзве 1927 г. н.), Насця (1928), Кацярына (1929).

МІЛЮКОВЫ з в. Ціхінічы: Ганна (1885) і Алесь (1908).

МІХАЛЬЧАНКІ з в. Мадора: Барыс Кузьміч (1868), Акуліна Аўдзееўна (1868), Лукер'я Парфёнаўна (1900), Марфа Ільяшаўна (1902), Аляксандр Барысавіч (1904), Сазон (1924), Матрона (1925), Ганна (1928), Марыя (1929).

НАДТАЧАЕВЫ з в. Ясенаўка: Усцін (1867), Малання Усцінаўна (1912), Восіп Усцінавіч (1918).

ПАЦЕВЫ з в. Ясенаўка: Фадзей (1882), Марыя Н. (1882), Ганна Фадзееўна (1909), Яфімія Фадзееўна (1913), Марына Фадзееўна (1915), Кацярына Фадзееўна (1917), Якаў Фадзеевіч (1921), Уладзімір Фадзеевіч (1924), Іван Фадзеевіч (1927).

ПАЦЕВЫ з в. Ясенаўка: Міхей (1865), Ганна (1865), Іван (1907), Марыя Яф. (1907), Сцяпан (1908), Аксіння (1910), Пелагея І. (1929).

СУДНІКАВЫ з хутара Валокі: Павел Рыгоравіч (1875), Акуліна Іванаўна (1875), Ісак Паўлавіч (1906), Ірына Ларыёнаўна (1906), Ульяна Паўлаўна (1910), Арцём Паўлавіч (1914), Васіль Паўлавіч (1916), Павел Ісакавіч (1925).

СУШЧЫНСКІЯ з хутара Валокі: Ксенія Адамаўна (1857), Малах Майсеевіч (1882), Варвара Майсееўна (1889), Фёдар Пятровіч (1900), Макрына Малахаўна (1909), Марыя Малахаўна (1921).

ХРАМЯНКОВЫ з хутара Чаромха Ціхініцкага сельсавета: Пелагея Іванаўна (1867), Матрона (1877), Мікалай Адамавіч (1893), Таццяна В. (1901), Вольга Мікалаеўна (1920), Лявон Мікалаевіч (1923), Барыс Мікалаевіч (1925).

ЧМЫХАВЫ з в. Выс. Дзягцяр Ціхініцкага сельсавета: Андрэй Васілевіч (1873), Агафія (1885), Таццяна Андрэеўна (1904), Іван Андрэевіч (1905), Аляксей Андрэевіч (1912).

ШКУРАТАВЫ з хутара Дзягцярскае: Аксіння (1875), Аўдоцця (1897), Апанас (1898), Іраіда Апанасаўна (1925).

На гэтым канчаецца архіўны дакумент, але не спіс рэпрэсіраваных землякоў. Яго можна прадаўжаць і прадаўжаць. Тут пералічаны рэпрэсіраваныя сяляне толькі з трох сельсаветаў за 1930 год. А як у астатніх сельсаветах і ў іншыя гады?

На жаль, звесткі пра рэпрэсіраваных землякоў, якія мела камісія на час здачы рукапісу кнігі ў вытворчасць, вельмі абмежаваныя. Як, напрыклад, пра жыхароў в. Азяраны **АТРОХАВА** Дзмітрыя Цімафеевіча, 1908 г. н., і **АТРОХАВА** Мікалая Рыгоравіча, 1909 г. н., расстраляных 26.10.1937 г. каля г. Мазыра (звесткі атрыманы з КДБ Рэспублікі Беларусь).

Упраўленне КДБ па Гомельскай вобласці дапоўніла гэты спіс наступнымі прозвішчамі:

ГРАХОЎСКІ Іван Ігнатавіч, н. ў 1906, в. Сенажаткі Побалаўскага сельсавета. Калгаснік. Арыштаваны 17.7.1938. Па пастанове асобай тройкі НКУС БССР ад 25.9.1938 зняволены на 8 гадоў у папраўча-працоўны лагер. Пакаранне адбываў у Кемераўскай вобл., дзе 5.10.1941 памёр. Рэабілітаваны 12.6.1989.

СЕНАЖЭНСКІ Аляксандр Іванавіч, н. ў 1894, в. Сенажаткі. Арыштаваны 1.8.1937. Па пастанове камісіі НКУС і пракурора СССР ад 28.11.1937 прыгавораны да расстрэлу. Расстраляны 6.12.1937 у Бабруйску. Месца пахавання невядома. Рэабілітаваны 9.2.1959.

СЕНАЖЭНСКІ Ігнат Іванавіч, н. ў 1902, в. Сенажаткі. Арыштаваны 18.11.1937. Па пастанове камісіі НКУС і пракурора СССР ад 9.12.1937 прыгавораны да расстрэлу. Расстраляны 13.1.1938 у Бабруйску. Рэабілітаваны 29.9.1958.

Прыведзеныя вышэй звесткі датычацца толькі трох жыхароў в. Сенажаткі. Як стала вядома, у 30-я гады былі рэпрэсіраваны амаль усе мужчыны Сенажаткі і бліжэйшых да вёскі хутароў. Мінчанка А. І. Шарай даслала ў раённую камісію спіс ахвяр рэпрэсій, які склала яе маці Юзэфа Іванаўна Грахоўская. Яна сцвярджае, што было арыштавана каля 60 аднавяскоўцаў, але ўспомніла толькі 40. На жаль, дапоўніць спіс дадатковымі звесткамі не змагла і раённая камісія. Усе арыштаваныя былі вывезены за межы раёна. Далейшы іх лёс застаўся невядомы. У вёску вярнуліся толькі Аркадзь Адамавіч Грахоўскі і Барнаба Антонавіч Закрэўскі.

Рэпрэсіраваныя жыхары в. Сенажаткі:

АСЯПЧУК Рыгор.
ГРАХОЎСКІ Амброжа Адамавіч.
ГРАХОЎСКІ Аркадзь Адамавіч.
ГРАХОЎСКІ Іван.
ГРАХОЎСКІ Кайтан Адамавіч.
ГРАХОЎСКІ Міхаіл Іванавіч.
ЖОЎТАК Іосіф Адольфавіч.
ЖОЎТАК Леанід Іванавіч.
ЗАКРЭЎСКІ Антон Кайтанавіч.
ЗАКРЭЎСКІ Антон Мамертавіч.
ЗАКРЭЎСКІ Астаф Дзяменцьевіч.
ЗАКРЭЎСКІ Аўгусцін Дзяменцьевіч.
ЗАКРЭЎСКІ Барнаба Антонавіч.
ЗАКРЭЎСКІ Іван Лявонцьевіч.
ЗАКРЭЎСКІ Ігнат Альбертавіч.
ЗАКРЭЎСКІ Іосіф Тытусавіч.
ЗАКРЭЎСКІ Кайтан Лявонцьевіч.
ЗАКРЭЎСКІ Станіслаў Антонавіч.
ЗАКРЭЎСКІ Станіслаў Тытусавіч.
ЗАКРЭЎСКІ Тытус Лявонцьевіч.
ЗАКРЭЎСКІ Франц Казіміравіч, расстраляны ў 1938.
ЗУБОВІЧ Міхаіл.
КАРАТКЕВІЧ Мікалай Лявонцьевіч.
МАНКЕВІЧ Аляксандр.
ПАРХАМОВІЧ Аляксандр Вадзяслававіч.
СЕНАЖЭНСКІ Вадзяслаў Тадэўкавіч.
СЕНАЖЭНСКІ Канстанцін Вікенцьевіч.
СЕНАЖЭНСКІ Лявон Вадзяслававіч.
СЕНАЖЭНСКІ Міхаіл Вадзяслававіч.
СЕНАЖЭНСКІ Міхаіл Іосіфавіч.
СЕНАЖЭНСКІ Пётр.
СЕНАЖЭНСКІ Томка Вадзяслававіч.
СЕНАЖЭНСКІ Яўген Вадзяслававіч.
ЦЕМЯНГА Людвіг.
ШЧЫГЕЛЬСКІ Габрусь Мамертавіч.

ШЧЫГЕЛЬСКІ Казімір Казіміравіч.
ШЧЫГЕЛЬСКІ Канстанцін Паўлавіч.
ШЭНКЕЛЬ.
ЯДЛОЎСКІ Антон Сямёнавіч.

На падставе матэрыялаў, што паступілі ў камісію па аказанні садзейнічання ў забеспячэнні правоў ахвяр палітычных рэпрэсій пры Рагачоўскім раённым Савеце народных дэпутатаў, складзены дадатковы спіс рэпрэсіраваных. У яго ўключаны, у асноўным, гаспадары сем'яў. Гэта:

АЛЕЙНІКАЎ Дзяніс Тодаравіч, в. Ясенаўка.
АЛЕЙНІКАЎ Яфім Дзянісавіч, в. Ясенаўка.
АНДРОСАЎ Сямён Міхайлавіч, в. Балаба.
АНТОНАЎ-ЯЎМЕНАЎ Якаў Яўстратавіч, в. Паддувінск.
АРЦЁМЕНКА Павел Гапеевіч, в. Каменка Стралкоўская.
АЎЧЫННІКАЎ Апанас Яўменавіч, в. Вялікія Стралкі.
БАЗЫЛЕНКА Аркадзь Сямёнавіч, в. Аляксандраўка.
БАЗЫЛЕНКА Еўдакія Макараўна, в. Аляксандраўка.
БАРАЗНА Іван Дамітрыевіч, в. Вітлін.
БУМАЖЭНКА Мікалай Іванавіч, в. Новыя Журавічы.
БЯЛОЎ Іван Максімавіч, в. Балаба.
ВАСЬКОЎ Гаўрыла Сідаравіч, в. Хатоўня.
ВАШЭЦЬКАЎ Пётр Макеевіч, в. Хатоўня.
ВЯРАКСА Аляксандр Антонавіч, в. Глінск.
ГАЛУБОЎСКІ Панфіл Дамітрыевіч, в. Надзейкавічы.
ГАНЧАРОЎ Іван Сцяпанавіч, в. Шапчыцы.
ГУРЭВІЧ Архіп Лявонавіч, в. Сялец.
ГУРЭВІЧ Яўгенія Кандратаўна, в. Сялец.
ДАВЫДАЎ Ігнат Фёдаравіч, в. Вуглы.
ДАНІЛАЎ Іван Захаравіч, в. Мадора.
ДРАЧОЎ Тарас Захаравіч, в. Лучын.
ЕФІМОВІЧ Іван Андрэевіч, в. Будзішча.
ЖУКАЎ Яўстафій Іосіфавіч, в. Красніца.
ЖУРАЎЛЁЎ Пётр Андрэевіч, в. Бірчанская Слабада.
ЗАЙЦАВА (КАЎТУНОВА) Яўгенія Сцяпанаўна, в. Званец.
ЗАЙЦАЎ Дзмітрый Якаўлевіч, в. Званец.
ЗАЙЦАЎ Канстанцін Дзмітрыевіч, в. Званец.
ЗАЙЦАЎ Кірыла Васілевіч, в. Вікаў.
ЗАЙЦАЎ Нічыпар Прохаравіч, в. Званец.
ЗАЙЦАЎ Якаў, в. Званец.
ЗІНЬКЕВІЧ Сямён Іванавіч, в. Красніца.
ЗМЕЯНКОЎ Цімафей Яўтухавіч, в. Міждзераў.
ЗЫКАЎ Стахван Ільіч, в. Куставіца.
КАВАЛЁЎ Ягор Фадзеевіч, в. Шапчыцы.
КАЖАМЯКІН Сяргей Адамавіч, в. Ветачка.
КАЛЕЕЎ Андрэй Анісімавіч, в. Сямінаўка.
КАЛЕЕЎ Прохар Сямёнавіч, в. Сямінаўка.
КАЛІНОЎСКІ Іосіф Пятровіч, хутар Купаўё.
КАЛІНОЎСКІ Рыгор Пятровіч, в. Мыза.
КАЛІНОЎСКІ Фёдар Патапавіч, в. Смольнае.

Я. Ф. Кавалёў.

КАЛІНОЎСКІ Фёдар Паўлавіч, в. Філіпкавічы.
КАНОНЧЫК Рыгор Аляксеевіч, в. Бірчанская Слабада.
КАЦЯНКОЎ Марцін Рыгоравіч, в. Хапаны.
КОНЧЫЦ Васіль Андрэевіч, в. Красніца.
КОНЧЫЦ Іван Васілевіч, в. Красніца.
КОНЧЫЦ Наталля Ануфрыеўна, в. Красніца.
КОНЧЫЦ Сцяпан Пятровіч, в. Красніца.
КОНЧЫЦ (УСЕВІЧ) Пелагея Яфімаўна, в. Красніца.
КОРШЫКАЎ Васіль Міхайлавіч, в. Аляксандраўка.
КРАПІЦКІ Антон Піліпавіч, в. Канапліцы.
КРЫЖЭЎСКІ Іван Герасімавіч, в. Красніца.
КУДРАЎЦАЎ Акім Міхайлавіч, в. Турск.
КУПРЭЕЎ Піліп Апанасавіч, в. Адраджэнне.
КУРАКА Карп Дзяменцьевіч, в. Ветачка.
КУШНЯРОЎ Архіп Кандратавіч, в. Мыза.
ЛАПІЦКАЯ Марыя Аляксееўна, в. Гуцішча.
ЛАПІЦКІ Васіль Якаўлевіч, в. Гуцішча.
ЛАПІЦКІ Іван Стафанавіч, в. Гуцішча.
ЛАПІЦКІ Стафан Іванавіч, в. Гуцішча.
ЛАШКЕВІЧ Рыгор Іванавіч, в. Красніца.
ЛУКОМСКАЯ (ЛАШКЕВІЧ) Марыя Іванаўна, в. Красніца.
ЛУКОМСКІ Іван Мікалаевіч, в. Красніца.
ЛУКОМСКІ Мікалай Марцінавіч, в. Красніца.
ЛУК'ЯНАЎ Іван Іванавіч, в. Стары Крыўск.
ЛУК'ЯНАЎ Якаў Уладзіміравіч, в. Стары Крыўск.
ЛЯХАЎ Васіль Дзянісавіч, в. Гадзілавічы.
ЛЯХАЎ Гаўрыла Юр'евіч, в. Сямінаўка.
ЛЯХАЎ Пракоп Дзянісавіч, в. Гадзілавічы.
ЛЯХАЎ Яўстрат Юр'евіч, в. Сямінаўка.
МАКАРАНКА Ануфрый (Напрэй) Міхайлавіч, в. Шчыбрын.
МАРКАЎ Іосіф Аляксеевіч, в. Хатоўня.
МАРЧАНКА Прохар Аляксеевіч, в. Турск.
МАСАЛБАСАЎ Ціхан Адамавіч, в. Ціхінічы.
МАЦУКЕВІЧ Архіп Аляксеевіч, в. Буда.
МЕЛЬНІКАЎ Яўціхій Аляксандравіч, в. Міждзераў.
МІНЧУКОЎ Рыгор Данілавіч, в. Гадзілавічы.
МІРОНАЎ Якаў Тарасавіч, в. Новы Пахар.

МІХАЛЬЧАНКА Трафім Ільіч, в. Мадора.
МЯЖЭВІЧ Антон Цімафеевіч, в. Красніца.
МЯЖЭВІЧ Васіль Антонавіч, в. Красніца.
МЯЖЭВІЧ Домна Іванаўна, в. Красніца.
МЯЖЭВІЧ Ульяна Міхайлаўна, в. Красніца.
МЯЖЭВІЧ Яфім Антонавіч, в. Красніца.
НЕГАРЭЕВА Ганна Паўлаўна, в. Серабранка.
НІКАЛАЕНКА Васіль Трафімавіч, в. Вуглы.
ПАЛЯНСКІ Нічыпар Гаўрылавіч, в. Забалацце.
ПАРАХНЕВІЧ Канстанцін Іванавіч, в. Востраў.
ПАРАХНЕВІЧ Таццяна Сямёнаўна, в. Востраў.
ПАЎЛЮКОЎ Дарафей Дзмітрыевіч, в. Сялец.
ПАЎЛЮКОЎ Пётр Міхайлавіч, в. Цеснавое.
ПАЦЕЎ Міхаіл Якаўлевіч, в. Ясенаўка.
ПЕТРАЧЭНКА Сідар Анісімавіч, в. Стары Доўск.
ПІЛІПЕНКА Ілья Фёдаравіч, в. Рэпкі.
РАДЧЫКАЎ Пётр Фёдаравіч, в. Шчыбрын.
РАМАНАВА Ганна Дзмітрыеўна, в. Шапчыцы.
РАМАНАЎ Глеб Міхайлавіч, в. Шапчыцы.
РУДЗЬКОЎ Павел Андрэевіч, в. Стары Доўск.
РЫНЕЙСКІ Пётр Марцінавіч, в. Ліскі.
САВАСЦЬЯНАЎ Іван Мітрафанавіч, в. Сялец.
СТРАЛКОЎ Тарас Нічыпаравіч, в. Канапліцы.
СТРАЛЬЦОЎ Самуіл Цімафеевіч, в. Бліняцы.
СУДНІКАЎ Ціт Ягоравіч, в. Канапліцы.
СЦЯПАНАЎ Іван Кандратавіч, в. Сялец.
СЦЯПАНАЎ Рыгор Кірылавіч, в. Сялец.
СЯМЁНАЎ Фацей Самуілавіч, в. Гусараўка.
ТУЖЫКАЎ Юрый Ігнатавіч, в. Міньковў.
УСАЎ Трафім Дзмітрыевіч, в. Стары Крыўск.
УСЕВІЧ Зіновій Ціханавіч, в. Красніца.
УСЕВІЧ Таццяна Васілеўна, в. Красніца.
ФРАЛОЎ Цімафей Іванавіч, в. Вішанька.
ФРАЛОЎ Цярэнцій Цімафеевіч, в. Вішанька.
ХАРЭВІЧ Аляксандр Мечыслававіч, в. Глінск.
ЦІМАШЭНКА Лідзія Кузьмінічна, в. Турск.
ЦІМАШЭНКА Яўстрат Цімафеевіч, в. Турск.
ШАРОЙКА Карней Уладзіміравіч, хутар Ліпаўка.
ШАЎЧУК Пётр Фядотавіч, в. Амельна.
ШАЎЧУК Фядот Андрэевіч, в. Амельна.
ШКУРАТАЎ Фёдар Сідаравіч, в. Зацішша.

* * *

КАРАБЦОЎ Васіль Пятровіч, в. Гадзілавічы.
ШЭЎЧАНКА Васіль Рыгоравіч, в. Вірычаў.

З выхадам кнігі «Памяць. Рагачоўскі раён» пошукавая работа не спыняецца. Зараз у рэспубліцы ідзе збор і сістэматызацыя звестак пра рэпрэсіраваных жыхароў Беларусі. Адчыняюцца архіўныя сховішчы, вучоныя і краязнаўцы атрымліваюць магчымасць знаёміцца з раней закрытымі справамі, адшукваюць новыя імёны. Вынікам такой работы стануць кнігі «Памяць», спецыяльна прысвечаныя ахвярам рэпрэсій. Будзем спадзявацца, што на іх старонках з'явяцца новыя прозвішчы нашых землякоў, якія, на жаль, не ўдалося выявіць у час падрыхтоўкі гэтай кнігі.

ВОІНЫ-ЗЕМЛЯКІ, ЯКІЯ ЗАГІНУЛІ Ў САВЕЦКА-ФІНЛЯНДСКУЮ ВАЙНУ 1939—1940 гг.

АЗЯРАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА КАНАПЛІЦЫ

БАЖАНКОЎ Навум Фёдаравіч, н. ў 1910, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.
КРУМКАЧОЎ Рыгор Піліпавіч, н. ў 1906, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.
ПАЛЕКАНАЎ Нічыпар Мікітавіч, н. ў 1900, загінуў 15.2.1940.

ГАДЗІЛАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГАДЗІЛАВІЧЫ

МІРОНАЎ Павел Назаравіч, н. ў 1912, рад., прапаў без вестак 19.2.1940.
ШКУТАЎ Іосіф Карпавіч, н. ў 1913, рад., загінуў 25.2.1940.

ПАСЁЛАК ПАХАР

БАХАНЦОЎ Піліп Кузьміч, н. ў 1910, прапаў без вестак у снежні 1939.

ГАРАДЗЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЫСОКАЕ

БОНДАРАЎ Барыс Анціпавіч, н. ў 1906, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЁСКА ГАРАДЗЕЦ

СЛЮНКОЎ Павел Ягоравіч, н. ў 1910, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЁСКА МАЛЫЯ СТРАЛКІ

ЗЫКАЎ Іван Захаравіч, рад., памёр ад ран 7.3.1940.
РАМАНАЎ Васіль Лявонавіч, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ДВАРЭЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА НАДЗЕЙКАВІЧЫ

БЛЯХЕРАЎ Іван Харытонавіч, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ЖУРАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕСКА ДРАГУНСК

БАСАЎ Рыгор Сямёнавіч, загінуў у 1939.
КУХАРЭНКА Ціхан Фёдаравіч, н. ў 1911, у Чырв. Арміі з 1939, загінуў у сакавіку 1940.

ЗАПОЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕСКА ЗАПОЛЛЕ

КАЗЛОЎ Васіль Барысавіч, н. ў 1911, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.
ПАНІЧКАЎ Яфім Мікітавіч, н. ў 1907, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЕСКА КАЛАСЫ

МАКСІМАЎ Даніла Яўціхавіч, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЕСКА СВЯТОЕ

КАЗЛОЎ Кірыла Восіпавіч, н. ў 1911, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ЗБАРОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕСКА ЗБАРОЎ

КРАЎЦОЎ Міхаіл Максімавіч, н. ў 1919, рад., загінуў 13.2.1940.
СЛУГАРОЎ Фёдар Мікітавіч, н. ў 1915, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ЗВАНЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕСКА ЗВАНЕЦ

БАРЫСАЎ Фёдар Еўдакімавіч, лейт., загінуў 12.12.1939.
ВОПСЕЎ Пётр Нічыпаравіч, н. ў 1909, загінуў у 1940.
ГАПОНАЎ Пётр Сяргеевіч, н. ў 1903, загінуў у 1940.
КАРЖОЎ Фама Піліпавіч, загінуў..
МАРОЗАЎ Малах Савасцеевіч, н. ў 1912, загінуў у 1940.

КІСЦЯНЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕСКА КІСЦЯНІ

ТАРАСАЎ Мірон Дзянісавіч, н. ў 1911, рад., загінуў у лютым 1940.

КУРГАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕСКА АСМОЛАВІЧЫ

ВОСТРЫКАЎ Цярэнцій Міхайлавіч, н. ў 1905, загінуў у 1939.
КРАЎЦОЎ Пётр Нічыпаравіч, н. ў 1909, загінуў у 1939.
КУЗЬМІН Станіслаў Васілевіч, н. ў 1910, загінуў у 1939.
ТУЖЫКАЎ Аляксандр Ігнатавіч, н. ў 1917, загінуў у 1939.

Ф. Е. Барысаў.

ВЕСКА КУРГАННЕ

ХАМЯНКОЎ Ігнат Яфімавіч, н. ў 1904, загінуў у 1939.

ВЕСКА МАЛАШКАВІЧЫ

ФАМЯНКОЎ Ігнат Яфімавіч, н. ў 1902, загінуў у 1940.
ЦЫРУЛЬНІКАЎ Ягор Клімавіч, н. ў 1902, загінуў у 1940.

ВЕСКА НОВЫ КРЫЎСК

СОМАЎ Фёдар Кірылавіч, н. ў 1902, загінуў у 1939.
ШПАКАЎ Павел Іванавіч, н. ў 1914, загінуў у 1939.

ВЕСКА ПЕРАКОП

МАРЧАНКА Якаў Захаравіч, н. ў 1906, загінуў у 1939.

ВЕСКА СТАРЫ КРЫЎСК

БАРЫСЕНКА Іван Трафімавіч, н. ў 1913, загінуў у 1939.
САМУСЬКОЎ Мацвей Якаўлевіч, н. ў 1911, загінуў у 1939.

СТАРАСЕЛЬСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕСКА НОВЫЯ КАНАПЛІЦЫ

ВАЛЧКОЎ Андрэй Цярэнцьевіч, рад., загінуў 10.3.1940.

ВЕСКА ШЧЫБРЫН

РАДЧЫКАЎ Рыгор Майсеевіч, н. ў 1905, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

СТАЎПНЯНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕСКА ВУГЛЫ

ФІЛІПАЎ Сяргей Лазаравіч, н. ў 1911, рад., загінуў у 1940.

ВЕСКА МІРНАЯ

КІРЫЕНКА Мікалай Емяльянавіч, н. ў 1913, загінуў у 1939.

МІРОНАЎ Іван Іванавіч, н. ў 1914, рад., загінуў у 1939.

СЕМЧАНКА Даніс Іванавіч, н. ў 1904, сярж., загінуў у 1939.

ВЕСКА ПАДБУДДЗЕ

КАНДРАЦЕНКА Мікалай Іванавіч, н. ў 1904, сярж., загінуў у 1939.

ВЕСКА ПАДЗЕЛЫ

КІРСЕНКАЎ Мікалай М., н. ў 1913, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ВЕСКА СТАЎПНЯ

ЖЫРАНКОЎ Аляксандр Ігнатавіч, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

КРАЎЦОЎ Мікалай Аляксеевіч, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ЦІХІНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ЖУРАЎЛЕЎ Апанас Антонавіч, н. ў 1904.

* * *

ВАРАБ'ЁЎ Мікалай Пятровіч, н. ў 1907, рад., загінуў 8.2.1940.

ДЗЕМ'ЯНЕНКА Анісім Піліпавіч, н. ў 1907, рад., загінуў 16.2.1940.

ЕРМАКОЎ Карп Ільіч, н. ў 1901, рад., прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ЛЯГКОЎ Аляксей Макаравіч, рад., загінуў 8.3.1940.

НАВІЦКІ Сцяпан Васілевіч, н. ў 1909, прапаў без вестак 22.2.1940.

«Наш раён павінен стаць чыстым»

Пад такім заклікам праходзіла вясной 1941 г. кампанія па добраўпарадкаванні Рагачова і навакольных вёсак. У сакавіку 1941 г. галоўны ўрач Рагачоўскай бальніцы, заслужаны ўрач БССР Георгій Пятровіч Шараварaў на адным з партыйных сходаў райаддзела аховы здароўя прапанаваў прывесці вуліцы, двары, хаты горада ў належны стан. Яго горача падтрымалі калегі. 14 сакавіка правялі раённую канферэнцыю медыцынскіх работнікаў, на якой прынялі зварот да рабочых, калгаснікаў і інтэлігенцыі раёна. Зварот быў надрукаваны ў раённай газеце, перададзены па радыё. Гэта ініцыятыва, як тады гэта было прынята, была абмеркавана і ўхвалена партыйнымі і савецкімі органамі, якія заклікалі насельніцтва прыняць актыўны ўдзел у «паходзе за чыстату, за павышэнне санітарнай культуры».

Для пачатку вырашылі навесці парадак у Рагачове. Горад падзялілі на 40 кварталаў, замацавалі за кожным з іх дэпутата гарсавета і медработніка, якія павінны былі растлумачыць насельніцтву сутнасць кампаніі і прыцягнуць яго да работы. Задача была простай: падмесці вуліцы, вывезці смецце, засыпаць лужы, ямы на дарозе, адрамантаваць тратуары.

На сходах жыхары горада ўзялі абавязацельствы сачыць за чысцінёй вуліц, тратуараў, сваіх двароў і хат, аднадушна вырашылі азеляніць вуліцы горада. Былі падтрыманы прапановы давесці да ўзорнага санітарнага стану ўстановы і прадпрыемствы горада, школы, клубы, сталовыя, лазні і г. д. У горадзе выбралі 276 грамадскіх санітарных інспектараў (большая частка з іх жанчыны), якія дапамагалі замацаваным за кожным кварталам дэпутатам і медработнікам.

Праз некалькі дзён пасля падрыхтоўчай агітацыйнай работы, людзі ўзяліся за навядзенне парадку. З раніцы жыхары горада з рыдлёўкамі, насілкамі, венікамі выходзілі на вуліцы. Хутка горад было не пазнаць, так ён змяніўся. Вуліцы былі падмецены, засыпаны выбоіны, адрамантаваны маставыя, тратуары, платы. У кожным двары зрабілі памыйныя ямы, скрынкі для смецця, на тратуарах паставілі урны. Былі агароджаны калодзежы, зроблены для іх накрыўкі, кожны калодзеж меў сваё вядро. Хутка прыклад гараджан пераняліі і вяскоўцы.

У горадзе панаваў усеагульны ўздым. Пачалося нават спаборніцтва, тады гэта было модна, паміж кварталамі. Людзі вырашылі не толькі зрабіць чыстым, але і ўпрыгожыць горад: сталі садзіць маладыя дрэўцы, кусты, разбіваць кветнікі, фарбаваць платы.

Паралельна з гэтым медыкі распачалі санітарна-асветную работу. Яны ў тактоўнай форме давалі гаспадарам парады па

г. Рагачоў, вуліца Цымерманаўская. 1939 г.

асабістай гігіене і гігіене жылля. Былі наладжаны гуртковыя заняткі, дзе ўрачы праводзілі гутаркі, як пазбегнуць заразных захворванняў, асабліва сярод дзяцей, па асабістай гігіене, пра аказанне першай медыцынскай дапамогі і інш.

На горад звярнулі ўвагу рэспубліканскія арганізацыі. Пра пачын рагачоўцаў стала вядома ўсёй рэспубліцы, бо абласныя і рэспубліканскія газеты шырока асвятлялі яго на сваіх старонках. 20 мая 1941 г. ў Рагачоў прыехалі за вопытам кіраўнікі раённых і абласных аддзелаў аховы здароўя на чале з наркомам аховы здароўя БССР М. І. Кавалёнкам. З Масквы прыехаў намеснік наркома аховы здароўя СССР Калеснікаў. У горадзе прайшла спецыяльная канферэнцыя, у якой прынялі ўдзел апрача гасцей мясцовыя медработнікі, грамадскія санінспектары, прадстаўнікі ўсіх раённых устаноў. Пасля такой нарады пра справы рагачоўцаў паведамілі і савюзныя газеты.

Кіраўнікі рагачоўскіх арганізацый і лепшыя грамадскія санінспектары былі запрошаны ў Маскву, каб расказаць пра свой вопыт на пасяджэнні калегіі Наркамата аховы здароўя СССР. Вопыт рагачоўцаў калегія абмеркавала 6 чэрвеня 1941 г. З дакладамі выступілі народны камісар аховы здароўя БССР Кавалёнак, сакратар Рагачоўскага райкома партыі Свярдлоў і загадчык раённага аддзела аховы здароўя Брук. Яны падвялі вынікі трохмесячнай кампаніі: рэзка паменшылася ў горадзе і раёне колькасць захворванняў на заразныя хваробы, медработнікамі горада і раёна зроблена больш за 10 000 прафілактычных прышчэпак, праведзена 500 гутарак з насельніцтвам. У вёсках рэгулярна працуюць 57 лазняў і яшчэ 14 будуецца, у Рагачове адрамантавана 109, а ў калгасах 860 калодзежаў, будуецца 30 новых. У раёне пасаджана 26 200 маладых дрэў. Будуюцца 3 новыя фельчарска-акушэрскія пункты. Па ініцыятыве грамадскіх санінспектараў 31-га квартала, хатніх гаспадынь Фярберавай, Ерафеевай, Карнышовай, Шарупіч, Лідагосцер і Шнеўр было асушана балота плошчай у 7 гектараў. Яно ўваходзіла ў межы горада і было прычынай успышак малярыі. Асушаны ўчастак зямлі адводзіўся пад агароды для раённай бальніцы.

Калегія Наркамата аховы здароўя СССР высока ацаніла работу рагачоўцаў. 19 чалавек былі ўзнагароджаны значкамі «Выдатнік аховы здароўя». Пра добрыя справы жыхароў горада была напісана асобная брашура, якая выйшла з друку, калі Рагачоў ужо акупіравалі фашысты.

ІШЛА ВАЙНА СВЯШЧЭННАЯ

Рагачоўскі плацдарм. 1941 г. Незлічонымі матэрыяльнымі стратамі, палаючымі гарадамі і вёскамі, неймавернымі людскімі пакутамі і мільёнамі заўчасна абарваных чалавечых жыццяў увайшла ў нашу гісторыю Вялікая Айчынная вайна. Пачатак яе быў надзвычай цяжкім. Ведучы цяжкія кровапралітныя баі, нашы войскі вымушаны былі адступаць пад націскам колькасна перавышаючага і больш вопытнага праціўніка.

Адразу ж пачалася мабілізацыя ў армію. Толькі за тыдзень, з 23 па 28 чэрвеня, Рагачоўскі ваенкамат накіраваў у дзеючую армію каля чатырох тысяч жыхароў раёна. Ужо 25 чэрвеня ў раёне з'явіліся бежанцы. Мясцовае насельніцтва аказвала ім усялякую падтрымку: дапамагала адзеннем, прадуктамі, стварала ўмовы для часовага пражывання, прадпрыемствы выдзялялі транспарт для адпраўкі ў глыбокі тыл. Адначасова праводзілася эвакуацыя матэрыяльных каштоўнасцей з правабярэжжа Дняпра. Спецыяльныя брыгады дэманціравалі абсталяванне з малочнакансервавага завода, пераганялі жывёлу на левы бераг Дняпра.

У першыя дні вайны пры Рагачоўскім і Журавіцкім райкомах партыі былі створаны знішчальныя батальёны. У Рагачове іх узначаліў намеснік начальніка МТС М. Г. Калінковіч, у Журавічах — начальнік НКУС Гранюк. Батальёны ахоўвалі дзяржаўныя аб'екты, а таксама павінны былі выяўляць шпіёнаў і дыверсантаў.

25 чэрвеня пачалася бамбардзіроўка, адыходзілі на ўсход нашы войскі. Аднак рагачоўцы яшчэ спадзяваліся, што фронт вось-вось спыніцца і за Бярэзіну вораг не пройдзе, яшчэ дзень-другі — і Чырвоная Армія пагоніць фашыстаў назад. Але ўжо 27 чэрвеня ў сувязі з набліжэннем нямецкіх войск работа на ўсіх прадпрыемствах была спынена. Жыхары Рагачоўскага раёна ўпершыню адчулі вайну рэальна. Вось кароткія ўспаміны сведкі — сакратара Рагачоўскага райкома партыі С. М. Свярдлова: «Нашы войскі адыходзяць суцэльным патокам[1]. Лавінай рухаюцца бежанцы... Мы атрымалі загад капаць супрацьтанкавыя равы на рэках Друць і Дняпро. Работа на ўсіх прадпрыемствах перапынена... 12 тысяч чалавек капаюць равы, траншэі, акопы... Да Дняпра пачалі прыбываць першыя часці 63-га корпуса 21-й арміі».

Ішоў другі тыдзень вайны. На заходнім напрамку баі разгортваліся ў міжрэччы Бярэзіны і Дняпра. Наносячы ворагу велізарныя страты, Чырвоная Армія намнога болей страчвала сама. Усё яшчэ працягваў уплываць неспрыяльны зыход прыгранічных баёў, усё вастрэй адчуваліся глыбінныя катаклізмы гістарычнага працэсу ў краіне.

63-ы стралковы корпус, якім камандаваў генерал-лейтэнант Л. Р. Пятроўскі, разгарнуў свае стралковыя дывізіі (167-ю, 61-ю, 117-ю) на поўнач ад Рагачова, уздоўж левага берага Дняпра, ад в. Збароў да Стрэшына. Управа і ўлева ад яго абсталявалі свае пазіцыі 67-ы і 66-ы стралковыя карпусы. У рэзерве ў іх быў 25-ы механізаваны корпус (55-я і 50-я танкавыя, 219-я матарызаваная дывізіі). Аднак корпус не паспеў закончыць сваё фарміраванне — за невялікім выключэннем яго асабовы састаў быў без баявых машын, не хапала зброі. Дывізіі спешна

---

[1] Аўтар успамінаў дапусціў тут недакладнасць — ён прыняў за масавае адступленне адыход часцей нашай 4-й арміі на даўкамплектаванне.

будавалі абарончыя рубяжы, у міжрэччы выставілі дазоры і рухомыя атрады, якія займаліся пошукам і знішчэннем варожай разведкі, камандзірскіх раз'ездаў. Уздоўж шашэйных і грунтавых дарог вялі барацьбу з узмоцненымі танкавымі тальёнамі праціўніка, якія выходзілі ўглыб абароны нашых перадавых часцей з мэтай захопу мастоў.

Частка сіл фашысцкай 3-й танкавай дывізіі пад камандаваннем В. Модэля, пераадольваючы ўпартае супраціўленне зводнага атрада войск Бабруйскага гарнізона і рэшткаў нашай 121-й стралковай дывізіі, упарта рухалася ўздоўж шашы да Рагачова. 2 ліпеня фашысты выйшлі ў заходнюю частку Рагачоўскага раёна. Разведка вывучала берагі, выбірала зручныя месцы для пераправы войск цераз раку. 3 ліпеня перадавыя часці гітлераўцаў падышлі да Рагачова і занялі яшчэ раней апусцелы горад. Камандаванне 3-й танкавай дывізіі фашыстаў мела намер да падыходу асноўных сіл фарсіраваць Дняпро і захапіць плацдарм на яго левым беразе.

Баі пачаліся раніцай 4 ліпеня. На пазіцыі нашых войск праціўнік абрушыў бомбавыя ўдары і масіраваны артылерыйскі агонь. Асабліва жорсткую атаку давялося зведаць 167-й стралковай дывізіі. У фашыстаў быў батальён баявых машын, здольных пераадолець водную перашкоду па дне ракі. Яны меркавалі фарсіраваць Дняпро на поўнач ад Рагачова. Але на гэтым участку ў нашай 167-й дывізіі быў моцны артылерыйскі і кулямётны заслон. Фашысты страцілі некалькі танкаў падбітымі і адышлі, саступіўшы месца авіяцыі. І зноў на пазіцыі 167-й дывізіі абрушыўся масіраваны бомбавы і артылерыйскі ўдар. Асабліва жорсткі агонь давялося зведаць стралковаму батальёну 465-га палка, які займаў пазіцыі каля в. Збароў. Фашыстам удалося зачаніцца за левы бераг, і яны сталі хутка нарошчваць сілы. Стралковы батальён 465-га палка быў змяты, але перакінутыя камандзірам корпуса Л. Р. Пятроўскім палкі 167-й і 61-й дывізій перайшлі ў контратаку. Бой зацягваўся. Тым часам да правага берага падышлі асноўныя сілы 3-й танкавай дывізіі праціўніка. Сапёры распачалі будаўніцтва пантоннай пераправы. Бой разгарэўся з новай сілай. Па наведзеным мосце фашысты пераправі лі салдат і баявую тэхніку. Танкі і мотапяхота ворага разгарнуліся ў баявы парадак і рушылі на пазіцыі нашых 465-га і 520-га стралковых палкоў. Камандзір корпуса перакінуў сюды яшчэ некалькі стралковых батальёнаў 61-й дывізіі і карпусную артылерыю. Бой быў надзвычай цяжкім. Гітлераўцы змагліся пацясніць нашу абарону і паглыбіцца ў бок Гадзілавіч. Абодва бакі неслі вялізарныя страты ў людзях і тэхніцы. Фашысцкая авіяцыя беспакарана бамбіла нашы пазіцыі. Пад вечар становішча стала мяняцца. Танкі праціўніка пачалі адыходзіць назад. Наша артылерыя ўзмацніла агонь. Фашысты пад прыкрыццём артылерыі і авіяцыі сталі перапраўляць свае войскі на правы бераг. Аднак стралкам 465-га палка ўдалося блакіраваць невялікія падраздзяленні праціўніка каля в. Збароў. Ноччу атрад каля 150 стралкоў на чале з камандзірам 465-га палка Федзіным ажыццявіў налёт на Збароў і знішчыў праціўніка. Да раніцы на левым беразе не было ніводнага нямецкага салдата. На полі бою засталіся разбітыя, абгарэлыя танкі і шмат забітых салдат праціўніка. Некалькі дзесяткаў танкістаў былі захоплены ў палон.

Упартае супраціўленне нашых войск пад Рагачовам, Барысавам, на іншых участках фронту выклікала трывогу сярод нямецкага камандавання. Генерал-палкоўнік Г. Гудэрыян, які камандаваў 2-й танкавай групай, паведамляў камандуючаму групай армій «Цэнтр» Ф. Боку, што «...праціўнік на ўсім участку наступлення аказвае жорсткае супраціўленне». Фельдмаршал фон Бок у сваю чаргу гэтай жа датай паведамляў па інстанцыі ў Стаўку: «Супраціўленне перад нашымі наступаючымі групамі значна ўзмацнілася. Праціўнік... аказвае жорсткае арганізаванае супраціўленне пры падтрымцы артылерыйскага агню». І яшчэ, 6 ліпеня: «Праціўнік перад 2-й танкавай групай узмацніў сваю групоўку за кошт таго, што падкінуў новыя часці ў напрамку Гомеля. Удары праціўніка ад Жлобіна на Бабруйск, а таксама ў раёне Бярэзіны дазваляюць думаць, што ён мяркуе стрымаць нашы танкавыя сілы, якія наступаюць цераз Бярэзіну, для таго, каб арганізаваць абарону на Дняпры». (Анфилов В. А. Начало Великой Отечественной войны. М., 1962. С. 137, 142.)

Нямецкае камандаванне, сустрэўшы арганізаваную абарону войск нашай 21-й арміі, пакінула думку аб фарсіраванні Дняпра ў раёне Рагачова, але яго авіяцыя сістэматычна бамбіла пярэдні край абароны нашых часцей. Разам з тым, гітлераўцы працягвалі імітаваць спробы пераправы, відаць, з тым, каб скрыць ад нашай разведкі свае сапраўдныя намеры.

І ўсё ж затрымаць гітлераўцаў на

Дняпры не ўдалося. Сканцэнтраваўшы 2-ю танкавую групу Гудэрыяна і перадавыя армейскія карпусы 2-й палявой арміі генерал-палкоўніка М. Вейхса на правым беразе Дняпра ад Оршы да Жлобіна, праціўнік знайшоў у нашай абароне слабыя месцы і трыма ўдарнымі групамі, аснову якіх складалі 47-ы, 46-ы і 24-ы матарызаваныя карпусы, 10—11 ліпеня 1941 г. фарсіраваў Дняпро на поўнач і поўдзень ад Шклова і ў раёне Быхава. Каля Быхава 24-ы фашысцкі матарызаваны корпус Г. Швепенбурга (3-я, 4-я танкавыя і 10-я матарызаваныя дывізіі) сустрэў перад сабой абарончыя пазіцыі, расцягнутыя больш чым на 50 км. Іх займала адна наша 187-я стралковая дывізія. Іншыя ж злучэнні, якія павінны былі арганізаваць тут абарону, знаходзіліся ў дарозе. Іх першыя эшалоны прыбылі тады, калі праціўнік на левым беразе ўжо заняў і значна расшырыў плацдарм. Прыбыўшыя батальёны адразу ж уступалі ў бой з танкамі. Але змяніць сітуацыю яны не маглі. Рухомыя сілы 24-га корпуса прарвалі нашу слаба арганізаваную і неэшаланіраваную абарону, выйшлі на аператыўны прастор у напрамку Чавусаў і Прапойска. За танкавымі сіламі з невялікімі інтэрваламі прайшлі 12-ы, 7-ы і 13-ы армейскія карпусы гітлераўцаў. Сітуацыя на ўсім Заходнім фронце зноў крайне абвастрылася. Вельмі напружанай заставалася яна і на левым яго крыле — у паласе 21-й арміі — у Рагачоўскім, Жлобінскім і Журавіцкім раёнах. З поўначы над яе флангам, на лініі Новы Быхаў — Прапойск, клінам навіслі варожыя танкавыя войскі. З захаду, на рубяжы Рагачоў — Парычы, разгортваліся 7 пяхотных дывізій 43-га і 53-га армейскіх карпусоў, якімі камандавалі адпаведна генералы Айзенбергер і Хейнрыке. Гэтыя дывізіі накіроўваліся з 2-га эшалона групы армій «Цэнтр». Каб як-небудзь затрымаць фашысцкае наступленне, наша каманданне паставіла войскам, у прыватнасці 21-й арміі, задачу — нанесці ўдар у агульным напрамку на Бабруйск, разграміць або скаваць тут войскі 2-й палявой арміі праціўніка.

13 ліпеня разгарэліся цяжкія баі. Паводле загада камандуючага Заходнім фронтам Маршала Савецкага Саюза С. К. Цімашэнкі 63-ы стралковы корпус наносіў удар у 3 напрамках. Яго левафланговая 154-я стралковая дывізія (437-ы, 473-ы, 510-ы стралковыя палкі), якую ўзначальваў палкоўнік Я. С. Факанаў і 508-ы гаўбічны полк карпусной артылерыі на чале з маёрам Даўгапілавым вызвалілі Жлобін. Адсюль яны развівалі наступленне ў напрамку Бабруйска. Управа ад яе выступілі 221-ы і 307-ы палкі 61-й стралковай дывізіі, якой камандаваў палкоўнік М. А. Прышчэпа. Перад дывізіяй стаяла задача сканцэнтраваць асноўныя дзеянні ў напрамку населеных пунктаў Блізняцы, Фалевічы, Старцы. Галоўны ўдар павінна была ажыццявіць 167-я дывізія (415-ы, 465-ы, 520-ы стралковыя палкі) на чале з В. С. Ракоўскім. Дывізія павінна была фарсіраваць Дняпро, авалодаць Рагачовам і адсюль развіваць наступленне ў бок Валосавіч.

Раніцай на поўнач ад Рагачова загрымела артылерыя. Бой адкрыў 415-ы полк. Ён павінен быў адцягнуць увагу праціўніка ад асноўнага напрамку ўдару і як мага даўжэй трымаць яго у няведанні аб сапраўдных намерах дывізіі. Ніжэй па цячэнні ракі, каля разбуранага рагачоўскага моста, страляла карпусная артылерыя. Спачатку яна прывяла праціўніка ў крайні беспарадак. Тым часам штурмавыя групы 465-га і 520-га стралковых палкоў адчалілі на процілеглы бераг. Следам за імі сапёры пацягнулі плыты. Аднак хутка праціўнік арганізаваўся, адкрыў артылерыйскі і мінамётны агонь, выклікаў авіяцыю... У суцэльным громе і рове не чуваць было каманд. Байцы і камандзіры рабілі сваю справу. Хуткае цячэнне ракі падхоплівала забітых і параненых байцоў і назаўсёды адносіла іх з гэтага грымучага пекла. Першым за правы бераг зачапіўся стралковы батальён 520-га палка. Стралкі расшырылі заняты «пятачок» і замацаваліся на ім. А там, на рацэ, па наплыўным мосце, які хістаўся пад нагамі, беглі стралкі, неслі станковыя кулямёты, мінамёты, трактары цягнулі гаўбіцы. Усё гэта адбывалася пад градам куль і шквалам артылерыйскага агню, разрывамі бомб. На захопленым нашымі байцамі плацдарме хутка накаплівaліся чырвонаармейцы. Яны збівалі варожую абарону, забяспечвалі пераправу стралковым, мінамётным і артылерыйскім падраздзяленням. Атака пачалася раптоўна. Маленькі пятачок плацдарма нібы ўзарваўся крыкам «Ура». Чырвонаармейцы, змінаючы абарону праціўніка, рушылі па вуліцах Рагачова. Стралкі разам з артылерыйскімі разлікамі выбівалі кулямётныя і гарматныя гнёзды. Радавыя Перапёлкін і Някрасаў непрыкметна падышлі да варожага танка, укапанага на вуліцы, і падпалілі яго.

Цяжка прыйшлося стралкам 415-га палка. Пераадолеўшы водную перашкоду

каля горада, яны ашынуліся ў стане ворага. Цэлы дзень полк прабіваўся да сваіх. Прарваўшыся праз 2 умацаваныя пазіцыі, ён злучыўся з дывізіяй у Рагачове. Позна вечарам 13 ліпеня Рагачоў быў поўнасцю ачышчаны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Далейшыя дзеянні 167-й дывізіі развіваліся ў напрамку на паўночны захад ад Бабруйска.

Некаторы час нашы войскі працягвалі цясніць праціўніка. Аднак, не маючы падтрымкі танкамі і авіяцыяй, іх наступленне паступова затухала. Дывізія замацавалася на захопленым плацдарме на захад ад Дняпра, на лініі Новы Быхаў — Стрэшын. Здудзічы, Парычы і перайшла да абароны. Гэты плацдарм нашы войскі ўтрымлівалі цэлы месяц. Баі тут былі напружаныя, але ні аднаму з бакоў не прынеслі істотнага тактычнага поспеху. Вось невялікая хроніка тых баёў. 1 жніўня гітлераўцы тройчы атакавалі войскі 167-й стралковай дывізіі на захад ад Рагачова. Іх пяхота ў суправаджэнні танкаў прарвалася ўглыб абароны дывізіі і зайшла ў тыл 465-му палку, стварыла пагрозу камандаму пункту дывізіі. Аднак з глыбіні абароны адкрылі агонь батарэі 122-мм пушак карпусной артылерыі, і праціўнік адышоў з вялікімі стратамі. Наступленне варожай пяхоты на гэтым жа ўчастку працягвалася і ў наступныя дні. 3 жніўня войскі 252-й (паводле іншых звестак 255-й) дывізіі праціўніка з танкамі атакавалі левы фланг 645-га палка і пачалі цясніць падраздзяленні стралкоў. Камандзір дывізіі В. С. Ракоўскі ўвёў у бой рэзерв. Праціўнік адышоў на зыходныя пазіцыі. Перагрупаваўшыся і атрымаўшы падмацаванне, ён зноў пайшоў у атаку. Баі прынялі зацяжны характар. Апошні бой цягнуўся да вячэрняга змроку. Полк адкінуў гітлераўцаў, але яго 1-ы батальён апынуўся адрэзаным. 2 дні ён адбіваўся ад праціўніка, потым ноччу штурмам прарваў акружэнне і выйшаў да сваіх. 7 жніўня бой разгарэўся з раніцы. Воіны 465-га палка адбілі 5 атак. На ўсім участку пярэдняга краю абароны войскі 63-га, 66-га, 67-га карпусоў стойка адбіваліся, утрымліваючы плацдарм.

Пакуль ішлі баі на Дняпры ў прыфрантавой паласе, на левабярэжжы пачаўся збор ураджаю. Жніво праходзіла ў вельмі складаных умовах — не хапала рабочых рук, тэхнікі; жанчыны, старыя, дзеці працавалі самааддана, над абстрэлам гармат і самалётаў. У многіх выпадках зерне з такоў здавалася прама ў дзеючую армію.

У сувязі з тым, што савецкія войскі стварылі пагрозу на флангах гітлераўскай групы армій «Цэнтр», фашысцкае вярхоўнае камандаванне рашэннем 30 ліпеня вымушана было спыніць наступленне на Маскву і перайсці да абароны. Для ліквідацыі пагрозы на сваім правым флангу яно скіравала 2-ю танкавую групу Гудэрыяна і 2-ю палявую армію Вейхса фронтам на поўдзень.

Генерал-палкоўнік Ф. Гальдэр, начальнік штаба сухапутных сіл Германіі, у сваім ваенным дзённіку 9 жніўня 1941 г. ў сувязі з гэтым зрабіў запіс: «3-я і 4-я танкавыя дывізіі, выконваючы пастаўленую задачу на ліквідацыі супраціўлення праціўніка каля Рагачова, перайшлі ў наступленне на Рагачоў і дасягнулі поспеху. Пяхотныя дывізіі будуць наступаць з левага фланга з мэтай падтрымкі наступлення танкавых дывізій» (3-я і 4-я танкавыя дывізіі да 15 жніўня вернуты пад Рослаўль для далейшага наступлення на Унечу, Старадуб і далей на поўдзень).

Задума нямецкага камандавання заключалася ў тым, каб увесці рухомыя сілы 2 танкавых дывізій і пяхотныя войскі 2 армейскіх карпусоў у міжрэчча Дняпра і Сажа і там з лініі Прапойск — Новы Быхаў наступаць супраць нашай 21-й арміі на поўдзень. Адначасовымі ўдарамі 7 пяхотных дывізій з захаду і паўночнага захаду выцесніць нашы войскі з плацдарма на заходнім беразе Дняпра, потым у выніку дзеянняў на поўнач ад Гомеля замкнуць іх у кальцо. Для падтрымкі гэтай групоўкі сюды з ельнінскага выступу накіроўвалася ўся бамбардзіровачная авіяцыя.

Танкі 3-й і 4-й дывізій 24-га матарызаванага корпуса фашыстаў з'явіліся апоўдні 9 жніўня з боку Прапойска. Тут іх сустрэлі войскі нашага 25-га танкавага корпуса, які з дня фарміравання быў амаль безмашынным, а за месяц баёў ён быў абяскроўлены. Баі адразу прынялі жорсткі характар. Спачатку гітлераўцам удалося пацясніць правы край абароны нашай 21-й арміі, але потым яе войскі прымусілі фашыстаў адвесці свае танкі на зыходныя пазіцыі. Адмовіўшыся ад лабавога ўдару ўздоўж шашы Прапойск — Рагачоў, фашысцкія танкавыя часці атакавалі 25-ы корпус з флангаў. 12 жніўня з паўночнага ўсходу перайшлі ў наступленне 13-ы, 12-ы, а паўночнага захаду — 53-і, а захаду, паміж Горвалем і Стрэшынам — 43-і армейскія карпусы. На працягу двух наступных дзён баёў праціўніку ўдалося пры падтрымцы танкаў, авіяцыі і ўзмоц-

ненай карпусной артылерыі пацясніць нашы войскі дняпроўскага плацдарма на заходнім беразе Дняпра. Каб не апынуцца адрэзанымі ад сваіх тылоў на ўсходнім беразе, войскі 63-га корпуса і 102-й стралковай дывізіі пакінулі гарады Рагачоў і Жлобін, гарадскі пасёлак Стрэшын і ноччу 14 жніўня пераправіліся на ўсходні бераг. У міжрэччы Дняпра і Бярэзіны ішлі цяжкія крывапралітныя баі. На поўначы праціўнік сіламі пяхотных дывізій 12-га, 13-га і часткова 53-га армейскіх карпусоў на працягу двух даён выцеснілі нашы войскі з занятых пазіцый. Баі прынялі манеўровы характар. Наш 67-ы стралковы корпус (102-я і 151-я стралковыя дывізіі) пачаў адыходзіць у бок Доўска, стрымліваючы ярасныя атакі варожых пяхотных дывізій. Часці 115-й стралковай дывізіі 13-й арміі, вельмі аслабленыя, пад націскам праціўніка, які наступаў з Быхаўскага раёна, самаадданa абараняліся ў раёне населеных пунктаў Абідавічы, Вець, Доўск.

117-я стралковая дывізія стойка абараняласа ў раёне вёсак Вялікая Зіміца, Палкі, Паляніна-вічы. Тут яна трапіла ў акружэнне і потым доўга і рашуча прабівалася да свайго корпуса. Яшчэ 12 жніўня ў сувязі з тым, што 117-я стралковая дывізія была выведзена ў паласу 13-й арміі, была аслаблена абарона ў раёне Доўска. Камандуючы 21-й арміяй перакінуў сюды з-пад Рагачова 167-ю стралковую дывізію. Тут яна прыняла на сябе асноўны ўдар 13-га армейскага корпуса праціўніка.

Раён Стрэшына абараняла 154-я стралковая дывізія. 13 жніўня яна атрымала загад пакінуць пасёлак і заняць абарону ўздоўж усходняга берага Дняпра. 43-і корпус ворага яшчэ раней падышоў да ракі, фарсіраваў яе сваімі чатырма дывізіямі, і, не сустрэўшы сур'ёзнага супраціўлення, вырваўся ў напрамку Буда-Кашалёва — Уваравічы. Стварылася рэальная пагроза акружэння ўсёй 21-й арміі. Праціўнік скараціў агульную лінію фронту і пачаў адсюль цясніць нашы войскі. 14 жніўня яны пакінулі Журавічы, Доўск і іншыя населеныя пункты.

Мужнасць і стойкасць чырвонаармейцаў перасягала ўсялякія магчымасці. Нягледзячы на жорсткія бамбардзіроўкі і артабстрэлы, савецкія часці самаадданa абаранялі свае рубяжы, самі пераходзілі ў атакі, траплялі ў акружэнне і прарываліся з яго, зноў атакуючы праціўніка. Але сілы канчаліся, а вораг ужо замкнуў кальцо ў Буда-Кашалёўскім раёне. Камандзір корпуса Л. Р. Пятроўскі пачаў збіраць свае часці і злучэнні. Яны ў гэты час адбіваліся ад ворага, які насядаў на вялікай прасторы Рагачоўскага, Журавіцкага, Жлобінскага раёнаў.

16 жніўня часці і падраздзяленні корпуса сканцэнтраваліся ў раёне дзеяння 154-й дывізіі на захад ад Буда-Кашалёва. Была створана група прарыву, у якую ўвайшлі 473-ы, 438-ы, 510-ы стралковыя палкі. Вырашана было прарывацца па дарозе на Губічы, уздоўж левага берага Дняпра, праз пазіцыі 134-й пяхотнай дывізіі праціўніка.

Глыбокай ноччу 17 жніўня раздаліся гарматныя выбухі. Гэта пайшлі на штурм

Адкрыццё памятнага знака каля Рагачова на месцы дыслакацыі штаба 63-га стралковага корпуса. Ліпень 1991 г.

палкі 63-га стралковага корпуса. Разам з атакуючымі ішоў камандзір корпуса Л. Р. Пятроўскі. Пакуль фашысты арганізаваліся, чырвонаармейцы, паліваючы кулямётным агнём варожыя пазіцыі, прарвалі абарону праціўніка, сталі пераадоліваць яго агнявыя пункты. У Губічах перадавы полк 154-й стралковай дывізіі разграміў штаб гітлераўскай дывізіі, паліў каля 50 транспартных і спецыяльных аўтамашын. Але не паспелі яшчэ ўсе калоны вырвацца з прарыву, як фашысты ўжо павялі арганізаваны бой. Кальцо зноў замкнулася. Там засталіся часці, якія забяспечвалі прарыў, а галоўныя калоны 154-й дывізіі ўжо выйшлі да Горваля, дзе абаранялася наша 232-я стралковая дывізія. Калі высветлілася, што не ўсе выйшлі з акружэння, Л. Р. Пятроўскі стварыў атрад і пайшоў з ім выручаць акружаныя часці і падраздзяленні. Яны прарвалі знешняе варожае кальцо, але яно замкнулася за іх спінай. Генерал павёў сваіх байцоў у атаку каля в. Скепня Жлобінскага раёна і загінуў у гэтым баі.

Да 19 жніўня ўцалелыя войскі корпуса выйшлі з акружэння і сканцэнтраваліся ў раёне Рэчыцы. Тут яны сталі ствараць новы абарончы рубеж.

А. Л. Манаенкаў.

Партызанскі фронт. Яшчэ ў сярэдзіне ліпеня паўстала пытанне аб арганізацыі партызанскіх груп на тэрыторыі раёна. Гэту работу ўзначалілі былыя першыя сакратары Рагачоўскага і Журавіцкага райкомаў партыі С. М. Свярдлоў і М. Ф. Шлыкаў. Асновай партызанскіх фарміраванняў павінны былі стаць знішчальныя батальёны. У ліпені група байцоў Рагачоўскага знішчальнага батальёна двойчы пераходзіла лінію фронту з мэтай збору звестак аб праціўніку і правядзення дыверсій. Кіраваў групай М. Г. Калінковіч. У час рэйдаў байцы правялі некалькі засад, здолелі вывесці з акружэння вялікую групу чырвонаармейцаў. Трое байцоў, у тым ліку М. Г. Калінковіч, загінулі.

15 жніўня нашы часці 63-га і 67-га стралковых карпусоў пад націскам праціўніка адступілі на поўдзень. На тэрыторыі Журавіцкага і Рагачоўскага раёнаў дзе-нідзе ўспыхвалі энергічныя баі. Гэта нашы падраздзяленні, якія прыкрывалі адыход асноўных сіл сваіх часцей, цяпер прарываліся да іх праз баявыя парадкі праціўніка.

У Будскім лесе ў гэты дзень адбылося пасяджэнне Рагачоўскага райкома партыі. Ён у складзе першага сакратара С. М. Свярдлова, другога — І. Ц. Зуевіча

М. Г. Калінковіч.

І. Ц. Зуевіч.

і членаў райкома застаўся для работы ў тыле ворага. Тут жа быў арганізаваны партызанскі атрад. У яго ўвайшлі камуністы і камсамольцы раёна і частка байцоў знішчальнага батальёна, воіны, якія адсталі ад сваіх часцей (усяго каля 120 чалавек). Камандзірам атрада быў прызначаны М. Ц. Кузняцоў. Камісарам стаў С. М. Свярдлоў. Штабныя справы былі даручаны Л. Коўтуну.

Рагачоўскі падпольны райком КП(б)Б

Сакратары: С. М. Свярдлоў (15.8.1941—6.7.1943), І. Ц. Зуевіч, члены райкома: К. М. Драчоў (15.8.1941—2.10.1943), А. А. Бірукоў (15.8.1941—6.10.1941), В. У. Паўлаў (з 1.2.1943), Ф. С. Тарасевіч (30.6.1943—15.2.1944), В. А. Мінайлаў (з 13.7.1943), Ц. Т. Ціхаміраў (з 19.1.1944).

Падпольны райком выдаваў газету «Камунар» (з 1943 г.).

З першага дня акупацыі раёна дзейнічаў і Рагачоўскі падпольны райком камсамола.

Рагачоўскі падпольны райком ЛКСМБ.

Сакратары: А. А. Бірукоў (да 1.7.1943), М. Ф. Шабеткін (1.8.1942—30.12.1943), М. Я. Ханяк (з 8.1.1944), сакратар па прапагандзе В. П. Данілаў (1.4—29.8.1943), члены райкома: М. Я. Данілава, В. Г. Туманаў (да кастрычніка 1941, загінуў), А. М. Дычкоў (да кастрычніка 1941), Шабеткін (1.4.1942—30.12.1943), І. Л. Шыцікаў (1.9.1942—26.3.1943, загінуў), А. І. Красічкаў (з 20.4.1943), Н. А. Цэйтлін (з 1.7.1943).

У складаным становішчы апынуліся ў пачатку сваёй дзейнасці рагачоўскія партызаны. Іх першыя баявыя крокі былі няўпэўненыя і даваліся з вялікімі цяжкасцямі. Пасля мірных заняткаў, справа, за якую яны ўзяліся, была незвыклай для іх. Не хапала прадуктаў, зброі, адсутнічала сувязь. Яшчэ больш ускладнілі становішча раннія восеньскія халады. У гэтай сітуацыі кіраўніцтва атрада не знайшло адзінага рашэння адносна далейшых сваіх дзеянняў, і як вынік — атрад распаўся. Кузняцоў і Коўтун з часткай байцоў пайшлі на ўсход з

намерам перайсці лінію фронту. Аднак далёка адысці яны не змаглі. Пасля доўгіх блуканняў многія з іх знайшлі прытулак у добрых людзей у Краснапольскім і Клятнянскім раёнах. Крыху пазней з часткай атрада перайшоў на левабярэжжа Драчоў. У выніку пастаяннага перамяшчэння атрада ад яго адарваўся Бірукоў, які пасля беспаспяховых спроб знайсці журавіцкіх партызан вярнуўся ў Быхаўскі раён да сваіх бацькоў і там пазней разам з акружэнцамі арганізаваў атрад. Свярдлоў, які застаўся з невялікай групай партызан, перайшоў на падпольную работу.

Яшчэ ў больш цяжкім становішчы апынуліся патрыёты Журавіцкага раёна. За некалькі дзён да акупацыі раёна загінуў першы сакратар Журавіцкага РК КП(б)Б Шлыкаў. Новы ж сакратар І. Ф. Мышчак і шэраг членаў райкома накіраваліся ў савецкі тыл. Застаўшыся без кіруючага ядра, патрыёты не змаглі аб'яднацца ў атрад. Станаўленне партызанскага руху зацягнулася тут да восені 1942.

Тым часам, як і на ўсёй акупіраванай тэрыторыі, фашысты ліквідавалі сістэму органаў Савецкай улады і ўстанавілі акупацыйны рэжым. Тэрыторыі Рагачоўскага і Журавіцкага раёнаў былі ўключаны ў зону армейскага тылу групы армій «Цэнтр». Тут устанаўленне «новага парадку» і рэалізацыя злачынных планаў знаходзіліся ў руках тайнай палявой паліцыі, ваеннай разведкі і контрразведкі, паліцыі бяспекі і СД, а таксама мясцовай паліцыі аховы парадку. У Рагачове і Журавічах былі створаны раённыя і гарадскія камендатуры, якія падпарадкоўваліся Чэрыкаўскай палявой камендатуры. У Новым Доўску ў будынку былой МТС размясцілася перыферыйная каманда тайнай паліцыі ГФП-724. У райцэнтрах сталі працаваць аддзяленні гестапа, у Рагачове, Журавічах, Доўску — аддзяленні жандармерыі. Акупанты перабсталявалі ўсе прадпрыемствы, якія не былі вывезены, для ваенных мэт. Рагачоўскі лесазавод выконваў толькі ваенныя заказы; выпускаючы брусы і верхні насціл для мастоў, шпалы, матэрыял для абсталявання казармаў, канюшняў, складоў. Каменедрабілка выраблялa друз для рамонту шашэйных дарог. На хлебапякарнях у Рагачове, Журавічах, Доўску выпякаўся хлеб для нямецкай арміі і цывільных чыноўнікаў. У раёне таксама працавала некалькі масласырзаводаў. Паводле ўспамінаў былой партызанскай сувязной Вольгі Герман, ужо ў першыя месяцы свайго «гаспадарання» акупанты перайменавалі ўсе саўгасы раёна ў земскія двары і далі кожнаму з іх сваю назву. Па сутнасці земскія двары сталі зборнымі і адкормачнымі пунктамі, куды зганялі нарабаваную ў насельніцтва жывёлу і птушку, потым адпраўлялі ў гітлераўскую армію. Калгасы сталі называцца абшчыннымі гаспадаркамі. Усялякі самавольны падзел зямлі забараняўся, у іншым выпадку сяляне прыцягваліся да адказнасці і страчвалі права на зямлю наогул. Палітычна ненадзейныя гаспадары да карыстання зямлёй не дапускаліся. Акрамя таго, гітлераўскія ўлады абкладвалі сялянскія гаспадаркі непамерным падаткам на пастаўку ім хлеба, бульбы, мяса, малака. Узброеныя атрады акупантаў выязджалі ў вёскі Гарадзецкага, Вішаньскага, Кісцянёўскага сельсаветаў і забіралі ў сялян усё, што было ў іх дварах. Акупанты шырока ўжывалі сістэму штрафаў. За невыкананне паставак сялян пазбаўлялі зямлі, забіралі ўсю жывёлу. Вось толькі некалькі характэрных прыкладаў з загадаў нямецкага сельскагаспадарчага каменданта: «За няздачу малака і яек у грамадзян вёскі Мадора Яшкова Якава канфіскаваць апошніх кароў, а ў Далгаковай Арыны і Болдырава Івана — кароў, усіх авечак і курэй здаць на базу «Заготжывёла». Яшчэ ў адным загадзе гаварылася, што за «злосную няздачу малака і яек і непадпарадкаванне старасту грамадзяніна вёскі Вялікія Стралкі Трошкава Елісея пазбавіць правоў карыстання зямлёй, канфіскаваць каня і сельгасінвентар і перадаць іх іншай асобе, а карову і курэй здаць на базу «Заготжывёла». І такіх загадаў было шмат.

Ужо ў першыя дні акупацыі гітлераўцы расстралялі шэраг савецкіх актывістаў і камуністаў. Сярод іх былі калгасны брыгадзір ардэнаносец А. Клюеў, сакратар камсамольскай арганізацыі в. Хатар камсамольскай арганізацыі в. Хатоўня П. Прыкоценка і яго маці, старшыні Балатнянскага і Званецкага сельсаветаў І. Дзегцяроў, А. Пазнякоў, старшыня калгаса Т. А. Адміралаў. Фашысты стварылі лагеры ваеннапалонных у вёсках Новы і Стары Доўск, Гадзілавічы і іншых. Восенню 1941 г. грабяжы і расстрэлы прынялі масавы характар. 6 лістапада 1941 г. акупанты расстралялі ў Рагачове 3 тысячы мірных жыхароў, крыху пазней 400 ваеннапалонных у Журавічах, а 17 студзеня 1942 г.— яшчэ 176 жыхароў Журавіцкага раёна.

Тым часам у народзе нарастала супраціўленне акупантам. У шэрагу населеных пунктаў афармляліся партыйныя і кам-

самольскія падпольныя арганізацыі. Ужо восенню 1941 — вясной 1942 г. былі створаны падпольныя партыйна-камсамольскія групы ў Рагачове, вёсках Свержань, Серабранка, Азяраны. Вестка пра разгром гітлераўцаў пад Масквой акрыліла людзей, надзея на хуткае вызваленне падштурхнула іх да дзеянняў. У гэтым працэсе вялікую ролю адыгралі патрыёты-падпольшчыкі. Яны растлумачвалі насельніцтву сутнасць нямецка-фашысцкай акупацыйнай палітыкі, выхоўвалі людзей у духу патрыятызму, аб'ядноўвалі разрозненыя дзеянні патрыётаў у адзіную плынь арганізаванай народнай вайны. Больш упэўнена стаў дзейнічаць падпольны райком партыі, умацоўваліся яго сувязі з патрыятычнымі сіламі раёна, якія пры першай неабходнасці былі гатовы ісці ў лес. Гэтаму таксама садзейнічала ўстанаўленне сувязі з разведгрупай І. М. Чорнага, а праз яе — са штабам Заходняга фронту. Цяпер, калі з'явілася сувязь, райком партыі стварыў разгалінаваную сетку агентурнай разведкі і праз яе збіраў для Заходняга фронту даныя аб праціўніку.

У сярэдзіне лета 1942 г. ў раён прыйшоў 255-ы партызанскі атрад. Яго арганізаваў на Быхаўшчыне член Рагачоўскага падпольнага райкома партыі А. А. Бірукоў з ваеннаслужачымі малодшым лейтэнантам М. К. Марусавым, Д. А. Залатаровым, М. А. Канстанцінавым, А. Я. Галашчапавым, якія не змаглі выйсці ў савецкі тыл і зімавалі ў вёсках Алень, Цвёрдава, Кучын, Камуна, імя Фрунзе і інш. Потым прыйшлі яшчэ 15 ваеннаслужачых і некалькі чалавек з мясцовай моладзі. 28 красавіка члены атрада выйшлі ў Кучынскі лес. Пасля першых сустрэч з карнікамі ў Быхаўскім раёне, ухіляючыся ад далейшых баёў, партызаны выйшлі ў Рагачоўскі раён. Тут паводле рашэння райкома партыі атрад аб'яднаўся з рагачоўскай групай С. М. Свярдлова — І. Ц. Зуевіча. 255-ы аб'яднаны атрад арганізацыйна ўмацаваўся, значна павялічылася яго актыўнасць. У канцы верасня камандаванне ахоўнай дывізіі, выкарыстаўшы мясцовыя гарнізоны, паліцыю, праводзіла карныя аперацыі. Ухіляючыся ад адкрытых сутычак з рэгулярнымі войскамі, партызаны атрада вялі манеўраныя дзеянні ў Журавіцкім і сумежным раёнах.

Яшчэ раней, у ліпені 1942 г., камандаванне атрада ўстанавіла сувязь з Клічаўскім аператыўным цэнтрам, атрад быў падпарадкаваны яго аператыўнаму кіраўніцтву і атрымаў нумарное абазначэнне 255-ы. Байцы атрада мелі задачу перанесці свае дзеянні на чыгунку і арганізаваць зрыў варожых перавозак па чыгунках і шашэйных дарогах. Дыверсійныя групы да канца года падарвалі і разбілі на чыгунцы ў Быхаўскім, Рагачоўскім і іншых раёнах 29 паяздоў. У баях партызаны знішчылі і разагналі 28 паліцэйскіх участкаў і валасных управаў, а таксама варожыя гарнізоны ў вёсках Дзедлава, Гадзілавічы, Струкі, Стары Крыўск. Выходзячы з-пад удараў карнікаў, 255-ы атрад правёў некалькі адкрытых баёў, у тым ліку каля вёсак Гарадзец, Мяркулавічы, Хватаўка, Перакоп, Свержань, Сяліба, Загацце. У кастрычніку 1942 г. атрад знайшоў каля Лозаўскай дачы Буда-Кашалёўскага раёна склад зброі і боепрыпасаў. У жніўні 1941 г. тут праходзілі моцныя баі акружаных часцей 63-га і 66-га стралковых карпусоў з гітлераўскімі войскамі 12-га, 43-га армейскіх карпусоў і танкавымі часцямі Гудэрыяна. Пры адступленні савецкія воіны, відаць, схавалі частку сваёй зброі і боепрыпасаў. Партызаны перазахавалі гэты склад і ўзялі пад сваю ахову (пазней атрады Клічаўскага аператыўнага цэнтра вывезлі зброю на свае базы). У выніку партызаны атрымалі каля мільёна патронаў, калі пасля выхаду з баёў з карнікамі мелі вострую патрэбу ў боепрыпасах, а дапамога з савецкага тылу перапынілася з-за дрэннага надвор'я.

Восенню 1942 г. па заданню ЦК КП(б)Б з савецкага тылу ў паўночныя раёны Гомельскай вобласці прыбылі некалькі арганізатарскіх і дыверсійных груп. Іх асабовы склад прайшоў курс навучання ў партызанскіх школах. У Рагачоўскі і Журавіцкі раёны прыбылі групы на чале з І. М. Дзіканам, А. С. Язерскім, Ф. І. Шылавым, Т. І. Ціхаміравым (агульная колькасць 62 чалавекі).

Арганізатарская група І. М. Дзікана — С. М. Белых дасягнула тэрыторыі Рагачоўскага раёна 5 кастрычніка. Адсюль у лістападзе група перайшла на левы бераг Дняпра і разгарнула баявыя дзеянні на дарогах Рагачоўскага, Журавіцкага і Буда-Кашалёўскага раёнаў. У групу ўваходзіла 15 партызан, яны ад Сураж-скіх «варот» да месца прызначэння прайшлі па тылах ворага некалькі сот кіламетраў і ўяўлялі сабой зладжанае баявое ядро. На месцы група папоўнілася байцамі, якія трапілі ў акружэнне і жылі ў вёсках, а таксама мясцовай моладдзю. Група аформілася ў 256-ы партызанскі атрад, які ўзначаліў старшы лейтэнант С. М. Белых. Актыўныя дзеянні партызан хутка прынеслі ім вядомасць. У атрад

пацягнулася моладзь з навакольных і далёкіх вёсак. Яго баявыя групы арганізоўвалі засады на дарогах, падрывалі масты, ачышчалі раён ад мясцовай паліцыі і валасных управаў. У баях атрад рос, мужнеў, яго асабовы склад перайшоў да больш складаных аперацый — ліквідацыі варожых гарнізонаў. У снежні 1942 г. партызаны разбілі і разагналі Янаўскі, Ржэўскі, Дзедлаўскі, Задуброўскі, Варановіцкі, Палкаўскі нямецка-паліцэйскія гарнізоны. У час аперацый партызаны захапілі шмат зброі, адбілі нарабаваную ў насельніцтва маёмасць, сельскагаспадарчыя прадукты і вярнулі іх былым уладальнікам. У лістападзе 1942 г. байцы здзейснілі налёт на нямецкі склад, захапілі каля 700 пудоў зерня, каля 500 пудоў з іх раздалі сялянам в. Орсічы. У хуткім часе яны разбілі нямецкі зерняскладу в. Башыца, канфіскавалі каля тысячы пудоў зерня і таксама раздалі мясцовым жыхарам. У в. Красніца партызаны атрада ліквідавалі нарыхтоўчы пункт — забралі яйкі, соль, пшаніцу, фасоль. На шашы паміж Гадзілавічамі і Доўскам партызаны напалі на санны абоз, захапілі 400 кілаграмаў солі і іншыя харчовыя тавары.

Выхад народных мсціўцаў на шашэйныя дарогі станавіўся масавым. Дыверсійныя групы, буйныя стралковыя падраздзяленні мініравалі дарогі, арганізоўвалі засады на аўтамашыны і санныя абозы. Праціўнік таксама не пакідаў партызан у спакоі. 14 лютага 1943 г. батальён здраднікаў «Днепр», які складаўся з былых савецкіх ваеннапалонных, напаў на партызан 256-га атрада ў в. Свержань. Праціўнік меў вялікую перавагу ў колькасным складзе, а таксама ў якасці стралковай зброі і ўзбраенні. Партызаны ведалі пра намеры праціўніка і яго колькасць, таму сустрэлі яго арганізаваным агнём. Завязаўся жорсткі бой. Праціўнік залёг. У гэты час партызаны часткай атрада абходным манеўрам выйшлі ў тыл ворага, затым адзіным ударам з тылу і імгненнай лабавой атакай разбілі здраднікаў. У гэтым баі праціўнік страціў 48 салдат забітымі і некалькі дзесяткаў параненымі. Партызаны захапілі гармату, 7 кулямётаў, 37 вінтовак, патроны і іншыя трафеі. Праз тыдзень партызаны раптоўным налётам вызвалілі рабочую каманду лагера ваеннапалонных, якая размяшчалася ў Новым Доўску. І ваеннапалонныя і паліцэйскія, што ахоўвалі іх, былі залічаны ў атрад. Адначасова партызаны напалі на гарнізон у в. Стары Доўск. У час штурму байцы атрада ўзялі 3 кулямёты, 26 вінтовак, вызвалілі 48 палонных, якія таксама ўліліся ў атрад. 23 лютага, выконваючы заданне камандавання, рота партызан сутыкнулася з «казакамі» каля в. Каменка. Бой працягваўся каля гадзіны. Партызаны забілі 18 здраднікаў, захапілі 2 кулямёты, 21 вінтоўку, патроны, гранаты, 20 коней.

Разгром гітлераўцаў пад Сталінградам маральна падтрымаў нашых людзей, што змагаліся ў смяртэльна небяспечных абставінах у тыле ворага. Аднак у ваенных адносінах лягчэй не стала. Імкнучыся забяспечыць бесперабойную перавозку грузаў па дасягнутых камунікацыях, акупацыйная адміністрацыя пастаянна нарошчвала сілы па барацьбе з партызанамі. Павялічылася колькасць гарнізонаў, аднаўляліся старыя, у глыбінцы тэрмінова былі створаны новыя варожыя апорныя пункты. Усе гарнізоны былі павялічаны ў колькасным баявым складзе і ўмацаваны інжынернымі збудаваннямі. Аднак і партызанскія атрады за гэты час значна выраслі, набылі ваенны вопыт, павысілі баявыя якасці. І ўсё ж для паспяховай барацьбы з буйнымі гарнізонамі праціўніка неабходна было аб'яднаць партызанскія сілы ў больш буйныя фарміраванні, палепшыць тактычныя адзінкі, іх арганізацыю і аператыўнае кіраванне дзеяннямі атрадаў. Рашэннем гэтых арганізацыйных пытанняў заняўся Рагачоўскі падпольны райком партыі, 18 лютага 1943 г. ён звярнуўся ў Клічаўскі аператыўны цэнтр з ініцыятывай аб'яднання атрадаў у брыгаду. Клічаўскі аператыўны цэнтр сваімі загадамі ад 22, 27 лютага і 11 сакавіка стварыў дзве партызанскія брыгады: 8-ю Рагачоўскую і 10-ю Журавіцкую. У гэты ж час арганізатарская група І. М. Дзікана разгарнулася ў Журавіцкі падпольны райком партыі. Яго ўзначаліў Ігнат Максімавіч Дзікан (да верасня 1943 г., потым Самуіл Паўлавіч Дзівачэнка).

Беларускі штаб партызанскага руху (БШПР) настойліва «прабіваўся» на сувязь з партызанамі Гомельшчыны. Штаб меў толькі агульныя звесткі пра атрады, якія дзейнічалі ў вобласці. Звесткі паступалі праз радыёстанцыі разведвальных органаў Чырвонай Арміі, ад Клічаўскага аператыўнага цэнтра і ўкраінскіх партызан. Аднак былі яны даволі агульныя і не заўсёды аператыўныя. У сакавіку 1943 г. гомельскія партызаны атрымалі першыя пяць радыёстанцый. У тым ліку два радысты з лёгкімі пераноснымі радыёстанцыямі «Поўнач» прыбылі ў Рагачоўскую і Журавіцкую брыгады. Яны былі перакінуты самалётамі з са-

вецкага тылу на аэрадром Клічаўскага аператыўнага цэнтра, адкуль прыйшлі ў брыгады.

Больш складана вырашалася пытанне з палётамі авіяцыі да партызан Гомельшчыны. Нарэшце начальнік Цэнтральнага ШПР (ЦШПР) П. К. Панамарэнка дабіўся ў Стаўцы ваеннага галоўнакамандуючага, каб для палётаў да беларускіх партызан былі выдзелены некалькі авіяцыйных часцей і падраздзяленняў, якія базіраваліся на франтавых аэрадромах, бліжэй да партызан. У самы разгар майскіх баёў з карнікамі 8-я Рагачоўская брыгада 3 мая пакінула свой зімовы лагер у Азяранскіх лясах і перайшла ў Быхаўскі, а затым у Кіраўскі раёны, пакінуўшы ў Крушынаўскай дачы 259-ы атрад для атрымання авіягрузу з савецкага тылу. У ноч на 13 мая да партызан прыляцеў першы самалёт і скінуў ляскам байцам зброю, боепрыпасы, медыкаменты.

10-й Журавіцкай брыгадзе не ўдавалася атрымаць авіягруз з-за бесперапынных баёў з карнікамі. 10 мая партызаны брыгады перайшлі на левы бераг Сажа да чачэрскіх партызан, дзе праз некаторы час атрымалі для брыгады груз з боепрыпасамі і зброяй. Гэта дапамога з Вялікай зямлі была, безумоўна, мізэрнай для двух з палавінай тысяч партызан брыгады, аднак стала сапраўднай падзеяй у іх жыцці, узняла маральны дух байцоў.

Стварэнне партызанскіх брыгад, падпольных партыйных і камсамольска-маладзёжных арганізацый у Рагачоўскім і Журавіцкім раёнах, устанаўленне сувязі з цэнтральнымі партыйнымі органамі Беларусі і БШПР узнімала народную барацьбу на новы этап развіцця. На працягу вясны 1943 г. ў атрады ўліліся сотні хлопцаў і дзяўчат з навакольных вёсак. Праз мясцовых партызан і падпольшчыкаў была наладжана шырокая масава-палітычная работа ва ўсіх населеных пунктах, у тым ліку і ў варожых гарнізонах. Жыццё, побыт і баявая дзейнасць партызан многімі гранямі зліваласа з народам. Частка насельніцтва, каб уберагчыся ад акупантаў, знаходзілася ў сямейных лагерах пры партызанскіх атрадах. Адзін з такіх лагераў быў арганізаваны каля в. Гадзілавічы.

За сакавік — красавік 1943 г. 10-я Журавіцкая брыгада ператварылася ў буйное злучэнне. Баявы і колькасны склад яе ўключаў 9 буйных атрадаў агульнай колькасцю 2494 партызаны (на 1 мая 1943 г.). На ўзбраенні партызаны мелі 2101 вінтоўку, 67 аўтаматаў, 96 кулямётаў, 24 мінамёты, процітанкавую пушку. Асабовы склад брыгады размяшчаўся ў населеных пунктах, аднак на адным месцы затрымліваўся нядоўга. На 27 красавіка партызаны размяшчаліся ў вёсках Рыскова, Каменка, Пераком, Ударнік, Варашылаў. Атрады дзейнічалі ў міжрэччы Дняпра і Сажа на тэрыторыі Журавіцкага, Рагачоўскага, Буда-Кашалёўскага, Кармянскага, Чачэрскага, Церахоўскага раёнаў. Сваімі актыўнымі баявымі дзеяннямі атрады трымалі ў напружанні транспартную сістэму Доўскага вузла і не дазвалялі працiўніку бесперашкодна вывозіць эканамічныя рэсурсы з тэрыторыі сваёй зоны.

Іншае становішча складвалася ў партызан 8-й Рагачоўскай брыгады. Дыслацыраваліся яны на вельмі бойкім месцы. Пад ударамі брыгады знаходзілася транспартная сістэма правабярэжнай часткі Дняпра. Асноўная база 8-й Рагачоўскай брыгады знаходзілася ў Азяранскіх лясах, паблізу чыгункі і буйных варожых гарнізонаў, у тым ліку і Бабруйскага. За два месяцы з моманту арганізацыі брыгады партызаны на чыгунцы паміж Жлобінам і Бабруйскам пусцілі пад адхон два эшалоны з грузамі рознага прызначэння. Каля станцыі Рагачоў дыверсійныя групы падарвалі мост, здзейснілі крушэнне воінскага эшалона, у выніку былі разбіты паравоз і сем вагонаў.

Камандаванне брыгады не стварала пастаянных лагераў. Ухіляючыся ад баёў з карнікамі, партызаны вялі маневраныя дзеянні ў Рагачоўскім, Быхаўскім, Кіраўскім, Клічаўскім раёнах. У сувязі з гэтым на першым часе камандаванне абмяжоўвала прыём патрыётаў у партызаны. Асноўныя тактычныя адзінкі фарміраваліся не буйнымі, а рухомымі, узброенымі лёгкай стралковай зброяй. У брыгадзе арганізаваўся кароткачасовы курс падрыхтоўкі малодшых і сярэдніх камандзіраў, шмат увагі звярталася на падбор і навучанне падрыўнікоў, арганізатараў разведкі. Разведка для 8-й Рагачоўскай брыгады была асноўнай сферай дзейнасці. Гэта задача была пастаўлена перад камандаваннем брыгады штабам Заходняга фронту. На 1 мая 1943 г. брыгада складалася з 5 атрадаў агульнай колькасцю 563 партызаны. На ўзбраенні мела 38 ручных, 3 станковыя кулямёты, 22 аўтаматы, вінтоўкі.

У канцы красавіка 1943 г. працiўнік сканцэнтраваў два палкі з танкамі, бронемашынамі і артылерыяй у раёне населеных пунктаў Доўск, Гадзілавічы, Мяр-

кулавічы, Турск, Стары і Новы Крыўск, агульнай колькасцю да 5 тысяч салдат і афіцэраў і павёў наступленні супраць журавіцкіх партызан. 10-я Журавіцкая брыгада пакінула сваё месца базіравання і перайшла ў Лозаўскі лес Буда-Кашалёўскага раёна, заняла абарону каля вёсак Лозаў, Рагінь, Негаўка, Старына, Аборкі, Царкоўе. Дзве атакі былі адбіты. Потым праціўнік увёў асноўныя сілы і пачаў наступленне з трох напрамкаў, аднак і пасля гэтых атак карнікі не дасягнулі поспеху. І толькі вечарам, пасля шэрага атак, вораг прарваўся на ўчастку абароны 263-га атрада, уклініўся ў лес з боку в. Лозаў і прымусіў некаторыя атрады партызан перайсці на новыя пазіцыі. Ноччу брыгада знялася з пазіцый і пайшла да в. Малыя Казловічы. У Лозаўскім баі партызаны знішчылі 23 аўтамашыны, лёгкі танк, бронемашыну, забралі 30 страявых коней. Быў забіты гітлераўскі палкоўнік, які кіраваў боем. Партызаны страцілі 6 чалавек забітымі, 32 параненымі. Былі разбіты пушка, два кулямёты і некалькі мінамётаў. Загінуў камандзір брыгады С. М. Белых. Праціўнік не пакідаў партызан у спакоі, пасля працяглых манеўраных баёў брыгада выйшла ў засожскія лясы і адтуль асобнымі атрадамі і дыверсійнымі групамі выходзіла на заданні ў Журавіцкі, Кармянскі, Буда-Кашалёўскі, Церахоўскі і Рагачоўскі раёны.

3—17 мая 1943 г. нямецкае камандаванне групы армій «Цэнтр» арганізавала буйную карную аперацыю супраць партызан Клічаўскай зоны. Азяранскі лес, дзе ў той час размяшчалася 8-я Рагачоўская брыгада, таксама быў блакіраваны. 5 мая, не прымаючы бою, брыгада выйшла ў Быхаўскі, а затым у Кіраўскі раёны. Пазней зноў вярнулася ў рагачоўскія лясы.

Калі пачалася аперацыя «Рэйкавая вайна», роўна апоўначы 3 жніўня загрымелі выбухі на чыгунцы ў раёне Рагачова.

На лініі ад в. Чырвоны Араты да ст. Рагачоў дзейнічалі атрады 537-ы, 538-ы, 539-ы, 100-ы Кіраўскай ваенна-аператыўнай групы (ВАГ) і зводная група 61-га, 620-га, 760-га атрадаў. 8-я Рагачоўская брыгада атрымала загад ЦШПР правесці аперацыю «Рэйкавая вайна» 31 ліпеня ў перуноўскіх лясах Кіраўскага раёна, куды напярэдадні перайшла з блакіраваных карнікамі азяранскіх лясоў. Адсюль асобныя падраздзяленні брыгады выйшлі да чыгункі Бабруйск — Жлобін. Каля раз'езда Амельня партызаны атакавалі ахову і здзейснілі 140 узрываў рэек, разбурылі стрэлачныя пераводы, семафор, гнуткія цягі і іншае станцыйнае абсталяванне.

10-я Журавіцкая брыгада базіравалася за Сажом у Кармянскім раёне, а яе атрады, якія самастойна выконвалі задачы, былі разгрупаваны на вялікай тэрыторыі. На аперацыю партызаны выйшлі ў наступную ноч. Першая група атрадаў штурмам авалодала ўчасткам чыгункі паміж станцыямі Салтанаўка і Шарыбаўка і падарвала 754 рэйкі. Другая група атрадаў, якая павінна была разбурыць дарогу на ўчастку Хальч — Старая Рудня, спазнілася да пачатку аперацыі і вымушана была ўступіць у бой з нямецкай камандай, што прыбыла са Жлобіна. Кароткім боем гэта група атрадаў затрымала немцаў і дапамагла атрадам першай групы без перашкод выконваць свае задачы.

У ноч на 6 жніўня партызаны зноў правялі аперацыю паміж станцыямі Салтанаўка і Хальч. У выніку было ўзарвана 856 рэек. Паспяховым быў паўторны выхад партызан 8-й Рагачоўскай брыгады да раз'езда Амельня ў другой палавіне жніўня. У гэтай аперацыі было падарвана 1084 рэйкі. Масавыя аперацыі партызан на чыгунцы працягваліся ўсю восень. Праціўнік з адчаем абараняў шашэйныя дарогі і чыгункі, выкарыстоўваючы іх для падвозу і перагрупоўкі войск і тэхнікі. На транспартных камунікацыях ствараліся і пастаянна нарошчваліся буйныя гарнізоны. У Рагачове знаходзілася 8 тысяч салдат з нямецкіх палявых ахоўных часцей і каманд, а таксама ўласаўцаў, паліцыі. Амаль такі ж гарнізон размяшчаўся ў Жлобіне. У сярэдзіне жніўня ўзмоцненыя варожыя апорныя пункты актывізавалі барацьбу супраць партызан, арганізоўвалі аблавы на мірных жыхароў, насільна вывозілі іх у Германію. Пры падтрымцы

Лясны лагер жыхароў вёскі Гадзілавічы

баявых падраздзяленняў гаспадарчыя каманды акупантаў распачалі ўборку ўраджаю. Не аслабляючы ўдараў па дарогах, партызаны разгарнулі актыўныя дзеянні па выратаванню насельніцтва і вырашчанага ім ураджаю. 2 жніўня 10-я Журавіцкая брыгада разграміла нямецкую каманду каля в. Каменка. У аперацыі прымала ўдзел таксама група байцоў са спецатрада «Слаўны». Пра-ціўнік меў намер забраць ураджай, людзей вывезці на будаўніцтва абарончых рубяжоў 9-й палявой арміі, затым на работу ў Германію. Аналагічныя аперацыі супраць рабаўнікоў правяла Рагачоўская брыгада 8 і 16 жніўня.

Па загаду Магілёўскай абласной ВАГ ад 20 жніўня 1943 г. 8-я Рагачоўская брыгада ўдзельнічала ў аперацыі магілёўскіх партызан па адначасоваму разгрому некалькіх гітлераўскіх гарнізонаў. У гэтай аперацыі партызаны брыгады разам з 537-м атрадам Кіраўскай ВАГ разбілі нямецкі гарнізон у в. Падсёлы. Для замацавання партызан на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна 12 жніўня была створана 1-я Буда-Кашалёўская брыгада. На яе фарміраванне выдзелены тры атрады з 10-й Журавіцкай брыгады: 262-і імя В. І. Чкалава, 263-і імя М. І. Кутузава і 108-ы імя Р. І. Казлоўскага агульнай колькасцю 693 партызаны з поўным узбраеннем (601 вінтоўка, 15 аўтаматаў, 25 кулямётаў, 15 аўтаматаў, радыёстанцыя «Поўнач»).

Наступіла восень 1943 года. Чырвоная Армія на шырокім фронце, ад Вялікіх Лук на поўначы да Чорнага мора, гнала гітлераўскія войскі на захад. У канцы верасня нашы войскі ўшчыльную падышлі да ўсходніх межаў Беларусі і пачалі яе вызваленне.

У размяшчэнне 10-й Журавіцкай брыгады ў Кармянскім раёне 20 верасня пачалі прарывацца інжынерныя войскі праціўніка. Яны распачыналі будаўніцтва абарончых пазіцый на правым беразе Сажа і наводзілі пераправы ў вёсках Струмень і Васільеўка. Праз шэсць дзён на дарогах пацягнуліся адступаючыя гітлераўскія часці. Партызаны арганізавалі засады ў раёне вёсак Горкі, Выдранка, Буда Кляшінская, Сабалі, Мікалаеўка, Свярбілаўка.

Ноччу з 1 на 2 кастрычніка партызаны выбілі пяхотны батальён з невялікай вышыні каля в. Лозаўшчына і накіраваліся ў напрамку вёсак Гута Асіноўская, Осава. Тут асноўным складам злучыліся з 260-й стралковай дывізіяй 11-й арміі; 267-ы атрад, які дзейнічаў у Церахоўскім р-не, 28 верасня злучыўся каля в. Сянькова Добрушскага р-на з 17-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіяй конна-механізаванай групы.

463 партызаны брыгады знаходзіліся на заданнях у Журавіцкім, Рагачоўскім і іншых раёнах. Пазней, у розны час, яны выйшлі ў савецкі тыл. Агульны склад брыгады налічваў 3034 партызаны. З перадавымі часцямі Чырвонай Арміі злучыліся 2811 партызан. Было забіта і прапала без вестак 119 партызан. У Чырвоную Армію ўліўся 1591 партызан.

За перыяд дзеяння ў тыле ворага партызаны брыгады падарвалі 110 эшалонаў. У час аперацыі «Рэйкавая вайна» на ўчастку чыгункі паміж Жлобінам і Буда-Кашалёвам узарвалі 2090 рэек. У адкрытых баях і засадах, а таксама шляхам мініравання на шашэйных і грунтавых дарогах партызаны знішчылі 302 аўтамашыны, некалькі дзесяткаў танкаў і бронемашын, 3 гарматы, 22 мінамёты. Было знішчана таксама 48 складоў, байцы разграмілі або разагналі 57 гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў, спалілі 14 дробных прадпрыемстваў, у тым ліку электрастанцыі, заводы, склады з хлебам і маёмасцю.

Бранская аперацыя савецкіх войск закончылася ў пачатку кастрычніка выхадам іх на левы бераг Сажа. У паласе Рагачоўскага і Жлобінскага раёнаў гэта адбылося 2 і 3 кастрычніка, калі войскі 11-й арміі выйшлі на левы бераг Сажа ў Кармянскім раёне. Тут яны і спыніліся. Трэба было фарсіраваць раку. Аднак на гэта ўжо не было ні сіл, ні сродкаў. Каб пераадолець магутны водны рубеж і зламаць арганізаваную абарону ворага на процілеглым беразе, войскам неабходны былі матэрыяльныя сродкі і ўзгодненыя дзеянні стратэгічных маштабаў.

Вызваленне тэрыторыі Рагачоўскага і Жлобінскага раёнаў пачалося ў ходзе Гомельска-Рэчыцкай аперацыі 10—30 лістапада 1943 г. войскамі Беларускага фронту. 22 лістапада перайшлі ў наступленне і войскі яго правага крыла — 50-я і 3-я арміі.

3-я армія з займаемай паласы, на поўдзень ад Прапойска да Барталамееўкі Кармянскага раёна, фарсіравала Сож і прарвала абарону праціўніка на правым беразе, пачала цясніць яго 55-ы і 23-і армейскія карпусы на захад. 25 лістапада часці арміі выйшлі ў раён в. Новы Быхаў, вызвалілі райцэнтр Журавічы і шэраг населеных пунктаў у яго ўсходняй частцы. Аднак далейшага развіцця наступлення 3-й арміі не атрымалася. Толькі ў пачатку снежня яна вызваліла яшчэ некалькі населеных пунктаў, у тым

ліку Доўск, і на лініі Шапчыцы, Гадалавічы, Гарадзец, Стоўпня перайшла да працяглай абароны.

У гэтай сувязі сітуацыя для рагачоўскіх партызан ускладнілася. Палявыя войскі 55-га і 23-га армейскага карпусоў 9-й нямецкай арміі навадналі раён дыслакацыі 8-й Рагачоўскай брыгады. Скарацілася яе харчовая база. Нямецкія палявыя часці, не скаваныя баямі, маглі адносна свабодна рашаць любыя тактычныя задачы ў сваім тыле. Рагачоўскія партызаны ўжо ў пачатку восені сталі ўступаць праціўніку свой раён баявых дзеянняў, аднак ім яшчэ ўдавалася праводзіць асобныя дыверсіі і аперацыі. Так, на чыгунцы на поўнач ад в. Старое Сяло дыверсійная група падарвала эшалон з людзьмі і ваеннай тэхнікай, абстраляла яго.

Пасля вызвалення Гомеля і большай часткі тэрыторыі вобласці з нямецкай транспартнай сістэмы быў выключаны буйны чыгуначны вузел. Амаль перастаў працаваць і Жлобінскі чыгуначны вузел. Яго паўднёвыя лініі былі перарэзаны войскамі 48-й арміі на лініі Буда-Кашалёў — Мормаль, а на поўначы паралізаваны дзеяннямі партызан і франтавой авіяцыяй. 24 кастрычніка 8-я Рагачоўская брыгада, не прымаючы бою, адарвалася ад карнікаў і з Азяранскіх лясоў выйшла ў Быхаўскі раён. Праз два тыдні партызаны брыгады вярнуліся на сваю базу, але доўга тут не затрымаліся. 19 лістапада, забраўшы хворых і параненых, тылавую гаспадарку, партызаны назаўсёды пакінулі Азяранскія лясы і перайшлі ў Клічаўскі раён. Там брыгада размясцілася каля в. Развадаў і ў асноўным дзейнічала на шашы Магілёў — Бабруйск, затым у Крупскім, Шклоўскім і іншых раёнах. Партызаны метадам дыверсій і засад знішчалі на дарозе транспарт і тэхніку праціўніка. На шашы Магілёў — Бабруйск байцы 259-га атрада знішчылі 3 танкі, 33 аўтамашыны. 255-ы полк (арганізаваны 1 лістапада 1943 г.) у час лютаўскай карнай экспедыцыі правёў два буйныя баі пры абароне раёна дыслакацыі каля в. Развадаў і прарыве блакады. У лютым — красавіку партызаны палка збілі 4 варожыя самалёты. Адзін самалёт збілі ў Бярэзінскім раёне партызаны 258-га атрада. 12 сакавіка 1944 г. брыгада паводле рашэння Рагачоўскага падпольнага райкома была пераўтворана ў Рагачоўскую ваенна-аператыўную групу. Пры фарміраванні ВАГ брыгаднае звяно было ліквідавана, а 255-ы полк, 252-ы, 257-ы, 258-ы і 259-ы атрады ўвайшлі ў склад ВАГ асобнымі адзінкамі. Камандзірам ВАГ стаў В. В. Чысцякоў, начальнікам штаба — М. Ф. Рубіс. У маі каля в. Занікітнікі ВАГ абсталявала сваю пасадачную пляцоўку, на якую пазней прыняла пяць самалётаў са зброяй і боепрыпасамі, эвакуіравала параненых і хворых партызан. У час правядзення аперацыі «Рэйкавая вайна» 20 чэрвеня 1944 г. Рагачоўская ВАГ узаемадзейнічала з партызанскімі злучэннямі Магілёўскай абласной ВАГ. Па загаду камандзіра Магілёўскай абласной ВАГ падпалкоўніка С. Г. Сідарэнкі-Салдаценкі рагачоўскія атрады і 255-ы полк знаходзіліся ў яго рэзерве і размяшчаліся каля в. Цяцерын Круглянскага раёна. Адсюль яны забяспечвалі адыход праз раку Друць Магілёўскім партызанскім палкам і атрадам, якія ўдзельнічалі ў аперацыі «Рэйкавая вайна» на ўчастках чыгункі Орша — Магілёў і Орша — Барысаў.

28 чэрвеня 1944 г. Рагачоўская ВАГ знаходзілася на аперацыі на шашы Магілёў — Бабруйск. Каля в. Зеляніца Кіраўскага раёна яе партызаны сустрэліся з часцямі 250-й стралковай дывізіі 3-й арміі і злучыліся з імі ў складзе 250-га палка, 252-га, 258-га, 259-га атрадаў. 257-ы атрад злучыўся з перадавымі часцямі 14-й дывізіі 21 чэрвеня ў Круглянскім раёне каля в. Шапялевічы.

Пасля сустрэчы з Чырвонай Арміяй Рагачоўская ВАГ была выведзена ў Рагачоўскі раён і расфарміравана. Агульны колькасны склад за ўвесь перыяд дзеяння 2767 партызан. На момант злучэння з часцямі Чырвонай Арміі — 2305 чалавек. У баях былі забіты і паранены 102 партызаны. У Чырвоную Армію ўлілося 1348 байцоў.

За ўвесь перыяд баявых дзеянняў рагачоўскія партызаны здзейснілі шмат паспяховых дыверсій на чыгунцы: было разбіта 108 паравозаў, разбіты і пашкоджаны сотні вагонаў, платформ з войскамі, тэхнікай і іншымі грузамі. У аперацыі масавага разбурэння чыгуначных ліній партызаны ўзарвалі 2 тысячы рэек. На аўтамабільных дарогах у дыверсіях і засадах было знішчана 477 аўтамашын з рознымі грузамі, збіта 6 самалётаў, падарвана 47 невялікіх мастоў на шашэйных дарогах і чыгунцы. Рагачоўскія партызаны правялі больш за 100 адкрытых і 277 засадных баёў, знішчылі або падбілі 29 танкаў і бронемашын, было разбіта і разагнана 37 воінскіх гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў.

А. Л. Манаенкаў.

Вызваленне. Пасля перамогі ў Курскай бітве 1943 г. Чырвоная Армія разгарнула



стратэгічнае наступленне на фронце 2 тысячы кіламетраў. У верасні 1943 г. на тэрыторыю Беларусі адной з першых уступіла 3-я армія пад камандаваннем генерал-лейтэнанта А. В. Гарбатава (Бранскі фронт). Фарсіраваўшы р. Сож, часці 3-й арміі пачалі развіваць наступленне на гомельскім напрамку, каб выйсці да Дняпра. 24 лістапада былі вызвалены першыя вёскі на рагачоўскай зямлі — Драгунск, Гута, Званец, Шапчыцы. Амаль 2 сутак працягваліся баі за Журавічы, вёска некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі. 26 лістапада Журавічы і в. Курганне былі вызвалены. 2 снежня нашы войскі авалодалі Доўскам і Стоўпняй, 4 снежня — Гарадцом і Гадзілавічамі. Новы этап у вызваленні Рагачоўшчыны наступіў у канцы зімы 1944 г.— 21 лютага пачалася наступальная аперацыя войск правага крыла 1-га Беларускага фронту, якая атрымала назву Рагачоўска-Жлобінскай аперацыі 1944 г. Акрамя 3-й арміі ў ёй удзельнічалі войскі 50-й (камандуючы генерал-лейтэнант І. В. Болдзін), 48-й (камандуючы генерал-лейтэнант П. Л. Раманенка) і 16-й паветранай (камандуючы генерал-лейтэнант авіяцыі С. І. Рудэнка). Войскам фронту процістаяла 9-я армія нямецка-фашысцкай групы армій «Цэнтр», якая займала падрыхтаваную абарону (2 умацаваныя паласы). Рагачоў быў пераўтвораны ў моцны вузел супраціўлення. Галоўная роля ў аперацыі адводзілася 3-й арміі, якая павінна была нанесці ўдар з поўначы ў абход Рагачова, авалодаць ім і развіваць наступленне на Бабруйск.

21 лютага войскі 3-й арміі перайшлі ў наступленне, на працягу 2 дзён прарвалі абарону праціўніка, фарсіравалі па лёдзе Дняпро, перарэзалі чыгунку Магілёў — Рагачоў, 23 лютага выйшлі на подступы да Рагачова з паўночнага ўсходу і паўднёвага ўсходу. Камандаванне гітлераўскай групы армій «Цэнтр» падцягнула да Рагачова 5-ю танкавую дывізію, частку сіл 4-й танкавай дывізіі, з-пад Віцебска — 20-ю танкавую дывізію. Адбіўшы контратакі праціўніка, войскі 3-й арміі ноччу 24 лютага штурмам вызвалілі Рагачоў. Першым на паўднёва-ўсходнюю ўскраіну горада ўварваўся 334-ы полк гвардыі палкоўніка Савельева. Імклівай атакай яго падтрымалі гвардзейцы 336-га і 339-га палкоў. Над горадам вісела велізарнае зарыва. Гэта фашысты ў бяссільнай злосці палілі ўсё, што магло гарэць. Працягваючы наступленне на поўнач ад Рагачова, чырвонаармейцы прасунуліся

да р. Друць, захапілі на правым беразе Дняпра паміж Новым Быхавам і Рагачовам плацдарм каля 60 км па фронту і да 25 км углыбіню. На поўдзень ад Рагачова ліквідавалі плацдарм праціўніка на левым беразе Дняпра і выйшлі на подступы да Жлобіна. Войскі 50-й арміі, падтрымліваючы наступленне 3-й арміі, перайшлі ў наступленне 22 лютага і ў ходзе ўпартых баёў авалодалі невялікім плацдармам.

Паводле загаду Вярхоўнага Галоўнакамандавання ад 26.2.1944 г. 13 войсковым часцям і злучэнням, якія прымалі ўдзел у Рагачоўска-Жлобінскай аперацыі, было нададзена ганаровае найменне «Рагачоўскіх». Вось гэтыя злучэнні і часці: 120-я гвардзейская Чырванасцяжная (камандзір палкоўнік Я. Я. Фогель), 169-я (камандзір палкоўнік Ф. А. Вяроўкін) і 269-я (камандзір генерал-маёр А. Ф. Кубасаў) стралковыя дывізіі, 13-я зенітная артылерыйская дывізія (камандзір палкоўнік У. М. Качубей), 40-я знішчальная процітанкавая артылерыйская брыгада (камандзір палкоўнік С. А. Нікіцін), 2-я штурмавая інжынерна-сапёрная брыгада (камандзір палкоўнік М. П. Воранаў), 36-ы (камандзір падпалкоўнік М. В. Макаркін) і 160-ы (камандзір маёр Я. А. Белякоў) асобныя танкавыя палкі, 286-ы армейскі мінамётны полк (камандзір маёр Б. Х. Алімбаеў), 554-ы армейскі пушачны артылерыйскі полк (камандзір падпалкоўнік А. Ф. Сяргееў), 9-ы гвардзейскі інжынерны батальён (камандзір маёр І. Я. Шафарост), 48-ы асобны матарызаваны пантонна-маставы батальён (камандзір маёр Н. Г. Кожын), 141-я асобная рота ранцавых агнямётаў (камандзір старшы лейтэнант В. А. Сысоеў). Войскам, якія ўдзельнічалі ў вызваленні Рагачова, загадам Вярхоўнага Галоўнакамандавання ад 24.2.1944 г. абвешчана падзяка, у Маскве ў гонар гэтай падзеі быў дадзены салют 12 артылерыйскімі залпамі са 124 гармат.

Пры вызваленні Рагачова савецкія воіны праявілі масавы гераізм, мужнасць і стойкасць. Па-геройску загінуў у баі за горад радыст 334-га палка гвардыі радавы Пятроў. Да апошняга дыхання ён падтрымліваў сувязь акружанага гітлераўцамі батальёна з камандзірам палка. Выбіўшы праціўніка з траншэй, баявыя сябры знайшлі мёртвае цела адважнага радыста пад абломкамі бліндажа. Гвардыі радавы Пятроў быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Такім жа ордэнам быў адзначаны і подзвіг камандзіра аддзялення 336-га палка Мінеслама Нагімава. Ён першы з узвода фарсіраваў Дняпро, уварваўся ў варожую траншэю і ў рукапашным баі знішчыў 8 гітлераўцаў. У раёне Рагачова камандзір 248-га знішчальнага авіяпалка падпалкоўнік Іван Мікалаевіч Абалтусаў паўтарыў подзвіг М. Гастэлы. 14 лютага 1944 г. ён накіраваў свой палаючы самалёт на калону варожых войск. У 1972 г. ў гонар вызвалення Рагачова ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў пастаўлены помнік — 7-метровы мармуровы пілон, побач — мемарыяльная сцяна, дзе пералічаны войсковыя часці і злучэнні, якія ўдзельнічалі ў вызваленні горада.

Наступным населеным пунктам, вызваленым пасля Рагачова, была в. Вірычаў, потым вёскі Ціхінічы і Жылічы. Астатняя частка тэрыторыі раёна, размешчаная на правабярэжжы Дняпра, была вызвалена ў ходзе Беларускай аперацыі 1944 г. (кодавая назва «Багратыён»), праведзе-

Савецкія воіны вядуць бой у раёне Рагачова. 1944 год.

Мемарыял Вайсковай славы ў Рагачове.

най войскамі Чырвонай Арміі 23 чэрвеня — 29 жніўня.

З верасня 1943 г. да ліпеня 1944 г. стаяў фронт на тэрыторыі Рагачоўскага раёна. 9 доўгіх месяцаў не сціхалі тут крывапралітныя баі. Савецкія воіны праявілі ў баях стойкасць і масавы гераізм, многія з іх назаўсёды засталіся ляжаць у гэтай зямлі пад сціплымі салдацкімі абеліскамі. 37 воінам, самым храбрым і адважным, за подзвігі, здзейсненыя пры вызваленні Рагачоўскага раёна, было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. 75 брацкіх магіл нагадваюць аб тым, якой дарагой цаной заплачана за вызваленне краю ад фашысцкіх захопнікаў. Удзячныя жыхары Рагачоўшчыны свята ўшаноўваюць памяць аб іх высокім подзвігу.

Тысячы ўраджэнцаў Рагачоўскага раёна змагаліся на розных франтах вайны. І куды б ні кідалі іх франтавыя дарогі, сыны і дочкі Рагачоўшчыны заявалі мужна і самаадданa, не шкадуючы ні сіл, ні жыцця. Многія адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. Героямі Савецкага Саюза сталі У. С. Вялічка, Р. А. Гусараў, П. Е. Жгіроў, Г. П. Ісакоў, Р. С. Кавалёў, В. М. Калеснікаў, К. Н. Осіпаў, М. П. Пацееў, Ц. А. Пачтароў, А. Ф. Самусеў, В. В. Скрыганаў, А. П. Сяргін. Пасля вайны ў Рагачове жыў і працаваў Герой Савецкага Саюза Л. С. Данілюк. (Падрабязны артыкул пра Л. С. Данілюка пад назвай «Мацней за браню» надрукаваны ў кнізе «Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Быхаўскага р-на». Мн., 1990. С. 270—271.) Поўным кавалерам ордэна Славы 3 ступеней стаў А. М. Белавусаў з в. Ходасавічы.

У самай цяжкай з войнаў наша краіна адстаяла сваю свабоду і незалежнасць. Нягледзячы на цяжкія людскія і матэрыяльныя страты, народ быў гатовы да новага подзвігу — працоўнага, ён быў поўны жадання хутчэй узняць з руін сваю Радзіму.

А. С. Лейкін.

Так пачыналася вайна

Старонкі з дзённіка былога першага сакратара Рагачоўскага падпольнага райкома партыі С. М. Свярдлова

Самуіл Манусавіч Свярдлоў нарадзіўся 15.10.1903 г. ў в. Рожна Лепельскага раёна. Адзін з кіраўнікоў партыйнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Гомельскай вобласці. З 1928 г. на прафсаюзнай рабоце. У 1936 г. С. М. Свярдлоў скончыў Вышэйшую сельскагаспадарчую школу Беларусі. З 1938 г. другі сакратар Добрушскага, першы сакратар Рагачоўскага РК КП(б)Б. З 15.8.1941 г. па 6.7.1943 г. сакратар Рагачоўскага падпольнага РК КП(б)Б. Адначасова ў кастрычніку 1941 — ліпені 1942 г. камандзір Рагачоўскага партызанскага атрада. З снежня 1943 г. сакратар Рагачоўскага, Бярэзінскага РК КП(б)Б, а 1948 г. на гаспадарчай рабоце. Пасля выхаду на пенсію С. М. Свярдлоў пачаў работу па стварэнні Рагачоўскага музея народнай славы. З 1962 г.— дырэктар музея. Памёр 20.2.1973 г.

22 чэрвеня 1941 г. Вестка аб вераломным нападзе фашысцкай Германіі на нашу краіну маланкай абляцела горад. У гэты ж дзень у райкоме адбылася нарада сакратароў пярвічных партарганізацый горада, кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў. Забяспечыць нармальную работу ўсіх прадпрыемстваў, складоў, баз, тэлеграфна-тэлефоннай сувязі, а таксама ўстанавіць кругласутачнае дзяжурства адказных работнікаў на ўсіх прадпрыемствах і ўстановах — гэта першае, што было выпрацавана на нарадзе. Групы работнікаў былі накіраваны ў сельскія Саветы для аказання дапамогі

на месцах у правядзенні прызыву ваеннаабавязаных у рады Чырвонай Арміі, а таксама мабілізацыі гужавога і аўтатранспарту.

23 чэрвеня. З раніцы ў ваенкамат сталі пад'язджаць машыны, падводы з мабілізаванымі. Шмат людзей ішло пешшу. Іх праводзілі жонкі і родныя. Настрой у людзей быў бадзёры. Усе былі ўпэўнены ў хуткім прасоўванні нашых войск у глыбіню тэрыторыі праціўніка. Сталі прыбываць групы бежанцаў з Брэста і іншых раёнаў заходняй часткі Беларусі. Частка бежанцаў ідуць за Днепр, а іншыя застаюцца ў горадзе. Будынак школы і іншыя памяшканні былі прыстасаваны пад жыллё для бежанцаў. Рэстаран і сталовая абслугоўвалі прыбываючых людзей.

24 чэрвеня. Сталі прыбываць бежанцы з Мінска. Жыхары даведваюцца ад іх аб варварскай авіяцыйнай бамбардзіроўцы Мінска. Насельніцтва Рагачова пачынае праяўляць хваляванне.

25 чэрвеня. Паток бежанцаў павялічыўся галоўным чынам з Мінска і прылеглых да яго раёнаў. Вакол бежанцаў збіраюцца натоўпы гараджан. Распаўсюджваюцца чуткі пра хуткі адыход нашых войск.

26 чэрвеня. У гэты дзень з'явіліся першыя групы адыходзячых войск Чырвонай Арміі. Пад гэтым уражаннем некаторыя кіруючыя работнікі пачынаюць адпраўляць свае сем'і за Днепр. Па гэтаму пытанню ў райкоме была праведзена нарада сакратароў пярвічных партарганізацый і кіраўнікоў прадпрыемстваў і ўстаноў. Былі дадзены ўказанні, што эвакуацыя сем'яў кіруючых работнікаў павінна праходзіць толькі з дазволу райкома.

27 чэрвеня. Войскі адыходзяць суцэльным патокам, лавінай рухаюцца бежанцы. Сярод іх ужо ёсць і бежанцы з Бабруйска.

Ад вайсковых часцей атрыманы загад: капаць процітанкавыя рвы на рэках Друць і Днепр. Работа ўсіх прадпрыемстваў спынена. Рабочыя і служачыя, а таксама калгаснікі навакольных вёсак, усяго больш за 12 тысяч чалавек, былі накіраваны на абарончыя збудаванні на Дняпры і Друці. У гэты ж дзень пачалі прыбываць да Дняпра і займаць абарону першыя падраздзяленні корпуса Пятроўскага. З абкома партыі атрымана радыёграма: вывозіць матэрыяльныя каштоўнасці за Днепр і ўганяць жывёлу. Увесь аўтатранспарт і калгасны гужавы транспарт быў выкарыстаны для вывазкі матэрыяльных каштоўнасцей. Людзі паспелі вывезці на левы бераг Дняпра

С. М. Свярдлоў.

120 тон згушчанага малака і эвакуіраваць запасы тавараў асноўных кааператыўных складоў. Дадзена ўказанне ўсім арганізацыям падрыхтаваць для эвакуацыі архівы і іншыя дакументы, а таксама банкаўскія каштоўнасці. Дазволена эвакуацыя сем'яў кіруючых работнікаў, а таксама камуністам, якія па стану здароўя ці сямейных абставінах не маглі заставацца ў франтавой абстаноўцы. У гэты ж дзень была паслана група работнікаў у калгасы задняпроўскай зоны для ўгону жывёлы на левы бераг Дняпра.

28 чэрвеня. Райваенкамат разгарнуў вялікую работу па мабілізацыі ў армію не толькі людзей свайго раёна, але і ваеннаабавязаных іншых раёнаў, якія накіроўваліся ў савецкі тыл. Было накіравана ў армію больш за 4 тысячы чалавек, галоўным чынам з Бабруйскага раёна. Выдзелена 20 факельшчыкаў, каб знішчыць тыя каштоўнасці дзяржаўных і кааператыўных арганізацый, якія немагчыма было вывезці. Адпраўлены архівы райкома партыі, а таксама банкаўскія каштоўнасці і грошы на суму 5 200 000 рублёў.

29 чэрвеня. Вывезці ўсе матэрыяльныя каштоўнасці было немагчыма. Тэрмінова выклікалі факельшчыкаў. З болем у сэрцы, са слязамі на вачах глядзелі людзі на ахопленыя полымем будынкі. Аднак людзі ўсведамлялі, што нічога не павінна дастацца ворагу. У гэты дзень згарэлі нафтабаза, сенасклад, склады, заготзбожжа, спіртбаза, была ўзарвана электрастанцыя, завод кансерваванага малака.

К канцу дня горад амаль апусцеў. Засталася толькі невялічкая частка людзей, якія па розных прычынах не маглі пакінуць горад. У Рагачове засталіся таксама 60 камуністаў на чале з членамі бюро райкома для аператыўнай работы. Ноч прайшла трывожна і цяжка было ўстанавіць — адыходзяць нашы апошнія часці ці рухаюцца нямецкія авангарды.

30 чэрвеня. У паветры кружылі нямецкія самалёты, аднак абстрэлу і бамбёжкі не было. К канцу дня праціўнік уступіў на тэрыторыю Рагачоўскага раёна.

1 ліпеня. Вораг ужо падыходзіць да горада. Выканаўшы ўсё, што было ў нашых сілах, камуністы з апошнім вайсковым падраздзяленнем пакінулі горад і накіраваліся на левы бераг Дняпра і размясціліся ў саўгасе «Турск».

3 ліпеня. Побач з саўгасам пачалі падрыхтоўку пляцоўкі для пасадкі самалётаў. На будаўніцтва пляцоўкі былі накіраваны сотні мірных грамадзян. З-за блізкага размяшчэння аэрадрома раённы цэнтр прыйшлося перанесці ў мястэчка Гарадзец.

4 ліпеня. Акупанты перайшлі ў наступленне, фарсіравалі Днепр і дайшлі да 8-га кіламетра ў напрамку вёскі Гадзілавічы. Перад насельніцтвам была пастаўлена задача дапамагчы выводзіць раненых з поля бою. Параненых байцоў дастаўлялі ў Гарадзецкую бальніцу, дзе ім аказвалася першая медыцынская дапамога. Затым воінаў адпраўлялі ў лазарэты далей ад фронту. Абслугоўваў параненых медыцынскі персанал Гарадзецкай бальніцы.

7 ліпеня. Байцы корпуса Пятроўскага перайшлі ў наступленне. Вораг быў адкінуты за Днепр. Прыток параненых да вечара перапыніўся. На гэтым участку фронт стабілізаваўся...

Рагачоўскі знішчальны

З успамінаў байца знішчальнага батальёна Н. Навакова

Райком партыі даручыў нам сачыць за парадкам у горадзе і ўсёй акрузе. На ўсіх асноўных аб'ектах для аховы маёмасці былі пастаўлены нашы байцы. Неўзабаве нам сталі паступаць сігналы з Крушынаўкі, Ціхініч, Побалава, Забалацця аб з'яўленні варожых дэсантаў. Тут жа выехалі ў гэтыя пункты.

Адной з нашых задач было будаўніцтва супрацьтанкавай абароны. Жыхары раёна, якія ўдзельнічалі ў гэтых работах, былі сканцэнтраваны ў асноўным каля малочнакансервавага камбіната, вёсак Задруцце, Збароў, Ходасавічы. Людзі працавалі старанна, з высокім пачуццём патрыятызму. Нягледзячы на спёку, усё новыя і новыя людзі прыходзілі з рыдлёўкамі на работу. Яны гатовы былі працаваць круглыя суткі, абы толькі не дапусціць ворага. На працягу 2—3 сутак была створана даволі сур'ёзная абарона.

Аднойчы мы дзяжурылі на мосце цераз Дняпро ў час руху па ім бежанцаў. Тут стварылася такая моцная пробка, што на некалькі гадзін нават спыніўся рух вайсковых часцей. Але дзякуючы ўменню і настойлівасці нашых байцоў пробка была ліквідавана. А потым мы ўзяліся за будаўніцтва пераправы цераз Дняпро ў раёне рагачоўскіх могілак. На працягу сутак пераправа была гатова, яна дала магчымасць ліквідаваць перагрузку асноўнай дарогі.

Варожыя парашутысты рабілі некалькі спроб захапіць гарадскі тэлеграф. Пры адным з налётаў загінулі начальнік пошты і вартавы, а таксама рэдактар раённай газеты Валовік. Нам, байцам знішчальнага батальёна, даводзілася суткамі не спаць і не есці, стаяць на варце горада. У тыя дні мы затрымалі шмат дыверсантаў, пераапранутых у цывільнае адзенне.

Узялі мы пад свой кантроль і малочнакансервавы завод, на якім засталося каля 3,5 млн. бляшанак малочных кансерваў. Гэтыя кансервы мы аддалі чырвонаармейцам.

Шмат зрабіў наш батальён для эвакуацыі з горада і раёна насельніцтва за Дняпро. Потым асноўная частка нашых байцоў пераехала ў в. Турск, а 16 чалавек засталося ў апусцелым горадзе для нясення вартавой службы. Калі фашысты пачалі падыходзіць да Рагачова, наш батальён перайшоў у в. Гарадзец, там я і іншыя нашы байцы былі залічаны ў Чырвоную Армію.

З АПЕРАТЫЎНЫХ ЗВОДАК ЗА 1941 ГОД

6 ліпеня (ранішняе паведамленне)

На Бобруйском направлении противник неоднократно пытался наступать, но все его попытки были отбиты нашими войсками с большими для него потерями.

10 ліпеня (ранішняе паведамленне)

На Бобруйском направлении наши войска прочно удерживают занимаемые позиции.

13 ліпеня (вячэрняе паведамленне)

На западном направлении наши войска вновь овладели городами Жлобин и Рогачев. На остальных участках этого направления весь день происходили ожесточенные бои с крупными силами пехоты и танков противника.

16 ліпеня (вячэрняе паведамленне)

Отступая под ударами наших войск от Рогачева, попал в окружение и был уничтожен танковый батальон противника. Экипажи шести вражеских танков были настолько сильно измотаны, что многие танкисты не могли покинуть машины без посторонней помощи. Медицинское освидетельствование пленных показало, что этот упадок сил у пленных — результат крайнего физического переутомления.

Друкуецца па кн.: Сообщения Советского Информбюро. М., 1944. Т. 1. С. 29, 41, 50, 59.

У ліпені 1941-га

З успамінаў С. Марына, падпалкоўніка ў адстаўцы, былога камандзіра знішчальна-супрацьтанкавай батарэі

За 1 км на поўнач ад Рагачова праціўнік разбіў невялікі атрад нашых войск, фарсіраваў Дняпро і авалодаў на левым беразе плацдармам, захапіўшы пры гэтым вёску Збароў.

У гэты час 61-я стралковая дывізія знаходзілася яшчэ на маршы. У авангардзе быў 221-ы стралковы полк з 131-м асобным знішчальна-супрацьтанкавым артылерыйскім дывізіёнам. Полк здзяйсняў начны марш да Рагачова. Світала. Ніяк не хацелася думаць пра баі, уражвала прыгожая дарога. Раптам наперадзе, метраў за 500, разгарэўся бой. На скрыжаванні дарог на захад ад Збарова атрад гітлераўцаў напаў на нашу галаўную паходную заставу.

Камандзір палка падпалкоўнік Гарэлік рашыў з ходу контратакаваць праціўніка. Узвіліся 2 чырвоныя ракеты. Падраздзяленні палка хутка разгарнуліся ў баявы парадак. Кулямётная рота з батальёна капітана Шчарбакова была пасаджана на быстраходныя браніраваныя цягачы «Камсамолец», якія былі выкарыстаны як танкі. У атаку павёў іх камандзір дывізіёна капітан Ягораў. Гарматы палкавой артылерыі і знішчальнага артдывізіёна адкрылі агонь прамой наводкай па танках і агнявых кропках праціўніка. Бой быў кароткі, але жорсткі, у вёсцы Збароў ён прыняў характар бліжніх сутычак. Байцы змагаліся храбра.

Страціўшы 7 танкаў і каля батальёна пяхоты, баючыся акружэння, фашысты спешна пачалі адыходзіць да Дняпра. Камандзір палка падпалкоўнік Гарэлік быў паранены. Камандаванне палком прыняў камандзір батальёна капітан Шчарбакоў.

Каб пазбегнуць поўнага знішчэння, праціўнік контратакаваў нас злева сілай да роты, на матацыклах, з трыма танкамі. Але гэта яму не дапамагло. Нашымі гарматамі танкі былі падбіты. Левафланговы батальён нанёс удар ручнымі гранатамі. Фашысты былі змяты. Нашы падраздзяленні пачалі яго праследаванне.

Потым сталі рыхтавацца да фарсіравання Дняпра. Байцам было загадана разбіраць гаспадарчыя пабудовы, збіваць плыты. Праз некалькі мінут на левым беразе ракі з'явілася каля 200 розных плытоў: са звязаных бочак, дошак, з бярвення. Пад прыкрыццём артылерыйскага агню пачалі фарсіраваць раку. Паволі адыходзілі плыты, запоўненыя салдатамі, кулямётамі, мінамётамі, гарматамі. Праціўнік імкнуўся ў што б там ні стала ўтрымацца, у спешцы сцягваў свае сілы, а потым адкрыў агонь з усіх відаў зброі. Падалі ў ваду забітыя і параненыя. Настаў крытычны момант. Камандзір узвода 45-міліметровых гармат малодшы лейтэнант Відоўскі з плытоў пачаў страляць па агнявых пунктах праціўніка. Адкрылі агонь і кулямётчыкі. Першаму эшалону да берага заставалася метраў 50—60, калі з воклічам «За Радзіму!» у ваду кінуўся капітан Шчарбакоў. За ім рушылі байцы і камандзіры падраздзяленняў. Завязаўся штыкавы бой ля берага. Паляцелі ручныя гранаты. Плыты ўсё падыходзілі і падыходзілі. Высадзіўшыся, нашы байцы з ходу ўступілі ў бой, усё больш расшыраючы плацдарм. На беразе, стоячы на каленях, увесь у крыві, малады лейтэнант крычаў «Смялей! Наперад! Абцякай злева.»

На гэтым участку гітлераўцы былі разбіты. Нашым палком быў узяты невялікі плацдарм: 700 м па фронту і 400 м у глыбіню.

Стаяла знясільваючая гарачыня. Вораг падцягнуў рэзервы, хацеў скінуць храбрацоў у раку. Атакі ішлі адна за адной. Але ўсе яны былі адбіты. З гэтага плацдарма на другі дзень, 12 ліпеня, перайшоў

у контрнаступленне 63-і стралковы корпус камкора Л. Р. Пятроўскага. Працiўнік быў адкінуты на 20—25 км на паўночны захад у напрамку Бабруйска.

Так воіны 221-га стралковага палка, не маючы колькаснай перавагі і баявога вопыту, у пачатку вайны разбілі загартаваны ў баях гітлераўскі матарызаваны полк.

Контрудар каля Рагачова

З успамінаў І. Корпіча, былога камандзіра кулямётнага аддзялення 164-га стралковага палка 61-й дывізіі

Служыў я перад пачаткам вайны ў войсках НКУС па ахове чыгуначна-дарожных збудаванняў. Калі напалі фашысты, нас эшалонам перакінулі ў Гомель. Тут атрымалі каскі і пешым маршам накіраваліся на Рагачоў. У начны час падышлі да Дняпра. Наша падраздзяленне ўлілося ў састаў 164-га стралковага палка 61-й дывізіі. Перад намі за Дняпром быў Рагачоў, заняты гітлераўцамі. На світанні 13 ліпеня пераправіліся цераз раку і ўвайшлі ў Рагачоў, які нашы воіны контрударам адбілі ў акупантаў.

Майму кулямётнаму аддзяленню загадалі прыкрываць тыл. Мы выбралі пазіцыю ля цагельнага завода. Уперадзе за горадам завязалася перастрэлка. Толькі на трэці дзень далі дазвол ісці на падмогу, калі нашы дайшлі да р. Друць. Мы фарсіравалі раку і апынуліся на тэрыторыі малочнакансервавага завода. Далей ішло адкрытае поле, а за чыгуначным палатном былі відаць каскі фашыстаў, якія акапаліся. Тыя ўбачылі, што нас мала, і адкрылі агонь. Мы занялі абарону, акапаліся, а пад вечар падышла дапамога. Тут цяжка параніла 1-ы нумар кулямётнага разліку — байца Працко, сціплага і паслухмянага хлопца. Праз некалькі дзён, удала атакаваўшы ноччу, мы выбілі праціўніка з заняты пазіцый па лініі чыгункі і шашэйнага моста над ёй.

Праціўнік адкаціўся да в. Калатоўка (Стрэнькі), але на нашым шляху паставіў моцны артылерыйскі агонь. І ўсё ж мы занялі Стрэнькі. Жыхароў там не было. Вечарам нашы воіны прасунуліся наперад яшчэ на 300 метраў. Раніцай убачылі ля лесу гарматны разлік праціўніка. Пасцілa каманда адкрыць агонь. Я прасіў не рабіць гэтага, матывуючы тым, што вораг далёка, яму страт не нанясём, а сябе выявім. Так і атрымалася. Фашысты пашкодзілі наш кулямёт, двое нашых байцоў атрымалі кантузію. У абароне прабылі некалькі дзён. Тут загінулі кулямётчык ленінградзец Вараб'ёў, чырвонаармеец Амараў з Казахстана, баец выключнай храбрасці. Немцы абстрэльвалі нас з мінамётаў. 12 жніўня нас перакінулі на другі ўчастак фронту, а фашысты набліжаліся да горада.

Як мы былі ўзброены? Да станковага кулямёта выдалі па 2 стужкі патронаў. У камандзіраў старшых і малодшых былі пісталеты і рэвальверы, у кожнага з нас — гранаты. А ў апошнія дні паступалі бутэлькі з гаручай сумессю супраць танкаў. У пехацінцаў былі вінтоўкі і ручныя кулямёты. Нашы артылерысты білі па ворагу рэдка, але трапна. Не ведаючы, як быў узброены праціўнік, мы лічылі, што ўзброены добра, і былі ўпэўнены, што спынім ворагаў і пагонім іх з нашай тэрыторыі.

Подзвіг на Дняпры

З успамінаў Г. П. Куляшова

Георгій Пятровіч Куляшоў нарадзіўся ў 1902 г. ў Варонежы. З 1919 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнік грамадзянскай вайны. На пачатак Вялікай Айчыннай вайны быў камандзірам 318-га артылерыйскага палка. У ліпені — жніўні 1941 г. ўдзельнічаў у баях пад Рагачовам. Да 1954 г. служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Узнагароджаны 7 ордэнамі, шматлікімі медалямі.

В июне 1941 г. 63-й стрелковый корпус, дислоцировавшийся в Приволжском военном округе, срочно был направлен на пополнение войск Западного особого военного округа. Война застала корпус в пути. Только первые его эшелоны успели 21 июня прибыть к месту разгрузки — на станции Добруш и Ново-Белица. Последующие подходили чрезвычайно разрозненно до первых чисел июля на различные станции вблизи Гомеля. А некоторые части корпуса, еще не доехав до Гомеля, были повернуты на север, в район Орши.

Первый приказ, дошедший до командования и штаба корпуса, гласил о том, что 63-й стрелковый корпус вошел в состав 21-й армии. Его задача — развернуться на восточном берегу Днепра на фронте Гадиловичи, Рогачев, Жлобин, Стрешин, сосре-

доточивая основные усилия на правом фланге, с целью отбросить немецко-фашистские войска, если они попытаются переправиться через Днепр. Готовность обороны 16.00 3 июля 1941 г. Командир 63-го стрелкового корпуса комкор Л. Г. Петровский отлично знал район предстоящих боевых действий. Здесь он воевал в гражданскую войну, а затем служил в Белоруссии, в Бобруйске.

Протяженность фронта обороны корпуса составляла 70-километров вместо 16—24 километров, предусматривавшихся нормативами тогдашних уставов. Кроме того, поскольку 102-я стрелковая дивизия 67-го стрелкового корпуса (сосед справа) запаздывала с выходом и занятием указанного ей рубежа, последовало дополнительное распоряжение — впредь до ее подхода оборонять участок по восточному берегу Днепра, на фронте Шапчицы, Гадиловичи.

Через пять суток после подхода передовых частей 63-го корпуса к Днепру, на рассвете 2 июля, вражеские танки появились на западном берегу реки. Сперва гитлеровцы были очень осторожны. Постепенно осмелев, они стали производить разведку мест возможных переправ. В третьем часу 3 июля при поддержке артиллерии и авиации фашисты пытались с ходу форсировать Днепр в районе Рогачева на участке обороны 167-й стрелковой дивизии. Но, встреченные подготовленным заранее артиллерийским и ружейно-пулемётным огнем, они понесли большие потери и вынуждены были поспешно отойти назад. Ни в этот, ни на другой день враг так и не сумел прорваться на восточный берег Днепра.

5 июля в 13 часов после артиллерийского обстрела и ударов авиации противнику удалось форсировать Днепр северо-восточнее Рогачева, в районе населенного пункта Зборов. Гитлеровцы начали продвигаться к Гадиловичам. По приказанию командира корпуса Л. Г. Петровского, прибывшего на командный пункт правофланговой 61-й стрелковой дивизии и возглавившего руководство боем, к месту прорыва были подтянуты 520-й и 221-й стрелковые полки.

После короткого артиллерийского налета комкор Л. Г. Петровский поднял полки в контратаку. Фашисты не выдержали удара наших частей и отошли. Дважды при поддержке танков они в тот день снова переходили в наступление, но оба раза с большими потерями отбрасывались назад. На поле боя осталось 250 вражеских трупов и восемь подбитых танков. Были захвачены пленные.

В этих боях особенно отличился командир 200-го отдельного разведывательного батальона 167-й стрелковой дивизии майор Степанищев. Его часть еще 4 июля переправилась через Днепр. Зайдя в тыл противнику, бойцы стремительной атакой обратили в бегство отдыхавших фашистских танкистов. 27 оставленных ими танков были уничтожены.

По решению комкора Л. Г. Петровского 6 июля была предпринята разведка боем на левом фланге корпуса силами 117-й стрелковой дивизии, поддержаной огнем двух артиллерийских полков (322-й ап, 707-й гап) и дивизиона корпусной артиллерии (546-й кап). С рассветом 240-й стрелковый полк первым форсировал Днепр, атаковал противника и, овладев городом Жлобин, устремился к Бобруйску. Гитлеровцы, не ожидавшие такого удара, поспешно начали отходить. На западный берег реки переправился еще один полк — 275-й стрелковый. Но спустя некоторое время враг бросил против прорвавшихся частей две дивизии, стремясь отрезать советские войска от единственной в районе Жлобина переправы через Днепр.

В районе переправы создалось критическое положение. В этот момент здесь появился командир корпуса. Немедленно была развернута ближайшая батарея 76-миллиметровых орудий. Леонид Григорьевич Петровский будто не замечал огня вражеских танков и самоходных орудий, простреливавших весь этот район. Стоя в полный рост, он следил за поединком батареи с фашистскими танками, изредка отдавал короткие и четкие приказания ее командиру. После 15—20-минутной артиллерийской перестрелки несколько немецких танков были подбиты, остальные отошли. Только после этого Л. Г. Петровский покинул переправу и последовал в Жлобин на передовой командный пункт командира дивизии.

240-й и 275-й стрелковые полки до наступления темноты продолжали отражать контратаки вражеских мотомехчастей. Ночью, по приказу командира корпуса, выполнив поставленную перед ними задачу, оба полка отошли на восточный берег Днепра.

Вскоре 117-я стрелковая дивизия была передана 21-й армии, а вместо нее в состав корпуса прибыла 154-я стрелковая дивизия, которая заняла оборону на фронте Цупер, Жлобин, Стрешин.

12 июля в 12 часов 63-й стрелковый корпус получил приказ, согласно которому он должен был форсировать Днепр и начать наступление с западного берега реки. На подготовку войск к наступлению, перегруппировку и подтягивание частей

оставалось около суток. Положение усложнялось тем, что части корпуса заняли оборону на широком фронте и что западный берег Днепра, занятый противником, был более выгоден в тактическом отношении.

В сложившейся обстановке комкор Л. Г. Петровский решил форсировать Днепр на широком фронте, имея боевой порядок корпуса в один эшелон. Правофланговая 61-я стрелковая дивизия получила задачу форсировать реку в районе Зборов и нанести удар в направлении Близнецы, Фалевичи, Старцы. Для обеспечения своего открытого правого фланга дивизия выделяла усиленный батальон, которому надлежало, заняв оборону в районе Озераны, не допустить контратак с севера. В центре, на участке Рогачев, Лучин, форсировала Днепр 167-я стрелковая дивизия, имевшая задачу овладеть Рогачевом и в дальнейшем наступать на Волосовичи. На левом фланге наступала только что прибывшая 154-я стрелковая дивизия. Она должна была форсировать реку в полосе Лебедевка, Жлобин, овладеть городом Жлобин и развивать наступление вдоль железной дороги Жлобин — Бобруйск.

Утром 13 июля части 63-го корпуса начали форсирование Днепра. Стояла изнуряющая жара. Гитлеровцы, совершенно не ожидая нашего наступления, беспечно прятались от жары по домам в Рогачеве и Жлобине. Они снимали с себя оружие, а иногда и обмундирование. В таком положении застал их наш первый огневой налет.

Противник был настолько ошеломлен наступлением частей корпуса, что вначале почти не оказывал организованного сопротивления. И только после того, как наши атакующие подразделения вышли на западные окраины Рогачева и Жлобина, гитлеровцы опомнились. Укрывшись за железнодорожными насыпями, использовав водонапорные башни и каменные здания, они начали оказывать сопротивление, которое усиливалось с каждым часом. Из многих домов открыли огонь автоматчики. Но корпус продолжал наступать.

В этих боях отличились многие воины и в целом подразделения...

15 и 16 июля части 63-го корпуса продолжали с боями продвигаться на запад, не давая гитлеровцам задерживаться на выгодных рубежах и отбивая их неоднократные контратаки. Только на западном берегу реки Друть противнику удалось закрепиться.

17 июля на участке 167-й стрелковой дивизии противник пять раз переходил в контратаку, продвигаясь местами на 1—2 километра, и пять раз его отбрасывали назад. Захваченные в эти дни пленные показали, что к местам прорыва корпуса враг на автомашинах подбросил 465-й пехотный полк 255-й пехотной дивизии и 497-й пехотный полк 267-й пехотной дивизии, ранее не принимавших участия в боях.

В июльском наступлении красноармейцы и командиры 63-го стрелкового корпуса проявили массовый героизм, смелость и отвагу. Вот несколько примеров. Командир роты 66-го стрелкового полка 61-й стрелковой дивизии лейтенант Лисин 23 июля, находясь в разведке, был трижды ранен, но боевой приказ выполнил. Вернувшись в часть, он отказался эвакуироваться в тыл и продолжал командовать ротой. Командир 7-й роты этого же полка лейтенант Туляков 22 и 23 июля пять раз водил подразделение в атаку, увлекая своим мужеством и отвагой бойцов. Командир 6-й роты 437-го стрелкового полка лейтенант П. Гарнага, будучи 20 июля ранен, остался в строю, продолжал мужественно сражаться и руководить своим подразделением. 21 июля командир батареи 154-й стрелковой дивизии лейтенант Борода со своего наблюдательного пункта засек на поле боя вражеское противотанковое орудие и немедленно открыл по нему беглый огонь. Несколько разорвавшихся снарядов заставили гитлеровцев бросить пушку. Лейтенант Борода с несколькими бойцами захватил орудие и, развернув его, открыл огонь по наступающему противнику. Два дня спустя в бою овладел немецкой пушкой и открыл из нее огонь по врагу красноармеец Вершинин из 465-го стрелкового полка 167-й стрелковой дивизии. Во время ведения разведки младший сержант Суранов с группой бойцов из 473-го стрелкового полка 154-й стрелковой дивизии 21 июля встретился с превосходящими силами противника. Чтобы не попасть в окружение, группа начала отходить. Суранов прикрывал отход товарищей. Раненный, он до последних сил продолжал сдерживать врага. Вся группа вышла из окружения. От тяжелых ран Суранов скончался.

25 июля 63-й стрелковый корпус, произведя перегруппировку, возобновил наступление в направлении Бобруйска и к 19 часам вышел на рубеж Веричев, Заболотье, Великий Лес, Рудня-Малевичская, Лесана. Противник очень сопротивлялся. Особенно тяжелые бои происходили 28 июля. В ночь на 29 июля гитлеровцы предприняли контратаку, хотя обычно в то время они еще имели привычку отды-

хать по ночам. Контратака была отбита с большими для врага потерями. После этого противник начал производить усиленные оборонительные работы по всему фронту, особо укрепляя свой центральный рубеж — Тихиничи, Бронное, Осинники, — и одновременно форсировал инженерные работы на втором рубеже по западному берегу реки Добысна. Кроме того, из показаний пленных и рассказов местных жителей было установлено, что противник стал сосредоточивать значительные силы. К фронту подтягивались новые части, особенно на правом фланге корпуса. Так, один пленный показал, что 19 июля в район южнее Нового Быхова начала прибывать немецкая 31-я пехотная дивизия 10-го армейского корпуса в составе трех пехотных полков.

К концу июля 1941 г. части 63-го корпуса вклинились в глубину обороны противника местами до 30 километров и выдвинулись вперед, особенно по отношению соседа справа (67-й ск). Образовался большой уступ. В связи с концентрацией фашистских войск на этом направлении командующий 21-й армией 30 июля приказал 63-му стрелковому корпусу перейти к обороне. На другой день пришло известие о том, что за умелое руководство боевыми действиями командиру корпуса Л. Г. Петровскому присвоено звание генерал-лейтенанта, а командирам дивизий Н. А. Прищепе, В. С. Раковскому, Я. С. Фоканову — звание генерал-майора.

Между тем в начале августа обстановка усложнилась. Получив сокрушительный отпор на фронте 63-го корпуса, противник, начиная с 5 августа, предпринимает ряд попыток найти участок послабее на флангах корпуса и армии. В тот же день, то есть 5 августа, гитлеровцы начали наступление на фронте соседней справа 13-й армии и одновременно на левом фланге нашей 21-й армии с целью захвата переправ через Днепр в районе Речицы. Командование 21-й армии было вынуждено направить в район Речицы последнюю резервную 42-ю стрелковую дивизию. 7 августа гитлеровцы предпринимают наступление на крайнем правом фланге нашей армии в районе Устье и при поддержке авиации и 60 танков форсируют реку Сож.

На следующий день нашим войскам пришлось сдерживать натиск врага уже на всем фронте 21-й армии. Части 63-го стрелкового корпуса отбили вражескую атаку на Рогачев, начатую в 6 часов утра. Через некоторое время после полуторачасовой подготовки, под прикрытием дымовой завесы гитлеровцы вновь атаковали боевые порядки корпуса, но снова организованным огнем были отброшены в исходное положение.

167-я стрелковая дивизия, снятая с фронта 63-го стрелкового корпуса, в ночь на 13 августа была переброшена в район Довска и с утра 13 августа при поддержке частей 67-го корпуса предприняла контратаку. Эта контратака запоздала, так как соседние соединения уже оставили занимаемые позиции, и 167-я дивизия также вынуждена была отходить. Мотоциклетные части и бронемашины врага к 22 часам 13 августа вышли в район Меркуловичи и стали продвигаться в направлении Чечерска, создавая угрозу окружения 63-го стрелкового корпуса. Утром 14 августа противник овладел Чечерском, в окрестностях которого находился штаб 21-й армии. Его личному составу пришлось с боем прорываться из окружения. Затем гитлеровцы заняли станцию Буда-Кошелевская, завершив полное окружение частей 63-го корпуса.

Связь 63-го стрелкового корпуса со штабом 21-й армии оказалась прерванной. Генерал-лейтенанту Л. Г. Петровскому пришлось руководить боевыми действиями, не имея никаких сведений о положении на соседних участках фронта. В очень сложной обстановке он сумел организовать отрыв корпуса от противника и к исходу 14 августа переправил дивизии на восточный берег Днепра. В ночь на 15 августа они начали отходить на рубеж Столпня, Городец, Жлобин с тем, чтобы нанести удар по врагу и отбросить его за Днепр.

Командный пункт корпуса утром 15 августа был переведен в деревню Святое. Но немецкие подвижные части отрезали штаб и некоторые части корпуса (307-й стрелковый полк 61-й стрелковой дивизии и 1-й дивизион 318-го гаубичного артиллерийского полка большой мощности ВВГК) от основных его сил. Тогда генерал-лейтенант Петровский с группой командиров штаба возглавил атаку подразделений, чтобы прорвать окружение. Стремительный удар заставил гитлеровцев отступить. Л. Г. Петровский повел части на юго-запад и в тот же день прибыл в расположение 154-й стрелковой дивизии и других войск корпуса.

Встреча состоялась в лесу. Здесь шел напряженный бой с врагом, сжимавшим кольцо окружения. Ознакомившись с обстановкой, командир корпуса немедленно организовал разведку и приступил к подготовке прорыва из окружения. 16 августа в 12 часов он отдал приказ, нацелив основной удар в направлении Скепня, Губичи, то есть на юго-запад, а не на юго-

восток, как этого мог ожидать противник. Примерно в 19 часов на командном пункте 154-й стрелковой дивизии, в районе леса северо-восточнее Четверни (15 километров юго-восточнее Жлобина), Л. Г. Петровский уточнил задачи дивизии. Ознакомившись с проектом боевого приказа 154-й стрелковой дивизии, командир корпуса дал указание заместителю начальника штаба дивизии дополнительно включить в приказ следующий пункт: «Всему начсоставу, вне зависимости от звания и должности, в период ночной атаки, вплоть до соединения частей корпуса с частями Красной Армии, находиться в передовых цепях, имея при себе эффективное оружие, с задачей объединить вокруг себя весь личный состав дивизии...». Леонид Григорьевич также указал, что он вместе с группой командиров штаба корпуса будет следовать с 154-й стрелковой дивизией.

После полуночи 17 августа северо-восточнее Четверни, у второй просеки леса, выходящей к поселку Завод, собралось командование корпуса и дивизии. Еще раз уточнили все вопросы, затем разъехались по частям...

Ровно в 3 часа 17 августа 1941 г. после короткого, но мощного артиллерийского налета 473-й стрелковый полк начал прорыв. За ним последовали атаки всех остальных частей дивизии. Наступление застало противника врасплох, и части 154-й стрелковой дивизии, сравнительно легко прорвав кольцо вражеского окружения, быстро двинулись вперед. В населенном пункте Губичи они разгромили штаб 134-й немецкой пехотной дивизии и захватили в шести портфелях ее боевые документы.

Таким образом, кольцо блокирующих войск было прорвано. Генерал Л. Г. Петровский имел все основания последовать за продвигающимися полками и выйти из окружения. Однако он решил вернуться назад к частям, прикрывающим выход из окружения. Чувство долга и глубокой ответственности за жизнь вверенных ему командиров и бойцов заставило его поступить только так. Командир 154-й стрелковой дивизии генерал-майор Я. С. Фоканов и ряд других товарищей пытались было уговорить Л. Г. Петровского не возвращаться. «Здесь мне уже нечего делать,— решительно сказал он.— Впереди спокойно, решающее теперь там... Там проклятый немец наседает на наших». И, желая подбодрить и успокоить командиров, смеясь, сказал: «Страшное миновало», а потом серьезно и твердо, будто приказывая, добавил: «А вы спешите к войскам, по возможности скорее приведите их в порядок, да будьте готовы отразить атаки немцев, особенно со стороны Речицы. Я скоро вернусь».

И командир корпуса с группой командиров штаба и резервом направился туда, где шел ожесточенный бой, чтобы личным руководством обеспечить отрыв сил прикрытия от наседающего противника, ускорить их присоединение к дивизиям, сократить по возможности потери. Но враг, подбросив свежие части, вновь стал замыкать кольцо окружения. Во второй раз прорваться было уже значительно тяжелее.

Прорвавшись в одном месте, подразделения попали в еще более сложную обстановку у деревни Скепня, где проходила вторая линия вражеского кольца. Здесь погиб адъютант командира корпуса лейтенант В. Колесов. Л. Г. Петровский, раненный в руку, продолжал руководить боем. Прорыв все же удался. Но сам Леонид Григорьевич Петровский при атаке противника, укрепившегося на северных окраинах Скепни, был смертельно ранен замаскировавшимися в кустах автоматчиками.

Друкуецца па кн.: В грозные годы. Мн., 1973. С. 38—47.

Падрабязнасці баёў за Рагачоў

З артыкула П. Крылова ў газеце «Правда» ад 16 ліпеня 1941 г.

Рогачев и Жлобин отбиты у врага. Над ними вновь развеваются красные советские флаги.

Только что я вернулся из Рогачева. Фашистские варвары совершенно разрушили этот прекрасный городок. Жители Рогачева никогда не забудут зверств, учиненных фашистами.

Вот некоторые подробности борьбы советских войск за Рогачев. Отступив под натиском превосходящих сил противника на восточный берег Днепра, советские войска перешли к обороне. В течение нескольких дней фашисты пытались форсировать Днепр. Их замысел, однако, разбивался о стойкую оборону наших частей.

13 июля, подтянув свежие силы, части Красной Армии на этом участке фронта сами перешли в наступление. По наведен-

ным саперами мостам подразделения Н-ского соединения стремительно форсировали Днепр и решительной смелой атакой выбили из Рогачева фашистов.

В боях за город особенно отличились подразделения командиров тт. Прищепа, Степанищева, Елисеева. Бойцы этих подразделений, столкнувшись с отборным офицерским фашистским отрядом численностью до батальона, уничтожили половину его состава. Поддерживавшие отряд танки также были рассеяны, а 8 из них уничтожено.

Следует также отметить артиллеристов подразделения, которым командует тов. Михеев. Советская артиллерия, обеспечивая переправу пехоты, совершенно подавила фашистскую артиллерию.

Отважен поступок сержанта Лукьяненко. В течение нескольких часов он со станковым пулеметом сдерживал численно превосходящего противника. Огнем врага выбило весь расчет, а затем разбило и пулемет. Тов. Лукьяненко раздобыл новый пулемет и вновь продолжал разить фашистов, пока не подоспела подмога...

«Хачу ісці ў бой...»

ПЯТРОЎСКІ Леанід Рыгоравіч, генерал-лейтэнант (1941). Нарадзіўся ў Данецкай вобласці. Член КПСС з 1916 г. У Чырвонай Арміі ў 1918—38 гг. і са снежня 1940 г. Скончыў Ваенную акадэмію (1922), курсы ўдасканалення вышэйшага начсаставу (1928). З мая 1937 г. камандзір стралковага корпуса ў Беларускай ваеннай акрузе, выбіраўся членам ЦК КП(б) Б. Са снежня 1937 г. камандуючы войскамі Сярэднеазіяцкай ваеннай акругі, намеснік камандуючага войскамі Маскоўскай ваеннай акругі. Са снежня 1940 г. камандзір стралковага корпуса, які ў ліпені — жніўні 1941 г. ўдзельнічаў у абарончых баях пад Рагачовам і Жлобінам. У ліпені ў ходзе контрудару савецкіх войск на бабруйскім напрамку корпус фарсіраваў Дняпро, вызваліў Рагачоў і Жлобін і прасунуўся на 30 км на захад ад Дняпра. 13 жніўня 1941 г., калі корпус вёў баі ў акружэнні, Л. Г. Пятроўскі праз дэлегата сувязі, які прыбыў на самалёце, атрымаў загад аб прызначэнні яго камандуючым 21-й арміі, аднак папрасіў адтэрмінаваць уступленне на пасаду камандзіра да вываду часцей корпуса з акружэння. Пасля 50-дзённых жорсткіх баёў у час прарыву з акружэння Л. Р. Пятроўскі быў смяртэльна паранены каля в. Скепня Жлобінскага раёна. Пахаваны ў в. Старая Рудня Жлобінскага раёна, на магіле пастаўлены помнік.

Імем Л. Р. Пятроўскага названы вуліцы ў Жлобіне і в. Старая Рудня Жлобінскага р-на; яго імя прысвоена сярэдняй школе ў в. старая Рудня, піянерскай дружыне Беліцкай сярэдняй школы Рагачоўскага раёна.

З пісем Л. Р. Пятроўскага жонцы і дачцэ

24 чэрвеня 1941 г.

Здравствуйте, дорогие мои Надя и Оля!

Крепко-крепко вас обеих целую. Прошло всего несколько дней, хотя и работы много, а все-таки о вас соскучился. Дел невпроворот, сегодня спал всего три часа, буду ли ночью спать — не знаю.

Сейчас еду к командующему. Где я, писать не буду. Недалеко от того места, где мы с тобой и Олей собирали белые грибы. Всего несколько часов пути на машине. Сегодня утром над нами летал немецкий разведчик, но это только отдельные самолеты, которые могут сюда залететь. Сейчас мы в глубоком тылу. Я очень об этом жалею. Прямо скажу тебе, что хочу идти в бой и бить германских фашистов... Ты из газет, наверное, уже знаешь, что наша Красная Армия отбила многие их атаки.

Очень жалею, что я не среди первых частей, а пока в тылу. Мы все уверены в победе, и каждый из нас горит желанием сражаться за Родину, за вас, наших близких, которых мы защищаем. Вот поэтому ты, смотри, не плачь, будь спартанкой, это выражение тебе очень понравилось. Здесь мы стоим в сосновом лесу, песок под ногами...

27 ліпеня 1941 г.

Здравствуй, моя дочка!

Как ты поживаешь? Что поделываешь? Что у тебя нового? Мне ты написала всего лишь одно письмо. С твоей стороны это нехорошо. Ты могла бы мне писать и полнее. Что там у вас делается? Народу у вас теперь много, и, видимо, у вас там весело.

Я посылаю тебе несколько фотографий африканских. Мы захватили один германский штаб, а там много африканских фотографий. Вот я решил послать тебе некоторые из них. Есть там одна модница с прической «пераманент» по-африкански. Есть и собака с обезьяной. Думаю, что тебе понравится рассматривание этих карточек. У нас все по-старому. Артиллерия гремит так, что трудно разговаривать

Л. Р. Пятроўскі.

между собой, и мы все кричим друг другу и уже поосипли.

Сегодня солнечный день. Летают самолеты. Подбили один немецкий самолет. Летчиков взяли в плен и везут в штаб. Утром зенитка наша вела огонь по самолету очень удачно, и он должен был уйти с пути и не бомбил.

По лесу пошли грибы, лисички и сыроежки. Наверное, скоро будут и белые...

Сейчас уезжаю на фронт, на разведку. Пиши мне, дочка. Привет всем. Целуй мать свою от меня.

Целую тебя. Леонид.

* * *

Адносна абставін гібелі камкора Л. Р. Пятроўскага існавала некалькі версій. Да 1944 г. ён лічыўся прапаўшым без вестак. Летам 1944 г. ў час вызвалення Беларусі каля в. Старая Рудня размясціўся 42-і стралковы корпус. Паводле нарыса палкоўніка ў адстаўцы Г. П. Куляшова ў «Военно-историческом журнале» (1966. № 6) тады і было выяўлена пахаванне камкора.

Ад мясцовых жыхароў камандаванню стала вядома аб гібелі ў гэтых мясцінах Л. Р. Пятроўскага. Вяскоўцы паказалі безымянную магілу за 1 км на поўдзень ад в. Рудзенка. Сюды, як расказалі яны, група байцоў і афіцэраў вынесла з поля бою свайго смяротна параненага камандзіра. Тут ён і быў пахаваны, прычым пасля таго, як раён баёў акупіравалі нямецка-фашысцкія войскі, па распараджэнню іх камандавання на магіле камандзіра «чорнага корпуса» — так гітлераўцы называлі 63-і стралковы корпус — быў устаноўлены крыж з надпісам на нямецкай мове: «Генерал-лейтэнант Пятроўскі». Але гэты крыж не захаваўся.

Адкрылі магілу. Л. Р. Пятроўскі быў апазнаны людзьмі, якія яго добра ведалі. Тэрміновай тэлеграмай былі вызваны родныя Леаніда Рыгоравіча. 13 чэрвеня 1944 г. ён быў перазахаваны на брацкіх могілках у в. Старая Рудня з усімі воінскімі ўшанаваннямі.

У маі 1945 г. адзін з нямецкіх ваенна-палонных, обер-лейтэнант германскай арміі, які ў 1941 г. служыў у складзе палка, што ўдзельнічаў у баях з войскамі акружанага 63-га корпуса паказаў на дапросе, што пасля бою летам 1941 г. ён загадаў двум салдатам сваёй роты знайсці якую-небудзь трафейную легкавую аўтамашыну. Хутка адзін з салдатаў вярнуўся на легкавушцы і прывёз шынель камандзіра Чырвонай Арміі з невядомымі знакамі адрознення. Ён далажыў, што камандзір той ляжаў побач з машынай і, калі яны накіраваліся да яго, застрэліў з пісталета аднаго салдата. І тут жа аўтаматная чарга другога салдата абарвала яго жыццё. Адбылося ўсё гэта на ўскраіне лесу паміж вёскамі Рудзенка і Скепня. Нямецкі палкоўнік па даведніку знакаў адрознення камандзіраў Чырвонай Арміі вызначыў, што шынель належаў генерал-лейтэнанту і тэрмінова выехаў на месца. У кішэні гімнасцёркі забітага было знойдзена пасведчанне на імя генерал-лейтэнанта Пятроўскага Леаніда Рыгоравіча. Палкоўнік загадаў пахаваць Л. Р. Пятроўскага асобна.

Нельга забыць

З успамінаў капітана В. Рэвы, удзельніка абароны Рагачова ў 1941 г.

У ліпені 1941 г. 467-ы стралковы полк, якім камандаваў палкоўнік Ш. Г. Кіпіяні, дзень і ноч вёў жорсткія баі з ворагам. Па загаду камандавання полк фарсіраваў Дняпро ў раёне в. Гадзілавічы, разам з іншымі часцямі 102-й стралковай дывізіі нанёс нечаканы ўдар па ворагу і заняў плацдарм на правым беразе. Аднак сілы былі няроўныя. Пад градам варожых снарадаў і бомбаў полк забяспечваў адыход часцей Чырвонай Арміі цераз Дняпро. Пры адбіцці адной з атак Шалва Георгіевіч быў паранены ў грудзі, але поле бою не пакінуў. У час другой атакі ён атрымаў новае раненне — былі перабіты абедзве нагі, але працягваў камандаваць боем. Калі бой сціх, камандзір аддаў палку загад адыходзіць да Дняпра і тут жа страціў прытомнасць. Байцы беражліва выносілі яго на плашч-палатцы з-пад агню. Некалькі разоў натыкаліся на праціўніка, у час гэтых сутычак загінула яшчэ некалькі чалавек. Памёр, сцякаючы крывёю, і Ш. Г. Кіпіяні. З вялікімі цяжкасцямі астатнія байцы здолелі дабрацца да Дняпра, дзе іх падабрала наша разведка. А 22 ліпеня на правы бераг Дняпра была накіравана група разведчыкаў, якая знайшла целы загінуўшых байцоў і камандзіра палка. Усе яны пахаваны ў брацкай магіле каля в. Гадзілавічы. Так навекі ў зямлі Беларусі застаўся ляжаць сын Грузіі.

Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі Рагачоўскага раёна

8-я РАГАЧОЎСКАЯ БРЫГАДА

Створана ў лютым 1943 г. па ініцыятыве Рагачоўскага падпольнага райкома КП(б)Б і паводле загаду Клічаўскага аператыўнага цэнтра ад 22 лютага 1943 г. на базе 255-га, 256-га і 257-га атрадаў. Пры фарміраванні брыгады з асабовага складу 255-га атрада і прыбыўшых з савецкага тылу асобных груп арганізаваны 258-ы і 259-ы атрады. 256-ы атрад дзейнічаў у складзе брыгады да 11 сакавіка 1943 г., затым быў разгорнуты ў 10-ю Журавіцкую брыгаду. У красавіку 1943 г. быў створаны спецатрад пры Рагачоўскім падпольным райкоме КП(б)Б. 1 лістапада 1943 г. 255-ы атрад пераўтвораны ў 255-ы полк.

Пасля вызвалення Гомельскай вобласці 8-я Рагачоўская брыгада перабазіравалася ў Клічаўскі раён Магілёўскай вобласці.

Акрамя Рагачоўскага, партызаны брыгады дзейнічалі ў Журавіцкім, Жлобінскім, Буда-Кашалёўскім раёнах Гомельскай, Клічаўскім, Кіраўскім, Бярэзінскім і Быхаўскім — Магілёўскай абласцей.

12 сакавіка 1944 г. брыгада расфарміравана. На дзень расфарміравання было 2200 партызан.

Камандзіры брыгады: Тарасевіч Фёдар Сцяпанавіч (люты 1943 — люты 1944), Чысцякоў Віктар Віктаравіч (люты — сакавік 1944); камісары: Бірукоў Адам Андрэевіч (люты — ліпень 1943), Паўлаў Васіль Уладзіміравіч (ліпень 1943 — сакавік 1944); начальнікі штаба: Чысцякоў Віктар Віктаравіч (люты 1943 — люты 1944), Рубіс Марк Фёдаравіч (сакавік 1944).

255-ы ПАРТЫЗАНСКІ ПОЛК

Створаны ў лістападзе 1943 г.

14 жніўня 1941 г. паводле рашэння ЦК КП(б)Б з партыйна-савецкага актыву Рагачоўскага раёна арганізаваны Рагачоўскі партызанскі атрад у колькасці 120 чалавек (камандзіры: Кузняцоў Мікіта Цітавіч, жнівень — кастрычнік 1941 г.; Свярдлоў Самуіл Манусавіч, кастрычнік 1941 г.— ліпень 1942 г.; начальнік штаба — Коўтун, да кастрычніка 1941 г.). У кастрычніку група партызан на чале з М. Т. Кузняцовым вылучылася з атрада для выхаду ў савецкі тыл. Астатнія партызаны засталіся дзейнічаць пад кіраўніцтвам сакратара райкома партыі С. М. Свярдлова.

У Быхаўскім раёне ў лістападзе 1941 г. ваеннаслужачы М. К. Марусаў і член Рагачоўскага падпольнага райкома КП(б)Б А. А. Бірукоў арганізавалі партызанскую групу, якая колькасна выросла і ў красавіку 1942 г. аформілася ў атрад. У ліпені ён устанавіў сувязь з Клічаўскім аператыўным цэнтрам і атрымаў нумарное абазначэнне 255-ы. У ліпені 1942 г. атрады 255-ы і Рагачоўскі аб'ядналіся. Новы аб'яднаны атрад атрымаў назву 255-ы партызанскі атрад і да 22 лютага 1943 г. баявыя дзеянні праводзіў самастойна, а потым у складзе 8-й Рагачоўскай брыгады.

Дзейнічаў у Рагачоўскім, Быхаўскім, Клічаўскім і Жлобінскім раёнах.

Камандзіры атрада: Марусаў Міхаіл Кузьміч (красавік 1942 — красавік 1943), Мінайлаў Васіль Аляксандравіч (красавік — кастрычнік 1943); камісары: Бірукоў Адам Андрэевіч (красавік 1942 — сакавік 1943), Іванюк Аляксандр Канстанцінавіч (красавік — ліпень 1943), Ярымаў Іван Аляксеевіч (ліпень — кастрычнік 1943); начальнікі штаба: Чысцякоў Віктар Віктаравіч (ліпень 1942 — сакавік 1943), Мінайлаў Васіль Аляксандравіч (сакавік — красавік 1943), Красічкаў Аляксей Іванавіч (чэрвень 1943, в. а.), Зайцаў Павел Міхайлавіч (ліпень — кастрычнік 1943).

1 лістапада 1943 г. атрад разгорнуты ў 255-ы полк у складзе 3 батальёнаў. Спачатку полк уваходзіў у 8-ю Рагачоўскую брыгаду, 12 сакавіка 1944 г. перададзены Рагачоўскай ВАГ.

Да канца лістапада 1943 г. акрамя Рагачоўскага полк дзейнічаў у Жлобінскім раёне Гомельскай вобласці, у Быхаўскім, Кіраўскім, Клічаўскім раёнах — Магілёўскай вобласці і Крупскім раёне Мінскай вобласці.

Партызаны палка злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. ў складзе 3 батальёнаў агульнай колькасцю 849 партызан.

Камандзір палка Мінайлаў Васіль Аляксандравіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944); камісары: Захарава Аляксандра Нічыпараўна (лістапад 1943 — май 1944), Паўлаў Васіль Уладзіміравіч (май — чэрвень 1944); начальнік штаба Ярымаў Іван Аляксеевіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

1-ы батальён сфарміраваны 1 лістапада 1943 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 205 партызан.

Камандзір Шынкевіч Васіль Ігнатавіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944); камісары: Кавалёў Міхаіл Фёдаравіч (лістапад 1943 —

В. А. Мінайлаў.

В. У. Паўлаў.

І. М. Гаўрылаў.

К. М. Драчоў.

Чаша Іван Францавіч (май — май 1944), Чаша Іван Францавіч (май — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Красічкаў Аляксей Іванавіч (лістапад 1943 — май 1944), Шынкевіч Мікалай Андрэевіч (чэрвень 1944).

2-і батальён арганізаваны 1 лістапада 1943 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 287 партызан.

Камандзіры: Страчанка Сяргей Васілевіч (лістапад 1943 — сакавік 1944), Іваноў Фёдар Кузьміч (сакавік — чэрвень 1944); камісар Рэйдзер Піня Меераві ч (лістапад 1943 — чэрвень 1944), начальнік штаба Мяшкоў Георгій Кононавіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

3-і батальён створаны 1 лістапада 1943 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 208 партызан.

Камандзір Сакалоў Іван Васілевіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944); камісар Радзіёнаў Міхаіл Іванавіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944); начальнік штаба Швалёў Мікалай Васілевіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

257-ы АСОБНЫ АТРАД

Створаны ў лютым 1943 г. ў складзе 8-й Рагачоўскай брыгады з асабовага складу дыверсійнай групы А. С. Язерскага, якая прыбыла ў Рагачоўскі раён з савецкага тылу ў верасні 1942 г., і партызан, вылучаных 255-м атрадам. 12 сакавіка 1944 г. атрад перададзены Рагачоўскай ВАГ. Да канца лістапада 1943 г. дзейнічаў у Рагачоўскім раёне, затым у Быхаўскім, Клічаўскім Магілёўскай вобласці і Бярэзінскім, Крупскім раёнах Мінскай вобласці. Атрад злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 27 чэрвеня 1944 г. ў Бялыніцкім раёне агульнай колькасцю 414 партызан.

Камандзіры атрада: Язерскі Аляксандр Станіслававіч (люты 1943 — красавік 1944), Сяскоў Яфім Авяр'янавіч (красавік — чэрвень 1944), камісары: Паўлаў Васіль Уладзіміравіч (люты 1943 — май 1944); Кавалёў Міхаіл Фёдаравіч (май — чэрвень 1944); начальнік штаба Шавялёў Міхаіл Карнеевіч (верасень 1943 — чэрвень 1944).

258-ы АСОБНЫ АТРАД

Сфарміраваны ў сакавіку 1943 г. ў складзе Рагачоўскай брыгады з групы партызан, выдзеленай 255-м атрадам. 12 сакавіка 1944 г. перададзены Рагачоўскай ВАГ. Да канца лістапада 1943 г. дзейнічаў у Рагачоўскім раёне, затым у Клічаўскім і Крупскім раёнах. Атрад злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. ў складзе 512 партызан.

Камандзіры атрада: Кароткі Уладзімір Міхайлавіч (сакавік — красавік 1943), Галашчапаў Аляксандр Ягоравіч (красавік 1943 — чэрвень 1944); камісар Мальцаў Аляксандр Кліменцьевіч (сакавік 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Шыцікаў Іван Лукіч (сакавік 1943, загінуў); Мядзведзеў Мікалай Цімафеевіч (красавік — чэрвень 1943), Лукашоў Пётр Дамітрыевіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944).

259-ы АСОБНЫ АТРАД

Сфарміраваны ў сакавіку 1943 г. ў складзе 8-й Рагачоўскай брыгады на базе дыверсійнай групы Ц. Ц. Ціхамірава, якая дзейнічала з 15 лістапада 1942 г. па заданні ЦК КП(б)Б у тыле праціўніка. 12 сакавіка 1944 г. ўключаны ў склад Рагачоўскай ВАГ. Дзейнічаў на тэрыторыі Гомельскай вобласці да канца лістапада 1943 г., потым у Магілёўскай вобласці. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. ў складзе 175 партызан.

Камандзіры атрада: Ціхаміраў Ціхан Трафімавіч (сакавік — красавік 1943), Андрыянаў Мікалай Паўлавіч (красавік 1943 — чэрвень 1944).

252-і АСОБНЫ АТРАД

У красавіку 1943 г. з 255-га атрада выдзелена 2-я рота і разгорнута ў Рагачоўскі спецатрад. Да 12 сакавіка 1944 г. атрад быў у распараджэнні Рагачоўскага падпольнага райкома партыі, затым пераўтвораны ў 252-ы партызанскі атрад і ўключаны ў Рагачоўскую ВАГ. Да канца лістапада 1943 г. дзейнічаў у Рагачоўскім раёне, затым у Клічаўскім і Крупскім. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі, 28 чэрвеня 1944 г., налічваў 220 партызан.

П. К. Антонаў.

Камандзір атрада Парываеў Іван Мікалаевіч (красавік 1943 — чэрвень 1944); камісары: Зуевіч Іван Цімафеевіч (красавік — ліпень 1943), Рэйдзер Піня Мееравіч (жнівень — кастрычнік 1943), Іванюк Аляксандр Канстанцінавіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944); начальнікі штаба: Шаўчэнка Васіль Іванавіч (чэрвень — ліпень 1943, загінуў), Казлоўскі Лаўрэнцій Ціханавіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944).

10-я ЖУРАВІЦКАЯ БРЫГАДА

Створана ў сакавіку 1943 г. загадам Клічаўскага аператыўнага цэнтра на базе 256-га атрада 8-й Рагачоўскай брыгады. Пры фарміраванні брыгады з асабовага складу, вылучанага 256-м атрадам, арганізаваны новыя 260-ы, 261-ы, 262-і атрады, а таксама ўключаны 108-ы атрад. Пазней створаны атрады П. Я. Мацюшкова, В. А. Трубачова, П. П. Рымарава, 266-ы, 267-ы «За Радзіму», 268-ы імя 25-годдзя камсамола. 1 мая 1943 г. атрады П. Я. Мацюшкова, В. А. Трубачова, П. П. Рымарава атрымалі (адпаведна) нумарныя абазначэнні 263-і, 264-ы і 265-ы. 16 ліпеня 1943 г. атрадам былі прысвоены імёны: 256-му — І. В. Сталіна, 260-му М. І. Калініна, 261-му — В. І. Чапаева, 262-му — В. П. Чкалава, 263-му — М. І. Кутузава, 264-му — А. В. Суворава, 265-му — К. Я. Варашылава, 266-му — М. В. Фрунзе, 108-му — Р. І. Катоўскага. У жніўні 1943 г. загадам упаўнаважанага ЦК КП(б)Б па Гомельскай вобласці атрады імя Р. І. Катоўскага былі перададзены 1-й Буда-Кашалёўскай брыгадзе. Да 6 красавіка 1943 г. брыгада ўваходзіла ў склад Клічаўскага аператыўнага цэнтра, затым — партызанскага злучэння Гомельскай вобласці.

Партызаны брыгады дзейнічалі ў Журавіцкім, Рагачоўскім, Жлобінскім, Чачэрскім, Буда-Кашалёўскім, Кармянскім і Церахоўскім раёнах. Брыгада злучылася асноўнымі сіламі з часцямі Чырвонай Арміі 2 кастрычніка 1943 г., 267-ы атрад «За Радзіму» — 28 верасня 1943 г., асобныя групы партызан працягвалі дзейнічаць у варожым тыле да чэрвеня 1944 г. Усяго выйшла ў савецкі тыл 2811 партызан.

Камандзіры брыгады: Белых Сцяпан Мітрафанавіч (сакавік — красавік 1943, загінуў), Гаўрылаў Іван Міхайлавіч (май — кастрычнік 1943); камісары: Дзіан Ігнат Максімавіч (сакавік — верасень 1943), Драчоў Карп Міхайлавіч (верасень — кастрычнік 1943); начальнік штаба Антонаў Піліп Карпавіч (сакавік — кастрычнік 1943).

256-ы атрад імя І. В. Сталіна

22 чэрвеня 1942 г. па заданні ЦК КП(б)Б з савецкага тылу была накіравана арганізатарская група І. М. Дзікана — С. М. Белых у складзе 16 чалавек. 5 кастрычніка група прыбыла ў Журавіцкі раён. Да снежня група колькасна выросла і аформілася ў атрад. Спачатку партызаны атрада дзейнічалі самастойна, з лютага 1943 г. — у складзе 8-й Рагачоўскай брыгады. 11 сакавіка 1943 г. атрад перададзены для фарміравання 10-й Журавіцкай брыгады. У канцы лютага 1943 г. атраду прысвоена нумарное абазначэнне 256-ы. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 578 партызан.

Камандзіры атрада: Белых Сцяпан Мітрафанавіч (снежань 1942 — сакавік 1943), Штапенка Яфім Ігнатавіч (май — кастрычнік 1943); камісары: Дзікан Ігнат Максімавіч (люты — сакавік 1943), Міхуноў Іван Ананасавіч (май — кастрычнік 1943); начальнік штаба — Антонаў Піліп Карпавіч (лістапад 1942 — жнівень 1943), Марозаў Іван Гаўрылавіч (жнівень — кастрычнік 1943).

260-ы атрад імя М. І. Калініна

Арганізаваны ў сакавіку 1943 г. загадам Клічаўскага аператыўнага цэнтра з асабовага складу 2-й роты 256-га атрада. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 388 партызан.

Камандзіры атрада: Гаўрылаў Іван Міхайлавіч (сакавік — красавік 1943), Грызлоў Міхаіл Рыгоравіч (май — кастрычнік 1943); камісары Жураўлёў Фама Лявонцьевіч (сакавік — верасень 1943), Кудасаў Аляксей Сцяпанавіч (верасень — кастрычнік 1943); начальнік штаба Дудалёў Сяргей Сямёнавіч (сакавік — кастрычнік 1943).

261-ы атрад імя В. І. Чапаева

Створаны ў сакавіку 1943 г. загадам Клічаўскага аператыўнага цэнтра з партызан 3-й роты 256-га атрада. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 577 партызан.

Камандзір атрада Жураўлёў Міхаіл Пятровіч (сакавік — кастрычнік 1943); камісары: Нікіфараў Якаў Мікалаевіч (сакавік — красавік 1943), Гонтараў Апанас Сяргеевіч (май — кастрычнік 1943); начальнік штаба Анікіевіч Васіль Міхайлавіч (сакавік — кастрычнік 1943).

264-ы атрад імя А. В. Суворава

Сфарміраваны ў красавіку 1943 г. з партызан 4-й роты 256-га атрада. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 292 партызаны.

Камандзір атрада Трубачоў Васіль Антонавіч (красавік — кастрычнік 1943); камісары Афанасенка Мікіта Яўсеевіч (красавік — май 1943), Казакоў Канстанцін Піліпавіч (май — кастрычнік 1943); начальнік штаба Качаткоўскі Уладзімір Паўлавіч (красавік — кастрычнік 1943).

265-ы атрад імя К. Я. Варашылава

Створаны ў сакавіку 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы П. П. Рымарава — К. М. Драчова, выдзеленай 8-й Рагачоўскай брыгадай. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 568 партызан.

Камандзіры атрада: Рымараў Павел Пятровіч (сакавік — ліпень 1943), Драчоў Карп Міхайлавіч (жнівень — верасень 1943), Пушкароў Павел Пахомавіч (верасень — кастрычнік 1943); камісары: Драчоў Карп Міхайлавіч (сакавік — жнівень 1943), Шабеткін Мікіта Фёдаравіч (жнівень — кастрычнік 1943); начальнік штаба Сямешкін Ілья Ягоравіч (сакавік — кастрычнік 1943).

266-ы атрад імя М. В. Фрунзе

Арганізаваны ў маі 1943 г. на базе ініцыятыўнай групы У. Б. Паўлава. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 317 партызан.

Камандзір атрада Паўлаў Уладзімір Барысавіч (май — кастрычнік 1943); камісар Дубінін Уладзімір Іванавіч (май — кастрычнік 1943); начальнікі штаба: Палікаў Мікалай Мікітавіч (май — верасень 1943), Панкоў Лаўрэнцій Аўрамавіч (верасень — кастрычнік 1943).

Ф. С. Тарасевіч.

С. М. Белых.

267-ы атрад «За радзіму»

Утвораны ў жніўні 1943 г. з партызан 5-й роты 256-га атрада. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 172 партызаны.

Камандзір атрада Самыкін Захар Паўлавіч (жнівень — кастрычнік 1943); камісар Холадаў Дзмітрый Іванавіч (жнівень — кастрычнік 1943); начальнік штаба Пунінскі Іван Мітрафанавіч (жнівень — кастрычнік 1943).

268-ы атрад імя 25-годдзя ВЛКСМ

Сфарміраваны ў верасні 1943 г. як камсамольска-маладзёжны. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 58 партызан.

Камандзір атрада Чарненка Кузьма Фядосавіч, камісар Бязмельніцын Іван Рыгоравіч, начальнік штаба Раманаў Іван Лявонцьевіч (усе — верасень — кастрычнік 1943 г.).

ФЁДАР СЦЯПАНАВІЧ ТАРАСЕВІЧ

Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях у гады Айчыннай вайны. Нарадзіўся 4 чэрвеня 1911 г. ў в. Слабодка Клічаўскага раёна. З 1929 г. рабочы-шкловыдзімальшчык. У Чырвонай Арміі з 1931 г. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1940). У партызанах з сакавіка 1942 г.: начальнік штаба атрада, камандзір групы, з кастрычніка 1942 г. камандзір 720-га партызанскага атрада. У лістападзе 1942 — лютым 1943 г. быў камандзірам 4-й Клічаўскай партызанскай брыгады, у лютым 1943 — лютым 1944 г.— камандзірам 8-й Рагачоўскай брыгады. У 1944–

1970 гг. працаваў у Прэзідыуме Вярхоўнага Савета БССР. З 1970 г. на пенсіі. Жыве ў Мінску. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені.

СЦЯПАН МІТРАФАНАВІЧ БЕЛЫХ

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Рагачоўшчыне ў гады Айчыннай вайны. Нарадзіўся ў 1916 г. ў с. Гайваронка Кастрычніцкага раёна Курскай вобласці. Перад вайной служыў у пагранвойсках. У 1942 г. па загаду БШПР С. М. Белых быў накіраваны з групай партызан у тыл ворага для разгортвання партызанскага руху ў Журавіцкім раёне. З кастрычніка 1942 г. камандзір 256-га партызанскага атрада імя І. В. Сталіна. З сакавіка 1943 г. камандзір Журавіцкай партызанскай брыгады. Загінуў у баі 29 красавіка 1943 г. Пахаваны ў брацкай магіле ў в. Курганне.

АДАМ АНДРЭЕВІЧ БІРУКОЎ

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага падполля і партызанскага руху на Рагачоўшчыне ў гады Айчыннай вайны. Нарадзіўся ў 1914 г. на Клічаўшчыне. З верасня 1940 г. сакратар Рагачоўскага райкома ЛКСМБ.

У жніўні 1941 г. выбраны сакратаром Гомельскага падпольнага абкома ЛКСМБ, член падпольнага райкома КП(б)Б. Адначасова з лістапада 1941 г. камандзір партызанскай групы, з красавіка 1942 г. камісар 255-га атрада. У лютым 1943 г. А. А. Біркоў прызначаны камісарам 8-й Рагачоўскай брыгады. З жніўня 1943 г. да ліпеня 1944 г. быў на падпольнай рабоце ў Пінскай вобласці. З 1947 г. на партыйнагаспадарчай рабоце. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1959—1963 гг. Зараз на пенсіі. Жыве ў Мінску.

ІГНАТ МАКСІМАВІЧ ДЗІКАН

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Гомельскай вобласці. Генерал-маёр (1943). Нарадзіўся ў маі 1900 г. ў вёсцы Раеўскія Мазырскага раёна. У 1919—1941 гг. на савецкай рабоце ў Гомельскай вобласці. З ліпеня 1942 г. ў тыле ворага: камандзір арганізацыйнай групы, камісар атрада, у сакавіку — верасні 1943 г.— 10-й Журавіцкай брыгады, адначасова сакратар Журавіцкага падпольнага РК КП(б)Б. З кастрычніка 1943 г. І. М. Дзікан — начальнік аператыўнай групы БШПР пры

А. А. Біркоў.

Беларускім, 1-м Беларускім франтах. З 1944 г. працаваў намеснікам старшыні Бабруйскага аблвыканкома. Памёр 13.2. 1948 г.

З успамінаў А. І. Ермакова, былога партызана 10-й Журавіцкай брыгады

Паміж сабой мы яго звалі проста Максімычам. Наш Максімыч — горда гаварылі мы, а сябе называлі дзіканцамі. Быў наш камісар цывільным чалавекам.

Перад вайной на пасадзе старшыні Стрэшынскага райсавета дэпутатаў працоўных Ігнат Максімавіч займаўся будаўніцтвам дарог, школ, бальніц. А пачалася вайна, ён разам з усімі сумленнымі людзьмі стаў на абарону бацькаўшчыны. Ён дзяліў з намі, радавымі, усе цяжкасці партызанскага жыцця. Быў душой атрада, нашым духоўным бацькам і настаўнікам. Спакойны, ураўнаважаны, у той жа час меў цвёрды прынцыповы характар. Да нашага камісара часта звярталіся мясцовыя партызаны па асабістых справах і часцей з пытаннем — як быць з сем'ямі, якіх праследавалі паліцаі і фашысты. Пасля, калі ў нас за Сажом была створана свая база, гэта пытанне вырашалася прасцей — дзяцей і жанчын уладкоўвалі ў гаспадарчую частку брыгады. Але восенню 1942 г. такой магчымасці яшчэ не было і кожны такі выпадак вырашаўся ў вельмі цяжкіх і складаных умовах. Аднак наш камісар заўсёды ўмеў знайсці выйсце і нейкім чынам вырашыць пытанне.

Запомніўся мне Максімыч і ў баі каля в. Лозава летам 1943 года. Гэта быў цяжкі бой, які працягваўся цэлы дзень да самай цемнаты. Фашысты кінулі супраць нас нават армейскія часці, якія рухаліся на фронт. У невялічкім ляску каля Лозава мы занялі кругавую абарону, адбіваючы атакі фашыстаў і паліцаяў. Атрады ў гэты крытычны час трымаліся стойка. Камісар быў ва ўсіх на віду...

Усе мы яго любілі, як роднага бацьку. Кожнаму з нас хацелася зрабіць што-небудзь прыемнае для нашага Максімыча. Аднойчы, вярнуўшыся з удала праведзенай аперацыі, партызаны паказвалі адзін аднаму свае трафеі. У ліку іншых трафеяў у мяне быў невялічкі кішэнны ліхтарык. Усім ён вельмі спадабаўся. «Падары яго Максімычу»,— прапанаваў хтосьці з прысутных. І я з задавальненнем прыняў гэту параду.

...Калі мы даведаліся, што нашаму камісару прысвоілі званне генерал-маёра, то ніколькі не здзівіліся. Ён сапраўды заслужыў гэта высокае званне. Велізарная работа лягла на яго плечы і пасля злучэння з Чырвонай Арміяй. Ігнат Максімавіч не ведаў спакою ні днём, ні ноччу. Ён быў пастаянна ў дарозе, у паездках па раёнах. Ён і памёр у дарозе, у адным з аддаленых раёнаў вобласці.

МІХАІЛ ПЯТРОВІЧ ЖУРАЎЛЁЎ

Нарадзіўся ў 1915 г. ў мястэчку Свержань Рагачоўскага раёна. Перад вайной скончыў ваеннае вучылішча. Прымаў удзел у Смаленскай бітве ў раёне Віцебска, дзе быў паранены. Пасля выздараўлення вярнуўся ў родную вёску. З кастрычніка 1941 г. М. П. Жураўлёў узначаліў Свержанскую камсамольскую арганізацыю. З кастрычніка 1942 г. ў партызанах. У сакавіку — кастрычніку 1943 г. камандзір 261-га атрада 10-й Журавіцкай брыгады. Пасля вайны знаходзіўся на савецкай рабоце ў г. п. Дзятлава Гродзенскай вобласці. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, Чырвонай Зоркі і медалямі. Персанальны пенсіянер.

АЛЯКСАНДРА НІЧЫПАРАЎНА ЗАХАРАВА

Адна з арганізатараў партызанскага руху ў Гомельскай вобласці ў гады Айчыннай вайны. Нарадзілася 22 сакавіка 1903 г.

А. Н. Захарава.

ў с. Паліеўка Ямпольскага раёна Сумскай вобласці. З 1923 г. настаўнічала. З 1938 г. ў Стаўрапольскім крайкоме, з 1940 г. ў Беластоцкім абкоме КП(б)Б. З лютага 1943 г. лектар Рагачоўскага падпольнага РК КП(б)Б. З лістапада 1943 г. камісар 255-га партызанскага палка. З 1945 г. лектар, намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б. У 1947—1959 гг. намеснік старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, дырэктар Дома-музея I-га з'езда РСДРП. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947—1959 гг. З 1959 г. на пенсіі. А. Н. Захарава вяла вялікую грамадскую работу. Жыве ў Мінску. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны II ступені, баявым ордэнам Рэспублікі Югаславія, медалямі.

Няўлоўны «Арол»

...Марознай лютаўскай ноччу 1942 г. непадалёк ад в. Сялец прызямліліся тры савецкія разведчыкі: камандзір групы А. І. Чарноў («Рэвізор»), радыст М. І. Емяльянаў («Арол») і разведчыца Шура Субоціна («Клара»). Яны прыбылі з Вялікай зямлі з заданнем узяць пад кантроль чыгуначную станцыю і гарнізон праціўніка ў Рагачове. Прытулак у гэты цяжкі час далі разведчыкам калгасніца вёскі Ульяна Пятроўна Лускіна, яе сын Пётр, дачка Ніна. Рызыкуючы жыццём, яны надзейна схавалі разведчыкаў на гарышчы сваёй хаты, што стаяла побач з нямецка-паліцэйскім гарнізонам. У хуткім часе члены разведгрупы А. Чарноў і А. Субоціна накіраваліся ў Рагачоў, ім удалося ўладкавацца на працу ў акупацыйныя ўстановы. Ульяна Прохараўна і Ніна Лускіны сталі іх надзейнымі сувязнымі. Яны пастаянна хадзілі ў Рагачоў, каб потым глыбокай ноччу «Арол» мог перадаць у цэнтр каштоўныя разведданыя. Затым на дапамогу ім прыйшлі сакратар падпольнага райкома партыі С. М. Свярдлоў, падпольшчыкі Мікалай Зінчанка, Якаў Міхееў, настаўнік Ф. Р. Сідоранка з жонкай Юзэфай Іосіфаўнай, Даніла Шолахаў. Ланцужок сувязных ад Рагачова цягнуўся праз Старую Рудню, Салтанаўку, Гарадзец, Красніцу, Аляксандраўку, Лаву да радыёстанцыі «Арла», схаванай на балотным астраўку пад кучай старога галля.

Гітлераўскія разведчыкі не раз траплялі на след радыёстанцыі, праводзілі павальныя аблавы, прачэсвалі лясы, але «Арол» заставаўся няўлоўным. Уласным жыццём заплацілі памочнікі разведгрупы, але не выдалі тайны ворагам. Фашысты жыўцом спалілі Ульяну Лускіну, закатавалі ў засценках Шуру Субоціну, Юзэфу Сялезка, у няроўным паядынку склаў галаву Аляксандр Чарноў, радыёстанцыя працягвала працаваць. І кожны раз, звязаўшыся з цэнтрам, Емяльянаў гаварыў:

— Я — «Арол». Перадаю чарговую радыёграму...

А. Духанін.

Рагачоўскае падполле

З жніўня 1941 г. да ліпеня 1944 г. ў Рагачове і раёне дзейнічала партыйна-камсамольскае падполле. У яго ўваходзіла 17 арганізацый і груп, якія налічвалі больш за 160 чалавек, у тым ліку 21 камуніста і 108 камсамольцаў. У горадзе дзейнічалі 2 падпольныя камсамольскія арганізацыі: тэрытарыяльная (кіраўнік М. Я. Данілава) і на лесазаводзе (кіраўнік К. К. Гадзіеўскі). На тэрыторыі раёна ў розны час дзейнічала 11 падпольных камсамольскіх арганізацый: 3 у в. Турск (кіраўнікі А. А. Ганчароў, В. Ф. Ярмоленка, Л. А. Кудраўцава), у пасёлках Дняпроўск (Г. А. Фядосава), Масткі (М. С. Філіпаў), у вёсках Забалацце (В. К. Парфёнава), Слабада (А. А. Канавалава), Станькаў (У. Я. Крапіцкая), Церахоўка (У. Ф. Мазепіна), Філіпкавічы (Р. П. Лукашэвіч), Гадзілавічы (І. В. Гранкова), Красніца (А. І. Шукевіч), Азяраны (А. К. Мальцаў), на станцыі Салтанаўка Жлобінскага раёна (В. А. Ашмянскі і У. В. Лабачоў). Існавалі явачныя кватэры ў пас. Дубрава (М. Я. Бардуленка) і ў в. Ходасавічы (П. А. Купрэеў) і інш. З мэтай аператыўнага кіраўніцтва падполлем РК ЛКСМБ у маі 1942 г. замацаваў членаў райкома С. М. Свярдлова, І. Ц. Зуевіча, К. М. Драчова за асобнымі зонамі раёна. Сакратар Рагачоўскага падпольнага РК ЛКСМБ А. А. Бірукоў каардынаваў дзейнасць падпольных камсамольскіх арганізацый і груп. Падпольшчыкі за 2 гады здабылі і перадалі партызанам 4 мінамёты, 24 кулямёты, 263 вінтоўкі, 750 гранат, 450 кілаграмаў узрыўчаткі, больш за 100 тысяч патронаў, разам з партызанамі ўдзельнічалі ў дыверсіях на чыгунцы. Зімой 1943 г. М. Я. Данілава з дапамогай іншых падпольшчыкаў пераправіла да партызан зубных урачоў і арганізавала вываз абсталявання зубаўрачэбнага кабінета. У дыверсіях на чыгунцы актыўна ўдзельнічалі падпольшчыкі Л. Л. Байдакова, Н. С. Бялян, браты А. Р. і М. Р. Жданавы, Л. М. Мацкоў, К. І. Ясянецкая. Члены арганізацыі в. Станькаў Ф. Р. Каморнікаў, М. В. Хуркоў і А. С. Парахневіч зімой 1942 г. двойчы ўзрывалі чыгунку. Інжынер А. С. Каратаеў вывеў са строю водаправодную сістэму, якая забяспечвала водой чыгуначную станцыю і тэрыторыю былога ваеннага гарадка, дзе размяшчаўся гарнізон праціўніка. Падпольшчыкі Л. Я. Данілава, А. А. Чарнавусава, М. П. Дойлідаў рэгулярна выводзілі са строю сянныя прэсы. Летам 1943 г. П. В. Чэвушаў падарваў на станцыі Рагачоў мотавоз і 5 вагонаў з гаручым, у верасні там жа знішчыў усю дзеючую і запасную апаратуру сувязі (больш за 50 тэлефонных і тэлеграфных апаратаў). У красавіку 1943 г. Філіпаў, П. С. Назараў і В. І. Падольцаў забяспечылі партызанам поспех у баі з нямецкім гарнізонам в. Гадзілавічы. Патрыёты Сідарэнка, Фядосава, Д. А. Шолахаў і іншыя аказвалі дапамогу партызанам і разведгрупам Чырвонай Арміі зборам інфармацыі аб перадыслакацыі вайсковых часцей, чыгуначных і аўтамабільных перавозках праціўніка. У барацьбе з фашысцкімі захопнікамі загінулі М. А. Бондараў, П. А. Купрэеў, В. І. Кухарэнка, В. І. Падольцаў, Ф. Н. Рудзянкоў, Ю. І. Слязенка, І. М. Шабеткін, В. Д. Шолахаў, У. І. Юшкевіч, В. А. Янава.

М. Ф. Шумейка.

А. Субоціна.

Л. Чарноў.

З успамінаў А. А. Бірукова, былога сакратара Рагачоўскага падпольнага РК ЛКСМБ

З першага дня акупацыі пачалася актыўная работа па стварэнні ў Рагачове і на тэрыторыі раёна камсамольскага падполля для барацьбы з ворагам. Для гэтай мэты ў Рагачоў была паслана Марыя Якаўлеўна Данілава. Да вайны яна працавала тэхнічным сакратаром у райкоме партыі, з'яўлялася членам райкома камсамола. І калі на пасяджэнні падпольнага райкома партыі 30 жніўня 1941 г. паўстала пытанне аб арганізацыі падпольных камсамольскіх арганізацый у Рагачове і кандыдатуры для гэтай работы, выбар выпаў на Марыю Данілаву.

Заданне было адказным і нялёгкім. Патрэбны былі мужнасць, арганізатарскія здольнасці, уменне працаваць у складаных умовах, Марыя Якаўлеўна валодала ўсімі гэтымі якасцямі. Яна ўладкавалася працаваць афіцыянткай у сталовую пры

былой кардоннай фабрыцы. І адразу ж пачала работу па стварэнні першай у горадзе падпольнай камсамольскай арганізацыі. Моладзь яна ведала добра і карысталася ў яе даверам.

Актыўнай памочніцай ёй стала малодшая сястра Лідзія Данілава. Першымі членамі камсамольскай арганізацыі сталі Мікалай Маркаў, Марыя Гардзіеўская. Пазней для работы ў падпольнай камсамольскай арганізацыі былі прыцягнуты Ларыса Клятэцкая, браты Сяргей і Уладзімір Бацюшкавы. Да пачатку 1942 г. камсамольская арганізацыя налічвала ў сваіх радах 14 чалавек. Кожны з іх меў ад М. Данілавай канкрэтнае заданне.

Аднак работа афіцыянткай абмяжоўвала дзейнні Марыі па арганізацыі камсамольскага падполля і збору разведвальных даных для партызан. Нарэшце, у красавіку 1942 г. ёй удалося ўладкавацца памочнікам справавода ў раённую ўправу. Цяпер у яе была магчымасць кантраляваць перапіску раённага бургамістра. Яна магла азнаёміцца з яго распараджэннямі ваенным і вясковым старастам, іх паведамленнямі. Гэта інфармацыя была вельмі неабходнай для каардынацыі партызанскай барацьбы і работы падпольшчыкаў. Перадаваць яе ў падпольны райком партыі дапамагалі яе сястра Ліда, бацькі. Працуючы ва ўправе, Марыя магла даставаць розныя дакументы для забеспячэння імі патрэбных людзей.

Другой вельмі важнай справай камсамольскай арганізацыі быў збор разведвальных даных аб размяшчэнні і руху нямецкіх вайсковых часцей па чыгункі Жлобін — Магілёў, аб характары перавозімых грузаў, руху па шашы. Сабраныя камсамольцамі звесткі Марыя перадавала савецкім разведчыкам Чарнову і Субоцінай, якія жылі з сакавіка 1942 г. ў Рагачове. Атрыманыя матэрыялы па рацыі перадаваліся імі ў Маскву.

Сабраныя звесткі для райкома партыі Марыя перадавала праз сувязнога падпольшчыкаў старасту в. Шчыбрын Васіля Шэбушава. Калі сустрэцца з ім было немагчыма, матэрыялы пакідала ў дупле дуба на дарозе на в. Старое Сяло. Гэту «паштовую скрынку» рэгулярна наведвалі партызанскія сувязныя. Дастаўку тэрміновых звестак у райком партыі ажыццяўляў і Дзмітрый Ільіч Клятэцкі, які працаваў галоўным бухгалтарам на лесазаводзе. Ён перадаваў іх праз сваю дачку камсамолку Ларысу. Яна разам з маці Ефрасінняй Фокаўнай збірала звесткі аб праходжанні паяздоў праз станцыю Рагачоў. Праз старасту Шэбушава перадаваліся ў партызанскі атрад таксама зброя, прадукты і многае іншае.

Камсамольцы Л. Данілава, А. Чарнавусава і М. Дойлідаў працавалі на сяннай базе. Яны мелі пропускі для выезду за межы Рагачова, што выкарыстоўвалася для наладжвання сувязей з моладдзю. Чарнавусава і Дойлідаў займаліся таксама і дыверсійнай работай, выводзілі са строю сянныя прэсы. Браты Бацюшкавы працавалі ў нямецкай майстэрні па рамонту баявой тэхнікі. Яны сістэматычна псавалі станкі, абсталяванне і ўсялякімі сродкамі стрымлівалі рамонт машын.

Камсамольцы М. М. Маркаў і А. І. Масладудаў працавалі на радыёвузле, рэгулярна слухалі Маскву, зводкі Саўінфармбюро і перадавалі іх у падпольную арганізацыю для інфармавання насельніцтва. Яны даставалі батарэі для радыёпрыёмнікаў і перадавалі іх у партызанскі атрад. Камсамольцы Іван Вялічка і яго сястра Вера збіралі зброю, рыхтавалі моладзь да адыходу ў партызаны. Актыўна працавала камсамолка Вера Кухарэнка.

Шмат было зроблена падпольнай камсамольскай арганізацыяй і моладдзю пад кіраўніцтвам Марыі Данілавай. У 1943 г., калі бургамістр Сідарэнка пачаў падазраваць Марыю, ёй удалося перайсці ў зямельную ўправу. Дапамагла у гэтым Вольга Герман, якая працавала тут аграномам і была сувязной райкома партыі. Калі ж пагроза раскрыцця стала рэальнай, Марыю пераправілі ў партызанскі атрад. Падполле ўзначаліла Марыя Гардзіеўская. Але актыўная дзейнасць падпольнай камсамольскай арганізацыі не абышлася без ахвяр. Загінула, выконваючы даручэнні і арганізацыі, камсамолка Вера Кухарэнка.

Падпольную камсамольскую арганізацыю на лесазаводзе ўзначальваў Канстанцін Кірылавіч Гардзіеўскі. Яго бацька Кірыла Харытонавіч знаходзіўся ў партызанах з першых дзён акупацыі. Канстанціна на кожным кроку падсцерагала небяспека. Данясе хто-небудзь, што яго бацька партызан,— смерці не мінуць. Але Канстанціна гэта не палохала. На лесазаводзе падпольшчыкі выводзілі са строю машыны, псавалі маторы, водаправодную сетку, помпавую станцыю. У выніку лесазавод пры заданні 300 кубаметраў лесаматэрыялаў выпускаў іх не больш як 20—25 кубаметраў за дзень. Памочнікамі Гардзіеўскага былі Г. П. Клятэцкі, М. Т. Гарадзецкі, М. І. Філімонаў, А. І. Палякоў, В. Е. Шумілаў, М. В. Іваноў, М. А. Гайдураў. У склад камсамольскай арганізацыі ўваходзілі В. П. Ксянзова, А. С. Грыгор'ева, Н. М. Барысава. У лютым —

сакавіку 1943 г. ўсе камсамольцы пайшлі ў партызаны і да канца вайны са зброяй у руках грамілі ворага.

Актыўна дзейнічала падпольная камсамольская арганізацыя ў Азяранах. Арганізатарам і кіраўніком яе была Вольга Андрэеўна Гаўрыленка. Створана камсамольская арганізацыя была ў лістападзе 1941 года. Спачатку ў ёй былі чатыры камсамольцы: Вольга Андрэеўна, Ф. І. Аўраменка, П. П. Канавалаў, П. А. Гаўрыленка. А ўжо да верасня 1942 г. налічвалася 16 чалавек. На рахунку камсамольцаў нямала баявых спраў. Яны ўдзельнічалі ў разгроме нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў у Азяранах, Ціхінічах, сарвалі план стварэння гарнізона ў в. Падсёлы. А калі акупанты пачалі ствараць гарнізон у в. Фалевічы, падпольшчыкі для ўступлення ў паліцыю падабралі сваіх 12 маладых хлопцаў на чале з членам камсамольскай арганізацыі В. І. Бондаравым. Немцы забяспечылі іх зброяй, і ўсе яны тут жа перайшлі са зброяй да партызан.

У лістападзе 1943 г. амаль усе падпольшчыкі разам з В. А. Гаўрыленка сталі партызанамі. Аднак дзейнасць арганізацыі не спынілася. Яе ўзначаліла Валянціна Аляксандраўна Янава. У студзені 1944 г. яна была схоплена немцамі і расстраляна.

У в. Філіпкавічы падпольная камсамольская арганізацыя была створана ў маі 1942 г. Яе арганізатарам і кіраўніком стаў Рыгор Прохаравіч Лукашэвіч. З першых дзён фашысцкай акупацыі ён пачаў аб'ядноўваць вакол сябе патрыятычна настроеную моладзь. Разам збіралі і хавалі зброю, якой нямала засталося пасля баёў у 1941 г. Пазней Рыгор наладзіў сувязь з членамі падпольнага райкома партыі, па іх заданні камсамольцы выконвалі розныя разведвальныя даручэнні. У маі 1942 г. група Лукашэвіча афіцыйна была аб'яднана ў падпольную камсамольскую арганізацыю. У яе ўвайшло 12 хлопцаў і дзяўчат. Ад райкома партыі Лукашэвіч атрымаў заданне пастаянна сачыць за дзейнасцю паліцэйскіх гарнізонаў у вёсках Жылічы і Дварэц і рэгулярна перадаваць інфармацыю сувязному падпольнага райкома партыі. Л. Г. Бычкову, Л. С. Шчэрбіч, В. М. Чарняўскай, Е. Ф. Ціхановіч было даручана наведвацца ў Бабруйск, каб ведаць абстаноўку ў гэтым горадзе. Ад іх райком партыі атрымаў нямала карысных звестак. М. М. Сапега, якому было даручана работа з ваеннапалоннымі, здолеў пераправіць групу ваеннапалонных у партызанскі атрад.

У Філіпкавічах былі дзве явачныя кватэры — у Е. Ф. Ціхановіча і В. М. Чарняўскай. Займаліся камсамольцы і дыверсійнай дзейнасцю. Так, В. І. Бокачу, В. Ф. Шаціла, Ф. М. Рудзянкову і В. І. Юшкевічу было даручана знішчыць мост цераз раку Добасна. Ахоўваў мост узвод былых ваеннапалонных (не вытрымаўшы здзекаў у канцлагеры, яны згадзіліся пайсці служыць немцам). Камсамольцы знайшлі агульную мову з вартаўнікамі, і тыя самі ўзарвалі мост і са зброяй перайшлі да партызан. Камсамольская арганізацыя вёскі перадала партызанам 31 вінтоўку, 2 пісталеты, шмат патронаў, гранат, падрыхтавала і накіравала ў партызаны 25 чалавек моладзі.

У сваёй дзейнасці арганізацыя панесла і страты. Выконваючы заданне ў ліпені 1943 г., загінулі Ф. М. Рудзянкоў, В. І. Юшкевіч. У сакавіку 1944 г. быў схоплены немцамі і Р. П. Лукашэвіч. Аднак камсамольская арганізацыя в. Філіпкавічы працягвала дзейнічаць.

У снежні 1942 г. ўтварылася падпольная арганізацыя камсамольцаў і моладзі ў в. Забалацце. Арганізатарам падполля стала Вольга Канстанцінаўна Парфёнава. У актыўную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі яна ўключылася ў чэрвені 1941 г. Была ў складзе знішчальнага батальёна, некалькі разоў па заданні камандавання вайсковай часці хадзіла ў разведку праз лінію фронту, які ў жніўні 1941 г. знаходзіўся на Дняпры, вывела з акружэння некалькі груп чырвонаармейцаў. Потым была пакінута ў Забалацці сувязной райкома партыі і камандавання партызанскага атрада.

На рахунку камсамольскай арганізацыі, у якой было 9 чалавек, нямала спраў. Члены гэтай арганізацыі Н. С. Бялян і Л. Л. Байдакова рэгулярна вялі ўлік руху паяздоў на ўчастку чыгункі Бабруйск — Жлобін, іх звесткі два разы ў тыдзень перадаваліся ў падпольны райком партыі, а затым у разведгрупу Заходняга фронту «Арол».

Лідзія Байдакова, Ганна і Таццяна Дорычавы, Надзея Бялян, Марыя Фінкова, Дзмітрый Дубкоў, Юлія Мельнікава былі праваднікамі партызанскіх дыверсійных груп да тых участкаў чыгуначнай дарогі Бабруйск — Жлобін, што не ахоўваліся акупантамі. Дзмітрый Дубкоў разам з партызанамі ўдзельнічаў у знішчэнні Бадруцкага льнозавода і Лукскага паліцэйскага ўчастка. У камсамольскай арганізацыі быў свой радыёпрыёмнік. Патрыёты прымалі зводкі Саўінфармбюро, размнажалі і распаўсюджвалі іх не толькі сярод насельніцтва Забалацця, але і навакольных вёсак.

Марыя Фяськова ў снежні 1942 г. па-

дабрала параненага афіцэра — разведчыка Чырвонай Арміі Івана Фёдаравіча Залатарэйку. Рызыкуючы сваім жыццём і жыццём родзічаў, хавала і лячыла яго. І. Ф. Залатарэнка зноў вярнуўся ў строй. Марыя Фяськова здабыла і перадала ў штаб партызанскай брыгады план-карту Жлобіна з нанесенымі на ёй умацаваннямі і агнявымі пунктамі акупантаў. Карта добра паслужыла і партызанам, і нашай авіяцыі, якая бамбіла Жлобінскі чыгуначны вузел.

Члены арганізацыі І. А. Максімаў, А. М. Дорасеў, М. С. Бялян здабылі і перадалі партызанам 6 кулямётаў, 50 вінтовак, гранаты, патроны, узрыўчатку. Камсамольская арганізацыя падрыхтавала і накіравала ў партызанскі атрад 12 маладых хлопцаў.

У Станькаўскай падпольнай камсамольскай арганізацыі асаблівую мужнасць і адвагу праявіў камсамолец І. М. Кузькоў. Пры выкананні аднаго з заданняў ён быў схоплены фашыстамі і пасля катаванняў расстраляны. Мужны патрыёт не выдаў сваіх таварышаў. Камсамольская арганізацыя пад кіраўніцтвам Ульяны Яфрэмаўны Крапіцкай і яе сястры Фаіны працягвала дзейнічаць. Члены падпольнай арганізацыі А. С. Парахневіч, Ф. Р. Каморнікаў, М. А. Хуркоў у 1942 г. двойчы ўарывалі рэйкі на чыгунцы. Вялікую дапамогу камсамольскай арганізацыі ў правядзенні дыверсій на чыгунцы аказваў камуніст Я. Л. Міхееў — сувязны падпольнага райкома партыі.

Па заданні райкома партыі камсамолец М. А. Хуркоў пайшоў на работу ў Старасельскі участак паліцыі, а А. С. Парахневіч уладкаваўся ўчастковым аграномам у раённай зямельнай управе. Яны праз сувязнога І. М. Тараканава перадавалі розныя каштоўныя звесткі разведчыцы Аляксандры Майсееўне Субоцінай.

У снежні 1943 г. акупанты натрапілі на след камсамольцаў. Аднак яны былі своечасова папярэджаны і ўліліся ў партызанскі атрад.

У в. Турск падпольныя камсамольскія групы ўзначальвалі Аляксандр Андрэевіч Ганчароў, Людміла Аляксееўна Кудраўцава. У сакавіку 1943 г. члены камсамольскіх арганізацый уступілі ў рады партызан. Яны былі аб'яднаны ў дыверсійна-падрыўны ўзвод. Камандаваў ім былы член камсамольскай арганізацыі А. Д. Бекарэвіч. А. Ганчароў быў выбраны сакратаром камсамольскай арганізацыі. Партызаны ўзводу ўзарвалі 8 мастоў, знішчылі 12 аўтамашын з ваеннымі грузамі, 4400 метраў тэлеграфна-тэлефоннай сувязі, замініравалі 1600 метраў дарогі.

Шмат баявых спраў на рахунку падпольных камсамольскіх арганізацый пас. Дняпроўск Кісцянёўскага сельсавета і в. Красніца. Сакратарамі іх былі Ганна Аляксандраўна Фядосава і Кацярына Іванаўна Шукевіч. Яны асабіста перадавалі звесткі падпольшчыкаў з чыгункі Жлобін — Гомель у партызанскі атрад. І кожны раз трэба было пераадолець 25 небяспечных кіламетраў. Сувязным быў і бацька Ганны Фядосавай Аляксандр Васілевіч.

Каля Дняпроўска знаходзілася пастаянная партызанская пераправа, дзе працавалі камсамольцы А. П. Хімчанка, В. А. Рублеўскі, В. Ф. Лаўрэнаў. Яны адказвалі за стан лодак, якія хавалі ў затоках Дняпра. Камсамольцы Т. Ф. Чурвіна, А. С. Зайцава, А. Е. Фядосава вялі разведку, каб у час пераправы партызан цераз Днепр гітлераўцы раптоўна не напалі, не зрабілі засаду.

У в. Красніца актыўна дзейнічалі патрыёты А. І. Шукевіч, А. Я. Хахлянцаў, А. К. Шукевіч, Я. І. Язэпаў. Яўген Іванавіч Язэпаў у кастрычніку 1942 г. пайшоў у партызанскі атрад і камандаваў дыверсійнай групай. 26 чэрвеня 1943 г. група вярталася з задання і трапіла ў засаду. Камандзір застаўся прыкрываць таварышаў. Ён змагаўся да апошняга патрона. Фашысты хацелі ўзяць Язэпава жывым. Але ў апошні момант ён паспеў вырваць чаку з гранаты, узарваў сябе і акружыўшых яго гітлераўцаў.

Актыўны ўдзел у барацьбе з ворагам прымала таксама моладзь в. Масткі на чале з М. С. Філіпавым, С. М. Роднікавым і М. С. Прахарэнкам. Члены гэтай арганізацыі П. С. Назараў і В. І. Падольцаў па ўказанні райкома партыі пайшлі працаваць у нямецка-паліцэйскі гарнізон у в. Гадзілавічы. Праз сувязнога А. С. Назарава яны паведамлялі аб усіх планах, якія намячаў гарнізон па барацьбе з партызанамі. Партызаны своечасова прымалі адпаведныя контрмеры.

Патрыётаў з в. Церахоўка ўзначальвала Ульяна Фёдараўна Мазепіна. Нямала каштоўных звестак атрымала праз гэту арганізацыю армейская разведгрупа «Арол». Камсамольцы праводзілі таксама і дыверсіі на чыгунцы. Тры варожыя эшалоны былі пушчаны пад адхон камсамольцам М. С. Казлоўскім. У правядзенні дыверсій на чыгунцы ўдзельнічалі І. Я. Калбасаў, В. С. Казак, С. Ф. Мазепін, Л. М. Чапцоў. У в. Слабада патрыёты-падпольшчыкі змагаліся пад кіраўніцтвам Аляксандры Андрэеўны Канавалавай. М. С. Жданаў, М. Я. Бондараў, М. П. Бондарава, М. С. Зазерская, П. П. Бонда-

рава перыядычна наведваліся ў Рагачоў весці разведку і ва ўмоўнае месца перадавалі звесткі. Пры выкананні задання ў верасні 1942 г. быў схоплены гітлераўцамі і загінуў у іх засценках камсамолец Мікалай Бондараў.

Так, шмат маладых жыццяў абарвалася ў няроўнай барацьбе за вызваленне бацькаўшчыны. Патрыёты Рагачоўшчыны ў гэтай смяртэльнай схватцы з ворагам паказалі сябе сапраўднымі героямі.

З успамінаў М. А. Дзмітрыева, былога сакратара Журавіцкага падпольнага РК ЛКСМБ

Да ўтварэння Журавіцкага падпольнага райкома камсамола па ініцыятыве камсамольцаў раёна ствараліся і актыўна дзейнічалі пярвічныя падпольныя камсамольскія арганізацыі, якія ўвайшлі затым у падпарадкаванне Журавіцкага райкома камсамола.

Праз два тыдні пасля акупацыі Серабранкі, 1 верасня 1941 г. ў вёсцы была створана падпольная камсамольская арганізацыя. У яе ўвайшлі ў асноўным маладыя настаўнікі і вучні-старшакласнікі. Арганізатарам і сакратаром арганізацыі быў Міхаіл Апанасавіч Дзмітрыеў. Пасля яго ўходу ў партызанскі атрад арганізацыю ўзначаліла Ніна Ігнатаўна Левянкова, а з чэрвеня 1943 г.— Марыя Цітаўна Патапенка.

Членамі камсамольскай арганізацыі былі М. М. Прохараў, Н. І. Кудасава, К. В. Савельева, В. М. Кандраценка, М. М. Лукашоў, Б. М. Прохарава, В. П. Антонаў, В. А. Дзмітрыеў, М. М. Камароў, В. Я. Пацееў, Я. Я. Якубаў.

Серабранская камсамольская арганізацыя неўзабаве ўстанавіла сувязь са Свержанскай падпольнай партыйнай арганізацыяй праз яе сакратара Т. Ф. Карніенка, а праз яе — з сакратаром Рагачоўскага падпольнага РК ЛКСМБ, упаўнаважанага ЦК ЛКСМБ А. А. Біруковым.

Юнакі і дзяўчаты збіралі зброю і боепрыпасы, перадавалі іх партызанам. Па заданню хадзілі ў разведку ў Бабруйск, Рагачоў, Прапойск, Карму, Журавічы, Чачэрск, у многія вёскі і прыносілі шмат каштоўных звестак. Падпольшчыкі псавалі тэлефонную сувязь, распаўсюджвалі лістоўкі і партызанскія газеты сярод насельніцтва, ратавалі моладзь многіх вёсак ад вывазу ў Германію. Двойчы ўдалося выратаваць ад вывазу ў Германію юнакоў і дзяўчат Серабранкі.

У пачатку лютага 1943 г. ў Серабранку прыбыў карны батальён «Днепр». За маскіровачныя белыя халаты жыхары вёскі празвалі карнікаў «белахалатчыкамі». Камандаваў батальёнам П. І. Мельнікаў, родны брат якога М. І. Мельнікаў быў партызанам. Партызанскае камандаванне паставіла перад серабранскімі падпольшчыкамі задачу не дапусціць баёў карнікаў з партызанамі. Падпольшчыца К. В. Савельева прывезла ў Серабранку з в. Зенькавіна маці Мельнікава, якая па нашай задуме павінна была паўплываць на сына. Камандзір батальёна згадзіўся пазбягаць магчымасці сутыкнення з народнымі мсціўцамі і штодзённа паведамляў пра маршрут карнікаў. Гэтыя даныя перадаваліся партызанам. І хоць Мельнікаў не згадзіўся перайсці на бок партызан, яго батальён быў нейтралізаваны.

К. В. Савельевай паспяхова было выканана і другое важнае заданне. Яна даставіла ў партызанскую брыгаду шрыфты, фарбу і іншае абсталяванне з нямецкай друкарні г. п. Карма. Шрыфты спатрэбіліся для газеты «Партызан Гомельшчыны». З дапамогай сваіх памочнікаў, будучых партызан Мікалая Купцова, Міхаіла Мельнікава, Аляксандра Рудэнкі яна надрукавала ў Кармянскай друкарні некалькі соцень партызанскіх лістовак, якія распаўсюджваліся падпольшчыкамі і партызанамі сярод насельніцтва.

У снежні 1942 г. ў доме маці падпольшчыка М. Н. Лукашова была праведзена вельмі тонкая і смелая аперацыя па нейтралізацыі актыўнага і асцярожнага агента гестапа — жанчыны, якая выдала немцам серабранскіх камуністаў. Злоўленая шпіёнка была перапраўлена ў лес да партызан. Немцаў жа здолелі пераканаць, што зрабіла яна гэта добраахвотна.

Падпольшчыкі ўстанавілі нагляд за другім агентам акупантаў — братам злоўленай. Вывучалі яго маршрут. І вось аднойчы партызаны ў форме нямецкага афіцэра і паліцэйскіх сярод белага дня на шашы пасадзілі да сябе ў павозку старасту-здрадніка. Здраднік апамятаўся, калі пачалі пад'язджаць да лесу...

У доме падпольшчыцы М. Ц. Патапенкі пад чужым імем жыла сям'я начальніка штаба 10-й Журавіцкай партызанскай брыгады Ф. К. Антонава. Пасля Марыя Цітаўна ўзначаліла камсамольскую арганізацыю.

Не ўсім серабранскім падпольшчыкам удалося дажыць да светлага дня Перамогі. Пры выкананні баявых заданняў загінулі камсамольцы М. М. Прохараў, І. Ц. Патапенка, І. А. Дварэцкі.

Свержанская падпольная камсамольская арганізацыя была створана па ініцыятыве сакратара Свержанскай падпольнай партыйнай арганізацыі Т. Ф. Карніен-

ка. Спачатку ў яе ўваходзілі камсамольцы Р. Ф. Бачынскі, І. М. Бондараў, Н. М. Бондарава, М. П. Жураўлёў, М. А. Жыткевіч, П. І. Краўчанка, І. І. Кудрыцкі, М. Ф. Карніенка, М. Я. Петрачэнка і М. А. Шаройка. Пазней арганізацыя папоўнілася: у яе ўвайшлі А. С. Несцераў, Ю. І. Новікава, Е. А. Шаройка, М. І. Новікава, Л. Я. Петрачэнка, М. М. Савіцкі, Н. Р. Сіліна, Р. Д. Талкачоў. Для больш аператыўнай работы арганізацыя была падзелена на 3 самастойныя групы. Спачатку сакратаром быў прызначаны М. Я. Петрачэнка, а ў кастрычніку 1941 г. кіраўніцтва камсамольцамі-падпольшчыкамі было даручана лейтэнанту Чырвонай Арміі М. П. Жураўлёву, які пасля ранення і акружэння вайсковай часці апынуўся ў Свержані.

Кожная група атрымала канкрэтнае заданне: збіраць, захоўваць і трымаць у належным стане зброю і боепрыпасы, здабыць радыёпрыёмнік, выяўляць нямецкіх прыхвасняў, наладжваць сяброўскія сувязі з моладдзю навакольных вёсак, рыхтавацца да пераходу ў партызанскі атрад, строга захоўваць канспірацыю, ажыццяўляць дыверсіі на дарогах.

Падпольшчыкам стала вядома, што акупанты размініравалі поле, знялі 150 процітанкавых мін і збіраліся іх перавезці на свае склады. Ноччу патрыёты перанеслі 70 мін і надзейна іх схавалі. Астатнія вырашылі ўзарваць. Піянеры А. М. Бондараў, Конанава і Чубанава зрабілі гэта, але, на жаль, самі загінулі.

З лістапада 1941 г. па снежань 1942 г. І. І. Кудрыцкі, Р. Ф. Бычынскі, П. І. Краўчанка і М. А. Шаройка ўзарвалі на дарогах 9 нямецкіх аўтамашын.

У кастрычніку 1942 г. свержанскія камсамольцы-падпольшчыкі першымі ў Журавіцкім раёне ўстанавілі сувязь з ініцыятыўнай групай І. М. Дзікана, прысланага з-за лініі фронту для разгортвання партызанскага руху. Многія юнакі перайшлі ў партызаны. Камсамольскую арганізацыю ўзначаліла А. А. Шаройка.

Актыўную барацьбу супраць акупантаў вяла Хатаўнянская патрыятычная група, якую ўзначальваў Я. П. Аніскоў. У ёй было дзесяць адважных камсамольцаў: І. М. Панкоў, А. П. Маркаў, Паліна Кулакова, У. А. Астаенка, Л. Д. Філіпчанка, В. А. Астапенка, Д. П. Аніскоў, І. А. Свістуноў і Л. І. Чарняўскі. Усе яны былі вернымі памочнікамі партызан.

Канаўскую камсамольскую патрыятычную групу ўзначаліў С. Ф. Шакараў. У ёй было 15 камсамольцаў: М. В. Гонтараў, С. Д. Цітоў, А. Т. Асюлеў, З. М. Навіцкая, Ц. Ф. Шакараў, Г. Р. Філіпчанка, Я. В. Сяменчыкаў, Л. П. Шакарава, Д. Д. Асюлева, Д. І. Сівакова, Ф. У. Гонтарава, М. С. Гонтарава і Г. А. Гонтарава. Канаўскія камсамольцы знішчылі ў ліпені 1942 г. Хатаўнянскую валасную ўправу, узарвалі масты цераз раку Гутлянка каля вёсак Вець і Сялец, сабралі 7 вінтовак і больш за тысячу патронаў, якія перадалі палітруку 2-й роты 261-га партызанскага атрада імя В. І. Чапаева І. Ф. Сівакову.

У лютым 1942 г. была створана падпольная камсамольская група ў в. Юдзічы ў складзе сакратара С. С. Троцкай і членаў Л. Н. Сергіенка, Н. І. Кавалёвай, М. І. Лукашкова, А. М. Несцярэнка. Па даручэнні партызан і падпольнага райкома камсамола камсамольцы в. Юдзічы сабралі і перадалі партызанам 7 вінтовак, 1 аўтамат, 2 скрыні гранат, 4 скрыні патронаў, вялі разведвальную работу, збіралі аблігацыі, адзенне і давалі прадукты харчавання.

У маі 1943 г. арганізавалася Зімніцкая камсамольская група. Яе ўзначаліла П. Р. Данілава. У яе ўвайшлі М. Р. Данілаў, Д. Ю. Аніскоў, П. П. Чумакова, І. Р. Данілаў, У. І. Сазонаў, М. К. Лазавікоў, М. Ц. Белашоў і С. Ю. Аніскоў.

Патрыёты збіралі зброю, боепрыпасы, наладжвалі сувязь з ваеннапалоннымі з мэтай адпраўкі іх у партызанскі атрад, удалося выпісаць для ваеннапалонных 12 «аўсвайсаў». Члены групы распаўсюджвалі партызанскія газеты і лістоўкі сярод насельніцтва, вялі разведку, хавалі ад немцаў хлеб і жывёлу.

Акрамя таго, сапраўднымі патрыётамі паказала сябе моладзь вёсак Фёдараўка, Асмолавічы, Новы Доўск, Пахар, Дзедлава, Перакоп, Рыскова, Стары Крыўск. Многія імёны і прозвішчы герояў не захаваліся. Аднак усе яны сумленна выканалі свой грамадзянскі абавязак у крытычны для Радзімы час.

Свержанскае падполле

З верасня 1941 г. і да кастрычніка 1942 г. ў в. Свержань Журавіцкага раёна дзейнічала падполле. Яго кіраўніком была Т. Ф. Карніенка. Патрыёты прымалі ўдзел у стварэнні падпольных груп у суседніх вёсках, ратавалі савецкіх людзей ад вываза на катаргу ў Германію, зрывалі пастаўкі хлеба, жывёлы акупантам, вялі разведку. Члены падполля падарвалі 10 аўтамашын ворага, 2 масты, склад з гаручым у Доўску. Падполле падрыхтавала базу для разгортвання партызанскага руху ў Журавіцкім раёне. У кастрычніку 1942 г. ўсе падпольшчыкі ўліліся ў 10-ю Журавіцкую брыгаду.

З успамінаў былога кіраўніка Свержанскага падполля Т. Ф. Карніенка

Т. Ф. Карніенка.

Рашэннем Журавіцкага райкома КП(б)Б мяне пакінулі ў тыле ворага для падпольнай работы разам з іншымі таварышамі, але нікога з пакінутых на акупіраванай тэрыторыі не аказалася. Абстаноўка была вельмі складанай, даводзілася рызыкаваць, не раз глядзець смерці ў твар. Удалося стварыць падпольную арганізацыю ў Свержані, а пад яе кіраўніцтвам у Журавіцкім раёне была створана яшчэ 21 падпольная камсамольская арганізацыя. З 1 верасня 1941 г. да кастрычніка 1942 г. я ўзначальвала патрыётаў падполля ў Свержанскім і суседніх з ім сельсаветах. Працаваць даводзілася ў вельмі цяжкіх умовах, тым больш, што майму сынку споўніўся толькі год. Небяспека заключалася ў тым, што ў Свержані размяшчалася валасное ўпраўленне і паліцэйскі ўчастак. Камуністы дамовіліся весці работу па месцу жыхарства. Першымі членамі партыйнага падполля сталі старшыня Свержанскага сельсавета А. С. Берднікаў, які жыў у в. Фёдараўка, настаўніца Ф. Ц. Маркава, старшыня калгаса «Інтэрнацыянал» У. Л. Прохараў у в. Серабранка, настаўніца Бася Герчыкава, аграном Н. С. Мядзведзева з Свержані. Да канца 1941 г. арганізацыя папоўнілася новымі членамі, сталі дапамагаць у нашай рабоце А. І. Шукевіч з в. Красніца, І. А. Міхуноў, П. І. Жураўлёў з в. Свержань. На першым плане востра стаяла пытанне аб рабоце сярод моладзі. Яшчэ ў верасні 1941 г. М. А. Дзмітрыевым была створана камсамольская арганізацыя ў в. Серабранка, а таксама ў Свержані на чале з М. Петрачэнкам (пазней яе ўзначаліў М. П. Жураўлёў). На працягу 1942 г. камсамольскае падполле было створана ў вёсках Слабада, Дзедлава, Доўск і інш. Для нас стала вялікай падзеяй, калі ў кастрычніку 1941 г. ў Свержань прыйшоў першы сакратар Рагачоўскага падпольнага РК ЛКСМБ А. А. Бірукоў, які з'яўляўся і членам падпольнага райкома партыі. Так была ўстаноўлена сувязь з Рагачоўскім падпольным райкомам партыі.

Тлумачальная работа сярод насельніцтва тармазілася з-за адсутнасці сувязі з Вялікай зямлёй. Даводзілася самім складаць лістоўкі, размнажаць іх ад рукі. Трэба было неадкладна, чаго б гэта ні каштавала, раздабыць прыёмнік і арганізаваць прыём інфармацыі з Масквы. У в. Гадзілавічы мне ўдалося звязацца з радыёаматарам Іванам Макарчыкавым, які дастаў для нас радыёпрыёмнік, але без лямпы і сілкавання. Падпольшчыца з Красніцкай патрыятычнай групы настаўніца П. А. Шантурава спецыяльна ездзіла ў Бабруйск і, рызыкуючы жыццём, дастала там сілкаванне і радыёлямпы. З канца снежня 1941 г. мы пачалі прымаць зводкі і іншыя матэрыялы па радыё. Свержанскія падпольшчыкі змаглі ўладкаваць сваіх людзей у валасное ўпраўленне і паліцыю, а таксама ў Журавіцкую раённую паліцыю. Гэта дало магчымасць выратаваць ад арышту і расстрэлу некалькі дзесяткаў людзей, зрываць вываз насельніцтва ў Германію, нарыхтоўкі хлеба для германскай арміі. Актыўны ўдзел падпольшчыкі Свержанскай арганізацыі прынялі ў зборы баявой зброі і боепрыпасаў. Усяго падпольшчыкі сабралі 7 кулямётаў, 4 мінамёты, больш за 260 вінтовак і 10 тысяч патронаў, 600 гранат, 25 пісталетаў, больш за 250 кілаграмаў толу. Асабліва шмат зброі сабраў ляснік В. К. Афанасенка — станкавы кулямёт, 3 ручныя кулямёты, 5 вінтовак СВТ, 17 вінтовак-трохлінеек, 3 пісталеты.

У пачатку 1942 г. падпольшчыкі пачалі баявыя дзеянні. Ужо ў першай палавіне 1942 г. падпольная арганізацыя мела сваіх людзей у кожнай вёсцы. У чэрвені 1942 г. свержанскія падпольшчыкі сабраліся на першы свой нелегальны сход. Абмяняўшыся думкамі, прыйшлі да высновы, што база для партызанскай барацьбы ўжо створана, трэба арганізоўвацца ў атрад і восенню ісці ў лес. Частку патрыётаў меркавалася пакінуць у падполлі. Аднак падзеі пачалі развівацца хутчэй, чым мы думалі. У пачатку 1942 г. наша актыўная падпольшчыца Н. С. Мядзведзева паведаміла, што мяне чакаюць у лесе каля пасёлка Хвошч людзі, якія прыйшлі з-за лініі фронту. Сустрэча адбылася. Група ў колькасці 16 чалавек пад кіраўніцтвам І. М. Дзікана і С. М. Белых была накіравана ў Журавіцкі раён для арганізацыі партызанскага руху. Арганізатарская

група прайшла праз тэрыторыю Рагачоўскага раёна, дзе сустрэлася з С. М. Свярдловым. Сакратар Рагачоўскага падпольнага райкома партыі С. М. Свярдлоў рэкамендаваў членам групы сустрэцца з нашай падпольнай арганізацыяй, каб атрымаць усялякую падтрымку. Дапамога сапраўды была аказана вялікая — к таму часу, калі група з'явілася ў нашым раёне, падпольшчыкі залажылі аснову для хуткага і шырокага разгортвання партызанскага руху ў Журавіцкім раёне. У першай палавіне кастрычніка 1942 г. ў Свержанскім лесе быў створаны партызанскі атрад, яго ядро склалі арганізатарская група і значная частка патрыётаў Свержанскага падполля. У канцы лютага 1943 г. атраду прысвоены нумар 256-ы.

Далей заставацца ў вёсцы было ўсё больш небяспечна, навісла рэальная пагроза майго арышту. Па рашэнні камандавання атрада 27 кастрычніка 1942 г. я пайшла ў атрад, з 1943 г. стала камісарам атрада па камсамоле.

З ГІСТОРЫІ ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА № 256 ІМЯ І. В. СТАЛІНА 10-й ЖУРАВІЦКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

...15 ноября 1942 г. разгромлен хлебный склад в дер. Осиновка, взято [для партизан] 200 пуд. зерна, роздано крестьянам 500 пуд...

2 декабря 1942 г [на] шоссе Довск — Гомель разбито 2 автомашины, 1 легковая и мотоцикл, убито 5 немцев.

6 декабря 1942 г. разгромлен заготпункт в дер. Красница, взято 300 яиц, 24 кг соли, 120 кг фасоли, 500 кг пшеницы...

6 декабря 1942 г. на шоссе Довск — Гадиловичи разгромлен немецкий обоз, захвачено 400 кг соли.

10 декабря 1942 г. разгромлен Задубский гарнизон полиции, взято 12 полицейских, 12 винтовок...

19 декабря 1942 г. разгромлен ржевский гарнизон полиции (30 чел), захвачено: 1 пулемет, 12 винтовок, 4 пистолета. В дер. Васьковичи пойманы 1 офицер и переводчик, взято 2 велосипеда...

5 января 1943 г. в Новых Журавичах сожжён сенной склад в 880 т., спалены прессовальная машина и трактор.

7 января 1943 г., бой в дер. Еленово с «казаками», убито 3 «казака»...

12 января 1943 г., в дер. Пахарь бой с немцами и полицией, убито 5 немцев, в том числе 2 офицера, ...3 полицейских...

11 февраля 1943 г., разгром охраны на шоссе Довск — Новые Журавичи, убито 5 немцев, 4 полицейских, захвачено: 2 пулемета, 10 винтовок, 3 тыс. патронов и 20 гранат...

14 февраля 1943 г., бой в дер. Свержень с отрядом «Днепр», убито 48 чел., в том числе 29 немцев, ранено 80 чел., захвачено: 1 пушка, 7 пулеметов, 36 винтовок, патроны и другие трофеи.

22 февраля 1943 г. в Новом Довске распущен лагерь военнопленных. 51 [военнопленный] и 5 полицейских приведены в отряд, взяты 1 пулемет, 8 винтовок.

В дер. Старый Довск разгромлен немецкий гарнизон, убито 8 немцев, взято 3 пулемета, 26 винтовок, выпущено 48 пленных, которые приведены в отряд...

4 апреля 1943 г. в гор. Рогачеве сожжен льнозавод...

21 апреля 1943 г., разгром немецких и полицейских гарнизонов Довск, Журавичи, Гадиловичи, Крывск, Рекотино, Меркуловичи. Убито 28 немцев, 13 изменников, 17 полицейских, взорвано и сожжено 6 мостов...

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1973. Т. 2, кн. 1. С. 453—455.

РАПАРТ ПАМОЧНІКА НАЧАЛЬНІКА ШТАБА 108-га ПАРТЫЗАНСКАГА АТРАДА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ С. М. РОХЛІНА КАМАНДЗІРУ 10-й ЖУРАВІЦКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ І. М. ГАЎРЫЛАВУ АБ ДЫВЕРСІЙНАЙ РАБОЦЕ АТРАДА

29 чэрвеня 1943 г.

7 мая 1943 г. [на] ж. д. Гомель — Жлобин, между стн. Салтановка и разъездом Шарыбовка № 23, в 23.00 спущен под откос воинский эшелон с живой силой и продовольствием. Разбиты паровоз, 2 платформы с балластом и 6 вагонов с живой силой.

13 мая 1943 г. [на] ж. д. Гомель — Жлобин, между ст. Салтановка и разъездом Шарыбовка № 23, в 2.15 спущен воинский эшелон с техникой. Разбиты 4 платформы, 4 танка, паровоз и 2 вагона с немцами. Железная дорога не работала 24 часа...

27 мая 1943 г. на этой же дороге, между стн. Салтановка и блок-постом Старая Рудня, в 10.30 спущен воинский эшелон с живой силой, техникой и продовольствием. Разбиты паровоз и 5 вагонов. Сменили 6 рельсов и 50 шпал.

27 мая 1943 г. на этой же [железной] дороге, между стн. Салтановка и [разъездом] Шарыбовка № 23, в 11.10 спущен эшелон с продовольствием. Разбиты паровоз, 3 вагона и 2 платформы. Сменили 4 рельса и 17 шпал.

13 июня 1943 г. на этой же железной дороге в 23.00 спущен воинский эшелон с живой силой. Разбиты 2 платформы, паровоз и 4 вагона [сброшены под откос]. Сменили 15 шпал и 67 рельсов.

15 июня 1943 г. на этой же железной дороге в 22.30 спущен воинский эшелон с живой силой и танками. Разбиты 2 платформы, паровоз, 8 вагонов с немцами и платформа с танками [сброшены под откос]. Железная дорога не работала 23 час.

17 июня 1943 г. на этой же железной дороге, [между] стн. Буда-Кошелево и блок-постом № 23 Шарыбовка, в 24.00 спущен воинский эшелон с живой силой и техникой. Разбиты паровоз и 4 платформы с танками. Есть потери живой силы. Сменили 6 рельсов и 42 шпалы.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Мн., 1973. Т. 2, кн. 1. С. 491—493.

Бой пад Каменкай

У маі 1943 г. разведвальна-дыверсійны атрад «Слаўны», які дыслацыраваўся ў Бранскіх лясах, па загаду Цэнтра здзейсніў пераход у Гомельскую вобласць. Па намечаным маршруце наперадзе атрада рухаліся групы на чале з К. А. Мадэем і В. Я. Раманько. Размясціўшыся ў лесе каля в. Рыскаў, дзе базіраваліся мясцовыя партызаны, авангард атрада правёў шэраг паспяховых засад на шашы Гомель — Магілёў. З «мэтай знішчэння зноў узнікшага на захад ад шашэйных дарог банды цэнтра» камандаванне 221-й ахоўнай дывізіі вермахта распрацавала план карнай аперацыі пад кодавай назвай «Чэрвеньскі жук». Пачатак аперацыі планаваўся на 5 чэрвеня 1943 г. Да ўдзелу ў аперацыі былі прыцягнуты падраздзяленні 203-й ахоўнай дывізіі.

У ноч з 3 на 4 чэрвеня атрад «Слаўны» перайшоў шашу Гомель — Магілёў. Камандзір атрада А. П. Шастакоў, накіраваўшы абоз да авангарда атрада, з 70 партызанамі арганізаваў засаду на шашы каля вёскі Новы Крыўск. У дзесяць гадзін раніцы да вёскі пад'ехалі 6 аўтамашын з гітлераўцамі і спыніліся якраз насупраць засады партызан. Ружэйна-кулямётным агнём, гранатамі партызаны знішчылі, як пазней высветлілася, авіядэсантную роту праціўніка, што накіроўвалася да месца правядзення аперацыі «Чэрвеньскі жук». Былі захоплены дзве гарматы і столькі ж мінамётаў, тры кулямёты, два аўтаматы, дваццаць пяць вінтовак, больш за трыста камбінезонаў. Смерцю храбрых загінуў баец А. М. Далгушын, быў смяртэльна паранены М. А. Сафійка.

У гэты ж дзень у лесе байцы злучыліся з групамі Мадэя і Раманько. У другой палавіне дня, калі ў в. Каменка хавалі А. М. Далгушына, над вёскай і навакольным лесам некалькі разоў праляцеў нямецкі разведвальны самалёт. Мясцовыя партызаны пакінулі сваю стаянку і пераілі камандзіру «Слаўнага» тэрмінова перадыслацыравацца ў іншае месца. Аднак байцы былі знясілены дарогай, некалькі разведвальных і дыверсійных груп атрада знаходзіліся на заданнях. Вырашылі застацца на месцы. Па загаду камандзіра байцы перааапрануліся ў трафейныя камбінезоны.

Ноччу дазорныя данеслі, што ў навакольных вёсках з'явіліся часці гітлераўскай арміі. Атрад быў падняты па трывозе і падрыхтаваўся да абароны. На золку два самалёты-разведчыкі абстралялі пазіцыі атрадаў і скінулі некалькі бомб. Затым з боку Каменкі адкрыла інтэнсіўны агонь артылерыя праціўніка. Пасля гэтага з-пад вёсак Курганне, Дзедлаў у атаку супраць «Слаўнага» пайшлі пяхотныя і дэсантныя падраздзяленні ў суправаджэнні трох самаходных гармат.

Стойка трымаліся байцы ўзвода Васіля Раманько. Мінамётчык Апанас Агафонавіч Сібелеў і кулямётчыкі ўзвода адбілі некалькі атак праціўніка. Дзям'ян Каранькоў разам з Паўлам Мартынавым і Паўлам Менкелем з трафейнай гарматы

прамой наводкай знішчылі дзве самаходкі. Аляксей Сафонаўскі і Пётр Барысаў, захапіўшы ротны мінамёт праціўніка, адкрылі меткі агонь па пяхоце праціўніка. Удача спадарожнічала і Міхаілу Зуеву, пад яго кулямётны агонь трапіў камандзір паўночнай групы карнікаў маёр Аман. Зуеву ўдалося захапіць у яго штабныя дакументы і сярод іх план аперацыі «Чэрвеньскі жук». З плана камандаванню атрада стала вядома, што асноўныя сілы — падраздзяленні 45-га і 604-га ахоўных палкоў — гітлераўскае камандаванне сканцэнтравала на паўднёвым участку на лініі Каменка — Новая Слабада. Акрамя таго, перад 45-м ахоўным палком была пастаўлена задача знішчыць «цэнтр банды ў лясах вакол Рыскава і забяспечыць спакой у гэтым раёне».

Маючы вялікую перавагу ў сіле і тэхніцы, гітлераўцы былі настолькі ўпэўнены ў сваёй перамозе, што ніякіх абарончых збудаванняў не ўзводзілі. Меркавалася, што аперацыя будзе праведзена хутка і паспяхова. У трафейных дакументах указвалася: «...Пасля заканчэння аперацыі баявая група Амана 5.6.1943 накіроўваецца ў Гадзілавічы. Адразу ж неабходна падрыхтаваць і правесці аперацыю «Чэрвеньскі жук-2». Задача: знішчэнне лагера банды ў лясным масіве на захад ад Турца...»

Між тым бой працягваўся. Да 15 гадзін дня кальцо акружэння партызан значна звузілася. Таялі запасы патронаў, становішча станавілася крытычным. 115 патрыётам процістаялі каля дзвюх тысяч добра ўзброеных гітлераўцаў. Улічваючы, што заходняя група ворага была пазбаўлена кіраўніцтва, адкрывалася магчымасць паспрабаваць прабіцца да вялізнага лясnога масіву на захадзе.

Паводле рашэння камандзіра атрада для прыкрыцця «Слаўнага» было пакінута каля сарака байцоў на чале з В. Я. Раманько. Асноўныя ж сілы атрада абрушыліся на правы фланг заходняй групы праціўніка, затым пайшлі ў атаку. Байцы «Слаўнага» былі пераапрануты ў сінюю форму нямецкіх дэсантнікаў. Гэта выклікала разгубленасць у стане ворага. Спачатку, відаць, гітлераўцы прынялі партызан за сваіх. Салдаты групы Амана, сярод якіх былі і ўласаўцы з усходняга кавалерыйскага эскадрона, не вытрымалі націску і кінуліся бегчы. У спешцы праціўнік пакінуў некалькі павозак з харчаваннем і патронамі. Аднак прарыў варожага кальца дастаўся байцам «Слаўнага» дарагой цаной. Смерцю герояў загінулі Іван Дзянісавіч Ляпцееў, Іван Фёдаравіч Лявыкін, Якаў Паўлавіч Піскараў і Кузьма Асятроў. Мясцовыя жыхары пахавалі герояў «Слаўнага» на могілках у в. Перакоп.

Гітлераўцы таксама панеслі страты. І не толькі ад трапнага агню байцоў «Слаўнага». На ўчастку, дзе прарваўся атрад, падраздзяленні з 203-й дывізіі і дэсантнікі з 221-й дывізіі адкрылі адзін па аднаму агонь. Цяжка сказаць, чаму выйшла такое непаразуменне, аднак адносіны паміж сабой высвятлялі не адну гадзіну.

Паражэнне аперацыі «Чэрвеньскі жук» карнікі вымесцілі на мірных жыхарах вёсак Рыскаў, Каменка Рыскаўская і Перакоп. Жудасную расправу ўчынілі яны над жанчынамі, дзецьмі, старымі гэтых вёсак.

Пасля прарыву байцы «Слаўнага» сем дзён манеўравалі ў лясах паблізу рэчкі Ржаўка. Затым ноччу з цяжка параненымі байцамі перайшлі шашу Доўск — Рагачоў, а днём дзвюма групамі фарсіравалі Дняпро ў раёне вёсак Кісцяні і Заездзе і перайшлі чыгунку Магілёў — Жлобін паблізу раз'езда Станькава. У час дыслакацыі на тэрыторыі Рагачоўскага раёна «Слаўны» значна папоўніўся мясцовымі патрыётамі з вёсак Рэкта, Княжынка, Марткоў, з самога райцэнтра. З Талочкава, напрыклад, у атрад улілося адразу дваццаць чалавек. На Рагачоўшчыне «Слаўны» правёў шэраг баявых аперацый. Адна з іх — дзёрзкая вылазка ў Рагачоў у ноч на 24 чэрвеня 1943 года. У групу, якой камандаваў К. А. Мадэй, уваходзілі М. Баштан, А. Бабошын, У. Зіноўеў, А. Ісаеў, Ю. Нячаеў, М. Пульгуеў, М. Садоўнікаў, Б. Сталяроў, М. Шынкароў. Усе яны фізічна вынослівыя, смелыя, добраахвотна адгукнуліся на прапанову бясстрашнага Мадэя. У начной цемнаце група храбрацоў прабралася ў горад і, абышоўшы ўсе пасты, пранікла на хлебазавод. Дыверсанты вывелі са строю абсталяванне завода, прывялі ў непрыгоднасць чатыры вагоны мукі, шэсць тон гатовай прадукцыі. Прыхапіўшы тры пуды солі і некалькі мяшкоў з хлебам і мукой, партызаны пакінулі завод.

Размясціўшыся ў рагачоўскіх лясах, байцы «Слаўнага» значную ўвагу звярталі на правядзенне разведкі. З Бабруйска, Жлобіна, Рагачова разведчыкі атрада рэгулярна здабывалі інфармацыю для разведкіраўніцтва Чырвонай Арміі, а таксама камандуючаму авіяцыяй далёкага дзеяння. Напярэдадні бітвы на Курскай дузе важныя і аб'ектыўныя разведвальныя даныя былі асабліва каштоўныя.

І. С. Барысаў.

Бязлітасны тэрор чынілі акупанты над насельніцтвам Рагачоўшчыны ў ваеннае ліхалецце. Першымі ахвярамі сталі прадстаўнікі Савецкай улады, калгасныя актывісты, патрыёты, якія далі прытулак параненым байцам. З такой жа жорсткасцю распраўляліся акупанты з яўрэямі, якія жылі ў Рагачове, Журавічах і ў іншых населеных пунктах раёна. Ужо 9 верасня 1941 г. выйшаў загад Рагачоўскай управы перасяліць усіх непрацаздольных яўрэяў у агульны дом ТЭЦ. Працаздольных, пачынаючы з дзесяцігадовага ўзросту, было загадана перавесці ў лагер. Людзей сагналі ў сырыя, халодныя падвалы былога ваеннага склада, адтуль перавялі ў будынак ТЭЦ. А 6 лістапада ў процітанкавым рове за кардоннай фабрыкай каля самой Друці фашысты і іх прыслужнікі ўчынілі жудасны акт расправы, забіўшы каля 3 тысяч яўрэяў. У сакавіку 1942 г. гэты страшэнны роў быў размыты веснавой вадой. Акупанты тэрмінова мабілізавалі насельніцтва горада вылоўліваць трупы з ракі. Загінуўшых зноў закопвалі на беразе. Настаўніца Н. С. Баранцова ўспамінала: «...Увесь роў быў загружаны тысячамі трупаў, якія толькі ледзь былі прысыпаны, і вада знесла ўвесь слой зямлі. Сярод трупаў большасць было жанчын, дзяцей і старых. Адкрываліся неверагодныя па сваёй жорсткасці карціны: забітая маці ляжала, абняўшы сваіх дзяцей. Трупы амаль раздзетыя дагала. Працавала на засыпцы трупаў нас шмат, працавалі мы ўвесь дзень...»

У пачатку снежня 1941 г. гітлераўцы пад выглядам работы па размініраванню дарог пагналі з гета 72 чалавекі ў бок вёсак Новы і Стары Крыўск і расстралялі. У хуткім часе, 1 студзеня 1942 г., ва ўрочышчы Старына, каля в. Хатоўня, гітлераўцы расстралялі яшчэ 171 зняволенага з яўрэйскага гета.

Месцам масавых расстрэлаў у Рагачове сталі гарадскія рускія могілкі. Роў з паўднёвага боку могілак людзі назвалі «далінай смерці». Сюды ад будынка гестапа вялі смертнікаў. Каля тысячы жыццяў было загублена ў гэтым страшным месцы, трупы людзей гітлераўцы хавалі ў спецыяльна выкапаных ямах.

Яшчэ ў канцы 1941 г. фашысты стварылі лагеры ваеннапалонных у вёсках Новы і Стары Доўск, Гадзілавічы. У гэтых лагерах знаходзілася па 50—70 ваеннапалонных. Іх выкарыстоўвалі на самых цяжкіх і брудных работах. Вязні жылі ў халодных пунях. Ежа — неачышчаная грэчка, марожаная бручка і капуста. Маленькі кавалачак эрзац-хлеба раз у тыдзень. Працавалі ж палонныя з раніцы да самай цемнаты. Жудасна было глядзець на аброслых, абарваных людзей, якія ледзь цягалі тачкі. Многія падалі. Тут жа раздавалася аўтаматная чарга. Многія паміралі ад холаду на гнілой саломе ў бараках. Раніцай іх вывозілі ў бліжэйшы роў і прысыпалі снегам. Ваеннапалонныя ўчынялі ўцёкі, шукалі сувязі з партызанамі, у лагерах існавалі падпольныя камітэты.

Восенню 1941 г. ў Журавічах фашысты расстралялі 400 ваеннапалонных. 17 студзеня 1942 г. былі знішчаны 176 жыхароў райцэнтра. Той жа восенню 1941 г. ў в. Востраў прыбыў атрад гітлераўцаў. Акружыўшы вёску, яны выгналі ўсіх яе жыхароў на вуліцу. Затым выбралі з натоўпу ўсіх маладых мужчын і адагналі іх у другі канец вёскі, падверглі здзекам. Потым прымусілі выкапаць яму, каля якой расстралялі 46 чалавек.

У хуткім часе вестка пра масавую загубу людзей зноў ускалыхнула людзей. 27 снежня 1941 г. ў лесе каля в. Свержань было расстраляна 260 грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці.

Пачатак 1942 г быў адзначаны трагедыяй у пас. Пахар. 13 студзеня гэты пасёлак быў поўнасцю спалены, а маці партызана Сямёна Гарбачова спалілі жыўцом у хаце за тое, што сын — партызан.

У сакавіку 1943 г. ў некалькіх населеных пунктах Журавіцкага раёна карнікі ўчынілі расправу над мірным насельніцтвам. У Журавічах карнікі расстралялі дачку партызана Фядоса Цімафеевіча Румянцава за тое, што яе бацька і маці былі ў партызанскім атрадзе. У той жа дзень расстралялі і Алену Мазураву, таму што была замужам за яўрэем. 8 сакавіка 1943 г. гітлераўскі кат-перакладчык Шварц учыніў публічны расстрэл у в. Свержань сям'і Арсена Вікенцьевіча Жыткевіча. Іх грудное дзіця Шварц стукнуў аб сценку будынка. У в. Шапчыцы паліцэйскія з карнага атрада забілі 27 чалавек, у тым ліку Ганну Коўтунаву, Фёдара Давыдава, Марфу Котаву і іншых. Сям'ю жыхара гэтай вёскі Рыгора Лукіча Драздова з пяці чалавек карнікі знішчылі поўнасцю. Спачатку забілі на руках у маці грудное дзіця, затым расстралялі маці і пасля гэтага астатніх членаў сям'і. У в. Званец такі ж трагічны лёс напаткаў сям'ю Ягора Шчарбакова з пяці чалавек. Усіх членаў сям'і, у тым ліку малалетніх дзяцей, расстралялі. Потым, падпаліўшы хату, пакідалі забітых у агонь.

Шматпакутная в. Рыскоў двойчы была

падвергнута знішчэнню. У першы раз, летам 1942 г., была спалена часткова, роўна праз год фашысты спалілі ўсю вёску і расстралялі 33 яе жыхароў. Карнікі рыхтаваліся ўчыніць крывавую расправу над усімі жыхарамі вёскі. Для гэтага дзяцей, старых, жанчын сагналі на могілкі і нявялі кулямёты. Аднак у самы апошні момант загад быў адменены. Працаздольнае насельніцтва было сагнана ў канцлагеры Магілёўскай вобласці.

Такі ж цяжкі лёс напаткаў і партызанскую в. Каменка Рыскоўская. За сувязь насельніцтва з партызанамі 14 студзеня 1943 г. было расстраляна 7 чалавек. Гэта быў толькі пачатак выпрабаванняў, якія выпалі на долю жыхароў вёскі. На працягу 1943 г. Каменку Рыскоўскую чатыры разы бамбілі з самалётаў. Самым моцным і жорсткім быў абстрэл 5 чэрвеня 1943 г., затым карнікі ўварваліся ў вёску. Пачалася зверская расправа. А. М. Шаўцоў 83 гадоў быў спалены ва ўласнай хаце. 77-гадовага Т. Я. Тужыкава забілі з аўтамата. Пяцёра старых, кожнаму з якіх было каля 80 гадоў, і саракагадовага мужчыну карнікі за ваколіцай вёскі паклалі тварам уніз і застрэлілі разрыўнымі кулямі. У бліндажы на агародзе ў М. Д. Марчанкі схаваўся 21 чалавек. Аднак вылюдкі знайшлі безабаронных людзей. Бліндаж быў закіданы гранатамі і падпалены. Цудам у жывых застаўся толькі сам гаспадар. У гэты жудасны дзень было забіта і спалена жывымі 153 чалавекі, з іх поўнасцю знішчаны 18 сем'яў, спалены 81 двор і 26 вялікіх грамадскіх будынкаў. 18 чэрвеня налёт варожых самалётаў завяршыў знішчэнне ўсіх 105 дамоў і гаспадарчых будынкаў, якія былі да вайны.

5 і 18 чэрвеня цалкам спалены суседнія пас. Перакоп і расстраляна 12 яго жыхароў.

Ахвярамі карнай экспедыцыі гітлераўцаў сталі таксама жыхары в. Каменка Стралкоўская. 12 чэрвеня ў яркі сонечны дзень былі забіты, закатаваны і спалены жывымі 53 мірныя жыхары, знішчана 60 двароў. Старых, жанчын і дзяцей (каля 25 чалавек) загналі ў той дзень у хату Сяргея Сталярова і падпалілі яе... У доме Гарпіны Кірыенка спалілі 20 жыхароў вёскі. З палаючага агню вырваліся толькі Марыя Міхасёва і Аня Цімашэнка. Затым карнікі яшчэ раз пайшлі па хатах. Хворую Таццяну Зыкаву, 20 гадоў, застрэлілі ў ложку. Жэню Шавялёва, якому быў толькі годзік, вылюдкі вынеслі з хаты, стукнулі галавой аб казлы для пілавання дроў і мёртвага павесілі на іх. Падпаліўшы з усіх бакоў хату Хадоры Цімашэнка, карнікі накіраваліся да наступнай. Калі заўважылі, што гаспадыня выпаўзала з хаты ў сад, вярнуліся і кінулі ў яе гранату... Шасцідзесяцігадовую Ганну Цімашэнка, двух яе ўнукаў 8 і 4 гадоў кінулі жывымі ў калодзеж каля будынка школы. Людзі чулі іх роспачныя крыкі. Гітлераўцы ў гэты час падпальвалі школу.

Восенню 1943 г. зноў хваля расправ пракацілася па Рагачоўшчыне. Зноў гінулі дарослыя і дзеці, лілася людская кроў. 23 верасня 1943 г. карнікі ўварваліся ў пас. Адраджэнне. Эсэсаўцы пачалі дзікую расправу. Засталіся сведкі таго страшнага дня ў гісторыі вёскі. Спачатку карнікі пачалі рабаваць вёску, затым людзей пачалі заганяць у дамы і падпальваць іх. У тых, хто ўцякаў, карнікі стралялі, параненых кідалі ў агонь. Так, у С. Ф. Гаршова спалілі жонку і двое дзяцей, у М. Ф. Белавусава забілі маці і бацьку. Ефрасіння Апанасаўна Белавусава выпадкова выратавалася і пайшла да партызан, а яе маці, сястра і трое дзяцей былі знішчаны. Частку жыхароў карнікі пагналі ў бок в. Ходасавічы. За вёскай карнікі схапілі падлеткаў, якія пасвілі коней, далі ім лапаты і прымусілі капаць магілы. Маладых хлопцаў тут жа расстралялі, астатніх прывялі ў Ходасавічы і адпусцілі. Сярод іх была і К. А. Белавусава. На трэці дзень яна рызыкнула пайсці ў спаленую родную вёску. Жанчына ўбачыла страшэнную карціну — у спаленых дамах ляжалі абгарэлыя трупы. Сям'я Паўла Нікіціна, жонка і двое дачок, згарэлі абняўшыся. У адной хаце старыя так і згарэлі, стоячы на каленях перад абразамі.

У дзень расправы карнікі адначасова наляцелі на суседні пас. Відалін. Яны запрэглі ў бароны старых і жанчын і пагналі па дарозе, каб упэўніцца, што на ёй няма партызанскіх мін. Пазней карнікі зноў прыйшлі ў Відалін і спалілі яго. Жыхары пасёлка да гэтага часу ўцяклі ў лес, каб пазбегнуць лёсу сваіх суседзяў.

13 кастрычніка 1943 г. ўзнялося крывавае зарыва адразу над чатырма вёскамі Рагачоўскага раёна. Гарэлі ў агні жыхары вёсак Валокі, Фалевічы, Морткаў, Талочкаў. Валокі сталі месцам загубы многіх жыхароў з в. Фалевічы. Запаліўшы ўсе дамы і будынкі, гітлераўцы не кранулі толькі дзве хаты. Сюды пачалі заганяць жыхароў в. Валокі і суседняй в. Фалевічы, якіх не паспелі забіць ці спаліць ва ўласных хатах. Дзверы хат карнікі забілі дошкамі, затым разбілі вокны і пачалі кідаць гранаты. Пасля гэтага хаты падпалілі... Людзі, хто застаўся ў жывых, выскаквалі з палаючых акон і траплялі

пад агонь аўтаматаў. Вырвацца з гэтага пекла было немагчыма. Жыхара в. Валокі В. С. Шумілава двойчы кідалі ў палаючы дом. Калі ён выскачыў з агню, яго схапілі і зноў штурхнулі ў хату. Тады ён зноў выпаўз, цудам непрыкметна дасягнуў лесу. Людзі падабралі яго і адвезлі да родзічаў, дзе ў вялікіх пакутах памёр ад апёкаў у 1948 г. Насуперак усяму вырвалася і засталося жыць яшчэ некалькі чалавек. Сярод іх быў і У. Ц. Зайцаў. Ён успамінае: «...Я знаходзіўся ў адным з гэтых дамоў. У доме было 27 мужчын. Мы з братам схаваліся за грубкай, і калі немцы пачалі кідаць у вокны гранаты, брат нагой адкінуў гранату. Брата ўзрывам параніла ў галаву, а мяне толькі аглушыла. Праз філянговыя дзверы, разбіўшы іх, выпаўзлі ў суседнюю палавіну дома, а затым праз акно на кухні вылезлі ў двор. Выратавалася з гэтага дома 6—8 чалавек, а астатніх, хто імкнуўся выпаўзці, фашыст забіваў з аўтамата. Дом спалілі, і ўсе параненыя згарэлі. Мне ўдалося дабрацца ў лес, дзе мяне два месяцы лячылі ў партызанскім лагеры». Тым часам зверскія расправы над людзьмі працягваліся. У Валоках двухгадовага Валянціна Купрашова падняслі за ногі ўніз галавой і застрэлілі з нагана. Карнікі знішчылі ўсю сям'ю гэтага хлопчыка: бабулю, маці, цёцю, стрыечную сястру, матчынага брата Вову. У в. Фалевічы гітлераўцы поўнасцю знішчылі ў гэты дзень некалькі сем'яў. Загінула ўся сям'я Фёдара Данцова — муж, жонка і двое дзяцей. У Цімоха Данцова (сам ён быў на фронце з 1941 г.) забілі жонку і двое дзяцей, адна дзяўчынка цудам засталася жывой, але памерла пасля вайны. Сталі ахвярамі таго страшнага дня Апанас Данцоў і яго жонка, іх двое дзяцей (адна дачка была паранена ў вока, але засталася жывой). У Барыса Палевікова забілі жонку, трое дзяцей, цесця і цешчу, толькі ён сам выпадкова выратаваўся. Жывымі кінулі ў агонь Міколу Зязюліна, раскалыхаўшы яго за рукі і ногі. Сведкамі той дзікай расправы над людзьмі быў Іван Зязюлін, якому ў той час споўнілася дзесяць гадоў: «Мы жылі ў Фалевічах. Аднойчы да нас у дом уварваліся фашысты, пачалі страляць і прыкладамі выганяць усіх на вуліцу. Немцы запалілі клець і кінулі туды майго бацьку. Калі бацька ў палаючым адзенні выскачыў з клеці, немцы прыкладамі пачалі яго біць. Бацька ўпаў. Затым падняўся і, хістаючыся, увесь у крыві, пайшоў па двары. Немцы дабілі яго з аўтамата. Я з сястрой і бабуляй схаваўся ў склепе, а маці — у сенцах. Яе таксама забілі. Затым фашысты кінулі ў склеп некалькі гранат. Гранатамі забіла сястру і бабулю, а мяне параніла. Адыходзячы, карнікі накідалі ў склеп саломы і падпалілі яе. Я выскачыў са склепа і пабег...»

Жыхароў в. Морткаў партызаны паспелі папярэдзіць, і многім удалося ўцячы ў лес. Уварваўшыся ў вёску, карнікі расправіліся з 11 жыхарамі.

У лесе ў час карных акцый восенню 1943 г. фашысцкімі вылюдкамі былі расстраляны 70 жыхароў в. Вялікая Крушынаўка, 35 жыхароў пас. Вялікае Ляда, 34 жыхары пас. Дзятлаўшчына, 18 жыхароў пас. Вузенькі. Былі расстраляны ў лесе і 35 жахыроў в. Азяраны.

Ранкам 2 лістапада 1943 г. карны атрад акружыў в. Сялец. Карнікі пачалі сілай зганяць жыхароў вёскі ў адно месца, а тых, хто не мог хутка ісці, расстрэльвалі на месцы. Астатніх людзей загналі і зачынілі ў двух вялікіх дамах. Праз вокны ў дамы пачалі кідаць гранаты, страляць, а затым падпалілі дамы. У в. Сялец было забіта 286 чалавек.

Пацярпелі ад карнікаў і жыхары Рагачова. 28 лістапада 1943 г. ў двух будынках па вуліцы Друцкай было спалена больш за 200 чалавек. Сведкам гэтай расправы быў М. Н. Чосаў:

«27 лістапада ў дзве гадзіны дня я ўбачыў, што фашысты ўзламалі маю пуню і сталі выкідаць адтуль маю маёмасць. Побач з пуняй стаяла падвода з дрывамі. У шэсць гадзін вечара, было ўжо цёмна, да пуні пад'ехала крытая машына. 28 лістапада, яшчэ да світання, я зноў убачыў машыну. З гарышча свайго дома стаў назіраць за пуняй. Гітлераўцы падпалілі пуню, я пачуў страшэнныя крыкі, якія несліся з яе. Гарэла пуня і майго суседа Лаўра Калеснікава. Раптам заўважыў, што з пуні суседа выскачыў у адной бялізне чалавек. Ён бег, спатыкаўся. Услед крычалі гітлераўцы і сталі страляць. Мужчына прабег з паўквартала і ўпаў. Пуня гарэла да вечара. Гітлераўцы забаранілі хадзіць па вуліцы цэлы тыдзень. Калі я зазірнуў у абгарэлую пуню праз тыдзень, то ўбачыў рэшткі маіх рэчаў, а на зямлі пласт попелу і абгарэлых касцей. Пры дотыку яны рассыпаліся...»

Зімой 1943—44 гг. перад адступленнем акупанты пад выглядам эвакуацыі вывезлі тысячы жыхароў раёна ў Азарыцкі лагер смерці. Пераадолелі голад, хваробы, холад і дачакаліся вызвалення нямногія з іх...

...Няма на рагачоўскай зямлі куточкаў, дзе б не пралілася людская кроў у ваеннае ліхалецце. Ахвярамі акупацыйнага рэжыму, карных аперацый стала самая

безабаронная частка насельніцтва — жанчыны, дзеці, старыя. Нечалавечыя мукі прынялі яны. Помніць пра гэта, ушаноўваць месцы апошніх жудасных хвілін іх жыцця — наш чалавечы абавязак.

М. Н. Камароў.

З АКТА РАГАЧОЎСКАЙ РАЁННАЙ КАМІСІІ ПА РАССЛЕДАВАННЮ ЗЛАЧЫНСТВАЎ, ЗДЗЕЙСНЕНЫХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ НА ТЭРЫТОРЫІ РАЁНА Ў 1941—43 гг.

15 снежня 1944 г.

...Первые расстрелы производились немецкими палачами около лесозавода, в подвалах и во дворах быв[шего] центрального склада. Как указывает свидетельница Найденова, там немцы расстреляли быв[шего] председателя заводского комитета лесозавода Прибыльского Максима, работника райисполкома Фруменкова и многих др[угих].

В первую неделю ноября 1941 г. в гор. Рогачеве фашистские варвары совершили самое кровавое и зверское злодеяние: во рву за картонной фабрикой в 70 м от р. Друть немецкие палачи убили около 3 тыс. советских граждан еврейской национальности. Путем этого дикого кровожадного погрома фашистские мерзавцы истребили все полностью оставшееся в Рогачеве еврейское население всех возрастов — от грудных младенцев до глубоких стариков. Перед расстрелом палачи долго издевались над своими жертвами. Мужчин, женщин и детей фашисты держали в сырых холодных подвалах бывшего склада, откуда каждый день гоняли их на самые тяжелые работы. Подгоняемые палками немцев, обреченные убирали камни и кирпичи, возили песок, воду. Женщины и подростки выгребали руками нечистоты из уборных, на которых красовались надписи: «Только для немцев».

Наиздевавшись над беззащитными людьми, в первых числах ноября фашистские людоеды согнали всех евреев в здание бывших складов, раздели людей и партиями вывозили ко рву. Фашисты заставляли свои жертвы ложиться в ров рядами, а затем расстреливали из автоматов и винтовок или просто убивали прикладами.

Маленьких детей гитлеровцы брали за ноги, ударяли головой о мерзлую землю и бросали в ров в общую груду мертвецов.

В марте 1942 г. в этом же рву были замучены и расстреляны 300 советских граждан еврейской и цыганской национальностей, собранных со всех районов. Немного позже массовые расстрелы советских граждан производились немецкими палачами на русском кладбище над Днепром. Это страшное место рогачевцы назвали «долиной смерти». Здесь расстрелы производились ежедневно. На кладбище немцы заранее вырывали яму 3 м в ширину, 6 м в длину и 3 м в глубину, а когда эта яма наполнялась трупами, вырывали новую яму. Таких ям в этой «долине смерти» было 10.

Расправа на кладбище обычно производилась так: фашисты приводили к очередной яме обреченных, ставили их в ряд и расстреливали. Трупы засыпали тонким слоем земли. Затем следовала другая партия и т. д.

«Даліна смерці». Малюнак М. Ліпеня.

К «долине смерти» от здания гестапо вела проторенная сотнями смертников дорожка. Там расстреливали одиночек, группами по 10—20 чел[овек]. Свидетельница Симаненко Нина рассказывает, что в «долине смерти» были расстреляны известные жители Рогачева Карасик, Хохов Михаил, учитель Андреев Григорий и другие, а также директор Городецкой МТС Солдатенко, председатель Заболотского сельсовета Шевелев, председатель колхоза «Революция» Купреев Прокоп, его сын Николай и многие другие...

В районе нет такой деревни или поселка, где бы фашистские оккупанты не чинили зверств над советскими гражданами, а некоторые деревни и их жители подвергались поголовному истреблению или были угнаны в фашистское рабство.

Так, еще в 1942 г. немцы сожгли поселок Пахарь, а 12 июня 1943 г. немцы стерли с лица земли колхоз «Молот» Малострельковскго сельсовета. Очевидцы этой жуткой картины Старовойтов Игнат и Столярова Галина рассказали: «Рано утром 12 июня 1943 г. немецкий карательный отряд ворвался в деревню. Немцы стали выгонять из домов жителей, бить прикладами. 6 чел[овек] сразу же были убиты на улице. В избу Кириленко Исаака немцы согнали 20 чел[овек] жителей, стреляли по несчастным из автоматов, бросали в окна гранаты, потом зажгли. Дом сгорел вместе с людьми. В избу Столярова Сергея немцы загнали 25 чел[овек] и тоже сожгли. Если кто пытался бежать, того расстреливали».

Немцы сожгли и разграбили дер. Селец Станьковского сельсовета, где расстреляли, замучили и сожгли живьем 24 чел[овека] мирных граждан. Случайно спасшийся от смерти Музыченко Тимофей рассказал: «2 ноября 1943 г. немецкий карательный отряд на рассвете окружил деревню. Немцы ворвались в деревню, заходили в дома, прикладами выгоняли жителей на улицу. Кто не успевал уходить или отставал, того расстреливали. Все жители деревни были согнаны в 2 больших дома... Немцы закрыли двери, открыли по окнам стрельбу из автоматов и бросали гранаты, а потом дома зажгли. Несчастные жители, которые выпрыгивали из окон и пытались спастись бегством, расстреливались немцами. После пожара на улицах остались одни дымящиеся головешки и обгорелые трупы жителей».

Неслыханные зверства совершили немецкие оккупанты и в Тихиничском сельсовете. Здесь 13 октября 1943 г. немецкий отряд в 65 чел[овек], вооруженных пулеметами, автоматами и минометами, сопровождаемый танком, ворвался в дер. Толочков. Немцы разошлись по деревне, стали убивать всех, кто попадался на глаза.

В этот же день 100 чел[овек] немцев ворвались в другой населенный пункт Тихинического сельсовета — дер. Мортково. Деревню сожгли, а всех жителей, которые находились дома, расстреляли.

Жителя дер. Старое Село Вихрова Михаила Борисовича немцы посадили в клетку, где находились немецкие овчарки. Вихров просидел с собаками сутки, а затем его вывели к железной дороге и расстреляли.

Степанчикова Ивана Корнеевича, жителя дер. Старый Мазолов, немцы привязали за ноги к саням, запрягли лошадь и волочили до тех пор, пока он не потерял сознание, а потом убили молотком.

13 октября 1943 г. немецкий карательный отряд в количестве 100 чел[овек] окружил дер. Фалевичи Крушиновского сельсовета, сжег деревню и истребил жителей деревни в количестве 235 чел[овек].

В Рогачеве, Гадиловичах и Дворце находились лагеря для военнопленных красноармейцев. Над пленными красноармейцами немецкие палачи жестоко издевались, морили голодом и холодом. Каждый день из лагерей выносили трупы военнопленных красноармейцев.

В длинной цепи преступлений немецко-фашистских захватчиков особое место занимает насильственный угон в Германию советских граждан... Немцы устраивали в деревне и городе форменные облавы на людей. Они врывались в деревни и забирали трудоспособных взрослых и молодежь. В городе хватали людей в домах, учреждениях, на базаре и даже в кинотеатрах, сажали на автомашины, подвозили к железнодорожной станции, грузили в товарные вагоны и увозили в Германию.

Гитлеровские убийцы всячески пытались скрыть следы своих преступлений. В 1942 г. весной, как показывают многочисленные свидетели гор. Рогачева, водой размыло ров, где было больше 3 тыс. трупов. Трупы плыли в р. Друть. Немцы мобилизовали все население вылавливать плывущие трупы баграми и просто руками, заставляли снова зарывать.

В 1943 г. в декабре, перед отступлением из города, немцы перерыли весь ров, чтобы скрыть следы своих злодеяний. Из земли были выкопаны все разложившиеся трупы,

скелеты, кости и сложены в штабеля таким образом: ряд трупов и костей, а на него — ряд бревен. Эти штабеля обливали керосином, смолой и зажигали. Три дня и три ночи далеко был виден пожар. Ко рву немцы никого не подпускали. Произведенными в ноябре и декабре 1944 г. тщательными обследованиями массового истребления советских граждан специальной комиссией были обнаружены площадки во рву и на кладбище, загруженные слоем в 40 см, состоящим из останков обожженных костей, пепла, комков очень перегноенной земли, остатков металлических частей одежды: крючков, пуговиц, пряжек от брюк и т. д.

Несмотря на все ухищрения немецких оккупантов скрыть следы своих кровавых злодеяний, на основании заявлений советских граждан, протоколов допросов и свидетельских показаний комиссия установила, что за период оккупации территория Рогачевского района немецкими захватчиками было расстреляно, повешено, сожжено живьем и замучено 6353 чел[овека] мирных советских граждан... Угнано в немецкое рабство 1478 человек.

На основании заявлений советских граждан, протоколов допросов и свидетельских показаний комиссия установила, что разрушение в гор. Рогачеве, деревень и сел Рогачевского района, поголовное ограбление населения, массовое истребление мирных советских граждан проходило при личном участии и непосредственном руководстве коменданта немецкой полевой комендатуры майора Мерло, его зам. майора Диллера, коменданта городской комендатуры обер-лейтенанта Рудольфа, уполномоченного по сельскому хозяйству капитана Зипкех (крупный немецкий помещик), начальника гестапо обер-лейтенанта Ментропа, районного сельскохозяйственного коменданта Буша (помещик), его зам. майора Рольке Антония (помещик), начальника центрального торгового общества Бушмана (берлинский предприниматель), его зам. Крессе, шефа Штурбана, обер-лейтенанта Мавра. О чем и составлен настоящий акт.

Председатель комиссии Свердлов:
члены комиссии:
9 подписей неразборчивы.
Подписи заверяет
председатель Рогачевского исполкома
райсовета депутатов трудящихся Драчев

Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. 1941—1944. Мн., 1965. С. 256—260.

З успамінаў І. В. Камарова, ураджэнца в. Фалевічы

Перад вайной у нашай сям'і адбылася вялікая і незабыўная падзея — нарэшце было закончана будаўніцтва новай хаты на дзве палавіны. Аднак пажыць у ёй бацьку па сутнасці так і не давялося — у 1939 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію, удзельнічаў у паходзе ў Заходнюю Беларусь, затым — у савецка-фінляндскай вайне. У першыя ж дні вайны бацька таксама пайшоў на фронт. Праўда, трапіўшы ў акружэнне на Заходняй граніцы, вярнуўся дамоў. Памятаю, як упершыню ў вёску нахлынулі чужынцы. На машынах, матацыклах яны самазадаволена, з усмешкамі ехалі па вуліцы. Каля калгаснай брамы, на якой былі замацаваны партрэты Леніна і Сталіна, яны спыніліся. Пачалі нешта крычаць і адкрылі па партрэтах шалёную стральніну. Потым пайшлі па хатах рабаваць людское дабро. У нашым доме перарылі куфар з адзеннем і забралі самыя каштоўныя рэчы, на двары злавілі некалькі курэй, схапілі парася. На піск парасяці з хлеўчука выскачыла вялізная рабая свіння і накінулася на рабаўнікоў. Тыя ледзь выскачылі з двара, але свінню не застрэлілі.

Крыху пазней, недзе ў пачатку 1942 г., вёску пачалі наведваць партызаны. Не ведаю чаму, але больш за ўсё я баяўся партызан. Можа, што прыходзілі яны ўначы і моцна стукалі ў дзверы. Я куды-небудзь хаваўся, а маці адчыняла дзверы, давала партызанам ежу, калі-нікалі штосьці з бацькавага адзення. Так працягвалася да таго часу, пакуль гітлераўцы не размясцілі ў вёсцы свой гарнізон. Часам адбываліся сутычкі паміж партызанамі і акупантамі. У снежні 1942 г. партызаны разграмілі гарнізон. А восенню 1943 г. жыхарам вёскі паведамілі (свой чалавек меў сувязь з паліцыяй), што акупанты рыхтуюць карную аперацыю, будуць паліць вёску. Адны гэтаму паверылі, сабралі свой скарб і накіраваліся ў лес. Наша сям'я таксама падалася за грэблю на дарозе на в. Крушынаўку. У лесе з галінак дрэў зрабілі будан. Так і жылі.

Аднак даймалі восеньскія халады і многія пачалі вяртацца да хат. 12 кастрычніка 1943 г. маці з старэйшай і маленькай сястрычкамі пайшлі з лесу ў вёску, каб спячы хлеба (бацька ў той час партызаніў у 8-й Рагачоўскай брыгадзе). Я са сваёй цёткай Лесай застаўся ў лесе, яна перад вайной прыехала пагасцяваць з Ленінграда, а выехаць назад так і не паспела. На наступны дзень зранку, калі яшчэ ўсе людзі спалі, карнікі акружылі вёску з усіх бакоў, устанавілі кулямёты. З боку вёскі пачулася моцная страляніна, выбухі гранат, крыкі людзей, брэх сабак. Мы ўбачылі вялізнае зарыва, якое ўзнялося над вёскай. З-за дыму нічога не было відаць, лес напоўніўся шумам ад куль, выбухаў гранат і людскіх крыкаў. Усе зразумелі, што фашысты паляць вёску, забіваюць людзей. Нехта сказаў, што трэба адсюль уцякаць, бо і сюды яны могуць прыйсці. Мы пакінулі свае месцы, нічога не ўзяўшы з сабою, пабеглі далей у глыбіню лесу, спадзеючыся знайсці ратунак. Так дайшлі да вёскі Вялікая Крушынаўка, расказалі яе жыхарам, што чулі і бачылі сваімі вачыма.

Аднак карнікі ў лес не пайшлі, у хуткім часе ўсе вярнуліся на пакінутыя месцы. І тут мы даведаліся пра жудасную расправу, якую ўчынілі фашысцкія выродкі над ні ў чым не вінаватымі людзьмі. Партызаны, а з імі быў і мой бацька, вельмі спяшаліся, каб выратаваць людзей, але не паспелі... Яшчэ дыміліся недагарэлыя бярвенні хат і пабудоў, едкі дым засцілаў папялішчы. Бацька знайшоў забітых маці, маіх сястрычак... Сам пахаваў іх на мясцовых могілках. Усяго ў гэты дзень фашысты загубілі 235 жыхароў. У тыя дні былі спалены і расстраляны жыхары вёсак Валокі, Морткаў (вёска спалена і не адноўлена), Талочкаў. Тыя людзі, што засталіся жывымі, сталі бежанцамі, жылі, хто дзе мог. Некаторыя аднавяскоўцы трапілі ў лагер смерці ў пінскія балоты, і ім прыйшлося перажыць усе жахі, голад і холад у фашысцкай няволі, пакуль іх не вызваліла Чырвоная Армія. Мы жылі некаторы час у мястэчку Ціхінічы, потым перайшлі да сваіх родзічаў у в. Забалоцце. Там усіх жыхароў вёскі акупанты павыганялі з хат, і мы жылі ў зямлянках да пачатку зімы 1944 г. У канцы лютага 1944 г. выгналі нас і з зямлянак і пагналі ў бок Рагачова. У дарогу амаль нічога не паспелі ўзяць. Куды ўсіх гоняць у такі марозны дзень — ніхто не ведаў. На шляху фашысты падганялі людзей, каб ішлі хутчэй. Тых, хто адставаў, білі прыкладамі або забівалі на месцы. Пад вечар нас перагналі цераз вялікі мост на раце Друць і ў хуткім часе мы былі ў Рагачове. Загналі ўсіх у цагляны будынак школы, зачынілі дзверы і паставілі вартавога. Што з намі збіраліся рабіць — мы не ведалі, толькі нехта сказаў, што гэта канец, адсюль ніхто жывым не выйдзе. У доказ гэтаму пачулі ад нямецкага вартаўніка слова «капут». Надышла ноч, усе размясціліся на халоднай падлозе, але ніхто не спаў. Неўзабаве пачалася моцная страляніна, выбухі гранат, разрывы мін і снарадаў. Кулі траплялі ў шкло, якое тут жа рассыпалася, упіваліся ў сцены, цокалі ў кафляную грубку каля сцяны. Усе моцна прыціскаліся да падлогі, нібы яна магла выратаваць нам жыццё. Пачулася гучнае рускае «ўра», нямецкія выкрыкі, страляніна яшчэ больш узмацнілася. Раптам дзверы ў класе школы з грукатам адчыніліся і ў іх паказаўся савецкі салдат з аўтаматам у руках. Ён сказаў, што ўсе мы выратаваны і трэба хутчэй адсюль выходзіць — немцы могуць зноў з'явіцца, горад яшчэ поўнасцю не вызвалены. Не верылася, што прыйшло вызваленне, усе мы хуценька кінуліся ў дзверы і пачалі выходзіць. Рагачоў гарэў, ад агню і пажараў было светла, гарэлі дамы, будынкі, часам разрываліся міны і снарады, нямецкія ракеты падалі на дахі дамоў, і тыя пачыналі загарацца. Паўсюдна траплялі забітыя і параненыя нямецкія салдаты, бачыў параненых і забітых савецкіх воінаў. Нас выводзілі з-пад абстрэлу, але ратунку пакуль што не было: немцы інтэнсіўна абстрэльвалі горад. Было вельмі страшна, але ўсе ведалі, што выратаваны і хутка будзем у бяспецы. Праз некаторы час прыпыніліся ў вялікім цагляным доме, але і сюды даляталі нямецкія снарады і заставацца тут было небяспечна. Таму салдаты параілі выбірацца адсюль і ісці далей у тыл. Так мы апынуліся за некалькі кіламетраў ад Рагачова і размясціліся ў лесе ў былых нямецкіх зямлянках. Жыць тут было цяжка і небяспечна. Гітлераўцы пакінулі пасля сябе шмат зброі, мін, снарадаў. Не было таго дня, каб хто-небудзь з дарослых або дзяцей не падрываўся на міне. Асабліва былі небяспечныя для нас, хлапчукоў, пяхотныя міны, якія былі расстаўлены ў лесе паўсюдна і іх цяжка было выявіць. Два маі сябры загінулі, падарваўшыся на мінах, і былі пахаваны ў лесе каля дарогі. Разміраваныя савецкімі мінёрамі супрацьтанкавыя нямецкія міны ляжалі ў кучах на зямлі. У такіх цяжкіх умовах мы пражывалі да лета 1944 г., калі пачалося канчатковае вызваленне беларускай зямлі ад фашысцкіх акупантаў. Калі Рагачоўскі раён быў поўнасцю вызвалены, мы

сабралі свае небагатыя пажыткі і пагнуліся да родных мясцін, хоць усе ведалі, што там нічога добрага нас не чакае. Так у ліпені 1944 г. мы разам з іншымі сем'ямі з вялікімі цяжкасцямі дабраліся да Фалевіч. Страшнае відовішча адкрылася нам. Па сутнасці вёскі не было, ніводнай хаты ў ёй не засталося, на былых сялянскіх сядзібах усё пазаростала вялікім бур'янам і травой, уся зямля была зрэзана траншэямі, акопамі, ямкамі ад разрываў бомбаў, мін і снарадаў. Усюды былі відаць сляды нядаўніх жорсткіх баёў: разбітая ваенная тэхніка, валялася многа зброі, боепрыпасаў. Яшчэ не ўсе былі знойдзены, знесены і пахаваны загінуўшыя савецкія воіны, трупы нямецкіх салдат і афіцэраў. Жыхары вёскі зносілі загінуўшых савецкіх салдат і хавалі ў брацкіх магілах на мясцовых могілках. Жыў я ў зямлянцы недалёка ад месца, дзе некалі была наша хата. Цётка Леса цяжка захварэла і яе завезлі ў Рагачоўскую бальніцу, дзе яна неўзабаве памерла. Я застаўся адзін і не ведаю, што б са мною здарылася, каб у гэты час мяне не знайшоў бацька, які разам з іншымі партызанамі ўдзельнічаў у разгроме акружанай нямецкай групоўкі пад Мінскам і вызваленні горада. Пасля вызвалення Мінска яго пакінулі ў горадзе, дзе ён працаваў у Міністэрстве ўнутраных спраў БССР. У канцы ліпеня 1944 г. бацька прыехаў за мною ў вёску, застаў мяне цяжка хворым і ў такім стане ледзь давёз да Мінска...

Калі гарэла вёска

Мішу Марчанку не было яшчэ і чатырнаццаці гадоў, калі ён упершыню сустрэўся з партызанамі. Хлопчык перадаваў народным мсціўцам сабраныя ім на месцы былых баёў зброю і боепрыпасы. Ад партызан жа Міша забіраў лістоўкі, нёс іх у Доўск падпольшчыцы Агаф'і Талкачовай.

Так працягвалася да 5 чэрвеня 1943 года. У тую раніцу Міша прыгнаў каня з пашы, стаміўся і лёг крыху адпачыць. Прачнуўся ад выбухаў снарадаў.

— Хутчэй хавайцеся! — пачуў ён голас сваёй сястры Ані (маці пайшла ў той час у Вялікія Стралкі да родзічаў).

Дзеці, а іх было, акрамя Мішы, тры сястры і два браты, пабеглі хавацца ў акоп, выкапаны паблізу пуні яшчэ ў пачатку вайны. А снарады ляцелі, са страшэнным грукатам узрываючыся на вуліцах вёскі.

Хата Марчанкаў, якая стаяла на ўскрайку, загаралася адразу ад прамога трападання. Чорны дым узняўся слупам, зашугала полымя, а потым загарэліся іншыя будынкі. Толькі абстрэл скончыўся, як раптам над акопам пачулася:

— Рус, вылазь!

Вылезлі напалоханыя заплаканыя дзеці, жанчыны, тут разам з суседзямі хаваўся 21 чалавек.

— А ну, зноў туды хавайцеся! — пачулася новая каманда. І як толькі ўсе саскочылі ў акоп, страшэнны выбух, а затым другі страсянуў і наваколле. Гэта гітлераўцы кінулі ў акоп гранаты. Потым яны разбурылі саламяны дах лазні і накідалі ў акоп саломы і, абліўшы яе бензінам, падпалілі. Міша чуў вакол сябе жудасны крык, стогны параненых. Ён сабраўся з сілай і выскачыў з акопа. За ім выбралася Ульяна Удовенка. У Мішы гарэлі шапка, ватоўка, ён скінуў іх з сябе і пабег. Чуў за сабой аўтаматную чаргу: гэта карнікі прыкончылі Ульяну, якая паспела адбегчы толькі метраў на дваццаць. Міша, не памятаючы сябе ад болю і страху, імчаў па палаючай вёсцы, а потым скочыў у склеп, дзе хаваліся цётка Агата, двое яе дзяцей, стары Апанасенка Мірон з жонкай, Цітова Наста са сваімі дзяўчаткамі Зінай і Марусяй. Гітлераўцы прыйшлі і сюды. Карнікі ўжо не загадвалі вылазіць, яны проста кінулі ў люк гранату. Вогненны струмень з кулямёта давяршыў сваю справу. Міша, схаваўшыся за снапы лёну, страціў прытомнасць. Ачнуўся ад пранізлівага болю, усё побач гарэла, крыкаў чуваць уже не было... Хлопчык выпаўз са склепа, глынуў свежага паветра і зноў страціў прытомнасць. Апрытомнеў толькі пад вечар. Цётка Наста перавязвала ножку сваёй Зіне і галасіла. Галасіла і яе трынаццацігадовая Маруся. Міша застагнаў, і тады Наста з Марусяй нахіліліся над ім. У падлетка абгарэлі твар, рукі, нясцерпна балела правая нага, калола ў грудзях.

На змярканні Наста ўзяла на рукі шасцігадовую Зіну, а дзецям загадала ісці за ёй. Ад усяго перажытага і болю Міша ледзь ішоў, раны былі перавязаны, аднак боль не сціхаў. Зіна плакала на матчыных руках. Усім нясцерпна хацелася піць. Наста зняла з нагі дачушкі чабаток, адышла з дарогі, набрала з лужыны вады. Дзеці сталі піць мутную ваду, якая пахла балотнай тванню, а яны ўсё пілі і пілі...

Ноччу Наста пакінула дзяцей, сама ж з Зінай накіравалася ў лес, каб сустрэцца з

партызанамі і расказаць пра трагедыю вёскі. Жанчыне пашанцавала, яна выпадкова сустрэлася з разведчыкамі і прывяла іх да Марусі і Мішы. Зіна раніцай памерла, а Мішу пачалі ратаваць. Спачатку яго хавалі і лячылі юныя падпольшчыцы ў в. Фундамінка. Тут і знайшла хлопчыка яго маці Матруна Іванаўна. Хата іх была спалена, пяцёра дзяцей загінула... Заставаўся пакуль жыць толькі Міша, аднак стан яго здароўя пагаршаўся. Тады мясцовыя патрыёты перавезлі хлопца ў в. Надзеждзіна Буда-Кашалёўскага раёна. Міша стаў жыць у хаце Марфы Іванаўны Лашкаровай, медсястры яшчэ з даваенным стажам. Лячыла яго гэта чулая жанчына травамі.

Загаіліся шматлікія раны толькі к восені, але з адной бяды Міша трапіў адразу ў другую. У Надзеждзіне стаяў варожы гарнізон. Гітлераўцы схапілі аднойчы 15 заложнікаў, сярод якіх быў і Міша, і павінны былі іх расстраляць, калі на гітлераўцаў нападуць партызаны.

...Хлопчыку ўдалося ўцячы. Разам з маці ён стаў жыць у сямейным партызанскім лагеры. А неўзабаве прыйшло выратаванне: Чырвоная Армія вызваліла родныя мясціны...

У. Бандарэнка.

Адплата

У в. Новы Доўск дыслацыравалася перыферыйная каманда 724-й групы тайнай палявой паліцыі (ГФП-724). Асабліва лютавалі яе супрацоўнікі летам і восенню 1943 г. 5 чэрвеня ў другой палавіне дня яны сумесна з падраздзяленнямі 221-й ахоўнай дывізіі наляцелі ў в. Каменка Рыскоўская і падпалілі яе. 12 чэрвеня, роўна праз тыдзень, карнікі акружылі в. Каменка Стралкоўская і падманам сабралі людзей. Паводле ўспамінаў жыхаркі вёскі Ганны Ігнацьеўны Кавалёвай, гітлераўцы аб'явілі вяскоўцам, што будуць іх перасяляць, і прымусілі грузіць найбольш каштоўныя рэчы ў аўтамашыны. Пасля загналі жанчын, старых і дзяцей у хаты Ісака Кірэенкі і Сяргея Сталярова і падпалілі іх. У той жа дзень карнікі вярнуліся ў Каменку Рыскоўскую і спалілі астатнія 8 хат. Карнікі спалілі таксама вёскі Рыскоў і Перакоп. У зладзейскай акцыі ўдзельнічаў камісар ГФП-724 капітан Бірман.

У ліпені 1943 г. супрацоўнікі 724-й групы расстралялі бургамістра Журавіцкай воласці Яфіма Емяльянавіча Філіпчанку, старастаў вёсак Балатня і Задвор'е Васіля Дамітрыевіча Фядосцава і Анісіма Аляксеевіча Календу, якіх западозрылі ў сувязі з партызанамі. Яшчэ раней, у маі 1943 г., карнікі 724-й групы Г. Функ і М. Лабада жорстка збілі 50 зняволеных з Навадоўскага лагера ваеннапалонных за спробу ўцячы да партызан. Шасцёра з іх расстралялі.

Пасля вайны супрацоўнікі тайнай палявой жандармерыі імкнуліся замесці свае злачынствы. Аднак гэта не ўсім удалося. Чэкісты Гомельшчыны знайшлі некаторых злачынцаў. У 1967 г. Ваенны трыбунал Беларускай ваеннай акругі разглядаў у Гомелі крымінальную справу на Генрыха Функа, Мікалая Лабаду. Яшчэ раней да крымінальнай адказнасці былі прыцягнуты былыя супрацоўнікі разведаддзела 221-й ахоўнай дывізіі Курт Шэйн і Аляксандр Шылінг, якія ўдзельнічалі ў распрацоўцы плана карнай аперацыі «Чэрвеньскі жук» і іншых злачынствах. Прыгавор быў суровы, аднак справядлівы.

І. С. Барысаў.

Гэта было ў Рагачове

З успамінаў К. К. Гардзіеўскага

Канстанцін Кірылавіч Гардзіеўскі нарадзіўся ў 1922 г. ў Рагачове. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У 1941—42 гг. у Чырвонай Арміі. У 1942 г. арганізаваў і ўзначаліў падпольную камсамольскую арганізацыю ў Рагачове. З лютага 1943 г. ў партызанах, камандзір дыверсійнай групы, начальнік разведкі атрада, а затым брыгады. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі і медалямі. Жыве ў Рагачове.

Пасля цяжкага ранення на фронце восенню 1941 г. я апынуўся ў тыле ворага, мне з цяжкасцю давялося дабрацца да Рагачова, дзе жылі бацькі. Бацькі не было дома, па чутках, ён пайшоў у партызаны разам з камуністамі раёна.

Крыху акрыяўшы пасля ранення, я змог уладкавацца на лесазавод электраманцёрам, дзе да вайны працаваў мой бацька, а да арміі і я. Немцы прыкладалі ўсе намаганні аднавіць завод для перапрацоўкі драўніны на патрэбы вайны. На

К. К. Гардзіеўскі.

заводзе ўжо працавалі мае таварышы: Клятэцкі Рыгор Пятровіч, Палякоў Аляксей, Гарадзецкі Мікалай, Філімонаў Мікалай, Паўлюкоўскі Міхаіл і Суслаў Леанід. Мы хутка зблізіліся і пачалі падумваць пра далейшыя дзеянні. Было вырашана арганізаваць падпольную камсамольскую арганізацыю. Сакратаром выбралі мяне, а маім намеснікам Клятэцкага. Паступова ў нашу арганізацыю мы ўцягнулі Уладзіміра Яркіна, Васіля Шумілава, Веру Ксянзову, Марыю Гардзіеўскую, Мікалая Гайдурава, Антаніну Грыгор'еву, Леаніда Кахоўскага.

Першыя крокі нашай дзейнасці заключаліся ў растлумачальнай рабоце. Мы стараліся ўсяляк узняць нянавісць людзям у перамозе Чырвонай Арміі, рабілі ўсё магчымае, каб затармазіць работу завода.

У пачатку вясны 1942 г. я дакладна ведаў, што мой бацька знаходзіцца ў Рагачоўскім партызанскім атрадзе, і праз яго змог звязацца з падпольным райкомам партыі, з С. М. Свярдловым і К. М. Драчовым. Па заданню райкома партыі, «працуючы» на заводзе, наша група яшчэ больш актывізавала сваю дзейнасць і не толькі на заводзе, а вышуквала магчымасць усюды, дзе толькі можна, шкодзіць фашыстам. Мы дзейнічалі ўжо больш упэўнена і мэтанакіравана. Выводзілі са строю маторы, замарожвалі трубы, якія падавалі ваду ў паравы кацёл, арганізоўвалі аварыі ў помпавай станцыі і іншыя дыверсіі на заводзе і гэтым дабіваліся скарачэння да мінімуму выпуску драўніны, замест 300 да 20—25 кубаметраў у суткі.

Значную работу наша камсамольская арганізацыя праводзіла па распаўсюджанню лістовак, зводак аб становішчы на франтах. Вывешвалі лістоўкі ў горадзе, у тым ліку і на нямецкіх установах. Забяспечвалі партызан прадуктамі, махоркай, соллю са сваіх рабочых пайкоў, перадавалі партызанам зброю і боепрыпасы. Выконвалі па іх заданню і па сваёй ініцыятыве дыверсійныя аперацыі ў горадзе.

У 1942 г. фашысты аднавілі двухпавярховы будынак райвыканкома і прыстасавалі яго пад шпіталь для сваіх параненых, а калі абсталяванне шпіталя было поўнасцю ўстаноўлена і здадзена ў эксплуатацыю, мы (я, Рыгор Клятэцкі і Аляксей Палякоў) у адну з начэй падпалілі будынак, ён цалкам згарэў з усім абсталяваннем, так і не прыняўшы ні аднаго параненага фашыста.

У раёне чыгуначнай станцыі на склад была завезена вялікая колькасць аброі і боепрыпасаў. Склад добра ахоўваўся. Але нам удалося падкласці туды міну, сканструяваную Рыгорам Клятэцкім. У 10 гадзін раніцы аглушальны выбух узрушыў горад. Снарады, міны і патроны рваліся з нарастаючай сілай, стварала ўражанне моцнай артылерыйскай, кулямётнай і вінтовачнай стральбы. Нямецкая вайсковая часць, якая стаяла ў казармах у горадзе, збегла за горад, баючыся разгрому, і толькі праз 3 гадзіны, апамятаўшыся, удакладніўшы абстаноўку, вярнулася ў казармы. Гэта быў вельмі прыгожы і ўнушальны феерверк, які напомніў ворагу, што наш народ змагаецца ўсімі даступнымі яму шляхамі.

Акупанты ўзмоцненымі тэмпамі пачалі фарсіраваць аднаўленне чыгуначнага моста на р. Друць. Мы вырашылі і тут па меры магчымасці перашкодзіць. Калі былі ўстаноўлены рыштаванні, закончаны падрыхтоўчыя работы, група падпольшчыкаў (Шумілаў, Філімонаў, Гарадзецкі) спусціла караван звязанага лесу (некалькі соцень кубаметраў), што стаяў на Друці ўверх ад моста. Моцным цячэннем вады лес панесла пад мост. Ён зламаў на сваім шляху рыштаванні і панёс іх уніз па цячэнні. На месяц былі затрыманы работы па аднаўленню моста.

Сотні зводак Саўінфармбюро, газет, лістовак, якія мы атрымлівалі ад райкома, асабліва з паведамленнямі пра перамогі Чырвонай Арміі пад Сталінградам і на іншых франтах, былі нашай натхняючай сілай. Мы стараліся як мага хутчэй і лепш гэтыя весткі данесці да народа...

Калі за мной сталі сачыць, я пайшоў у партызанскі атрад, дзе быў мой бацька Кірыла Харытонавіч, які злажыў галаву за нашу Радзіму.

Сакратаром камсамольскай арганізацыі застаўся Рыгор Паўлавіч Клятэцкі. У маі — жніўні 1943 г., выканаўшы свае заданні, члены нашай камсамольскай арганізацыі паступова перайшлі ў рады партызанскага атрада.

Наш зямляк *Жэня Язэпаў* з пас. Пахар працаваў перад вайной кінамеханікам у в. Журавічы. У ліпені 1941 г. добраахвотнікам уступіў у знішчальны батальён. Пасля шматлікіх просьбаў паслаць на фронт быў накіраваны на спецыяльныя курсы падрыўнікоў. З красавіка 1942 г. хлопец стаў членам падпольнай групы ў в. Красніца, а ў кастрычніку 1942 г.— падрыўніком 256-га атрада імя І. В. Сталіна 10-й Журавіцкай брыгады. У атрадзе не хапала прафесіяналаў у дыверсійнай справе, і Яўген узяўся вучыць байцоў. Стаўшы камандзірам дыверсійнай групы, ён разам з падрыўнікамі рэгулярна выходзіў на чыгуначную лінію Гомель — Жлобін. Добра ведаючы нямецкую мову, нярэдка ў форме афіцэра Яўген з'яўляўся ў самым логаве ворага і прыносіў каштоўныя разведданыя. У хуткім часе група Язэпава стала сапраўднай гразой для акупантаў. Гітлераўцы вымушаны былі ўзмацніць ахову чыгункі на ўчастку, дзе дзейнічала група. Праз кожны кіламетр былі пабудаваны дзоты з кругавым абстрэлам, часта арганізоўваліся засады на партызан. За галаву бясстрашнага камандзіра групы акупанты абяцалі ўзнагароду: 100 пудоў солі і вялікую суму грошай. Але здраднікаў не знайшлося. 26 чэрвеня 1943 г. група ў чарговы раз падабралася да палатна, нягледзячы на ўсе заслоны, і пусціла пад адхон 18-ы эшалон. Прайшоўшы прыдарожную паласу, каля в. Кірава Жлобінскага раёна група трапіла ў варожую засаду. Камандзір загадаў байцам адыходзіць, а сам з ручным кулямётам застаўся прыкрываць іх. Калі скончыліся патроны, Яўген знішчыў кулямёт, а потым, падпусціўшы фашыстаў бліжэй, узарваў апошняй гранатай сябе і 12 акупантаў. Пахаваны адважны падрыўнік у в. Кірава ў брацкай магіле воінаў і партызан. Я. І. Язэпаў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені. Яго імем названа вуліца ў в. Журавічы. Імя падрыўніка ёсць на помніку камсамольцам у Гомелі.

У чэрвені 1942 г. ў 255-ы атрад 8-й Рагачоўскай брыгады прыйшоў падрыўнік *Аркадзь Добкін*. Быў ён родам з Бялыніч, служыў у Чырвонай Арміі, з баямі адступаў да Масквы. Тут яго накіравалі на вучобу ў школу, дзе рыхтавалі падрыўнікоў для дыверсійнай работы ў тыле ворага. Так трапіў Аркадзь Добкін да партызан Рагачоўшчыны. Адразу ж пасля прыбыцця ў атрад падрыўнік пачаў абучаць байцоў дыверсійнай справе. Праз тыдзень група падрыўнікоў у складзе Леаніда Лежанкова, Васіля Кошалева, Фамы Захаркова, Мікалая Несцяркова, Васіля Жураўлёва і Васіля Шынкевіча пайшла на сваё першае заданне на чыгунку Бабруйск — Жлобін. Першая ўдача яшчэ больш згуртавала хлопцаў. Аркадзь, хоць узначальваў маладзёжную дыверсійную групу, працягваў абучаць яшчэ дзве групы падрыўнікоў. Восенню 1943 г. група Добкіна пайшла на чарговую аперацыю. Праводзіў групу сам камбрыг. Здавалася, усё ўлічана і прадугледжана. Партызаны былі апрануты ў нямецкую форму, добра ўзброены. Нічога не прадказвала бяды. А раніцай у брыгаду прыйшла страшная вестка: з пятнаццаці чалавек у жывых засталося толькі трое... У наступную ноч амаль усе вучні Аркадзя пайшлі на заданні. За два тыдні яны знішчылі тры шашэйныя масты, дзесяць кіламетраў тэлеграфна-тэлефоннай сувязі, падарвалі 5 воінскіх эшалонаў. Байцы помсцілі акупантам за свайго настаўніка Аркадзя Добкіна, які ў ліку дванаццаці не вярнуўся з той аперацыі. Адважны падрыўнік быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны I ступені.

У адну з начэй у канцы сакавіка 1943 г. сямёра партызан 261-га атрада імя В. І. Чапаева 10-й Журавіцкай брыгады на шашы Рагачоў — Доўск, за 13 кіламетраў ад Рагачова, паставілі некалькі мін з інтэрвалам 200—250 метраў і схаваліся ў прыдарожным лесе. Раніцай, калі па дарозе пацягнуліся нямецкія машыны, падрыўнікі пачулі моцны выбух, шаша заняла полымем ад узарванай аўтацыстэрны. Яшчэ адзін выбух страсянуў навакольле — гэта на партызанскай міне падарвалася легкавая аўтамашына. Натхнёныя ўдачай, партызаны вырашылі прадоўжыць аперацыю на шашы. У той дзень яшчэ тры варожыя машыны трапілі пад іх агонь. Аднак дарагой цаной далося паспяховае выкананне аперацыі — загінуў лепшы партызан атрада і верны сябра *Грыша Бычынскі*, які быў прыкладам храбрасці.

У цёплы чэрвеньскі дзень 1943 г. на Рагачоўшчыне ў схватцы з ворагам загінуў смерцю героя вядомы ў перадваенны час спартсмен васьміразовы чэмпіён краіны па акадэмічным веславанні заслужаны майстар спорту *Аляксандр Далгушын*. Ён у складзе спецатрада «Слаўны» прыбыў з-за лініі фронту. Шмат слаўных баявых аперацый правёў гэты атрад на Гомельшчыне. У час паходаў сяржант

А. Д. Добкін.

А. Далгушын.

Т. Пола.

М. В. Талавераў.

Далгушын не разлучаўся са снайперскай вінтоўкай. У апошні свой бой ён пайшоў з кулямётам... Байцы ў засадзе чакалі аўтакалону. 8 аўтамашын рухалася з боку Рагачова. Праехаўшы левы фланг, яны спыніліся якраз у сярэдзіне засады. Калі гітлераўцы пачалі саскокваць з машын, камандзір атрада выпусціў дзве чаргі з аўтамата. У машыны з-за бярвён паляцелі гранаты. Уцалелыя гітлераўцы, схаваўшыся за колы аўтамашын у прыдарожнай канаве, адкрылі ў адказ шалёны агонь. Асабліва насядаў вораг на левым флангу, дзе з ручным кулямётам ляжаў Аляксандр Далгушын: з гэтага боку гітлераўцы імкнуліся зайсці ў тыл партызанам. Былі параненыя. Раптам кулямёт Далгушына змоўк. Саша адкінуў у бок пусты дыск. Яго баявы таварыш Ілья Давыдаў, убачыўшы гэта, здолеў паднесці кулямётчыку тры поўныя дыскі, у апямозе ўпаў каля Далгушына і не адразу зразумеў, чаму Саша не бярэ дыскі. Калі падняў галаву, убачыў, як з невялікай ранкі на ілбе сцякаў струменьчык крыві... Так загінуў адважны партызан Аляксандр Далгушын — рыцар «Залатога вясла».

Разам з беларусамі на рагачоўскай зямлі змагаліся ўкраінцы, рускія, палякі, чэхі. Рознымі шляхамі прыйшлі яны ў рады народных мсціўцаў. Усведамленне небяспекі, якую нёс народам свету фашызм, з'яднала гэтых людзей. У радах патрыёў-інтэрнацыяналістаў змагаўся на рагачоўскай зямлі і чэх *Тэадор Пола*. Ён маладым хлопцам быў мабілізаваны ў гітлераўскую армію, займаўся рамонтам шашэйных дарог. Разам з двума сваімі сябрамі апынуўся ў в. Доўск. Калі даведаўся, што ў Рыскаўскіх лясах знаходзяцца партызаны, разам з сябрамі пайшоў да іх. У 268-м атрадзе 10-й Журавіцкай брыгады ён паказаў сябе смелым і кемлівым партызанам. Дора, так называлі яго баявыя сябры, пасля вайны вярнуўся на радзіму. І ўсе пасляваенныя гады не забываў пра сваіх сяброў-партызан. Перапісваўся з імі, у яго ў гасцях быў былы камандзір 268-га атрада К. Ф. Чарненка, з якім моцна сябраваў у час вайны. Прыязджаў да свайго былога камандзіра і Тэадор Пола. Па-брацку прымалі на Рагачоўшчыне госця з Чэха-Славакіі. Беларускі партызан прасіў перадаць усім сваім баявым паплечнікам шчырую ўдзячнасць за незабыўныя дні ваеннай маладосці.

Сапраўды, дружбе, што нарадзілася ў ваеннае ліхалецце, непадуладны ні час, ні змены, якія адбываюцца ў свеце.

А. Янкоў, Н. Цэйтлін, Л. Чапцоў.

Партызанскі майстар

З успамінаў М. В. Талаверава

У экспазіцыі Гомельскага абласнога краязнаўчага музея прадстаўлены унікальныя экспанаты — два партызанскія аўтаматы. Цяжка паверыць, што яны самаробныя. Але гэта так. Сканструяваны яны былі майстрам зброі 252-га партызанскага атрада 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады Мікалаем Васілевічам Талаверавым. Побач з аўтаматамі — яго партрэт.

М. В. Талавераў жыве ў Рагачове. Пасля вайны ён шмат гадоў працаваў слесарам-наладчыкам на малочнакансервавым камбінаце. Унёс 36 рацыяналізатарскіх прапаноў. Да яго баявых узнагарод дабавіўся ордэн Леніна — за працоўныя заслугі.

З ростам партызанскага руху патрабавалася ўсё больш і больш зброі і боепрыпасаў. Гэта была галоўная ўмова нашай паспяховай барацьбы з нямецка-фашысц-

кімі захопнікамі. Але зброі не хапала. Асабліва аўтаматычнай. У маі 1943 г. для партызан Рагачоўскай зоны было скінута самалётам з Вялікай зямлі некалькі мяхоў зброі і боепрыпасаў. Дык нашаму атраду былі выдзелены толькі 2 аўтаматы ППШ. Іх аддалі падрыўнікам.

Неяк я напрасіў у Валодзі Мяльковіча даць паглядзець мне аўтамат. Разабраў яго і пачаў вывучаць канструкцыю. Па прафесіі я слесар і параўнальна хутка зразумеў, што да чаго. Аўтамат выклікаў у мяне вялікае захапленне. Узнікла думка, а ці не зрабіць мне яго самому? З такой прапановай звярнуўся да камандзіра атрада І. Н. Парываева. Ён і партызаны, якія стаялі побач, засмяяліся, маўляў, жартуеш.

Але ў мяне з галавы не выходзіла думка аб сваім аўтамаце. Яшчэ і яшчэ раз прыкінуў — хоць і цяжка (няма неабходнага абсталявання), але зрабіць можна. Адказ камандавання быў такі: «Перашкаджаць не будзем, паспрабуй, паглядзім, што атрымаецца».

І я ўзяўся за справу. Даставаў неабходныя інструменты, матэрыялы. У гэтым мне дапамагалі іншыя партызаны. Нялёгка ўсё давалася. Былі, здавалася, невырашальныя задачы. І ўсё ж да назначанага часу аўтамат быў гатовы. Далажыў аб гэтым камандзіру атрада. «Што ж,— гаворыць ён,— пойдзем да камандзіра брыгады, няхай паглядзіць».

Камандзір брыгады Ф. С. Тарасевіч уважліва агледзеў аўтамат і даў дазвол на выпрабаванне. Мы адышлі далей ад штабной зямлянкі. І начальнік штаба В. В. Чысцякоў падаў мне каманду: «Агонь!». Я націснуў на спускавы механізм, аўтамат запрацаваў спачатку кароткімі, а затым доўгімі чэргамі — і дыск разрадзіўся. Усе пачалі віншаваць мяне з поспехам.

Пазней было зроблена яшчэ 5 аўтаматаў. І дзейнічалі яны бездакорна. Але самае галоўнае — у атрадзе пасля гэтага была арганізавана свая майстэрня па вырабу зброі.

З вінтоўкай і алоўкам

З успамінаў С. Р. Раманава

Сяргей Раманавіч Раманаў — беларускі графік. Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь (1966). Нарадзіўся 5.9.1914 г. ў Маскве. Скончыў Маскоўскае мастацкае вучылішча памяці 1905 г. (1940). У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху на тэрыторыі Рагачоўскага раёна. У мастацкіх выстаўках удзельнічае з 1945 г. Працуе ў розных тэхніках станковай і кніжнай графікі, аўтар шматлікіх шаржаў і карыкатур для часопісаў «Вожык» (1945—78) і «Крокодил». Галоўнае месца ў творчасці займае тэма Вялікай Айчыннай вайны. Прафесійнай дасканаласцю, дакументальнай дакладнасцю вызначаюцца малюнкі ваенных гадоў «У партызанскай зямлянцы» і «Кароткі прывал» (1943), «Прывялі языка» і «Бой у гарнізоне Рэкта» (1944) і інш. Пераканаўча раскрыты мужнасць, характары народных мсціўцаў у серыях лістоў «Партызаны Беларусі». Гераізм Беларускага народа адлюстраваны ў творах «Рэйкавая вайна» (1946), «Подзвіг Мікалая Гастэлы» (1975), «Партызанская застава» (1978), «Снеданне ў Клічаўскіх лясах» (1979) і інш. Мастаком створана серыя гісторыка-рэвалюцыйнай тэматыкі, шэраг работ прысвечаны мірнаму жыццю і працы народа. Стварыў серыю партрэтаў рабочых МТЗ (1976—77). Аўтар жывапісных работ «У пошуках сына» (1945), «Вяртанне з баявой аперацыі» (1979), «Вясна ў партызанскай зоне» (1981), «Беларускі вакзал. Масква. 41-ы год» (1982), «Прывал пад Быхавам» (1985) і інш. Афарміў кнігі «Вершы і паэмы» П. Броўкі (1946), «Вершы» М. Танка і «Славуты домік» Я. Купалы (1948), «У нашай сталіцы» А. Якімовіча (1954), «Маленькія апавяданні, казкі і байкі» Л. Талстога (1957) і інш. Стварыў шэраг плакатаў. Жыве ў Мінску.

Амаль пасля кожнай баявой аперацыі, у якой мне даводзілася прымаць удзел, я рабіў эскізы, сціплыя замалёўкі. Увесь мой мастацкі багаж складаўся з кішэннага самаробнага альбомчыка, аскабалка алоўка і кавалачка гумкі. Паперу дастаць было цяжка. Часам разведчыкі даставалі нам паперу, галоўным чынам — шпалеры. А неяк мне падарылі нават альбом для сямейных фатаграфій з прарэзамі на ражках. Гэта была рэч!

Жаданне працаваць было заўсёды, хоць маляваць даводзілася ў розных абставінах. Маляваў, седзячы на кані, калі брыгада рухалася спакойным крокам, маляваў у нарадзе...

Пасля няўдалай спробы з'яднацца з рэгулярнай арміяй пад Быхавам мы пад раніцу фарсіраваным маршам выходзілі з акружэння. На прывале ў лесе я назіраў такую карціну: змучаныя людзі спалі на снезе, прыхіліўшыся адзін да аднаго або да дрэў, тут жа стаялі коні са стомленa апушчанымі галовамі... Кастры амаль патухлі, толькі маленькія струменьчыкі дыму падымаліся ўгару, а сняжынкі, павольна кружачыся, падалі і падалі; людзі і коні віднеліся праз снежную пелену.

С. Р. Раманаў.

Н. А. Цэйтліп.

Я дастаў свой альбом і пачаў замалёўваць гэты прывал...

Усе свае малюнкі я насіў у заплечным мяшку ў вокладцы фотаальбома. І нават на вокладцы маляваў. Аднойчы я ледзь не развітаўся з усім сваім скарбам і нават з жыццём.

4 сакавіка 1944 года на досвітку мы прачнуліся ў лясной зямлянцы. Змянілі вартавога і пачалі збірацца ў засаду каля шашы. Але вораг, карыстаючыся раніш-нім туманам і тым, што ведаў наш пароль, падышоў да зямлянкі і да вартавога...

Немцы раалічвалі ўзяць аднаго-двух разведчыкаў, але напароліся на аддзяленне з ручным кулямётам. Кулямёт нас выручыў. Вартавы Васіль Казлоў быў паранены ў абедзве рукі, кулямётчык Іван Шкораў — у ступню. І мне дасталося. Давялося ўцякаць, і я не паспеў нават ухапіць свой заплечны мяшок. Пасля таварышы расказалі, што малюнкі яны сабралі каля зямлянкі. Сёе-тое, праўда, прапала.

Некаторыя з гэтых малюнкаў — «У партызанскай зямлянцы», «На прывале» і «Прывялі языка» — знаходзяцца ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР. Малюнак «У партызанскай зямлянцы» я рабіў проста з натуры, а для малюнкаў «На прывале» і «Прывялі языка» спачатку накідваў схему задуманай кампазіцыі на маленькім лістку, потым гэту схему лёганька алоўкам пераносіў на вялікі лісток, выбіраў натуру і тады ўжо маляваў у ліст. Пазіравалі партызаны з вялікім задавальненнем. Усе яны намаляваны з партрэтным падабенствам.

На малюнку «Прывялі языка» я намаляваў і свой аўтапартрэт — у левым кутку, у кепцы з муштуком у роце. Казалі, што я не падобны на сябе. Калі зажыла правая рука, я намаляваў партызанскі шпіталь-зямлянку, сваіх баявых сяброў Шкорава і Казлова (яны ляжаць на нарах) і медсястру з урачом. Малюнак мне ўдаўся, але, на жаль, прапаў.

У пачатку лета 1944 года адзначалася двухгоддзе нашай брыгады. К таму часу мая папка папоўнілася, і камісар атрада П. Мальцаў прапанаваў мне наладзіць выстаўку. Але паўстала пытанне: дзе і як? Пра памяшканне не было чаго і думаць, шчыт заказаць не было дзе. Але мы знайшлі выйсце. Я нарэзаў лазовых прутко-ў, расшчапіў іх, уставіў у расколіну малюнкі і на лыкавых вяровачках паразвешваў іх па сасонніку.

Відовішча было цікавае. Ад лёгкага ветрыку ўся экспазіцыя калыхалася, і каля лісткоў, прытрымліваючы іх звізу, тоўпіліся ўзброеныя людзі, уважліва ўглядаючыся ў малюнкі. Гэта былі першыя гледачы маёй першай персанальнай выстаўкі.

Многа малюнкаў я падарыў сваім таварышам. Прынясе, бывала, хто-небудзь лісток паперы і папросіць намаляваць на памяць, я і намалюю. Так і паехалі мае малюнкі ў Сярэднюю Азію, на Каўказ і ў іншыя мясціны.

Пазней я раздабыў крыху каляровых алоўкаў і выканаў імі тры эскізы: «Партызаны чытаюць зводку калгаснікам», «Разгром гарнізона Рэкта» і «Абстрэл эшалона». Малюнак партызана Н. Часнаева я зрабіў на шпалерах графічным алоўкам. Малюнкі «Маці партызана», «Разведчыкі», «Чытаюць навагодні загад» і іншыя зроблены па накідах майго кішэннага альбомчыка ўжо ў Мінску.

Запас уражанняў і назіранняў ад усіх гадоў вайны велізарны, хоць не часта даводзіцца звяртацца да яго — клічуць сучасныя сюжэты.

Друкуецца па час.: Маладосць. 1964. № 8. С. 124—126.

Дапамагалі словам

У суровы ваенны час на Рагачоўшчыне ў розныя гады выдаваліся падпольныя партызанскія выданні — газета «Камунар», рукапісны часопіс «Камсамол Рагачоўшчыны», лістоўкі і баявыя лісткі. Рабіліся яны ў цяжкіх палявых умовах: непрыстасаваных зямлянках, пры вострым недахопе паперы, фарбы, друкарскіх шрыфтоў. Аднак дзякуючы энтузіязму, прыроднаму ўмельству і вынаходніцтву тых, хто ўзяўся за гэту нялёгкую справу, тысячы людзей былі падтрыманы ў крытычны час, мелі магчымасць ведаць праўду пра становішча на франтах, спадзяваліся на перамогу.

З успамінаў Н. А. Цэйтліна

На першым часе партызаны не ведалі пра падзеі на франтах, бо яшчэ не было сувязі з Вялікай зямлёй. Інфармацыю чэрпалі толькі з нямецкай газеты «Новый путь», якая выдавалася ў Бабруйску на рускай мове. Фашысты ў ёй пісалі, што Масква ўзята, і што нават прадаюцца чыгуначныя білеты на Маскву. Але ў снежні 1941 яны змясцілі ў газеце паведамленне, што па загаду фюрэра нямецкія войскі адведзены на 80 кіламетраў ад Масквы на лепшыя зімовыя кватэры.

Партызаны склалі лістоўку: «Дарагія таварышы! Не верце фашыстам. Яны ўводзяць вас у зман. Ніякіх ускраін Масквы яны не занялі. Ленінград змагаецца і не здаецца. Часці Чырвонай Арміі на ўсіх франтах даюць адпор фашыстам. Дапамагайце партызанам. Няхай смерць чакае фашыстаў на кожнай дарозе, у кожнай вёсцы! Рагачоўскі падпольны РК КП(б)Б».

Цяжка было размножыць гэту першую лістоўку, бо не было паперы і тэхнічных сродкаў. Аднак выручыў сувязны з Аляксандраўкі Ягор Балабаеў. Ён знайшоў у сябе дома некалькі лістоў паперы, і 14 лістовак было напісана ад рукі. Партызаны перадалі іх сувязным з просьбай размножыць і распаўсюдзіць сярод насельніцтва. Лягчэй стала распаўсюджваць лістоўкі, калі ўдалося знайсці і перапраўіць у атрад друкарскую машынку.

Наступная лістоўка з'явілася, калі фашысты расстралялі ў Рагачове тры тысячы мірных жыхароў. Лістоўкі, напісаныя на кардоне, расказвалі пра зверствы фашыстаў і пра іх лютую нянавісць да савецкіх людзей. Панёс гэтую лістоўку Дзмітрый Кахно ў в. Хмеліно, прымацаваў ля студні. Раніцай тут сабралася ўся вёска, людзі чыталі страшную вестку пра расправу над нявіннымі ахвярамі.

З мая 1942 г. райком устанавіў пастаянную радыёсувязь з Цэнтральным штабам партызанскага руху. Гэта давала магчымасць рэгулярна атрымліваць зводкі Саўінфармбюро. У жніўні таго ж года партызаны атрымалі першую пошту з Вялікай зямлі. Патроны, міны, зброю і, вядома, газеты «Правда», «Советская Белоруссия». Газеты абышлі ўсіх партызан атрада, зачытваліся да дзірак мясцовым насельніцтвам.

Ва ўсіх атрадах выходзілі баявыя лісткі. Яны выдаваліся адзін-два разы на тыдні. Матэрыялы пісалі партызаны, афармляла лісты спецыяльна выбраная рэдкалегія. Большасць артыкулаў была прысвечана ўзаемнай выручцы, адносінам партызан з насельніцтвам, партызанскай тактыцы. Артыкулы ў баявых лістках суправаджаліся малюнкамі.

У атрадах сярод партызан вельмі папулярнымі былі насценгазеты. Асабліва славіліся ілюстраваныя газеты 258-га партызанскага атрада, якія афармляў партызан Сяргей Раманавіч Раманаў.

З 1943 стала выходзіць раённая газета «Камунар». Рэдагаваў газету сакратар райкома партыі І. Ц. Зуевіч, дапамагала яму Ала Сафонава, наборшчыцай была Наташа Міхеева.

Добра памятаю нумар «Камунара» за 26 верасня 1943 г. Перадавы артыкул быў надрукаваны пад загалоўкам «На франтах Айчыннай вайны». У ім расказвалася, што Чырвоная Армія, разграміўшы фашыстаў на Курскай дузе, упэўнена набліжаецца да Беларусі. Аўтар артыкула рабіў вывад, што для таго, каб поспехі Чырвонай Арміі былі больш важкімі, партызанам трэба ўзмацніць удары па ворагу. У гэтым жа нумары друкаваўся матэрыял аб дыверсійнай рабоце групы Ф. Кавалёва, А. Добкіна, якія пусцілі пад адхон 13-ы эшалон. У жніўні 1943 г. партызаны грамілі Падсельскі гарнізон, правялі засадны бой у раёне Азяран. Гэтыя падзеі былі адзначаны ў асобных артыкулах.

«Камунар» распаўсюджваўся сярод партызан і мясцовага насельніцтва. Друкаваная прапаганда адыгрывала вялікую ролю ў барацьбе з фашызмам, мабілізуючы і натхняючы насельніцтва на актыўную барацьбу.

З успамінаў адказнага рэдактара часопіса «Камсамол Рагачоўшчыны» С. Галубкова

Камісар атрада выклікаў нас нечакана.

— Сядайце, таварышы, пагаворым,— запрасіў Аляксандр Мальцаў. Сяргей Раманаў, Навум Цэйтлін і я здзівіліся, калі камісар прапанаваў выпускаць рукапісны літаратурна-мастацкі часопіс. Справа здавалася незвычайнай. Але ў той жа час мы добра разумелі, што яна патрэбная і неабходная.

Сяргей Раманаў па прафесіі быў мастак. І ў партызанскім атрадзе, калі не было баёў, ён не расставаўся з алоўкам. Выпуск «баявых лісткоў», афармленне насценных газет — усё гэта было яго справай. Некаторыя партызаны нашага атрада пісалі вершы і нават паэмы. Так што кадры для часопіса знайсці можна было.

Разгарэлася спрэчка аб назве часопіса. Уносілі шмат прапаноў, але ў рэшце рэшт вырашылі назваць яго «Камсамол Рага-

чоўшчыны». Атрад наш быў камсамольска-маладзёжны, большасці байцоў не было яшчэ і 30 гадоў, ды і камандзір яшчэ не выйшаў з камсамольскага ўзросту. Так што назва ўсіх нас задаволіла.

Ідэя выпуску часопіса мяне захапіла. Я пачаў падбіраць сабе памочнікаў. Мы падрабязна расказалі партызанам пра часопіс і прасілі даваць свае матэрыялы. Пісаць ім артыкулы, вядома, не было часу, таму байцы ішлі да мяне і проста расказвалі эпізоды са свайго баявога жыцця. Найбольш цікавыя і значныя з іх клаліся потым у аснову артыкулаў.

Праз пэўны час матэрыялы для першага нумара былі адабраны, адрэдагаваны. Разведчыкі знайшлі паперу, фарбы, пэндалікі. Пётр Радчыкаў здолеў раздабыць нават каленкор для вокладкі.

Першы нумар часопіса выйшаў у снежні 1943 г. На вокладцы Сяргей Раманаў намаляваў партрэт М. І. Калініна. А побач мы змясцілі вытрымкі з яго артыкула аб партызанскай барацьбе.

У артыкуле камісара А. К. Мальцава «Аб гісторыі атрада» расказвалася, як быў створаны атрад, аб яго баявых традыцыях. Цікавымі былі артыкулы пра камандзіра атрада А. Галашчапава, камісара атрада.

Вялікую цікавасць у партызан выклікалі карэспандэнцыі і атрыкулы «Аднойчы ноччу», «Бой на Лазоўшчыне», «Адважная дваццатка», «На 247-м кіламетры», «Памяць сяброў», «Гібель разведчыка». Былі надрукаваны таксама ў часопісе вершы партызанскіх паэтаў. Так, Іван Лукашоў выступіў з паэмай «Але настане час». Яе з захапленнем чыталі партызаны, жыхары навакольных вёсак.

Часопіс «Камсамол Рагачоўшчыны» стаў у рады барацьбітоў за вызваленне роднай зямлі. Першы нумар яго захоўваецца ў Музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

З успамінаў былога літсупрацоўніка газеты «Партызан Гомельшчыны» Н. П. Касцючэнкі

У маі 1943 г. пасля перабазіравання 10-й Журавіцкай брыгады за Сож у кармянскія лясы пры штабе брыгады стала рэгулярна выходзіць газета «Партызан Гомельшчыны». У брыгадзе быў партатыўны друкарскі станок, набор шрыфтоў, паперы, якія даставіў дэсантнік Аляксандр Казіміраў. Ён жа быў рэдактарам і кіраўніком падпольнай друкарні. Набор-шчыкам і друкаром стаў Мікалай Кушцоў, праз мае рукі праходзілі ўсе матэрыялы, якія друкаваліся ў газеце і лістоўках. Мы выпусцілі больш за пяць тысяч экземпляраў газеты і лістовак, у іх асвятлялася становішча на франтах, баявыя справы партызан, друкаваліся заклікі да насельніцтва. Аднак не ўсё гладка складвалася ў рабоце нашай лясной друкарні. Вельмі хутка мы пачалі адчуваць востры недахоп паперы. Толькі дзякуючы партызанам-разведчыкам, якія, вяртаючыся з баявых заданняў, лічылі сваім абавязкам прыносіць хоць нейкую паперу, мы выжылі. Былі гэта і вучнёўскія сшыткі, і лісткі канторскіх кніг, аднак усё ішло ў справу — калі папера не падыходзіла для друкавання газеты, на ёй выпускаліся лістоўкі. Асабліва верным нашым памочнікам быў малады разведчык Аляксандр Дамасканаў, які трагічна загінуў у пачатку Кастрычніка 1943 года, напярэдадні злучэння асноўных сіл брыгады з часцямі Чырвонай Арміі.

У рэдакцыі газеты, у склад якой уваходзілі акрамя А. Казімірава камісар брыгады І. Дзікан і я, узнікла ідэя арганізаваць выпуск літаратурнага часопіса, у якім у мастацкай форме асвятляліся б баявыя справы і будні народных мсціўцаў. Да работы прыцягнулі партызанскіх паэтаў, пісьменнікаў, мастакоў. Сярод іх былі Пётр Бозікаў, Ермакоў, Хілінскі і іншыя. Матэрыялы друкаваліся на пішучай машынцы, ілюстраваліся малюнкамі і прашываліся. Выйшла ўсяго тры нумары часопіса. Усе тры нумары па аднаму экземпляру камісар брыгады пераслаў самалётам у Маскву ў штаб партызанскага руху.

Так, народныя мсціўцы, змагаючыся са зброяй у руках, ведалі цану друкаванага слова ў ваенных умовах і рабілі ўсё магчымае і немагчымае, каб яно было баявым, прыносіла людзям надзею на хуткае вызваленне.

Незабыўная сустрэча

З успамінаў К. М. Драчова, актыўнага ўдзельніка і кіраўніка партызанскага руху

Карп Міхайлавіч Драчоў нарадзіўся ў 1897 г. ў в. Казловічы Горацкага р-на. Са жніўня 1941 г. да 1944 г.— член падпольнага райкома партыі. У 1-м Рагачоўскім партызанскім атрадзе — старшына, потым палітрук роты, камісар, камандзір атрада. З верасня 1943 г.— камісар 10-й Журавіцкай партызанскай брыгады. Пасля вайны на савецкай рабоце. Узнагароджаны 2 ордэнамі,

медалямі. Ганаровы грамадзянін Рагачова. Памёр у 1988 г.

Чым бліжэй падыходзіў фронт, тым больш прыбаўлялася работы партызанам. Да канца верасня 1943 г. ўжо з'явілі-ся фашысцкія часці, якія адступалі. Партызаны мініравалі дарогі, завальвалі іх лесам, масты знішчалі, рабілі непраходнымі. Узрывалі, разбіралі, палілі тэхніку ворага. Сотнямі захоплівалі і знішчалі фашыстаў. Вялікую дапамогу аказвала і мясцовае насельніцтва, якое з набліжэннем фронту пайшло ў лес да партызан. Наша брыгада ўзяла пад сваю ахову і бліжэйшыя вёскі.

10-я партызанская брыгада наносіла адчувальныя ўдары па ворагу і на левым беразе Дняпра, дзе няспынна працавалі дыверсійныя групы атрадаў, і на левым беразе Сажа, дзе былі асноўныя сілы атрадаў гэтай брыгады.

Да канца верасня сувязь брыгады з дыверсійнымі групамі на левабярэжжы Дняпра перарвалася з-за таго, што нямецкае камандаванне на правым беразе стварыла абарончы рубеж. Прадбачачы, што такое можа здарыцца, для каардынацыі дзеянняў груп былі пакінуты прадстаўнікі камандавання атрадаў, яны працягвалі кіраваць на левабярэжжы самастойна.

А фронт падыходзіў усё бліжэй і бліжэй. Ужо ў зводках Саўінфармбюро з'яўляліся знаёмыя нам населеныя пункты. І вось збылося доўгачаканае, радаснае. Увечары 1 кастрычніка значная частка падраздзяленняў брыгады была накіравана ў засады на дарогі, дзе рухаліся адступаўшыя нямецкія часці. Другая частка заняла на ноч пазіцыі ў напрамку фронту. Выстаўлены наперад вартавыя пасты. Усё было гатова да бою на выпадак сустрэчы з ворагам у партызанскім лагеры.

У 10 гадзін вечара мы разам з камандзірам брыгады І. М. Гаўрылавым і начальнікам штаба брыгады П. К. Антонавым сабралі камандзіраў, камісараў і начальнікаў штабоў партызанскіх атрадаў брыгады, далі ўказанне быць кожную мінуту гатовым па трывозе ўступіць у бой з ворагам, калі ён апынецца паблізу лагера брыгады, а раніцай паспрабаваць любой цаной звязацца з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі.

Камандны састаў атрадаў, пакінуўшы сувязных у штабе брыгады, накіраваўся на занятыя атрадамі рубяжы. На ноч устаноўлены асобны пароль: «Затвор два», адказ «Аўтамат». Ноччу амаль ніхто не прылёг. Напружанне, як ніколі. Дзесьці побач павінна быць Чырвоная Армія. Выразна чутна ружэйная, кулямётная стральба то ў адным, то ў другім месцы. Затым гадзін у 12 ночы наступіла злавеснай цішыня. Ні аднаго выстралу.

У 7 гадзін раніцы 2 кастрычніка раздалася кулямётная чарга — трывога! Усе прыпалі да зброі, чакалі каманды «Да бою». Але стрэлаў больш не было, цішыня. Неадкладна да месца трывогі накіравалі двух сувязных высветліць яе прычыну. Вярнуўшыся, сувязныя далажылі, што насупраць заставы з'явіліся ланцугі салдат і пасля кулямётнага абстрэлу з боку партызан заляглі, але не адказваюць. Дадзена каманда падкінуць да заставы падмацаванне і весці ўзмоцненую разведку. Наступіла рашаючая мінута. Усе гатовы да бою. А атрымалася, як ніколі, проста.

З заставы пададзены пароль «Затвор два». Адказ таксама «Затвор два». Значыць, не сышоўся. Але адказваюць на рускай мове, значыць, магчыма, не немцы. Страляць ці не страляць?

Нарэшце, лопаецца цярпенне, і з заставы, ужо з напружаннем, падаецца апошняе папярэджанне: «Адказвай, хто. Пачынаю агонь». І замест пароля адказ: «Трыццаты полк Чырвонай Арміі». Быццам, свае. Верыцца і не верыцца. Выходзяць па двое ад «ваюючых бакоў». Няма сумнення — байцы Чырвонай Арміі.

І раптам — надрыўны голас з партызанскага боку: «Свае! Чырвоная Армія! Ура!»

Накіроўваемся да месца сустрэчы. Сустракаем камандзіра батальёна, які вёў наступленне ў нашым напрамку. Ён расказаў пра абстаноўку на фронце нашага ўчастка і ён жа ў сваю чаргу паведаміў па рацыі свайму камандаванню 260-й стралковай дывізіі пра сустрэчу з партызанамі. Дамовіліся, як арганізаваць сустрэчу. 10 гадзін раніцы. З крыкамі «Ура» каля 4000 партызан і партызанак нашай брыгады вырваліся на паляну — месца сустрэчы. Поціскі рук, абдымкі, пацалункі. Змяшаліся ўсе — і партызаны і байцы. Бясконцыя пытанні: хто, адкуль, а як там і г. д. Абмен сувенірамі, зброяй, усё на памяць. Больш гадзіны працягвалася хвалюючая, непаўторная сустрэча на паляне ля Гуты Асінаўскай. Цяжка апісаць. Гэта трэба бачыць сваімі вачамі — хвалюючую, радасную сустрэчу дзвюх армій — народных мсціўцаў і Чырвонай Арміі, якія вялі барацьбу з агульным ворагам у розных умовах...

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 24 ЛЮТАГА 1944 г.

На днях войска Первого Белорусского фронта перешли в наступление против немецко-фашистских войск, расположенных в районе Рогачева. Успешно форсировав реку Днепр, наши войска прорвали сильно укрепленную оборону противника на фронте 50 километров, за три дня напряженных боев продвинулись вперед на 20—25 километров и 24 февраля штурмом овладели городом и крупной железнодорожной станцией Рогачев — важным опорным пунктом противника на Бобруйском направлении, а также с боями заняли более 100 других населенных пунктов, в том числе крупные населенные пункты Новый Быхов, Лазаревичи, Виляховка, Верхняя и Нижняя Тощица, Кистени, Вищин, Дедово, Еленово, Мадоры, Селец, Старое Село, Озеране, Большая и Малая Коноплица, Заборово, Турск, Ходосевичи, Цупер, Луговая Варня, Кобыловка, и железнодорожную станцию Тощица. Нашими войсками полностью ликвидирован важный плацдарм немцев на левом берегу Днепра, восточнее Рогачева и Жлобина.

* * *

С. П. Аніщанка загінуў 31.7.1944 г. пры вызваленні Польшчы. Пахаваны ў населеным пункце Стрэбня Беластоцкага ваяводства. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г. Імя С. П. Аніщанкі прысвоена Шчадрынскай сярэдняй школе, дзе ён вучыўся, яго імем названа вуліца на радзіме — у в. Стэпы.

АРДАШОЎ Валянцін Кузьміч. Нарадзіўся 14.1.1925 г. ў в. Навасельск Уржумскага р-на Кіраўскай вобл. Рускі. Член КПСС з 1944. Да вайны працаваў слесарам. У Чырвонай Арміі са студзеня 1943. Камандзір стралковага аддзялення ст. сяржант В. К. Ардашоў вызначыўся ў лютым 1944 г. пры фарсіраванні Дняпра каля в. Вішчын Рагачоўскага р-на. Адзін з першых у палку ён пераправіўся цераз раку, уварваўся ва ўмацаваны апорны пункт ворага.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.7.1944. В. К. Ардашоў жыве ў Бранску.

АРОЛ Іван Якаўлевіч. Нарадзіўся 8.2.1914 г. ў с. Клішчанцы Чарнабаеўскага р-на Чаркаскай вобл. Украінец. Працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі з 1936 г. У 1942 г. скончыў артылерыйскія курсы. Камандзір артылерыйскай батарэі капітан І. Я. Арол вызначыўся ў чэрвені 1944 г. ў баях на тэрыторыі Гомельскай і Магілёўскай абласцей. 24.6.1944 г. батарэя пад яго камандаваннем фарсіравала р. Друць, знішчыла гармату, 25 кулямётных пунктаў, роту гітлераўцаў, дапамагала пяхоце палка прарваць варожую абарону каля Рагачова. 26.6.1944 г. байцы батарэі ўварваліся ў в. Побалава Рагачоўскага р-на.

І. П. Аляксееў.

С. П. Анішчанка.

В. К. Ардашоў.

І. Я. Арол.

27.6.1944 г. ў баі каля в. Варатынь Бабруйскага р-на І. Я. Арол быў смяротна паранены. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 25.9.1944 г. Пахаваны ў брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у в. Варатынь Бабруйскага р-на.

БАГАМОЛАЎ Мікалай Цімафеевіч. Нарадзіўся 10.8.1923 г. ў в. Аленьеўка Рцішчаўскага р-на Саратаўскай вобласці. Рускі. Член КПСС з 1944 г. Да вайны працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі з лютага 1942 г. Камандзір кулямётнага разліку ст. сяржант М. Ц. Багамолаў вызначыўся ў баі пры фарсіраванні р. Друць каля Рагачова. 24.6.1944 г. байцы пад яго камандаваннем адбілі 12 варожых контратак. 25.6.1944 г. раптоўным фланговым агнём прымусілі праціўніка адступіць, гэтым садзейнічалі далейшаму руху наперад нашых войск. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г.

Пасля вайны М. Ц. Багамолаў жыў і працаваў на радзіме. Памёр 27.9.1981 г.

БУЛАТАЎ Васіль Галямавіч. Нарадзіўся 15.9.1921 г. ў с. Ніжні Чэтай Балтасінскага р-на, Татарыя. Татарын. Член КПСС з 1944 г. Працаваў у Чыцінскай вобл. У Чырвонай Арміі з 1942 г. У 1944 г. скончыў Забайкальскае кулямётна-мінамётнае вучылішча. Мал. лейтэнант В. Г. Булатаў вызначыўся ў баях пры фарсіраванні р. Друць і прарыве варожай абароны каля Рагачова. Кулямётны ўзвод пад яго камандаваннем 24.6.1944 г. пераправіўся на правы бераг ракі, зайшоў у тыл непрыяцеля, знішчыў некалькі варожых агнявых пунктаў. 25.6.1944 узвод адбіў 3 контратакі праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г.

Пасля вайны працаваў у органах МУС. Заслужаны работнік МУС СССР. У 1961 г. скончыў Казанскі дзяржаўны універсітэт. Жыве ў Казані.

М. Ц. Багамолаў.

В. Г. Булатаў.

ВАСІЛЬЕЎ Іван Васілевіч. Нарадзіўся 23.11.1906 г. ў с. Пажарэвіцы Дзедавіцкага р-на Пскоўскай вобл. Рускі. Член КПСС з 1931 г. У Чырвонай Арміі з 1928 г. У 1933 г. скончыў Ленінградскае пяхотнае вучылішча. Полк пад камандаваннем І. В. Васільева з 24 да 29 чэрвеня 1944 г. вёў цяжкія баі, фарсіраваў р. Друць каля Рагачова, захапіў пераправы цераз Дабасну і Бярэзіну, што садзейнічала выхаду нашых войск да Бабруйска. Полк прычыніў значныя страты ворагу. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22.8.1944 г.

Да 1956 г. І. В. Васільеў служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Памёр 5.7.1962.

ВЕЛІКАКОНЬ Рыгор Іванавіч. Нарадзіўся 29.9.1920 г. ў с. Балаганаўка Шосткінскага р-на Сумскай вобл. Украінец. Член КПСС з 1943 г. Да вайны працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі з 1940 г., на фронце з 1941 г. Камандзір узвода ст. сяржант Р. І. Велікаконь вызначыўся 24.6.1944 г. каля в. Заполле Рагачоўскага р-на. Байцы пад яго камандаваннем гераічна змагаліся з фашыстамі пры прарыве абароны, фарсіраванні р. Друць, знішчылі батарэю, захапілі 4 гарматы, 4 аўтамашыны праціўніка.

І. В. Васільеў.

Р. І. Велікаконь.

В. А. Віхараў.

І. В. Гермашаў.

Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г.

Пасля вайны Р. І. Велікаконь жыў у г. Шостка Сумскай вобласці, працаваў на хімкамбінаце. Памёр 13.8.1982 г.

ВІХАРАЎ Васіль Аляксандравіч. Нарадзіўся 19.1.1905 г. ў в. Шчыпачова Растоўскага р-на Яраслаўскай вобл. Рускі. Член КПСС з 1929 г. У Чырвонай Арміі з 1927 г. На фронце з 1942 г. Камандзір батальёна 4-га матарызаванага пантонна-маставога палка маёр В. А. Віхараў вызначыўся ў чэрвені 1944 г. пры фарсіраванні Дняпра каля Рагачова. Над агнём ворага пантанёры пад яго камандаваннем за дзюе сутак навялі цераз Днепр мост. Прамым пападаннем снарада мост быў пашкоджаны. В. А. Віхараў асабістым прыкладам натхніў байцоў на аднаўленне пераправы. Пад агнём праціўніка быў пабудаваны мост цераз Друць. Пераправа савецкіх войск ішла бесперапынна. Загінуў В. А. Віхараў 24.6.1944 г. Пахаваны на вайсковых могілках у Рагачове. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г.

ГЕРМАШАЎ Іван Васілевіч. Нарадзіўся 24.11.1914 г. ў с. Вазнясенаўка Цаліннага р-на, Калмыкія. Рускі. Член КПСС з 1939 г. У 1936 г. скончыў педвучылішча, працаваў інструктарам Калмыцкага абкома партыі. У Чырвонай Арміі са снежня 1941 г. У 1942 г. скончыў Сталінградскае ваенна-палітычнае вучылішча. На фронце з красавіка 1942. Ст. лейтэнант І. В. Гермашаў вызначыўся 24.6.1944 г. ў баях каля в. Новыя Каласы Рагачоўскага р-на. Стралковы ўзвод пад яго камандаваннем уварваўся ў траншэі праціўніка, выбіў фашыстаў, што дало магчымасць дзвюм ротам палка прарваць варожую абарону. У баі І. В. Гермашаў замяніў камандзіра роты і разам з байцамі адбіў танкавую атаку ворага. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г.

Пасля вайны І. В. Гермашаў жыў у г. Астрахань, працаваў у сістэме МУС, падпалкоўнік. Памёр 15.8.1979 г.

ГРОМАЎ Аляксандр Ільіч. Нарадзіўся 2.8.1919 г. ў в. Чухіна Старыцкага р-на Цвярской вобл. Рускі. Член КПСС з 1943 г. Працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі з 1938 г. На фронце з чэрвеня 1941 г. Ст. сяржант А. І. Громаў вызначыўся ў баях за вызваленне Гомельскай вобл. 21.2.1944 г. гарматны разлік А. І. Громава ў ліку першых у палку фарсіраваў Днепр каля в. Вішчын Рагачоўскага р-на, у баях на подступах да Рагачова а адкрытай агнявой пазіцыі на беразе р. Друць знішчыў мінамётную батарэю. У гэтым баі быў цяжка паранены, але працягваў бой і асабіста знішчыў 2 варожыя кулямёты. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 1.7.1944 г.

Да 1946 г. А. І. Громаў служыў у Савецкай Арміі. Жыў у Ленінградзе. Памёр 14.4.1968 г.

ДАНІЛАЎ Пётр Аляксеевіч. Нарадзіўся 15.10.1915 г. ў с. Малая Агароўка Цёпла-Агароўскага р-на Тульскай вобл. Рускі. Член КПСС з 1937 г. У 1937 г. скончыў Іванькаўскі сельскагаспадарчы тэхнікум, быў на савецкай і камсамольскай рабоце. У Чырвонай Арміі з 1937 г. На фронце з 1941 г. Памочнік начальніка палітаддзела 3-й арміі па рабоце сярод камсамольцаў маёр П. А. Данілаў вызначыўся ў лютым 1944 г. пры фарсіраванні Дняпра. 21.2. 1944 г. каля Рагачова асабістым прыкладам падняў байцоў у атаку. Цяжка паранены, не пакінуў поля бою. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Доўск Рагачоўскага р-на. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.7.1944 г. Імем П. А. Данілава названа вуліца ў в. Доўск, сярэдняя школа ў с. Спаскае Цёпла-Агароўскага р-на, яго імя высечана на сцяне-стэле ў скверы Герояў у г. Тула.

ДАРОХІН Іван Мікітавіч. Нарадзіўся

А. І. Громаў.

П. А. Данілаў.

І. М. Дарохін.

Э. Б. Джумагулаў.

31.3.1924 г. ў с. Рэшатава-Дуброва Краснінскага р-на Ліпецкай вобл. Рускі. Член КПСС з 1943 г. Выхоўваўся ў дзетдоме ў г. Ялец. Вучыўся ў педагагічным інстытуце ў Ельцы. Працаваў настаўнікам у в. Дзярноўка Краснінскага р-на. У Чырвонай Арміі з чэрвеня 1942 г. У 1943 г. скончыў Растоўскае вучылішча самаходнай артылерыі. На фронце з сакавіка 1943 г. Камандзір самаходнай гарматы 713-га самаходнага артылерыйскага палка мал. лейтэнант І. М. Дарохін вызначыўся 24—25.6.1944 г. ў баі за в. Свяцое Возера Рагачоўскага р-на. Экіпаж знішчыў самаходную артылерыйскую ўстаноўку «фердынанд», 3 процітанкавыя гарматы, 2 мінамётныя батарэі, 3 кулямёты праціўніка, што садзейнічала паспяховаму наступленню войск. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Заполле Рагачоўскага р-на. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г.

ДЖУМАГУЛАЎ Эльмурза Біймурзаевіч. Нарадзіўся 16.11.1921 г. ў с. Карлан-Юрт Хасавюртаўскага р-на Дагестана. Кумык. Член КПСС з 1944 г. У 1940 г. скончыў курсы ветфельчараў, працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі з 1940 г. У 1942 г. скончыў курсы малодшых лейтэнантаў. Камандзір узвода 42-га асобнага танкавага палка ст. лейтэнант Э. Б. Джумагулаў вызначыўся 24.6.1944 г. Танкавы ўзвод пад яго камандаваннем пераправіўся цераз р. Друць каля Рагачова, перарэзаў шашу Рагачоў — Бабруйск, што садзейнічала паспяховаму наступленню савецкіх войск на Бабруйск. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 26.9.1944 г.

Да 1973 г. Э. Б. Джумагулаў служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Жыве на радзіме. Ганаровы грамадзянін г. Рагачоў. Імя Э. Б. Джумагулава носіць школа-інтэрнат у г. Хасавюрт.

ДРЫНЬ Савелій Рыгоравіч. Нарадзіўся 4.1.1912 г. ў в. Таўбозіна Унецкага р-на Бранскай вобл. Рускі. У Чырвонай Арміі з 1943 г. Стралок 740-га стралковага палка радавы С. Р. Дрынь вызначыўся ў баях за вызваленне Гомельскай вобл. 25.6.1944 г. ў крытычны момант бою за в. Святое Возера Рагачоўскага р-на разам з камандзірам роты ст. лейтэнантам В. С. Уткіным са звязкам супрацьтанкавых гранат кінуўся пад самаходную ўстаноўку «фердынанд». Цаной свайго жыцця воіны сарвалі контратаку праціўніка. Пахаваны ў г. Рагачоў на вайсковых могілках. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г.

ЖОЛУДЗЕЎ Віктар Рыгоравіч. Нарадзіўся 22.3.1905 г. ў г. Угліч Яраслаўскай вобл. Рускі. Член КПСС з 1942 г. У Чырвонай Арміі з 1921 г. Удзельнік баёў на КВЖД у 1929 г. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у Сталінградскай і Курскай бітвах. Вызначыўся ў Беларускай аперацыі. 24.6.1944 г. стралковы корпус пад камандаваннем генерал-маёра В. Р. Жолудзева фарсіраваў р. Друць у Рагачоўскім р-не, прарваў варожую абарону, перарэзаў шашу Магілёў — Бабруйск, фарсіраваў рэкі Ольса і Бярэзіна, вызваліў гарадскія пасёлкі Клічаў і Бераэіно, вёў наступленне ў напрам-

С. Р. Дрынь.

В. Р. Жолудзеў.

Я. П. Зайцаў.

Ю. М. Зыкаў.

В. Ф. Каленнікаў.

М. М. Кліменка.

ку Мінска, 3.7.1944 г. ўдзельнічаў у яго вызваленні. В. Р. Жолудзеў загінуў 21.7. 1944 г. ў баі каля г. Ваўкавыск. Пахаваны ў Ваўкавыску ў брацкай магіле савецкіх воінаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 11.11.1944 г. Імем В. Р. Жолудзева названы вуліцы ў г. Ваўкавыск, г. Валгаград, у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі экспануюцца матэрыялы пра яго, каля Ваўкавыскай сярэдняй школы № 1 установлены яго бюст, імя героя ўвекавечана ў Сталінградскім мемарыяле.

ЗАЙЦАЎ Якаў Паўлавіч. Нарадзіўся 6.1.1918 г. ў с. Нікольскае Усманскага р-на Ліпецкай вобл. Рускі. Член КПСС з 1947 г. У Чырвонай Арміі з 1938 г. Камандзір узвода процітанкавых ружжаў 336-га гвардзейскага стралковага палка мал. лейтэнант Я. П. Зайцаў вызначыўся пры вызваленні Гомельскай вобл. 21—24.2.1944 г. ўзвод пад яго камандаваннем фарсіраваў Дняпр каля Рагачова і першы ўварваўся ў горад. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 3.6.1944 г.

Пасля вайны Я. П. Зайцаў жыў і працаваў у г. Сочы. Памёр 19.5.1973 г.

ЗЫКАЎ Юрый Мікалаевіч. Нарадзіўся 15.11.1922 г. ў г. Бранск. Рускі. Член КПСС з 1943 г. У Чырвонай Арміі з 1940 г. Камандзір звяна, пасля намеснік камандзіра эскадрыллі штурмавога авіяпалка гв. ст. лейтэнант Ю. М. Зыкаў вызначыўся пры вызваленні Беларусі. З 1 па 25.10.1943 г. вадзіў групы самалётаў на штурмоўку ўмацаваных пунктаў праціўніка на правым беразе Дняпра ў Лоеўскім раёне. 16.12.1943 г. ў раёне в. Даманавічы Палескай вобл. з групай штурмаваў скапленне варожых танкаў, 3 знішчыў; 14.1.1944 г. ў раёне г. Калінкавічы з групай штурмавікоў знішчыў 50 аўтамашын і каля 200 гітлераўцаў, Ю. М. Зыкаў зрабіў 175 баявых вылетаў, знішчыў шмат варожай тэхнікі, у т. л. 18 самалётаў праціўніка на аэрадромах. Загінуў 21.2.1944 г. каля Рагачова. Пахаваны ў Маскве на Новадзявочых могілках. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 1.7. 1944 г.

КАВАЛЁЎ Піліп Іванавіч. Нарадзіўся 27.11.1916 г. ў в. Гайкоў Чэрыкаўскага р-на Магілёўскай вобл. Беларус. Працаваў у саўгасе, на заводзе ў Запарожжы, брыгадзірам Чэрыкаўскай МТС. У Чырвонай Арміі з 1939 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. На фронце з чэрвеня 1941 г. З чэрвеня 1942 г., пасля ранення, змагаўся ў тыле ворага на тэрыторыі Беларусі. З ліпеня 1943 г. камандзір групы падрыўнікоў 255-га партызанскага палка 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады. Удзельнічаў у падрыхтоўцы 13 дыверсійных груп, пусціў пад адхон 19 варожых эшалонаў з тэхнікай і жывой сілай праціўніка, падарваў 24 аўтамашыны, 9 шашэйных мастоў. Загінуў 17.3.1944 г. ў баі каля в. Перунова Кіраўскага р-на Магілёўскай вобл. Пахаваны ў в. Боркі Кіраўскага р-на. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.8.1944 г. Імем П. І. Кавалёва названа вуліца ў г. Чэрыкаў.

КАЛЕННІКАЎ Васіль Фёдаравіч. Нарадзіўся 10.1.1921 г. ў в. Насовічы Добрушскага р-на Гомельскай вобл. Беларус. Член КПСС з 1944 г. У Чырвонай Арміі з 1938 г. У 1939 г. скончыў Вольскую ваенную авіяцыйна-тэхнічную школу. З 1941 г. на фронце: авіямеханік, камандзір звяна, эскадрыллі, штурмавога авіяпалка. Удзельнік Курскай бітвы, вызвалення Гомеля, Рэчыцы, Рагачова, Бабруйска, Брэста, Варшавы, штурму Берліна. 21—22.2.1944 г. ст. лейтэнант В. Ф. Каленнікаў на чале групы штурмавікоў бамбіў варожую пераправу цераз Днепр каля Рагачова. За гады вайны забяспечыў 123 і здзейсніў 140 баявых вылетаў, збіў 5 самалётаў праціўніка, знішчыў шмат баявой тэхнікі

А. П. Кулясаў.

І. Р. Лядоўскі.

і жывой сілы праціўніка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.2.1945 г.

Да 1960 г. В. Ф. Каленнікаў служыў у Савецкай Арміі, падпалкоўнік. Жыве ў г. Астрахань.

КЛІМЕНКА Мікалай Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў с. Лушнікоўка Астрагожскага р-на Варонежскай вобл. Рускі. У Чырвонай Арміі з 1942 г. На фронце з 1942 г., ваяваў пад Сталінградам, Калініным, Вялікімі Лукамі, на Украіне, у Беларусі. Механік-вадзіцель самаходнай артылерыйскай установкі ст. сяржант М. М. Кліменка вызначыўся ў Рагачоўскім р-не. 25.6.1944 г. пры прарыве абароны праціўніка каля в. Забалацце гусеніцамі раздавіў 6 кулямётаў ворага, разлік самаходнай гарматы і першы ўварваўся ў вёску. Загінуў 25.6.1944 г. ў гэтым баі. Пахаваны ў в. Побалава Рагачоўскага р-на. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г.

КУЛЯСАЎ Аляксандр Пятровіч. Нарадзіўся 10.3.1919 г. ў с. Малы Толкіш Чыстапольскага р-на, Татарыя. Рускі. Член КПСС з 1943 г. Скончыў педвучылішча. Працаваў настаўнікам. У Чырвонай Арміі з 1939 г. У 1941 г. скончыў Вольскае ваенна-пяхотнае вучылішча. На фронце з 1942 г. Камандзір стралковага батальёна капітан А. П. Кулясаў вызначыўся пры вызваленні Рагачоўшчыны 24—25.6.1944 г., з батальёнам прарваў абарону праціўніка каля вёсак Азяраны, Вялікая Крушынаўка Рагачоўскага р-на, авалодаў вузлом супраціўлення, што прадвызначыла поспех бою. А. П. Кулясаў загінуў 25.6.1944 г. ў гэтым баі. Пахаваны ў в. Азяраны Рагачоўскага р-на. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г.

ЛЯДОЎСКІ Іван Рыгоравіч. Нарадзіўся 15.6.1920 г. ў с. Майсееўка Жалезінскага р-на Паўладарскай вобл. Рускі. Працаваў камбайнерам у калгасе. У Чырвонай Арміі з 1938 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. На фронце з 1941 г. Камандзір кулямётнага ўзвода ст. лейтэнант І. Р. Лядоўскі вызначыўся ў чэрвені 1944 г. ў Беларускай аперацыі. У час прарыву абароны праціўніка каля в. Азяраны Рагачоўскага р-на ўзвод пад яго камандаваннем агнём прыкрываў наступленне пяхоты. Каля в. Перавоз Бярэзінскага р-на Мінскай вобл. з байцом узвода пераплыў р. Бярэзіну, перацягнуў на левы бераг паром, гэтым садзейнічаў пераправе савецкіх воінаў і разгрому праціўніка на плацдарме. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г. Жыве ў г. Паўладар.

МАЛОДЗІКАЎ Міхаіл Рыгоравіч. Нарадзіўся 20.11.1902 г. ў в. Калугава Масальскага р-на Калужскай вобл. Рускі. Член КПСС з 1939 г. Працаваў у калгасе, затым на дрэваапрацоўчым камбінаце, майстрам школы ФЗН. У Чырвонай Арміі з 1939 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра ў Рагачоўскім р-не. 21.2.1944 г. стралковы ўзвод пад камандаваннем лейтэнанта М. Р. Малодзікава ў ліку першых пераправіўся цераз Днепр каля в. Вішчын, пераадолеў 2 мінныя палі, драцяную загароду, захапіў плацдарм і замацаваўся на ім. У баі М. Р. Малодзікаў замяніў выбыўшага са строю камандзіра роты, умела кіраваў боем. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.7.1944 г.

У 1949 г. М. Р. Малодзікаў звольнены ў запас, жыў і працаваў на радзіме, пасля ў г. Растоў-на-Доне. Памёр 2.11.1981 г.

МАМУТАЎ Хасан. Нарадзіўся 12.2.1922 г. ў с. Георгіеўка Ленгерскага р-на Чымкенцкай вобл. Казах. Член КПСС з 1944 г. Да вайны працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі з сакавіка 1942 г. Кулямётчык 336-га гвардзейскага стралковага палка радавы Х. Мамутаў вызначыўся пры вызваленні Гомельскай вобл. 21.2.1944 г. ў ліку першых пераправіўся цераз Днепр і каля в. Кісцяні Рагачоўскага р-на знішчыў 7 агнявых пунктаў праціўніка. У баі за Рагачоў першы ўварваўся ў варожую траншэю. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 3.6.1944 г. Жыве ў г. Алма-Ата. Ганаровы грамадзянін Рагачова.

ПРЫХОДЗЬКА Пётр Сяргеевіч. Нарадзіўся 8.11.1918 г. ў г. Крамянчуг Палтаўскай вобл. Украінец. Член КПСС з 1942 г. Быў музыкантам. У Чырвонай Арміі з 1939 г. На фронце з 1941 г. Камандзір кулямётнага ўзвода ст. сяржант П. С. Прыходзька вызначыўся ў чэрвені 1944 г. ў час прарыву абароны

Х. Мамутаў.

П. С. Прыходзька.

Г. С. Размадзе.

А. Г. Сафонаў.

праціўніка ў Гомельскай вобл. Пры фарсіраванні савецкімі войскамі р. Друць каля Рагачова быў пашкоджаны штурмавы мост. Пераправіўшыся цераз раку, П. С. Прыходзька на чале ўзвода пад агнём праціўніка аднавіў мост. У баі за плацдарм агнём з кулямёта падтрымліваў наступленне пяхоты. У гэтым баі быў цяжка паранены, памёр 26.6.1944 г. Пахаваны ў в. Заполле Рагачоўскага р-на. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г. Яго імем названа сярэдняя школа № 1 у г. Крамянчуг.

РАЗМАДЗЕ Галакціён Самсонавіч. Нарадзіўся 21.8.1913 г. ў с. Цмендауры Онскага р-на, Грузія. Грузін. Член КПСС з 1941 г. У 1934 г. скончыў Кутаіскі сельскагаспадарчы тэхнікум, працаваў аграномам. У Чырвонай Арміі ў 1935—38 гг. Удзельнік баёў каля возера Хасан у 1938 г. У 1940 г. скончыў Тбіліскую школу МУС, працаваў следчым. У 1942 г. скончыў курсы палітрукоў. Са жніўня 1942 г. на фронце. Вызначыўся ў баях пры вызваленні Гомельскай і Магілёўскай абласцей. 21.2.1944 г. рота пад камандаваннем капітана Г. С. Размадзе адной з першых фарсіравала Днепр каля Рагачова, захапіла плацдарм і ўпарта ўтрымлівала яго, што садзейнічала паспяховай пераправе іншых падраздзяленняў. 23.2.1944 г. ў баі за чыгуначную станцыю Тошчыца рота адбіла 5 контратак праціўніка. Тройчы паранены Г. С. Размадзе не пакінуў поля бою. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.7.1944 г.

Да 1946 г. Г. С. Размадзе служыў у Савецкай Арміі. Жыў у г. Масква. Памёр у 1990 г.

САФОНАЎ Анатоль Георгіевіч. Нарадзіўся 20.11.1921 г. ў в. Чэртан Дуванскага р-на, Башкірыя. Рускі. Член КПСС з 1943 г. Скончыў Уфімскі геолагаразведачны тэхнікум. Працаваў геолагам. У Чырвонай Арміі з 1939 г. У 1941 г. скончыў пагранічнае вучылішча. На фронце з 1941 г. Камандзір роты ст. лейтэнант А. Г. Сафонаў вызначыўся ў баях за вызваленне Гомельскай вобл. 24.6.1944 г. рота пад агнём праціўніка фарсіравала р. Друць каля в. Заполле Рагачоўскага р-на, захапіла плацдарм і ўтрымлівала яго да падыходу падмацавання. А. Г. Сафонаў загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Блезніцы Рагачоўскага р-на. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г. Імем А. Г. Сафонава названа вуліца ў в. Мясагутава Дуванскага р-на.

ТУРБІН Віктар Андрэевіч. Нарадзіўся 9.11.1923 г. ў г. Баброў Варонежскай вобл. Рускі. Член ВЛКСМ. У Чырвонай Арміі з 1941 г. У 1942 г. скончыў Ульянаўскае ваеннае пяхотнае вучылішча. На фронце з 1942 г. Камандзір стралковага ўзвода мал. лейтэнант В. А. Турбін вызначыўся ў баях за вызваленне Гомельскай вобл. 24.6.1944 г. на чале ўзвода пераправіўся цераз р. Друць каля в. Калясы Рагачоўскага р-на. Байцы захапілі плацдарм, уварваліся ў варожыя траншэі, дэзарганізавалі сістэму агню праціўніка, адбілі 4 контратакі. В. А. Турбін загінуў у баі 18.8.1944 г. Пахаваны ў в. Вількава Беластоцкага ваяводства Польшчы. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г. Імем В. А. Турбіна названа вуліца ў г. Баброў.

УЛЬЯНІН Фёдар Іванавіч. Нарадзіўся ў сакавіку 1945 г. ў с. Балтуноўка Хвалынскага р-на Саратаўскай вобл. Рускі. Член КПСС з 1942 г. Працаваў на шахце ў Карагандзе. У Чырвонай Арміі з 1936 г. Удзельнічаў у баях каля возера Хасан у 1938 г. Камандзір батальёна маёр Ф. І. Ульянін вызначыўся пры вызваленні Рагачоўскага р-на. 24.6.1944 г. батальён пад яго камандаваннем фарсіраваў р. Друць. Воіны захапілі вышыню, адбілі 4 контратакі праціўніка, вызвалілі вёскі Заполле, Хапаны. 26.6.

В. А. Турбін.

Ф. І. Ульянін.

І. Р. Усацюк.

В. С. Уткін.

1944 г. батальён пераправіўся цераз р. Дабасна, на захопленым плацдарме адбіў некалькі контратак. Цяжка паранены Ф. І. Ульянін кіраваў батальёнам. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Дварэц Рагачоўскага р-на. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г. Імем Ф. І. Ульяніна названа вуліца ў в. Дварэц, у яго гонар с. Балтуноўка перайменавана ў с. Ульяніна.

УСАЦЮК Іван Раманавіч. Нарадзіўся 24.6.1917 г. ў пас. Аджамаўка Хабарскага р-на Алтайскага краю. Рускі. Член КПСС з 1943 г. Працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі з 1938 г. На фронце з чэрвеня 1941 г. Наводчык гарматы 1018-га стралковага палка сяржант І. Р. Усацюк вызначыўся ў баях за вызваленне Гомельскай і Магілёўскай абласцей. 24.6.1944 г. ў час прарыву варожай абароны на р. Друць каля Рагачова агнём з гарматы знішчыў некалькі агнявых варожых пунктаў, гэтым садзейнічаў руху пяхоты і захопу першай лініі абароны праціўніка. 30.6. 1944 г. ў баі за в. Краснае Бабруйскага р-на разлік гарматы загінуў. І. Р. Усацюк адзін адбіў контратаку гітлераўцаў, якія спрабавалі вырвацца з акружэння. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 26.10. 1944 г.

Пасля вайны І. Р. Усацюк працаваў старшынёй сельсавета на радзіме. З 1965 г. жыў у г. Магнітагорск. Памёр у 1987 г.

УТКІН Валерый Сцяпанавіч. Нарадзіўся 14.1.1922 г. ў с. Алюшына Сасаўскага р-на Разанскай вобл. Рускі. У 1941 г. скончыў Маскоўскі інструментальна-зварачны тэхнікум, працаваў электразваршчыкам на чыгунцы. У Чырвонай Арміі з 1941 г. Скончыў курсы малодшых лейтэнантаў. На фронце з лістапада 1941 г. Камандзір стралковай роты ст. лейтэнант В. С. Уткін вызначыўся ў баях за вызваленне Гомельскай вобл. 25.6.1944 г. ў крытычны момант бою за в. Святое Возера разам з С. Р. Дрынем са звязкам супрацьтанкавых гранат кінуўся пад самаходную ўстаноўку «фердынанд». Цаной свайго жыцця воіны сарвалі контратаку праціўніка. Пахаваны ў г. Рагачоў на вайсковых могілках. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г.

ФОГЕЛЬ Ян Янавіч. Нарадзіўся 24.12. 1898 г. ў с. Дурэ Гулбенскага р-на Латвіі. Латыш. Член КПСС з 1941 г. У Чырвонай Арміі з 1918 г. У 1933 г. скончыў Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзе. Камандзір 120-й гв. стралковай дывізіі генерал-маёр Я. Я. Фогель вызначыўся ў Беларускай аперацыі. У 2-й палавіне лютага 1944 г. дывізія фарсіравала Днепр і ва ўзаемадзеянні з іншымі злучэннямі 3-й арміі прарвала добра ўмацаваную абарону нямецка-фашысцкіх войск і 24.2. 1944 г. вызваліла Рагачоў. Дывізія вызначылася ў гэтых баях і атрымала ганаровае найменне «Рагачоўская». Дывізія да 8.7.1944 г. з баямі вызваліла больш за 250 населеных пунктаў. Я. Я. Фогель памёр ад ран 9.7.1944 г. Пахаваны ў г. п. Дзятлава Гродзенскай вобл. на брацкіх могілках савецкіх воінаў і партызан, дзе яму пастаўлены абеліск. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 10.4.1945 г. Імем Я. Я. Фогеля названы вуліцы ў Мінску, г. п. Дзятлава (і завулак), в. Малюшычы Карэліцкага р-на. За 2,5 км на паўночны ўсход ад в. Малюшычы, дзе ён быў смяротна паранены, установлены памятны знак.

ХМЕЛЬ Іван Іванавіч. Нарадзіўся ў 1917 г. ў г. Стары Аскол Белгародскай вобл. Рускі. Член КПСС з 1943 г. Працаваў на адным з прадпрыемстваў горада. У Чырвонай Арміі з 1939 г. На фронце з чэрвеня 1941 г. Камандзір роты ст. лейтэнант І. І. Хмель вызначыўся пры вызваленні Гомельскай вобл. 20.2.1944 г. рота пад яго камандаваннем фарсіравала Днепр каля в. Вішчын Рагачоўскага

Я. Я. Фогель.

І. І. Хмель.

М. К. Чупілка.

М. М. Шчукін.

р-на, байцы ўварваліся ў траншэі праціўніка, захапілі 4 гарматы і выз-валілі вёску. У час контратакі фашыстаў 21.2.1944 г. І. І. Хмель загінуў. Па-хаваны ў в. Вішчын Рагачоўскага р-на. Званне Героя Савецкага Саю-за прысвоена 3.6.1944 г. Імем І. І. Хме-ля названа вуліца ў г. Стары Аскол, яго імя прысвоена школе, дзе ён вучыўся.

ЧУГАЕЎ Анатоль Сяргеевіч. Нарадзіў-ся 30.11.1920 г. ў г. Архангельск. Рускі. Член КПСС з 1944 г. Да вайны працаваў на суднарамонтным заводзе. У Чырвонай Арміі з 1940 г. Камандзір роты капітан А. С. Чугаеў вызначыўся пры фарсіра-ванні Дняпра. У ноч на 24.6.1944 г. з ротай пераправіўся на правы бераг ракі каля в. Задруцце Рагачоўскага р-на. Байцы за-хапілі плацдарм, замацаваліся на ім, вялі бой з фашыстамі, прыкрываючы пераправу нашых войск. У час штурму ўмацаванай абароны праціўніка А. С. Чу-гаеў падняў байцоў у атаку. У выніку рашучых дзеянняў гітлераўцы адступілі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г. Жыве ў г. Чэлябінск.

ЧУПІЛКА Міхаіл Купрыянавіч. На-радзіўся 15.8.1912 г. ў в. Гараб'ёўка Канеўскага р-на Чаркаскай вобл. Украі-нец. Да вайны жыў у Крыме, працаваў трактарыстам у саўгасе. У Чырвонай Арміі з 1941 г. Скончыў паскораныя курсы санінструктараў, удзельнічаў у ба-ях у Севастопалі і на Каўказе. Быў паранены. Пасля вучыўся ў школе меха-нікаў-вадзіцеляў самаходных артылерый-скіх установак у г. Кіраў. Вызначыўся пры вызваленні Рагачоўскага р-на. 24.6. 1944 г. ў баях за вёскі Каласы, Кала-тоўка, Скачкі і Побалава агнём падтрымлі-ваў наступленне пяхоты. У час бою за в. Побалава над агнём праціўніка на вялі-кай скорасці правёў установку цераз р. Дабасна па мосце, які гітлераўцы рыхтаваліся ўзарваць, чым забяспечыў пераправу астатнім падраздзяленням. У баі замяніў параненага камандзіра ўстаноўкі.

Загінуў М. К. Чупілка ў баі 24.7.1944 г. ў Беластоцкай вобл. Пахаваны ў г. Бяроза Брэсцкай вобл. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г. Імя М. К. Чупілкі носіць школа ў в. Макарава Данілаўскага р-на Яраслаўскай вобл.

ШЧУКІН Мікалай Мітрафанавіч. На-радзіўся 12.12.1922 г. ў с. Баравінка Заводкаўскага р-на Цюменскай вобл. Рускі. Скончыў Чарнігаўскае ваенна-інжынернае вучылішча. На фронце з лю-тага 1943 г. Камандзір сапёрнага ўзвода ст. лейтэнант М. М. Шчукін вызначыўся пры вызваленні Гомельскай вобл. 23—24.6.1944 г. пад ураганным агнём за 300 м ад траншэі ворага з узводам будаваў мост цераз р. Друць каля Рагачова. Узвод панёс вялікія страты, М. М. Шчукін быў пара-нены, але не пераставаў працаваць, мост быў пабудаваны ў тэрмін. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.8.1944 г. Пры размініраванні Балтыйскага ўзбя-рэжжа ў чэрвені 1945 г. М. М. Шчукін быў цяжка паранены і 18.6.1945 г. памёр. Пахаваны ў г. Мамонава Калінінград-скай вобл. Яго імем названы рыбалавецкі пасёлак у Калінінградскай вобл., калгас на радзіме, завод у г. Мамонава.

Землякі-героі

БЕЛАВУСАЎ Андрэй Мінавіч. Поўны кавалер ордэна Славы. Нарадзіўся 2.10. 1906 г. ў в. Ходасавічы Рагачоўскага р-на. Беларус. Працаваў у калгасе. У Айчын-ную вайну ўдзельнік партызанскага руху на Гомельшчыне. З чэрвеня 1944 г. на

А. М. Белавусаў.

У. С. Вялічка.

П. Е. Жгіроў.

Г. П. Ісакаў.

фронце, сапёр. Вызначыўся ў баях на тэрыторыі Польшчы і Германіі. 14.1.1945 г. ў час прарыву варожай абароны ў раёне Віслы ў складаных абставінах зняў 42 міны. У лютым 1945 г. пераправіў цераз Одэр 400 скрынак боепрыпасаў, 1,5 т прадуктаў. 10.3.1945 г. на чале групы байцоў зрабіў 2 праходы ў мінных палях, у час наступлення зняў 150 мін. 15—16.4.1945 г. зрабіў праходы ў мінных палях, зняў 30 мін, размініраваў шашу ў напрамку г. Франкфурт-на-Одэры, зняў 32 міны. 25.4.1945 г. ўзначальваў групу сапёраў пры пабудове моста цераз канал, што садзейнічала поспеху наступлення савецкіх войск.

Пасля вайны А. М. Белавусаў жыў на радзіме ў в. Ходасавічы, працаваў у калгасе. Памёр 18.11.1976 г.

ВЯЛІЧКА Уладзімір Сідаравіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў с. Новакраснае Арбузінскага р-на Мікалаеўскай вобл. Рускі. Да вайны жыў у г. Рагачоў. У Чырвонай Арміі з 1941 г. Скончыў Гомельскае ваеннае пяхотнае вучылішча. На фронце з 1942 г. Камандзір мінамётнай роты ст. лейтэнант У. С. Вялічка вызначыўся пры вызваленні Украіны. 25.9.1943 г. на чале роты пад агнём гітлераўцаў фарсіраваў Днепр каля с. Пекары Канеўскага р-на Чаркаскай вобл. Байцы занялі зручную агнявую пазіцыю, знішчылі 5 агнявых кропак праціўніка, што садзейнічала паспяховай пераправе нашых галоўных сіл. У баях 27 верасня У. С. Вялічка мінамётным агнём паспяхова адбіваў варожыя атакі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 3.6.1944 г. Прапаў без вестак 29.10.1944 г.

ГУСАРАЎ Рыгор Андрэевіч. Нарадзіўся 6.2.1906 г. ў в. Алешня Рагачоўскага р-на. Рускі. Да вайны жыў у в. Холма Назараўскага р-на Краснаярскага краю, працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі са жніўня 1941 г., на фронце з верасня 1941 г. Камандзір аддзялення гв. сяржант Р. А. Гусараў вызначыўся 28.9.1943 г. пры фарсіраванні Дняпра. 4.10.1943 г. ў баі каля в. Мішурын Рог Верхнедняпроўскага р-на Днепрапятроўскай вобл. замяніў выбыўшага са строю камандзіра ўзвода. Дзейнічаў умела, байцы ўзвода занялі найбольш выгадны рубеж, адбілі контратакі праціўніка, што садзейнічала паспяховай пераправе іншых падраздзяленняў палка. Загінуў 23.12.1943 г. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 22.2.1944 г.

ЖГІРОЎ Піліп Ерафеевіч. Нарадзіўся 11.11.1911 г. ў в. Гута Рагачоўскага р-на. Беларус. Член КПСС з 1941 г. Да вайны працаваў у калгасе. У Чырвонай Арміі з 1933 г. У 1939 г. скончыў Маскоўскае ваенна-пяхотнае вучылішча, удзельнік баёў на р. Халхін-Гол у 1939 г. З 1942 г. на Сталінградскім, Данскім, Бранскім, Цэнтральным і 1-м Беларускім франтах. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра каля в. Вялле Брагінскага р-на. У ноч на 28.9.1943 г. гв. стралковы полк, начальнікам штаба якога быў маёр П. Е. Жгіроў, пад агнём праціўніка пераправіўся на правы бераг Дняпра, выбіў фашыстаў з траншэй, прасунуўся на 6 км і стварыў плацдарм, на які пераправіліся іншыя вайсковыя часці. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.1.1944 г.

Пасля вайны П. Е. Жгіроў працягваў службу ў Савецкай Арміі. У 1947 г. скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе, у 1955 г. Ваенную акадэмію Генштаба. У 1963 г. генерал-маёр П. Е. Жгіроў звольнены ў запас. Жыве ў г. Санкт-Пецярбург.

ІСАКАЎ Георгій Пятровіч. Нарадзіўся 11.2.1896 г. ў в. Вялікая Крушынаўка Рагачоўскага р-на. Беларус. Член КПСС з 1944 г. У 1915 г. скончыў Рагачоўскае рэальнае вучылішча, у 1929 г. БДУ, у 1930 г. курсы «Выстрал». З 1915 г. ў

Р. С. Кавалёў.

В. М. Калеснікаў.

К. Н. Осіпаў.

М. П. Пацееў.

арміі, з красавіка 1918 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнік грамадзянскай вайны на Заходнім фронце. У 1922—24 гг. працаваў намеснікам старшыні выканкома Рагачоўскага павятовага Савета, у 1924—32 гг. быў на прафсаюзнай і савецкай рабоце ў Мінску. З 1932 г. начальнік управўлення Камітэта нарыхтовак пры СНК БССР. У 1941 г. скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе. Са жніўня 1941 г. на Заходнім, Сталінградскім, Данскім, 3-м Беларускім і інш. франтах — камандзір палка, брыгады, дывізіі, генерал-маёр. Вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра на поўдзень ад Краменчуга Палтаўскай вобл. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 23.10.1943 г.

Да 1955 г. Г. П. Ісакаў служыў у Савецкай Арміі, быў начальнікам ваенных кафедраў Тартускага універсітэта і Эстонскай сельскагаспадарчай акадэміі. Памёр 4.2.1961 г., пахаваны ў г. Рыга.

КАВАЛЁЎ Рыгор Сямёнавіч. Нарадзіўся 8.5.1902 г. ў в. Вялікая Крушынаўка Рагачоўскага р-на. Беларус. Член КПСС з 1925 г. У Чырвонай Арміі ў 1924—28 гг. Да вайны працаваў на радзіме аб'ездчыкам у лясніцтве, старшынёй калгаса. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г. У Айчынную вайну партызан 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады. З ліпеня 1944 г. на 3-м Беларускім фронце. Стралок мотастралковай брыгады сяржант Р. С. Кавалёў вызначыўся пры вызваленні Літвы. 18.8.1944 г. ў баі за вышыню каля г. Шаўляй батальён пяхоты праціўніка пры падтрымцы 23 танкаў і 9 бронетранспарцёраў перайшоў у контратаку. Савецкія воіны падбілі некалькі танкаў, але астатнія рухаліся наперад. І тады Р. С. Кавалёў са звязкам гранат кінуўся пад танк. Натхнёныя яго подзвігам, савецкія воіны адбілі контратаку фашыстаў. Пахаваны Р. С. Кавалёў на ваенных могілках у населеным пункце Гінкунай Шаўляйскага р-на. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г.

КАЛЕСНІКАЎ Віталій Міхайлавіч. Нарадзіўся 15.8.1922 г. ў г. Рагачоў. Член КПСС з 1944 г. Да вайны вучыўся ў Рагачоўскім педагагічным інстытуце. У Чырвонай Арміі з лютага 1941 г. З чэрвеня 1941 г. на Заходнім, Бранскім, Цэнтральным і інш. франтах. Удзельнік абарончых баёў у Мінскай і Магілёўскай абласцях, Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Беларусі, Польшчы, баёў на тэрыторыі Германіі. Камандзір стралковага ўзвода гв. мал. лейтэнант В. М. Калеснікаў вызначыўся ў баях за г. Чарнігаў і пры фарсіраванні Дняпра ў Камарынскім р-не Палескай вобл. 28.9.1943 г. ў час бою ўзначаліў роту, якая пад агнём гітлераўцаў пераправілася на правы бераг Дняпра. За 2 дні рота адбіла 16 атак ворага. Прарваўшы абарону праціўніка, рота прасунулася наперад на 6 км, вызваліла в. Вялле. У баях за в. Галкі байцы адбівалі ў дзень па 3—4 контратакі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.1.1944 г.

Пасля вайны В. М. Калеснікаў служыў у Савецкай Арміі. У 1952 г. скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе, у 1961 г. Ваенную акадэмію Генштаба. Памёр 27.11.1964 г., пахаваны ў г. Рагачоў на вайсковых могілках. Імем В. М. Калеснікава названа вуліца ў Рагачове, яго імя было прысвоена піянерскай дружыне сярэдняй школы № 4 Рагачова.

ОСІПАЎ Кірыла Нічыпаравіч. Нарадзіўся 15.2.1907 г. ў в. Збароў Рагачоўскага р-на. Беларус. Член КПСС з 1931 г. Быў на камсамольскай рабоце ў Жлобіне. У Чырвонай Арміі з 1929 г. У 1935 г. скончыў артылерыйскае вучылішча. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Айчынную вайну на фронце з чэрвеня 1941 г. Сакратар партбюро артылерыйскага палка ст. па-

Ц. А. Пачтароў.

А. Ф. Самусеў.

літрук К. Н. Осіпаў у складзе групы войск генерал-лейтэнанта І. В. Болдзіна з баямі прабіваўся з акружэння на тэрыторыі Беларусі. У жніўні 1941 г. перайшоў лінію фронту, наладзіў сувязь з камандуючым 19-й арміяй І. С. Коневым, удзельнічаў у распрацоўцы і ажыццяўленні плана для злучэння групы І. В. Болдзіна з часцямі Чырвонай Арміі. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.8.1941 г. У 1942—43 гг. К. Н. Осіпаў у штабе партызанскага руху пры ваенсавеце Заходняга фронту. З 1944 г. на фронце. Удзельнік вызвалення Беларусі, баёў на тэрыторыі Усходняй Прусіі, на Далёкім Усходзе, супраць Японіі.

Да 1955 г. К. Н. Осіпаў служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Жыў у Гомелі. Памёр 16.8.1975 г. Пахаваны ў Гомелі на Давыдаўскіх могілках. Імем К. Н. Осіпава названа вуліца ў Гомелі, яго імя было прысвоена піянерскай дружыне васьмігадовай школы ў в. Збароў, дзе ў музеі баявой і працоўнай славы яму прысвечаны стэнд; яго партрэт устаноўлены на алеі Герояў каля Кургана Славы ў Рагачове.

ПАЦЕЕЎ Мікалай Паўлавіч. Нарадзіўся 16.5.1919 г. ў г. Рагачоў. Рускі. Член КПСС з 1943 г. У 1938 г. скончыў Ленінградскі машынабудаўнічы тэхнікум, працаваў на Ленінградскім трубным заводзе. У Чырвонай Арміі з 1939 г. З чэрвеня 1941 г. на Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, Сталінградскім, Бранскім, 1-м Прыбалтыйскім, 3-м Беларускім франтах. Удзельнічаў у вызваленні Беларусі, Літвы, Латвіі. 17.9.1944 г. танкавая рота лейтэнанта М. П. Пацеева заняла абарону на захад ад г. Мітава (цяпер г. Елгава, Латвія) і ўступіла ў бой з намнога большымі сіламі праціўніка. На працягу 4 сутак воіны адбілі 28 контратак. М. П. Пацееў з экіпажам знішчыў 9 танкаў. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 24.3.1945 г.

Да 1970 г. М. П. Пацееў служыў у Савецкай Арміі, падпалкоўнік. Жыў у г. Лунінец Брэсцкай вобл., у Мінску. Памёр 27.9.1972 г., пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

ПАЧТАРОЎ Цімафей Аляксеевіч. Нарадзіўся 3.11.1913 г. ў в. Каласы Рагачоўскага р-на. Беларус. Член КПСС з 1940 г. У Чырвонай Арміі з 1934 г. У 1938 г. скончыў Севастопальскае ваенна-марское вучылішча. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Айчынную вайну ўдзельнічаў у абароне Ленінграда. Са жніўня 1945 г. афіцэр-аператар берагавой артылерыі штаба Петрапаўлаўскай ваенна-марской базы Ціхаакіянскага флоту. Вызначыўся ў савецка-японскай вайне 1945 г. 18.8.1945 г. батальён марской пяхоты пад камандаваннем маёра Ц. А. Пачтарова паспяхова высадзіўся на востраў Шумшу, захапіў прыбярэжныя абарончыя збудаванні, штаб варожага батальёна, адбіў 3 контратакі, чым забяспечыў плацдарм для высадкі галоўных сіл дэсанта. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 14.9.1945 г.

Да 1957 г. Ц. А. Пачтароў служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Жыве ў г. Сестрарэцк Санкт-Пецярбургскага гарсавета. Яго імем названы мыс на востраве Шумшу.

САМУСЕЎ Андрэй Фёдаравіч. Нарадзіўся 5.10.1908 г. ў в. Высокае Рагачоўскага р-на. Беларус. Член КПСС з 1954 г. У Айчынную вайну на фронце з 1941 г., мінамётчык. Вызначыўся 15.10.1943 г. пры фарсіраванні Дняпра каля г. п. Лоеў Гомельскай вобл. Першы ў роце пераправіўся цераз раку, у рукапашным баі за плацдарм знішчыў некалькі гітлераўцаў, садзейнічаў паспяховай пераправе падраздзяленняў палка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 30.10.1943 г.

Пасля вайны А. Ф. Самусеў жыў на радзіме, працаваў старшынёй калгаса. Памёр 8.5.1965 г. Пахаваны ў в. Высокае Рагачоўскага р-на на вайсковых могілках.

СКРЫГАНАЎ Вікенцій Васілевіч. Нарадзіўся 22.6.1903 г. ў в. Надзейкавічы Рагачоўскага р-на. Беларус. Член КПСС з 1925 г. У Чырвонай Арміі з 1920 г. У 1925 г. скончыў пяхотную школу, у 1938 г.— Ваенную акадэмію імя Фрунзе. Удзельнік грамадзянскай вайны. У 1922—35 гг. у войсках БВА. У Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім, Паўднёвым, Закаўказскім, Паўночна-Каўказскім, Паўднёва-Заходнім, 3-м, 2-м, 1-м Украінскіх франтах. У студзені 1945 г. гвардзейская стралковая дывізія пад камандаваннем

В. В. Скрыганаў.

А. П. Сярогін.

М. В. Філімонаў.

генерал-маёра В. В. Скрыганава прарвала абарону ворага на захад ад г. Сандамір (Польшча) і за 11 дзён з баямі прайшла 264 км, фарсіравала р. Одэр, нанесла вораґу вялікія страты ў жывой сіле і тэхніцы. У баі быў цяжка паранены, памёр 26.1.1945 г. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 6.4.1945 г. Пахаваны ў г. Львоў. Яго імем названы вуліцы ў Мінску і в. Надзейкавічы Рагачоўскага р-на.

СЯРОГІН Аляксандр Паўлавіч. Нарадзіўся 30.8.1906 г. ў в. Балдасоўка Ферзікаўскага раёна Калужскай вобласці. Рускі. Член КПСС з 1932 г. У Чырвонай Арміі з 1928 г. У 1941 г. скончыў Вышэйшую афіцэрскую школу штабной службы. На фронце з 1942 г. Вызначыўся ў баях за вызваленне Камарынскага р-на Палескай вобл. 28.9.1943 г. полк пад камандаваннем гв. падпалкоўніка А. П. Сярогіна пад агнём праціўніка фарсіраваў Днепр, прарваў абарону, замацаваўся на плацдарме, адбіў контратакі ворага і вызваліў вёскі Вялле і Галкі Брагінскага р-на. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 15.1.1944 г.

Пасля вайны А. П. Сярогін служыў у арміі, палкоўнік. У 1951 г. звольнены ў запас. Жыў у Рагачове. Памёр 25.7.1977 г. Пахаваны ў Рагачове на вайсковых могілках.

ФІЛІМОНАЎ Міхаіл Васілевіч. Нарадзіўся 5.6.1922 г. на станцыі Гур'еўск Кемераўскай вобл. Рускі. Член КПСС з 1943 г. Скончыў сярэднюю школу, працаваў слесарам у МТС. Да вайны жыў у Рагачове. У Чырвонай Арміі з 1941 г. У 1942 г. скончыў Вольскае пяхотнае вучылішча, у 1945 г. Харкаўскае ваенна-палітычнае вучылішча. На фронце з 1942 г. Удзельнік Курскай бітвы. Камсорг стралковага батальёна ст. сяржант М. В. Філімонаў вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра. 22.9.1943 г. ў складзе перадавога атрада ён пераправіўся цераз Днепр каля в. Камарын Палескай вобл. На захопленым плацдарме ўдзельнічаў у адбіцці контратак праціўніка, падбіў з процітанкавага ружжа 3 танкі. У крытычны момант замяніў выбыўшага са строю камандзіра роты. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 16.10.1943 г.

Пасля вайны М. В. Філімонаў служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. У 1954 г. скончыў Ваенна-палітычную акадэмію. У 1976 г. звольнены ў запас. Жыве ў г. Арэнбург.

Крутымі дарогамі вайны

Тысячы сыноў і дачок рагачоўскай зямлі прайшлі праз цяжкія ваенныя выпрабаванні, змагаліся на розных франтах. Для адных франтавыя дарогі пачыналіся ў 1941, другія ішлі да іх партызанскімі сцежкамі і пасля вызвалення родных мясцін уступалі ў Чырвоную Армію, каб гнаць ворага далей на захад. І куды б ні кідаў іх франтавы лёс, салдаты-рагачоўцы мужна выконвалі свой нялёгкі воінскі абавязак.

Іван Акімавіч Бондараў нарадзіўся ў в. Слабада. У 1940 г. быў прызваны на службу ў Чырвоную Армію. Служыў у 53-м палку 81-й танкавай дывізіі непадалёку ад Львова. У ноч з 21 на 22 чэрвеня 1941 г. салдаты позна вярнуліся з трэніровак, спаць ляглі ў 2 гадзіны ночы. І не адразу разабраліся, што да чаго, калі пачулі ўсхваляваны голас дзяжурнага «Трывога!» Падхапіўшыся, убачылі зарыва над палаючым аэрадромам. Так для танкіста І. А. Бондарава і яго сяброў пачалася вайна. Ніколі не забыць тую ноч Івану Акімавічу. І пайшлі франтавыя дарогі, баі, шпіталі, паражэнні і ўдачы.

Тройчы быў паранены, кантужаны. Бывалі такія складаныя сітуацыі, як, напрыклад, у баі пад Варонежам, калі салдат ужо не спадзяваўся, што дажыве да Перамогі. Але лёс быў літасцівы да яго. 6 танкаў змяніў за вайну, а сам выжыў. Вызваляў Кіеў, Польшчу, да Аўстрыі дайшоў старшым сяржантам. Узнагароджаны 2 ордэнамі Айчыннай вайны, медалямі. Вярнуўшыся да мірнага жыцця, гэтак жа самаддана працаваў, як і ваяваў. Узнагароджаны ордэнам Працоўнай Славы.

Іван Канстанцінавіч Круглікаў, маёр у адстаўцы, жыве ў Рагачове. У пачатку вайны быў партызанам, з 1943 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнічаў у вызваленні Польшчы, у баях на Одэры, у штурме Берліна, распісаўся на рэйхстагу. Быў у складзе савецкай аховы ў час падпісання капітуляцыі Германіі ў прадмесці Берліна Карлсхорст. Мае ўзнагароды. Вельмі памятнае для Івана Канстанцінавіча імклівае наступленне нашых войск на польскай зямлі зімой 1945 г. І. К. Круглікаў быў тады ў складзе танкавага дэсанта, які, прарваўшы фронт, пранік у глыбокі тыл фашысцкіх войск. Танкісты і дэсантнікі, праразаўшы шашу з Лодзі, нанеслі нечаканы ўдар па фашысцкіх войсках, якія адступалі. Агнём і гусеніцамі разграмілі фашысцкую калону даўжынёй каля 3 км і гэтак жа імкліва зніклі ў лясным масіве, прасоўваючыся далей на захад. Вельмі цяжкімі былі баі за г. Познань. Доўгі час нашым байцам ніяк не ўдавалася ўзяць гарадскую крэпасць, надзвычай умацаваную, з вялікай колькасцю агнявых пунктаў. Фашысты, якія абаранялiся ў крэпасці, аказалі жорсткае супраціўленне. І тады наша камандаванне вырашыла ўзарваць крэпасць. На тэрыторыі крэпасці разгарэліся ўпартыя баі, якія пераходзілі ў рукапашныя сутычкі. Гарнізон быў вымушаны здацца.

Канстанцін Уладзіміравіч Паўлаў родам з Рагачова. Механік-вадзіцель танка К. У. Паўлаў сустрэў вайну каля Беластока, дзе служыў у Чырвонай Арміі. Потым удзельнічаў у абароне Магілёва, Смаленска, Масквы, у Курскай бітве і вядомым танкавым баі пад Прохараўкай. Потым былі баі за Дняпро, вызваленне Украіны і яе сталіцы Кіева, вызваленне Беларусі, прычым Канстанціну Уладзіміравічу пашчасціла вызваляць родны Рагачоў. Потым удзельнічаў у вызваленні Польшчы, яе сталіцы Варшавы і іншых буйных гарадоў, у баях на Одэры, штурме Берліна, распісаўся на рэйхстагу. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі.

Многа ўсяго пабачыў танкіст на сваім франтавым шляху за доўгія гады вайны. Адступаючы з баямі ад граніцы, даводзілася пад бамбёжкамі выходзіць з акружэння, гарэць у танку. Быў 6 разоў паранены, двойчы кантужаны. Асабліва памятнымі засталіся ў Канстанціна Уладзіміравіча баі за Маскву. Ваяваў ён тады ў складзе 4-й танкавай брыгады (дарэчы, брыгадзе самай першай было прысвоена званне «гвардзейская» і яна стала называцца 1-й гвардзейскай танкавай брыгадай). Найбольш небяспечным, як расказвае К. У. Паўлаў, было становішча на тульскім напрамку. Сілы былі настолькі няроўнымі, што, здавалася, ужо немагчыма адстаяць Маскву. Ва ўсякім разе, так лічылі гітлераўцы, і тады ўпершыню былі выкарыстаны танкавыя засады. Замаскіраваўшыся, нашы танкі нечакана наносілі па варожых калонах магутны агнявы ўдар, хутка памяняўшы месца ўкрыцця, наносілі яшчэ некалькі імгненных магутных залпаў па ворагу. Потым хутка адыходзілі на некалькі кіламетраў і займалі такую ж замаскіраваную пазіцыю. Адна толькі танкавая рота, дзе служыў механікам-вадзіцелем Канстанцін Уладзіміравіч, знішчыла ў баях пад Масквой 47 фашысцкіх танкаў. Такім чынам 4-я танкавая брыгада нанесла такія вялікія страты 2-й танкавай групе Гудэрыяна, што ён паставіў пад сумненне данясенне сваёй разведкі аб тым, што супраць яго дзейнічае танкавая брыгада, а не армія. Пасля Масквы К. У. Паўлаў удзельнічаў у жорсткіх баях за Тулу, Валакаламск, Істру. Нашы войскі панеслі ў гэтых баях вельмі цяжкія страты — загінула шмат баявых сяброў, брыгада страціла амаль усю матэрыяльную частку, лясамі выходзіла з акружэння. Выжыць Канстанціну Уладзіміравічу дапамаглі шчаслівы лёс і высокае майстэрства механіка-вадзіцеля, дзякуючы якому не раз было выратавана жыццё ўсяго экіпажа. Здзейсніў некалькі танкавых таранаў. У бітве на Курскай дузе быў цяжка паранены, танк загарэўся. Заўважыўшы, што не ўсе танкісты пакінулі палаючую машыну, медсястра стралковай роты выцягнула параненага механіка-вадзіцеля літаральна за некалькі секунд да ўзрыву танка. Маці салдата Соф'я Міронаўна двойчы атрымлівала пахаронкі на сына. Але ён выжыў, вярнуўся дамоў і зараз жыве ў Рагачове.

Акім Акімавіч Голубеў нарадзіўся ў в. Турск. Маладым хлопцам быў ён, калі пачалася вайна. Моцным болем апякла яго страта маці і старэйшай сястры, растраляных фашыстамі. Можа таму так самаддана і рашуча змагаўся з ворагам

18-гадовы юнак, які ў 1944 г. стаў байцом Чырвонай Арміі. Ад Дняпра да Одэра пралёг яго шлях. Асабліва запомніліся баі за Кракаў, яны скончыліся для маладога салдата шпіталем. Потым былі яшчэ 2 раненні. За мужныя паводзіны ў баях узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, медалямі «За адвагу» і інш. За добрасумленную працу пасля вайны электраманцёрам у райаб'яднанні «Сельгастэхніка» ўзнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Імя **Яўгена Фёдаравіча Фралова** добра вядома рагачоўцам. Ён працаваў райваенкомам, падпалкоўнік у адстаўцы. За мужнасць і адвагу на франтах вайны ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі.

Іван Рыгоравіч Якімаў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Пасля вайны працаваў на заводзе «Дняпраектар». Шмат гадоў добрасумленнай працы аддалі гэтаму заводу ветэраны вайны **Зінаіда Фёдараўна Падрубная, Кірыла Сцяпанавіч Новікаў, Меркурый Лазаравіч Новікаў** і многія іншыя.

У калгасе «Новы шлях» многія гады адпрацавалі на палях і фермах **І. Е. Белавусаў, П. М. Осіпаў, І. Р. Слугароў, Н. І. Раманаў, П. А. Зайцаў** і іншыя ветэраны — жыхары вёсак Ходасавічы, Збароў, Вікоў.

Ганаруцца сваімі ветэранамі ў саўгасе «1 Мая», дзе доўга працавалі былыя франтавікі **Васіль Яфрэмавіч Драгун, Ілья Ігнатавіч Аўласенка, Мікалай Іванавіч Гаўрыленка, Іван Ягоравіч Пешахонаў, Фрол Пятровіч Кушняроў, Рыгор Васілевіч Мельнікаў, Парфен Міхайлавіч Раманаў** і многія іншыя.

Усяго некалькі дзесяткаў прозвішчаў з тысяч, некалькі фрагментаў з мноства біяграфій... Колькі было іх, рагачоўцаў, маладых і сталых, сямейных і халасцяков, зусім бязвусых юнакоў, якія вынеслі на сваіх плячах нялёгкую ношу салдата Вялікай Айчыннай. Кожны з іх, хто дажыў і хто не дажыў да пераможнага мая, хто названы і не названы ў гэтай кнізе, зрабіў свой уклад у агульную справу Перамогі. Вялікая і шчырая ўдзячнасць патомкаў усім ім за тое, што яны зрабілі ў імя будучыні!

В. Паўлаў (частка артыкула).

Праз мукі палону

Іван Сафонавіч Майсееў, баец палкавой школы 27-га асобнага матацыклетнага палка пасля працяглых знясільваючых баёў пад Вялікімі Лукамі разам з іншымі байцамі школы трапіў у акружэнне. Восем сутак без ежы і вады курсанты школы імкнуліся разарваць варожае кальцо. Аднак не ўдалося.

...Трапіўшых у палон байцоў гналі ўсё далей на захад. Раз-пораз ззаду чуліся стрэлы. Гэта канваіры на матацыкле дабівалі тых, хто не мог больш ісці і падаў у знямозе ў прыдарожны пыл. Прыгналі на ўскраіну Маладзечна, дзе за калючым дротам пад адкрытым небам быў наспех створаны лагер ваеннапалонных. З гэтага моманту для Івана Сафонавіча і яго баявых таварышаў пачаліся неймаверныя выпрабаванні. Кармілі палонных адзін раз у суткі. Так званага «хлеба» выдавалі па сто грамаў. І білі. Нават пры раздачы баланды тоўсты повар у брудным фартуку нацэльваўся чарпаком у галаву. Зняволеныя, ухіляючыся ад удараў, надстаўлялі бляшанкі, пілоткі, а то і проста далоні, каб атрымаць сваю порцыю. Увесь час хацелася есці. Елі траву, лісце дрэў. Хутка на ўсёй тэрыторыі лагера чарнела голая зямля. Неўзабаве пачаліся восеньскія дажджы, затым выпаў снег, ударылі маразы. Палонныя спалі пад адкрытым небам. Раніцай вопратка была ў белай шэрані і дзесяткі нерухомых цел усцілалі зямлю.

Аднойчы ноччу Івану Майсееву ўдалося падкапацца пад калючы дрот і ўцячы. Худы, аброслы, у лахманах, ён трапіў у вёску Мойсічы. У крайняй хатцы яго прытуліла сям'я сялянкі Еўдакіі Баран. Гледзячы на абмарожанага, ледзь жывога ваеннапалоннага, жанчына не магла стрымаць слёз. Іван таксама заплакаў.

БІЗЮК Мікалай Васілевіч, н. ў 1926, рад., прапаў без вестак у 1944.

БОРСУКАЎ Пётр Яфрэмавіч, н. ў 1889, рад., загінуў у 1944.

ВАЛОДЗЬКІН Міхаіл Захаравіч, н. ў 1913, рад., загінуў.

ВАЛОДЗЬКІН Уладзімір Яўменавіч, н. ў 1920, сярж., прапаў без вестак у 1942.

ДАНЦОЎ Андрэй Іванавіч, н. ў 1919, прапаў без вестак у 1944.

ДОЙЛІДАЎ Андрэй Савельевіч, н. ў 1915, рад., загінуў.

ДОЙЛІДАЎ Васіль Мікалаевіч, н. ў 1912, загінуў.

ДОЙЛІДАЎ Міхаіл Савельевіч, н. ў 1904, рад., загінуў у 1944 у Польшчы.

ДОЙЛІДАЎ Пётр Андрэевіч, н. ў 1920, загінуў у 1943.

ДОЙЛІДАЎ Пётр Мікалаевіч, н. ў 1919, загінуў.

ДОЙЛІДАЎ Платон Андрэевіч, н. ў 1920, рад., загінуў.

ДОЙЛІДАЎ Уладзімір Мікалаевіч, н. ў 1920, загінуў.

ЗАЙЦАЎ Карней Савасцеевіч, н. ў 1908, рад., прапаў без вестак у 1941.

ІГНАЦЬЕЎ Іван Аляксеевіч, н. ў 1916, загінуў.

ІГНАЦЬЕЎ Міхаіл Аляксеевіч, н. ў 1920, загінуў.

КАЗЛОЎ Аляксей Апанасавіч, н. ў 1920, рад., прапаў без вестак у 1944.

КУРАЧОЎ Пётр Яўменавіч, н. ў 1915, загінуў.

КУРАЧОЎ Піліп Паўлавіч, н. ў 1920, рад., загінуў.

МІХАЛІШЫН Мікалай Паўлавіч, н. ў 1924, рад., загінуў у 1944 у Польшчы.

МІХАЛІШЫН Міхаіл Сафонавіч, н. ў 1916, загінуў у 1945.

МІХАЛІШЫН Пётр Лявонцьевіч, н. ў 1908, памёр ад ран у 1944.

ПЕЧУРОНАК Міхаіл Маркавіч, загінуў.

РАБУШАЎ Рыгор Антонавіч, н. ў 1922, рад., загінуў у 1943.

РАБУШАЎ Уладзімір Лявонцьевіч, н. ў 1917, радавы.

РУДЗЯНКОЎ Іван Барысавіч, н. ў 1913.

РУДЗЯНКОЎ Мікіта Сафронавіч, н. ў 1911, рад., загінуў у 1945 пад Берлінам.

ТАПЧАЕЎ Іван Сільвестравіч, н. ў 1919, загінуў у 1941.

ШУМІЛАЎ Арцём Васілевіч, н. ў 1910, рад., загінуў у 1944.

ШУМІЛАЎ Васіль Аляксеевіч, н. ў 1918, лётчык, загінуў на Курскай дузе.

ШУМІЛАЎ Васіль Анісавіч, н. ў 1924, загінуў.

ШУМІЛАЎ Васіль Цімафеевіч, н. ў 1926, загінуў.

ШУМІЛАЎ Іван Ільіч, н. ў 1910, загінуў.

ШУМІЛАЎ Іван Цімафеевіч, загінуў.

ШУМІЛАЎ Кірыла Васілевіч, н. ў 1896, прапаў без вестак.

ШУМІЛАЎ Мікалай Васілевіч, н. ў 1914, загінуў.

ШУМІЛАЎ Мікалай Цімафеевіч, н. ў 1916, загінуў.

ШУМІЛАЎ Міхаіл Пятровіч, загінуў 15.1.1945.

ШУМІЛАЎ Павел Васілевіч, н. ў 1905, рад., загінуў у 1941.

ШУМІЛАЎ Павел Мітрафанавіч, н. ў 1914, рад., прапаў без вестак.

ШУМІЛАЎ Пётр Захаравіч, н. ў 1919, рад., загінуў.

ШУМІЛАЎ Пётр Кірылавіч, н. ў 1922, памёр ад ран у 1946.

ШУМІЛАЎ Рыгор Кірылавіч, н. ў 1909, загінуў ва Усходняй Прусіі.

ШУМІЛАЎ Фёдар Цярэнцьевіч, н. ў 1914, загінуў.

ШУМІЛАЎ Якаў Трафімавіч, н. ў 1909, рад., прапаў без вестак.

ШЭЎЧАНКА Аркадзь Васілевіч, н. ў 1907, рад., прапаў без вестак у 1944.

ШЭЎЧАНКА Васіль Рыгоравіч, н. ў 1908.

ШЭЎЧАНКА Васіль Юр'евіч, н. ў 1928, загінуў.

ШЭЎЧАНКА Іван Юр'евіч, н. ў 1924, загінуў.

ШЭЎЧАНКА Іосіф Карнеевіч, н. ў 1908, рад., загінуў.

ШЭЎЧАНКА Панфіл Сямёнавіч, н. ў 1905, памёр ад ран у 1946.

ЯРМУСЕЎ Якаў Сільвестравіч, н. ў 1914, загінуў.

ВЕСКА МОРТКАЎ

АТРАШКОЎ Васіль Аўрамавіч, н. ў 1920, прапаў без вестак.

БУСЛАЎ Мікалай Рыгоравіч, н. ў 1920, рад., прапаў без вестак.

СУШЧЭЎСКІ Міхаіл Еўдакімавіч, н. ў 1920, рад., прапаў без вестак.

ХАПАНЧУК Іван Дзмітрыевіч, загінуў 18.8.1944 у Літве.

ВЕСКА НАВАСЁЛКІ

БАЗЫЛЕНКА Дзмітрый Мікалаевіч, н. ў 1920, загінуў.

ВАЛОДЗЬКІН Яфім Харламавіч, н. ў 1904, рад., прапаў без вестак.

ІВАНОЎ Аляксей Астапавіч, н. ў 1906, загінуў у 1944.

КАЗЛОЎ Мікалай Паўлавіч, н. ў 1920, лейт., загінуў у 1941.

КРАЎЦОЎ Мікалай Захаравіч, н. ў 1918, рад., загінуў у 1945.

КРАЎЦОЎ Пётр Захаравіч, н. ў 1926, загінуў у 1945.

ЛАШАКОЎ Іван Фядосавіч, н. ў 1918.

ЛАШАКОЎ Міхаіл Трафімавіч, н. ў 1922, загінуў.

ЛАШАКОЎ Несцер Сцяпанавіч, н. ў 1910, прапаў без вестак у 1944.

ЛАШАКОЎ Уладзімір Сцяпанавіч, н. ў 1907, рад., прапаў без вестак.

МАСАЛБАСАЎ Астап Мікітавіч, н. ў 1911, прапаў без вестак.

МАСАЛБАСАЎ Рыгор Дзмітрыевіч, н. ў 1905, рад., загінуў у 1943.

МАСАЛБАСАЎ Уладзімір Дзмітрыевіч, н. ў 1912, загінуў.

НАЎГАРОДСКІ Мікалай Міхайлавіч, н. ў 1908, прапаў без вестак у 1941.

РУДЗЬКОЎ Аляксей Дзмітрыевіч, н. ў 1914, рад., загінуў.

РУЦКІ Уладзімір Восіпавіч, н. ў 1916, рад., загінуў у 1944.

САЗОНАЎ Аркадзь Якаўлевіч, н. ў 1922, загінуў 18.8.1944 у Літве.

САЗОНАЎ Гаўрыла Прохаравіч, н. ў 1908, загінуў.

САЗОНАЎ Карней Логвінавіч, н. ў 1908, рад., прапаў без вестак.

САЛЬНІКАЎ Аркадзь Фядосавіч, н. ў 1920, загінуў.

САЛЬНІКАЎ Сцяпан Клімавіч, н. ў 1906, прапаў без вестак у 1943.

САЛЬНІКАЎ Якаў Захаравіч, н. ў 1913, прапаў без вестак у 1942.

САМУЙЛАЎ Павел Мікалаевіч, н. ў 1912, рад., загінуў.

САМУЙЛАЎ Сяргей Аляксандравіч, н. ў 1915, загінуў.

САМУЙЛАЎ Сяргей Аляксеевіч, н. ў 1926, загінуў у 1945.

САРОКІН Канстанцін Купрыянавіч, памёр ад ран у 1945.

САРОКІН Уладзімір Фаміч, н. ў 1915, загінуў.

СТАНКЕВІЧ Мікалай Мікітавіч, н. ў 1906, прапаў без вестак у 1944.

СТАНКЕВІЧ Уладзімір Мікітавіч, н. ў 1911, прапаў без вестак.

СТАРЦАЎ Віктар Піліпавіч, н. ў 1903, загінуў.

СТАРЦАЎ Іван Радзівонавіч, рад., загінуў.

СТАРЦАЎ Мікалай Рыгоравіч, н. ў 1914, загінуў у 1943.

СТАРЦАЎ Міхаіл Радзівонавіч, н. ў 1923, загінуў.

СУКОННІКАЎ Аляксей Іванавіч, н. ў 1926, прапаў без вестак у 1944.

СУКОННІКАЎ Іван Уласавіч, н. ў 1923, загінуў у 1942.

СУКОННІКАЎ Мікалай Васілевіч, н. ў 1905, загінуў.

ХАПАНКОЎ Аркадзь Іванавіч, н. ў 1906, загінуў 4.8.1944 пры размініраванні.

ХАПАНКОЎ Васіль Іванавіч, н. ў 1915, загінуў у 1943.

ХАПАНКОЎ Іван Якаўлевіч, н. ў 1912, загінуў у 1944.

ХАПАНКОЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1910, загінуў.

ХРАМЯНКОЎ Аркадзь Васілевіч, загінуў.

ХРАМЯНКОЎ Барыс Васілевіч, н. ў 1925, загінуў у 1944.

ХРАМЯНКОЎ Васіль Іванавіч, н. ў 1915, загінуў у 1943 у Смаленскай вобл.

ХРАМЯНКОЎ Кірыла Васілевіч, н. ў 1900, загінуў.

ХРАМЯНКОЎ Павел Іванавіч, н. ў 1921, загінуў.

ХРАМЯНКОЎ Пётр Парфенавіч, н. ў 1920, загінуў 4.10.1943 у Смаленскай вобл.

ХРАМЯНКОЎ Рыгор Андрэевіч, н. ў 1918, загінуў.

ХРАМЯНКОЎ Сяргей Васілевіч, н. ў 1918, загінуў.

ШАРШНЁЎ Аркадзь Ігнатавіч, н. ў 1921, загінуў.

ШАРШНЁЎ Мікалай Ігнатавіч, н. ў 1915, радавы.

ШАРШНЁЎ Мікалай Паўлавіч, н. ў 1927, загінуў.

ШАРШНЁЎ Пётр Ігнатавіч, н. ў 1907, прапаў без вестак у 1945.

ШЛІХТАЎ Уладзімір Міхайлавіч, н. ў 1925.

ШЫШКІН Сяргей Канстанцінавіч, н. ў 1921, прапаў без вестак у 1941.

ВЁСКА ТАЛОЧКАЎ

ВАСІЛЬКОЎ Мікалай Макаравіч, н. ў 1920, загінуў у 1941.

КАЗЛОЎ Іван Міхайлавіч, н. ў 1912, загінуў у 1944.

КРУШАНАЎ Мікалай Іванавіч, н. ў 1904, прапаў без вестак у 1944.

МУРАШКА Сцяпан Мікалаевіч, н. ў 1914, загінуў у 1944.

ПАСЁЛАК ЦАГЕЛЬНЯ

СУШЧЭЎСКІ Аляксандр Пятровіч, н. ў 1898, загінуў.

ХРАМЯНКОЎ Якаў Іванавіч, н. ў 1911, загінуў.

ВЁСКА ЦІХІНІЧЫ

АЗЯРЭЦ Канстанцін Іванавіч, н. ў 1914, загінуў.

АЛЯКСЕЕЎ Аляксандр Аляксеевіч, н. ў 1924, загінуў.

АТРОШАНКА Аркадзь Якаўлевіч, н. ў 1916, загінуў у 1944.

АТРОШАНКА Іван Андрэевіч, н. ў 1905, прапаў без вестак у 1942.

БАЖАНКОВА Кацярына Дарафееўна, медсястра, загінула.

БАЖАНКОЎ Міхаіл Сцяпанавіч, загінуў у 1945.

БАЖАНКОЎ Павел Дарафеевіч, н. ў 1920, прапаў без вестак у маі 1944.

БОНДЗІКАЎ Канстанцін Мікалаевіч, н. ў 1913.

БОНДЗІКАЎ Канстанцін Сямёнавіч, н. ў 1905, загінуў у 1945 у Чэхаславакіі.

БОНДЗІКАЎ Міхаіл Мікітавіч, н. ў 1919, загінуў у 1944.

БОНДЗІКАЎ Міхаіл Сямёнавіч, н. ў 1904, загінуў.

БУТРАМЕЕЎ Міхаіл Уладзіміравіч, памёр ад хваробы ў 1945 у Германіі.

БЫЧКОЎ Канстанцін Дзям'янавіч, н. ў 1875.

БЯЛОЎСКІ Іпаліт Пятровіч, н. ў 1907, загінуў у 1944.

ВАЛОДЗЬКІН Аляксей Дзмітрыевіч, н. ў 1912, прапаў без вестак.

ВАЛОДЗЬКІН Васіль Сямёнавіч, н. ў 1909, загінуў.

ВОЙТАЎ Аляксей Ігнатавіч, н. ў 1912, загінуў у 1945.

ВОЙТАЎ Васіль Пятровіч, н. ў 1918, прапаў без вестак у 1943.

ВОЙТАЎ Іван Пятровіч, н. ў 1908, прапаў без вестак у 1941.

ГАРБУЗАЎ Пётр Данілавіч, н. ў 1921, загінуў 11.3.1943.

ГРЫНЬ Арсенцій Радзівонавіч, н. ў 1905, прапаў без вестак у маі 1944.

ГРЫШКОЎ Аркадзь Гаўрылавіч, н. ў 1917, памёр ад ран.

ДЗЯМІДАЎ Павел Міхайлавіч, н. ў 1900, загінуў у 1944.

ДРОГУНАЎ Апанас Сцяпанавіч, н. ў 1905, загінуў.

ДРОГУНАЎ Рыгор Сцяпанавіч, н. ў 1907, прапаў без вестак у 1944.

ДРОГУНАЎ Уладзімір Сцяпанавіч, н. ў 1920, загінуў.

ЖУКАЎ Іван Іванавіч, н. ў 1898, загінуў у 1942.

ЖУКАЎ Пётр Міхайлавіч, н. ў 1912, загінуў.

ЖУРАЎЛЁЎ Аляксандр Андрэевіч, загінуў.

ЖУРАЎЛЁЎ Аляксандр Гаўрылавіч, н. ў 1911.

ЖУРАЎЛЁЎ Аляксей Васілевіч, н. ў 1922, загінуў.

ЖУРАЎЛЕЎ Андрэй Рыгоравіч, н. ў 1911, загінуў 18.1.1945 у Варшаве.

ЖУРАЎЛЕЎ Аркадзь Аляксандравіч, памёр ад ран у 1944.

ЖУРАЎЛЕЎ Васіль Аляксеевіч, н. ў 1920, прапаў без вестак.

ЖУРАЎЛЕЎ Васіль Іосіфавіч, н. ў 1923, загінуў у 1944.

ЖУРАЎЛЕЎ Васіль Пятровіч, н. ў 1913, загінуў 3.3.1945 у Германіі.

ЖУРАЎЛЕЎ Іван Канстанцінавіч, н. ў 1895, загінуў у 1944.

ЖУРАЎЛЕЎ Іван Сцяпанавіч, н. ў 1910, загінуў.

ЖУРАЎЛЕЎ Леанід Андрэевіч, н. ў 1919, загінуў.

ЖУРАЎЛЕЎ Мікалай Іосіфавіч, н. ў 1921, лейтэнант.

ЖУРАЎЛЕЎ Мікалай Мітрафанавіч, н. ў 1914, лейт., загінуў.

ЖУРАЎЛЕЎ Міхаіл Фёдаравіч, н. ў 1913.

ЖУРАЎЛЕЎ Павел Фёдаравіч, н. ў 1919.

ЖУРАЎЛЕЎ Пётр Максімавіч, н. ў 1921, лётчык-знішчальнік, прапаў без вестак.

ЖУРАЎЛЕЎ Пётр Фёдаравіч, н. ў 1925.

ЖУРАЎЛЕЎ Рыгор Іосіфавіч, н. ў 1926, загінуў.

ЖУРАЎЛЕЎ Рыгор Сямёнавіч, н. ў 1921.

ЖУРАЎЛЕЎ Уладзімір Іванавіч, н. ў 1922, загінуў у 1945.

ЖЫЛІНСКІ Васіль Аўгуставіч, н. ў 1908, загінуў.

ЗІНКЕВІЧ Леанід Акімавіч.

ЗРАКАЎ Васіль Паўлавіч, н. ў 1920, рад., прапаў без вестак.

КАВАЛЕЎСКІ Аляксей Віктаравіч, н. ў 1912, загінуў у 1944.

КАСЦЮКЕВІЧ Рыгор Мітрафанавіч, н. ў 1904, загінуў у 1944.

КОЗУНАЎ Мікалай Мікалаевіч, н. ў 1922, загінуў.

КУЛЯШОЎ Аляксандр Яфімавіч, н. ў 1905.

КУЛЯШОЎ Васіль Яфімавіч, н. ў 1909, загінуў у 1943.

КУЛЯШОЎ Пётр Мінавіч, н. ў 1919, загінуў.

КУЛЯШОЎ Уладзімір Аўгуставіч, н. ў 1912, у 1941 быў цяжка паранены, прапаў без вестак.

КУЛЯШОЎ Уладзімір Фёдаравіч, н. ў 1925.

КУРМАШОЎ Іван Міхайлавіч, н. ў 1907, прапаў без вестак у 1941.

ЛІСОЎСКІ Клім Дзянісавіч, н. ў 1923.

ЛАРЫЁНАЎ Сяргей Аляксеевіч, н. ў 1907.

ЛАРЫЁНАЎ Уладзімір Аляксеевіч, н. ў 1901.

НОВІКАЎ Іван Пракопавіч, н. ў 1921.

НОВІКАЎ Лаўрэн Пракопавіч, н. ў 1923.

ОСІПАЎ Мікалай Аляксеевіч, рад., загінуў.

ОСІПАЎ Міхаіл Сідаравіч, н. ў 1925, загінуў у 1944.

ОСІПАЎ Пётр Рыгоравіч, н. ў 1906, рад., прапаў без вестак.

ПІЧУГІН Пётр Рыгоравіч, н. ў 1915, прапаў без вестак у 1941.

ПЛАТОНАЎ Пётр Ігнатавіч, н. ў 1914, загінуў у 1944.

ПСЫРКОЎ Аркадзь Сямёнавіч, загінуў у 1945.

РАБКОЎ Іван Аляксандравіч, н. ў 1914, прапаў без вестак.

РАЗУМАЎ Рыгор Сцяпанавіч, н. ў 1910, загінуў.

СЛАБАДЧУК Мікалай Сяргеевіч, н. ў 1902, загінуў у 1944.

СУШЧЭЎСКІ Іван Пятровіч, н. ў 1907, загінуў у 1942.

СУШЧЭЎСКІ Уладзімір Пятровіч, загінуў.

ФЕДАРОВІЧ Уладзімір Клімавіч, прапаў без вестак.

ФЕДАРОВІЧ Якаў Цітавіч, н. ў 1905, памёр у 1944.

ХАРОНЖА Аляксей Аляксандравіч, н. ў 1905, загінуў у 1944.

ЦІТАРАЎ Аркадзь Ціханавіч, загінуў.

ЦІТАРАЎ Канстанцін Ціханавіч, н. ў 1912, загінуў.

ЦІТАРАЎ Міхаіл Патапавіч, н. ў 1920, радавы.

ЧАРНЯЎСКІ Сямён Канстанцінавіч, н. ў 1909, прапаў без вестак.

ШАНТАРОВІЧ Васіль Мітрафанавіч, н. ў 1920, загінуў.

ШАНТАРОВІЧ Іван Раманавіч, н. ў 1903, загінуў у 1945.

ШКРАБАЎ Нікан Рыгоравіч, н. ў 1910, памёр ад хваробы ў 1944.

ШУРАНКОЎ Апанас Цімафеевіч, н. ў 1901, памёр ад ран у 1945.

ШУРАНКОЎ Павел Сямёнавіч, н. ў 1918.

ЮЗВЯК Іван Станіслававіч, н. ў 1919, загінуў.

ЮЗВЯК Станіслаў Рыгоравіч, н. ў 1880, загінуў.

У МІРНАЙ ПРАЦЫ

Яшчэ грымелі апошнія залпы вайны на заходніх рубяжах краіны, яшчэ плакалі жанчыны, атрымліваючы пахавальныя лісты, а вызваленая рагачоўская зямля ўжо рабіла першыя крокі па аднаўленні народнай гаспадаркі.

Вайна пранеслася, як жудасны ўраган, пакінуўшы за сабой руіны, папялішчы, знявечаную зямлю. Гісторыя не ведала разбурэнняў такога маштабу. За перыяд акупацыі гітлераўцы разбурылі і знішчылі на Рагачоўшчыне ўсю прамысловасць раёна: завод кансерваванага малака, лесазавод, кардонную фабрыку, ільнозавод, спіртзавод, хлебазавод, цагельны завод, 22 прамысловыя арцелі. У райцэнтры была разбурана камунальная гаспадарка, спалена і разбурана 1230 дамоў. Акупанты знішчылі ўсе культурна-асветныя ўстановы раёна: настаўніцкі інстытут, школы медсясцёр, трактарных механікаў, па падрыхтоўцы сельскагаспадарчых кадраў, ФЗН, рамеснае вучылішча, 51 агульнаадукацыйную школу, 5 дзіцячых дамоў, 8 дзіцячых садкоў, 23 Дамы культуры і клубы, Дамы піянераў, Дом настаўніка, кінатэатр, 52 бібліятэкі, друкарню. Фашысты знішчылі ўстановы аховы здароўя, разбурылі калгасы, саўгасы, МТС, спалілі ўсе грамадскія пабудовы калгасаў і 5109 жылых дамоў калгаснікаў, разрабавалі калгасную жывёлу і асабістую ў 79 % калгаснікаў і аднаасобнікаў. Але самымі горкімі і незваротнымі былі людскія страты. Каля 5 тыс. ураджэнцаў раёна не вярнуліся з франтоў вайны, акупанты знішчылі больш за 8 тыс. мірных грамадзян. Каля 1,5 тыс. чалавек было вывезена ў Германію.

Цяжкасцей было шмат — не хапала рабочых рук, будаўнічых матэрыялаў, пра-

Рагачоў у 1944 годзе. З малюнкаў мастака У. Паладзенкі.

дуктаў харчавання, адзення і абутку, жылля, насення... Увесь цяжар лёг на плечы жанчын, падлеткаў, старых. З восені 1944 г. паступова пачалі аднаўляць прамысловыя аб'екты — завод кансерванага малака, кардонную фабрыку, цагельны завод, піларраму, арцелі і інш. Праз 2 месяцы пасля вызвалення раёна было адноўлена выданне раённай газеты «Камунар». Зіму 1944—45 гг. людзі жылі ў напаўразбураных дамах і зямлянках, выкапаных на агародах, каля дарог. Кіраўніцтва аднаўленнем разбуранай гаспадаркі выпала на долю былых партызан і падпольшчыкаў. На адказных пасадах былі былыя партызаны С. М. Свярдлоў, К. М. Драчоў, В. А. Мінайлаў, С. П. Дзівачэнка, К. П. Чарненка і інш.

І вось настаў доўгачаканы Дзень Перамогі. Вярталіся дадому былыя франтавікі. Не дасыпаючы, не даядаючы, людзі працавалі ад цямна да цямна, ахопленыя адным жаданнем — хутчэй залячыць раны, нанесеныя вайной, зрабіць жыццё светлым і радасным. Паступова знікалі горы бітай цэглы і арматуры, паўставалі з руін адноўленыя прадпрыемствы, будаваліся новыя фермы, клубы, жыллё. Да сярэдзіны 1946 г. ўжо дзейнічалі арцелі «Чырвоны пекар», «Аб'яднанне», «Бальшавік», «Калектывіст», «17-ы парт-з'езд», якія за 1946 г. выпрацавалі прадукцыі на 2 млн. 100 тыс. рублёў. Пачаў выпускаць прадукцыю Рагачоўскі цагельны завод, часткова запрацаваў крухмальны завод, а ў 1947 г. ўжо працавалі 16 прамысловых прадпрыемстваў.

Аднаўлялася сельская гаспадарка. У 1946 г. ў Рачагоўскім раёне было: 2691 конь, 9276 галоў буйной рагатай жывёлы, 2233 авечкі, 3196 свіней. Частка жывёлы была перададзена раёну партызанамі і арміяй, частка прывезена з Германіі. Жывёлу атрымалі некаторыя сем'і загінуўшых і інвалідаў вайны.

Пачалося аднаўленне разбуранага жыллёвага фонду. Арганізоўваліся нядзельнікі — ачышчаліся вуліцы, зараўноўваліся ямы і варонкі, падрыхтоўваліся пляцоўкі. Разам з дарослымі працавалі і школьнікі. За 2 гады пасля вызвалення было адноўлена 600 дамоў плошчай 27 тыс. м^2, пабудавана каля 190 новых плошчай 7200 м^2. Але жылля яшчэ не хапала — у 1947 г. ў зямлянках жыло 180 сямей калгаснікаў, многія былі на падсяленні. Насельніцтва раёна на 1 чэрвеня 1946 г. складала 46 751 чалавек.

Адной з галоўных задач была арганізацыя навучання дзяцей. 1 верасня 1945 г. ў раёне ў прыстасаваных памяшканнях дзейнічалі 72 школы, у якіх навучалася 11 тысяч школьнікаў.

Ад знявечаных вайной палёў краіна чакала хлеба. Дзяржпастаўка збожжа была галоўнай задачай яшчэ слабых калгасаў і саўгасаў. Планы выконвалі і нават перавыконвалі часта за кошт тых, чыімі рукамі быў запрацаваны гэты хлеб.

Шмат рабілася, каб павялічыць ураджай збожжавых. Вялікую работу тут праводзілі камсамольцы, піянерскія дружыны школ. Усе школы раёна ўдзельнічалі ў зборы ўгнаенняў. З вялікай удзячнасцю пісала ў тыя гады раённая газета пра брыгады па зборы ўгнаенняў Дварэцкай, Дучынскай і іншых школ. Павялічваліся пасяўныя плошчы. Так, у 1947 г. ўжо засявалася 96,9 % даваеннай плошчы, а праз год — уся даваенная плошча. Цяжкасці выклікала выкананне іншых сельгаскампаній: лесавывазка, здача малака, ільновалакна, асушэнне балот.

У 1948 г. рэзка ўзраслі тэмпы росту сельскагаспадарчай вытворчасці. За гэты год пагалоўе буйной рагатай жывёлы павялічылася на 52,9 %, свіней — на 111,7, авечак — на 31,2, птушкі — на 152,7 %. Асаблівых поспехаў у жывёлагадоўлі дабіліся калгасы «1 Мая», «Шлях сацыялізму». Узмацнілася матэрыяльная база гаспадарак. Пэўную ролю ў гэтым адыграла ўзбуйненне калгасаў, праведзенае ў 1950 г. У раёне стала 38 калгасаў.

З 1946 г. пачалася падрыхтоўка да здабычы торфу на поўдзень ад в. Гарадзец. Месцанараджэнне такога неабходнага паліва было даследавана ў 1939—40 гг. Але вайна перашкодзіла пачаць распрацоўку. І вось адразу пасля вайны пачалося асушэнне балота і будаўніцтва вузкакалейкі. У 1949 г. быў атрыманы першы торф. У сезон на месцанараджэнні працавала да 2,5 тыс. рабочых, якія жылі ў палатках і на кватэрах у суседніх вёсках. У 1951 г. на торфапрадпрыемства прыйшла першая тэхніка. У гэтым жа годзе пачалося будаўніцтва пасёлка, названага Беліцк. Новы пасёлак забудоўваўся добраўпарадкаванымі двухпавярховымі жылымі дамамі, былі пабудаваны школа, бальніца, сад і яслі, клуб, стадыён, магазіны.

Да 1947 г. дало прадукцыю самае буйное прадпрыемства ў Рагачове — завод кансерваванага малака. Самаадданая праца рабочых дазволіла ў кароткі тэрмін падняць з руін гэта прадпрыемства і ў 1948 г. выпусціць звыш плана 460 тыс. бляшанак малочных кансерваў.

Адразу пасля вызвалення левабярэжнай тэрыторыі раёна ў в. Стоўпня была ад-

крыта бальніца. Пасля поўнага выгнання акупантаў распачалася дзейнасць па адраджэнні медыцыны ў раёне. Да 1948 г. ў раёне дзейнічалі райбальніца на 100 ложкаў, амбулаторыя, санэпідстанцыя, малярыйная станцыя, малочная кухня. У сельскай мясцовасці працавалі 4 урачэбныя ўчасткі, 3 сельскія бальніцы, 14 фельчарска-акушэрскіх пунктаў. Шмат сіл і энергіі аддалі наладжванню медыцынскай дапамогі медработнікі А. І. Саракаумаў, С. Я. Кікоін, І. С. Малашэнка, З. Я. Пагужэльская, Зуеў, Грачанкоў, Цюлькін і інш.

Аднаўлялася і сетка культурна-асветных устаноў. Да пачатку 1949 г. ў раёне дзейнічалі 20 хат-чытальняў, 3 бібліятэкі, 3 радыёвузлы, 4 кінаўстаноўкі, шэраг самадзейных мастацкіх калектываў. Вялікай папулярнасцю карыстаўся драмгурток М. Кавалеўскага, які часта выступаў з канцэртнымі праграмамі перад рабочымі і калгаснікамі. Часта ў горадзе і раёне гасцілі прафесіянальныя калектывы.

Шмат было зроблена па добраўпарадкаванні населеных пунктаў. У райцэнтры высаджана каля 4000 дрэў, агароджаны 2 паркі. Рэгулярна сталі праводзіцца нядзельнікі па ачыстцы горада.

У пачатку 1950-х гадоў удалося амаль поўнасцю ўкамплектаваць МТС. Прыкметна ўзрос валавы збор збожжа. Развівалася прысядзібная гаспадарка. Дасягненні перадавых калгасаў і саўгасаў дэманстраваліся на раённай сельскагаспадарчай выстаўцы, якая праходзіла 17—19 кастрычніка 1954 г. Методыку павышэння ўрадлівасці палёў, прадукцыйнасці грамадскай жывёлагадоўлі дэманстравалі калгасы імя Леніна, імя Калініна, «13 год Кастрычніка», імя Кірава і інш.

У 1954 г. моладзь усёй краіны прыняла ўдзел у асваенні цалінных і аблогавых зямель. Не засталіся ў баку і юнакі і дзяўчаты Рагачоўшчыны. У райком камсамола паступілі сотні заяў з просьбай накіраваць на цаліну. У ліку першых цаліннікаў ад Рагачоўшчыны былі І. І. Ганцоўскі, П. Прымакоў, М. Ганчарова, Н. Туз, Н. Шалушкова і многія інш. У наступныя гады на цаліну выехала больш за 200 сямей з Рачагоўскага раёна. Дзесяткі рагачоўцаў узнагароджаны медалём «За асваенне цалінных зямель». Пасланцы Рагачоўшчыны працавалі на новабудоўлях Поўначы і Сібіры, Наваполацка і Салігорска, Далёкага Усходу і Алтая.

У 1956 г. да Рагачоўскага раёна далучана частка тэрыторыі ліквідаванага Журавіцкага, у 1962 г.— Кармянскага раёнаў. Цяжкасці ў кіраванні такім вялікім раёнам прымусілі адмяніць гэта рашэнне, і ў 1964 г. Кармянскі раён быў адноўлены.

Рос дабрабыт насельніцтва, паляпшалася бытавое абслугоўванне, хоць яго матэрыяльная база была слабая. Расла рэалізацыя тавараў народнага спажывання. У 1957 г. іх было прададзена на 100,2 млн. рублёў. У тым жа годзе ў раёне электрыфікавана 19 сельгасарцелей і ўвесь райцэнтр, што палегчыла працу гараджан і сельскіх жыхароў. Пачалася механізацыя шэрага працаёмкіх работ.

У выніку рэарганізацыі МТС і продажы тэхнікі да восені 1958 г. калгасам прададзена 205 трактароў і 88 камбайнаў. Аднак навязванне калгасам тэхнікі вымушала іх рабіць вялікія пазыкі, з якімі цяжка было разлічвацца. Перавод калгасаў і саўгасаў на грашовую аплату ў 1959 г. і ўкараненне ўнутрыгаспадарчага разліку павысілі матэрыяльную зацікаўленасць сялян, спрыялі росту прадукцыйнасці працы.

Развівалася сетка народнай адукацыі. У 1957 г. ў раёне дзейнічала 99 школ (55 сярэдніх, 27 сямігадовых) з 10 739 навучэнцамі, працавалі 3 школы рабочай моладзі і столькі ж школ сельскай моладзі. Аднак праз 13 гадоў пасля вайны 21 школа яшчэ працавала ў наёмных памяшканнях.

Умацоўвалася база медыцынскага абслугоўвання. У 1958 г. працавала 10 бальніц, 21 фельчарска-акушэрскі пункт, урачэбны ўчастак, санстанцыя. У раёне працавала больш за 250 медработнікаў, у тым ліку 10 урачоў.

У 1959 г. ў раёне дзейнічалі 2 Дамы культуры, 27 клубаў, 20 бібліятэк, 8 стацыянарных і 15 перасоўных кінаўстановак. У 1960 г. пры раённым аддзеле культуры адкрыта музычная школа. Паводле тыпавых праектаў былі пабудаваны Дамы культуры ў Рагачове, Азяранах, Збарове, Вішаньках, Востраве, Побалаве і Мадоры. Пры Дамах культуры дзейнічалі гурткі мастацкай самадзейнасці і спартыўныя секцыі. У 1962 г. драматычнаму калектыву раённага Дома культуры прысвоена званне народнага тэатра.

На працягу 1959—65 гадоў у Рагачове ўведзены ў дзеянне новы агародніна-кансервавы завод, расшырылі свае вытворчыя магутнасці будаўнічыя арганізацыі, у тым ліку міжкалгаснае будаўнічае аб'яднанне. Будаўнікі перасоўнай механізаванай калоны № 6 і будаўнічыя брыгады калгасаў і саўгасаў здалі ў эксплуатацыю 6 школ на 880 вучняў, 5 клубаў на 1138 месцаў, 12 магазінаў і 2 сталовыя, 400 кватэр. У горадзе пабудаваны інтэрнат прафесія-

нальна-тэхнічнага вучылішча, пральня, станцыя пералівання крыві, спартыўны комплекс з плавальным басейнам, некалькі жылых дамоў. Заасфальтавана некалькі вуліц, высаджана каля 5000 дрэў і кустоў. Разбураны ў час вайны райцэнтр быў адбудаваны, стаў яшчэ прыгажэйшым. 3.11.1967 г. ў Рагачове адкрыты помнік землякам, якія аддалі сваё жыццё ў гады Вялікай Айчыннай вайны, — курган Славы. У гэтыя ж дні наведвальнікаў прыняў музей народнай славы.

Сваімі руплівымі рукамі і самаадданай працай працаўнікі Рагачоўшчыны пераварылі за пасляваенныя гады сваё роднае Прыдняпроўе ў квітнеючы край.

Працоўная дзейнасць рачагоўцаў была адзначана ўрадавымі ўзнагародамі. Званне Героя Сацыялістычнай Працы ў розны час было прысвоена М. В. Арцёменку, І. В. Ісаенку, А. І. Сафонавай, Н. А. Філіпавай і іншым. Ордэнам Леніна ўзнагароджаны В. Д. Серабракова, М. І. Міхайлаў, Д. Г. Кірыенка, Р. І. Багданава, Г. Я. Баравец і іншыя. За самаадданую працу на Мінскім трактарным заводзе званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоены Ф. К. Самусёву, які нарадзіўся ў в. Шапчыцы Рагачоўскага раёна. Лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі СССР, а пазней і Героем Сацыялістычнай Працы стаў М. М. Слюнькоў з в. Гарадзец, які таксама на працягу доўгага часу працаваў на Мінскім трактарным заводзе.

У 1968 г. частка прадпрыемстваў раёна пачала пераход на новыя ўмовы планавання і эканамічнага стымулявання, што спрыяла лепшаму выкарыстанню матэрыяльных і фінансавых рэсурсаў, удасканаленню тэхнікі і арганізацыі працы. У ліку першых новую сістэму ўкаранілі малочнакансервавы камбінат, мэблевая фабрыка, фабрыка апрацоўкі воўны.

У лістападзе 1975 г. раён датэрмінова выканаў заданне 9-га пяцігадовага плана — выпусціў валавой прадукцыі на суму больш за 740 млн. рублёў. У ліку перадавікоў вытворчасці былі калектывы торфапрадпрыемства «Беліцкае», малочнакансервавага камбіната, вінзавода, мэблевай фабрыкі, хлебазавода. За гады пяцігодкі ў строй дзеючых увайшло некалькі аб'ектаў вытворчасці і культурна-бытавога прызначэння, пабудавана 54 км дарог і капітальна адрамантавана 14 км. Узраслі валавыя зборы збожжа. Аднак планы па яго вытворчасці выканалі толькі 9 гаспадарак, бульбы — толькі 3 (імя Жданава, «Новы шлях», «Запаветы Ільіча»). Вялікія цяжкасці выклікала стварэнне кармавой базы.

На рубяжы 70-х гадоў уся наша краіна пачала страчваць уласцівы ёй дынамізм, у грамадстве сабралася шмат цяжкасцей і нявырашаных праблем. Застойныя тэндэнцыі не маглі не адбіцца і на сацыяльна-эканамічным развіцці раёна. У сельскай мясцовасці мала будавалася жылля, клубаў, не аддавалася належнай увагі будаўніцтву дарог, стварэнню ўмоў працы і быту механізатараў. Не дзіўна, што значная частка сельскага насельніцтва, асабліва моладзь, выязджала на жыхарства ў горад.

У гады 10—11-й пяцігодак узрасла прамысловая вытворчасць. Першую прадукцыю даў буйнейшы завод раёна — «Дыяпраектар». На прылаўках магазінаў з'явіліся аптычныя прыборы і іншыя тавары народнага спажывання, якія выпускаў калектыў «Дыяпраектара». Рэканструкцыю вытворчасці правялі на ўсіх прадпрыемствах. Малочнакансервавы камбінат увёў у строй цэх заменнікаў неразведзенага малака. Пабудаваны новыя адміністрацыйныя, бытавыя і дапаможныя памяшканні, праведзена поўная аўтаматызацыя тэхналагічных працэсаў. На плодаагародніннным прадпрыемстве пачаў працаваць цэх вытворчасці піва і безалкагольных напіткаў. У новым вытворчым памяшканні адкрыўся філіял гомельскага вытворчага аб'яднання «Гамяльчанка», на базе Доўскага цагельнага завода арганізавана вытворчасць нятканых будаўнічых матэрыялаў. Пабудаваны новыя магутнасці па вытворчасці жалезабетонных вырабаў. Усё гэта дазволіла павялічыць выпуск тавараў народнага спажывання. Аб'ём прамысловай вытворчасці ў 1984 г. склаў каля 120 млн. рублёў.

Дасягненні прамысловасці звязаны з імёнамі перадавікоў вытворчасці Ф. І. Лугаўскога, М. Р. Яўсеевай, А. С. Закаршменнага і іншых.

У сельскай гаспадарцы былі праведзены работы па комплекснай механізацыі ферм. Уступіла ў строй каля 100 новых памяшканняў для жывёлы, у тым ліку комплексы па вырошчванні буйной рагатай жывёлы ў калгасе «Чырвоная Армія», па вытворчасці малака ў калгасах імя Кірава і «Новы шлях», свініны — у калгасе імя Леніна і саўгасе «Побалава», узнаўленні цялушак у калгасе «Кастрычнік» і іншыя.

Галоўнай галіной сельскагаспадарчай вытворчасці раёна стала жывёлагадоўля. На жаль, шэраг гадоў рост прадукцыйнасці гэтай галіны стрымліваўся недастатковасцю кармавой базы. Але дзякуючы самаадданай працы работнікаў сельскай гаспадаркі, Рагачоўшчына неаднаразова станавілася пераможцай абласнога

спаборніцтва ў вытворчасці сельгаспрадукцыі. Вялікі ўклад у гэтыя дасягненні зрабілі аператары машыннага даення, жывёлаводы, механізатары П. А. Варанцова, М. Ф. Осіпава, М. С. Худавец, В. Ф. Сімакова, Р. Ф. Прусава, М. М. Ткачоў, І. М. Якушаў, В. П. Горбач, Ф. М. Шкораў і іншыя.

У сацыяльнай сферы ўвага ў асноўным сканцэнтравалася на будаўніцтве жылля і аб'ектаў культурна-бытавога прызначэння. У гады 11-й пяцігодкі ў горадзе і на сяле здавалася па 180—220 кватэр на год. У гэтыя гады пачалося будаўніцтва першых шматпавярховых дамоў. Асноўную частку гарадскога жылля будаваў завод «Дыяпраектар». На сродкі гэтага прадпрыемства ў Рагачове былі пабудаваны каналізацыя і магістраль цеплазабеспячэння. Расшырылася сетка гандлёвых пунктаў. У горадзе з'явілася шмат новых магазінаў.

Значную дапамогу ў будаўніцтве аб'ектаў на сяле аказалі шэфскія арганізацыі горада. Шмат жылля будавалася ў гаспадарках «1 Мая», «Новы шлях», «Савецкая Беларусь», «Прагрэс». У сельскай мясцовасці паявілася больш за 10 гандлёвых цэнтраў, 30 магазінаў.

Адкрыліся новыя навучальныя ўстановы: педвучылішча і тэхнічнае вучылішча № 150 металістаў. У сучасныя карпусы перайшлі навучэнцы ГПТВ № 100, СШ № 4 г. Рагачова, Курганскай, Серабранскай, Азяранскай, Збароўскай, Побалаўскай і іншых школ. У 1985 г. ў горадзе дзейнічала 12 дашкольных устаноў,

Пасвячэнне ў хлебаробы ў калгасе «Дружба».

у сельскай мясцовасці забяспечанасць дзіцячымі садамі склала 95 %. Уведзены ў эксплуатацыю кінатэатр у Рагачове, Дамы культуры ў Курганні, Гарадцы, Кісцянях, Заполлі і інш. У 1984 г. жыхароў сяла абслугоўвалі 53 бібліятэкі, 50 клубаў і Дамоў культуры. Вырасла матэрыяльная база медыцыны. Адкрыліся дзіцячая бальніца, стаматалагічная паліклініка, новыя памяшканні атрымалі станцыя хуткай дапамогі, санітарна-эпідэміялагічная станцыя, бальніцы ў Побалаве і Доўску, шэраг фельчарска-акушэрскіх пунктаў у вёсцы.

Не спынялася спартыўнае жыццё — адкрылася дзіцяча-юнацкая спартыўная школа па веславанні ў Рагачове і раённая ДЗЮСШ. У горадзе ў 1958 г. працавалі 10 спартыўных устаноў, праводзілі-

Злёт даярак-чатырохтысячніц. Рагачоў, 1990 г.

Басейн у санаторыі «Прыдняпроўскі».

ся шматлікія раённыя спаборніцтвы па футболе, валейболе, лёгкай атлетыцы і іншых відах спорту. Далёка за межамі раёна вядома аб поспехах рагачоўскіх спартсменаў-весляроў. Сярод выхаванцаў мясцовай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы чэмпіёны і прызёры Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету, Еўропы, СССР і Беларусі, розных спартакіяд і іншых прэстыжных спаборніцтваў (больш падрабязна пра гэта гл. ў артыкуле «Рагачоўскія весляры»).

У Рагачове ўпершыню ў рэспубліцы стаў культывавацца гіравы спорт, першым майстрам спорту стаў Уладзімір Мусатаў. Развіваючы новы від спорту — наўрліфтынг (сілавое трохбор'е), рагачоўскія спартсмены за кароткі час сталі лідэрамі ў рэспубліцы. Дзякуючы добрай арганізацыі спартыўна-масавай работы, фізкультурнікі раёна пастаянна знаходзяцца ў ліку прызёраў абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў.

За 12 км на ўсход ад Рагачова на левым беразе Дняпра знаходзіцца бальнеагразевы і кліматычны курорт рэспубліканскага значэння. Ён мае такія лекавыя фактары, як мінеральныя крыніцы на ванны, пітное лячэнне, тарфяная і сапрапелевая гразі (паблізу курорта, на возеры Святое, выяўлена месцанараджэнне торфу і сапрапелей). У паўночнай частцы курорта, сярод вялікага масіву хвойнага лесу, на беразе Дняпра размешчаны санаторый «Прыдняпроўскі» на 500 месцаў, які спецыялізуецца на лячэнні гінекалагічных захворванняў і органаў руху. 13 верасня 1977 г. «Прыдняпроўскі» прыняў першых адпачываючых. Для станаўлення санаторыя шмат зрабіў яго першы галоўны ўрач Я. Ф. Корык. У санаторыі ёсць вада- і гразелячэбніцы, зала ЛФК, лячэбны мінеральны басейн, кабінеты гідрапатыі, электра- і святлолячэння, масажу, механатэрапіі, мануальнай тэрапіі, іголкарэфлексатэрапіі, інгаляторый, касметычны кабінет, сауна. Далёка за межы Рачагова разнеслася слава пра санаторый, дзе працуюць кваліфікаваныя работнікі, сардэчныя і шчырыя людзі, у тым ліку А. В. Казлоў, П. С. Жураўлёў, Г. А. Сідарэнка, Т. У. Мяржанава, З. М. Буднікава, К. М. Гвоздзева, галоўны ўрач санаторыя В. М. Ядчанка.

У гады 12-й пяцігодкі намаганні працаўнікоў раёна былі скіраваны на далейшае развіццё сацыяльна-эканамічнага ўзроўню раёна, будаўніцтва жылля, нарошчвання аб'ёмаў вытворчасці тавараў народнага спажывання, умацаванне матэрыяльнай базы аховы здароўя і народнай асветы, сацыяльную перабудову вёскі. Штогод прамысловасць Рагачова і раёна выпускала тавараў на суму больш як 350 млн. рублёў. Значна выраслі аб'ёмы

Заняткі ў сярэдняй школе № 2 Рагачова.

капіталаўкладанняў. За гады 12-й пяцігодкі пабудавана больш за 20 складаных аб'ектаў вытворчага і культурна-бытавога прызначэння. Сярод іх паліклініка і кінатэатр у Рагачове, 2 школы і інш. Штогод уводзілася ў строй каля 20 тыс. м² жылля ў горадзе і 10—12 тыс. м² у вёсцы. Распрацавана і ажыццяўляецца праграма газіфікацыі раёна. Значныя аб'ёмы дарожных работ выконваюць дарожна-будаўнічае ўпраўленне № 1, дарожна-эксплуатацыйнае ўпраўленне № 154, перасоўная механізаваная калона № 41. У 1991 г. ў раёне працавалі 8 прамысловых прадпрыемстваў, 7 будаўнічых арганізацый, 30 калгасаў і саўгасаў, птушкафабрыка, 24 сярэднія, 18 васьмігадовых і 16 пачатковых школ, педагагічнае і 2 прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, філіял Гомельскага медыцынскага вучылішча, 11 бальніц, 31 фельчарска-акушэрскі пункт, 13 дамоў культуры, 48 клубаў, 52 бібліятэкі.

Раён выканаў у 12-й пяцігодцы планы паставак малака, мяса, яек, збожжа. Значны ўклад у павышэнне эфектыўнасці сельскагаспадарчай вытворчасці ўносяць працоўныя калектывы калгасаў імя Леніна, «Чырвоная Армія», саўгаса «Ціхінічы», птушкафабрыкі. Тут актыўна ўкараняюцца навінкі перадавога вопыту, выкарыстоўваюцца прагрэсіўныя формы арганізацыі і аплаты працы.

Сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў краіне, прызнанне права на розныя формы ўласнасці і гаспадарання, дэмакратызацыя грамадскага жыцця выклікалі неабходнасць далейшай перабудовы эканамічных адносін у аграрным сектары раёна. У 1991 г. ў 16 гаспадарках быў укаранёны арэндны падрад, у тым ліку ў 10 з іх на арэндных адносінах працуюць усе падраздзяленні. У калгасе «Новы шлях», саўгасе «Станькаўскі» створаны ўнутрыгаспадарчыя кааператывы. З'явіліся ў раёне арандатары і фермерскія гаспадаркі.

Але сённяшні ўзровень развіцця сельскагаспадарчай галіны не дае патрэбнай колькасці прадуктаў харчавання. Адбываецца скарачэнне пагалоўя жывёлы на асабістых падвор'ях калгаснікаў і рабочых саўгасаў. Сітуацыя ўскладняецца ў сувязі з чарнобыльскай трагедыяй, чорная хмара якой закранула сваім крылом і Рагачоўшчыну. 87 вёсак і пасёлкаў, у якіх пражывае больш як 13 тыс. чалавек, знаходзяцца на тэрыторыі з узроўнем забруджанасці ад 1 да 5 кюры на км², а 57 населеных пунктаў з насельніцтвам 19, 8 тыс. чалавек размешчаны на тэрыторыі, дзе шчыльнасць забруджанасці ад 5 да 15 кюры на км². Гэты фактар павялічвае сацыяльную напружанасць, адмоўна ўплывае на гаспадарчую дзейнасць, выклікае адток працаздольнага насельніцтва за межы раёна. Чыстыя землі раёна сталі абжываць перасяленцы з чарнобыльскай зоны, якія ўтвараюць нават цэлыя пасёлкі. Гэта крыху здымае праблему працаздольнага насельніцтва ў раёне.

Рагачоўская зямля шчодрая на таленавітых людзей. У Рагачове прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады вядомага вучонага-селекцыянера Леаніда Кандратавіча Грэбеня, прафесара, доктара сельскагаспадарчых навук, акадэміка УАСХНІЛ і АН УССР, Героя Сацыялістычнай Працы. Тут нарадзіўся гісторык і педагог Г. Г. Фрумянкоў, прафесар, доктар гістарычных навук, заслужаны дзеяч навукі РСФСР. У Гомельскім універсітэце імя Ф. Скарыны працуе ўраджэнец в. Барсукі Герой Сацыялістычнай Працы М. А. Дзмітрыеў. У Рагачове нарадзіліся таксама: У. М. Говар-Бандарэнка, заслужаны артыст Беларусі; С. Я. Галкін, яўрэйскі паэт і драматург; А. І. Гінцбург, кінааператар і рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі і РСФСР; К. І. Завіша, мастак-жывапісец; К. М. Саннікаў, беларускі рэжысёр, акцёр, педагог, народны артыст Беларусі, прафесар; А. М. Федчанка, заслужаная артыстка Беларусі. На Рагачоўшчыне нарадзіліся многія дзеячы беларускай літаратуры — А. Я. Макаёнак, драматург, народны пісьменнік Беларусі; Ф. І. Куляшоў, літаратуразнавец і крытык, доктар філалагічных навук, прафесар; паэт Мікола Сурначоў; Ю. С. Пшыркоў, літаратуразнавец і крытык, заслужаны дзеяч навукі рэспублікі. У Рагачове прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады паэта Алеся Жаўрука, які загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны ў баях пад Сталінградам. З Рагачоўшчынай былі цесна звязаны жыццё і творчасць беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча.

У 1910 г. ў в. Ціхінічы нарадзіўся грамадскі і літаратурны дзеяч Аўген Калубовіч, які ў часы сталіншчыны зведаў сібірскія лагеры. У гады Вялікай Айчыннай вайны ён уваходзіў у створаную акупантамі Беларускую Цэнтральную Раду, быў старшынёй Беларускага культурнага згуртавання, кіраўніком аддзела культуры. Пасля вайны ў эміграцыі — да 1950 г. жыў у Заходняй Германіі, потым у ЗША, дзе і памёр у 1987 г. Сярод яго літаратурнай спадчыны найбольш значнымі з'яўляюцца 2-томнае даследаванне «Мова ў гісторыі беларускага пісьменства»



Хор Азяранскага Дома культуры.

(1974—78), «На крыжовай дарозе» (1986), успаміны пра Я. Коласа і Я. Купалу, нарыс «Айцы» БССР і іхны лёс» (1985).

У 1917 г. Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю скончыў народны пісьменнік Беларусі Міхась Лынькоў. У 1922—25 гг. ён настаўнічаў у в. Свержань Рагачоўскага раёна.

Перад вайной у Рагачоўскім настаўніцкім інстытуце вучылася Алена Васілевіч, беларуская пісьменніца, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1976).

Яшчэ да вайны ў Рагачове было створана літаратурнае аб'яднанне, якое працягвае дзейнасць і ў нашы дні. Пры раённым Доме культуры працуюць 2 народныя калектывы — агітбрыгада і драматычны тэатр. Пры многіх сельскіх Дамах культуры, на прадпрыемствах дзейнічаюць самадзейныя калектывы. У раёне добра ведаюць і любяць танцавальны калектыў завода «Дыяпраектар», хор Азяранскага Дома культуры, фальклорны калектыў Мадорскага Дома культуры і іншыя. У в. Каменка загадчыкам клуба працуе цікавы чалавек — Дз. І. Сталяроў, майстар разьбы па дрэве, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь. Рагачоўцам добра вядомы жывапісныя работы мастакоў Б. П. Маліноўскага і У. І. Паладзенкі, якія жывуць у Рагачове.

На Рагачоўшчыне свята ўшаноўваюць памяць воінаў, якія аддалі сваё жыццё за свабоду і незалежнасць гэтай зямлі. Народная памяць зберагае таксама імёны тых, хто самаадданай працай ці творчасцю праславіў родны край. У раёне існуе шэраг музеяў, большасць матэрыялаў якіх прысвечана подзвігу народа ў час Вялікай Айчыннай вайны, працоўнаму подзвігу жыхароў раёна, славутым землякам. У Рагачове працуе музей народнай славы, у Азяранскай школе — музей баявой і працоўнай славы, у в. Вялікія Стралкі — музей народнай славы, у Гарадзецкай і Бе-

Танцавальны калектыў завода «Дыяпраектар».

ліцкай школах — гісторыка-краязнаўчыя музеі, у Журавіцкай школе — музей народнага пісьменніка Беларусі Андрэя Макаёнка. Музей працоўнай славы створаны на малочнакансервавым камбінаце.

У Рагачове ёсць вуліца імя Вячаслава Сцяпанава. Гэта своеасаблівы помнік участковаму міліцыянеру, які загінуў у мірны час пры выкананні службовых абавязкаў.

Памяць пра подзвіг народа, пра добрыя справы неўміручая, яна перадаецца з пакалення ў пакаленне і будзе жыць вечна.

А. С. Лейкін.

Да мірнага жыцця

З успамінаў жыхара в. Збароў П. Г. Осіпава

Нялёгкім было вяртанне да мірнага жыцця. Мёртвая цішыня сустракала бежанцаў, якія прыходзілі ў спаленыя і разбураныя вёскі, каб пачынаць новае жыццё. Каля 200 чалавек працаздольнага насельніцтва Збароўскага сельсавета загінула ў час вайны, і ўвесь цяжар па аднаўленні народнай гаспадаркі лёг на плечы жанчын, старых і дзяцей. Трэба было аднаўляць жыллё з руін і папялішчаў. З усёй вёскі збераглі ад фашыстаў толькі дзвюх кароў. Іх гаспадары прадавалі аднавяскоўцам па адной шклянцы малака, каб крыху падтрымаць хворых і самых маленькіх. Многія дзеці за гэты час забыліся смак малака. Каб купіць жывёлу, людзі хадзілі ў аддаленыя вёскі або ехалі нават у заходнія раёны Беларусі ці на Украіну. Армейскія часці перадалі калгасу некалькі коней, але іх было недастаткова, каб апрацаваць калгасныя палі і прысядзібныя ўчасткі сялян. Многія работы аднавяскоўцы выконвалі ўручную, часам самі ўпрагаліся ў плугі і ўзворвалі зямлю, рыдлёўкамі засыпалі траншэі, ямкі ад разрываў бомбаў і снарадаў, раўнялі знявечаную зямлю. Не было ўгнаенняў, таму зямля давала нізкія ўраджаі. Жніво, малацьба, касьба вяліся ўручную. Салому пасля малацьбы выкарыстоўвалі для дахаў дамоў і ў асабістай гаспадарцы. Востра адчуваўся недахоп будаўнічых матэрыялаў — шкла, цэглы, цвікоў і інш. Яшчэ некалькі гадоў пасля вайны вокны ў хатах былі забітыя, а некаторыя сем'і жылі яшчэ ў зямлянках. Удовы Таццяна Паўлюкова і Матрона Сімакова перасяліліся з зямлянак у новыя хаты толькі ў 50-я гады.

Пасля вайны знешні выгляд вёскі, сялянскіх хат, саміх людзей яшчэ працяглы час напамінаў пра цяжкія вынікі вайны. У сялян не было посуду, таму людзі гатавалі сабе страву ў салдацкіх кацялках і кансервавых бляшанках. Бляшанкі з-пад кансерваў выкарыстоўвалі таксама замест конавак. З-за адсутнасці мясак і талерак адвараную бульбу звычайна высыпалі на разасланы ручнік і так елі. Саматужным спосабам выраблялі алюмініевы посуд — лыжкі, міскі, конаўкі. Інваліды вайны здабывалі гуму, клеілі галошы і прадавалі. Для адзення выкарыстоўвалі салдацкае абмундзіраванне, з шынялёў шылі коўдры, паддзёўкі і фуфайкі. З кавалкаў бязі і фланелі, прызначаных на анучы, жанчыны шылі сабе кофты. У пасляваенныя гады грошы абясцэніліся, таму прадукты харчавання і адзенне каштавалі вельмі дорага, расла спекуляцыя.

У першыя пасляваенныя гады не было чым шкліць вокны. Увечары іх завешвалі хусткай, якая днём была на галаве, або яшчэ чым-небудзь. Не было ложкаў, не было чаго паслаць і чым накрыцца. Часцей за ўсё накрываліся верхнім адзеннем. Паняццяў «пасцельная бялізна», «сподняя бялізна» не было, і тыя прадметы, якія іх складалі, мала агульнага мелі са словам «белы», таму іх звычайна называлі «рыззё». Непазбежным спадарожнікам вайны была страшная антысанітарыя. Гэта адчувалі на сабе тыя, хто ў час вайны перажыў акупацыю. Адзенне гэтых людзей было бруднае, у ім было шмат паразітычных насякомых, ад укусаў якіх скура свярбела, цела пакрывалася чырвонымі крапінкамі. Пашырылася захворванне каростай. Толькі з паяўленнем у магазінах мыла, у аптэках лекаў і дэзінфекцыйных сродкаў пачалася ўпартая барацьба з усім гэтым злом.

Шмат цяжкасцей давялося пераадолець людзям. Але да канца 40-х гадоў жыццё паступова стала наладжвацца. Гарадзецкая МТС дапамагла калгасу сельскагаспадарчымі машынамі, першую грузавую аўтамашыну гаспадарка атрымала ў 1948 г. У калгасе была створана каса ўзаемадапамогі, з якой выдавалі грошы ўсім тым, каму яны былі вельмі патрэбны. Сіротам дапамога аказвалася бязвыплатна. У 1944 г. ў Рагачове быў адкрыты дзіцячы дом, аднак не ўсе дзеці-сіроты маглі туды трапіць, бо не хапала месцаў. Таму

многія дзеці заставаліся ў сем'ях калгаснікаў яшчэ ў 1945 і 1946 гг. Развіццё жывёлагадоўлі калгас «XVII партз'езд» пачынаў з двух дзесяткаў коней і 25 кароў. У такіх цяжкіх умовах пачыналася новае жыццё.

Пра вёску і яе людзей

З успамінаў настаўніка Балатнянскай сярэдняй школы А. Зайцава

У 1945 г. ў калгасе в. Мадора дзейнічала 8 паляводчых брыгад, якія мелі сваё поле, сад, агарод, інвентар. Аднак з-за адсутнасці ўгнаенняў, сельскагаспадарчай тэхнікі, недахопу мужчынскіх рабочых рук ураджаі збожжавых культур былі вельмі нізкія (жыта атрымлівалі па 6—8 цэнтнераў з гектара). Значную частку сваёй сельскагаспадарчай прадукцыі сяляне здавалі дзяржаве. Самі ж на свае працадні амаль нічога не атрымлівалі (у 1946 г. ім выдалі на кожны працадзень па 50 грамаў жыта). З 1947 г. большая частка калгасных палёў засявалася грэчкай і просам. Кожны сялянскі двор абкладваўся дзяржаўным падаткам. Для гэтага патрэбны былі грошы. Каб іх мець, сяляне збіралі ў лесе чарніцы, суніцы, маліну, журавіны, грыбы, везлі на рынак у Рагачоў і там прадавалі. Вывозілі яны таксама на продаж і прадукты харчавання: малако, масла, смятану, тварог, яйкі, курэй, мёд і інш. Зімою не сядзелі склаўшы рукі, збіралі хваёвыя шышкі і здавалі іх у лясніцтва, за што таксама атрымлівалі грошы. Пазней збіралі ў лесе дзеразу, высушвалі, рабілі з яе жоўты парашок і здавалі яго ў аптэкі. Кожная сям'я выкарыстоўвала здольнасці і прафесійныя навыкі сваіх членаў. Так, А. І. Кавалёў умеў рабіць добрыя печы, грубкі, у якіх была моцная цяга і няблага гарэлі дровы. Каб пракарміць і вырасціць сваю ўнучку Таню, якая засталася з маленства без маці, ён хадзіў на заработкі ў навакольныя вёскі. Сямён Старавойтаў быў мулярам, гэту прафесію набыў яго сын Мікіта, якога таксама запрашалі сяляне зрабіць тую ці іншую работу. Асабліва добрая слава хадзіла пра мадорскіх цесляроў. Яны збіраліся групай па 4—6 чалавек і адпраўляліся на заробкі па вёсках Рагачоўскага і суседніх раёнаў, працавалі ад зары да зары — за тыдзень рубілі зруб дома. Добрымі цеслярамі былі Сазон Трылобаў, Конан Андросаў, Аляксандр Завішаў, Сямён Зайцаў, Дзмітрый Чэвушаў, Андрэй Чэвушаў, Васіль Старавойтаў, Дзмітрый Аўрамаў. Сяляне Іосіф Ларкоў, Дзмітрый Чэвушаў, Міна Курылін добра выраблялі цэбры, бочкі, дзежкі для хлеба. Некаторыя жыхары вёскі займаліся разьбой па дрэве. Іван Міхальчэнка заўсёды знаходзіў прыгожы малюнак для сваіх вырабаў. Да яго часта прыходзілі сяляне з розных месцаў і прасілі зрабіць ажурныя ліштвы для акон або дзвярэй. У гэтай рабоце праявіў свой талент і Міхаіл Стрыкаў. У пашане мадорцаў была праца кавалёў. Доўгі час у кузні працаваў Ягор Слесараў, потым на змену яму прыйшоў Іван Рабцаў. Гэтыя майстры сваёй справы чула адносіліся да заказаў аднавяскоўцаў, з любоўю рабілі любыя рэчы. Аўтарытэтам сярод сялян за сваю працу і дабразычлівасць карысталіся шафёры Несцер Бугаёў і Кірыла Чэвушаў, конюхі Піліп Коханаў і Іван Осіпаў, механізатары Аляксей Рабцаў, Мікалай Осіпаў, Іван Андросаў, Яфім Чэвушаў.

Пасля вайны праўленне калгаса ўзначальвалі Ц. П. Арцёменка, Ф. Р. Таранаў, А. А. Ткачоў, Лаўрэн Казлоўскі. Па ініцыятыве апошняга ў Мадорах была створана і дзейнічала адзіная ва ўсёй акрузе воўначасалка, якой загадвала Хадора Чэвушава. Пра адкрыццё воўначасалкі далі інфармацыю ў раённай газеце, і з усіх навакольных раёнаў пачалі прывозіць часаць воўну, а ў калгасную касу сталі паступаць грошы. Не заняпала на вёсцы і пчалярства, у калгасе, а потым у саўгасе гэтай справай займаўся Васіль Чэвушаў. У 60-я і 70-я гады пачалося ўзбуйненне калгасаў і саўгасаў. Наш калгас быў ператвораны ў саўгас з цэнтрам у в. Старое Сяло. Мадора ж стала далёкай ускраінай, тут быў ліквідаваны і сельскі Савет. Развіццю вёсцы перасталі ўдзяляць належную ўвагу, таму ў хуткім часе яна стала неперспектыўнай.

Па старонках газеты «Камунар» за 1947, 1948, 1949 гг.[1]

6 красавіка 1947 г.

СЛОВА СВАЁ СТРЫМЛІВАЮЦЬ

Новы метад у ворыве прымянілі Мацэла Сцяпан і Сушчэўская Елена. Для таго, каб выкарыстаць на ворыве малапрадукцыйней, яны сумесна з каровай запрагаюць у плуг каня. Такі метад паказаў пядрэнныя вынікі. Штодзённа Мацэла і Сушчэўская узорваюць па 0,45 гектара.

Еўг. Карнееў.

8 лютага 1948 г.

ПАТРЫЯТЫЧНЫ ПАЧЫН КАЛГАСНІКАЎ КАЛГАСА «ЧЫРВОНЫ ПУЦІЛАВЕЦ»

У сувязі з мінулагодняй засухай калгас «Чырвоны пуцілавец» Дварэцкага сельсавета недабраў са сваіх палёў значную колькасць ураджаю зернавых. Гэта не дало магчымасці поўнасцю забяспечыць сябе насеннем.

Сабраўшыся днямі на сход, калгаснікі рашылі сабраць нехапаючае насенне з сваіх уласных запасаў. Першы пачын у гэтым зрабіў калгасны пастух Гаўрыла Філіповіч. З сваіх уласных запасаў ён прывёз у грамадскі свіран 2 цэнтнеры ячменю. Прыкладу Гаўрылы Філіповіча паследвалі калгаснікі Піліпенка Леанід, які ўнёс 32 кілаграмы зярна, Кутай Варвара, якая дала калгасу 20 кілаграмаў зернавых, Матусёў Грыгорый, Піліпоўскі Кузьма і многа іншых.

За адзін дзень — 5 лютага — у калгасны свіран наступіла ад калгаснікаў 500 кілаграмаў зернавых культур, якія апрыходаваны, як насенны матэрыял.

Апрача гэтага, калгаснікі ўнеслі 550 рублёй грашыма на закупку насення.

Збор зернавых для насення і грошай для яго закупкі калгаснікі калгаса «Чырвоны пуцілавец» працягваюць.

Е. Песін, старшыня Дварэцкага сельсавета

23 лютага 1948 г.

РАГАЧОЎ ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ

Роўна чатыры гады прайшло з таго часу, як наша доблесная Совецкая Армія вызваліла наш родны горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Цяжка апісаць тыя разбурэнні, якія аставілі пасля сябе фашысцкія варвары. Ад прыгожага і квітнеючага горада засталіся толькі руіны і попел. Фашысты зруйнавалі і знішчылі 1754 комунальных і ўласных дамоў, кансервны завод, картонную фабрыку, лесазавод, усе прамысловыя арцелі, навучальныя і медыцынскія ўстановы.

Пасля вызвалення горада ад нямецкай няволі, зараз-жа былі распачаты аднаўленчыя работы па яго адбудаванню. За чатыры гады поўнасцю адноўлена і пушчана ў эксплуатацыю першая чарга кансервавага завода, поўным ходам ідзе аднаўленне другой чаргі. Адноўлены усе прамысловыя арцелі горада, МТС, МТМ, усе цэхі промкамбіната, лесазавод. Працуе дзве сярэдніх і адна пачатковая школа, школа рабочай моладзі, горбібліятэка. У горадзе працуе зараз 29 гандлюючых кропак, 5 чайных і закусачных. Аднаўляецца хлебазавод, які будае абсталяваны навейшай тэхнікай. Працуе раённая бальніца на 100 ложкаў з радзільным аддзяленнем на 30 ложкаў, паліклініка, некалькі медпунктаў, санэпідстанцыя, аптэка, жаночая і дзіцячая кансультацыя, дзіцячыя яслі. Адноўлен дзіцячы дом. Працуюць радыёвузел, стацыянарная кінаўстаноўка.

Прамысловасць нашага горада выканала ў мінулым годзе план па выпуску валавай прадукцыі на 100 процентаў, кансервавы завод даў краіне прадукцыі на 113,5 процента да плана.

Адзначаючы 30-годдзе Совецкой Арміі і чацвёртую гадавіну са дня вызвалення горада Рагачова ад нямецкіх захопнікаў, працоўныя горада прыкладаюць усе намаганні, каб хутчэй залячыць раны, нанесеныя нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Наш горад з працягам часу будзе прыгажэйшым, чым ён быў да вайны.

Н. Навакоў, старшыня выканкома горсовета.

27 лютага 1948 г.

АГІТБРЫГАДА ПРЫ ДОМЕ СОЦКУЛЬТУРЫ

Пры Рагачоўскім раённым Доме соцкультуры з гурткоў мастацкай самадзейнасці арганізавана агітбрыгада, якая на перыяд палявых работ будзе даваць у бліжэйшых калгасах канцэрты. Агітбрыгада (кіруе ёй мастацкі кіраўнік ДК Н. Я. Кавалеўскі) налічвае 16 чалавек. У яе рэпертуары народныя беларускія і рускія песні, песні совецкіх кампазітараў, народныя танцы, п'еса і многа іншых нумароў.

[1] Захаваны стыль і арфаграфія тагачасных артыкулаў.

М. В. Арцёменка.

М. А. Дзмітрыеў.

У нядзелю, 18 красавіка, агітбрыгада зрабіла першы выезд у Старасельскі сельсавет. Тут для калгаснікаў была прачытана лекцыя на тэму «Паходжанне чалавека», якую чытаў завуч Старасельскай сямігадовай школы тав. Пуканаў, а потым быў дан вялікі канцэрт.

Калгаснікі былі вельмі задаволены прыездам агітбрыгады.

Такія выезды будуць наладжвацца кожны тыдзень.

Е. Кор.

13 мая 1948 г.

РАГАЧОЎСКІ РАЁН ЗА ПЯЦЬ ГОД З ДНЯ ВЫЗВАЛЕННЯ

Пяць год стваральнай працы працоўных далі свае вынікі. За гэты час уведзены у строй кансервавы завод, два промкамбінаты, 10 прамысловых арцелей, поўнасцю адноўлены ўсе калгасы, саўгасы і МТС. У раёне адбудавана 5512 дамоў для калгаснікаў, 618 грамадскіх пабудоў.

Значныя поспехі дасягнуты і ў галіне культурна-бытавога будаўніцтва. За прайшоўшыя 5 год адноўлена і працуе 72 школы, у іх займаецца звыш 11.000 вучняў. Значна палепшылася культурна-асветная работа сярод насельніцтва. Зараз у раёне працуе 20 хат-чытальняў, 3 бібліятэкі, 3 радыёвузлы, 4 кіноўстаноўкі, адна калгасная электрастанцыя.

Нямала зроблена за гэты час па адраджэнню сеткі аховы здароўя. Адноўлены і працуюць 4 урачэбных участкі, 3 сельскія ўчастковыя больніцы, 14 фельчарска-акушорскіх пунктаў, раённая больніца на 100 ложкаў, амбулаторыя, санэпідстанцыя і малочная кухня.

М. Оніпка, старшыня выканкома раённага Совета дэпутатаў працоўных.

3 красавіка 1949 г.

ДАРОЖНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Члены сельгасарцелей Стаўпнянскага і Забалацкага сельсоветаў датэрмінова выканалі план дарожнага будаўніцтва. На тэрыторыю гэтых сельсоветаў усе дарогі прыведзены ў спраўнасць, адрамантаваны і ўноў пабудаваны масты.

На жаль, не ўсе сельсоветы ўдзяляюць належную ўвагу гэтаму ўчастку работы. У Ціхініцкім і Крушынаўскім сельсоветах, не гледзячы на ўсе маючыяся магчымасці, план выканан толькі на 50 працэнтаў.

Э. Кугге.

Героі працы

АРЦЁМЕНКА Міхаіл Васілевіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Малашкавічы Рагачоўскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1947 г. жывёлавод, з 1976 г. рабочы паляводства саўгаса «1 Мая» Рагачоўскага раёна. У 1966 г. за поспехі ў павелічэнні вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1967—71 гг. На пенсіі.

ДЗМІТРЫЕЎ Міхаіл Апанасавіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Барсукі Рагачоўскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Заслужаны настаўнік Беларусі (1964). Кандыдат педагагічных навук (1968). Скончыў БДУ (1950). З 1943 г. працаваў дырэктарам Журавіцкай (Рагачоўскі раён) і Кармянскай сярэдніх школ. З 1961 г. дырэктар Кармянскай сярэдняй школы-інтэрната, з 1974 г. рэктар Мазырскага педагагічнага інстытута, з 1985 г. дацэнт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны. Даследуе праблемы гісторыі і тэорыі педагогікі і гісторыі народнай асветы. У 1971 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

ІСАЕНКА Іван Васілевіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Прудок Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобл. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1947—56 гг. працаваў на прадпрыемствах малочнай прамысловасці ў Магілёўскай вобласці і ў Стаўрапольскім краі, з 1956 г. памочнік майстра, майстар, старшы майстар, начальнік цэха, з 1978 г. інжынер-тэхнолаг Рагачоўскага малочна-кансервавага камбіната. У 1966 г. за высокія тэхніка-эканамічныя паказчыкі

І. В. Ісаенка.

Н. В. Сафонава.

М. М. Слюнькоў.

Н. А. Філіпава.

ў вытворчасці мясных і малочных прадуктаў прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Памёр у 1982 г.

САМУСЕЎ Фёдар Конанавіч. Нарадзіўся ў 1928 г. ў в. Шапчыцы Рагачоўскага раёна. З 1952 г. каваль-штампоўшчык, з 1954 г. брыгадзір кавалёў, з 1978 г. наладчык кавальска-прэсавага абсталявання Мінскага трактарнага завода. У 1966 г. за поспехі ў выкананні планавых заданняў прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Жыве ў Мінску.

САФОНАВА Настасся Іосіфаўна. Нарадзілася ў 1925 г. ў в. Гадзілавічы Рагачоўскага раёна. З 1949 г. ў калгасе «Чырвоная дуброва» (у 1949—53 гг. звеннявая па вырошчванні кок-сагызу), з 1959 г. ў калгасе «Савецкая Беларусь» (у 1970—80 гг. цялятніца) Рагачоўскага раёна. У 1951 г. за атрыманне высокіх ураджаяў кок-сагызу прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1971—75 гг. Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга. На пенсіі.

СЛЮНЬКОЎ Мікалай Мікітавіч. Герой Сацыялістычнай Працы (1974), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1971), заслужаны работнік прамысловасці Беларусі (1972). Нарадзіўся ў 1929 г. ў в. Гарадзец Рагачоўскага раёна. Член КПСС з 1954 г. Скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (1962). З 1950 г. працаваў на Мінскім трактарным заводзе, з 1960 г. дырэктар Мінскага завода запасных частак, з 1965 г. дарыктар Мінскага трактарнага завода, з 1972 г. першы сакратар Мінскага гаркома КПБ, з 1974 г. намеснік старшыні Дзяржплана СССР, у 1983—87 гг. першы сакратар ЦК КПБ, а 1987 г. сакратар ЦК КПСС, член Палітбюро ЦК КПСС. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1966—70 гг. і ў 1983—90 гг., дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1971—75 гг. З 1990 г. на пенсіі. Жыве ў Маскве.

ФІЛІПАВА Надзея Аляксееўна. Нарадзілася ў 1926 г. ў в. Гадзілавічы Рагачоўскага раёна. У 1947—51 гг. звеннявая па вырошчванні кок-сагызу ў калгасе «Чырвоная дуброва», з 1954 г. аграном Гарадзецкай МТС, калгаса «Перамога», у 1956—77 гг. калгасніца, брыгадзір калгаса «Савецкая Беларусь» Рагачоўскага раёна. У 1950 г. за атрыманне высокіх ураджаяў кок-сагызу прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Кандыдат у члены ЦК КПБ у 1971—76 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1951—55 гг. Памерла ў 1990 г.

* * *

ЯКУШАЎ Іван Міронавіч. Нарадзіўся ў 1936 г. ў в. Гарадзец Рагачоўскага раёна. Скончыў курсы механізаратаў у Гарадзецкай МТС. Працуе механізатарам у калгасе «Рассвет» Рагачоўскага раёна. За высокія паказчыкі ў сельскагаспадарчай вытворчасці ўзнагароджаны ордэнамі Працоўнай Славы II і III ступеняў, медалямі. У 1985 г. І. М. Якушаву прысвоена званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР.

СЯРГЕЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ ВІШНЕЎСКІ.

Генерал-маёр (1940). Нарадзіўся 5(17). 4.1893 г. ў Рагачове. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1933). У Чырвонай Арміі з 1918 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—40 гг. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на Заходнім фронце, камандуючы арміяй. У кастрычніку 1941 г. трапіў у палон, знаходзіўся ў нюрнбергскай турме, канц-

С. З. Галкін.

А. Дз. Жаўрук.

лагерах. Вызвалены ў 1945 г. З 1947 г. на выкладчыцкай рабоце, з 1949 г. ў адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, 4 іншымі ордэнамі, медалямі. Памёр С. У. Вішнеўскі 22.6.1967 г.

САМУІЛ ЗАЛМАНАВІЧ ГАЛКІН

Яўрэйскі паэт і драматург. Нарадзіўся ў 1897 г. ў Рагачове. Пачаў друкавацца ў 1920-я гады. У зборніках паэзіі «Боль і мужнасць» (1929), «За новы фундамент» (1932), «Кантакт» (1935), «Дрэва жыцця» (1948) паказаў адыход шырокіх яўрэйскіх мас ад старога ладу жыцця і ўдзел у грамадскім будаўніцтве. Яго вершы і паэмы вызначаюцца афарыстычнай адточанасцю, уменнем перадаваць найтанчэйшыя рухі думак і пачуццяў. Драматычныя творы «Бар-Кохба» (1939), «Суламіф» (1940) ішлі на сцэнах савецкіх тэатраў. Трагедыя «Паўстанне ў гета» («За жыццё», 1947) расказвае пра паўстанне ў варшаўскім гета супраць фашысцкіх акупантаў. У зборнік «Зямныя шляхі» (1945) увайшлі патрыятычныя вершы аб Вялікай Айчыннай вайне. Ён перакладаў на яўрэйскую мову творы А. Пушкіна, В. Шэкспіра, М. Лермантава, А. Блока, С. Ясеніна, Г. Лангфела, У. Маякоўскага, Л. Лявонава. Асноўныя творы Галкіна перакладзены на рускую мову. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны». Памёр С. З Галкін у 1960 г.

АЛЯКСАНДР ІЛЫЧ ГІНЦБУРГ

Кінааператар і рэжысёр. Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1955) і РСФСР (1969). Нарадзіўся 16.2(1.3).1907 г. ў Рагачове. У 1927 г. скончыў Ленінградскі фотатэхнікум, у 1934 г.— Ленінградскі электратэхнічны інстытут. З 1925 г. аператар кінастудыі «Ленфільм», з 1943 г. на кінастудыі імя М. Горкага. У 1948—58 гг. працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». Аператар мастацкага фільма «Канстанцін Заслонаў» (1949), фільмаспектакляў «Паўлінка» (1952), «Пяюць жаваранкі» (1953), «Хто смяецца апошнім» (1954), дакументальнага фільма «Калгас «Рассвет» (1952); мастацкі кіраўнік фільма «Беларускі канцэрт» (1956). Аператарскаму майстэрству Гінцбурга характэрны лаканізм і прастата кампазіцыі ў пабудове кадра, дакладная перадача псіхалагічнага настрою, атмасферы сцэн і эпізодаў, выразная работа са святлом, увага да мастацкай дэталі, пейзажу. Выступаў таксама як рэжысёр і сцэнарыст.

Памёр А. І. Гінцбург 15.11.1972 г.

В. І. Смаль.

УЛАДЗІМІР МІХАЙЛАВІЧ ГОВАР-БАНДАРЭНКА

Беларускі акцёр, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь (1961). Нарадзіўся 8(21).6.1914 г. ў Рагачове. У 1937 г. скончыў Беларускую студыю пры тэатральным вучылішчы ў Ленінградзе. Працаваў у 1937—41 гг. у Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача імя Крупскай, у 1944—46 гг. у Гродзенскім абласным драмтэатры, у 1946—49 гг. у Брэсцкім абласным драмтэатры, у 1956—78 гг. у Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача. Выканаўца характарных роляў. Створаныя артыстам вобразы пераконваюць псіхалагічнай дакладнасцю — ад агульнай характарыстыкі да нюансаў у інтанацыях і міміцы. Сярод лепшых работ: у Брэсцкім тэатры — Ладыгін («Звычайны чалавек» Л. Лявонава), Ваня Земнухоў («Маладая гвардыя» паводле А. Фадзеева), Галубкін («Сустрэча з юнацтвам» А. Арбузава), Ярашэвіч («Ірынка» К. Чорнага), у Беларускім тэатры юнага гледача — Жухрай («Як гартавалася сталь» паводле М. Астроўскага), Гараднічы («Рэвізор» М. Гогаля), Алег Баян («Клоп» У. Маякоўскага), Гусляр («За лясамі дрымучымі» А. Вольскага і П. Макаля), Янук, Шыдлоўскі («Папараць-кветка», «Над хвалямі Серабранкі» І. Козела), Тата Карла («Прыгоды Бураціна» паводле А. Талстога), Канцлер («Цудоўная дудка» В. Вольскага), Лыняеў («Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага), Мантанелі («Авадзень» паводле Э. Л. Войніч), Тарталья («Зялёная птушка» К. Гоцы), Сорын («Чайка» А. Чэхава).

ЯКАЎ АБРАМАВІЧ ГОЛЬБІН

Беларускі эканаміст, доктар эканамічных навук (1970). Нарадзіўся 1.7.1925 г. ў Рагачове. Скончыў Беларускі інстытут народнай гаспадаркі імя Куйбышава (1949). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1949—50 гг. працаваў у Дзяржплане БССР, з 1950 г. ў Інстытуце эканомікі Акадэміі навук Беларусі: з 1952 г. старшы навуковы супрацоўнік, у 1973—82 гг. загадчык сектара грамадскай прадукцыйнасці працы, з 1982 г. старшы навуковы супрацоўнік-кансультант. Асноўны кірунак навуковай дзейнасці — эканоміка ліцейнай вытворчасці. Аўтар навуковых работ «Пытанні эканомікі ліцейнай вытворчасці» (1960; перакладзена на нямецкую мову і выдадзена ў Берліне ў 1964 г.), «Эканамічная эфектыўнасць дакладнага ліцця ў машынабудаванні» (1964), «Праблемы эканомікі ліцейнай вытворчасці» (1971, разам з У. А. Германам). Жыве ў Мінску.

НАВУМ ЯКАЎЛЕВІЧ ГУБЛЕР

Беларускі празаік. Піша па-руску. Нарадзіўся ў 1933 г. ў Рагачове. Скончыў лётнае вучылішча грамадзянскай авіяцыі ў г. Сасава Разанскай вобл. (1954), Ульянаўскую школу вышэйшай лётнай падрыхтоўкі (1956), БДУ (1969). Працуе ў грамадзянскай авіяцыі: кіраўнік палётаў, начальнік змены службы кіравання паветраным рухам.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1957 г. Аўтар кніг «Веснавы рэйс» (1979), «Пры ўспышцы маланкі» (1985), «Палёт працягваецца» (1986), «Непралітая хмара» (1992). Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1992 г.

АЛЕСЬ ЖАЎРУК

Беларускі паэт Алесь Жаўрук (Аляксандр Дзмітрыевіч Сінічкін) нарадзіўся 19.8.1910 г. ў г. Сянно Віцебскай вобласці ў сям'і служачага. Дзяцінства і юнацтва паэта прайшлі ў Рагачове. Па сведчанні паэта А. Зарэцкага, дзяцінства ў Алеся Жаўрука было нялёгкае.

«Бацькі яго атрымалі ад гарсавета пляц і збіраліся пабудаваць для сям'і дом, каб, нарэшце, развітацца з прыватнай кватэрай, але ў 1922 г. Шураў бацька, бухгалтар рагачоўскага казначэйства, раптоўна памёр ад тыфу. Маці засталася адна з трыма малымі, а неўзабаве пасля смерці нарадзілася і чацвёртае дзіця — трэцяя дачка. І замест прыстойнага дома на ўсю сям'ю ўдава на сваю

У. Говар-Бандарэнка ў ролях Гараднічага (злева) у спектаклі «Рэвізор» М. Гогаля і Шыдлоўскага ў спектаклі «Над хвалямі Серабранкі» І. Козела.

сціплую зарплату акушэркі адолела паставіць маленечкую хату, амаль палавіну якой займала вялізная руская печ. Гэта печ і карміла, і грэла, і была, асабліва зімой, тым надзейным прытулкам, дзе можна адпачыць і выспацца.

Хатка стаяла на пагорку, і ранняй вясной, калі яшчэ на дрэвах не было лісця, Шура і я залазілі на гонтавы дах, адкуль віднелася на ўсходзе агромністае разводдзе Дняпра, а на захадзе меншае, але таксама ўражальнае для дзіцячых вачэй — Друці...

Што і казаць, жылося асірацелым Сінічкіным цяжка, але сям'я была дружная, працавітая, а ўдава Елізавета Сцяпанаўна, якая і дагэтуль застаецца для мяне ўзорам мацярынскай самаахвярнасці, рабіла ўсё магчымае і немагчымае, каб паставіць дзяцей на ногі. А час быў нялёгкі — першыя гады пасля вялікіх апусташальных войнаў — першай сусветнай і грамадзянскай» (Зарыцкі А. Голас з далёкіх дзён вясны // Жаўрук А. Крывёю сэрца. Мн., 1987. С. 3—4).

У час вучобы ў школе А. Жаўрук пасябраваў з А. Зарыцкім, удвух яны выдавалі сатырычную газету «Смех і слёзы». Летам 1926 г. разам з Зарыцкім будучы паэт хадзіў у Бабруйск, каб паказаць М. Лынькову вершы і сумесна напісаную аповесць «Аб чым галасілі варштаты» (рукапіс не захаваўся). Тады ж у Бабруйску сустрэлі М. Чаромху (Блісцінава), пазнаёміліся з Р. Суніцам (Рыгорам Лыньковым). У 1927 г. Алесь Жаўрук паступіў у Рагачоўскі педтэхнікум, пасля заканчэння якога настаўнічаў на Любаншчыне ў саўгасе «Сосны». У 1939 г. скончыў літаратурны факультэт Маскоўскага інстытута гісторыі, філасофіі і літаратуры і адразу паступіў у аспірантуру пры АН БССР. Аднак неўзабаве быў прызваны ў Чырвоную Армію. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны А. Жаўрук на фронце ў якасці карэспандэнта арміейскай газеты «В бой за Родину». 23 жніўня 1942 г. ў час варожай бамбёжкі Сталінграда і яго прыгарадаў палітрук 62-й арміі А. Дз. Сінічкін быў цяжка паранены і накіраваны ў шпіталь. Паводле ўспамінаў украінскага паэта М. Упеніка, які разам з А. Жаўруком працаваў у рэдакцыі газеты, «...фашысцкая бомба ўзарвалася і ў раёне шпіталя. Алесь быў паранены другі раз. Разам з другімі параненымі яго, яшчэ жывога, перанеслі на бераг Волгі, а адтуль — на палубу судна, каб пераправіць на левы бераг. Але паветраны налёт ворагаў не спыняўся. І адна бомба была скінута на судна, над якім развяваўся сцяг з чырвоным крыжам...

Разам з іншымі салдатамі беларуса Алеся Жаўрука навекі прыняла волжская вада» (Упенік М. Пра майго беларускага сябра // Жаўрук А. Крывёю сэрца. Мн., 1987. С. 187).

У гэты трагічны дзень паэт атрымаў ліст ад жонкі з радаснай весткай аб нараджэнні сына і нават паспеў адказаць ёй: «Ну, дзякую табе, вялікі дзякуй табе за сына. Толькі атрымаў твой ліст, перачытаў яго некалькі разоў. Вось радасць якая, што ўсё абышлося добра. Даражэнькая мая, глядзі, беражы цяпер сыночка. Ён мне, як і ты, даражэй за ўсіх на свеце, як бы я хацеў зараз быць разам з вамі, расцалаваць вас!..»

З вершамі Алесь Жаўрук дэбютаваў у 1926 г. ў абласной газеце «Магілёўскі селянін» і бабруйскай акруговай газеце «Камуніст», а пазней і ў літаратурным дадатку да яе — «Вясна». Першы зборнік паэзіі «Ручаіны» выйшаў у 1936 г., а праз два гады — «Дняпро выходзіць з берагоў». У сааўтарстве з А. Ушаковым пісаў творы для дзяцей: паэмы «Пра майго таварыша», «Пра слаўных папанінцаў нашага дзетсада» (абедаве 1939) і інш. Сааўтар лібрэта першай беларускай аперэты «Зарэчны барок» (разам з А. Ушаковым). Найбольш значны твор Алеся Жаўрука — паэма «Крывёю сэрца» (1938), прысвечаная барацьбе з фашызмам рэспубліканскай Іспаніі. Яго творам уласцівы яснасць думкі і пачуцця, сталасць зместу, эстэтычная завершанасць. У іх адлюстравалася ўспрыняцце свету тым пакаленням, якому выпала адчуць пафас першых пяцігодак і стаць у суровы ваенны час на абарону незалежнасці сваёй Айчыны.

А. С. Гурская, В. У. Ярац.

РАСЦІСЛАЎ ПЯТРОВІЧ ЖБАНКОЎ

Беларускі вучоны, доктар фізіка-матэматычных навук (1972), прафесар (1974), член-карэспандэнт Беларускага аддзялення Міжнароднай інжынернай акадэміі (1992). Нарадзіўся 30.10.1930 г. ў Рагачове. Скончыў БДУ (1954). З 1959 г. працуе ў Інстытуце фізікі Акадэміі навук Беларусі (з 1970 г. загадчык лабараторыі малекулярнага спектральнага аналізу). Працы па спектраскапіі вугляводаў і прыродных высокамалекулярных злучэнняў. Вывучае цэлюлозу і іншыя вугляводы метадамі малекулярнай спектраскапіі і малекулярнай механікі. Аўтар 8 манаграфій, шматлікіх навуковых артыкулаў, мае 45 вынаходніцтваў. Лаўрэат прэміі Савета Міністраў СССР (1987). Падрыхтаваў 26 кандыдатаў і дактароў навук. Член рэдкалегіі 2 міжнародных навуковых часопісаў. Адзін з аргані-

затараў фізкультурна-аздараўленчай работы ў рэспубліцы, член нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі.

КАНСТАНЦІН ІВАНАВІЧ ЗАВІША

Беларускі жывапісец. Нарадзіўся 7(20).10.1904 г. ў Рагачове. У 1930 г. скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У мастацкіх выстаўках удзельнічаў з 1932 г. Працаваў пераважна ў галіне лірычнага пейзажа і нацюрморта: «Асенні матыў» (1937), «Стары Мінск» і «Мінскі дворык» (да 1940), «Днепр» (1945), «Раніца ў вёсцы» (1956), «Астры» (1958), «Кветкі і Венера» і «Старонка лясная» (абодва 1960), «Восень. Баяры» і «Пасля навальніцы» (1978) і інш. Аўтар сюжэтна-тэматычных карцін «Пасля работы» (1957), «Юныя рыбаловы» (1963), «Лесараспрацоўка. Першы рэйс» (1967) і інш.

Памёр К. І. Завіша 28.2.1984 г.

ФЁДАР ІВАНАВІЧ КУЛЯШОЎ

Беларускі літаратуразнавец і крытык. Нарадзіўся 5(18).6.1913 г. ў в. Вялікія Стралкі Рагачоўскага раёна. Пасля заканчэння Ленінградскага абласнога настаўніцкага інстытута (1935) працаваў у школе выкладчыкам рускай мовы і літаратуры. У 1944 г. Ф. І. Куляшоў скончыў Ленінградскі дзяржаўны пединстытут імя А. У. Герцэна. З гэтага часу выкладчык ВНУ: у 1951—55 гг. і з 1961 г. ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, у 1955—61 гг. у Сахалінскім педагагічным вучылішчы. Доктар філалагічных навук (1964), прафесар (1965).

Ф. І. Куляшоў.

Ф. І. Куляшоў друкуецца з 1932 г. Даследуе гісторыю рускай літаратуры 19— пачатку 20 ст. і сучасную беларускую літаратуру. Аўтар кніг «Жыццё і творчасць Л. М. Талстога» (1953), «Сатырычная паэзія М. А. Някрасава» (1954), «Міхась Лынькоў» (1961, дапоўненае выданне 1979), «Міхась Лынькоў. Семінарый» (1963), «Іван Мележ» (1968), «Сучасная беларуская проза» (1970), «Лекцыі па гісторыі рускай літаратуры канца XIX — пачатку XX ст.» (ч. 1—2, 1976—80), «Літаратурныя партрэты» (1983). Аўтар літаратурна-крытычных артыкулаў пра творчасць Я. Брыля, І. Шамякіна, І. Навуменкі, П. Пестрака, М. Лобана, Б. Сачанкі, І. Чыгрынава і інш. Склаў зборнікі «А. П. Чэхаў пра літаратуру і мастацтва» (1954), «Максім Горкі і Беларусь» (1968), «А. І. Купрын пра літаратуру» (1969), «Леў Талстой і Беларусь» (1981). Аўтар працы «Творчы шлях А. І. Купрына...» (2 выд., 1983—87).

З майго мінулага

З успамінаў Ф. І. Куляшова

Што праўда, то праўда: бяда ніколі адна не ходзіць. Ранняй вясной памерла мая маці, здаецца, ад родаў. Праз два месяцы бацька захварэў на тыф. Лячыць яго не было каму, і ён неўзабаве памёр. Хавалі яго летам, у гарачыню, стараючыся як найхутчэй вынесці дамавіну з душнай і цеснай хаты. Здарылася гэта ў 1920 годзе. Засталіся мы ўпяцярых. Старэйшаму, Ігнату, было шаснаццаць, мне — роўна сем гадоў. Бацькі не пакінулі нам нічога, апрача каровы, дзесяціны пясчанай, неўрадлівай зямлі ды хаты — старой, струхнелай, якая сіратліва стаяла без панадворку, прыкладна за вярсту ад вёскі Вялікія Стралкі. Ні каня, ні плуга, ні хатніх рэчаў, годных на продаж, не было нават курыцы на развод. Быў час разрухі, голаду, грамадзянскай вайны. Як жыць? Што рабіць, каб не памерці з голаду? Цётка Марфа і дзядзька Усцін, якія былі на пахаванні бацькі, параіўшыся, вырашылі параздаваць нас па «людзях». Ігната неўзабаве ўладкавалі ў Малыя Стралкі ў кулака Мурашкі, некуды ў іншае месца быў аддадзены ў пастухі сярэдні брат Дзмітрый; старэйшай сястры Люсі выпала нялёгкая доля быць гаспадыняй у хаце, гадаваць пяцігадовую Аню (пазней і яна пайшла ў наймічкі) і даглядаць карову. Мяне забраў да сябе дзядзька Еўдакім, брат нябожчыцы-маці. Так і разляцеліся тады мы — «бязбацькавічы» — па белым свеце,

і ўжо ніколі потым не прыйшлося нам жыць разам, адной сям'ёй, пад адной страхой.

З таго лета, гаротна памятнага мне на ўсё жыццё, я быў пастаўлены перад неабходнасцю самастойна, уласным мазалём здабываць сабе кавалак хлеба. Так я апынуўся ў пастушках. Трэба было рабіць быццам і простую, але нялёгкую для маіх гадоў справу — пасвіць дзядзькавых авечак і кароў, карміць курэй і свіней, няньчыць дзіцё, сачыць за тым, каб сусе-дава жывёла, крый божа, не ўзбегла на «нашу» траву ці поле.

Зрэдку, у нядзелю, мяне пускалі «дадому», на хутар да сястры, і я бег туды, ад радасці не чуючы ног пад сабой. Сястра частавала мяне хлебам і малаком у паліванай конаўцы і настойліва дапытвалася, ці б'юць мяне і ці часта б'юць; галасіла, успамінала бацьку і маці. Ад яе вяртаўся я невясёлы.

З роднымі братамі бачыўся вельмі рэдка.

У дзядзькі я пражыў, здаецца, адно лета і даве зімы. Добра помню, як у адзін з вясновых дзён — тады я ўжо скінуў з ног лапці і бегаў басанож, хаця зямля і была яшчэ халодная, да дзядзькі Еўдакіма прыйшоў нейкі незнаёмы мужчына і сказаў мне:

— Я забяру цябе з сабой. З тваёй сястрой і братам усё дамоўлена. Пойдзеш да мяне?

Што я мог яму адказаць?

— Пайду. Мне ўсё роўна.

І ён павёў мяне. Ішлі чуць не цэлы дзень доўгай дарогай ад Вялікіх Стралкоў да мястэчка Гарадзец, праз само мястэчка, затым кудысьці на хутар. Пазней, пасталеўшы, я даведаўся, што мы прайшлі тады не больш шасці вёрст. Незнаёмы мужчына прывёў мяне ў хату, загадаў лезці на печ абагрэцца і тут жа гучна крыкнуў у акно:

— Мама, паглядзі, якога пастушка я прывёў.

Увайшла старая жанчына, агледзелася ў хаце і, прыкмеціўшы мяне на печы, расчаравана прамовіла:

— Божа ж мой, гэта ж яшчэ зусім дзіця! І які з яго пастух? Яго ж каровы заборуць... Ты, напэўна, есці хочаш?..

Так я апынуўся ў сям'і Ісака Барысенкі. Мяне прывёў сюды яго старэйшы сын Хведар, а ласкавую бабку потым я стаў называць цёткай Насцяй.

Пацягнуліся звычайныя пастухоўскія дні. Будзілі мяне да ўсходу сонца. Я браў доўгую пугу і выганяў за вароты жывёлу. Барысенкі жылі заможна, кароў было многа, так што да самага вечара мне хапала бегатні. Непрыкметна завяліся ў мяне дружбакі сярод такіх, як і я, пастушкоў. Асабліва блізка падружыўся з Андрэем Кордзікавым. У самы прыпар, у поўдзень, калі каровы, не вытрымаўшы гарачыні, беглі пад паветку, мы, хлапчукі, беглі пад Гарадзец, на рэчку, і боўталіся там, пакуль не прыходзіў час зноўку гнаць жывёлу ў поле.

Зімой былі і іншыя неадкладныя справы і клопаты: то абіраць бульбу, то мясці падлогу ці мыць посуд, то віць з канапель тонкія вяровачкі і плесці на калодцы чуні, то разам з гаспадаром ісці ў гумно па сена для скаціны і паіць кароў на двары, то няньчыць маленькую даяўчынку, крыклівую, капрызную, хваравітую. Толькі ў вялікія рэлігійныя святы мне дазвалялі пайсці пагуляць да суседзяў ці нават у мястэчка. Часам «сам» Барысенка браў мяне з сабою, калі ішоў у нядзелю раніцай у царкву, у Гарадзец. Сям'я гаспадара была рэлігійнай, строга пільнавалася пастоў ці царкоўных звычаяў. Я таксама верыў у бога.

Барысенка чамусьці не пускаў мяне ў школу. Да гэтай пары памятаю, з якой зайздрасцю глядзеў я праз акно, як кожную раніцу рупліва талакой спяшаліся хлопцы з вёскі Граб'е ў бок мястэчка, дзе была школа. Сярод іх быў і мой сябар Андрэй Кордзікаў. Неаднойчы я падпільноўваў яго, калі ён вяртаўся дамоў, і Андрэй, смешна заікаючыся, расказваў пра тое, што было ў школе. Менавіта Андрэй, які быў крыху старэйшы за мяне, адыграў у маім жыцці ролю своеасаблівага настаўніка: ён навучыў распазнаваць першыя літары алфавіта.

Чытаць я навучыўся самастойна. Цяжка цяпер сказаць, як гэта адбылося. Помню, што ў доме Ісака Барысенкі было некалькі нумароў газеты «Церковные ведомости», валяўся пашматаны «Русский букварь» Вахцерава і яго ж «Мир в рассказах для детей» з вялікай колькасцю малюнкаў; на сцяне былі наклеены нейкія ярка пафарбаваныя плакаты, мабыць, з часоў нядаўняй грамадзянскай вайны. Па гэтых «пісьмовых крыніцах» і авалодаў я пачаткамі граматы. Мне тады ішоў адзінаццаты год.

Неяк зімой на хутар прыйшла трывожная вестка: памёр Ленін. Я не ведаў, хто ён, хаця з размоў зрабіў вывад, што гэта, відаць, вельмі вялікі чалавек. Не ведаю чаму, але я тады быў упэўнены, што памёр ён зусім недалёка ад нас, у мястэчку Гарадцы. Відаць, пры мне неаднойчы вымаўлялася слова «Горкі», і яно

неяк асацыіравалася ў маёй свядомасці з больш звычайнай і блізкай мне назвай недалёкага мястэчка.

Пасля двух гадоў пастушкоўства ў Барысенкі мяне адвезлі вясной 1924 года ў далёкую вёску Селівонаўку і перадалі Рымараву Апанасу. Жыў ён не ў самой вёсцы, а недзе на водшыбе. Быў гэта чалавек мажны, нейкі пульхны і сыты, з круглым чырвоным тварам, нізкі і тоўсты, як бочка. Чамусьці ён адразу неўзлюбіў мяне, я яго — таксама. Аднойчы ён адлупцаваў мяне раменнай дзягай за тое, што, пасучы раніцай кароў, я заснуў, а яны, праклятыя, забрылі ў чужую грэчку.

Аднак мушу выказаць і словы шчырай удзячнасці Апанасу: гэта ён аддаў мяне ў школу. Восенню 1924 года я ўпершыню пераступіў школьны парог. Настаўнікам быў нехта Кунцэвіч, які вучыў адначасова чатыры класы ў адным прасторным пакоі. Спачатку ён пасадзіў мяне ў той рад, дзе сядзелі першакласнікі. Нечым я яму спадабаўся, і Кунцэвіч неўзабаве «перавёў» мяне ў другі клас, гэта значыць, перасадзіў за парту ў другім радзе. Я прагна накінуўся на падручнікі і кнігі. Чытаў многа, але, здаецца без усякай сістэмы.

Той зімой не давялося мне закончыць другога класа. Прыехаў аднойчы дзядзька Улас, мой родзіч па матчынай лініі, і, пагаварыўшы з Апанасам, сказаў мне тонам загаду:

— Вось што, Хведзька, рыхтуйся ў дарогу. Адвязу цябе ў Бабруйск, у прыют. Хочаш? Усё роўна, кажаш? Ну і добра. Не прападаць жа табе сіраціной сярод чужых людзей. І лячыць цябе трэба, а то аслепнеш.

Быў сакавік 1925 года. З дзядзькам Уласам я — па разводдзі, па калені мокры — дабраўся да станцыі Салтанаўкі. Тут мы селі ў цягнік. Я ўпершыню апынуўся ў вагоне, быў вельмі ўсхваляваны і ўсю дарогу глядзеў у акно.

Бабруйск здаўся мне вельмі вялікім горадам. Дзядзька вёў мяне за руку і ўсю дарогу, пакуль ішлі ад вакзала да цэнтра, пераконваў, што, калі спытаюць, ці ёсць у мяне родныя, сваякі, я павінен гаварыць: «Нікога няма»,— і пры гэтым плакаць, а то, чаго добрага, яшчэ не возьмуць у прыют. Я маўчаў.

Дзядзька аформіў нейкія паперы і адразу здаў мяне ў прыют. Развітваючыся, пацалаваў тройчы, а я доўга не адпускаў яго, адчуваючы, што пераступаю якісьці рубеж у сваім жыцці.

Вакол тоўпіліся і шумелі віхрастыя, бойкія хлапчукі. Яны паднялі мяне на смех за тое, што быў у лапцях. Хтосьці з выхаванцаў заступіўся за мяне. На душы было цяжка, сумна, адзінока. У першую ноч я моўчкі выплакаўся над коўдрай і вырашыў уцякаць у вёску, да сястры, толькі не ведаў, як гэта зрабіць. Паступова пачаў звыкацца з абстаноўкай. Асвойваўся. Мяне адзелі ва ўсё «гарадское», і я стаў нават знешне падобны на іншых. Хлапчукі, хаваючыся ад выхавацеляў, бегалі на рынак — і я з імі. Потым мы гуртам адпраўляліся на Бярэзіну купацца, блукалі па горадзе, збіралі акуркі і яркія афішы. Паціху пачалі курыць. Я хутка авалодаў «блатным» жаргонам.

У Бабруйску пражыў я з паўгода. У канцы лета, у саставе вялікай групы выхаванцаў, адправілі мяне ў другі дзіцячы дом — у Пірэвічы, непадалёк ад Салтанаўкі.

Пірэвіцкі дзетдом знаходзіўся ў былым памешчыцкім маёнтку. Вакол дома — парк, ліпавыя алеі, вялікі сад, возера. Зусім блізка была школа. Мяне залічылі ў трэці клас, аднак, калі праверылі веды, перавялі ў чацвёрты. Вучыўся я ўвесь час добра. Стаў піянерам. Зрабіўся кніжнікам. Перачытаў усё, што было ў дзетдомаўскай бібліятэцы, у першую чаргу — Жуля Верна і Дж. Лондана. Незабыўнае ўражанне зрабіў на мяне толькі што выдадзены тады «Сымон-музыка». Крыху пазней прыйшлі дзве кнігі трылогіі Коласа, «Салавей» Бядулі і «Сцежкі-дарожкі» Зарэцкага. Паланіў мяне «Салават Юлаеў» Злобіна. З Талстога першым прачытаў «Уваскрэсенне», а потым іншыя яго рэчы. Складаў нейкія вершы, відаць, дрэнныя.

Было ў нас і чытанне іншага зместу. Аднекуль у дзетдом папалі ў рукапісе вершы знакамітага Баркова — пра Луку, пра купчыху і г. д. Іх ведалі ўсе хлапчукі. З рук у рукі перадаваліся «Прыгоды Рокамболя». Моцна запомніўся мне «Антон Крэчат» Міхаіла Раскатава, зусім забытага цяпер рускага пісьменніка, які «працаваў» пад «Рокамболя». Восем невялічкіх кніжак Раскатава і дэтэктыў Папсона дэ Тэррайля абуджалі прагу да розных незвычайных здарэнняў, як, напрыклад, уцёкаў з дзіцячага дома. Я таксама разы тры быў «уцекачом».

Звычайна гэта адбывалася пасля заканчэння школьных заняткаў. Згаварваліся трыпяць чалавек, запасаліся правіянтам — і на месяц-два знікалі, ператвараліся ў безнаглядных бадзяг. Бывала, лавіла нас дарожная міліцыя і вяртала

ў дзетдом. Іншыя самі вярталіся.

Мае апошнія ўцёкі з Пірэвіч былі ў трыццатым годзе. Са сваім «напарнікам» Амбражэвічам я адправіўся «зайцам» праз Гомель у бок Адэсы. За лета мы агаралі не адну сотню вёрст — то цягніком, то пешку: пабылі і ў Чаркасах, і ў Кіеве, і ў Харкаве, і яшчэ ў дзесятках гарадоў. Аднойчы, пры спробе на хаду ўскочыць на падножку вагона, я сарваўся і толькі цудам уцалеў. Дзесьці ў Залатаношы я і Амбражэвіч згубілі адзін аднаго. Мяне моцна пацягнула ў родныя мясціны, і я вырашыў ехаць у Мінск.

Босы, не вельмі прыстойна адзеты, схуднелы, з'явіўся я ў сталіцу. Хаця мне споўнілася семнаццаць гадоў, я тады выглядаў падлеткам, нізенькім і мізэрным. Мне захацелася зноў вярнуцца ў школу, вучыцца: быў канец жніўня. Проста з цягніка я прыйшоў у Дзеткамісію (была такая ўстанова пры ЦВК БССР). Пажылы мужчына ў акулярах, выслухаўшы мой расказ, сярдзіта сказаў:

— Аднак жа ты зноў уцячэш, неўгамонная душа! Пэўна ж, уцячэш, га?

— Ну, што вы! Навошта тады было б ехаць у гэтую далячынь, калі б я збіраўся кудысьці збегчы? Я хачу вучыцца. Праз шэсць дзён мне трэба быць у школе.

Здаецца, ён мне паверыў, бо загадаў накарміць і выдаць грошы на праезд да Бабруйска, у распараджэнне акрана. Да Бабруйска я, вядома, ехаў без білета: тады ўсе цягнікі былі «мае». З загадчыкам бабруйскага акрана, якому я ўручыў сваю мінскую пуцёўку, у мяне адбылася размова, прыкладна, такога ж характару, як і ў Дзеткамісіі. Мне выпісалі новую паперу і накіравалі ў Рагачоў. Я адразу ж паехаў туды звыклым спосабам — на платформе таварнага цягніка. Загадчык Рагачоўскага райана, мяккі і ласкавы Бахановіч, развёў рукамі:

— Што мне з табой рабіць? Ты, кажаш, стралкоўскі, з-пад Гарадца? Пашлю хіба цябе ў Гарадзецкую школу, да Паўлава. Ён харошы чалавек. Няхай корміць цябе і давучае.

Аляксей Міхайлавіч Паўлаў, які загадваў Гарадзецкай ШКМ, прыняў жывы інтарэс у маім лёсе. Ён уладкаваў мяне на жыццё пры школе, разам з вартаўніком, а есці я павінен быў хадзіць у сталоўку. Назаўтра я сядзеў ужо за школьнай партай.

Вучоба, па якой згаладаўся за лета, ішла бліскуча. Настаўнікі хвалілі, асабліва выкладчык літаратуры Б. Карпаў. Я адразу запісаўся ў два гурткі, маляваў плакаты, афармляў школьную насценгазету, памагаў вартаўніку прыбіраць вечарам класныя пакоі. Аднойчы паслаў у раённую газету «Камунар» нейкі допіс, яго надрукавалі, і я стаў пісаць туды рэгулярна. Разам з Колем Журомскім, які пісаў вершы, захапляліся паэзіяй, асабліва Ясеніным, многа чыталі.

Гарадзецкую ШКМ скончыў вясной 1931 года. Неяк у камандзіроўку ў Гарадзец прыехаў рэдактар «Камунара» Ц. Парошын, адшукаў мяне і прапанаваў працу ў рэдакцыі. Я з радасцю згадзіўся. Перабраўся ў Рагачоў, стаў літсупрацоўнікам газеты. Маім непасрэдным начальнікам быў Н. Седляроў, таварышамі па рабоце — мае аднагодкі Ян Клімовіч і Патап Сурыновіч. З даручэннямі рэдакцыі я насіўся па горадзе, ішоў у МТС, ехаў у вёску, у калгас або саўгас. Энергіі ў мяне было тады, здаецца, на дзесяцёх чалавек. Пісаў карэспандэнцыі, артыкулы, пераходзячы часта на нарыс. Пісаў кожны дзень, працуючы ў «чатыры рукі». У 1932 годзе стаў уласным карэспандэнтам газеты «Савецкая Беларусь» па Рагачоўскім раёне.

Час ад часу рэдакцыя «Камунара» адводзіла адну паласу пад «літаратурную старонку». Тут друкаваў свае вершы рагачовец Алесь Жаўрук, а таксама Сымон Бытавы, Міхась Скрыпка, Мікола Сурначоў, Мікола Бацюшкаў, крыху пазней — Канстанцін Цітоў, Аляксей Зарыцкі.

Працуючы ў «Камунары», я адначасова слухаў лекцыі ў вячэрнім камвузе, закончыў курсы па падрыхтоўцы ў Магілёўскі педінстытут. Мне вельмі хацелася атрымаць вышэйшую адукацыю і пры тым як мага хутчэй, пакуль яшчэ не пастарэў: у 1933 годзе мне споўнілася 20 гадоў. Я рашыў дзейнічаць неадкладна. У жніўні месяцы я заявіў рэдактару, што паеду ў Ленінград. Угаворы і адгаворы не памаглі: я пакінуў Рагачоў, каб стаць студэнтам Ленінградскага педінстытута імя Пакроўскага...

Друкуецца па кн.: Вытокі песні. Мн., 1973. С. 115—121.

АНДРЭЙ МАКАЁНАК

Беларускі драматург, народны пісьменнік Беларусі Андрэй Ягоравіч Макаёнак нарадзіўся 12 лістапада 1920 г. ў в. Борхаў Рагачоўскага раёна ў сялянскай сям'і. Бацька, Ягор Сяргеевіч, быў арганізатарам камуны ў роднай вёсцы, расстраляны ў час вайны гітлераўцамі. Маці, Малання Міхайлаўна, памерла ў 1978 г.

А. Макаёнак у 1939 г. скончыў Журавіцкую сярэднюю школу і паступіў у ваеннае вучылішча. Аднак вайсковыя падкі прыняць не здолеў і вярнуўся на радзіму. Год працаваў у раённым доме сацыялістычнай культуры, пасля чаго паступаў ва Усесаюзны інстытут кінематаграфіі. Не прынялі, запрасілі паступаць праз год. Але выйшаў указ аб прызыве на вайсковую службу юнакоў з сярэдняй адукацыяй на год раней, і будучы пісьменнік апынуўся на Каўказе. Пачаліся будні суровай армейскай вучобы з частымі начнымі баявымі трывогамі, знясільваючым капаннем акопаў у скальным грунце. Неўзабаве атрымаў прызначэнне на пасаду намесніка палітрука роты. Палёгкі гэта не прынесла: засталася тая ж салдацкая ноша, але дадаўся абавязак чытаць чырвонаармейцам газеты, праводзіць гутаркі, выпускаць баявыя лісткі...

У першыя месяцы вайны дывізія, у якой служыў А. Макаёнак, у баявых дзеяннях не ўдзельнічала: яна была ўведзена ў Іран, каб папярэдзіць пранікненне туды гітлераўскіх войск. Баявое хрышчэнне адбылося напярэдадні 1942 г.: дывізію перакінулі ў Крым, і А. Макаёнак паўгода ўдзельнічаў у жорсткіх крывавых баях. У канцы красавіка 1942 г. быў цяжка паранены. Урачы памылкова дыягнаставалі гангрэну, але гарачы палітрук ад ампутацыі адмовіўся і адстаяў свае ногі пры дапамозе трафейнага пісталета. Крымска-Феадасійскі дэсант савецкіх войск, як вядома, амаль цалкам загінуў. Андрэй Ягоравіч сярод нямногіх цудам застаўся жывы: непадалёк ад медсанбата, дзе ён пакутваў, прызямліўся для дазапраўкі самалёт, які з варожага тылу вывозіў параненага камандзіра партызанскага атрада, у ім аказалася адно свабоднае месца. Больш чатырох месяцаў лячыўся Макаёнак у шпіталях Краснадара і Баку. Рваўся на фронт, але раны былі цяжкія, і медкамісія вынесла катэгарычны прысуд: спісаць у запас. Пасля доўгіх вандраванняў па інстанцыях А. Я. Макаёнак апынуўся ў мястэчку Люксембургі, працаваў выкладчыкам у мясцовым сельгастэхнікуме, пазней — выкладчыкам ваеннай справы ў Акаурцкай сярэдняй школе ў Грузіі. Будучы драматург уважліва прыглядаўся да экзатычнага горнага краю, побыту яго людзей і моцна сумаваў па радзіме. І як толькі родная Рагачоўшчына была вызвалена ад акупантаў, вярнуўся дамоў. Крыху больш за месяц папрацаваў настаўнікам у Журавіцкай сярэдняй школе, быў абраны першым сакратаром мясцовага райкома камсамола. У снежні 1944 г. яго пасылаюць на курсы прапагандыстаў пры ЦК КП(б)Б, але скончыць іх не давялося, бо быў накіраваны ЦК ЛКСМБ сакратаром гаркома камсамола ў Гродна. Па сямейных абставінах мусіў перабрацца бліжэй да родных мясцін: да чэрвеня 1946 г. загадваў парткабінетам Магілёўскага чыгуначнага вузла, потым быў памочнікам сакратара райкома партыі, народным суддзёй у Журавічах. Абавязкі суддзі аказаліся цяжкімі, невыносна было судзіць мнагадзетных удоў за нядоімкі, і Андрэй Ягоравіч папрасіўся ў адстаўку. Яму прапанавалі ўзначаліць рэдакцыю раённай газеты «Сталінец». У верасні 1947 г. ён стаў слухачом Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КП(б)Б, па заканчэнні якой у 1949 г. залічаны загадчыкам аддзела прозы часопіса «Вожык». На гэты час драматургія амаль цалкам завалодала яго творчымі планамі, і з 1953 г. А. Макаёнак пачаў займацца толькі творчай працай. У 1956—57 гг. ён літкансультант Саюза пісьменнікаў Беларусі, потым зноў заняўся творчай працай. З студзеня 1966 г. галоўны рэдактар часопіса «Нёман».

А. Макаёнак быў надзвычай таленавітым чалавекам: добра маляваў, займаўся разьбой па дрэве, валодаў талентам акцёра і г. д. Пісаць вершы і замалёўкі пачаў яшчэ ў школьныя гады. У 1941—42 гг. вёў дзённік, пасля вайны пачаў пісаць апавяданні, драматургічныя творы. Друкаваўся з 1946 г. Першая п'еса — аднаактавая драма «Добра, калі добра канчаецца», апублікавана ў рэспубліканскай газеце «Чырвоная змена». Да пачатку 1950-х гадоў напісаў яшчэ некалькі аднаактовак («Жыццё патрабуе», «Перад сустрэчай», «Першае пытанне», «Аксеніна цялушка», «Крымінальная справа»), а таксама шматактовыя п'есы «Ворагі» (1947), «Узыходы шчасця» (1947), «Выйгрыш» (1948). Працуючы ў часопісе «Вожык», ён пісаў гумарэскі, скетчы, фельетоны, сатырычныя апавяданні; папулярнасцю карысталася рубрыка «Выбачайце, калі ласка», заснавальнікам і асноўным аўтарам якой быў А. Макаёнак. Вожыкаўскія публікацыі пісьменніка вызначаліся бескампраміснай вастрынёй выкрыцця розных прайдзісветаў, махляроў, нягоднікаў. Многія высакапастаўленыя чыноўнікі пасля яго выступленняў назбавіліся сваіх пасад.

У 1951 г. тэатр імя Я. Купалы паставіў палітычную драму А. Макаёнка «На досвітку» пра барацьбу французскіх рабочых за свае правы. І хоць спектакль

А. Макаёнак. Здымак 1964 г. (злева).

А. Макаёнак з артыстамі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы Г. Макаравай і Г. Бальчэўскай. 1973 г. (справа).

карыстаўся поспехам, драматург адчуваў, што павінен пісаць пра жыццё не зарубежных, а працоўных сваёй зямлі: дома было столькі нявырашаных праблем, столькі бед і недахопаў! Менавіта гэта грамадзянскае адчуванне і дапамагло Макаёнку напісаць сатырычную камедыю «Выбачайце, калі ласка!» (1953), якая нанесла знішчальны ўдар па тэорыі бесканфліктнасці. У час, калі ў літаратуры дапускаўся толькі паказ барацьбы добрага з лепшым, драматург вывеў пад святло рампы канфлікты вялікага грамадскага напалу, з мастацкай дакладнасцю і пераканальнасцю выкрыў многія заганы адміністрацыйна-бюракратычнага стылю кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, які атрымаў хадзячую назву «каліберaўшчына». Наступныя дзве камедыі «Каб людзі не журыліся» (1958) і «Лявоніха на арбіце» (1961) таксама прысвечаны асэнсаванню жыццёвых клопатаў сельскіх працаўнікоў. Сцэнічны лёс гэтых п'ес склаўся па-рознаму. Калі першая з іх, нягледзячы на несумненна высокія мастацкія вартасці, была гвалтоўна выкраслена з рэпертуару тэатральнымі чыноўнікамі, то другая атрымала ўсесаюзнае і міжнароднае прызнанне. Небяспрэчная па сваіх грамадска-палітычных вывадах, «Лявоніха на арбіце» вызначалася бліскучым майстэрствам увасаблення вобразаў, вырашэння канфліктаў. Амаль дзесяць гадоў А. Макаёнак не прапаноўваў тэатрам сваіх п'ес, шукаў новыя сродкі сцэнічнай выразнасці. У выніку напружаных пошукаў узніклі дзве трагікамедыі — палітычны памфлет «Зацюканы апостал» (1969) і народны лубок «Трыбунал» (1970).

Наступная п'еса «Таблетку пад язык» (1973) жанрава вызначана як камедыя-рэпартаж (разам з «Трыбуналам» адзначана Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Я. Коласа 1974). Неўзабаве з'явіліся сатырычная камедыя трагікамічнага плана «Кашмар» (сцэнічная назва «Святая прастата», 1976) і сентыментальны фельетон «Верачка» (1980). Два апошнія драматургічныя творы пісьменніка — трагікамедыя «Пагарэльцы» (1980) і «Дыхайце эканомна!» (1983) — таксама вызначаюцца арыгінальнасцю формы і зместу. А. Макаёнак мэтанакіравана імкнуўся «прышчапіць» беларускай камедыі паболей жанравых адгалінаванняў, значна пашырыў арсенал яе выяўленчых сродкаў, вярнуў у нашай драматургіі «правы грамадзянскасці» маналога і г. д. П'есы беларускага драматурга шырока ставіліся тэатрамі СССР і зарубежных краін. П'есы «Выбачайце, калі ласка», напрыклад, пастаўлена 200 тэатрамі, «Трыбунал» — 160, каля ста тэатраў ставілі «Лявоніху на арбіце» і «Зацюканага апостала».

Пяру А. Макаёнка належаць пераклады многіх п'ес савецкіх драматургаў («Трэцяе жаданне» Б. Блажака, «Дабракі» А. Зорына, «Я, бабуля, Іліко і Іларыён» Н. Думбадзе і Г. Лордкіпанідзе, «Блакада» У. Іванава, «Чацвёрты» К. Сіманава і інш.). Па сцэнарыях драматурга зняты фільмы «У адзінай сям'і» (1957), «Шчасце трэба берагчы» (1958), «Кандрат Крапіва» (1961), «Рагаты бастыён» (1964), «Пасля кірмашу» (1973); сцэнарыі «Твой хлеб» (1954), «Вялікая небяспека» (1960) і «Не пакінеш мяне» (1969) не ставіліся. Творы Макаёнка перакладаліся на многія мовы народаў СССР і за мяжой.

А. Макаёнак выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1971—82), членам

многіх камітэтаў, грамадска-палітычных арганізацый. У складзе розных дэлегацый неаднойчы выязджаў за мяжу, удзельнічаў у рабоце сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Знак Пашаны, медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, Украіны.

Памёр 16.11.1982, пахаваны на Усходніх могілках у Мінску. Імя А. Я. Макаёнка прысвоена Гродзенскай цэнтральнай бібліятэцы, Журавіцкай сярэдняй школе; яго імем названа вуліца ў Мінску, на доме, дзе ён жыў, установлена мемарыяльная дошка, у в. Журавічы ў 1986 г. адкрыты літаратурны музей пісьменніка.

С. С. Лайшук.

Ю. С. Пшыркоў.

З успамінаў Хвядоса Цімафеевіча Румянцава, настаўніка-пенсіянера

Хоць я выкладаў не літаратуру, а хімію і біялогію, Андрэй у школьныя гады часта падыходзіў, пытаўся: «А вы не чыталі?..» «Чытаў»,— кажу. Да чытання ён мастак быў. Пагаворым, абмяркуем. Ён недалёка ад школы жыў. Тая хата і сёння стаіць. Яе купілі Макаёнкі, калі пераехалі з вёскі Борхаў, дзе нарадзіўся пісьменнік. Бацьку, Ягора Сяргеевіча, прызначылі акурат тады старшынёй Журавіцкага калгаса. Добра памятаю, як паказаў мне Андрэй сваю першую п'есу. Не церпіцца ведаць яму, ці спадабаецца? П'еса мне спадабалася. Толькі некалькі пытанняў усё ж мелася. І адно з іх — чаму ж ты, Андрэй, пра французаў напісаў? Хіба ў нас герояў мала? Ён усміхнуўся, прамовіў у адказ: «І пра вас напішу!» Напісаў. І добра напісаў. А потым тая першая п'еса «На досвітку» была пастаўлена, і я парадаваўся за свайго былога вучня ад шчырага сэрца.

Ужо будучы даволі вядомым пісьменнікам, ён, прыязджаючы да нас, звяртаўся: «Ну што, Цімафеевіч, на рыбную лоўлю махнём?» Любіў Андрэй Ягоравіч парыбачыць. Ехалі мы на Дняпро, там ён усе мясціны ведаў — нарадзіўся ж, лічы, ледзьве не на самым беразе ракі. У мяне звычайныя вуды, у яго — спінінг. Трохі нават і зайздросціў. Але не гэта запомнілася, а тое, як падчапіўшы шчупака, крычаў Макаёнак на увесь бераг: «Злавіў!» Радаваўся, бы малое дзіця. Умеў ён радавацца... Вельмі ўмеў...

З успамінаў Праскоўі Васілеўны Гальскай, загадчыцы мясцовай аптэкі

Сорак чацвёрты год... Я вучылася тады ў сёмым класе. Камсамольскі білет мне ўручыў Андрэй. Вы прабачце, што мы ў размове вось тут усё Андрэй ды Андрэй... Яго так усе ў нас называлі. І тады, калі ўжо вядомым пісьменнікам стаў. Бо свой ён нам быў і ёсць. Прывёз неяк нам паказаць сваю п'есу. З Мінска артысты былі. Дык што запомнілася. Калі пачалі яны граць, адзін чалавек, пазнаўшы ў адмоўным герої сябе, дэманстратыўна ўзняўся і пакінуў залу. А выпісаны ж быў ён бы ўсё роўна на партрэце. У «Лявоніхі на арбіце», да слова сказаць, мы ўсіх герояў пазналі, хоць былі і схаваны яны драматургам пад іншымі прозвішчамі. Наш, наш ён пісьменнік, журавіцкі.

З успамінаў Галіны Рыгораўны Мацвейчык, настаўніцы-пенсіянеркі

У 1952 г. памёр мой бацька — дырэктар мясцовай дзесяцігодкі Здановіч Рыгор Баніфацьевіч. З Андрэем яны былі ў вельмі добрых зносінах. Таму паведамілі і яму аб напаткаўшым нас горы, хоць і сумняваліся, што прыедзе. Калі яму там? Чалавек заняты. А ён прыехаў. На могілках слова сказаў, пасля нас сущешыў. А бываючы ў Журавічах, абавязкова заглядваў. Заўсёды падбадзёрыць, натхніць, а паедзе — і сумна. Бы страчана нешта...

З успамінаў Веры Уладзіміраўны Волкавай, настаўніцы-пенсіянеркі

Андрэй сябраваў з маім братам Колем. Нярэдка разам урокі рабілі, фатаграфавалі, а потым падоўгу разглядвалі картачкі. Разглядваюць і смяюцца: «На каго гэта людзі падобны, а?» А пазней і добра ў іх пачало атрымлівацца. Коля на Курскай дузе загінуў. Дваццаць тры гады было яму... І не памятаю я такога выпадку, каб, бываючы ў нашай вёсцы, не забег Андрэй да нас. Пасядзіць крыху, Колю ўспомніць, разам з намі пасумуе-пабядуе і заспяшаецца. Ведама ж, багата ў яго людзей, да якіх хацелася зайсці. Яму ў кожнай хаце былі рады.

...Успаміны, успаміны. Жыве ў сэрцах журавічан памяць пра вядомага земляка. І будзе жыць. Як жывуць, шумяць на вясновым ветры журавіцкія сосны. Яны выраслі на тым месцы, дзе падпіралі аблокі іх папярэдніцы, з якіх рабілі людзі хаты. Каб было дзе жыць. Шчасліва жыць пад мірным небам.

Прыслухоўваюся: сумотна шумяць журавіцкія сосны...

Запісаў В. Ткачоў.

ЮЛЬЯН СЯРГЕЕВІЧ ПШЫРКОЎ

Беларускі літаратуразнавец, крытык, заслужаны дзеяч навукі БССР (1978).

Доктар філалагічных навук (1962), прафесар (1964). Член Саюза пісьменнікаў Беларусі (1950). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа [1980, за ўдзел у 2-томным даследаванні «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» і «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» (на рус. мове, 1977)].

Ю. С. Пшыркоў нарадзіўся 31.10.1912 г. ў в. Кісцяні Рагачоўскага р-на ў сялянскай сям'і. Вучыўся ў Кісцянёўскай пачатковай школе, у Свержанскай сямігодцы, дзе ў той час працаваў М. Лынькоў. У 1925 г. школа закрылася, таму вучобу працягваў у Рагачоўскай сямігодцы, якую скончыў у 1928 г. У 1930 г. скончыў педкурсы ў Рагачове, 4 гады працаваў настаўнікам у Звальніцкай, Буднеўскай пачатковых школах Клічаўскага раёна, потым у Царкоўскай сямігодцы Буда-Кашалёўскага раёна. У 1934—39 гг. вучыўся на філалагічным факультэце Ленінградскага універсітэта. У 1939—40 гг. працаваў выкладчыкам Магілёўскага пед-інстытута. З лістапада 1940 г. ў Чырвонай Арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны: ваяваў пад Ленінградам, Кёнігсбергам, быў паранены.

З 1945 г. ў Інстытуце літаратуры АН БССР, дзе з 1954 г. загадваў сектарам дакастрычніцкай літаратуры і тэксталогіі. Адначасова працаваў выкладчыкам у БДУ (1945—57), у Мінскім педагагічным інстытуце (1966—68). Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «Знак пашаны».

Навуковай дзейнасцю пачаў займацца яшчэ ў студэнцкія гады, калі працаваў над дыпломнай работай, прысвечанай творчасці Я. Коласа (фрагменты работы былі апублікаваны). З даследаваннем спадчыны народнага песняра звязаны яго асноўныя поспехі. У сваім першым артыкуле «Новая зямля» Я. Коласа» (1940), манаграфіі «Якуб Колас. Жыццё і творчасць» (1951), а таксама ў пазнейшым даследаванні «Эпас рэвалюцыі» (1975) Ю. Пшыркоў змагаўся супраць вульгарызатарства і фальсіфікацыі гісторыі літаратуры, разглядаў творы песняра ў шырокім тыпалагічным плане, прасочваў гісторыю задумы і стварэння коласаўскага ліра-эпасу. Па словах Я. Коласа, ён першы, хто правільна ацаніў «Новую зямлю». З канца 1950-х гадоў Ю. Пшыркоў працаваў над гісторыяй узнікнення і развіцця беларускай мастацкай прозы. Але і тут асноўная ўвага ўдзялялася Я. Коласу. Коласаўскаму перыяду ў развіцці нацыянальнай прозы прысвечаны манаграфіі Ю. Пшыркова «Трылогія Якуба Коласа «На ростанях» (1956), «Беларуская савецкая проза (20-я — пачатак 30-х гадоў)» (1960), за якую аўтару была прысуджана вучоная ступень доктара філалагічных навук. У гэтых працах узноўлены асноўныя аспекты літаратурнага жыцця міжваеннага перыяду, выкарыстаны вялікі фактычны матэрыял, успаміны пісьменнікаў, што дазволіла стварыць аб'ектыўную карціну грамадска-палітычных умоў, у якіх адбывалася станаўленне беларускай прозы, паказаны працэс зараджэння новых жанравых форм і перспектывы іх развіцця. Аўтар вёў барацьбу з фальсіфікатарамі і «аглабельнай крытыкай». Ён даследаваў творчасць У. Дубоўкі, К. Крапівы, М. Танка, І. Шамякіна, Я. Брыля. Пра шырыню даляглядаў вучонага сведчаць працы «Уплыў творчасці А. С. Пушкіна на развіццё беларускай літаратуры» (1949), «Тарас Шаўчэнка і беларуская літаратура» (1964, разам з І. Крэнь), «А. Я. Багдановіч» (1966). Вялікі ўклад унёс Ю. Пшыркоў у развіццё тэксталогіі. Пад яго рэдакцыяй выйшлі ў свет зборы твораў Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, К. Чорнага, В. Дуніна-Марцінкевіча. Складальнік альбома «Якуб Колас. Жыццё і творчасць» (1959). Сааўтар кніг «Нарыс гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1954), «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 1—2, 1968—69), падручніка па беларускай літаратуры для сярэдняй школы. Аўтар шматлікіх крытычных артыкулаў, якія друкаваліся на старонках рэспубліканскай перыёдыкі. Апошняя праца вучонага — кніга «Летапісец свайго народа: Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа» вышла ў 1982 г. Памёр Ю. С. Пшыркоў 23.12.1980 г.

І. Ф. Штэйнер.

КАНСТАНЦІН МІКАЛАЕВІЧ САННІКАЎ

Беларускі рэжысёр, акцёр і педагог, народны артыст БССР (1949), прафесар (1960). Нарадзіўся 18.5.1896 г. ў Рагачове. Сцэнічную дзейнасць пачаў у 1916 г. Працаваў як акцёр у розных тэатральных калектывах Рагачова і Мінска, з 1918 г. ў Першым беларускім таварыстве драмы і камедыі, з 1920 у БДТ (тэатр імя Я. Купалы, адзін з яго заснавальнікаў). Скончыў Беларускую драматычную студыю ў Маскве (1926, кіраўнік В. Смышляеў). З 1926 г. акцёр і рэжысёр у БДТ-2 (тэатр імя Я. Коласа), у 1931—37 гг. мастацкі кіраўнік Беларускага трэцяга дзяржаўнага тэатра, у 1937—

61 гг. у Беларускім тэатры імя Я. Купалы (у 1942—44 гг. рэжысёр франтавых тэатральных брыгад, у 1948—52 гг. галоўны рэжысёр). У 1947—65 гг. адначасова выкладчык Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута: кіраўнік курса акцёрскага майстэрства (сярод вучняў Г. Аўсяннікаў, Л. Давідовіч, М. Захарэвіч, В. Тарасаў і інш.) і загадчык кафедры рэжысуры. Як рэжысёр аддаваў перавагу сучаснаму рэпертуару, зрабіў значны ўплыў на станаўленне беларускіх драматургаў К. Крапівы, А. Макаёнка, К. Губарэвіча, Э. Самуйлёнка, А. Маўзона і інш. Яго пастаноўкі былі адметныя акрэсленай грамадзянскай пазіцыяй, глыбокай распрацоўкай псіхалогіі герояў, рэалістычнай накіраванасцю, тонкім разуменнем беларускага характару і майстэрствам перадачы народнага побыту на сцэне. Сярод пастановак: беларуская драматургія — «Партызаны» (1938, з Л. Рахленкам), «З народам» (1948), «Пяюць жаваранкі» (1950, Дзяржаўная прэмія СССР 1952), «Зацікаўленая асоба» (1953) і «Людзі і д'яблы» (1958) К. Крапівы, «Пагібель воўка» Самуйлёнка (1939), «Канстанцін Заслонаў» А. Маўзона (1947, Дзяржаўная прэмія СССР 1948), «Цытадэль славы» (1949), «Простая дзяўчына» (1953, з П. Сушко) і «На крутым павароце» (1956) Губарэвіча, «На досвітку» (1952, з У. Кухтам) і «Выбачайце, калі ласка!» (1954) Макаёнка, «Пінская шляхта» В. Дуніна-Марцінкевіча (1954), «Злавацца не трэба» В. Зуба (1960), «Любоў, Надзея, Вера» П. Васілеўскага (1961); класічныя творы і п'есы сучасных аўтараў з іншых рэспублік — «Машачка» А. Афінагенава і «Хлопец з нашага горада» К. Сіманава (1941), «Сям'я Мерлье» («Асада млына») паводле Э. Заля (з Л. Кобрынскім) і «Душа Масквы» Л. Нікуліна (1942), «Губернатар правінцыі» Л. Шэйніна і бр. Тур і «Маскоўскі характар» А. Сафронава (1948), «Асабняк у завулку» бр. Тур (1949, з Б. Платонавым), «Сям'я Лутоніных» бр. Тур і І. Пыр'ева і «Сям'я» І. Папова (1950), «Ганна Карэніна» паводле Л. Талстога (1951), «Зыкавы» М. Горкага (1955), «Шлюб па сакрэту» Дж. Колменастарэйшага і Д. Гарыка і «Вечная крыніца» Да. Зорына (1957), «Смерць ваяводы» Ю. Славацкага (1959) у тэатры імя Я. Купалы; «Вакханкі» Еўрыпіда (з Смышляевым) і «У мінулы час» І. Бэна (1926, з М. Міцкевічам і Б. Афоніным), «Рэйкі гудуць» У. Кіршона (з С. Розанавым) і «Маёмасць» паводле аповесці Г. Караваевай «Двор» (1929), «Авангард» В. Катаева (1930, з Розанавым) у тэатры імя Я. Коласа; «Энтузіясты» Н. Сербракова і Е. Тарвід, «Контратака» Дз. Курдзіна, «Мой сябра» М. Пагодзіна і «Суд» Кіршона (1932), «Сяржант Дроб» Самуйлёнка і «Гісторыя пяці хвастоў» Л. Левіна (1935), «Каварства і каханне» Ф. Шылера (1937) у БДТ-3. Як акцёр выконваў драматычныя і гераічныя ролі, напоўненыя ўнутранай сілай, эмацыянальнай напружанасцю і псіхалагічнай глыбінёй. Сярод найбольш значных работ: Аляксей («Рысь» паводле Э. Ажэшкі «У зімовы вечар») і Васька Попел («На дне» М. Горкага), князь Капуста («Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча) у тэатры імя Я. Купалы; Максімілян («Цар Максімілян», народная драма ў апрацоўцы А. Рэмізава і Міцкевіча), Аберон («Сон у летнюю ноч» У. Шэкспіра), Эрас («Эрас і Псіхея» Е. Жулаўскага), Міхаль («У мінулы час») і Гадун («Разлом» Б. Лаўранёва) у тэатры імя Я. Коласа; Кіруючая асоба («Мой сябра») і Мілер («Каварства і каханне») у БДТ-3.

Памёр К. М. Саннікаў 12.7.1965 г. На яго магіле на Усходніх могілках у Мінску ўстаноўлены бюст (1966).

Кастусь Саннікаў

З успамінаў Я. С. Рамановіча[1]

Усе, хто праходзіў у 1918 годзе па мінскай рабочай ускраіне — Камароўцы, каля драўлянага клуба «Беларуская хатка» маглі бачыць прыгожага юнака ў паласатай спартыўнай майцы. Ён вылучаўся сярод іншых маладых людзей высокім ростам, капою жоўтых, нібы спелыя каласы, валасоў і шэра-блакітнымі мяккімі вачамі. Вечарамі на канцэртах разам са сваёй партнёркай, гэткай жа ладнай і прыгожай Стафаніяй Станютай, яны заўзята танцавалі «Мяцеліцу», выконвалі і невялічкія ролі ў спектаклях Першага таварыства беларускай драмы і камедыі. Калі фарміраваўся Першы дзяржаўны тэатр рэспублікі, яго арганізатар Фларыян Ждановіч забраў з «Хатзатар кі» ўсіх здольных аматараў, у тым ліку і Кастуся Саннікава.

Першыя ж выступленні на сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра ў 1920 го-

[1] Яўген Сцяпанавіч Рамановіч — беларускі пісьменнік, акцёр і тэатразнавец.

дзе ўжо не на ўскраіне Мінска, а ў яго цэнтры, у былым гарадскім тэатры, паказалі шматабяцальныя акцёрскія здольнасці Саннікава.

Урад Савецкай Беларусі, дбаючы аб росквіце тэатральнага мастацтва рэспублікі, стварыў у Маскве нацыянальную тэатральную студыю, выкладчыкамі ў якую былі запрошаны вядомыя майстры сталічнай сцэны. У гэтую студыю накіроўваюцца на вучобу самыя лепшыя маладыя акцёры Першага беларускага тэатра і сярод іх — Кастусь Саннікаў, які неўзабаве выявіў сябе як студыец-акцёр, а пазней і рэжысёр-асістэнт выдатнага майстра маскоўскай сцэны В. С. Смышляева.

Разам з Першым дзяржаўным тэатрам рэспублікі, цяпер акадэмічным імя Янкі Купалы, мне, у той час акцёру гэтага тэатра, давялося ў 1923 годзе паехаць у Маскву для ўдзелу ва Усерасійскай сельскагаспадарчай і саматужна-прамысловай выстаўцы, на якой выступалі найлепшыя нацыянальныя тэатры краіны.

У Маскву з'ехаліся з усіх канцоў СССР удзельнікі выстаўкі і госці-экскурсанты. Выстаўка стваралася ў раёне сённяшняга парку імя М. Горкага на вялікай плошчы, яна нагадвала міжнародны кірмаш, бо ў ёй удзельнічалі замежныя фірмы.

Мы прыехалі загадзя і жылі ў вялікім інтэрнаце на Астожынцы, выступалі на вечарах у розных клубах і на прадпрыемствах. І вось аднойчы да нас прыходзяць Кастусь Саннікаў і дырэктар беларускага павільёна брат Міхася Чарота І. Кудзелька і прапаноўваюць нам пайсці з раніцы афармляць павільён, а вечарам выступаць на канцэртах.

— Праца гэтая не цяжкая,— угаворваў нас Кудзелька,— плацім мы добрыя грошы, а вы ж усе маладыя, чаму б не зарабіць які рубель у новай валюце, у Маскве прыдасца. Вось,— паказаў ён на Саннікава,— камандзір нашых студыйцаў. Яны працуюць у павільёне — развешваюць экспанаты, але людзей мала, а мы мусім паспець да адкрыцця выстаўкі.

Кастусь, з якім мы былі добра знаёмыя яшчэ з «Беларускай хаткі», кажа мне:

— Добрая гэта справа, што мы робім. Збяры хлопцаў, хто пажадае, і прыходзьце на выстаўку. Трэба, каб наш павільён быў гатовы да адкрыцця.

Вядома, мы згадзіліся, і нашы маладзейшыя акцёры і актрысы, у тым ліку і Барыс Платонаў, Уладзімір Уладамірскі, Эдуард Шапко, Вольга Галіна і іншыя, чалавек дзесяць, пайшлі афармляць беларускі павільён. На выстаўцы мы яшчэ

К. М. Саннікаў (трэці справа) сярод артыстаў.

больш збліжаліся з нашымі студыйцамі Стафаніяй Станютай, Аляксандрам Ільінскім, Язэпам Чайкоўскім, Міколай Міцкевічам.

У жывых гутарках я з цікавасцю даведаўся ад вельмі кампанейскага Кастуся Саннікава, што ён сам з Рагачова, прыехаў у Мінск пасля дэмабілізацыі з арміі і паступіў у трупу Бяляева, што працавала ў летнім тэатры «Рэнесанс», які знаходзіўся на беразе Свіслачы, дзе цяпер наш Дзяржаўны цырк.

Саннікаў яшчэ ў 1916 годзе ў Рагачове зблізіўся з вядомым акцёрам і антрэпрэнёрам С. Бярнардавым і выступаў у драматычных ролях на гарадской сцэне.

У 1926 годзе, пасля пяцігадовай вучобы ў Маскве, на радзіму вярнуліся студыйцы, якія атрымалі накіраванне ў толькі што арганізаваны Другі беларускі драматычны тэатр (БДТ-2). Будынак Віцебскага гарадскога тэатра акцёры абсталявалі на свой лад, бо назапасілі ведаў і ўражанняў у самых лепшых маскоўскіх тэатрах самых розных кірункаў — ад акадэмічнага Малога да эксперыментальнага тэатра Меерхольда. Юнакі прыехалі з вялікім творчым запалам і прагай прафесійнай дзейнасці і прывезлі з сабою гатовыя спектаклі: народную драму «Цар Максімілян», камедыю У. Шэкспіра «Сон у летнюю ноч», беларускую п'есу І. Бэна «У мінулы час».

Вельмі рухавы, энергічны, прагны да ведаў і працы, Кастусь Саннікаў з маладым энтузіязмам бярэцца за стварэнне БДТ-2 і выяўляе сябе як цікавы выканаўца акцёрскіх роляў, асабліва матроса-бальшавіка Гадуна ў драме Б. Лаўранёва «Разлом». Адначасова ён памагае ў рэжысуры, набывае вопыт, які пасля вывеў яго ў найлепшыя рэжысёры рэспублікі.

З самага пачатку самастойнай рэжысёрскай дзейнасці Саннікава вабіць сучасная тэматыка, п'есы нашых беларускіх драматургаў, якім ён стараецца памагчы ў працы.

У тыя ж дваццатыя гады ў Гомелі абсталёўваецца вандроўны тэатр рэспублікі пад кіраўніцтвам выдатнага акцёра, рэжысёра і драматурга, першага беларускага народнага артыста Уладзіслава Галубка. Яго калектыву даецца назва Трэцяга беларускага дзяржаўнага тэатра (БДТ-3). Галубок запрашае К. Саннікава на пасаду рэжысёра. З уласцівым яму запалам і адданасцю Саннікаў бярэцца за работу ў Трэцім БДТ і хутка стварае там цікавы рэпертуар. Прыкметны поспех маюць яго пастаноўкі «Суд» У. Кіршона, «Дыктатура» І. Мікітэнкі, «Мой друг» М. Пагодзіна.

Шмат увагі Саннікаў аддае беларускай драматургіі. Найбольшы плён прыносіць яго творчая праца з вядомым беларускім празаікам Эдуардам Самуйлёнкам. Пастаноўка яго п'есы «Сяржант Дроб» паводле інсцэніраванай аповесці «Тэорыя Каленбрун» збліжае Саннікава з Самуйлёнкам. Іх яднаюць адзінства погляду на мастацтва, улюбёнасць у тэатральную справу, вострае адчуванне сучаснасці.

Працуючы з акцёрамі, рэжысёр Саннікаў памагае росту вядомых у той час майстроў сцэны Трэцяга БДТ У. Дзядзюшкі, К. Быліча, А. Бараноўскага, Л. Шынко, А. Згіроўскага, Маргарыты і Таццяны Шашалевіч. Пасля расфарміравання БДТ-3 большасць з іх на чале з К. Саннікавым пераходзіць на сталую працу ў Першы дзяржаўны тэатр, яны арганічна ўліваюцца ў калектыў, бо Кастусь Саннікаў і выдатны рэжысёр і педагог БДТ-1 Еўсцігней Міровіч грунтавалі сваю творчую дзейнасць на сістэме вялікага рэжысёра нашай сучаснасці — Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага.

Разам з акцёрам і рэжысёрам БДТ-1 Леанідам Рахленкам у 1938 годзе Кастусь Саннікаў ставіць спектакль паводле п'есы Кандрата Крапівы «Партызаны». Поспех спектакля, супольная творчая праца з выдатным пісьменнікам адкрылі новыя шляхі для развіцця беларускай драматургіі на сцэне БДТ-1. Супрацоўніцтва з Кандратам Крапівой было на дзіва плённае, асабліва пазней. Аднак Кастусь Саннікаў не забывае і пра свайго даўняга сябра Эдуарда Самуйлёнка і стварае з ім спектакль «Пагібель воўка», які разам з «Партызанамі» паказваецца ў Маскве на першай Дэкадзе беларускага мастацтва і знаходзіць там прызнанне масквічоў. Высокую ацэнку пастаноўкам дае цэнтральны друк.

Вялікая Айчынная вайна застала Першы БДТ на гастролях у Адэсе. Тэатр быў эвакуіраваны ў глыбокі тыл — у Сібір.

Сібіракі любяць тэатр, цырк, кіно, у нас білеты раскупляліся за тыдзень наперад, і трапіць на спектакль БДТ-1 было не лёгка. Саннікаў адразу ж пасля прыезду паставіў п'есу К. Сіманава «Хлопец з нашага горада», блізкую па сваёй тэматыцы ваеннаму часу. Потым у яго пастаноўцы ідзе спектакль «Душа Масквы» Л. Ніколіна. Шмат увагі Саннікаў аддае кіраўніцтву самадзейным драматычным калектывам томскага Дома афіцэраў.

Няма чаго і казаць, што ўсе мы жылі

падзеямі на франтах барацьбы з фашыстамі. У інтэрнаце, дзе быў наш пакой, мы наказвалі даяжурным будзіць нас у 4 гадзіны ночы — час, калі з Масквы перадаваліся апошнія паведамленні. І вось аднойчы чуем, што войскі двух нашых франтоў злучыліся ў раёне Калача. Напачатку было незразумела: як гэта маглі апынуцца там нашы байцы? Калач жа далёка ў тыле нямецкіх войскаў. Але ўслед за паведамленнямі перадавалі каментарыі, і стала зразумела, што нашы войскі акружылі вялікую нямецкую групоўку ў раёне Сталінграда, пачалі баі, каб яе знішчыць. Тут Косця не вытрымаў і на другі ж дзень напрасіўся, каб яго накіравалі на фронт у раён Сталінграда.

Саннікаў прабыў на фронце, кіруючы франтавымі тэатрамі, аж да вызвалення Мінска ад акупантаў.

Ён апынуўся ў Мінску разам з групай беларускіх пісьменнікаў, франтавых журналістаў на трэці дзень пасля вызвалення горада і прыслаў мне адтуль у Томск паштоўку, у якой з нястрымнай радасцю паведамляў, што ўсе ў маёй сям'і жывыя. Схуднелыя, змарнелыя, але жывыя. Знайшоў ён маю жонку, дзяцей у невялікай матчынай хаціцы ў закутку Сляпянскай вуліцы на Камароўцы.

На руінах, папялішчах пачалі мы, вярнуўшыся ў Мінск з эвакуацыі, аднаўляць наш тэатр. Яшчэ ішла вайна з гітлераўцамі, а Беларускі дзяржаўны тэатр, які атрымаў у той час ганаровую назву акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, распачаў работу.

Ствараючы свой рэпертуар і найперш пастаноўкі на патрыятычную тэму, мы знаёмімся з п'есаю маладога драматурга Аркадзя Маўзона і пасля сур'ёзнай дапрацоўкі ставім «Канстанціна Заслонава» — гераічную драму пра партызанскае падполле. Спектакль быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР. Разам з пастаноўшчыкам спектакля К. Саннікавым прэміі атрымалі Б. В. Платонаў — Заслонаў, Г. П. Глебаў — Кропля, У. І. Дзядзюшка — Крушына, І. Ф. Ждановіч — Аня. На маю думку, гэта была самая лепшая рэжысёрская работа К. Саннікава, якому ўдалося стварыць моцны ансамбль выканаўцаў і глыбока раскрыць вобразы-характары герояў драмы.

Аднаўляючы свае сувязі з беларускімі драматургамі, Саннікаў у 1950 годзе ставіць сатырычную камедыю Кандрата Крапівы «Пяюць жаваранкі», якая атрымлівае Дзяржаўную прэмію СССР. Сувязі з беларускімі драматургамі пашыраюцца і мацнеюць. У тэатр з новымі п'есамі прыходзяць Кастусь Губарэвіч, Валянцін Зуб, Пятро Васілеўскі. Але асабліва моцныя творчыя сувязі і ўзаемаразуменне ў Саннікава, апрача К. Крапівы і А. Маўзона, складваюцца з Андрэем Макаёнкам. Рэжысёр смела бярэцца за пастаноўку першай, яшчэ не зусім дасканалай яго п'есы «На досвітку», але ўжо другая п'еса Макаёнка — сатырычная камедыя «Выбачайце, калі ласка!» — не толькі мае вялікі поспех у рэспубліцы, але і выводзіць аўтара на шырокую ўсесаюзную сцэну.

Рэжысёрскаму крэда К. Саннікава былі характэрныя вострае адчуванне сучаснасці, глыбока рэалістычная трактоўка вобразаў п'ес, уменне цярпліва і настойліва працаваць з новымі аўтарамі, заўсёды даводзячы гэтую працу да выхаду новай пастаноўкі на акадэмічную сцэну. Так, апрача «Партызанаў» і «Пяюць жаваранкі», у тэатры імя Янкі Купалы Саннікаў паставіў п'есы К. Крапівы «З народам», «Зацікаўленая асоба», «Людзі і д'яблы», К. Губарэвіча «Цытадэль славы», «Простая дзяўчына», «На крутым павароце». Не ўсе яны мелі поспех, але рэжысёрская лінія на стварэнне нацыянальнай драматургіі была вельмі дакладная і паслядоўная.

Вядома, не толькі беларускія п'есы ўвасабляў на сцэне К. Саннікаў. Ён паставіў шмат твораў рускіх савецкіх драматургаў і сярод іх такія, як «Сям'я» І. Папова з вобразам юнага Леніна, «Вечная крыніца» Л. Зорына, «Маскоўскі характар» А. Сафронава. Прыкметнае месца ў яго творчасці займае руская і замежная класіка: «Зыкавы» М. Горкага, «Смерць ваяводы» Ю. Славацкага, «Ганна Карэніна» Л. Талстога, «Каварства і каханне» Ф. Шылера.

Як заўсёды, К. Саннікаў шмат увагі аддае грамадскай дзейнасці, памагае тэатральным гурткам. З гарачым пачуццём свайго партыйнага абавязку ён удзельнічае ў журы конкурсаў, выступае на канферэнцыях, з'ездах, карыстаючыся вялікай павагай і аўтарытэтам. Паспяваючы ўсюды, гэта на дзіва няўрымслівы чалавек клапоціцца пра выхаванне маладой змены. Ён кіруе кафедрай у Беларускім тэатральным інстытуце, адкуль выходзяць вядомыя цяпер акцёры Л. Дразлова, В. Тарасаў, Л. Давідовіч, Г. Аўсяннікаў, М. Захарэвіч.

З імем Канстанціна Мікалаевіча Саннікава звязаны самыя яркія старонкі ў жыцці і дзейнасці беларускіх драматычных тэатраў, усюды ён паспеў пакінуць свой след, сваю творчую спадчыну,

і пра гэта мы павінны заўсёды помніць. На прыкладзе яго добрых спраў павінны вучыцца маладыя акцёры і рэжысёры.

Я пішу гэтыя радкі ўспамінаў, а перада мною — постаць дужага, прыгожага чалавека, які не ведаў іншай радасці ў жыцці, як аддана служыць савецкаму тэатру ўсімі сваімі здольнасцямі і гарачым сэрцам мастака.

Друкуецца па кн.: Рамановіч Я. Людзі і маскі. Мн., 1977. С. 105—114.

ДЗМІТРЫЙ УЛАДЗІМІРАВІЧ СТАЛЯРОЎ

Беларускі самадзейны майстар разьбы па дрэве, заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь (1977). Нарадзіўся 1.8.1923 г. ў в. Каменка Рагачоўскага р-на. З 1966 г. працуе загадчыкам клуба ў в. Каменка. З 1948 г. ўдзельнічае ў мастацкіх выстаўках. Стварае кампазіцыі на гістарычную, ваенную, бытавую тэмы, партрэты: «Гусляр» (1948), «Плытагон» (1953), «Вольная хвіліна» (1962), «Электразваршчык» (1964), «Слаўнае 50-годдзе БССР» (1969), «Дэкрэт аб міры» (1970), «Дзед Талаш» (1950), «Дзеці суровага часу» (1954), «Няскораны» (1960), «Па дарогах вайны» (1963), трыпціх «Перад боем», «Пасля бою», «У зямлянцы» (1967—69), «Радыстка», «Франтавы трохвугольнік», «Салаўі, салаўі...», «Трыццаць гадоў таму» (усе 1973—80), «Фідэль Кастра» (1961), «Янка Купала» (1964, 1967), «Максім Горкі» (1968), «Якуб Колас» (1970) і інш. Творам Дз. У. Сталярова ўласцівы лаканічнасць кампазіцыйных вырашэнняў, эмацыянальная насычанасць вобразаў, пластычная дакладнасць у перадачы індывідуальных рыс асобы.

А. К. Лявонава.



Дз. У. Сталяроў. Перад боем. Разьба па дрэве. 1967—69 гг.

МІКОЛА СУРНАЧОЎ

Беларускі паэт Мікалай Мікалаевіч Сурначоў нарадзіўся ў 1917 г. ў в. Слабада Рагачоўскага р-на ў мнагадзетнай сялянскай сям'і. Вучыўся ў Рагачоўскай сямігодцы, потым у Гомельскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. Пасля яго заканчэння працаваў аграномам у Рагачоўскім р-не, пазней перайшоў у раённую газету «Камунар». У 1937 г. паступіў у Гомельскі пединстытут, пазнаёміўся з паэтамі-пачаткоўцамі. Студэнтам удзельнічаў у рабоце канферэнцыі маладых пісьменнікаў у Мінску. У 1939 г. перавёўся ў Мінскі пединстытут. Вучобу сумяшчаў з работай у рэдакцыях газеты «Звязда» (1939—40) і «Чырвоная змена» (1940—41). У Вялікую Айчынную вайну М. Сурначоў ваяваў на Заходнім, Бранскім, Данскім, Паўднёва-Заходнім, 1-м Беларускім, Паўднёвым, 4-м Украінскім франтах. Удзельнічаў у баях на Каўказе, дзе быў паранены, пад Сталінградам, у Румыніі, Польшчы. Восенню 1944 г. М. Сурначоў прыязджаў у Мінск. Старшы лейтэнант камандзір узвода знішчальнага процітанкавага артылерыйскага палка Мікола Сурначоў на подступах да Берліна, каля г. Пірыца, быў зноў паранены, але хутка вярнуўся ў строй. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі. М. Сурначоў загінуў у ноч з 19 на 20 красавіка 1945 г. ў рукапашным баі. Быў пахаваны ў брацкай магіле за восем кіламетраў ад Берлінскай акругавай дарогі. У 1948 г. прах паэта перанеслі на брацкія могілкі ў г. Бад-Фрэнвальдэ (на помніку прозвішча паэта пададзена як Н. Н. Сурнамаў). На вайне загінулі таксама браты М. Сурначова Яўхім і Хведар. Бацька і старэйшая сястра Наталля былі ў партызанах, сястра Лідзія — ваенфельчарам у блакадным Ленінградзе.

Пісаць вершы М. Сурначоў пачаў яшчэ ў тэхнікуме, друкавацца — з 1933 г. ў рагачоўскай раённай газеце. З 1938 г. выступаў у рэспубліканскім друку. Даваенная яго паэзія вызначаецца ёмістасцю

М. М. Сурначоў.

вобразаў, сюжэтнай закончанасцю, фальклорнасцю выяўленчых сродкаў; лірыка ваеннага часу — раманты чна ўзнёслая, лаканічная. Хрэстаматыйным стаў яго дванаццацірадковы верш «У стоптаным жыце», які нарадзіўся ў чэрвені 1941 г. пры выхадзе з Мінска (упершыню прачытаны М. Аўрамчыку, разам з якім паэт выходзіў з палаючай сталіцы, у раёне Чырвонага ўрочышча, потым перакладзены на рускую мову А. Твардоўскім). На фронце паэт не разлучаўся з запісной кніжкай, куды заносіў новыя вершы (частка з іх загінула). Упершыню паэзія М. Сурначова была сабрана яго сябрамі ў 1946 г. ў сціплы томік «На сурмах баравых». У 1959 г. выйшаў зборнік паэта «Барвовая зара». У зборнік «Акопны спеў» (1986; складальнік П. Прануза) увайшлі таксама лісты з фронту, успаміны пра паэта, артыкулы пра яго творчасць. Вершы М. Сурначова перакладзены на рускую і інш. мовы. Памяць пра паэта захоўваецца на яго радзіме: яго імем названа вуліца ў Рагачове, у Юдзіцкай васьмігадовай школе створаны мемарыяльны куток, яго імя занесена на мемарыяльную дошку ў Доме літаратара ў Мінску. Пасмяротна М. Сурначоў быў узнагароджаны мемарыяльным медалём літаратурнага конкурсу імя А. М. Астроўскага, які праводзіўся ў 1967 г. Саюзам пісьменнікаў СССР і выдавецтвам «Молодая гвардия».

Г. М. Урупіна.

Каштаны паэта

Тады я працаваў настаўнікам Шапчыцкай васьмігадовай школы, выкладаў родную мову і літаратуру. Утульна было ў школе зімовымі вечарамі, калі тэхнічка запальвала грубкі. Водсветы полымя ад бярозавых дроў роўна клаліся на падлогу. Такімі зімовымі вечарамі, калі збіраліся ў школе на пасяджэнне літаратурнага гуртка, мы захапляліся паэзіяй Міколы Сурначова. Яе мы палюбілі, мабыць, яшчэ і таму, што ён быў нашым земляком. Ад Шапчыц да Слабады, роднай вёскі паэта,— рукой падаць, усяго некалькі кіламетраў. І нам, вядома, хацелася больш даведацца пра паэта, які хадзіў нашымі сцежкамі, слухаў зялёны шэпт тых жа гаёў, дубраў і бароў.

Але біяграфічныя звесткі пра Міколу Сурначова былі даволі скупаватыя — усяго некалькі ўспамінаў яго сяброў па пяру. Ды яшчэ на руках у гурткоўцаў — тоненькая кніжачка «Барвовая зара», адкуль дзеці для літаратурнага вечара перапісвалі яго вершы ў свае школьныя сшыткі. Аднак побач жылі людзі, якія з маленства ведалі паэта, яго сям'ю, хадзілі разам у школу, сябравалі. Гэта былі бацькі і дзяды гурткоўцаў, знаёмыя вяскоўцы, жыхары Слабады, куды мы не адзін раз хадзілі. Іх успаміны станавіліся нашым духоўным набыткам.

Па малой крупінцы збіралі мы гэтыя звесткі, узнаўляючы жыццёвы і творчы шлях паэта. І перад нашымі вачамі паўставаў сціплы і мужны чалавек, які любіў жыццё, умеў радавацца яму.

У маленькай хаціне, накрытай саломкай, якая набралася ад старасці мохам, было цесна: сям'я ў Мікалая Яфімавіча, бацькі паэта, нават па вясковай мерцы вялікая — 8 чалавек. Калі Мікола падрос, бацька перабраўся ў новую хату, якую набудаваў з бурштынавай сасны. А тут і яшчэ адна радасць! Побач з іх хатай, на пагорку, вырасла прыгожая пачатковая школа.

У першым класе Мікола быў ціхім і сарамлівым хлапчуком. Затое, калі чытаў вершы сваім звонкім моцным голасам, вырастаў на вачах, здаецца, станавіўся высокім і мужным. Недарэмна сяброўкі па школе празвалі яго «Генералам». Вельмі любіў слухаць маці. Аксіння Мартынаўна была добрай апавядальніцай. Зімовымі вечарамі пад скавытанне завірухі, ліўся ў цёплай хаце яе меладычны голас, сплятаючы ў казачныя карункі словы. Часам да маці прыходзілі суседкі, і ў хаце Сурначовых, пад пошум верацён, спяваліся народныя песні. Пазней гэта плынь народнай паэзіі арганічна ўвальецца ў вершы паэта, стане іх асновай.

Сямігодку Мікола Сурначоў заканчваў у Рагачове. На суботах да яго прыязджаў бацька. На санках ён прывозіў колатыя дровы, каб расплаціцца з гаспадыняй за кватэру. І хаця цяжка было Мікалаю Яфімавічу цягнуць гаспадарчы воз і яшчэ вучыць сына, ён добра помніў словы настаўніцы: «Толк будзе з твайго хлопца, Яфімавіч. Яму трэба вучыцца далей».

На канікулы бацька забіраў Міколу з сабой у Слабаду. Дарога была няблізкай і ўвесь час ішла лесам. Скрыпелі на марозе палазы санак, падалі на ездакоў камякі снегу з вершалін дрэў. І ва ўсім гэтым — вечаровай дарозе, белым снезе, пошуме старога лесу — была нязгаданая прыгажосць роднай зямлі, якая поўніла сэрца, напявала першыя вершы.

Лясная дарожка
Слядочак губляе:
То выпырне з елак,
То ў лозы знікае.
То выгнецца спінкай,
То ўся ўстрапянецца —
З заросшай лагчыны
На ўзгорак імкнецца.
Шуміць таямніча,
Нібы ёй вядома,
Куды мяне кліча
Барвовая, з дому.

Міколу Сурначова ўжо са школьных гадоў захапілі кнігі. Яны адкрывалі нязведаны свет, будзілі фантазію, чаравалі паэтычнымі радкамі. Калі вучыўся ў Рагачове, то на невялікія грошы, што даваў бацька, купляў паэтычныя зборнікі. Неўзабаве сабралася бібліятэчка, якую захоўваў у звонкай дубовай бочцы, зробленай Мікалаем Яфімавічам для продажу. Любоў да кнігі ён пранёс праз усё сваё жыццё. Паступаючы ў Гомельскі педагагічны інстытут, прывёз з сабой драўляны чамадан, паўнюткa набіты кнігамі. Яны былі і ў палявой сумцы, якую насіў на фронце. А яшчэ ён любіў сваю родную зямлю, з дзяцінства, калі басанож бегаў па роснай траве, калі з бацькам хадзіў за плугам, калі садзіў сад. Аднойчы з Гомеля прывёз у Слабаду некалькі саджанцаў каштана. Пасадзіў іх пад вокнамі роднай хаты. Старанна даглядаў. Цяпер каштаны сталі вялікімі і радуюць вока сваёй прыгажосцю.

Адразу пасля школы ён паступіў у сельскагаспадарчы тэхнікум і пасля заканчэння яго працаваў некаторы час аграномам у адным з калгасаў Рагачоўскага раёна. І зноў цягне да сябе чысты аркуш паперы, як незасеянае поле. Далёка за поўнач гарыць на кватэры агранома газавая лямпа. Ён ужо разумее, што паэзія — не імгненнае захапленне, а справа ўсяго жыцця. А неўзабаве яго першыя вершы былі надрукаваны ў раённай газеце «Камунар». Яны прывабілі чытача сваёй напеўнасцю, рамантычнасцю.

Мікола адчувае, што праца паэта патрабуе не толькі душэўнай шчодрасці, але і пэўных ведаў. І тады ён падае дакументы на літаратурны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута. Друкуе нізку сваіх вершаў у рэспубліканскім часопісе. Іх заўважыла крытыка. Вершы палюбілі чытачы.

...І раптам вайна. У гэты час Сурначоў працуе ў рэдакцыі рэспубліканскай газеты «Чырвоная змена». З палаючага Мінска ён ідзе на фронт разам са сваім сябрам паэтам Міколам Аўрамчыкам. Над іх галовамі праносяцца варожыя самалёты. Цяжкім коласам нікне да зямлі нязжатая збажына, плача бурштынавым зернем. У здратаваным людзьмі і тэхнікай жыце паэт бачыць забітага маладога байца. І тады амаль экспромтам нараджаецца адзін з яго першых вершаў аб Вялікай Айчыннай вайне:

Ніколі не ехаць
Хлапцу маладому
Да роднага гаю
Да блізкага дому.
Ляжыць ён, як віцязь,
У стоптаным жыце,
Маці спаткаеце,
Ёй не кажыце.

Паэт Сурначоў становіцца салдатам. На многіх франтах ваюе ён, набліжаючы Дзень Перамогі. У баях некалькі разоў быў паранены, але зноў пасля шпіталя вяртаўся ў строй. У франтавых вершах паэта чуецца пах пораху, у іх нянавісць да ворага, вера ў перамогу. У 1943 г. Сурначоў ваяваў у Запарожжы, але сэрцам ён быў разам з тымі, хто вызваляў яго родную вёску. Пранікнёна піша ён пра гэта ў вершы «Ліст да маці»:

Ля хаціны тваёй сасновай
Скрозь байцы ў шынялях, бушлатах,
Маці!
Стрэнь іх там добрым словам,
Пачастуй, чым наш край багаты.

Восенню таго ж года, выпісаўшыся са шпіталя пасля чарговага ранення, Мікола Сурначоў наведаў родную вёску. Мясціны вакол не пазнаць — дарогі разбіты гусеніцамі танкаў, у лясах — акопы і траншэі. Бацькаўская сяліба ўцалела ад ліхалецця вайны. Выжыў і сад, хаця некаторыя дрэвы пасеклі асколкі. Па старому дзедаўскаму звычаю за хатай, у садзе, зладзілі бяседу. Запрасілі на яе ўсіх вяскоўцаў. Моўчкі памянулі загінуўшых на вайне братоў Яфіма і Фёдара. Сустрэча была нядоўгай. Неўзабаве Мікола за-

кінуў за плячо «сідар» і пачаў развітвацца з роднымі.

— Можа б, застаўся, сынок! Сам жа гаварыў, што прапаноўвалі работу ў рэдакцыі, у Мінску. Куды ты пойдзеш, такі паранены,— упрошвала яго маці.

— Трэба ісці, мама! Мяне чакаюць там салдаты. Ім нельга без камандзіра.

І ён пайшоў. На нейкі момант прыпыніўся на пагорку, яшчэ раз паглядзеў на вёску. Убачыў, як зводдалі, на скрыжаванні дарог застыла маці. Ён яшчэ не ведаў, што больш ніколі не вернецца ў родную хату.

Загінуў гвардыі лейтэнант Мікола Сурначоў пад Берлінам. Да фашысцкага логава заставалася яму прайсці ўсяго 8 кіламетраў. Па расказах аднапалчан, батарэя, у якую ўваходзіў і ўзвод Сурначова, трапіла на добра ўмацаваны ўчастак абароны фашыстаў. Завязаўся смяротны бой. Сілы былі няроўныя. Была дадзена каманда адысці ў блізкі лясок. Сурначоў быў зноў паранены, але не пакінуў поля бою. Ён застаўся прыкрываць адыход таварышаў. І тут у яго трапіў варожы фаустпатрон.

...І доўга яшчэ прыходзіла на скрыжаванне дарог маці. Яна часта моўчкі стаяла на адным месцы, углядалася ў засмужаны пагорак. Ёй здавалася, што вось-вось вынырне з-за пагорка знаёмая каржакаватая постаць у старым артылерыйскім шынялі. А поцемкам вярталася дахаты. Даставала тоненькую кніжку сына і шурпатымі далонямі гладзіла яе вокладку.

...З Шапчыц у Слабаду члены школьнага літаратурнага гуртка прыйшлі спякотным майскім днём. Дом паэта стаіць на самай ускраіне вёскі. Бацькі яго, калі перабіраліся да малодшай дачкі Ганны ў Магілёў, прадалі яго іншым людзям. Нядаўна дом перасыпалі, замянілі на новыя ніжнія вянкі, якія з'еў шашаль, і пабудова цяпер стала адной з самых высокіх у вёсцы.

Жыве і стары яблыневы сад, пасаджаны рукамі паэта. З аднаго боку ён агароджаны ржавым калючым дротам. Гэта, як стрэмка, напамінак мінулай вайны. Перад прыходам фашыстаў у Слабаду Мікалай Яфімавіч закапаў у садзе бібліятэчку сына з яго рукапісамі. Пасля вайны, страціўшы на фронце трох сыноў, ён забыўся на тое месца і не мог знайсці закапанае. Узброіўшыся металічнымі штырамі, вучні хацелі прамацаць увесь сад і, магчыма, натрапіць на схаваны скарб. Але новая гаспадыня дома, пакаваўшы рукою на зялёную рунь у садзе, сказала, што мы сваімі пошукамі пашкодзім пасевы. Дадаўшы пры гэтым, што кнігі, якія праляжалі дзесяткі гадоў у зямлі, па ўсім відаць, даўно спарахнелі.

— А калі перасыпалі хату, можа штонебудзь знайшлі з рэчаў паэта? — запыталіся ў яе мы.

Яна павярнулася і моўчкі пайшла ў дом. Праз некаторы час вынесла адтуль тоўстую, з пажоўклымі старонкамі кнігу.

— На гарышчы знайшла.

З замiраннем сэрца разглядалі мы знойдзеную кніжку. Гэта былі тры нумары часопіса «Литературный современник» за 1936 год, які выходзіў у Ленінградзе ў выдавецтве «Художественная литература». Суравымі ніткамі часопіс быў сшыты ў адно цэлае і нагадваў сабой кніжку. Калі з вялікай асцярожнасцю перагортвалі старонкі, з кніжкі нечакана выпала закладка — вузкая палоска з вучнёўскага сшытка, на якой у двух месцах было напісана — «М. Сурначоў».

...Не даспяваў сваю паэтычную песню Мікола Сурначоў. Але і тое, што напісаў, ніколі не згасне ў памяці народа. А на яго радзіме растуць каштаны. Любяць збірацца пад іх шатамі вяскоўцы. І абавязкова хто-небудзь са старэйшых успомніць паэта.

Р. Андрэявец.

ЛАРЫСА МІКАЛАЕЎНА ФЕДЧАНКА

Беларуская актрыса, заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь (1975) Л. М. Федчанка нарадзілася 30.7.1925 г. ў Рагачове. У 1949 г. скончыла Беларускі тэатральны інстытут (курс С. Новака, К. Саннікава). У 1949—53 гг. працавала ў Гродзенскім абласным драмтэатры, у 1953—55 гг.— у тэатры драмы і камедыі пры Белдзяржэстрадзе. З 1956 г. у Бабруйскім вандроўным драмтэатры, з 1970 г. ў Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі імя В. І. Дуніна-Марцінкевіча (Бабруйск). Мастацтву актрысы ўласцівы лірычнасць, адкрытая эмацыянальнасць, драматызм, дакладнасць і выразнасць псіхалагічных характарыстык. Яркія, сцэнічна кідкія каларытныя персанажы стварыла яна ў беларускім рэпертуары: Насця («Пяюць жаваранкі» К. Крапівы, Тэатр драмы і камедыі пры Белдзяржэстрадзе), Верка («Цені знікаюць» С. Свірыдава) і Каця («Чалавек вярнуўся» П. Васілеўскага, Бабруйскі вандроўны тэатр), Дзюркіна («Злыдзень» А. Петрашкевіча), Мальвіна («Несцерка» В. Вольскага) і Антаніна Львоўна («І

змоўклі птушкі» І. Шамякіна, Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі). Багаты класічны рэпертуар Федчанкі. З вялікім сцэнічным тэмпераментам сыграны ёю ролі ў п'есах А. Астроўскага, М. Гогаля, М. Горкага, А. Чэхава, Я. Райніса, К. Гальдоні. Асабліва вылучаліся з іх Кукушкіна («Даходнае месца» Астроўскага), Васа, Малання («Васа Жалязнова», «Ягор Булычоў і іншыя» М. Горкага), Алена Андрэеўна («Дзядзька Ваня» Чэхава), Аўдоцця Васілеўна («Свеціць ды не грэе» Астроўскага і М. Салаўёва) у Бабруйскім вандроўным і Магілёўскім абласным драмы і камедыі тэатрах. Адметныя вобразы стварыла і ў сучаснай драматургіі: Любка («Вяселле з пасагам» М. Дзьяканава; Гродзенскі тэатр), Анна-Вальтэр («Апошні прыпынак» Э. М. Рэмарка, Бабруйскі вандроўны тэатр), Фаіна («Вясёлы тракт» Б. Васільева), Варвара («Апошні тэрмін» паводле В. Распуціна), Анеле Індрунене («Лесвіца ў неба» паводле М. Слуцкіса, усё ў Магілёўскім абласным тэатры драмы і камедыі).

ГЕОРГІЙ ГЕОРГІЕВІЧ ФРУМЯНКОЎ

Доктар гістарычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Расійскай Федэрацыі. Нарадзіўся ў 1919 г. ў Рагачове. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1937 г. паступіў на гістарычны факультэт Ленінградскага педагагічнага інстытута імя Герцэна.

У тым жа годзе быў рэпрэсіраваны яго бацька (пасмяротна рэабілітаваны ў 1958). За гэта Г. Г. Фрумянкова ледзь не выключылі з інстытута. Запомніліся яму словы аднаго з інстытуцкіх адміністратараў: «Мы не абавязаны вучыць разумных дзяцей ворагаў народа». Хлопцу не плацілі стыпендыю, ён галадаў, таму прыходзілася падзарабляць на жыццё разгрузкай вагонаў.

28 чэрвеня 1941 г. атрымаў дыплом аб сканчэнні інстытута, адмовіўся паступаць у ваеннае вучылішча і пайшоў на фронт. Удзельнічаў у абароне Ленінграда. Тады ж пачаў пісаць нататкі ў франтавую газету. З чэрвеня 1943 г. стаў ваенным карэспандэнтам газеты «Франтавы дарожнік». Пасля вайны паступіў у аспірантуру Ленінградскага педагагічнага інстытута імя Герцэна, пасля сканчэння якой у 1947 г. накіраваны ў Архангельскі педагагічны інстытут: выкладчык, загадчык кафедры гісторыі СССР. У 1954 г. абараніў кандыдацкую, у

Л. М. Федчанка.

Г. Г. Фрумянкоў.

1966 г.— доктарскую дысертацыю. У 1962—1980 гг.— рэктар Архангельскага педагагічнага інстытута імя М. В. Ламаносава. Ён аўтар больш за 200 навуковых прац, сярод якіх кнігі па гісторыі архангельскай Поўначы: «З гісторыі ссылкі ў Салавецкі манастыр у XVIII стагоддзі», «Салавецкі манастыр і абарона Памор'я ў XVI—XIX стст.» (абедзве 1963), «Вязні Салавецкага манастыра» (1965), «Архангельск. 1584—1984: Фрагменты гісторыі» (1984, у саўт.). Адзін з рэдактараў і аўтараў «Паўночнага археаграфічнага зборніка» (вып. 1—3). Рэдагаваў многія кнігі, якія выходзілі ў Паўночна-Заходнім кніжным выдавецтве. Педагагічную і навуковую дзейнасць Г. Г. Фрумянкоў спалучаў з грамадскай работай. Ён быў прапагандыстам гісторыі Архангельскага краю. Многа зрабіў для папулярызацыі М. В. Ламаносава, Ламаносаўскіх чытанняў. Выступіў ініцыятарам усесаюзнай канферэнцыі, прысвечанай 400-годдзю Архангельска. У гэты год ён стаў яго ганаровым грамадзянінам. У Дзяржаўным архіве Архангельскай вобласці створаны асабісты фонд Г. Г. Фрумянкова. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны», медалямі «За абарону Ленінграда» і інш. Памёр Г. Г. Фрумянкоў 18.8.1989 г.

МІКОЛА ЯНЧАНКА

Беларускі паэт і празаік Мікалай Ігнацьевіч Янчанка нарадзіўся 22.6.1931 г. ў в. Забалацце Магілёўскага раёна ў сям'і каваля. Вялікі ўплыў на будучага паэта аказаў бацька, таленавіты чалавек. Ён цудоўна іграў на скрыпцы і гармоніку, любіў паэзію, шмат вершаў ведаў на памяць, спрабаваў сам пісаць, перакладаў словы на музыку.

У 1956 г. М. Янчанка скончыў гістарычны факультэт Магілёўскага педінсты-

тута, і быў накіраваны ў Брожскую школу Бабруйскага раёна. Тут пад уражаннем паэзіі Сяргея Ясеніна пачаў пісаць вершы, якія дасылае ў раённую і абласную, рэспубліканскія газеты і часопісы. Творы маладога настаўніка сталі з'яўляцца ў друку. З 1961 г. ён працаваў на Рагачоўшчыне ў Гарадзецкай школе-інтэрнаце, рэдакцыі раённай газеты «Камунар». З 1966 г. Янчанка спрабуе свае сілы ў журналістыцы ў раённых газетах Калінкавіцкага, Кармянскага, Жлобінскага р-наў. У гэты час ён шмат пісаў, друкаваўся ў «Сельской газете», «Гомельскай праўдзе», выступаў з вершамі на тэлебачанні. У 1972 г. зноў вярнуўся ў Рагачоў, да выхаду на пенсію працаваў у раённай газеце, кіраваў літаб'яднаннем «Натхненне».

У 1971 г. ў выдавецтве «Беларусь» выйшла першая кніга паэта пад назвай «Разнатраўе», праз два гады ўбачылі свет дзіцячыя апавяданні ў яго кнізе «З людзьмі — добра». Затым выйшлі кнігі «Зраблю сонейка» (1978), «Кросны» (1980), «Лета ў серванце» (1981), «Залаты вулей» (1986), «Жменька жалудоў» (1989), «Жыцейка-жыта» (1990). М. Янчанка займаецца таксама перакладам вершаў рускіх паэтаў Ігара Шклярэўскага, Дзмітрыя Кавалёва і інш. У яго перакладзе выйшла кніга Дз. Кавалёва «Вечна зялёная Ветка» (1990).

Творы Міколы Янчанкі прасякнуты шчырым клопатам аб роднай зямлі, любоўю да людзей, душэўнай цеплынёй і мяккім гумарам, спрадвечным сялянскім цвярозым сэнсам.

В. К. Паўлаў.

Другая радзіма пісьменніка

Народны пісьменнік Беларусі Міхась Ціханавіч Лынькоў дзіцячыя і юнацкія гады свае правёў на Рагачоўшчыне. Станаўленне асобы пісьменніка і пачатак літаратурнай дзейнасці яго таксама звязаны з гэтымі мясцінамі. Таму і лічаць рагачоўцы М. Ц. Лынькова сваім земляком, ушаноўваюць памяць пра песняра. Бацька пісьменніка працаваў рабочым-чыгуначнікам, пераязджаў у пошуках работы з месца на месца. Толькі зімой 1907 г. сям'я Лыньковых пасялілася на «дзвесяце трынаццатай вярсце» у «будцы» (так называлі чыгуначную пабудову тыпу звычайнай драўлянай хаты) паблізу в. Старое Сяло.

Міхась быў старэйшым у сям'і. Вучыцца будучы пісьменнік пачаў у мясцовай школе, якую скончыў у 1910 г., атрымаўшы ў якасці ўзнагароды за добрую вучобу кнігу М. В. Гогаля «Вечары на хутары каля Дзіканькі». Па прапанове настаўніка Кірылы Пятровіча Бечына бацькі пасылаюць Міхася ў двухкласнае вучылішча пры Рагачоўскай настаўніцкай семінарыі. А ўвосень 1913 г. ён вытрымаў экзамены ў тую ж семінарыю.

Сябра пісьменніка па семінарыі Мяфодзій Якаўлевіч Новікаў успамінаў: «Хоць Рачагоў да рэвалюцыі быў невялікім павятовым горадам, аднак там былі рэальнае вучылішча, жаночая гімназія, вышэйшае пачатковае вучылішча, настаўніцкая семінарыя, драматычны тэатр, што па тым часе не так ужо і мала. Нездарма горад называлі значным цэнтрам асветы.

Толькі што адкрытая настаўніцкая семінарыя была забяспечана новымі вучэбнымі дапаможнікамі і размяшчалася ў спецыяльна пабудаваным корпусе. Акрамя таго, былі і іншыя будынкі: пачатковага вучылішча, дзе семінарысты праводзілі практычныя заняткі, інтэрната, бальніцы. Меўся вялікі семінарскі сад. Увесь гэты комплекс знаходзіўся непадалёку ад чыгуначнай станцыі. Выкладчыкамі з'яўляліся высокаадукаваныя людзі, выдатныя майстры сваёй справы. Большасць мела універсітэцкую адукацыю. Яны былі і класнымі настаўнікамі. Семінарысты знаходзіліся пад іх кантролем. Асабліва запомніліся выкладчыкі: фізікі і хіміі — Парыйскі, гісторыі і геаграфіі — Грышкоў, рускай мовы і літаратуры — Самахвалаў, псіхалогіі і логікі — Назар'ін, матэматыкі — Пуцімцаў.

З прычыны таго, што ў семінарыі выдавалася стыпендыя 180 рублёў на год, паступаць сюды было вельмі цяжка. На 30 месцаў штогод падавалася па 200—250 заяў. Шмат хто паступаў па 3—4 разы, таму вучні ў групе падзяліліся на вялікіх і малалетак. Лынькоў і я паступілі, калі нам было па 13 з паловай гадоў. Мы складалі групу малалетак.

З другога паўгоддзя першага класа Лынькоў не атрымаў стыпендыі, а таму вымушаны быў кожны тыдзень хадзіць дадому за 15 вёрст. У час канікулаў, ды і ў сярэдзіне зімы, падзарабляў на чыгунцы. Вучыўся старанна, прымаў актыўны ўдзел у выданні рукапіснага часопіса (пісаў артыкулы, апавяданні, вершы, маляваў, афармляў вокладку кожнага нумара часопіса), вучыўся іграць на скрыпцы ў выкладчыка Каца. А ў старэйшых кла-

сах даваў прыватныя ўрокі. У семінарыі ў Лынькова выяўляецца схільнасць да літаратуры і пісьменніцкай дзейнасці. Часта забаўляў ён нас вуснымі апавяданнямі, любіў карыстацца жывой гутарковай мовай. Упершыню ў яго выкананні я пачуў паэму «Тарас на Парнасе» на беларускай мове.

У 1913 г. за кошт семінарыі была арганізавана экскурсія ў вёску Навасёлкі-Салтанаўка Быхаўскага павета на месца баёў рускай арміі з полчышчамі Напалеона. Потым нам прапанавалі напісаць сачыненне на тэму «Паездка ў Навасёлкі».

Сачыненне М. Лынькова было самае лепшае. Яго адобрыла дырэкцыя, прачыталі ўсім семінарыстам і паслалі папячыцелю Віленскай вучэбнай акругі. Ён ацаніў сачыненне самым высокім балам (5+) і пахваліў аўтара.

1 лютага 1917 г. Міхась скончыў настаўніцкую семінарыю, атрымаў прызначэнне на пасаду настаўніка ў Ліпніцкую земскую школу Буда-Кашалёўскага р-на. Вёў заняткі ў школе адзін у чатырох групах (цяпер сказалі б у чатырох класах), сам даставаў кнігі для дзяцей. Арганізаваў першы ў вёсцы кааператыў, ездзіў за паўсотні кіламетраў за плугамі, сярпамі і іншым таварам у горад і сам, пакуль не падвучыў сабе замену, быў загадчыкам і прадаўцом, або, як тады гаварылі, сядзельцам кааператыўнай крамы, у летнія месяцы.

У час грамадзянскай вайны Міхась Лынькоў спачатку быў у партызанскім атрадзе, ваяваў, потым з лета 1919 г.— у Чырвонай Арміі. Удзельнічаў у баях з белапалякамі, у паходзе на Варшаву...

Лёс жа бацькоў пісьменніка ў тыя гады склаўся трагічна. Вось што гаварыла меншая сястра пісьменніка Ганна Ціханаўна: «У 1920 годзе не стала бацькі. Ноччу пайшоў правяраць чыгунку. Непадалёку ад моста на рэйках ляжала шмат шпалаў. Хтосьці нацягаў іх, магчыма, белыя, магчыма, «зялёныя» (так звалі ў нас тых, хто хаваўся ў лесе ад мабілізацыі). Бацька ведаў: вось-вось павінен прайсці кур'ерскі цягнік. Крушэнне непазбежнае. Доўга не думаючы, узяўся сцягваць шпалы і скідваць іх пад ахон. І толькі сцягнуў апошнюю шпалу — убачыў кур'ерскі. Праімчаўся ён, а бацька сеў на шпалу, абцёр далонню ўспацеўшы твар і з палёгкаю ўздыхнуў. Колькі ён адпачываў, невядома. Прыйшоў дадому, расказаў пра здарэнне. Гэты было ў суботу, у дзень, калі бацька грэў лазню, каб уся сям'я магла памыцца. Але ў гэты раз ён не пайшоў у лазню. Залез на гарачую печ ды так і не

М. Ц. Лынькоў.

злез да раніцы. Паклікалі доктара з Рагачова, але ўжо было позна ратаваць. Ноччу бацькі не стала. Мы ніколі не бачылі яго хворым, заўсёды ён быў бадзёры і моцны.

У сям'і старэйшай была Поля. Каб памагчы маці, яна пайшла працаваць на чыгунку. Праца цяжкая, але нічога не зробіш... У абавязак маці, якая працавала вартаўніком на пераездзе, уваходзіла насіць рапарт чыгуначнага майстра са Старога Сяла на станцыю Рагачоў. Кожны дзень туды і назад, калі цягніком, а калі пехатою, бо расклад руху паяздоў увесь час парушаўся — ішла ж грамадзянская вайна...

Да Полі (ёй не было і 17 гадоў) пасватаўся дэмабілізаваны з Чырвонай Арміі хлопец. Думалі, гадалі і вырашылі згадзіцца,— хоць Поля будзе мець свой кут. А жаніх добры, працавіты і з твару нішто сабе.

Полю аддалі замуж, а на яе месца на чыгунку пайшоў працаваць Грыша, падлетак, не было яму яшчэ чатырнаццаці. Працаваў з дарослымі на рамонце. Баліць матчына сэрца. А што зробіш? Ды вось радасць: ад Мішы прыйшло пісьмо, у якім ён паведамляў аб хуткай дэмабілізацыі. Прасіў яшчэ крыху пацярпець, каб потым клопаты аб сям'і ўзяць на сябе. Улетку 1922 г. сапраўды Міша прыехаў дадому са шпіталя, дзе лячыўся ад тыфу. Але нядоўгая была радасць, брат захварэў зноў. У хаце смутак, слёзы. Лячылі яго дактары і нават знахары, шаптухі. Памятаю, як паіла браціка па наказу маці «нагаворанай» вадой. Перамог Міхась і гэту хваробу. Аднойчы маці ўзрадавана зірнула на ложак, дзе ляжаў Міша, і ўсхвалявана сказала: «Слава богу, будзе жыць». Што яна ўбачыла ці пачула, нам засталося невядомым. Брат выжыў, стаў есці. Маці старалася паіць яго сырадоем, карміць усім лепшым, што было.

Паправіўшыся, Міша паехаў у Рагачоў і атрымаў прызначэнне ў сямігадовую

школу мястэчка Свержань. Правялі яго на працу, а потым брат узяў да сябе Грышу і ўладкаваў вучыцца. Міша працаваў настаўнікам, а Грыша вучыўся. Хлопцы самі гатавалі сабе ежу, самі прыбіралі кватэру. Калі Міхась наведваўся дадому, заўсёды прывозіў нам гасцінцы. Маці збярэ таго-сяго з яды, што было ў нас, і дасць з сабою. Так яны ўдвух і пражылі першы навучальны год».

Фёдар Лаўрэнцьевіч Бычынскі, былы вучань Свержанскай сямігодкі, палкоўнік у адстаўцы, успамінаў: «Я быў вучнем пятага класа, калі да нас у школу прыехаў малады настаўнік у чырвонаармейскім абмундзіраванні Міхась Лынькоў. Строгі і патрабавальны, скупы на павышаныя адзнакі, ён адразу заваяваў нашы сімпатыі. Мы палюбілі Міхася Ціханавіча за справядлівасць, павагу да нас, вучняў. Тады не хапала падручнікаў, твораў мастацкай літаратуры. Таму Лынькоў наладжваў калектыўныя чытанні. Зімою гэта рабілася ў свабодным класе ці кватэры настаўніка, якая была пры школе, а ў цёплыя веснавыя дні ўсе мы ішлі ў прыгожы бор, які пачынаўся адразу ж за школьнай сялібай. Міхась Ціханавіч патрабаваў ад нас акуратнасці і дысцыплінаванасці і сам паказваў ва ўсім прыклад, ніколі не спазняўся на ўрокі. Але аднойчы ў панядзелак не прыйшоў у школу. Я папытаўся ў яго брата Грышы: «Што здарылася?».

— Адграваецца,— адказаў той. Аказалася, на выхадны дзень ён хадзіў да маці ў Старое Сяло, гэта кіламетраў каля 20 ад Свержаня. Вяртаючыся назад, у лесе напаткаў ваўкоў, і тыя загналі яго на дрэва, дзе наш настаўнік прасядзеў да раніцы».

У снежні 1923 г. маці, Алена Емяльянаўна, паехала ў Магілёў афармляцца на пенсію, купіць што-небудзь з адзення. Напакавала ў горадзе вялікі клунак. Едзе шчаслівая дадому, радуецца: хутка паедзем да Мішы, будзем жыць усе разам, у адной сям'і. Вось і патрэбны прыпынак: Старасельскі раз'езд. Цягнік нават мінуты не пастаяў, і рвануў. Пасажыры пачалі выскокваць з вагонаў. Алена Емяльянаўна скочыла з клункам, але няўдала, і падножкай пацягнула клунак, а разам з ім і жанчыну. Коламі вагона параніла. Паравоз спынілі, пацярпеўшую ўнеслі ў вагон, потым завезлі ў Рагачоўскую чыгуначную бальніцу. У апошні раз праехала маці каля будкі, у якой пражыла амаль 17 гадоў. Адразу ж паведамілі дзецям... Прыехалі да маці ў бальніцу. Яна прасіла купіць валёнкі, бо параненая нага будзе баяцца холаду. Доктар параіў купіць партвейн. Віно і таго-сяго з ежы Міша занёс у бальніцу. Развіталіся, паабяцаўшы назаўтра прывезці Ганну, бо маці казала, што ёй сумна і няхай бы самая малодшая дачушка пабыла з ёю. Ужо ў Старым Сяле наняў Міхась Ціханавіч падводу і ранкам з Ганнай паехаў у Рагачоў. Не даехаўшы да горада кіламетры тры, зайшлі ў чыгуначную будку да кумы і тут даведаліся ад яе, што маці памерла. Ноччу кума сядзела каля маці. Алена Емяльянаўна папрасіла яе набраць у кубак вады, а калі тая вярнулася, маці памерла.

Пахавалі маці пісьменніка на старасельскіх могілках побач з мужам. Галасілі бабы над труною нябожчыцы, прарочылі дзецям жабрацтва. Толькі яны памыліліся. Дзеці вырашылі жыць разам. Пагрузілі на сані невялікі набытак, які застаўся ад бацькоў, паклалі падсвінкаў, ззаду прывязалі двух кароў. Малодшых ухуталі цяплей, размясціўшы паміж хатніх рэчаў. Уехалі ў Старое Сяло. На вуліцы стаялі сяляне, іх дзеці. Жанчыны цяжка ўздыхалі, ківалі галовамі, развітваючыся, некаторыя выціралі вочы. К вечару прыехалі да Дняпра, у Свержань, дзе пражылі да восені 1925 г.

Пасялілася сям'я ў двухпавярховым будынку, які да рэвалюцыі належаў нейкаму лесапрамыслоўцу. У ім былі два класныя пакоі і настаўніцкая. Міхась заняў два жылыя пакоі, з пярэдняй, кухняй і верандай. Адбылася першая сямейная нарада, на якой размеркавалі абавязкі. Ганне як адзінай жанчыне ў «камуне», а было той жанчыне ўсяго 11 гадкоў, даручылі гатаваць страву, даіць кароў, мыць бялізну, падлогу. Грыша павінен быў паіць і карміць кароў і свіней, прыносіць на кухню дровы, ваду, дапамагаць Ганне. Коля быў зусім малы, а пра Міхася не гаварылі, ведалі, немалы груз узваліў старэйшы брат сабе на плечы, стаўшы бацькам траіх дзяцей, не паспеўшы не тое што ажаніцца, а і змяніць паношаную чырвонаармейскую форму на цывільны касцюм.

У маі 1925 г. акруговы камітэт Кампартыі Беларусі накіраваў актыўнага селькора М. Ц. Лынькова, які дасылаў цікавыя карэспандэнцыі, вершы ў газету «Камуніст», на працу ў яе рэдакцыю. Ён стаў сакратаром рэдакцыі. Міхась Ціханавіч пераехаў у Бабруйск, а за старшага ў Свержані застаўся Грыша. Перад пачаткам навучальнага года старэйшы брат прыехаў да малых, каб прадаць гаспадарку і назаўсёды пакінуць Рагачоўшчыну. «Камуна» Лыньковых стала жыць у Бабруйску.

Ул. Бандарэнка.

У кожнага чалавека ёсць свой, запаветны куточак на зямлі. Для беларускага пісьменніка Уладзіміра Караткевіча такім дарагім для яго месцам было Прыдняпроўе. У сваёй аўтабіяграфіі «Дарога, якую прайшоў» ён адзначаў, што ў Прыдняпроўі яму было неяк больш прытульна. І гэта абумоўлівалася і прыгажосцю прыдняпроўскай зямлі, і тым, што нарадзіўся ён у Оршы і ўсе яго продкі таксама ўраджэнцы той часткі Беларусі, што ляжыць на Дняпры. На гэтай зямлі мастак напісаў многія свае творы. І многія з іх прысвечаны гэтай зямлі і яе людзям.

Асаблівае месца ў жыццёвым і творчым лёсе У. Караткевіча належыць Рагачоўшчыне. Так, у яго сям'і захавалася паданне пра Тамаша Грыневіча (Грынкевіча), сваяка з боку маці і яе радні, аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863—64 гг. на Прыдняпроўі, які быў расстраляны ў Рагачове. Пісьменнік апісаў гэту гісторыю ў пралогу рамана «Леаніды не вернуцца да Зямлі» (вядомы пад назвай «Нельга забыць»). Пазней у архіве даследчыкі знайшлі матэрыялы, якія сведчылі, што такі выпадак сапраўды адбыўся.

Маці пісьменніка, Надзея Васілеўна, пасля заканчэння ў 1911 г. Марыінскай гімназіі ў Магілёве некаторы час працавала настаўніцай у в. Збароў, каля Рагачова. Моцнае ўздзеянне на будучага пісьменніка зрабіў у дзяцінстве яго дзед, бацька маці, Грынкевіч Васіль Юльянавіч, які даслужыўся да павятовага казначэя, жыў і працаваў таксама ў Рагачове. Ён стаў прататыпам старога Данілы Загорскага-Вежы ў рамане «Каласы пад сярпом тваім».

Заўсёды гасцінным і ўтульным для У. Караткевіча і яго сяброў былі ў Рагачове дом на вуліцы Чкалава, дзе жыў яго дзядзька Ігар Васілевіч Грынкевіч (памёр у 1985), дзе і зараз жывуць яго жонка Галіна Мікалаеўна і іх сын Сяргей з сям'ёй. Гэты мураваны дом яшчэ пабудаваў дзед Васіль Юльянавіч. Сюды часта прыязджаў пісьменнік працаваць, адпачываць, лавіць рыбу і хадзіць на паляванне, сустракацца з цікавымі людзьмі. У гэтым прасторным доме з высокай столлю яму быў адведзены вялікі пакой. 15 мая 1981 г. У. Караткевіч падараваў Ігару Васілевічу свае «Выбраныя творы» ў 2 тамах (Мн., 1980) з такім надпісам: «Дарагому дзядзьку Ігару, майму другому бацьку».

Уладзімір Караткевіч пісаў свае творы ў розных мясцінах — у Оршы, Лесавічах на Украіне, у Маскве, Мінску, Карапішчавічах, Чэлябінску... Многія ж з іх, асабліва ў 60-я гады, былі створаны на Рагачоўшчыне. Ёсць падставы гаварыць, што для У. Караткевіча Рагачоў быў тым, чым былі для А. С. Пушкіна Болдзіна ці для Янкі Купалы Акопы.

Так, яго ранняя паэма «Зямля дзядоў» была пачата ў 1950 г. ў Рагачове. У ёй згадваюцца «руіны замка «каралевы Боны» і «над Дняпром шырокім курганы», «Збароў, дзе некалі мая матуля вясковаю настаўніцай была», капліца «над бабчынай магілаю старой», палі «напалеонаўскіх спаруд старых», якія згінаюць вышэй ад горада, каля Прарова, і дом «пад разгатаю таполяй», дзе «расце на змену самы меншы брат». Пранікнёна і шчыра гучаць заключныя радкі паэмы:

Зямля дзядоў! Любімы мой народзе,
Што моц сваю пазычыў у дубоў,
Дыхтоўна зробленыя на стагоддзе
Нашчадкі бортнікаў і рыбакоў.
Не зверне шлях мой на шляхі чужыя,
Заўсёды дарагімі будуць мне
Зарэчча, горад, хвоі залатыя,
Ашыткі, на прароўскім мулкім дне.

Пасля заканчэння Кіеўскага універсітэта летам 1954 г. зноў гасцяваў ён у дзядзькі. У вершы «Вагеньчык у яблынным садзе» паэт пісаў:

Тут цягне жыць і кахаці,
Тут добра так, як нідзе,
У старасвецкай хаце,
У дзедаўскім родным гняздзе.
Бо з гэтай няяркай зямліцы,
З абрываў рудых, з лугоў,
З садоў у начной расяніцы
Наш корань у свет пайшоў.

На рагачоўскай зямлі ўзніклі і вершы «Буслы вучаць дзяцей», «Я іду лугавою дарогай», «О вясна! Таполі! Свеце мілы!..», «Жанчыне з бэзам», «І сніў Адам», «Крокі ўначы», «Чурлёніс», «Вуліцы», «Як сканаю — душа застанецца» і многія інш.

Пісьменнік наведаў дзядзьку і летам 1959 г., пасля таго, як адвучыўся першы год на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве. У лісце да Янкі Брыля ад 21 жніўня 1959 г. ён пісаў: «Амаль месяц быў у Рагачове. Вось і ўвесь адпачынак. Зрабіў другую кнігу вершаў («Вячэрнія ветразі», 1960 — А. В.) і заўтра дашлю яе Анатолю Сцяпанавічу (Вялюгіну.— А. В.), напісаў некалькі новых вершаў і, здаецца, не зусім дрэнных. І яшчэ рыбачыў, рыбачыў і рыбачыў.

Люблю Дняпро, як вершы, нават такі,

У. С. Караткевіч.

змялелы, абязрыбелы, з дубамі, якія пасяхова пускаюць на дравішкі.

Не бачыў Нёмна, але думаю, што Дняпро ля Рагачова не горшы. Ён, мне здаецца, больш першабытны. Гліністыя, пясчаніковыя, сланцавыя адхоны. Крыніцы выбіваюцца з-пад іх, шастае трава. Так і здаецца, што зараз з'явіцца над ракою табун дзікіх коней. І месяц чырвоны, нізкі.

А вышэй ад горада лясы ідуць і вёскі на адхонах такія, што сэрца заходзіцца ад замілавання. Адны Кісцяні чаго варты!

І мые ён берагі, мые. Дубы вымывае, старыя, варажскіх часоў. Я напэўна рыбаком стаў бы, каб не пісаў. Падабралася ў нас кампанія: я ды дзядзька, ды два яго сябры, Мікола ды Пятро. І што мы нарагаталіся, што разыгралі адзін аднаго, што юшкі насёрбаліся!

І галоўнае, кожны дзень — гэта тысячы адкрыццяў». Пісьменнік сцвярджае далей, што ён запісаў ужо ў чарнавіку накід кінасцэнарыя «Дзеці вялікай ракі». Выказвае шкадаванне, што гэтыя людзі праз дваццаць год могуць астацца без рыбы, бо «прыязджае сволач розная і глушыць рыбу. І нікому няма справы».

Гэты побыт У. Караткевіча ў Рагачове стаў асновай для зместу дзевятага раздзела яго рамана «Леаніды не вернуцца да Зямлі», калі галоўны герой Андрэй Грынкевіч наведаў гарадок Сухадол, у якім пазнаецца Рагачоў. Тут згадваецца і вялізны дом, што пабудаваў яшчэ яго дзед, дзе Андрэй «атрымаў вялікі пакой (два акны ў сад, два — на вуліцу)», і вясёлая рыбацкая кампанія, якая складалася з дзядзькі, настаўніка Мікалая Якаўлевіча і Пятра. Андрэй у сваім пакоі «расклаў на стале рукапісы,— і пайшлі дні ў чаргаванні працы і адпачынку, вершаў і рыбнай лоўлі... ён ніколі яшчэ не пісаў так многа і добра, ніколі так поўна не адпачываў».

У рамане адзначаецца, што Андрэй любіў свайго дзядзьку не толькі за тое, што ён быў адмысловым рыбаком і добрым садаводам, бо выводзіў у Сухадоле нават вінаград, але і за тое, што ў дзядзькі, які шмат перажыў у жыцці, «быў рэдкі гумар, такі сонечнавясёлы, такі смачназ'едлівы, што каля яго людзі смяяліся да знямогі з раніцы да вечара». Думаецца, што Ігар Васілевіч паслужыў прататыпам дзядзькі ў рамане. Гэты чалавек быў духоўна блізкі У. Караткевічу, да яго той цягнуўся, ён зрабіў пэўны ўплыў на фарміраванне таленту мастака.

З Рагачовам звязана і стварэнне рамана «Каласы пад сярпом тваім». Як вядома, збіраць матэрыялы для свайго будучага твора пра паўстанне 1863—64 гг. У. Караткевіч пачаў у першай палове 50-х гадоў, калі вучыўся ў Кіеўскім універсітэце. Пісаць па-сапраўднаму раман ён пачаў у Рагачове 27 красавіка 1962 г. У далейшым, у 1962—64 гг., пісьменнік стварыў кнігу і ў гэтым горадзе (пісалася яна таксама ў Мінску, Каралішчавічах і Чэлябінску). У рамане У. Караткевіч закранаў адну з яркіх старонак беларускай гісторыі. Пачынаецца ён з прыдняпроўскіх легенд і паданняў, з апісання паэтычнай і вельмі прыгожай прыроды — ад Рагачова да Оршы. Метафарычны вобраз заклаў пісьменнік і ў назву кнігі. Навеяны ён выглядам падмытай грушы на стромкім адхоне высокага правага берага Дняпра ў вёсцы Азярышча. У. Караткевіч выступае ў рамане як чалавек, улюбёны ў сваё Прыдняпроўе. Ён стварае цудоўную песню пра сваю зямлю: «На Дняпры стаяла магутная палавень. Вышэй Сухадола вялікая рака разлілася на дванаццаць вёрст. Сонца гуляла ў ёй, і побач з гэтым магутным зяяннем мізэрнымі здаваліся бліскаўкі манастырскіх купалоў на тым беразе». Як у рамане «Каласы пад сярпом тваім», так і ў іншых творах ён Дняпро называе вялікай ракой. Дняпро з'яўляецца для мастака крыніцай натхнення, выступае як адзін з герояў яго кнігі, як сімвал беларускага краю, як тая артэрыя, што жывіць яго родную зямлю і дае ёй сілы.

Пісьменнік даў не толькі дасканалыя малюнкі беларускай прыроды. Ён па-мастацку апісаў і апаэтызаваў жыццё людзей на прыдняпроўскай зямлі. Назвы некаторых мясцін, дзе адбываецца дзеянне твора, ён пакінуў без змянення (Азярышча), некаторым даў сваю назву (Сухадол, Загоршчына). Кіраўнік закалату Яраш Раўбіч цэнтрам будучага паўстання меркаваў зрабіць Сухадол, у якім пазнаецца Рагачоў. Ён імкнуўся ўмацаваць такія прыдняпроўскія ўзвышэнні, як Доўгая Круча, Гарадзішча, Чырвоная Гара, Спароўскія вышыні, Луцкія гарбы.

У сцэнах сялянскага жыцця Кагутоў, у апісанні Загоршчыны, у апавяданні пра Данілу Загорскага-Вежу, у многіх іншых мясцінах твора раскрываецца глыбокае веданне аўтарам беларускага Прыдняпроўя, жыцця і быту яго жыхароў. Галоўны герой Алесь Загорскі абараніў дысертацыю па гісторыі на тэму «Сялянская вайна XVII стагоддзя на тэрыторыі беларускага Прыдняпроўя. Па матэрыялах радавых архіваў тамтэйшых дваран і прыдняпроўскіх «Кронік». Дзеля яе «ён усё лета праседзеў у архівах Вежы, Сухадольскага замка, Раткевічаўшчыны, Кісцянёў і фондаў былога Збароўскага касталянства». Алесь вучыў гісторыю роднага краю, для яго блізкімі і дарагімі сталі беларуская мова і культура, імёны кіраўнікоў народных паўстанняў на Беларусі.

Алесь даследаваў таксама прыдняпроўскія песні, паданні і легенды. У выніку наперакор рэакцыйным вучоным, якія бачылі ў беларусах «самы баганосны і рахманы са славянскіх народаў», ён паказаў бунтарны і жыццялюбны дух беларуса. І калі вядомы вучоны Сразнеўскі прачытаў працу Алеся, то адзначыў, што ён адкрыў, магчыма, цэлы народ. На самой справе Алесь адкрыў тое, што было і ёсць у яго народа. Ён паказаў веліч і духоўную моц свайго народа, заклікаў прадстаўнікоў іншых нацый звярнуць увагу на беларусаў і лічыцца з імі.

Першую кнігу рамана пісьменнік назваў «Выйсце крыніц». Родная зямля была для яго крыніцай, якая жывіла яго духоўныя і фізічныя сілы, давала яму сілы, як антычнаму Антэю. Праз Прыдняпроўе ён паказаў Беларусь, яе гераічнае і трагічнае мінулае, яе мужных і працавітых людзей.

З любоўю і цеплынёй апавядае пісьменнік пра родны край і ў аповесці «Сівая легенда». Тут паказана не толькі прыгожае і трагічнае каханне патомнага дваранiна Рамана Ракутовіча і прыгоннай дзяўчыны Ірыны, але і адлюстравана барацьба беларускага народа на пачатку XVII стагоддзя супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. Дзеянне твора адбываецца ля галоўным чынам у Кісцянёўскім замку, згадваецца таксама Быхаў, замкі ў Збарове і Рагачыку, адзначаецца, што «мяцеж узгарэўся ў наваколлі Зверына», у канцы дзеянне твора пераносіцца ў Магілёў.

У ліпені — жніўні 1964 г. была напісана ў Рагачове і навела «Ладдзя Роспачы», дзе расказвалася пра сярэдневяковага жыхара Рагачова Гервасія Выліваху. Сам пісьменнік лічыў, што гэты твор з'яўляецца найбольш удалай спробай «даць абагульнены характар беларуса, якому і чорт не брат, якога і смерць не палохае, які больш за ўсё любіць Радзіму, жыццё і весялосць і ні пры якіх абставінах не ўступіць у барацьбе за іх». Не пахіснула героя ў яго ерасі і не пакарала яго падчас сустрэчы з ім і каралева Бона Сфорца, якая наведала свой замак у Рагачове. Ён гуляе ў шахматы нават з самой Смерцю.

У вобразе Гервасія Выліваху ўвасобіўся жывы народны дух, непакорлівы, насмешлівы, невынішчальны і стойкі ў любых нягодах. Прататыпамі гэтага героя маглі стаць і дзядзька Ігар Васілевіч, і яго сябры-рыбаловы, і рагачовец Зміцёр Дорахаў, які «смешачкамі начальству і мешчаноце жыць не дае», і рагачовец-асілак (ён згадваецца ў нарысе «Зямля пад белымі крыламі»). Гэты дзяцюк «калісьці ў Рагачове, на спрэчку, пазносіў у адно месца дзесяць дванаццаціпудовых якараў з баржаў і пераблытаў іх лапамі так, што пасля куча людзей з гэтых лайбаў ледзь разблыталі, каб кожнаму забраць свой». Такіх людзей нараджала беларуская зямля. І пісьменнік паказваў іх у сваіх творах ва ўсёй самабытнасці і неадназначнасці.

Добрая атмасфера дзедаўскай хаты ў Рагачове спрыяла і таму, што якраз тут зімой і вясной 1966 г. У. Караткевіч канчаў свой раман «Хрыстос прызямліўся ў Гародні». Галоўны герой гэтага твора Юрась Братчык з'яўляецца духоўным братам не толькі Гервасію Выліваху, але і такім сусветна вядомым вобразам, як Пантагруэль, Ціль Уленшпігель, Кала Бруньён.

11 лістапада 1966 г. ў Рагачове была закончана аповесць «Чазенія», адзін з лепшых твораў пісьменніка. Заўважым, што асабліва дарагімі самому У. Караткевічу былі раман «Каласы пад сярпом тваім», аповесць «Чазенія» і навела «Ладдзя Роспачы». Узніклі яны ў Рагачове ў пік творчасці мастака. У Рагачове былі напісаны таксама нарыс пра Латвію «Казкі Янтарнай краіны», аўтабіяграфія «Дарога, якую прайшоў», апавяданне «Дрэвы вечнасці» і іншыя творы.

Шмат цёплых слоў сказаў пра Прыдняпроўе пісьменнік у нарысе «Зямля пад белымі крыламі». Пісьменнік, па сутнасці, стварае гімн роднай зямлі, калі апісвае паводку на Дняпры ці калі расказвае пра мужных, працавітых, кемлівых людзей свайго краю. Гэту зямлю ён называе «маё Прыдняпроўе», бо ён — часцінка гэтай зямлі, з ёю зросся жыццёвымі каранямі, яе апеў у сваіх творах.

Вызначаючы асаблівасці розных беларускіх мясцін, пісьменнік знаходзіць дакладныя і непаўторныя фарбы і для Рагачова, «дае зелень і гарадзішчы, і галаваломныя ўрвішчы над Дняпром, і вілясць на іх кронамі ўніз скурчаныя сосны, і дрэмле шыпшына на курганах, і зяюць тарыконы ракушак». Такой убачыў, такой паказаў і такой, выкарыстоўваючы яго любімае слова, «прыўкраснай» паўстала яна ў яго творах.

Так, пісьменнік часта ўцякаў ад гарадской мітусні і жыццёвых нягод у Рагачоў, каб там адпачыць душой і добра папрацаваць. Ён там знаходзіў падтрымку і разуменне, чым даражыў. У лістах да свайго сябра, латышскага паэта Е. Стулпана, з якім вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве, пісаў: «Потым [еду] тыдні на два ў Мінск, а потым на $1^1/_2$ у Рагачоў, да дзядзькі, працаваць» (15.02. 1962 г.), «У Рагачове буду месяц» (21.04.1962 г.), «шмат працую. Пішу новы раман («Каласы пад сярпом тваім».— А. В.). Атрымліваецца, здаецца, няблага... я яшчэ тут буду цэлы верасень, да 18-га чысла гэтага месяца» (23.08.1963 г.), «я зараз у Рагачове. Буду тут да 1 жн.» (5.07.1965 г.), «я ў Рагачове да 18 лютага» (30.01.1966 г.) і інш. Як бачым, Уладзімір Караткевіч часта і даволі працяглы час знаходзіўся ў Рагачове, асабліва ў першай палове і ў сярэдзіне 60-х гадоў. Свой водпуск разам з ім правёў у Рагачове летам 1963 г. перакладчык В. Сёмуха. У жніўні 1964 г. гасціваў у Рагачове і балгарскі літаратуразнавец Г. Вылчаў, што знайшло мастацкае адлюстраванне ў паэме У. Караткевіча «Віно дажджоў», напісанай неўзабаве ў Рагачове. Падарожнічаючы 2—9 чэрвеня 1965 г. па ўсходняй частцы Беларусі, У. Караткевіч з Янкам Брылём і Р. Барадуліным наведалі таксама Рагачоў, Кісцяні і Гарадзішча. Пазней, у нарысе «Мой друг і мая зямля», напісаным у 1967 г. да 50-годдзя Янкі Брыля, У. Караткевіч так успамінаў той час: «На берагах Дняпра, на замчышчах, якім дзевяцьсот-тысячу-дзве тысячы чатырыста год, шумела меж чарапкоў сівая трава. На котлішчах панскіх маёнткаў цвіла шыпшына, якая выradзілася з руж, і ўсяладны персідскі бэз. Над Рагачовам, над зялёнымі хмарамі Кісцянёўскага парку, над хутарам Крыцкага (хацеў бы я, каб мяне там калісьці закапалі, а да таго хацеў бы, як найчасцей, бываць там) цягнуліся і звінелі веснія, празрыстыя аблокі.

Шапацелі здзічэлыя яблыні. Марылі аб мінулым чорныя дубы на дне і ў берагах. Гэта была прыгажосць, неаддзельная ад лёгкага адценння тугі, бо гэта была мая радзіма, мая купель і курган маіх продкаў, і я дужа хацеў, каб яна стала роднай і хлопцам — уся, ад Прарова да Кісцянёўскіх круч.

Рэўнасць да родных мясцін дужа глыбока жыве ў нас. Але, мне здаецца, я дамогся свайго». Сваім сябрам, знаёмым, усёй Беларусі і ўсяму свету пясняр Прыдняпроўя хацеў паказаць, якая яна прыгожая, яго родная «зямля пад белымі крыламі». І, думаецца, ён дамогся гэтага ў сваіх творах. Дзякуючы песняру Прыдняпроўя зафіксавалі красу рагачоўскай зямлі і кінематаграфісты. Так, кінарэжысёр А. Ястрабаў па сцэнарыю У. Караткевіча паставіў дакументальныя фільмы «Апавяданні пра юнацтва» (1960) і «Будзь шчаслівай, рака» (1967). Пісьменнік радаваўся, што рэжысёр разумеў яго, а Кісцяні, напрыклад, зняў так, што ён, бываючы там, не ведаў, што яны такія прыгожыя. Разам са здымачнай групай «Беларусьфільма» У. Караткевіч наведаў у пачатку верасня 1966 г. Рагачоў, Гарадзішча і Жылічы, дзе таксама здымаліся кадры для дакументальнага фільма «Памяць каменя» (рэжысёр Ю. Цвяткоў).

Пісьменнік згадваў ці апісваў у сваіх творах Чырвоную Гару, Гарадзішча, Доўгую Кручу, Прароў, Азярышча, Зверын, Кісцяні і многія іншыя мясціны на Рагачоўшчыне. Многія з іх, уведзеныя ў літаратурны ўжытак, жывуць ужо сваім, самастойным літаратурным жыццём, з'яўляючыся яскравым увасабленнем яго роднай беларускай зямлі. У. Караткевіч любіў гэту зямлю. Абураўся, што браканьеры нішчаць яе прыроду і шкадаваў, напрыклад, у лісце да Янкі Брыля ад 26.07.1964 г., што на Чырвонай Гары адкрылі каштоўныя мінеральныя воды, і калі пабудуюць там курорт, то туды «наплыве дзярма, запаскудзяць і раку, і лясы, і берагі. Знікне цішыня. І самой ракі, якая яна была,— не будзе давеку». Нібы чуйны барометр, ён прадчуваў трагедыю, якая можа адбыцца ў выніку бяздумных адносін чалавека да прыроды, нібы папярэджваў і аб Чарнобылі, які потым, ужо пасля яго смерці, працярушыў такую маляўнічую і прыгожую рагачоўскую зямлю радыеактыўным пылам.

Пра сваю неадлучнасць ад лёсу Прыдняпроўя хораша сказаў пісьменнік у пасляслоўі да рамана «Каласы пад сярпом тваім», які выйшаў на рускай мове ў Мінску ў 1977 г. Пісьменнік марыў закончыць свой твор, паказаць і разгром паўстання. Але яму было страшна гэта зрабіць, бо надзвычай цяжка было паказаць смерць

сваіх герояў, з якімі ён зрадніўся. Ён прасіў сваіх чытачоў патрываць крыху, даць яму сабраць сілы, пісаў наступнае: «Справа нават не ў тым, што дзеля памяці пра іх, дзеля памяці пра Каліноўскага і Траўгута, Баброўскага і Мацкявічуса, Грыневіча і Серакоўскага... дзеля памяці, пра Майку і Алеся будзе абвешчаны ў Лондане, у Сент Мартынс-холе І Інтэрнацыянал.

Справа ў тым, што да гэтага часу стаіць у Рагачове стары дубовы крыж на магіле Тамаша Грыневіча, што шмат якім людзям, і мне, і вам — спадзяюся — пасля прачытання яшчэ не напісаных частак «Каласоў» будзе невыносна балюча».

У. Караткевіч натхнёна і мужна апяваў свой родны край, сваю Белую Русь. Нібы прадчуваючы смерць, у апошнія месяцы жыцця ён наведаў дарагія яму мясціны — Кіеў, радзіму Янкі Купалы Вязынку, Палессе. У чэрвені 1984 г. на некалькі дзён з'ездаіў і ў Рагачоў, каб далучыцца да сваіх вытокаў, каб пабачыць родную зямлю...

А. Л. Верабей.

З глыбінь народнай творчасці

Фальклор Рагачоўшчыны

Рагачоўскі раён уваходзіць ва Усходні гісторыка-этнаграфічны рэгіён, але мяжуе з Цэнтральным. Гэта вызначае асаблівасці вусна-паэтычнай творчасці, якія праявіліся ў сістэме жанраў, мове і іншых кампанентах. Аналізуючы публікацыі фальклорных матэрыялаў, у прыватнасці запісы Е. Р. Раманава, зробленыя тут у мінулым стагоддзі, а таксама запісы фальклорных экспедыцый, адна з якіх у 1977 г. сабрала тут больш за 600 твораў[1], можна сцвярджаць, што на Рагачоўшчыне бытавалі і бытуюць творы ўсіх асноўных фальклорных жанраў: каляндарная і сямейна-абрадавая паэзія, пазаабрадавыя песні, прыпеўкі, замовы, прыказкі, прымаўкі, загадкі, казкі, легенды, паданні, былічкі і інш.

Самая старажытная па сваім паходжанні **каляндарна-абрадавая паэзія,** звязаная з вераваннямі продкаў, з культам сонца і раслінnасці, была накіравана на атрыманне ўраджаю, на захаванне гаспадаркі ад варожых чалавеку сіл. У ёй выразная сувязь з земляробствам, жывёлагадоўляй, бортніцтвам, у песнях апаэтызаваны прырода, чалавек працы.

Каляндарна-абрадавая паэзія зімовага цыкла канцэнтравалася пераважна вакол каляд і Новага года. Каляды ўяўлялі сабой найбольш багаты фальклорна-этнаграфічны комплекс, хоць зараз у нашым быце многае страчана. Даўней у гэты час адбываліся рытуальныя трапезы, разнастайныя магічныя дзеянні, гаданні, традыцыйныя абходы калядоўшчыкаў, гучалі песні. Напярэдадні хрышчэння, на так званую «крывую каляду», у час вячэры клікалі мароза: «Мароз, мароз, хадзі з намі куццю есці, а ўлетку не прыходзь, гуркоў не марозь». Куццёвай кашай часцавалі худобу і птушак (куццю сыпалі ў абруч, каб куры добра неслiся і ў чужы двор не хадзілі).

Маляўнічым відовішчам былі абходы калядоўшчыкаў, якія ў адных вёсках адбываліся на каляды, у іншых — на Новы год або нават і ўвесь тыдзень ад каляд да Новага года. Гурты калядоўшчыкаў былі розныя паводле складу ўдзельнікаў і рэквізіту, але абавязковая рыса гэтых абходаў — пажаданне гаспадарам дабрабыту, ураджаю, поспехаў у гаспадарчай дзейнасці і сямейным жыцці.

Найбольш старажытнай і моцна звязанай з земляробчай дзейнасцю продкаў з'яўляецца традыцыя калядных абходаў з «казой». У ролі «казы» звычайна выступаў жвавы хлопец, пераапрануты ў вывернуты кажух. Па загаду свайго гаспадара-павадыра ён скакаў, выкідваў розныя штукі, а потым «паміраў» і з дапамогай таго ж павадыра «ажываў». У в. Лучын з дрэва выраблялі галаву казы, прыраблялі да яе рогі. Песні, якія тут выконвалі ў час скокаў «казы», у розных варыянтах вядомы і ў іншых раёнах рэспублікі:

Го-го-го, каза,
Го-го, шэрая!
Выскач ты, каза,
Выскач, нябожа,
З цёмнага лесу
На чыста поле,
На лукамор'е.
Там цябе шукаюць,
Там цябе пытаюць
Стральцы-удалцы!
— Я не баюся
Стральцоў-удалцоў.
Толькі баюся
Руса русога,
Даеда Старога.
Із ельнічку,
Із бярэзнічку
Выскачыў заяц,
Стаў казу лаяць:
— Ах ты каэіца,
Старая псіца,
Уаяла б ты сярпок,
Пайшла б у лясок,
Травы нажала
Ды сваіх даяцей
Дома даяржала,
Патрошку травы
Ім бы кідала.

(Вёска Забалоцце.)

[1] Запісы гэтай экспедыцыі Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, у якой прымалі ўдзел К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч, Л. П. Барабанава, І. І. Крук, Л. М. Салавей, з'явіліся асноўнай крыніцай фактычных матэрыялаў, выкарыстаных у артыкуле.

У в. Азяраны напярэдадні Новага года рабілі «кабылу», з якой гурт калядоўшчыкаў хадзіў па вёсцы. Не менш распаўсюджаныя ў тым жа Лучыне і навакольных вёсках былі абходы са «звяздой» «на чатыры рагі» (часам рабілі і болей — да дванаццаці), абклеенай каляровай празрыстай паперай. Унутры «звязды» наклейвалі малюнкі на рэлігійныя сюжэты і запальвалі свечку. Пры абходах са «звяздой» гучалі і традыцыйныя калядкі, і так званыя «святыя песні».

У гурце калядоўшчыкаў былі «цыган», «доктар» і іншыя персанажы, якія суправаджалі галоўных герояў — «казу» і яе гаспадара. З цягам часу звычаі вадзіць «казу» і хадзіць са «звяздой» знікалі, а традыцыі пераапранацца захоўваліся. Так, у в. Старое Сяло на каляды яшчэ зусім нядаўна хадзілі пераапранутыя цыганамі. Яны бралі карты, люстэрка, балалайку, рабілі вялікую ляльку, стукаліся ў хату, гаварылі, што згубілі сусёлку або што трэба дзіця пакарміць і перапавіць, прапаноўвалі пагадаць на картах або на люстэрку, прасілі грошай ці гарэлкі, спявалі, скакалі. Гэты варыянт калядавання ператвараецца ў калядную гульню.

Калядныя песні даволі разнастайныя па тэматыцы. Цэнтральнае месца сярод іх займаюць творы, прысвечаныя гэтаму святу, або велічальныя песьні, адрасаваныя сям'і і асобна яе членам. У залежнасці ад адрасата змяняецца змест і вобразная сістэма твораў: у песнях, адрасаваных дзяўчыне, падкрэслівалася яе прыгажосць, сціпласць; хлопцу — смеласць, дужасць, прыгажосць, пажаданне знайсці сабе нявесту. Вось тры калядныя песні, якія часам называюць і шчодрыкі, запісаныя ў в. Курганне. Ва ўсіх песнях пасля кожнага радка паўтараецца прыпеў «Святы вечар».

А ў саду, ў саду свяча гарэла.
Святы вечар.
Свяча гарэла, іскарка ўпала,
Іскарка ўпала — возера стала.
Што ў тым возеры сам Бог купаўся
Сам Бог купаўся з Ісусам Хрыстом,
З Ісусам Хрыстом, святым ражаством.
Святое ражаство радасць прынясло.
Святое Васілля развесяліла.

* * *

Ой ясна, красна ў лузі каліна.
Святы вечар.
Ой, ясней, красней Ганнулька ў таткі.
Па двару хадзіла — ўвесь двор красіла.
На ганкі ўзыйшла — ганкі абласміла,
А ў сені ўвайшла — баяры дзівяцца,
Баяры дзівяцца, шапкі знімаюць,
Шапкі знімаюць, у яе пытаюць:
— Ці ты царэўна, ці каралеўна?
— Я й ні царэўна, ні каралеўна,
Сцяпанава дачка як ягодачка.

* * *

А ў саду, у саду зялёны вінаград.
Святы вечар.
Хто тэй вінаград сцярэгчы будзе?
Будзе сцярэгчы малады Мікола.
Сцярог ночачку, сцярог другую.
А й на трэцяю крэпенька заснуў.
Прыйшла яго маці, стала пабуджаці.
— А ўстань, Міколка, а ўстань, сынок.
Увесь твой вінаград птушкі папілі,
Птушкі папілі, гнезды павілі.
— Я тых птушачак паразганяю.
Птушанятачак параскідаю,
Сваю дзевачку ў табуне ўгадаю.

На жаль, на Рагачоўшчыне слаба адлюстравана буйное народнае свята, што прыпадае на канец зімы — пачатак вясны — масленіца. Паводле сведчання старажылаў, традыцыі масленіцы тут існавалі здаўна. Масленіцу гулялі, як і каляды, спявалі ўсякія песні.

Даволі шырока ў фальклоры Рагачоўшчыны прадстаўлена каляндарна-абрадавая паэзія веснавога цыкла: заклічкі, вясняпкі, карагоды, крыху меней — валачобныя песні. Веснавы цыкл тут пачынаюць на Саракі, у асобных вёсках — на Благавешчанне. Ён уключае таксама святы Юр'я, Вялікдзень (Пасху), Сёмуху (Тройцу). Напрыклад, Саракі маюць тут акрэсленую фальклорна-этнаграфічную структуру, якая ўключае пэўныя дзеянні і песні. Святы Юр'я і Сёмуха свайго спецыфічнага песеннага рэпертуару не маюць, хаця пэўныя рытуальныя дзеянні захаваліся. Так, да Юр'я пастухоў не наймалі, пасвілі худобу дзеці або падлеткі, якія ў гэты дзень (6 мая) абавязкова пяклі сабе яешню. Першы выган скаціны пастухом адбываўся адразу пасля Юр'я. Гаспадар выганяў карову свянцонай вярбой, пад вароты клаў замок, каб у драпежнага звера зубы былі замкнёныя, і яечка, каб карова была гладкая. Траецкія і русальныя песні тут не захаваліся, хаця ўяўленні аб русалках і розныя апавяданні пра іх бытуюць. Існуе павер'е, што русалкі калышуцца на бярозах, а калі ўбачаць чалавека, асабліва малых дзяцей, даганяюць і казычуць. Каб выратавацца ад іх, трэба ўцякаць не ўздоўж паласы, дарогі, а ўпоперак. Тут бытуе павер'е пра канаплянак, якія нечым нагадваюць русалак, таксама небяспечныя, толькі жывуць у каноплях.

Вясну сустракалі звычайна на Саракі (22 сакавіка). Лічылася, што да гэтага дня павінна прыляцець сорак выраяў розных

птушак: шпакоў, гусей, качак і г. д. У гэты дзень выпякалі з цеста птушак («жаваранкаў»), збіралася моладзь, на моцныя сукі вялікіх дрэў чаплялі арэлі і калыхаліся, жартавалі, спявалі, гукалі вясну:

Вясна мая, вясеначка,
Дзе твая дачка Аленачка?
Пагнала кароў у ліпачкі,
А за ёй хлопцы ў скрыпачкі.
(Вёска Асмолавічы.)

Варыянт з вёскі Курганне:

Ой, вясна, вясна, вясёначка,
Дзе твая дачка Аксёначка?
Сядзіць у садочку, шые сарочку,
Шые сарочку свайму сыночку,
Свайму сыночку Васілёчку.

Паступова гурт павялічваўся, у свята ўключаліся і дзеці і дарослыя. Спявалі і заклічкі, і вясну, і так званыя галосныя песні. Заклічкі звычайна спявалі на ўзгорках, высокіх берагах рэчак:

Вясна-красна,
Выгляні ў ваконца,
Дам табе мёду
Цалую калоду,
На скібачку масла
Штобы было ясна. (Вёска Старое Сяло.)

Тэматыка галосных песень звязана з каханнем, будучым шлюбам, сямейнымі адносінамі:

Як стаяла белая бяроза над вадою,
Пацускала яна сваё голля над гарою.
Маладая малодачка ваду брала,
А з белаю бярозачкай размаўляла.
Белая бярозачка ў яе пытала:
Ці далёка ты свайго мілага, дзеўка,
праважала?
Праважала я свайго мілага за лясамі,
Забылася наказаці за слязамі,
Штоб не піў жа гарэлачкі-палыноўкі,
Штоб не любіў чужой жоначкі-чарнаброўкі,
Гарэлачка-палыноўка, ой, добра не водзе,
Чужа жонка-чарнаброўка цібе з ума зводзе.
(Вёска Курганне.)

* * *

Пасціла дзеўка ды кароў па дуброве.
Яна пасучы ды кароў пагубляла,
Пагубіўшы ды сама прыблудзіла,
Прыблудзіла ды к высокаму дубу.
Што на тым дубе там сядзіць чоран воран.
— Ох, ты, чоран воран, да ты высока сядзіш,
Ты высока сядзіш, да ты далёка бачыш.
Ці не бачыў ты ды кароў ці валоў?
— Я й не бачыў ды ні кароў, ні валоў,
Толькі бачыў тваю мамачку ў доме.
Па двару ходзя й белыя рукі ломе,
Белыя рукі ломе, шчэ й прысказвае:
— Хай не будзе ды ні кароў, ні валоў,
Каб толькі прыйшло ды дзіцятачка дамоў.
(Вёска Асмолавічы.)

Адметнай рысай веснавой паэзіі на Рагачоўшчыне можна лічыць шырокае распаўсюджанне карагодаў і карагодных песень. Найбольш вядомы карагод «Лука», які пачыналі вадзіць з Благавешчання. Калі падсыхала і крыху прагравалася заямля, саджалі на рызаё асобна адзін ад аднаго дзяцей (пяць або сем) і вадзілі паміж імі карагод, які суправаджаўся адпаведнамі песнямі. Удзельнічалі ў ім дзяўчаты і жанчыны. Дзеці і падлеткі вадзілі карагод «Проса». Узяўшыся за рукі і стаўшы ў дзве шарэнгі, адна насупраць адной, ішлі па чарзе насустрач адзін аднаму, спяваючы добра вядомую карагодную песню «А мы проса сеялі».

Вадзілі тут і кругавыя карагоды, у якіх удзельнічалі і дзяўчаты і хлопцы. Яны ўтваралі круг, пасярод якога знаходзіліся хлопец і дзяўчына, якія павінны былі сваімі рухамі і дзеяннямі ілюстраваць тое, пра што спявалі ўдзельнікі карагода, у прыватнасці ў шырока вядомай песні «У карагодзе мы былі».

Ідэя спаборніцтва, якая прысутнічае ў многіх карагодах і карагодных песнях, увасоблена ў карагодзе «Лука»:

Лука мая,
Лука мая зялёная,
Трава мая шаўковая.
Шаўковая.
Трава мая шаўковая,
Хто ж цябе таптаць будзе?
Таптаць будзе,
Хто ж цябе таптаць будзе?
Стапталі, сталачылі,
Сталачылі.
Стапталі, сталачылі,
Ды курэеўскія дзеўкі.
Дзеўкі
Ды курэеўскія дзеўкі
Шаўровымі чаравічкамі,
Чаравічкамі,
Шаўровымі чаравічкамі,
Куплёнымі панчошкамі,
Панчошкамі,
Куплёнымі панчошкамі.
Лука мая зялёная.
Зялёная.
Лука мая зялёная,
Трава мая шаўковая.
Шаўковая.
Трава мая шаўковая,
Хто ж цябе таптаць будзе?
Стапталі, сталачылі,
Сталачылі.
Стапталі, сталачылі
Ды сялянскія дзеўкі
Дзеўкі
Ды сялянскія дзеўкі
Шырокімі лапцішчамі.
Лапцішчамі
Ды шырокімі лапцішчамі
Пяньковымі аборкамі.
Аборкамі
Пяньковымі аборкамі
Каравымі анучкамі. (Вёска Азяраны.)

На Вялікдзень у некаторых вёсках раёна хадзілі валачобнікі, якія спявалі велічальныя песні гаспадару, гаспадыні, дзецям, напаміналі пра пачастунак. Валачобныя песні складалі неад'емную частку рытуальных абходаў, выкананне якіх, на думку нашых продкаў, павінна было спрыяць поспеху ў гаспадарцы і сямейных справах. Значная колькасць запісаў гэтых песень, зробленых параўнаўча нядаўна, дазваляе меркаваць, што традыцыя валачобніцтва тут была даволі трывалая. Велікодныя песні выконваліся не толькі на Пасху, а і на супрадках разам з пастовымі песнямі з прыпевамі пасля кожнага радка «А зялён явар кудравы», а пачынаючы з Вялікадня і да Ушэсця прыпеў быў іншы: «Хрыстос васкрос, сын Божы». Імёны святых у валачобных песнях не засланяюць гаспадарчыя клопаты, якіх шмат напярэдадні сяўбы.

Давайце, братцы, сабярымося,
А зялёны явар кудравы.
Сабярыма мы хоць па гарчычку.
Хоць па гарчыку жыта, пшаніцы,
Жыта, пшаніцы, розныя пашніцы.
Наварым мы піва, піва п'янога,
Сабяром мы гасцей да трох празнічкаў.
Первы празнік — да Вялік жа дзень,
Другі празнік — да святы Юрай,
Трэці празнік — да святы Мікола.
А Вялік жа дзень то з красным яечкам,
А святы Юрай з ранняй расою,
А святы Мікола па межах ходзя,
Па межах ходзя, яр-жыта родзя,
Як Мікола нагой, так і жыта капой.
(Вёска Станькава.)

Добрымі гаспадарамі, стараннымі працаўнікамі выступаюць у валачобных песнях і іншыя святыя. Ілья, напрыклад, так запрацаваўся, што спазніўся да Бога, які «святачкі ліча, празнічкі кліча»:

— Святы Ілля, дзе ж ты забарыўся,
Хрыстос васкрос, сын Божы (прыпеў пасля кожнага радка).
Што ты к Богу позна явіўся?
— А я жыта раджаў, жыта ядраное,
А я сена касіў, сена зеляное.
А я зерне з кораня верне,
У полі капякамі, ў клеці засякамі,
У клеці засякамі, у печы пірагамі.
(Вёска Старое Сяло.)

Аснову летняга цыкла каляндарнай абрадавай паэзіі складаюць купальскія і жніўныя песні. Свята Купала аб'яднала ў сабе старажытныя культы сонца, агню, раслінnасці. З гэтым днём звязаны шматлікія павер'і, частка з якіх бытуе і сёння або ў сваім першародным выглядзе, або як паэтычная трансфармацыя мінулага. Паэтычнай легендай стала старажытнае ўяўленне пра чарадзейную сілу кветкі папараці. Нашы продкі верылі, што на Купалу прыпадае не толькі росквіт раслінnага свету, але і актывізацыя розных варожых чалавеку звышнатуральных сіл — ведзьмаў, чараўнікоў, ад якіх трэба было бараніцца агнём, вадой і іншымі сродкамі. Усе гэтыя ўяўленні знайшлі адлюстраванне ў абрадавых дзеяннях і песнях. Важную ролю ў абрадзе адыгрываў агонь. 6 ліпеня (па новым стылі) распальвалі вогнішча, вакол якога скакалі, вадзілі карагоды, спявалі купальскія песні. У некаторых вёсках побач з гэтым вогнішчам ці замест яго запальвалі абкладзенае саломай старое кола, узнятае на высокі шост. Цікавае апісанне ку-

Этнаграфічнае свята ў Рагачове.

пальскага свята ў в. Азяраны зрабіў Е. Р. Раманаў у «Беларускім зборніку» (вып. 8, 1912): хлопцы і дзяўчаты збіраліся на вызначанае месца на захадзе сонца, прыносілі старыя ночвы, паламаныя колы і запальвалі агонь. Пасеўшы вакол яго, спявалі песні «Пайшлі дзеўкі ў лес па ягады», «Дзе ты сягонні ноч начавала», «А чый жа то лён да не поланы» і інш. з прыпевам «Купала на Івана», а потым хадзілі вакол агню ці па дарозе і спявалі розныя песні ўжо без гэтага прыпеву. Пасля спеваў нехта з дзяўчат прыносіў саху, усе ўпрагаліся ў яе і ўжо без перамесца, а дзяўчаты ішлі дамоў па вянкі, зробленыя з палявых красак. Сабраўшыся зноў ля вогнішча, дзяўчаты дзяліліся на дзве групы, станавіліся абапал агню і перакідвалі вянкі адна адной, а хлопцы імкнуліся перахапіць вянкі і парваць іх. Калі ўжо вянкоў не заставалася, перескоквалі цераз агонь, тушылі яго, закопвалі галавешкі і вярталіся дамоў.

У гэтых дзеяннях можна заўважыць рэшткі ахоўнай магіі, калі людзі імкнуліся шляхам абворвання ці іншымі сродкамі не дапусціць злыя сілы ў вёску, адгарадзіцца ад іх.

Купальскія песні былі разнастайнымі па тэматыцы, вобразнай сістэме, унутраным настроі. У іх створаны вобраз Купалы, Купалкі, перадаецца атмасфера весялосці, якая панавала на свяце. Акрамя названых і апублікаваных Е. Раманавым, прыводзім тэксты, запісаныя ў 1977 г.:

Дзе Купала начавала,
Купала пад Івана.
Пад бярозкаю з Хадоскаю,
Купала начавала.
Дзе Купала начавала,
Купала пад Івана.
Пад асінкаю з Аксінкаю,
Купала начавала.
Дзе Купала начавала,
Купала пад Івана.
Пад алешкаю з галавешкаю,
Купала пад Івана. (Вёска Курганне.)

Купала на Івана,
Дзе ж ты, Купала, начавала.
Начавала ночку ў барочку.
Дзе ж ты, Купала, вячэрала.
Вячэрала рыбку з перцам,
Рыбку с перцам, кашку з алейцам.
(Вёска Старое Сяло.)

* * *

Сёння Купала, заўтра Ян,
Будзе, хлопчыкі, ліха вам.
— А дзевачкі, якое, якое?
— Ганіце сабак у поле, у поле.
Адзін Янка астаўся, астаўся,
З рудою сучкай звянчаўся, звянчаўся.
(Вёска Канапліца.)

Добра захаваліся на Рагачоўшчыне жніўныя песні. Жніво пачыналася з зажынак, якія абставяліся з вялікай урачыстасцю. Зажынала звычайна старэйшая ў сям'і жанчына. Як пісаў Е. Р. Раманаў, яна ішла на ніву надвячоркам, узяўшы акраец хлеба, грамнічную свечку, асвячоную соль, чытала малітву, кланялася ніве і зжынала першы сноп, які пакідала ў полі старчаком. На наступны дзень у поле ішла ўся сям'я, а першы сноп пасля ставілі пад абразы.

Свой рытуал мелі і дажынкі. Завяршаючы жніво, на апошняй паласе пакідалі некалькі каласоў — «бародку», перавязвалі іх стужкай або саломінкай, старанна выполвалі навокал і пад гэту «бараду» клалі на чыстым ручніку хлеб і соль. Такім спосабам ушаноўвалі «духа нівы», прыносілі яму ахвяру. Пасля малітвы і зямных паклонаў жніцы, тройчы перакаціўшыся па ніве, казалі: «Ніўка, ніўка, аддай маю сілку».

Жніўныя песні спявалі і як жалі на полі, і дамоў ідучы, і дома. Іх тэматыка багатая, яны адлюстравалі і адносіны чалавека да прыроды, да зямлі, да працы, і скаргі на прыгон, і разнастайныя калізіі сямейнага жыцця. Напрыклад, у в. Старое Сяло на пачатку жніва спявалі наступную песню, кожны радок якой, акрамя першага, паўтараўся:

Дабро, жыцечка, дабро,
У адну сторанку алягло.
Да й у полі коласам,
Да й на гумне капякамі,
Да й у клеці засякамі,
Да й у печы пірагамі.

Больш раннія запісы з гэтага раёна належаць Раманаву:

Жнейкі маладыя,
Сярпы залатыя,
Жніце, жнейкі, жніце,
Вам гарэлачка ў жыце.
К бераэжку прыжнемся,
Гарэлачкі нап'емся.

* * *

— Дабранач, поле шырокае, жыта ядронае!
— На здароўе, жнейкі маладыя, сярпы залатыя!
Прыхадзіце ка мне заўтра рана.
Як соўнійка ўзойдзе, расіца спадзе.
Прынасіце па беламу сыру, па маленькім сыну:
Сырок на снядание, сынок на аддыханне.
(Вёска Балотня.)

Запісы фальклорных экспедыцый апошняга часу сведчаць пра ўстойлівасць песеннага рэпертуару, захаванасць традыцый.

Этнаграфічны куток у музеі школы № 6 горада Рагачова.

Пара, бабы, дамоў ісці,
На постаці раса пала,
Пала раса халодная,
А другая — эй салодкая.
Халодную таптаць буду,
Салодкую абіраць буду,
Халодную — пад ножачку,
Салодкую — у ложачку.
Халодную — то свёкарку,
Салодкую — то татачку. (Вёска Старое Сяло.)

* * *

А жнеечка дамоў ідзе,
А пад поясам сярпок нясе,
А на ручках эй даіцятачка.
А сустрэў яе родны татачка:
— А чыё, Дунька, даіцятачка?
Суседскае, мой татачка.
— А чаго, Дунька, лічка тваё?
Пры мне яно раджалася,
Лічыка маё ўдавалась. (Вёска Грабава.)

Да восеньскіх песень мясцовая традыцыя адносіць творы, прымеркаваныя да розных восеньскіх работ — уборкі льну, канапель, бульбы і інш., або якія адлюстроўваюць працоўную дзейнасць і стан прыроды ў гэты перыяд, а таксама некаторыя песні шлюбнай і сямейнай тэматыкі. Межы гэтага цыкла ў значнай ступені размытыя і дакладна неакрэсленыя. Некаторыя восеньскія песні, што бытуюць на Рагачоўшчыне, вядомы і па ўсёй Беларусі («На гары лён»), іншыя вядомы пераважна ў паўднёва-ўсходняй частцы рэспублікі. У час фальклорнай экспедыцыі 1977 г. фалькларыстамі запісаны наступныя песні:

Парадзіла мяне мамачка
Не ў шчаслівы дзень, у пятніцу, (2)
У вішнёвым саду пад яблынкаю (2)
Закрывала мяне мамачка
Ад ветрыку да й ад дожджычку,
Не закрыла мяне мамачка
Ад ліхога замужайка, (2)
Што не верная падружанька. (Вёска Грабава.)

* * *

Бярозка белая бялява,
Чаго стаіш,
Смутная да ты невясёла,
Смутна, невясёла?
— Прайшло лета,
Вясёла стаяла, (2)
Прыйшла восень,
Стаў ліста спадаці, (2)
Бяруць, бяруць
Малойца ў салдаты. (2)
Па ём плача
Яго родная маці, (2)
За матушкаю —
Сястрыца родная, (2)
За сястрою —
Жана маладая, (2)
За жаною —
Яго дробныя дзеткі. (Вёска Лучын.)

Добра захавалася на Рагачоўшчыне і **сямейна-абрадавая паэзія,** якая ўваходзіла як неад'емная арганічная частка ў радзінны, вясельны і пахавальны абрады. Радзінны і вясельны фальклорна-этнаграфічныя комплексы — песні, абрады, магічныя дзеянні, перасцярогі, забароны і інш.— павінны былі, на думку нашых продкаў, забяспечыць добрае здароўе і шчаслівы лёс нованароджанаму, трывалы шлюб і сямейнае шчасце маладой сям'і. Песні даюць уяўленне пра народныя ідэалы сямейнага шчасця, чалавечай прыгажосці. Падрабязнае апісанне радзіннага абраду, які існаваў у канцы мінулага стагоддзя ў в. Забалоцце Рагачоўскага павета, даў Е. Р. Раманаў. Ён адзначаў звычай хадзіць у «вотвядкі», які папярэднічаў хрэсьбінам. У «вотвядкі» хадзілі звычайна замужнія жанчыны, якія прыносілі з сабой што-небудзь варанае і хлеб. Хрэсьбінам папярэднічалі таксама выбар і запрашэнне кума і кумы, звычайна са сваёй радні.

У дзень хрэсьбін кум і кума прыходзяць да парадзіхі, прыносяць пірагі з жытняй мукі і соль. Іх садзяць за стол, частуюць, а бабка ў гэты час купае дзіця, захутвае яго ў мужчынскую рубаху, у рукавы якой завязваюць хлеб, соль і жыта, і перадае нованароджанага куме. Кум з кумой тройчы абходзяць вакол стала, люляюцца і ідуць да папа. «Як прыедуць дамоў да ўвойдуць у хату,— пісаў Раманаў,— дак кума гаворыць: «Як відзелі пад храстом, так дай Бог відаць пад вянцом». Тым часам у хаце збіраюцца госці, нясуць падарункі — хто хлеб, хто сала, хто зерне ці крупы, хто грошы — і аддаюць гэта старой ці дзецям, а не самой парадзісе.

Застолле пачынае гаспадар, які выпівае чарку за здароўе кума, кумы і гасцей,

частуе іх. Важнае месца ў рытуале займае «бабіна каша», якой завяршаецца застолле. Баба ставіць гаршчок пасярод стала, звяртаецца да прысутных: «Ну, госьці дарагія, прасілі вас на хлеб, на соль, вот прашу і на бабіну кашу, прашу пакласць па чырвонцу», закрывае кашу талеркай, куды і кідаюць дробныя грошы, якія потым перадаюць парадзісе. Пасля кум бярэ гаршчок і ціхенька стукае яго аб стол, гаворыць, што баба выбрала ў ганчара вельмі крэпкі гаршчок, які нельга разбіць. З жартамі і прыгаворамі кум тройчы спрабуе разбіць гаршчок з кашай, на трэці раз разбівае яго, кашу раздаюць дзецям і дарослым.

Калі запрошаныя пойдуць з хаты, бабку, кума, куму і блізкую радню зноў запрашаюць за стол, частуюць, бабцы даюць паркалю, а куму і куме — па намітцы. Потым бабку саджаюць на барану або на перадок ад калёс і вязуць у карчму, дзе яна адкупляецца гарэлкай. На другі дзень бываюць «пахрысціны», на якія запрашаюць толькі бабку, кумоў і радню, а на трэці дзень зноў клічуць бабку «мур змываць» — купаць нованароджанага пасля хрышчэння.

Натуральна, што ў час гэтых застолляў гучалі песні ў гонар нованароджанага, бацькоў, бабкі-павітухі, кумоў, розныя жарты, прыгаворы, асабліва калі дзялілі бабіну кашу. Аб'ектам жартаў у многіх радзінных песнях былі кум і кума, іх узаемаадносіны.

Як учора ды бабусюхна
Ды на ксцінках была,
А сягодні ды бабусюхна
На пахмелле прыйшла.
Упілася бабусюхна
Зелянога віна,
А не зайдзець бабусюхна
Да свайго да двара.
— Запражы ты, Іванічка,
Варанога каня.
А завязі бабусюхну
Да свайго да двара.
Палажы ты бабусюхну
На ўзгалоўе яе:
— А спі, мая бабусюхна,
На здароўе табе.

* * *

Ішоў кум гарою,
А кума даліною.
Зацвеў кум яворам,
А кума каліною,
А хрэснічак доляю,
Доляю шчасліваю,
Каму нам, каму нам
Падарачкі даць?
З каго нам, з каго нам
Магарыч нада ўзяць?
А як к куму кума
У рэшаце прыплыла
Грабянцом праграбла.
А ў мяне для кумы
Верабей у саду
Да й тэй без зяду.
Як завешу я кацёл —
Паўтараста вядзёр
І згатую для кумы
Адну шыячку.
— Еш ты, кума,
Не засалівайся,
Еш, ужывай,
А ў кішэню ні хавай.
А тым ты, кума,
Не супоўніш двара,
Не накорміш дзяцей,
Толькі насмяшыш людзей.

Яшчэ больш багатая і разнастайная вясельная паэзія, якая і сёння даволі актыўна бытуе, хоць традыцыйны вясельны абрад у адзінстве і паслядоўнасці ўсіх яго кампанентаў амаль не захаваўся. Паводле апісанняў Е. Р. Раманава, зробленых на мяжы мінулага і нашага стагоддзяў у в. Азяраны, што ў паўночна-заходнім кутку раёна, і ў в. Гарадзец, што ў процілеглай яго частцы, вясельны традыцыйны абрад уключаў такія структурныя адзінкі: сватанне, заручыны, дзявочнік, прыгатаванне каравая, вянчанне, куды малады і маладая едуць асобна кожны са сваёй дружынай, вяртанне з царквы жаніха і нявесты ў дом маладога, вяртанне маладой да сваіх бацькоў. На наступны дзень жаніх з баярамі ехаў да нявесты, дзе яго сустракала цешча ў вывернутым кажусе, якая частавала яго гарэлкай, падпяразвала, пасля чаго жаніх з дружынай ішлі ў хату, выкуплялі ў дружыны маладой месца за сталом і частаваліся. У нявесты дзялілі каравай, а потым ехалі дзяліць каравай да жаніха, дзе свякруха таксама сустракала нявестку ў вывернутым кажусе. Падзяліўшы каравай, маладых клалі спаць, а раніцай паведамлялі яе бацькам, ці была яна цнатлівая, і везлі ад іх кубел нявесты.

Гэтыя структурныя адзінкі, звёны і эпізоды маглі вар'іравацца ў залежнасці ад мясцовых традыцый. Напрыклад, у адных вёсках каравай пяклі толькі ў маладой, у іншых — і ў маладой, і ў маладога; цешча перад тым, як даць зяцю гарэлкі, двойчы або тройчы налівала ў чарку ваду — у адных выпадках малады проста выліваў яе, у другіх павінен быў першую чарку выліць цераз галаву, другую — на правы бок, трэцюю — на левы; у некаторых вёсках лічылася абавязковым тройчы падпаліць злёгку свечкай валасы маладой, пераехаць маладым цераз агонь, абсыпаць маладых збожжам і інш.

Арганічнай часткай вясельнай абрад-

насці з'яўляюцца песні, прыпеўкі, пагаворкі, якія суправаджалі кожны этап вяселля, вызначалі паслядоўнасць розных дзеянняў, раскрывалі іх значэнне і сэнс, дапамагалі стварацъ атмасферу ўрачыстасці і весялосці. На заручынах або запоінах спявалі:

На запоіны,
Пойдзем мы на запоіны,
Там даверы закроены,
Закроены.
Пакуль дзверы атварылі,
Дзевачку заручылі. (Вёска Грабава.)

Каравайныя песні таксама адпавядалі этапам яго прыгатавання. Пачынаючы сваю справу, старшая каравайніца спявала:

Стаўця дзяжу цясовую,
Нясіце ваду крынічную,
Сыпця муку пшанічную. (Вёска Гарадзец.)

Пасадзіўшы цеста ў печ, каравайніцы спявалі:

Расці, расці, каравай,
Вышы печы медзяной,
Вышы столі залатой
Вышы Таццяны маладой. (Вёска Гарадзец.)

Калі вымаюць каравай з печы, таксама пяюць:

А йдзе ж тыя кавалі, кавалі,
А што ету печку кавалі, кавалі?
Няхай ідуць, раскуюць, раскуюць.
Каравай з печкі не лезіць,
А зяць к цешчы не едзіць. (Вёска Гарадзец.)

Як збіраюцца ад маладога на маладую:

Што ў нашага Іванькі кавалі на дварэ,
А яны куюць залатыя нажы.
Не куй, Іванька, залатога нажа,
Падкуй, Іванька, варанога каня.
Залатому нажу на стале ляжаць,
Вараному каню ў дарогу ступаць.
А едам-едам борам, барамі
Борам, барамі, жоўтымі пяскамі
Ай бор зашуміць — падкоўка звініць,
Пясочак шаркне — падкоўка лясне.
Людзі пачуюць — дзівіцца будуць:
Ці не пан то едзя, ці не паню вязе.
Іванька едзя, Марусю вязе. (Вёска Асмолавічы.)

Калі жаніх прыязджае за нявестай:

Стукнула-грукнула на дварэ
— Паглядзі, мамачка, ці не па мяне?
— Па цябе, дачушка, па цябе.
— Гатуй, мамачка, кублік мне.
— Едзь, мая дачушка, без кубла,
Да чаму кудзельку не скубла?
— Я скубла-прала, шамацела,
Гэтага хлопчыка не хацела. (Вёска Старое Сяло.)
Пад'язджаем мы пад дамы,
Пад высокія церамы.
Разаб'ём сцяну каменну,
Возьмем дзевачку маладу.
Ды нашто нам сцяну псаваці,
Ды пайдзём дзвярэй шукаці. (Вёска Курганне.)

Калі нявесту вязуць да маладога:

Гадавала дзіцятка, гадавала,
За адну ночачку ўцірала. (2)
Вышла за вароты — толькі след (2)
Чабатамі вулачка змесена, (2)
Куды маё дзіцятка звезена. (Вёска Грабава.)

Калі прывязуць маладую да маладога:

Выйдзі, мамачка, паглядзі,
Што ж табе баяры прывязлі.
Прывезлі скрыню, пярыну,
Шчэ й маладую княгіню.
Малада княгіня хадзіць будзе,
Тваё падвор'е красіць будзе. (Вёска Рыскоў.)

За вясельным сталом маладой спявалі:

Сядзела Верачка за сталом,
Паклала ручкі на стале.
— Белыя мае ручачкі ў мамачкі,
А ці будуць белыя ў свякрушкі,
Мокрую пшаніцу таўкучы,
З-пад гор вадзіцу носячы.
Як зачуў яе Сяргейка:
— Ой, не журыся, Верачка.
Я ж табе алею пералею,
Мокрую пшаніцу падсушу,
З-пад гор вадзіцы прынясу. (Вёска Грабава.)

Ніпраўдзівая Танячка казала:
Замуж не пайду,
Маладога Іванькі не злюблю
У яго слядочак не ступлю.
Як прыйшлі сваты, так пайшла,
Маладога Іваньку злюбіла.
У яго слядочак ступіла. (Вёска Асмолавічы.)

Як за сталом сядзяць, спяваюць маладому:

Ай, не сядзі, Іванька, не сядзі,
Падніміе шапачку, паглядзі
Ці не спадмана якая,
Ці не бабачка старая.
Ды калі бабачка — адпіхні,
Калі Ганначка, абнімі. (Вёска Новы Крыўск.)

А мы думалі, што сваты едуць,
Што сваты едуць,
Ажно яны пяшком ідуць,
Жаніха ў мяшку нясуць,
А ногі яго тарчалі,
А на іх сабакі брахалі. (Вёска Асмолавічы.)

Нявесце-сіраце спяваюць:

Станавіся, радзіна, уся ў рад,
Ідзе Тамарка на пасад.
Усю й радзіначку абыйшла

Мамачкі свае не нашла,
Галоўка мая ў вянку,
Няма мамачкі ў радку.
Галоўка ж мая і ў цвеце,
Німа мамачкі на свеце. (Вёска Курганне.)

Пазаабрадавая песенная творчасць прадстаўлена ў Рагачоўскім раёне любоўнай і сямейнай лірыкай, сацыяльна-бытавымі творамі, у тым ліку рэкруцкімі і салдацкімі, песнямі рабочай тэматыкі, баладамі, калыханкамі, жартоўнымі песнямі, творамі іншых жанравых і тэматычных груп. Ёсць у мясцовым рэпертуары песні, звязаныя з рускай і ўкраінскай фальклорнай і літаратурнай традыцыямі.

Усе гэтыя творы з розных бакоў асвятляюць жыццё селяніна, яго мары і спадзяванні, маральныя прынцыпы і ацэнкі, уяўленні аб унутранай і знешняй прыгажосці чалавека. Не спыняючыся на ўсіх жанравых і тэматычных групах, адзначым толькі некаторыя з іх. Гэта калыханкі, якія па-ранейшаму захоўваюць свае выхаваўчыя, пазнавальныя і эстэтычныя функцыі. Калыханкі прасякнуты пяшчотай, дабрынёй, шчырасцю. Заклыхваючы дзіця, маці ці бабуля далучаюць яго і да меладычнасці роднай мовы.

Балады — ліра-эпічныя песні з драматычна напружаным сюжэтам — бытуюць на Рагачоўшчыне як пазаабрадавыя творы, хаця ў некаторых вёсках мясцовая традыцыя звязвае асобныя сюжэты з пэўнымі каляндарнымі святамі, у прыватнасці з купальскім або з восеньскім цыкламі. У аснове канфлікту многіх балад — варожыя адносіны свякрухі да нявесткі. У гэтых творах важнае месца займаюць матывы ператварэння людзей у расліны, птушак. Трагічная развязка многіх балад падкрэслівае высакароднасць народных ідэалаў справядлівасці, дабрыні, чалавечнасці, вернасці ў каханні, асуджэнне здрады.

Сацыяльна-бытавыя песні праз лёс чалавека адлюстроўваюць розныя калізіі, якія ўзнікаюць у грамадскім жыцці. Гэта і набор рэкрутаў, у час якога востра выяўлялася сацыяльная несправядлівасць, і цяжкая салдацкая служба, і адыходніцтва, якое карэнным чынам змяняла лёс і псіхалогію селяніна, і іншыя сітуацыі, што ўзнікалі на глебе сацыяльных канфліктаў.

Спецыфічную ролю ў сістэме песенных жанраў выконваюць жартоўныя гумарыстычныя песні. У народзе заўсёды знаходзілася дастаткова духоўных сіл, каб пажартаваць над уласнымі недахопамі і тым самым стварыць сітуацыю для псіхалагічнай разрадкі, для ўсталявання пэўнай псіхалагічнай раўнавагі.

Вось некалькі ўзораў пазаабрадавай песеннай творчасці Рагачоўскага раёна.

СЯМЕЙНА-БЫТАВАЯ

Ой, пайду, я ў лугі, лугі,
Наламаю смародзіны,
Пакідаю на дарогу.
А ішоў тудой мой татанька.
— Шкода, шкода смародынькі,
Што зелена паламана,
На дарогу пакідана.
— А татачка мой родненькі
Не жалей ты смародынькі,
Пажалей ты сваё даіця,
Што молада замуж аддаў.
Я й замужам нажылася:

Фальклорны калектыў Мадорскага Дома культуры.

Стала тонка, як былінка,
Стала бела, як ліпінка,
Стала чорна, як смародынька... (Вёска Вярычаў.)

* * *

РЭКРУЦКАЯ

Што з-пад лесу, лесу цёмнага,
Ой з-пад гаю, з-пад зялёнага
Вылятала пціца морская,
Прынасіла пісьмо царскае;
Усім тром братцам у салдаты ісці,
А большаму не прыходзіцца,
У сярэдняга дзеці дробныя,
А меншы брат сабіраецца.
С атцом, маменькай прашчаецца.
— Прашчай, ацец, прашчай, маманька,
Прашчай уся мая радзіначка.
Табе, мамка, садзі сад-вінаград,
Табе, братка, усё падвор'яйка. (Вёска Старое Сяло.)

(Кожны радок песні, акрамя першага і апошняга, паўтараецца.)

* * *

БАЛАДА

Аддала маці
Сына ў салдаты.
Да й ждала гадок,
Да й ждала другой.
На трэці гадочак
Наехаў сыночак,
Прыехаў сыночак
І з нявехнаю.
Да й вышла маці
Дзяцей вітаці,
Да не ўзлюбіла
Сваёй нявехначкі.
Да й сыну дала
Краснага віна.
А нявехначцы —
Чорнай атруты.
Сын віна не піў
На каня ўзліў,
Горкаю атруту
Папалам выпіў.
— Не ўмела маці
Дзяцей вітаці,
Да й умей, маці,
Нас пахаваці.

Сына пахавала
Перад цэркаўкай,
А нявехначку,
Да й за цэркаўкай.
На сыну вырас
Зялёны явар,
На нявехначцы —
Белая бяроза.
Ой, раслі, раслі
Пахіліліся,
Цераз цэркаўку
Сашчапіліся.
Ай прышла маці
Да й у цэркаўку
Да й у цэркаўцы
Богу маліцца.
Не так моліцца,
Як слязьмі плача.
Верна, дзетачкі
Вы любіліся.
Цераз цэркаўку
Сашчапіліся.
(Вёска Старое Сяло.)

* * *

ЖАРТОЎНАЯ

Камарык у сваты сабіраўся,
Да й на дуба і схаваўся.
Адкуль узялася хвіля-бура,
Камарыка з дуба здула.
Ляжыць камар ды не дыша,
Ручкамі ножкамі не калыша.
Адкуль узяліс даве мухі,
Бралі камара пад рукі.
— А што гэта за палкоўнік?
— Старае мухі палюбоўнік.
(Вёска Старое Сяло.)

* * *

КАЛЫХАНКІ

Люлі, люлі, люлі;
Паляцелі гулі,
Селі на варотах
У чырвоных ботах,
Сталі сакатаці,
Каму боты даці?
Малому дзіцяці,
А хто будзе спаці.

(Вёска Азяраны.)

* * *

Паляцелі птушкі
На бабіны грушкі,
Птушкі грушкі паклявалі
Да й бабе паслалі.
Паляцелі куры
На бабіна проса.
Проса паклявалі,
Да й бабе паслалі.

(Вёска Старое Сяло.)

* * *

Ішоў бай па сцяне
У чырвоным каптане,
Нес сямёра лапцей
І жане і сабе
І дзіцёнку па лапцёнку.
Бай-бай-бай-бай-пабай.

(Вёска Старое Сяло.)

Да песеннай творчасці адносяцца таксама прыпеўкі да розных танцаў і частушкі. Апошнія як жанр сфарміраваліся параўнаўча нядаўна і абапіраюцца на песенныя традыцыі. Частушкі — жанр вельмі дынамічны, імгненна адгукаюцца на розныя падзеі жыцця і хутка пашыраюцца. Большасць частушак — лірычныя творы пра каханне і пачуцці, перажыванні юнака і дзяўчыны. Нямала ў іх ліку жартоўных, прасякнутых жыццесцвярджальным гумарам; ёсць і ўзоры сапраўднай сатыры.

Я прыпевачку прапела,
А ў лясочку аддалось.
Сёння нам з мілёначкам
Расставацца давялось.

* * *

На чужой староначцы
Ды соняйка не грэе.
Апроч радзімай мамачкі
Ніхто не пажалее.

* * *

Ай, бабкі мае,
Суравежачкі,
Пасаліў бы я вас —
Няма дзежачкі.

* * *

Дождж ідзе, дождж ідзе
На людзей і на мяне,
А на мілага майго
Сорак вёдзер на днаго.

* * *

Трактар ходзіць каля лесу
А я пасу цёлачку.
Цёлачку — пад ёлачку,
А сама к мілёначку.

* * *

Ой, пад мостам рыба з хвостам,
А на беразе ўюны.
За дзевачак хлопцы б'юцца,
Як дурныя бараны.

* * *

Я паўз могілкі ішла
Глянула ў старонку:
Там нябожчыкаў арцель
Гоніць самагонку.

Бытуюць нізкі лірычных або жартоўных прыпевак да «Лявоніхі», «Сямёнаўны», «Страданняў» і інш.

Адзін са старажытных жанраў народнай творчасці — замовы. Вылучаюцца яны захаванасцю мастацкай формы, дасканалым выкарыстаннем мастацкіх сродкаў.

Замовы — гэта помнікі народнага мастацтва, у якіх адбіліся ўяўленні нашых продкаў пра навакольны свет і магчымасці ўздзейнічаць на яго. Разам з магічнымі дзеяннямі, лекавымі травамі, малітвамі, яны выкарыстоўваліся ў мінулым, а дзе-нідзе і сёння, як сродак супраць розных хвароб чалавека і жывёлы, супраць стыхійных бедстваў і інш. Бытуюць у асноўным лекавыя замовы — ад звіху, ад бяльма, ад залатухі, ад скулы, ад зубнога болю, ад крывацёку, ад укусаў вужакі, ад грыжы і іншыя, а таксама замовы ад хваробы скаціны. Вобразнасць гэтых твораў часам нагадвае вобразнасць народных казак. Напрыклад, у замове ад звіху, выкарыстаны добра знаёмыя казачныя вобразы сіняга мора, дуба, гнязда, у якім ляжыць яйка: Ішоў Ісус Хрыстос цераз калінавы мост, цераз белы камень, залатой трасціной папіраўся. Звіся, удар мініся (раба божага...).

На сінім моры, на чыстым полі стаіць дуб, на тым дубе гняздо, у тым гняздзе яйцо, у тым яйцы зай, рабу божаму... звіх загрызай. І з сініх жыл, і з жоўтае касці, і з гаручыя крыві, і з румянага сэрца рассып на макава зерне. Не я ж угаварыла, угавараў сам госпадзі Ісус Хрыстос, ні мой дух, ды гасподні. (Вёска Курганне.)

Многім замовам уласцівы рытмізаваная мова, унутраная рыфма, што можна заўважыць і ў папярэднім творы і ў замове ад зубнога болю:

Ішлі калекі цераз тры рэкі, сеялі рожу. Рожа не ўзышла, у раба божага... кроў ні пайшла. (Вёска Курганне.)

З казачнымі вобразамі пераклікаецца замова «Ад воб'едзі», якую шапталі, калі ў каровы ўздуваецца, пучыць жывот:

На моры, на малакамор'і стаіць купарэз дрэва, на купарэзе сядзіць жар-пціца з жалезнай дзюбкай, з жалезным крыллем, з жалезнымі кокцямі. Кокцямі разграбае, крыллямі размятае, паганую воб'едзь ад рабой каровы жалезнай дзюбкай выбірае. (Вёска Старое Сяло.)

Прыказкі, прымаўкі і выслоўі адносяцца да так званых малых жанраў народнай паэзіі. Яны канцэнтруюць у сабе працоўны і сацыяльны вопыт многіх пакаленняў, абагульняюць практычныя веды людзей пры дапамозе ёмістых мастацкіх формул, лёгкіх для запамінання і перадачы. Яны могуць мець і прамы, і пераносны сэнс. Іх значэнне звычайна раскрываецца ў кантэксце, дапамагаючы больш вобразна і ёміста выказаць думку і данесці яе да субяседніка. Вось некалькі прыказак і прымавак, якія давялося пачуць на Рагачоўшчыне.

Што сяльцо, то нараўцо.

На чужыне жыць — кожнаму гадзіць.

Дзе было гора, там і два (варыянт: Бяда адна не ходзіць).

За борам цялушка — палушка, ды дораг перавоз.

Хораша жывецца — добра і пяецца.

Сказаў, як канцы звязаў.

Навінка ў рот — здароўе ў жывот, мядзведжая сіла каб па свету насіла (гавораць, калі ядуць штосьці новае).

Не да песень, як свет цесен (калі цяжка жыць).

Дзе поўны куст, там двор не пуст (калі многа дзяцей у сям'і).

Прыдзеш з ляску, ды не прыдзеш з пяску (з магілы).

Да малых жанраў адносяцца і загадкі, якія некалі ўваходзілі ў розныя абрады і рытуалы (у абрад ініцыяцыі), спрыялі развіццю кемлівасці, вобразнага мыслення, мастацкаму асэнсаванню рэчаіснасці. Сёння загадкі бытуюць пераважна ў дзіцячым асяроддзі.

Бела біяла перад небам стаяла,
Кроў п'юць, мяса паляць. (Бяроза).

Маленькі, гарбаценькі па полі паскакаў,
дадому прышоў і на пруток сеў. (Серп).

Матка таўстуха, дачка красатуха,
сын Халімон, павіляў ды і вон. (Печ, агонь, дым).

Пашыраны ў гэтым раёне і апавядальныя жанры: казкі, легенды, паданні, былічкі. Тут у многіх вёсках плённа працаваў беларускі фалькларыст і этнограф Е. Р. Раманаў. Значная колькасць запісаных тут казак апублікавана ім у «Беларускім зборніку» (вып. 3—4. Віцебск, 1887—91; вып. 6. Магілёў, 1901). Сярод іх чарадзейныя казкі на сюжэты «Пераможца змея», «Тры падземныя царствы», «Незвычайныя ўцёкі», «Звярынае малако», «Царскі сабака», «Браты-вораны», «Нязнайка», «Жывёлы-швагры», «Рогі», «Праўда і крыўда» і многія інш. Раманавым запісаны тут і казкі пра жывёл: «Гусак, мядзведзь, воўк, лісіца», «Мужык, мядзведзь і ліса», «Каза ў арэхах», а таксама легендарныя «Марка Багаты», «Хроснік Хрыста» і інш.

У пасляваенны перыяд на Рагачоўшчыне запісана нямала казак, прызначаных дзіцячай аўдыторыі (пра калабка, пра коціка, пеўніка і ліску, пра казу-дзеразу і інш.), а таксама паданняў, якія тлумачаць паходжанне назваў населеных пунктаў. Так паходжанне назвы вёскі Курганне мясцовыя жыхары звязваюць з мноствам курганоў, якія раней тут былі; назву вёскі Асмолавічы — з вырабам тут у мінулым смалы.

У заключэнні кароткага агляду разнастайнай і багатай вусна-паэтычнай творчасці Рагачоўшчыны варта падкрэсліць, што жывыя народныя традыцыі — неацэнны скарб, шануючы які і ствараючы ўмовы для яго захавання, мы зможам забяспечыць нармальнае развіццё нацыянальнай культуры, фарміраванне светапогляду сучаснікаў у адпаведнасці з высокімі прынцыпамі народнай маралі.

К. П. Кабашнікаў.

Народныя калектывы

Рагачоўская народная агітбрыгада раённага Дома культуры. Створана ў 1959 г., з 1976 г. мае званне народнай. Кіраўнікі: К. Катлінскі (з 1961), А. Сількевіч (з 1972), Л. Мягкова (з 1978), В. Вярэніч (з 1984).

Сярод пастановак: «Дзед Мярэжка, які праўду ў вочы рэжа», «Тарас не на Парнасе, а ў суседнім калгасе», «Прывітанне з касмічных прасторaў», «Лявоніха брыгаду збірае на дэкаду», «На планеце будучага», «Квітней, Беларусь», «Будзьце здаровы», «Добры дзень», «На новыя рубяжы», «Слава працы», «Вернасць памяці» і інш.

Калектыў — дыпламант 1-га Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных (1975—77). Вядзе канцэртную дзейнасць у рэспубліцы, выступаў на ВДНГ СССР у Маскве (1964).

Рагачоўскі народны тэатр раённага Дома культуры. Створаны ў 1947 г., з 1962 г. мае званне народнага. Кіраўнікі: М. Кавалеўскі (з 1947), К. Катлінскі (з 1961), А. Сількевіч (з 1972).

У рэпертуары п'есы беларускіх і іншых савецкіх драматургаў: «Прымакі» Я. Купалы, «З народам» і «Людзі і д'яблы» К. Крапівы, «Альпійская балада» паводле аповесці В. Быкава, «Выгнанне блудніцы» І. Шамякіна, «Трывога» А. Петрашкевіча, «Апошні ўзлёт» А. Дударава, «Вясёлыя, бедныя, багатыя» Г. Марчука, «Іван і мадона» А. Кудраўца, «Лесвіца» В. Ткачова, «Крык на хутары» В. Бутра-

Рагачоўскі народны тэатр. Сцэна са спектакля «Прымакі».

меева, «Барабаншчыца» А. Салынскага, «Валянцін і Валянціна» М. Рошчына, «Салдацкая ўдава» М. Анкілава, «Дзённік жанчыны» К. Фіна і інш.

Калектыў — дыпламант рэспубліканскага агляду-конкурсу народных тэатраў і драматычных калектываў, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа (1982). Тэатр шмат выступае ў вёсках свайго раёна і за яго межамі.

Наша «Натхненне»

Літаратурнае аб'яднанне «Натхненне» пры Рагачоўскай раённай газеце «Камунар» мае свае даўнія і адметныя традыцыі. Яно бярэ пачатак з даваенных часоў. Лепшым прадстаўніком (таго перыяду быў наш зямляк паэт Мікола Сурначоў, які некаторы час працаваў у раёнцы і з 1933 г. пачаў у ёй друкаваць свае першыя творы. У пасляваенныя гады літаб'яднанне ўзначальвалі Валянцін Дончык, Анатоль Вярцінскі, Васіль Клімянкоў, з 1979 г.— М. Янчанка. Аб'яднанне згуртоўвае людзей розных узростаў. Добрым словам хочацца ўспомніць нашу гвардыю — паэтаў шафёра Івана Пышкова, бібліятэкара Льва Ліпоўскага, рэжысёра народнага тэатра Канстанціна Катлінскага, дырэктара школы Івана Усціновіча, настаўніка Фядоса Румянцава, калгасніка Андрэя Кордзікава, служачага Міхаіла Рутмана. На жаль, І. Пышкова, К. Катлінскага, Л. Ліпоўскага, І. Усціновіча няма сярод нас, але помнікам ім будуць іх уласныя творы.

Гэта былі людзі, улюбёныя ў сваю Рагачоўшчыну, дзе нарадзіліся, дзе пазналі радасць жыцця. «Далёка сасна стаіць, а свайму бору шуміць»,— гаворыць народная прымаўка. І як тут не ўспомніць Івана Пышкова, які жыў у Маскве, а ў дасланых вершах апяваў свае родныя незабыўныя Азяраны. Леў Ліпоўскі таксама пісаў пра свой любімы Рагачоў. Сапраўдным песняром Прыдняпроўя быў і Іван Усціновіч, а Канстанцін Катлінскі з'яўляецца аўтарам слоў вядомай у нас «Песні пра Рагачоў».

Ветэран нашага аб'яднання Андрэй Кордзікаў пачаў пісаць яшчэ ў даваенныя гады разам з Міколам Сурначовым, і да гэтага часу ён плённа працуе як празаік і гумарыст. У свой час А. Кордзікаў быў пераможцам рэспубліканскага конкурсу на лепшае апавяданне.

Добрыя здабыткі на літаратурнай ніве маюць слесар завода «Дыяпраектар» Міхась Атрасевіч, выкладчык Рагачоўскага педвучылішча Уладзімір Немізанскі, аўтар зборніка паэзіі і сааўтар калектыўных зборнікаў для дзяцей. Інструктар выканкома раённага Савета народных дэпутатаў Міхась Кавалёў, супрацоўнік раённай газеты Васіль Дружкоў і пенсіянер Павел Сарокін працуюць у жанры гумарыстычных замалёвак. Радуюць сваімі лірычнымі вершамі Васіль Клімянкоў, настаўнік Уладзімір Бандарэнка, інжынер Антон Маневіч. Хвалююць чытача вершы былога воіна-інтэрнацыяналіста Віктара Паўлава. Асобна хочацца сказаць пра паэта і кампазітара Юрыя Арэстава. Ён аўтар хвалюючых лірычных вершаў, напісаў музыку да многіх сваіх твораў і твораў членаў літаб'яднання. Актыўным членам «Натхнення» з'яўляецца і Уладзімір Шпадарук. На долю гэтага чалавека выпалі выключныя выпрабаванні, ён страціў магчымасць хадзіць. Але гэта не зламала яго, усю сваю энергію ён аддае вершам, у якіх знайшоў сцяжынку да сэрцаў людзей і сваё месца ў жыцці. Цяпер вершы Уладзіміра Шпадарука друкуюцца ў многіх перыядычных выданнях рэспублікі.

Спрабуюць свае сілы ў галіне паэзіі і прозы рабочая хлебазавода Юлія Брадунова, якая піша апавяданні, лірычныя вершы і байкі, настаўніца Таццяна Вялькова, інжынер Ірына Зуй, Ніна Пінчук і рабочая Ніна Драбышэўская.

Члены літаб'яднання ўносяць значны ўклад у культурнае жыццё раёна і горада, яны рэгулярна выступаюць перад рабочымі, хлебаробамі, моладдзю і школьнікамі. У газеце «Камунар» пастаянна публікуюцца літаратурныя старонкі, дзе змяшчаюцца лепшыя празаічныя і паэтычныя творы, ноты новых песень. Творчасць пачаткоўцаў разглядаецца ў літаратурных аглядах. «Натхненне» працягвае жыць, прыцягваючы да сябе літаратурныя таленты Рагачоўшчыны.

М. І. Янчанка.

Рагачоўскія весляры

Далёка за межамі раёна вядома аб поспехах рагачоўскіх спартсменаў-вяслароў. Рагачоўская дзіцяча-юнацкая спартыўная школа была адкрыта ў чэрвені 1956 г. Не маючы сваёй спартыўнай базы, маёмасці і абсталявання, заняткі яна

праводзіла ў спартыўнай зале СШ № 2. Паступова школа была ўкамплектавана вопытнымі трэнерамі, неабходным абсталяваннем і пачала рыхтаваць спартсменаў высокага класа. З прыходам трэнера майстра спорту СССР В. С. Станібулы ў школе пачало актыўна развівацца веславанне на байдарках і каноэ. Ужо за першыя гады работы весляры М. Гаўрыленка і Г. Агеенка сталі бронзавымі прызёрамі Рэспубліканскай спартакіяды школьнікаў, а ў 1960 г. ў склад зборнай каманды веляроў БССР увайшлі М. Гаўрыленка, Н. Снегіроў, Л. Хахлова, Т. Васькова, В. Грамыка, А. Дзядкоў. У 1964 г. Т. Васькова стала чэмпіёнкай Беларусі і прызёрам Усесаюзнай спартакіяды школьнікаў па веславанні.

Знамянальным у жыцці школы стаў 1972 г., калі выхаванец В. С. Станібулы М. Гарбачоў стаў алімпійскім чэмпіёнам па веславанні на байдарках і каноэ. За 2 месяцы да Мюнхенскай алімпіяды ён выйграў чэмпіянат краіны. Яшчэ 4 гады ён выступаў на спаборніцтвах рознага рангу, дзе стаў чэмпіёнам і неаднаразовым прызёрам чэмпіянатаў свету і Савецкага Саюза. У 1975 г. выхаванец школы В. Е. Вараб'ёў стаў чэмпіёнам свету, сярэбраным прызёрам чэмпіянату свету 1977 г., трохразовым чэмпіёнам СССР, чэмпіёнам 6-й летняй Спартакіяды народаў СССР, заслужаным майстрам спорту. У 1976 г. Н. В. Рычага стала чэмпіёнкай 7-й летняй Спартакіяды Беларусі.

У 1977 г. аддзяленне веславання на байдарках і каноэ пры ДЗЮСШ пераўтворана ў спецыялізаваную дзіцячаюнацкую школу алімпійскага рэзерву, якую ўзначаліў алімпійскі чэмпіён М. Гарбачоў. Т. В. Рычага стала сярэбраным прызёрам маладзёжнага чэмпіянату Еўропы ў 1979 г., сярэбраным прызёрам чэмпіянату Еўропы 1981 г., А. А. Мельнікава — бронзавым прызёрам Маскоўскай алімпіяды ў 1980 г., В. І. Крэз — чэмпіёнам СССР 1977 г. сярод юнакоў, чэмпіёнам Узброеных Сіл СССР 1979 г., пераможцам кубка СССР 1981 г., сярэбраным прызёрам чэмпіянату СССР 1983 г.

У 1983 г. В. Ф. Борыкаў на чэмпіянаце свету ў Тампере заняў 4-е месца, ён сярэбраны прызёр чэмпіянату СССР 1979 г., чэмпіён СССР, чэмпіён Еўропы 1981 г., сярэбраны прызёр чэмпіянатаў СССР 1985 г. і 1986 г. А. Зуеў — чэмпіён І маладзёжных гульняў СССР, бронзавы

Ю. П. Блінцоў.

прызёр чэмпіянатаў СССР 1985 г. і 1986 г., бронзавы прызёр 9-й летняй Спартакіяды народаў СССР, чэмпіён СССР 1987 г., сярэбраны прызёр міжнародных спаборніцтваў памяці Ю. Рабчынскай 1987 г., чэмпіён СССР 1988 г., сярэбраны прызёр чэмпіянату СССР 1989 г.

У 1990 г. С. Калеснік заваяваў 2 залатыя медалі на чэмпіянаце свету ў г. Познань, ён удзельнік Алімпійскіх гульняў 1988 г. ў Сеуле, двухразовы чэмпіён свету 1987 г. сярод моладзі, чэмпіён СССР 1987, 1988, 1989, 1990 гг., сярэбраны прызёр 20-га чэмпіянату свету.

Прымаючы эстафету ад старэйшых, выхаванцы спартыўнай школы набываюць вопыт удзелу ў спаборніцтвах Беларусі, становяцца чэмпіёнамі і прызёрамі спаборніцтваў розных рангаў. Сярод іх чэмпіён Беларусі, сярэбраны прызёр першынства СССР А. Букатаў, сярэбраны прызёр першынства СССР сярод ДЗЮСШ С. Слесараў, чэмпіёнка Беларусі І. Семянюк, прызёры спаборніцтваў З. Гручанкова, Э. Палавікоў, Дз. Навіцкі, В. Філімонаў і інш.

Наўрад ці знойдзецца на Беларусі спартыўная школа, дзе было б падрыхтавана больш за 300 першаразраднікаў, 100 кандыдатаў у майстры спорту, 30 майстроў спорту СССР. Гэтым поспехам папярэднічала вялікая работа педагогаў — заслужаных трэнераў СССР В. С. Станібулы, М. С. Гарбачова, М. В. Гаўрыленкі, заслужаных трэнераў Беларусі В. І. Караленкі, Г. П. Шышова, трэнераў М. С. Слесарава, В. Ф. Ярмоленкі і інш. Адначасова школа рыхтуе і трэнерскія кадры. Многія выпускнікі школы, скончыўшы ВНУ, прыходзяць працаваць у школы і спартыўныя арганізацыі, працягваюць работу сваіх настаўнікаў.

С. П. Бондараў.

М. В. Даманцэвіч.

П. М. Касьянаў.

С. М. Юрчанка.

Загінулі ў Афганістане

БЛІНЦОЎ Юрый Пятровіч, нарадзіўся 24.3.1968 г. ў в. Асіннікі. Беларус. У 1985 г. скончыў Забалацкую сярэднюю школу, працаваў трактарыстам у калгасе. У кастрычніку 1986 г. прызваны ў Савецкую Армію Рагачоўскім АГВК. Механік-вадзіцель радавы Ю. П. Блінцоў загінуў у баі 19.1.1988 г. каля г. Хост. Месца гібелі Юрыя сябры-воіны абазначылі самаробным помнікам. Пахаваны ў в. Асіннікі. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

БОНДАРАЎ Сямён Паўлавіч, нарадзіўся 26.6.1962 г. ў в. Турск. Беларус. У 1979 г. скончыў Гадзілавіцкую сярэднюю школу, вучыўся ў Мар'інагорскім саўгасе-тэхнікуме Мінскай вобласці. У кастрычніку 1980 г. прызваны ў Савецкую Армію Рагачоўскім АГВК. Быў камандзірам аддзялення. Удзельнічаў у ахове перавала каля г. Герат. Сяржант С. П. Бондараў загінуў 2.6.1982 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў в. Турск. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ДАМАНЦЭВІЧ Мікалай Васілевіч, нарадзіўся 30.1.1966 г. у в. Каласы. Беларус. У 1982 г. скончыў Рагачоўскую сярэднюю школу № 3, пасля вучыўся ў Северадзвінскім ПТВ № 1 Архангельскай вобласці, працаваў токарам на заводзе. У 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію Северадзвінскім РВК. Служыў у Афганістане ў інжынерна-сапёрнай роце, быў адным з лепшых спецыялістаў падраздзялення. У правінцыі Кандагар «мінная вайна» атрадаў апазіцыі набыла асабліва вялікі размах. 21.5.1986 г. групе сапёраў, у якую ўваходзіў і гвардыі радавы М. В. Даманцэвіч, трэба было размініраваць участак дарогі. Працавалі пад абстрэлам праціўніка. Мікалай абясшкодзіў 7 мін, восьмая абарвала яго жыццё... Пахаваны ў в. Каласы. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

КАСЬЯНАЎ Пётр Мікалаевіч, нарадзіўся 29.9.1963 г. ў в. Ціхінічы. Беларус. Пасля сканчэння 8 класаў Ціхініцкай сярэдняй школы Пётр вучыўся ў Жлобінскім ПТВ № 187, у 1981 г. працаваў трактарыстам у саўгасе «Ціхінічы». У Савецкую Армію прызваны Рагачоўскім АГВК. Служыў у Афганістане. Радавы механік-вадзіцель цягача П. М. Касьянаў загінуў 22.9.1983 г. пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў в. Ціхінічы. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

ЮРЧАНКА Сяргей Міхайлавіч, нарадзіўся 22.7.1965 г. ў в. Свержань. Беларус. У 1980 г. Сяргей скончыў 8 класаў Доўскай сярэдняй школы, вучыўся ў Жлобінскім ПТВ № 187, атрымаў спецыяльнасць трактарыста і вадзіцеля аўтамабіля. У кастрычніку 1984 г. прызваны ў Савецкую Армію Рагачоўскім АГВК. Служыў у Афганістане мінамётчыкам. Радавы С. М. Юрчанка загінуў 25.4. 1986 г. каля г. Газні пры выкананні баявога задання. Пахаваны ў в. Доўск. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Рагачоўскі музей народнай славы

У канцы снежня 1962 г. ў Рагачове на грамадскіх пачатках быў створаны гісторыка-краязнаўчы музей. Ініцыятар і заснавальнік яго — былы сакратар Рагачоўскага падпольнага райкома партыі С. М. Свярдлоў, які да 1973 г. ўзначальваў му-

Выстаўка работ мастака Б. П. Маліноўскага ў краязнаўчым музеі ў Рагачове. 1991 г.

